# Будуйце масты, не сцены

Энвер Джуліман, Ліліян Юрт
**БУДУЙЦЕ МАСТЫ, НЕ СЦЕНЫ.** — Метадычны дапаможнік для некамерцыйных арганізацый, якія займаюцца пытаннямі прававой асветы. Пераклад з нарвежскай мовы.

Дадзенае выданне — пераклад кнігі Энвера Джулімана і Ліліян Юрт «Будуйце масты, не сцены. 97 практыкаванняў па тэмах: правы чалавека, міжкультурнае ўзаемаразуменне і мірнае вырашэнне канфліктаў», дапоўненае каментарамі і даведкамі, датычнымі беларускага кантэксту.

Інфармацыя і практыкаванні, сабраныя ў кнізе, могуць быць карыснымі для настаўнікаў пачатковай і сярэдняй школы, выкладчыкаў сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў, а таксама для прадстаўнікоў некамерцыйных арганізацый, якія працуюць у галіне праваабарончай асветы. Педагогіка актыўнага ўдзелу, праілюстраваная ў кнізе, — гэта альтэрнатыва «традыцыйнаму» навучанню.

Выкарыстаны фотаздымкі:
Нарвежскі Хельсінкскі камітэт, Беларуская праваабарончая школа, photo.bymedia.net, nn.by

Рэдагаванне і адаптацыя да беларускага кантэксту: Таццяна Рэвяка
Распрацоўка арыгінал-макета, камп'ютарная вёрстка: Марына Пятровіч
Дызайн вокладкі: Віктар Корзун

Энвер Джуліман, 2010
Ліліян Юрт, 2010
Нарвежскі Хельсінкскі камітэт, 2010
Праваабарончы цэнтр «Вясна», 2010

Выдавецтва «Gudas», Вільнюс

Электронную версію кнігі можна знайсці на сайце: www.spring96.org



Энвер Джуліман і Ліліян Юрт

# Будуйце масты, не сцены

97 практыкаванняў па тэмах:
правы чалавека,
міжкультурнае ўзаемаразуменне
і мірнае вырашэнне канфліктаў

*распавядзі мне, і я забуду*
*пакажы мне, і я запомню*
*дай мне паспрабаваць, і я зразумею*

NORWEGIAN HELSINKI COMMITTEE

Вясна

2010

Энвер Джуліман, Ліліян Юрт
**БУДУЙЦЕ МАСТЫ, НЕ СЦЕНЫ**
(97 практыкаванняў па тэмах:
правы чалавека, міжкультурнае ўзаемаразуменне і мірнае вырашэнне канфліктаў).

Нарвежскі Хельсінкскі камітэт
Кіркегата 5, 0153 Осла, Нарвегія

Пераклад:
Таццяна Рэвяка

Выданне кнігі «Будуйце масты, не сцены» на нарвежскай мове стала магчымым пры падтрымцы Нарвежскай асацыяцыі навуковай літаратуры, Нарвежскага Хельсінкскага камітэта, Інстытута «Свабоднае слова» і Асацыяцыі этыкі і гуманнасці. Выданне кнігі на беларускай мове стала магчымым пры падтрымцы нарвежскага Міністэрства замежных спраў. Кніга таксама выдадзена на рускай, баснійскай, сербскай і харвацкай мовах.

Адносна інфармацыі пра семінары і курсы просьба звяртацца да аўтараў
па электроннай пошце:
djuliman@nhc.no — www.nhc.no
lillian@mr-akademiet.no — www.menneskerettighetsakademiet.no

Аўтарскія правы:
Humanist forlag
Postboks 6744 St. Olavs plass, 0130 Oslo



# З водгукаў пра кнігу ў Нарвегіі

- Калі нейкая кніга і павінна быць прымеркавана да Году разнастайнасці, то абавязкова гэтая.

*АФТЭНПОСТЭН*

- «Будуйце масты…» прызначана ў асноўным для дзяцей падлеткавага ўзросту. Аднак, назіраючы ўзровень ведаў у нарвежскіх дэбатах, можна сказаць, што кніга павінна быць настольнай для супрацоўнікаў паліцыі і акадэмікаў.

*НОВЫ ЧАС*

- Практыкаванні робяць майстрам у правах чалавека.

*СВАБОДНАЯ ДУМКА*

- «Будуйце масты, не сцены» даюць чытачу жаданне дзейнічаць на наступны дзень. Кніга поўная ведаў і мяккага падыходу да складаных тэм. Зноў і зноў падкрэслена важнасць умення размаўляць адзін з адным, абменьвацца меркаваннямі і ўмець аргументаваць. У такім выпадку будзе лягчэй паважаць розніцу паміж людзьмі, бачыць падабенствы і пагадзіцца адносна важнасці правоў чалавека.

*ДРАМЕНСКІЯ НАВІНЫ*

- Цудоўная кніга.

*АДУКАЦЫЯ*

# Змест

**Прадмова** 13

**Прадмова да беларускага выдання** 15

**Раздзел 1.** Навучанне правам чалавека, міжкультурнаму ўзаемаразуменню і вырашэнню канфліктаў 17

Навучальная дысцыпліна ў развіцці 21
Гэта працуе 22
Адукацыя ў галіне правоў чалавека для дзяцей і моладзі ў Беларусі 24

**Раздзел 2** Педагагічны аспект 29

Практычная арганізацыя кнігі 31
Роля выкладчыка 32
Падбор тэм і практыкаванняў 34
Размяшчэнне ў класе 35
Праца ў групах 35
Лекцыя кіраўніка 36
Агульнае абмеркаванне 37
Калі ўзнікнуць канфлікты 39
Парады кіраўніку 41

**Раздзел 3.** Уступныя практыкаванні і размінкі 43

Знаёмства 44
Чаканні і правілы паводзін на занятках 46
Размеркаванне па групах 48
Практыкаванні для разважання і камунікацыі 49
Размінкі 50
*Вітанні* 51
*60 секунд — адна хвіліна?* 52
*Шыхтаванне* 52
*Вецер дзьме* 53
*Дакраніся да пляча* 53
*Дом, чалавек, землятрус* 53
*Мама з дзецьмі, слон і пальма* 54
*Фігуры* 54
*Дакрануцца да падлогі* 55
*«Сляпы»* 56
*Танец пад музыку* 56
*«Чалавечая машына»* 56

**Раздзел 4.** Правы чалавека 57

Этычныя асновы 60
Перадгісторыя 61
Правы чалавека ў Беларусі. Гістарычны агляд 62
ААН і ўніверсальныя правы чалавека 64
Якія правы? 67
Дакументы і абавязацельствы дзяржаў 68
БССР і Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека 70
Абарона правоў чалавека 70
Нацыянальная абарона 71
Міжнародная абарона 81
Правы чалавека ў развіцці 91
Важныя пункты да даклада аб правах чалавека 92

**Практыкаванні па тэме «Правы чалавека»** 97

| НАЗВА | ТЭМА | |
|---|---|---|
| Чалавечая годнасць | *Універсальнасць правоў чалавека* | 98 |
| Самыя неабходныя патрэбы | *Уводзіны ў правы чалавека* | 104 |
| Новая планета | *Уводзіны ў правы чалавека* | 108 |
| Знайдзіце ніткі! | *Справядлівасць і несправядлівасць* | 111 |
| Давайце абмяркуем справядлівасць | *Правы чалавека грунтуюцца на справядлівасці* | 113 |
| Што мы ведалі і раней? | *Уводзіны ў правы чалавека* | 116 |
| Якія правы парушаны? | *Розныя правы чалавека* | 118 |
| Пантаміма аб правах чалавека | *Розныя правы чалавека* | 120 |
| Чытанне газет праз «акуляры правоў чалавека» | *Лепш пазнаёміцца з правамі чалавека* | 122 |
| Гісторыя правоў чалавека ў маёй краіне | *Гісторыя правоў чалавека* | 124 |
| Міжнародныя законы — гэта адказнасць дзяржавы | *Як міжнародныя дамовы аб правах чалавека прыводзяць да змен у дзяржавах* | 127 |
| Нацыянальная абарона: дзяржава і іншыя | *Як правы чалавека абараняюцца дзяржавай* | 131 |
| Разгляд скаргі ў Камітэце ААН па правах чалавека | *Камітэт ААН па правах чалавека* | 134 |
| Адзін на адзін з дзяржавай | *Еўрапейскі суд па правах чалавека* | 139 |
| Давайце прааналізуем сітуацыю з правамі чалавека | *Аб розных правах чалавека* | 142 |
| Рэбус аб свабодзе слова | *Свабода слова* | 145 |
| Што такое свабода слова? | *Свабода слова* | 147 |

| | | |
|---|---|---|
| «Калі троль выйдзе на сонца, то ён лопне ад святла» | *Свабода слова* | 150 |
| Ці павінна быць дазволена казаць абсалютна ўсё? | *Межы свабоды слова* | 154 |
| Я таксама хачу вырашаць | *Удзел у палітычным жыцці* | 159 |
| Грамадзянская супольнасць | *Грамадзянская супольнасць* | 162 |
| Праваабарончыя арганізацыі | *Праваабарончыя арганізацыі* | 166 |
| Праваабаронцы | *Праваабаронцы* | 169 |
| Правы дзіцяці | *Правы дзіцяці* | 171 |
| Так бы хацелася пагаварыць з кім-небудзь пра гэта | *Права на абарону ад кпінаў і гвалту* | 175 |
| Правы жанчын | *Правы жанчын* | 179 |
| Жаноцкасць і мужчынскасць | *Раўнапраўе* | 182 |
| Сацыяльны пол | *Сацыяльны пол* | 183 |
| Хатні гвалт | *Правы жанчын* | 187 |
| Мама, тата... я-гомасэксуаліст, але мне занадта цяжка | *Правы гомасэксуалістаў* | 193 |
| Можна ўвайсці? | *Правы ўцекачоў* | 196 |
| Рэлігія і традыцыі сутыкаюцца з правамі чалавека | *Правы чалавека і рэлігія, культура і традыцыя* | 204 |
| Энцыклапедыя глабалізацыі | *Глабалізацыя* | 208 |
| Увесь свет у адной вёсцы | *Эканамічныя, сацыяльныя і культурныя правы* | 211 |
| Доступ да лекаў | *Здароўе, глабалізацыя, дыскрымінацыя і прадузятасці* | 215 |
| Імітацыя ААН | *Арганізацыя Аб'яднаных Нацый (ААН)* | 222 |
| Справядлівая вайна? | *Правы чалавека, вайна і «гуманітарнае ўмяшальніцтва»* | 225 |
| Тэмпература правоў чалавека ў школе | *Актуальнасць правоў чалавека ў нашым жыцці* | 229 |

**Раздзел 5.** Міжкультурнае ўзаемаразуменне 233

Што такое міжкультурнае ўзаемаразуменне? 234
Шматкультурнае грамадства 235
Культура 237
Фарміраванне ідэнтычнасці 240
Ідэнтычнасць і сацыяльны кантэкст 243
Стварэнне ідэнтычнасці ўцекачоў і эмігрантаў 245
Цяжкасці шматкультурнага грамадства 246
Сустрэчы культур 246
Этнацэнтрызм і культурны рэлятывізм 247
Падабенствы культур 248
Адрозненні культур і наступствы 249
«Багатае» грамадства 250
Сутыкненні культур 251
Павага да непадобных людзей 254
Ушчамленне правоў чалавека па прыкмеце культуры і рэлігіі 255
Стэрэатыпы і прадузятасці 259
«Мы» і «яны» 261
Дыскрымінацыя 262
Чыя інтэграцыя? 264
Шматкультурная рэчаіснасць 267
Пункты да даклада аб міжкультурным узаемаразуменні 268

**Практыкаванні па тэме «Міжкультурнае ўзаемаразуменне»** 273

| **НАЗВА** | **ТЭМА** | |
|---|---|---|
| Шматкультурнае грамадства | *Міжкультурнае грамадства* | 274 |
| Шматкультурная Нарвегія | *Шматкультурная Нарвегія* | 276 |
| Што такое культура? | *Культура, міжкультурнае ўзаемаразуменне* | 278 |
| Ты значыш шмат | *Асоба* | 281 |
| Ці сам ты ствараеш сваю ідэнтычнасць? | *Ідэнтычнасць* | 283 |
| Мой уласны герб | *Ідэнтычнасць* | 286 |
| Маё дзяцінства | *Адрозненні і падабенствы паміж людзьмі* | 289 |
| Падобныя ці не? | *Адрозненні і падабенствы* | 291 |
| Каштоўнасці | *Каштоўнасці* | 293 |
| У мяне ёсць выбар | *Ідэнтычнасць і мужнасць* | 296 |
| Практыкаванне-дыялог | *Дыялог, аргументацыя, фарміраванне поглядаў* | 300 |
| Пункт гледжання з нагоды цяжкасцяў Аіды і Алі | *Фарміраванне сваёй пазіцыі* | 304 |
| Гульня ў пытанні пра традыцыйныя і сучасныя грамадствы | *Культура* | 307 |
| «Або-або» ці «і тое, і другое» | *Прыналежнасць да некалькіх культур* | 310 |
| Дзеці мігрантаў — на раздарожжы | *Ідэнтычнасць, культура, адрозненні культур* | 312 |
| Дзяўчаты — прадстаўніцы культурных меншасцяў — паміж двума агнямі | *Дыскрымінацыя жанчын* | 314 |

| | | |
|---|---|---|
| Я — носьбіт культуры | *Культура і ідэнтычнасць* | 317 |
| Уцекачы | *Уцекачы і ўцекачы-дзеці* | 319 |
| «Страты ўцекачоў» | *Страты людзей-уцекачоў* | 322 |
| «Пяць калод» | *Нязвыклая камунікацыя* | 324 |
| Я бяру на сябе адказнасць | *Цяжкасці дзяцей-уцекачоў у Нарвегіі* | 328 |
| Мой герой | *Адносіны людзей да людзей-ідэалаў* | 331 |
| СМІ і фарміраванне ўласнага меркавання | *Роля СМІ у стварэнні стэрэатыпаў і забабон* | 333 |
| Слухаем гісторыі іншых людзей | *Успрыманне і разуменне іншых людзей* | 339 |
| Як зразумець іншыя культуры? | *Этнацэнтрызм і культурны рэлятывізм* | 342 |
| Зорка шукае зорку | *Фармаванне групы* | 345 |
| Першае ўражанне | *Забабоны і прадузятасці* | 347 |
| Сацыяльныя стэрэатыпы — малюнкі ў нашай галаве | *Сацыяльныя стэрэатыпы і забабоны* | 349 |
| Маша і Халід | *Стэрэатыпы і забабоны* | 353 |
| «Мы» і «яны» | *Прыналежнасць да групы і дзяленне на «мы» і «яны»* | 355 |
| Розныя правілы гульні | *Большасць і меншасць* | 358 |
| Галаваломка пра рэчаіснасць | *Дыскрымінацыя, сегрэгацыя і выключэнне* | 361 |
| Здагадайцеся, хто прыйдзе на вячэру | *Дыскрымінацыя і распаўсюджванне забабонаў* | 363 |
| Вопыт дыскрымінацыі | *Дыскрымінацыя* | 366 |
| Сацыяльны статус | *Сацыяльны статус* | 369 |
| Талерантнасць | *Цярпімасць і нецярпімасць* | 372 |
| Дэбаты: колькі «іншасці» і непадобнасці мы можам трываць | *«Іншыя» і талерантнасць* | 375 |
| Мы складаем уласную дэкларацыю аб міжкультурным узаемаразуменні | *Міжкультурнае ўзаемаразуменне* | 377 |

**Раздзел 6.** Мірнае вырашэнне канфліктаў 379

Што такое канфлікт? 381
Канфлікты — гэта толькі негатыў? 383
Станоўчыя бакі канфліктаў 383
У нас ёсць выбар 386
Спіраль канфлікту 388
Камунікацыя 388
Значэнне эмоцый і пачуццяў 391
Вырашэнне і ўладжванне канфлікту 392
Канфлікты і абраза, ужыванне сілы 394
Не ўхіляйцеся ад адказнасці! 395
Пункты да даклада аб вырашэнні канфліктаў 396

**Практыкаванні па тэме «Вырашэнне канфліктаў»** 399

| **НАЗВА** | **ТЭМА** | |
|---|---|---|
| Канфлікты — частка нашай рэчаіснасці | *Паняцце «канфлікт»* | 400 |
| Канфлікты — гэта толькі негатыў? | *Пазітыўныя бакі канфліктаў* | 402 |
| Дрэва канфлікту | *Прэзентацыя паняцця «канфлікт»* | 405 |
| Канфлікт і ўжыванне сілы | *Канфлікт і парушэнне правоў чалавека* | 407 |
| Умець слухаць | *Стасункі* | 410 |
| Узаемныя стасункі | *Дыялог* | 413 |
| Ствараем разам | *Стасункі ў групах* | 415 |
| Крэслы | *Супрацоўніцтва* | 417 |
| Чырвоны сцяжок | *Усведамленне сваіх уласных рэакцый* | 422 |
| Чатыры прыступкі раз'юшанасці | *Усведамленне ўласных рэакцый і пачуццяў* | 424 |
| Праява гневу | *Усведамленне ўласных рэакцый і пачуццяў* | 426 |
| «Напад» і «адступленне» | *Усведамленне ўласных рэакцый і пачуццяў* | 428 |
| Перагаворшчык | *«Знаёмства» з уласнымі пачуццямі і рэакцыямі* | 433 |
| Чарга | *Задавальненне сваіх патрэб і жаданняў* | 436 |
| Спіраль канфлікту | *Развіццё канфліктнай сітуацыі* | 439 |
| У нас ёсць выбар | *Развіццё канфліктнай сітуацыі* | 442 |
| Адна сітуацыя — тры выхады | *Вырашэнне канфліктаў* | 444 |
| Этапы вырашэння канфлікту | *Вырашэнне канфліктаў* | 446 |

**Раздзел 7.** Тэатр у навучанні 451

Аўгусту Баал і «тэатр прыгнечаных» 454

**Раздзел 8.** Актывісцкая дзейнасць 457

Інфармацыя пра праблему 458
Апытанне 459
Лісты 460
Артыкулы і нататкі ў газету 460
Грамадскія дэбаты 460
Дэманстрацыі 460
Дапамога неабароненым слаям грамадства 460

Падтрымка арганізацый 461
Уласны праект ці арганізацыя 462

**Раздзел 9.** Ацэнка працы 465

Бягучая ацэнка 466
Вусная ацэнка на выніковым занятку 467
Індывідуальная пісьмовая ацэнка 467

**Дадаткі** 468

1. Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека 470
2. Важнейшыя дакументы па правах чалавека 475
3. Міждзяржаўныя арганізацыі, якія працуюць у сферы правоў чалавека 477
4. Незалежныя праваабарончыя арганізацыі 477

**Спіс літаратуры** 478



## ПРАДМОВА

Дадзеная кніга — вынік дзесяцігадовай працы ў галіне навучання правам чалавека, міжкультурнаму ўзаемаразуменню і вырашэнню канфліктаў. Працуючы над праектамі ў межах Нарвежскага Хельсінкскага камітэта, мы распрацавалі і апрабавалі праграмы для навучання школьнікаў, студэнтаў, настаўнікаў, журналістаў і ўцекачоў у краінах Балканскага паўвострава, у Беларусі, Расіі, ЗША і Нарвегіі.

Мы — актывісты па абароне правоў чалавека. Правы чалавека ўяўляюць сабой тыя каштоўнасці, якія падзяляюць усе краіны свету. Каштоўнасны падмурак правоў чалавека ў тым, што ўсе людзі на Зямлі маюць годнасць і ніхто, незалежна ад полу, колеру скуры, нацыянальнай, этнічнай, рэлігійнай і сэксуальнай прыналежнасці, не павінен быць ушчэмлены ў сваіх правах. Правы чалавека, разам з міжкультурным узаемаразуменнем і ўменнем вырашаць канфлікты, з'яўляюцца, напэўна, самымі важнымі рэсурсамі для грамадстваў у сучасным глабальным свеце. Сёння мы залежым адзін ад аднаго больш, чым калі-небудзь. І калі мы хочам жыць у міры, будаваць яго нам трэба разам.

**Падчас нашай** працы з моладдзю мы даволі хутка выявілі, што тэарэтычнае лекцыйнае выкладанне — няправільны шлях. Для таго, каб маладыя людзі сапраўды зразумелі і навучыліся прымяняць атрыманыя веды, ім павінна быць адведзена вядучая роля. З цягам часу мы прыйшлі да распрацоўкі практыкаванняў і гульняў, заснаваных на актыўным удзеле навучэнцаў падчас навучання. Ці да таго, што называецца выкарыстаннем актыўных метадаў навучання. З часам таксама сталі з'яўляцца новыя ідэі. Мы пазнаёміліся бліжэй з вопытам працы калег ва ўласнай краіне і за мяжой; сабралі матэрыялы, выдадзеныя Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый, Саветам Еўропы, Міжнароднай Амністыяй і іншымі арганізацыямі. Мы шукалі, выяўлялі, выкарыстоўвалі і дапаўнялі гэтыя матэрыялы. У выніку два гады таму мы аказаліся «ўладальнікамі» вялікага матэрыялу, які павінен быць даступным і для іншых, на нашу думку.

Практыкаванні, сабраныя ў дадзенай кнізе, могуць быць выкарыстаны ў розных кантэкстах. Яны могуць быць карысным матэрыялам як для настаўнікаў пачатковай і сярэдняй школы, так і для прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый, якія працуюць з уцекачамі, эмігрантамі і іншымі групамі людзей. Педагогіка актыўнага ўдзелу, праілюстраваная ў кнізе, — гэта альтэрнатыва «традыцыйнаму» навучанню. Або, як сказала аднойчы сямнаццацігадовая Ясміна: «Гэта *іншае* навучанне!»

Напісанне кнігі — доўгі і ёмісты працэс, і таму мы хацелі б падзячыць многім людзям. У першую чаргу, нашым калегам у Нарвежскім Хельсінкскім камітэце за шматгадовае супрацоўніцтва і падзяленне нашых поглядаў на праваабарончую працу. Мы вельмі ўдзячныя Марыі Рэклеў за яе ўнёсак у раздзел, прысвечаны тэме вырашэння канфліктаў, і ўсім тым, хто чытаў і каментаваў наш рукапіс. Вялікі дзякуй Гюн Бьёрнсэн, Эрыку Клевен, Інге Айдсвог, Марыт Хярнэс, Гюнару М. Карлсану, Лавілін Брэнна Кумар, Шчашці Лофтхюснэс і Інгер Даа Квале. Адказнасць жа за ўсё напісанае ў гэтай кнізе ляжыць на нас, аўтарах.

*Энвер Джуліман і Ліліян Юрт*
*Осла, 12 чэрвеня 2007 года*



## ПРАДМОВА ДА БЕЛАРУСКАГА ВЫДАННЯ

Веданне грамадзянамі сваіх правоў — адзін з інструментаў уплыву на агульную сітуацыю з іх выкананнем ў краіне. Зыходзячы з гэтага пераканання, беларускія праваабаронцы адным з прыярытэтных накірункаў сваёй дзейнасці заўсёды лічылі адукацыю і асвету ў галіне правоў чалавека.

Мы ўпэўнены, што, каб ведаць, што такое правы чалавека, недастаткова прачытаць або вывучыць Усеагульную дэкларацыю ці іншыя дакументы, якія іх гарантуюць, а таксама механізмы, якія забяспечваюць іх функцыянаванне. Толькі зразумеўшы, які сэнс закладзены ў гэтых дакументах і як гэта можа прымяняцца на практыцы ў канкрэтных сітуацыях, а таксама ўсвядоміўшы, як гэта павінна прымяняцца, можна атрымаць сапраўднае ўяўленне, што стаіць за выразам «правы чалавека» і які гэта мае ўплыў на жыццё кожнага з нас. Таму адукацыйная праца, безумоўна, важная не толькі з пункту гледжання распаўсюду ведаў пра правы чалавека, асноўныя дакументы ў гэтай галіне, сістэмы і механізмы іх абароны, але і атрымання ўдзельнікамі практычных навыкаў — для ўжывання ў паўсядзённым жыцці, прымянення ў прафесійнай і грамадскай дзейнасці.

Неабходна адзначыць, што ў аснову адукацыйнай дзейнасці закладзены найперш каштоўнасны падыход: важна, каб у людзей выхоўваліся адносіны і паводзіны павагі да правоў іншых людзей, разуменне неабходнасці дыялогу паміж прадстаўнікамі розных культур і асобамі розных поглядаў. Таксама важна выхаванне пачуцця справядлівасці і адказнасці за свае дзеянні, непрымання парушэння правоў іншых людзей і пагарды да іх чалавечай годнасці. Наш вопыт паказаў, што пры падобным падыходзе ва ўдзельнікаў адукацыйных праграм фарміруецца патрэба ў асабістай актыўнай пазіцыі, матывацыя да ўласнай практычнай дзейнасці па абароне правоў чалавека і грамадскіх інтарэсаў.

Такім чынам, для нас навучанне правам чалавека — гэта навучанне не толькі таму, што такое правы чалавека, але і таму, што трэба рабіць у інтарэсах правоў чалавека.

Адукацыйная праца беларускіх праваабаронцаў грунтуецца на педагогіцы актыўнага ўдзелу кожнага ўключанага ў працэс навучання — праз розныя формы і метадычныя падыходы. Такая ж канцэпцыя ляжыць у аснове навучання правам чалавека нашых калег з Нарвежскага Хельсінкскага Камітэта Энвера Джулімана і Ліліян Юрт, якія абагульнілі свой шматгадовы вопыт выкладчыцкай дзейнасці ў кнізе «Будуйце масты, не сцены. 97 практыкаванняў па тэмах: правы чалавека, міжкультурнае ўзаемаразуменне і мірнае вырашэнне канфліктаў». Выдаючы гэтую кнігу на беларускай мове, мы ўпэўнены, што яна стане важным унёскам у развіццё і далейшае ўдасканаленне працы ў сферы навучання правам чалавека ў нашай краіне. Мы разлічваем, што выкладзеныя матэрыялы будуць карыснымі ў выкладчыцкай працы як праваабаронцаў, так і прадстаўнікоў іншых асветніцкіх арганізацый, настаўнікаў, журналістаў і іншых зацікаўленых людзей Беларусі. Мы спадзяемся, што дзякуючы гэтай кнізе пашырыцца кола людзей, якія будуць задзейнічаны ў распаўсюдзе ведаў і каштоўнасцяў правоў чалавека, і яна стане ім добрым памочнікам у гэтай справе.

За працу над выданнем кнігі на беларускай мове і набліжэнне яе зместу да беларускага кантэксту асаблівая ўдзячнасць выказваецца праваабаронцам Алесю Бяляцкаму (старшыня Праваабарончага цэнтра «Вясна») і Юрыю Чавусаву (Асамблея няўрадавых дэмакратычных арганізацый).

*Таццяна Рэвяка, Праваабарончы цэнтр «Вясна»*





# РАЗДЗЕЛ 1

## Навучанне правам чалавека, міжкультурнаму ўзаемаразуменню і вырашэнню канфліктаў

Кожны дзень у свеце з'яўляюцца на свет больш за дзве тысячы дзяцей. Прыходзячы ў гэты свет, яны не валодаюць якой-небудзь мовай, культурай, мараллю або ведамі. З гадамі яны будуць выхоўвацца і навучацца, каб у адзін цудоўны дзень стаць бацькамі, настаўнікамі, фермерамі ці паліцэйскімі.

Народжаныя дзеці ведаюць аб тэорыі адноснасці, генетыцы ці правах чалавека столькі ж, колькі ведалі дзеці, якія нарадзіліся ў каменным веку. Іншымі словамі, нічога. Усяму трэба вучыцца. Нарвежскі настаўнік і пісьменнік Інге Айдсвог сказаў аднойчы, што людзі, у адрозненне ад жывёл, нараджаюцца, каб стаць кімсьці. Усе іншыя жывыя істоты нараджаюцца згодна з прадвызначэннем і загадзя «запраграмаваныя». Дай ім святло і ежу, і яны вырастуць такімі, якімі і павінны былі вырасці. Такім чынам, кацяня становіцца коткай/катом, ягня — авечкай/бараном. Чалавек жа, у сваю чаргу, нараджаецца, каб стаць кімсьці. Тады ўжо іншыя людзі, якія акружаюць нас, — гэта тыя, хто нас фарміруе. Кожнае новае пакаленне павінна ўсё спазнаваць спачатку. І таму нам выбіраць, якія веды атрымаюць нашы дзеці[1].

Кажуць, што сучасныя людзі — асы ў веданні тэхналогій. Што датычыць маралі, то тут можна вельмі моцна сумнявацца, як далёка людзі прасунуліся ў сваім развіцці. Стагоддзе, калі людзі заваявалі касмічную прастору і прызямліліся на Месяцы, было адначасова самым крывавым стагоддзем у гісторыі чалавецтва. Ніколі ў гісторыі не было забіта столькі людзей. Так што небяспечна валодаць сакрэтамі тэхналогіі, не валодаючы маральнымі кодэксамі. Таму самая складаная задача сучаснага свету — навучыць дзяцей будаваць мірныя і справядлівыя грамадствы.

Школа і іншыя сацыяльныя ўстановы не могуць таму, па нашым меркаванні, быць нейтральнымі арэнамі. У іх, наадварот, акцэнт на этычныя і агульначалавечыя прынцыпы павінен быць мацнейшым. Гэтак жа, як неабходны дзіцяці ўменні чытаць і пісаць, яму неабходны веды аб удзеле ў дэмакратычных працэсах жыцця грамадства. Тэмы дадзенай кнігі даюць такія веды, аснова якіх — вера ў чалавечую годнасць і ў тое, што паміж людзьмі больш падабенстваў, чым адрозненняў.

Чаму мы вырашылі гаварыць аб правах чалавека, міжкультурным узаемаразуменні і спосабах вырашэння канфліктаў у адной кнізе? Адказ просты: гэтыя тэмы дапаўняюць адна адну і адлюстроўваюць розныя падыходы да таго, як мы, звычайныя грамадзяне, можам ствараць годныя ўмовы жыцця і добрыя грамадствы.

Правы чалавека — гэта тыя каштоўнасці, якія павінны паважацца ўладамі і грамадзянамі. Правы чалавека — гэта краевугольны камень і нашай кнігі. З прыняццем Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека 10 снежня 1948 года ўпершыню ў гісторыі была дасягнута згода ў свеце аб асноўных нормах жыцця грамадства і этычных прынцыпах, якія рэгулююць адносіны паміж грамадзянамі і прадстаўнікамі дзяржаўнай улады. У іх цэнтры — годнасць чалавека і раўнапраўе: незалежна ад таго, адкуль чалавек родам і якое ў яго/яе паходжанне, ва ўсіх людзей роўныя правы. З'яўляючыся членамі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый і падпісаўшы міжнародныя дамовы, дзяржавы абавязваюцца выконваць правы сваіх грамадзян.

Правы чалавека — правы людзей і абавязкі дзяржавы.

Правы чалавека — гэта таксама юрыдычныя абавязацельствы. Аднак яны могуць быць пакладзены ў аснову этычных норм, што і падкрэсліваецца ва Ўсеагульнай дэкларацыі правоў чалавека[2]. Правы даюць чалавеку свабоду, але і патрабуюць ад яго адказнасці. Кажуць: «Твая свабода размахваць кулаком абмежаваная носам твайго суседа». І гэта не проста прыгожы вобраз. Тут маецца на ўвазе натуральны механізм суіснавання свабодных людзей: бо ў суседа маецца не толькі нос, але і такія ж свабодныя рукі, як у цябе. А значыць, адваротны бок свабоды — усведамленне адказнасці за наступствы яе ажыццяўлення. Калі хтосьці парушае маё права, значыць, ён павінен памятаць, што за свой учынак ён абавязкова тым або іншым чынам будзе несці адказнасць (прынамсі, так павінна адбывацца ў праватой дзяржаве). Дамагаючыся выканання сваіх правоў, ён (яна) павінны, у сваю чаргу, паважаць правы іншых людзей. Таму правы чалавека прадугледжваюць павагу, цярпімасць і салідарнасць.

*Усе людзі нараджаюцца свабоднымі і роўнымі ў сваёй годнасці і правах. Яны надзелены розумам і сумленнем і павінны ставіцца адзін да аднаго ў духу брацтва (Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека, арт. 1)*

Універсальнасць правоў чалавека не робіць іх невыразнымі. Хутчэй, наадварот: яны ўяўляюць сабой дакладныя каштоўнасці і прынцыпы, якія вызначаюць межы дзеянняў асобна ўзятага чалавека. Тыя элементы ў культурах, якія нясуць за сабой нецярпімасць, дыскрымінацыю і знявагу, заўсёды сустрэнуць адпор з боку правоў чалавека. Самая вялікая каштоўнасць — гэта павага годнасці чалавека. Таму абарона права быць іншым, непадобным і павага да разнастайнасці і шматкультурнасці — два бакі адной манеты.

Няма нічога няправільнага ў тым, каб быць «іншым».
Няправільна, калі да цябе ставяцца «па-іншаму».

Правы чалавека ўяўляюць сабой агульны юрыдычны і нарматыўны арыенцір для ўсіх краін. Гэта сучасныя каштоўнасці, створаныя для ўсё

большай колькасці міжкультурных грамадстваў, а ў цяперашні час — па ўсім свеце. Аднак дагэтуль межы чалавечых этычных і маральных супольнасцяў часта супадаюць з межамі іх нацыянальнай, этнічнай і рэлігійнай прыналежнасці. Гэта можа пацягнуць за сабой канфлікты і сілавое ўмяшальніцтва як унутры краін, так і на міжнародным узроўні. Універсальнасць правоў чалавека здольная вывесці нас за вузкія рамкі «абмежаванасці» і спрыяць стварэнню адзінай перспектывы мыслення.

Аднак афіцыйныя законы не будуць дзейнічаць, калі насельніцтва іх не прымае. Для таго, каб стварыць рэальную культуру правоў чалавека, неабходна выкарыстоўваць такія механізмы, як міжкультурнае ўзаемаразуменне і ўменне вырашаць канфлікты. Так, прафесіяналізм павышае нашу здольнасць паспяхова функцыянаваць і ўдзельнічаць у дэмакратычных працэсах, на якіх будуецца сучаснае грамадства.

*Міжкультурнае ўзаемаразуменне* нацэлена на «чалавека ў грамадстве» і на працэсы, што дзейнічаюць у міжасабовых адносінах. Асэнсоўваючы шматлікія і складаныя прычынна-выніковыя сувязі, якія фарміруюць нас, мы пачынаем лепш разумець сябе і фарміруем, такім чынам, больш шырокую аснову для разумення іншых людзей. Калі мы схільныя да катэгарызацыі людзей і дзялення іх на групы, нам лягчэй зразумець, як узнікаюць стэрэатыпы і забабоны, як адбываецца дыскрымінацыя. Гэтае разуменне вучыць нас бачыць у людзях індывідаў, а не толькі членаў якіх-небудзь груп; і вучыць нас быць больш адкрытымі ў адносінах да саміх сябе і іншых людзей.

*Вырашэнне канфліктаў* дае нам зразумець, што мы можам кіраваць сваімі жыццямі і міжасабовымі адносінамі. Канфлікты з'яўляюцца неад'емнай часткай нашага жыцця і неабходнай умовай прагрэсу. Канфлікты з'яўляюцца, як правіла, выражэннем адносін, якія маюць патэнцыял да паляпшэння. Аднак нярэдка мы бачым, што яны маюць негатыўныя наступствы. Уменне спраўляцца з канфліктамі спрыяе асабістаму росту і сацыяльнаму прагрэсу. Важнейшым станоўчым момантам у вырашэнні канфліктаў з'яўляецца тое, што канфлікты дазваляюць нам усвядоміць наступствы ўласных паводзін і, такім чынам, узброіць нас ведамі і ўменнямі.

Правы чалавека, міжкультурнае ўзаемаразуменне і вырашэнне канфліктаў не з'яўляюцца ў гэтым сэнсе каштоўнасна-нейтральнымі. Наадварот, у іх ёсць мэта — паўплываць на «чалавека як цэласнасць» і сфармаваць стаўленне, якое гармануе з уяўленнямі аб каштоўнасці чалавека і раўнацэннасці ўсіх людзей. Разумеючы гэта, мы пазнаем свет такім, якім ён ёсць, а таксама бачым, якім ён мог бы быць.



## Навучальная дысцыпліна ў развіцці

Навучанне правам чалавека, міжкультурнаму ўзаемаразуменню і вырашэнню канфліктаў — даволі «маладая» вобласць, якая перажывае бурны рост і развіццё ў апошнія гады. Навучанне правам чалавека, як акадэмічнае паняцце, упершыню было выкарыстана ў сярэдзіне 1980-х гадоў, адначасова з павышэннем увагі да ролі правоў чалавека для развіцця дэмакратыі і дасягнення міру. З тых часоў мноства дзяржаўных і недзяржаўных устаноў і арганізацый заявілі аб прызнанні важнасці такога навучання для выхавання цярпімасці і павагі да чалавечай годнасці і агульначалавечых каштоўнасцяў.

І ААН, і Савет Еўропы, і Еўрапейскі Саюз сфармавалі сваю палітыку ў дадзенай галіне. Перыяд з 1994-га па 2004 г. быў абвешчаны «Дзесяцігоддзем ААН па навучанні правам чалавека». У 2005 г. пачалася «Сусветная праграма ААН па навучанні правам чалавека», у якой утрымоўваецца заклік да дзяржаў укараняць навучанне правам чалавека як у школьныя праграмы, так і ў жыццё грамадства ў цэлым:

> *Міжнародная супольнасць няўхільна выказвае згоду з нагоды фундаментальнай значнасці навучання правам чалавека для рэалізацыі правоў чалавека. Навучанне правам чалавека нацэлена на развіццё разумення нашай агульнай адказнасці за тое, каб зрабіць правы чалавека рэальнасцю ў кожнай супольнасці людзей і ў грамадстве ў цэлым. У гэтым сэнсе яно робіць унёсак у доўгатэрміновае недапушчэнне парушэння правоў чалавека і канфліктаў з прымяненнем сілы, сцвярджэнне роўнасці і ўстойлівага развіцця і павышэнне ўдзелу грамадзян у працэсе прыняцця рашэння ў дэмакратычнай сістэме (…)*[3]

Правы чалавека пакладзены ў аснову школьнай адукацыі ў Нарвегіі. Як у пачатковай, так і ў старэйшай школы ёсць мэта — даць навучэнцам веды аб правах чалавека. Прынцыпы правоў чалавека пакладзены ў аснову методыкі выкладання астатніх прадметаў.

> *Мэта (...) спрыяць разуменню і падтрымцы асноўных правоў чалавека, прынцыпаў дэмакратыі, раўнапраўя і актыўнага ўдзелу ў жыцці грамадства*[4]

Метадычныя прыёмы і асяроддзе навучання — вельмі важныя для такога выкладання, што і падкрэсліваецца ААН:

> *Выкладанне ў галіне правоў чалавека выходзіць за межы разумовага навучання і ўключае ў сябе сацыяльнае і эмацыйнае развіццё ўсіх залучаных у працэс навучання. Мэта гэтага — развіццё культуры правоў чалавека, у якой правы чалавека практыкуюцца ў жыцці школы і праз зносіны з навакольным сацыяльным асяроддзем*[5].

*Пра стан фармальнай і нефармальнай адукацыі ў галіне правоў чалавека ў Беларусі глядзіце ніжэй.*

Многія грамадскія арганізацыі былі піянерамі ў выкарыстанні выкладання правоў чалавека ў сваёй працы і распрацоўцы методык выкладання. Такое выкладанне было важным, незалежна ад таго, ці была засяроджана праца той або іншай арганізацыі ў зонах ваеннага канфлікту, недэмакратычнай дзяржавы або ў сучасных гарадах-мегаполісах. Дзейнасць арганізацый, што абапіраецца на рэчаіснасць і практычную працу, спрыяла распрацоўцы інавацыйных методык. Паколькі мэтай была праца, накіраваная на стварэнне станоўчых установак ва ўзаемаадносінах паміж людзьмі, педагогіцы актыўнага ўдзелу аддавалася ўсё большая перавага. Наш вопыт паказвае, што людзі фармуюць свае адносіны не праз тэарэтычныя веды і завучванні матэрыялу, а з дапамогай актыўнага ўдзелу, дыскусій, абмеркаванняў, асэнсаванняў і практычных заняткаў.

Як ты вывучаеш — настолькі ж важна, як і што ты вывучаеш.

### Гэта працуе

Мэта гэтай кнігі — распаўсюд ведаў і фармаванне адносін і механізмаў паводзін людзей. Нам, аўтарам, вельмі хацелася б падкрэсліць важнасць пазітыўнага настрою ў працы з дзецьмі і вучнямі. Дзейсная сіла станоўчых прыкладаў і жыццёвых гісторый незаменная, паколькі можа здавацца, што сённяшнія праблемы непераадольныя, аднак прагрэс у многіх абласцях усё ж ёсць.

Чым далей мы звернемся ў гісторыю, тым лягчэй выявіць прыклады пазітыўнага развіцця. Дзвесце гадоў таму гарачая дыскусія вялася з нагоды адмены рабства. З пазіцый сённяшняга дня такая дыскусія ўсё больш і больш абсурдная. Іншы прыклад даволі радыкальных зменаў — становішча жанчын. Усяго толькі сто гадоў таму ў многіх краінах свету ў жанчын не было права галасаваць. Сёння дзяржавы, дзе жанчынам не дазволена галасаваць, выключэнні з правіл. Агульная тэндэнцыя ў тым, што жанчыны ўсё больш і больш прымаюць удзел у палітычным, эканамічным і грамадскім жыцці. Ёсць шмат і іншых прыкладаў: павялічваецца працягласць жыцця; дзіцячая смяротнасць за апошнія дзесяцігоддзі скарочана напалову; ніколі яшчэ не было так шмат дзяцей, у якіх ёсць магчымасць хадзіць у школу і атрымліваць адукацыю; у 1971 годзе налічвалася 41 дэмакратычная дзяржава, сёння іх — больш за 125; колькасць людзей, якія загінулі падчас узброеных канфліктаў, менш, чым у мінулыя часы; шанцы таго, што людзі будуць жыць у стане канфліктаў і войн, усё ж меншыя сёння, чым калі-небудзь[6].



Хоць і назіраецца прагрэс, вялікія нявырашаныя праблемы застаюцца: галеча, масавыя парушэнні правоў чалавека (няма ніводнай краіны, у якой наогул не было б праблем з рэалізацыяй правоў), наступствы эпідэмій, стыхійных бедстваў, недэмакратычныя палітычныя рэжымы і змаганне з тэрарызмам, нераўнамернае размеркаванне ў свеце багацця і матэрыяльных рэсурсаў. І для чалавека, які знаходзіцца ў адной з такіх складаных сітуацый, прагрэс чалавечага развіцця на сусветным узроўні — даволі невялікае суцяшэнне. Больш таго, калі адны мэты дасягнуты ў грамадстве, прыярытэты развіцця змяняюцца як для асобных людзей, так і для грамадства ў цэлым. Пабудова годнага жыцця, магчыма, бясконцы працэс.

Але шмат міль яшчэ прайсці і абяцанні стрымаць мне трэба... (Роберт Фрост)

Стварэнне культуры правоў чалавека — самая важная інвестыцыя грамадства, накіраваная на забеспячэнне справядлівасці, міру і развіцця. У адрозненне ад такіх рэсурсаў, як нафта, газ і рыба, дадзеных нам прыродай, культура міжчалавечых адносін павінна стварацца. Пазітыўнае развіццё адносін не адбываецца само па сабе. Як мы ўжо адзначалі, людзі нараджаюцца для таго, каб стаць кім-небудзь, і ўсе мы ўплываем адзін на аднаго. Таму ва ўсіх нас ёсць адказнасць. Добрыя ўчынкі выратуюць свет: не грандыёзныя і час ад часу а маленькія і кожны дзень.

Мы вырашылі назваць кнігу «Будуйце масты, не сцены». У назве ёсць пасыл, які звяртае ўвагу на тое, што мы самі вырашаем, як нам быць і якую рэчаіснасць ствараць.

Людзі на працягу ўсёй гісторыі ўзводзілі сцены і будавалі масты для таго, каб іх пасля разбурыць. У той час, як у Германіі ў 1989 годзе на хвалі заканчэння халоднай вайны была разбурана Берлінская сцяна, у іншай частцы свету, на Блізкім Усходзе, будуецца праз некалькі гадоў іншая, яшчэ даўжэйшая. Калі-небудзь упадуць і гэтыя сцены. Ніхто не ведае, калі гэта адбудзецца. Але адно відавочна: гэта не адбудзецца само па сабе. Сцены падаюць толькі ў тым выпадку, калі таго хочуць людзі. А пакуль гэта здарыцца, многія людзі працуюць над тым, каб будаваць масты — масты паміж людзьмі.

Мы спадзяемся, што гэтая кніга зробіць свой унёсак у пабудову такіх «мастоў».

# Адукацыя ў галіне правоў чалавека для дзяцей і моладзі ў Беларусі

Дзейнасць у сферы фармальнага і нефармальнага навучання правам чалавека, пачынаючы з 1990 года па сённяшні час, развівалася ў Беларусі вельмі нераўнамерна. З пэўнай доляй умоўнасці гэты перыяд можна падзяліць на тры часовыя адрэзкі:

- пачатак 90-х — усведамленне сутнасці ідэі правоў чалавека, правоў дзіцяці і неабходнасці яе прапаганды;
- 1995—2004 гг. — росквіт і пад'ём адукацыі ў сферы правоў чалавека, правоў дзіцяці;
- 2005—2008 гг. — спад і згасанне цікавасці да праблемы.

У першы выдзелены перыяд, на які прыходзіцца прыняцце Дэкларацыі аб незалежнасці рэспублікі (1991 г.) і Канстытуцыі краіны (1994 г.), шэрагу асноватворных законаў, у тым ліку «Аб адукацыі» (1991 г.), «Аб правах дзіцяці» (1993 г.), былі закладзены нарматыўныя падмуркі рэалізацыі правоў чалавека, правоў дзіцяці ў Беларусі. Аднак з-за рэзкага зніжэння ўзроўню жыцця насельніцтва і мноства праблем у сацыяльнай сферы, навучанню правам чалавека ў гэты перыяд не ўдзялялася асаблівай увагі. Разам з тым, пачынаючы з 1993 года, стваруюцца грамадскія аб'яднанні, якія ставяць сабе за мэту распаўсюджванне ідэі абароны правоў чалавека ў краіне, а ў некаторых установах адукацыі з'яўляюцца першыя парасткі навучання правам чалавека.

Асаблівае месца сярод передумоваў актывізацыі ў Беларусі працы па распаўсюду ведаў аб правах чалавека належыць ратыфікацыі Канвенцыі ААН аб правах дзіцяці (1989 г.). Як вядома, у гэтым важнейшым міжнародным дакуменце асобным артыкулам падкрэслена, што дзяржавы-ўдзельніцы пасля ратыфікацыі абавязаны стварыць сістэму ўвядзення правоў дзіцяці ў грамадскую свядомасць і побытавую практыку, у тым ліку праз установы адукацыі.

Варта падкрэсліць, што Рэспубліка Беларусь першай на постсавецкай прасторы прыняла Закон «Аб правах дзіцяці» (1993 г.), а годам пазней — Нацыянальны план дзеянняў па абароне правоў дзіцяці на 1995—2000 гады, у якім выкладзена праграма шырокага распаўсюду ведаў аб правах дзіцяці, згодна з якой працэсам азнаямлення неабходна ахапіць усю грамадскасць рэспублікі.

Асаблівага ўзгадвання заслугоўвае масавая асветніцкая праграма, праведзеная згодна з зацверджаным Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 15.01.1998 года Планам мерапрыемстваў па святкаванні 50-годдзя прыняцця Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека (1948 г.). Пералік мерапрыемстваў уключаў выданне і шырокі распаўсюд тэкста самога дакумента, а таксама адпаведнай літаратуры, правядзенне ўсемагчымых акцый інфармацыйнага характару. Акрамя таго, да знамянальнай даты было прымеркавана правядзенне ў чэрвені 1998 года парламенцкіх слуханняў на тэму «Праблема правоў чалавека», якія завершыліся прыняццем значных рашэнняў. Так, у рэкамендацыях Нацыянальнага сходу Міністэрству адукацыі была падкрэслена важнасць выхавання ў духу правоў чалавека і было прапанавана распрацаваць:

а) абавязковы курс «Правы чалавека» для вышэйшых, сярэдніх спецыяльных і прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў, сярэдніх школ;

б) цыкл лекцый, якія маюць на мэце развіццё палітычнай свядомасці маладых людзей;

в) дапаможнікі, а таксама наладзіць выпуск плакатаў, дыяфільмаў і буклетаў з адаптаванымі тэкстамі юрыдычных дакументаў, разлічанымі на дзіцячае ўспрыманне.

Асабліва паспяховым і выніковым у сферы правоў чалавека стаў у рэспубліцы час з 1995-га па 2004 год. Праўда, указаны перыяд таксама можна ўмоўна падзяліць на 2 этапы згодна з дзеяннямі кіруючых прынцыпаў: 1) «дазволена ўсё, што не забаронена» (да 1998 года) і 2) «забаронена ўсё, што не дазволена». На жаль, менавіта на другі этап прыходзіцца ўвядзенне ў дзеянне Нацыянальнага плана развіцця адукацыі ў галіне правоў чалавека ў Рэспубліцы Беларусь на 1999—2004 гады» (зацверджаны пастановай Савета Міністраў ад 15.03.1999 г.). Аднак дакумент усё ж адыграў станоўчую ролю, выклікаўшы масавы ўсплеск цікавасці да правоў чалавека, правоў дзіцяці ў вялікай колькасці людзей, асабліва ў прафесіяналаў.

Падкрэслівалася, што мэтай плана з'яўляецца ажыццяўленне дадатковых мер дзяржаўных органаў і грамадскіх арганізацый па далейшым развіцці адукацыі ў галіне правоў чалавека на 1999—2004 гады, рэалізацыя ў Беларусі рэзалюцыі Генеральнай Асамблеі ААН ад 23 снежня 1994 года «Дзесяцігоддзе адукацыі ў галіне правоў чалавека». У цэлым планам прадугледжвалася вырашэнне наступных задач:

- стварэнне кожнаму дзіцяці і даросламу шырокіх магчымасцяў для азнаямлення са зместам палажэнняў Міжнароднага біля аб правах чалавека, Канвенцыі аб правах дзіцяці, Закона Рэспублікі Беларусь «Аб правах дзіцяці», іншых міжнародных і нацыянальных актаў у галіне правоў чалавека;
- стварэнне разгалінаванай і шматступенчатай сістэмы адукацыі ў галіне правоў чалавека, выкарыстанне для гэтай мэты розных форм вывучэння палажэнняў міжнародных дакументаў у галіне правоў чалавека ў навучальным працэсе і ў па-закласнай дзейнасці;
- стварэнне спрыяльных умоваў для выкладчыкаў спецкурсаў «Правы чалавека» і «Правы дзіцяці», іншых педагогаў, кіраўнікоў навучальных устаноў шляхам выдання навучальна-метадычнай літаратуры, правядзення тэлеўрокаў, апублікавання матэрыялаў пра лепшы нацыянальны і замежны вопыт;
- шырокі ўдзел дзяржаўных органаў і грамадскіх аб'яднанняў у развіцці адукацыі ў галіне правоў чалавека;
- пашырэнне супрацоўніцтва са структурамі ААН, АБСЕ, Савета Еўропы, з іншымі краінамі па пытаннях развіцця адукацыі ў галіне правоў чалавека.

Быў распрацаваны шырокі і дэтальны пералік дзеянняў па стварэнні

фундаментальнай сістэмы адукацыі ў галіне правоў чалавека, які быў канкрэтызаваны ў Працоўным плане Міністэрства адукацыі і стаў ажыццяўляцца. Аднак пасля заканчэння ў 2004 годзе дзеяння Нацыянальнага плана актыўная і сістэматычная дзейнасць дзяржавы па ажыццяўленні адукацыі ў галіне правоў чалавека практычна была згорнута. Хаця варта адзначыць, што асобныя аспекты асветы ў галіне правоў чалавека, правоў дзіцяці (хаця і без неабходнай сістэмнасці) уключаны ў Нацыянальны план дзеянняў па паляпшэнні становішча дзяцей і абароне іх правоў на 2004—2010 гады, Прэзідэнцкую праграму «Дзеці Беларусі» на 2006—2010 гады і План мерапрыемстваў па прававой асвеце грамадзян на 2007—2010 гады.

На працягу трэцяга вылучанага перыяду адбываецца спад і згасанне цікавасці да праблемы адукацыі па правах чалавека, перш за ўсё ў прадстаўнікоў дзяржаўнага сектару. Як вынік, звесткі аб правах чалавека, правах дзіцяці практычна цалкам выцясняюцца з навучальна-выхаваўчага (адукацыйнага) працэсу, у школах спыняецца выкладанне аднайменных спецкурсаў. Так, у зацверджанай у 2008 годзе праграме абавязковага прадмета «Грамадазнаўства» толькі для пераходнага 9-га класа (толькі для 2008/09 навучальнага года) прадугледжана знаёмства з тэмай «Правы чалавека». Гэта азначае, што ў будучым старшакласнікам увогуле не будуць давацца веды па праблеме.

Што датычыць ВНУ і некаторых іншых навучальных устаноў, то з-за змяншэння гадзін, якія выдзяляюцца на прадметы гуманітарнага цыкла, як правіла, скарачэнню падвергліся менавіта курсы па правах чалавека.

Акрамя таго, практычна зварочваецца афіцыйнае супрацоўніцтва фармальнага і нефармальнага сектараў у сферы адукацыі ў галіне правоў чалавека, якое зноўку пачынае набываць адценне дысідэнцтва, нечага супрацьзаконнага, што парушае канстытуцыйны лад краіны.

Між тым адукацыя ў галіне правоў чалавека, асабліва ў нефармальным сектары, мае на сённяшні дзень для Беларусі асаблівае значэнне, паколькі праграмы патрыятычнага і ідэалагічнага выхавання, уведзеныя на дзяржаўным узроўні, адвучаюць моладзь думаць крытычна. Гэта асабліва датычыць рэгіёнаў, дзе мала сродкаў масавай інфармацыі і няма магчымасці да свабоднага доступу да сеткі Інтэрнэт.

## Адукацыйныя праграмы па розных аспектах правоў чалавека ў нефармальным сектары

У Беларусі ў шэрагу нарматыўна-прававых дакументаў (п. 4 Указа Прэзідэнта № 300 ад 01.07.2005 г.) забаронена правядзенне семінараў за кошт бязвыплатнай (спонсарскай) дапамогі і практычна прыроўнена да «ажыццяўлення дзейнасці, накіраванай на змяненне канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь, захоп ці звяржэнне дзяржаўнай улады». Таму тэматыка праектаў, звязаных з правамі чалавека, звычайна фармулюецца як накіраваная на больш агульную і нейтральную грамадзянскую адукацыю.

Спецыфічным для Беларусі з'яўляецца і тое, што адукацыя па правах чалавека ў нефармальнай сферы нярэдка ўспрымаецца ўладамі нібы яна мае палітычнае адценне, паколькі часта ажыццяўляецца аб'яднаннямі, якія вядуць актыўную праваабарончую дзейнасць і таму знаходзяцца ў канфрантацыі з дзяржаўнымі структурамі.

У цэлым, з пэўнай доляй умоўнасці, большасць недзяржаўных арганізацый, якія займаюцца адукацыяй у галіне правоў чалавека, можна падзяліць на 2 групы. У першую ўваходзяць арганізацыі, якія ажыццяўляюць грамадзянскую адукацыю ў шырокім сэнсе гэтага тэрміна, але разам з тым закранаюць аспекты правоў чалавека ў сваёй дзейнасці: грамадскае аб'яднанне «Адукацыйны цэнтр «ПОСТ», асветніцкае грамадскае аб'яднанне «Фонд імя Льва Сапегі», гарадское грамадскае аб'яднанне «Цэнтр «Супольнасць», грамадскія аб'яднанні «Жаночы незалежны дэмакратычны рух», «Фонд «Адкрытае грамадства», ГА «Фокус-група» і інш. У другую — аб'яднанні, якія рыхтуюць спецыялістаў і ажыццяўляюць спецыялізаванае асветніцтва ў сферы правоў чалавека, правоў дзіцяці: Гродзенскае абласное грамадскае аб'яднанне маладых навукоўцаў «ВІТ», Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Асацыяцыя клубаў ЮНЕСКА», Праваабарончы цэнтр «Вясна», Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Беларускі Хельсінкскі камітэт», Беларускі Дом правоў чалавека, Фонд развіцця прававых тэхналогій і інш.

У якасці найбольш эфектыўных адукацыйных форм варта адзначыць працу спецыяльных тэматычных школ для адрасных груп з адрывам удзельнікаў на 1—3 тыдні ад асноўнай працы.

(Паводле агляду, падрыхтаванага Л.І. Смагінай і А.С. Чарняўскай у межах праекта Бюро АБСЕ і Еўрапейскай камісіі)

---

1 Інге Айдсвог: Спачатку чалавек, Utdanningsdirektoratet 2004

2 У артыкуле 26(2) гаворыцца, што «Мэта навучання — спрыяць развіццю асобы чалавека і ўмацаванню каштоўнасцяў правоў чалавека і асноўных свабод. Яно павінна ствараць разуменне, цярпімасць і сяброўства паміж народамі і рознымі этнічнымі, рэлігійнымі групамі і падтрымліваць такім чынам працу ААН па ўмацаванні міру на Зямлі».

3 З Сусветнай Праграмы ААН «Аб выкладанні правоў чалавека» (арт.3) www.ohchr.org/english/issues/education/training/programme.htm

4 З «Плана выкладання грамадскіх навук» для пачатковай і старэйшай школы ў Нарвегіі. З восені 2007 г. у школах уведзены новы прадмет з асаблівай увагай да правоў чалавека «Палітыка і правы чалавека» ў Навучальнай праграме прадмета «Палітыка, асоба і грамадства» (vg2), і ў трохгадовай навучальнай праграме прадмета «Грамадскія навукі і эканоміка» (vg1, vg2, vg3). Правы чалавека з'яўляюцца таксама важным кампанентам прадмета «Рэлігія, грамадства і этыка»

5 Сусветная Праграма ААН «Аб выкладанні правоў чалавека» 2005, стар. 22

6 Артыкул прэм'ер-міністра Енса Сталтэнберга, часопіс «Сучаснасць» (Samtiden), 3/ 2006






# РАЗДЗЕЛ 2

## Педагагічны аспект

Дадзеная кніга напісана зыходзячы з пазіцый гуманнасці. Тых пазіцый, дзе свабода, годнасць і адказнасць — галоўныя каштоўнасці і дзе мэтай з'яўляецца цэласнае развіццё асобы. Навучанне зыходзіць з таго, што ўсе ўдзельнікі раўнацэнныя і што індывідуальныя адрозненні і патрэбы варта прымаць і паважаць. Неабходна імкнуцца да таго, каб зразумець унікальнасць кожнага. Ніхто не павінен быць «узнесены» над іншымі, настаўнік у тым ліку. Настаўніку варта замест гэтага ўзяць на сябе ролю арганізатара і «першага сярод роўных».

Педагогіка актыўнага ўдзелу як метад добра ўпісваецца ў кантэкст гуманістычнай перспектывы. Пры выкарыстанні гэтага метаду вялікая роля адводзіцца стасункам і ўзаемадзеянню. Роля аднабаковай перадачы ведаў і выступы настаўніка з дакладамі, наадварот, мінімальныя. Навучанне адбываецца сумесна: вопыт і веды кожнага чалавека запатрабаваны і актыўна выкарыстоўваюцца. Значнасць сумеснага навучання засноўваецца на сацыяльным характары навучання. Веды, каштоўнасці, адносіны і адказнасць канструююцца з дапамогай узаемадзеяння ў кантэксце, а не толькі ў межах індывідуальных працэсаў. Кожны ўдзельнік — гэта «чалавек-у-дзейнасці» і «чалавек-у-сітуацыі».

Кожны чалавек адчувае свет па-свойму, таму важнай часткай сумеснага навучання будзе навучанне ўменню ўспрымаць пункты гледжання іншых. Гэта стварае асаблівую ўзаемазалежнасць, дзе кожны дзеліцца сваімі ведамі, і людзі вучацца адзін у аднаго. Такое навучанне таксама развівае камунікатыўныя здольнасці і дазваляе ўдзельнікам зразумець, што яны нясуць адказнасць за свой унёсак у агульную працу. Яшчэ адной заслугай гэтага метаду з'яўляецца тое, што ўдзельнікі добра пазнаюць адзін аднаго.

Для аптымальнага функцыянавання навучання, заснаванага на педагогіцы актыўнага ўдзелу, усе ўдзельнікі павінны ўспрымаць яго актуальным і значным. Каб дамагчыся гэтага, неабходна ўлічваць шэраг прынцыпаў. Гэтыя падыходы інтэграваны ў практыкаванні, але мы хацелі б акцэнтаваць на іх увагу і зараз.

Навучанне павінна быць арыентаваным на пачуцці. Гэта значыць, што чалавек вучыцца на сваіх уласных пачуццях, якія ён атрымлівае падчас выканання практыкаванняў, будзь то праца ў групах, ролевыя гульні, даследаванні, дыскусіі, разважанні, размінкі і г.д. Далей, навучанне павінна быць арыентаваным на вопыт, гэта значыць, асабістыя веды і вопыт удзельнікаў павінны актыўна выкарыстоўвацца. Калі веды і вопыт чалавека запатрабаваны, яму/ёй лягчэй займець новае разуменне і атрымаць новы вопыт. Навучанне павінна быць максімальна арыентаваным на рэчаіснасць праз стварэнне сувязяў з сучаснасцю і паўсядзённай жыццёвай сітуацыяй удзельнікаў. І, нарэшце, яно павінна быць арыентаваным на будучыню і разглядацца ў плане тварэння і фарміравання гатоўнасці да дзеяння. Такія складаныя тэмы, як расізм, дыскрымінацыя, забабоны, войны, канфлікты, голад і галеча, могуць быць важнымі і неабходнымі, але іх заўсёды варта прывязваць да магчымасцяў змен да лепшага.

Калі ўсе гэтыя пажаданні ўлічаны ў працэсе навучання, такое навучанне будзе добра ўспрымацца і прынясе шмат сэнсу. Калі ўдзельнікі навучання адчуваюць, што яны самі сябе рэалізуюць, гэта спрыяе працэсу сталення чалавека як асобы. Людзі растуць як асобы, калі іх усведамленне сябе больш не залежыць ад таго, як іх успрымаюць іншыя людзі, а толькі ад таго, як яны самі сябе ўспрымаюць. Чалавек, які сам сябе вызначае, здольны сам вырашаць у сваім жыцці і рабіць уласны выбар.

Часта кажуць, што мэта школьнай адукацыі — падрыхтаваць маладых людзей да будучага жыцця. Аднак важна памятаць і тое, што 15-гадовы падлетак ходзіць у школу не для таго, каб стаць дарослым, а якраз таму, што яму або ёй 15 гадоў.

## Практычная арганізацыя кнігі

97 практычных практыкаванняў кнігі пабудаваны па адным і тым жа прынцыпе. Спачатку называецца тэма практыкавання. Напрыклад: шматкультурнае грамадства; правы дзіцяці; глабалізацыя або канфлікт. Затым даецца апісанне мэты: чаму ўдзельнікі навучацца ў выніку навучання. Напрыклад: азнаёміць навучэнцаў з паняццем «шматкультурнае» і звярнуць іх увагу на тое, як шматкультурнасць выяўлена ў розных краінах і грамадствах; звярнуць увагу на тое, што дзеці з'яўляюцца «слабой (уразлівай) групай», якая патрабуе асаблівай абароны; даць веды і разуменне прычын глабалізацыі, форм яе выражэння і наступстваў; даць зразумець, што канфлікты могуць несці ў сабе магчымасці далейшага развіцця і г.д.

Далей у апісанні можа ісці тэкст, вылучаны аранжавым колерам. Мэта гэтага — паказаць, якім чынам дадзенае практыкаванне можна суаднесці з рэальнасцю за акном. У некаторых выпадках гэта могуць быць важныя азначэнні і фармулёўкі, якія могуць быць выкарыстаны выкладчыкам у прэзентацыі практыкавання.

Пад загалоўкам «**Практычная рэалізацыя**» даецца кароткае апісанне, якім чынам павінна быць арганізавана правядзенне практыкавання.

## Узрост

У сваёй большасці практыкаванні падыходзяць лепш за ўсё для маладых людзей: ад 14—15 гадоў і больш. Многія могуць быць зменены і выкарыстоўвацца для дзяцей малодшага ўзросту — ад 10 гадоў. Практыкаванні таксама падыходзяць для студэнтаў і дарослых. Мы праводзілі паспяховае навучанне настаўнікаў, журналістаў, актывістаў «трэцяга сектара».

## Група

Ідэальная колькасць чалавек у групе — ад 15 да 20. Кожны ўдзельнік будзе мець магчымасць актыўна ўдзельнічаць у працэсе навучання. Хоць многія практыкаванні могуць праводзіцца і для большай аўдыторыі, да 30 чалавек.

## Час

Працягласць практыкаванняў — ад 30 хвілін да некалькіх гадзін. Час, неабходны для выканання практыкавання, указаны прыкладна. Усё залежыць ад колькасці ўдзельнікаў і манеры вядзення практыкавання выкладчыкам. Можа здарыцца так, што практыкаванне, разлічанае на адну гадзіну, можа заняць больш часу, калі ўдзельнікі вельмі актыўна ўцягнутыя ў працу. Лепш выбраць менш практыкаванняў і патраціць на іх правядзенне больш часу, чым паспрабаваць правесці болей за кароткі прамежак часу.

## Што неабходна?

Забеспячэнне матэрыяльнага і тэхнічнага бакоў навучання — залог поспеху. Для правядзення большасці практыкаванняў неабходна падрыхтаваць класны пакой так, каб у ім можна было свабодна рухацца, пераstаўляць мэблю, аб’ядноўвацца ў групы. Многія практыкаванні могуць быць рэалізаваны і па-за класнымі сценамі.  Важна, каб неабходны інвентар: адрыўныя лісты, плакаты, маркеры, блакноты і ручкі былі даступныя ўдзельнікам. Нядрэнна было б мець магчымасць выкарыстання камп'ютара і мультымедыйнага праектара, друкаваных выданняў, бібліятэкі і інтэрнэта. Хоць пры правядзенні асноўнай масы практыкаванняў можна абысціся малым.

## Дыскусія — падвядзенне вынікаў

Як заключны этап правядзення практыкавання пажадана дыскусія — падвядзенне вынікаў. Пытанні пры гэтым могуць быць наваднымі, і выкладчыку вырашаць, якія пытанні выносіць на абмеркаванне.

## Возьмем пад ўвагу

Пасля таго, як выніковая дыскусія скончана, важна, каб выкладчык зрабіў кароткае падвядзенне вынікаў. На гэтым этапе важна прывязаць змест практыкавання да рэчаіснасці, штодзённасці ці бліжэйшай будучыні: якім чынам мы можам выкарыстоўваць тое, чаму зараз навучыліся?

## Роля выкладчыка

Задача выкладчыка — падрыхтаваць, кіраваць і правесці навучанне. Ён (яна) павінны падабраць практыкаванні, скласці план правядзення, забяспечыць тэхнічны бок правядзення навучання.

### Кампетэнтнасць выкладчыка

Хаця вы будзеце выкладаць такія дысцыпліны, як міжкультурнае ўзаемаразуменне, правы чалавека і вырашэнне канфліктаў, вам не абавязкова быць дыпламаваным спецыялістам у гэтых абласцях. Часта бывае, што настаўнік літаратуры або гісторыі вядзе курс заняткаў па правах чалавека і міжкультурным узаемаразуменні лепш, чым юрыст або канфліктолаг. Самае важнае — што вы цікавіцеся навакольным светам і грамадствам.

Прапанаваная практыкаванні вельмі разнастайныя, і некаторыя з іх запатрабуюць ад вас больш ведаў і ўменняў, чым іншыя. Паколькі ва ўсіх людзей рознае паходжанне і жыццёвы вопыт, некаторыя выкладчыкі будуць схільныя аддаваць перавагу нейкім пэўным практыкаванням. Вы вельмі хутка зразумееце, якія практыкаванні запатрабуюць ад вас большых ведаў, чым вы маеце. Таму важна будзе вывучыць спецыяльную літаратуру і знайсці адпаведную інфармацыю. Яшчэ адна парада — паспрабаваць уявіць сабе, як будзе працякаць выкананне практыкаванняў ад пачатку да канца. Такім чынам, вы зможаце паразважаць над тым, якія пытанні могуць узнікнуць па ходу працы.

Прыказка сцвярджае, што паўтарэнне — маці вучэння. Калі вы праводзіце практыкаванне першы раз, вам могуць задаць пытанні і выказаць меркаванні, да якіх вы не гатовы. Магчыма, вы таксама адчуеце, што не можаце даць на іх даволі добрыя адказы. Гэта зусім не з’яўляецца паразай. Такі вопыт толькі падштурхне вас і дазволіць «вырасці» разам з працай, якую вы робіце, і ў наступны раз вы ўжо будзеце падрыхтаваныя лепш. Чым больш у вас вопыту, тым лепш вы будзеце спраўляцца з працай, і тым цікавей будуць вашы новыя навучальныя праекты.

Добры выкладчык вучыцца на хаду і няспынна павышае сваю кваліфікацыю, дзеліцца сваім вопытам і ведамі з іншымі і заклікае іншых удзельнікаў рабіць тое ж самае. Самая важная парада для таго, каб паспяхова справіцца з роляй, — гэта паводзіць сябе ў адпаведнасці з тымі каштоўнасцямі, якія вы выкладаеце. Часта кажуць, што словы словамі, а справы справамі. Усе выкладчыкі розныя, і ў кожнага ёсць свая манера выконваць ускладзеныя на яго задачы. Размераны і ўпэўнены стыль працы фарміруецца праз вопыт і шліфуецца гадамі. Нават выкладчыкам-прафесіяналам заўсёды ёсць чаму павучыцца.

### Выкладчыкі

Навучанне правам чалавека, міжкультурнаму ўзаемаразуменню і вырашэнню канфліктаў уяўляе цікавасць не толькі для ўдзельнікаў, але і ў высокай ступені для выкладчыка, які атрымлівае магчымасць павышаць узровень сваіх ведаў і вопыту. Аднак выкарыстанне педагогікі актыўнага ўдзелу патрабуе шмат чаго і ад выкладчыка. Ён павінен не толькі актыўна

ўдзельнічаць у навучанні і пастаянна прысутнічаць на занятках, але таксама кіраваць працэсам і быць яго натхніцелем. У выпадку, калі курс па правах чалавека займае некалькі дзён запар, пажадана прысутнасць і ўдзел двух выкладчыкаў. Ім будзе лягчэй тады падзяліць абавязкі, адказнасць, і яны таксама змогуць дапаўняць адзін аднаго. Больш ведаў і пунктаў погляду ўзбагачаюць працэс навучання. Каманда выкладчыкаў, якія працуюць некаторы час разам, набывае з часам упэўненасць адзін у адным і вучыцца выкарыстоўваць вопыт і веды адзін аднаго, што робіць працэс навучання цікавым як для ўдзельнікаў, так і для саміх выкладчыкаў.

**Асяродак навучання**

Для таго, каб навучанне было паспяховым, важна стварыць такі асяродак навучання, у якім удзельнікі атрымаюць роўныя магчымасці для эфектыўнай працы, даследавання, эксперыментавання і творчасці. Атмасфера, якая спрыяе дыялогу, супрацоўніцтву, даверу, адказнасці і незалежнасці, дапаможа стварыць такі асяродак навучання, у якім удзельнікі адчуваюць падтрымку ўсіх астатніх і што іх прымаюць. Упэўненасць і прызнанне — гэта асноўныя ўмовы фарміравання ў чалавека жадання і здольнасці падзяліцца ведамі, уражаннямі і вопытам, гатоўнасці адкрыта і шчыра разважаць. Адкрыты выкладчык, які прыслухоўваецца да іншых і выяўляе аднолькавую павагу і давер да ўсіх, будзе сам карыстацца павагай і створыць атмасферу спакою і ўпэўненасці. Важна, каб яго/яе словы і дзеянні былі выразнымі і адназначнымі. Выкладчык павінен дапамагчы ўдзельнікам усвядоміць сваю адказнасць за стварэнне добрага асяродку навучання. Ім варта беражліва ставіцца адзін да аднаго і ўдзельнічаць у працэсе навучання.

Добрыя выкладчыкі стымулююць крытычнае мысленне, рацыянальнае аргументаванне і імкненне адстойваць свае меркаванні. Яны падкрэсліваюць, што сталенне і развіццё могуць дапускаць змену перакананняў. Добрыя выкладчыкі — гэта энтузіясты, яны схільныя да разважанняў і праяваў клопату адносна іншых людзей. Немалаважна пачуццё гумару. Выкладчыкі, якія шмат даюць іншым, атрымліваюць шмат узамен, і ўсе разам вучацца на гэтым вопыце.

## Падбор тэм і практыкаванняў

Выбар і спалучэнне тэм і практыкаванняў залежаць ад аўдыторыі, мэт і наяўнага ў распараджэнні часу. Кіраўнік навучання павінен старанна абдумваць выбар практыкаванняў і іх спалучэнне пры складанні праграмы навучання на некалькі дзён. Хаця у дзеючым Базісным навучальным плане няма прадмета «Правы чалавека», навучэнцы павінны на ўроках гісторыі і грамадазнаўства атрымаць звесткі аб міжнародных стандартах у галіне правоў і свабод чалавека. Зыходзячы з пэўнай навучальнай праграмы і абраных падручнікаў, настаўнік зможа лёгка падабраць неабходныя менавіта яго вучням практыкаванні. Акрамя гэтага, многія практыкаванні падыходзяць для пазакласных выхаваўчых мерапрыемстваў.

Для таго, каб скласці добрую падборку практыкаванняў, неабходна дакладна вызначыцца з мэтамі: чаго я жадаю дасягнуць? Калі аўдыторыя вам незнаёмая, пажадана сабраць некаторую папярэднюю інфармацыю аб удзельніках/вучнях. Магчыма, неабходна тое ці іншае мець на ўвазе. Сабраўшы папярэднюю інфармацыю, лягчэй будзе пры выбары практыкаванняў і іх камбінаванні.

У тых групах, дзе ўдзельнікі не знаёмыя адзін з адным, і асабліва калі навучанне будзе працягвацца некалькі дзён, мы раім выкарыстоўваць практыкаванне — прэзентацыі ў першы дзень навучання. Таксама пажадана рэгулярнае выкарыстанне размінак. Размінка — аптымальны пачатак дня для стварэння добрай атмасферы і згуртаванасці. Размінкі можна выкарыстаць і як перапынкі, каб «падзарадзіцца энергіяй», або для таго, каб падкрэсліць тую ці іншую думку падчас навучання.

З часам у выкладчыка назапашваецца ўсё больш і больш вопыту адносна таго, якія практыкаванні працуюць добра, а якія неабходна дапрацаваць або падкарэктаваць.

## Размяшчэнне ў класе

Для правядзення большасці практыкаванняў патрабуецца шмат месца — для агульных абмеркаванняў, працы ў групах і фізічных практыкаванняў. Лепш за ўсё пасадзіць удзельнікаў паўколам — у форме падковы, калі кіраўнік сядзіць ці стаіць тварам да ўсіх удзельнікаў. Парты не з'яўляюцца неабходнасцю і нават непажаданыя, паколькі ствараюць бачны бар'ер. Выключэнне складаюць доўгія даклады, калі ўдзельнікі хочуць весці запісы па ходу даклада. Форма падковы таксама зручная для стварэння атмасферы раўнапраўя і даверу паміж слухачамі і выкладчыкам. Размяшчэнне крэслаў у форме паўкола таксама вельмі мабільна — крэслы лёгка пераставіць, калі неабходна хутка памяняць размяшчэнне, напрыклад, падчас працы ў групах або калі трэба вызваліць месца для правядзення размінак. Калі група зноў пераходзіць да абмеркавання, крэслы неабходна заўсёды ізноў расстаўляць паўколам.

## Праца ў групах

Праца ў групах з'яўляецца важнай часткай многіх практыкаванняў. Перавага працы ў групах у тым, што многія ўдзельнікі атрымліваюць магчымасць выказацца, а таксама ў тым, што ў групе лягчэй быць адкрытым і шчырым. Часта стасункі наладжваюцца лепш у невялікіх групах, дзе ўзровень згуртаванасці і разуменне датычнасці і адказнасці за агульную справу вышэй, чым у вялікіх групах. Пры дзяленні на групы можна адначасова працаваць з некалькімі тэмамі, можна дасягнуць большага, і вынік будзе шматбаковым.

Ідэальная колькасць удзельнікаў для працы ў групе — чатыры чалавекі. Гэта досыць маленькая група для таго, каб забяспечыць актыўны ўдзел, і досыць вялікая для таго, каб спрыяць творчасці і разнастайнасці.

Важна, каб выкладчык даваў дакладныя інструкцыі і распавядаў, што чакаецца ад працы ў групах. Ці трэба збіраць нейкую інфармацыю? Ці трэба весці запісы? Ці павінна група прадставіць вынікі сваёй працы? Таксама даваць дакладныя інструкцыі аб тым, колькі часу адводзіцца групе на працу. Пасля таго, як групы пачалі працаваць, важна дапамагаць ім: адказваюць на пытанні, тлумачыць, накіроўваць і сачыць за тым, каб усё ішло добра.

Як правіла, усім групам павінна быць дадзена магчымасць прадставіць вынікі сваёй працы ў аўдыторыі (або нейкую яе частку, калі часу мала). Выкладчык заклікае ўсіх удзельнікаў прыняць удзел у выкананні групавога задання. Аднак часта, адзін або двое бяруць на сябе ролі лідэраў. Заўсёды варта пытацца, ці ёсць у іншых членаў групы каментары ці дапаўненні. Выкладчык павінен адвесці дастаткова часу на выкананне групавога задання. Вопыт паказвае, што выкананне групавога задання патрабуе большага часу, чым мяркуецца. Гэта не варта ўспрымаць негатыўна, паколькі «перавыдатак» часу — гэта прыкмета таго, што працэс навучання складаецца паспяхова. Удзельнікі выкарыстоўваюць на выкананне задання больш часу, таму што яны захопленыя гэтым працэсам і лічаць важным і карысным данесці сваё меркаванне да іншых.

## Лекцыя кіраўніка

Часта лекцыя з'яўляецца важным элементам практыкаванняў. Добрая лекцыя павінна даваць новыя веды, тлумачыць сувязі і «прывязваць» практыкаванне да рэчаіснасці. Калі падчас выканання практыкавання ўдзельнікі выказваюць меркаванні або робяць высновы, якія, па меркаванні выкладчыка або кіраўніка, патрабуюць удакладнення, лекцыя можа стаць бліскучай магчымасцю для ўнясення такіх «паправак».

Да лекцыі важна вельмі добра падрыхтавацца. Чым лепш вы падрыхтаваныя, тым больш упэўнена вы будзеце сябе адчуваць і тым лепшы будзе ваш выступ. Важна, каб лекцыя была сканцэнтравана на нейкай адной праблеме. Калі вы спрабуеце ахапіць занадта шмат ідэй, гэта можа толькі ўсіх заблытаць і ўсё сапсаваць. Абавязкова распавядайце пра асабісты вопыт: добры і дрэнны. Нішто не ўспрымаецца з такой цікавасцю, як аповяды кіраўніка пра яго асабістыя дасягненні і няўдачы. Аповяды і гісторыі з рэальнага жыцця, пажадана пра канкрэтных людзей, — гэта таксама вельмі эфектыўны спосаб прыцягнуць увагу ўдзельнікаў.

Для таго, каб не забыцца сказаць нешта важнае, лепш за ўсё выкарыстоўваць нататкі з ключавымі словамі. Калі даклад чытаецца ўслых па загадзя падрыхтаванаму тэксту, то ён выглядае вельмі суха. Добры лектар таксама выкарыстоўвае зрокавы кантакт, гаворыць гучна і выразна. Для таго, каб зацікавіць слухачоў, неабходна рухацца падчас дакладу, выкарыстоўваць жэсты і рухі, каб акцэнтаваць пэўныя моманты. Запісвайце важныя ключавыя словы на дошцы або на планшэце з перакіднымі лістамі. Такія тэхнічныя сродкі, як мультымедыйны праектар, кіна- і відэапраектар, могуць стаць добрай падтрымкай, але не захапляйцеся імі занадта моцна, каб не патрапіць у залежнасць ад іх. Часам тэхніка можа перашкодзіць перадачы зместу лекцыі. Лепш за ўсё ўспрымаюцца міжасабовыя стасункі. Калі вы ўсё ж будзеце выкарыстоўваць мультымедыйны праектар ці кадаскоп, не пішыце занадта шмат на адным лісце.

Лекцыя не павінна працягвацца больш за паўгадзіны. Калі яна разлічана на большы час, варта падзяліць яе на дзве часткі, зрабіўшы паміж імі перапынак ці правесці размінку. Пасля лекцыі можна таксама раздаць удзельнікам раздрукоўку яе кароткага зместу.

## Агульнае абмеркаванне

Важнай характарыстыкай практыкаванняў з'яўляецца міжасабовая камунікацыя падчас групавой працы і ў агульных абмеркаваннях. Менавіта падчас абмеркаванняў выказваюцца меркаванні, аргументы, адбываецца фарміраванне ацэнак і абмен імі. Многія з практыкаванняў прадугледжваюць агульныя абмеркаванні як у пачатку, так і па ходу выканання практыкавання; акрамя таго, усе практыкаванні маюць апошні этап, які называецца «абмеркаванне». На гэтым заключным, агульным абмеркаванні група павінна паразважаць аб атрыманых ведах і «пераварыць» іх.

Асноўным прынцыпам кнігі з'яўляецца магчымасць абмеркавання любой праблемы, заснаваная на ўяўленні пра чалавека як пра разумную істоту. Для таго, каб мы змаглі прымаць як мага лепшыя рашэнні, грамадства павінна стварыць умовы для свабоднага, адкрытага і заснаванага на плюралізме абмену меркаваннямі. Ніколі раней не было ў чалавека так шмат магчымасцяў даведацца з розных крыніц аб тым, што адбываецца навокал. Пры гэтым трэба ўлічваць, што СМІ далёка не заўжды імкнуцца аб'ектыўна адлюстроўваюць рэальнае жыццё — на іх рэдакцыйную палітыку ўплываюць пазіцыі выдаўцоў і ўласнікаў, у тым ліку і іх грамадска-палітычныя погляды. Асабліва гэта праяўляецца ў сучаснай Беларусі, дзе, на жаль, большасць газет і практычна ўсе тэлеканалы знаходзяцца ў моцнай залежнасці ад дзяржаўных органаў. Таму трэба вучыць беларускіх школьнікаў аналізаваць інфармацыю са СМІ, асабліва тэлеінфармацыю.

Дзеці думаюць, што яны вельмі шмат ведаюць пра навакольны свет: пра блізкія і далёкія народы і культуры, аб войнах і канфліктах, дыскрымінацыі, аб злачыннасці і гвалце, аб каханні і сэксуальнасці. Мы лічым, што абавязкова трэба прыслухоўвацца да іх меркавання.

Яны бачаць і разумеюць шмат і павінны мець магчымасць выказвацца. Не варта баяцца свабоднай дыскусіі, нават калі эмоцыі распальваюцца. Некаторыя тэмы бывае вельмі цяжка абмяркоўваць, аднак яны не стануць лягчэй, калі іх будуць замоўчваць.

Свабодная дыскусія не азначае, што ўдзельнікам не трэба паважаць адзін аднаго і годнасць адзін аднаго. Свабода прадугледжвае адказнасць. Менавіта таму важна, каб дыскусіі праходзілі ў добразычлівай і спакойнай атмасферы. Толькі ўспрымаючы дзяцей сур'ёзна і праяўляючы да іх давер, мы можам падрыхтаваць іх да дэмакратычнай адказнасці, якая будзе ўскладзена на іх пры ўступленні ў дарослае жыццё.

Важна, каб працэс зносін працякаў спакойна і кіраваўся выкладчыкам. У гэтай сувязі мэтазгодна, каб выкладчыкі і ўдзельнікі абмеркавалі тое, што ў дыскусіі могуць быць дзве цалкам розныя мэты: альбо пераканаць іншых удзельнікаў дыскусіі ў сваёй слушнасці, альбо абмяняцца меркаваннямі і вопытам. Дыскусію першага тыпу часам называюць дыспутам або спрэчкай. Але любая дыскусія — гэта працэс даследавання, у выніку якога ўсе ўдзельнікі павінны стаць трошкі больш кампетэнтнымі ў праблеме, якая абмяркоўваецца.

*Больш глыбокае разуменне іншых людзей дазволіць мне глыбей зразумець самога сябе. Гэта зусім не тое ж самае, што легкадумны рэлятывізм. Я не адступлю ад таго, што лічу праўдзівым і правільным, калі толькі важкія аргументы не пераканаюць мяне. Але гэта значыць, што я прызнаю, што мой вопыт — гэта выключна мой вопыт. У іншых — свой вопыт. Калі б я быў на іх месцы, я б, верагодна, думаў гэтак жа, як яны. Я павінен прыкласці высілкі, каб зразумець ход іх думак. Не для таго, каб не думаючы пераняць яго, але для таго, каб атрымаць больш праўдзівую карціну рэчаіснасці. (Інге Айдсвог)*[7]

Для таго, каб дыскусія стала прадуктыўнай для ўдзельнікаў, важна, каб выкладчык прапанаваў ім самім выступаць з рэплікамі, каментарамі або пытаннямі. Неабходнай умовай актыўнага ўдзелу слухачоў з'яўляецца атмасфера павагі, адкрытасці і жаданне слухаць так, каб усе адчувалі давер і бяспеку. Калі асяродак навучання з'яўляецца спрыяльным, то гэта можа даць вам шмат пераваг. Што датычыць міжкультурнага ўзаемаразумення, правоў чалавека і вырашэння канфліктаў, то ва ўдзельнікаў, як правіла, выяўляюцца вельмі значныя веды, уменні і вопыт. Часта яны самі не ўсведамляюць гэтага.

На агульных абмеркаваннях варта прапанаваць удзельнікам прадставіць свае аргументы і развагі, пры гэтым пазбягаючы агульных пытанняў, якія прадугледжваюць адказы «так/не»: там, дзе гэта магчыма. Такія пытанні маюць вельмі абмежаваную каштоўнасць і мала спрыяюць развіццю. Калі такія адказы ўсё ж даюцца, кіраўнік павінен задаць удакладняючыя пытанні: «Што ты маеш на ўвазе?», «Ты не магла б растлумачыць падрабязней?» Калі і гэта не дапаможа, то можна шчыра сказаць, што адказы «так/не» мала пра што гавораць як самому выкладчыку, так і іншым удзельнікам.

Падчас абмеркаванняў не трэба баяцца цішыні. Цішыня можа азначаць, што ўдзельнікам трэба час для таго, каб «пераварыць» і асэнсаваць сказанае. Калі выкладчык адчувае патрэбу ў тым, каб «запоўніць пустэчу», то ён можа абагульніць самыя важныя моманты, закрануць іншыя бакі праблемы і паспрабаваць «завесці» дыскусію.

Часам бывае няпроста арганізаваць абмеркаванне так, каб усе змаглі прыняць удзел. У такіх выпадках можна задаць пытанне «па колу» і папрасіць кожнага ўдзельніка па чарзе выказаць сваё меркаванне. Бывае і так, што некаторыя ўдзельнікі не паспяваюць нічога сказаць, таму што іншыя кажуць занадта шмат. Тады можна звярнуцца проста да таго ўдзельніка, які амаль нічога не кажа, і спытаць яго, што ён думае па дадзеным пытанні. Апошняя магчымасць — гэта перайсці ад агульнага абмеркавання да працы ў групах, дзе кожны ўдзельнік будзе мець магчымасць выказаць сваё меркаванне.

Таксама бывае, што размова «адыходзіць» убок, у сферы, якія не звязаныя з асноўнай праблемай. Тады выкладчык павінен вярнуць яе ў патрэбнае рэчышча, каб не марнаваць час на рэчы, якія не маюць адносінаў да справы. Можна, напрыклад, сказаць: «Гэта, безумоўна, вельмі цікава, але не зусім датычыць нашай тэмы. Я прапанаваў бы вам працягнуць вашу дыскусію пасля заняткаў».

Калі агульнае абмеркаванне падыходзіць да канца, важна, каб выкладчык коратка абагульніў дыскусію, «сабраў усе яе ніткі» і сумесна з групай зрабіў высновы.

У асобных выпадках выкладчык можа патрапіць у сітуацыю канфрантацыі з некаторымі ўдзельнікамі. Напрыклад, яму задаюцца правакацыйныя і складаныя пытанні або пытанні, сутнасці якіх ён не разумее. У такіх выпадках рэкамендуецца задаць сустрэчнае пытанне: «Што вы маеце на ўвазе? Не маглі б вы прывесці прыклады, каб праілюстраваць пытанне?» Таксама магчыма спытаць іншых удзельнікаў, ці ёсць у іх нейкія меркаванні ці вопыт, здольныя праясніць гэтае пытанне.

Часам здараецца, што дыскусія становіцца вельмі бурнай. Гэта нармальная з'ява. У адкрытай і спакойнай атмасферы людзі могуць казаць тое, што яны думаюць, а паколькі ўсе людзі розныя, выказваюцца самыя розныя меркаванні. Часта гэтыя меркаванні суправаджаюцца моцнымі пачуццямі. Калі дыскусія праходзіць пад кантролем выкладчыка, без асабістых нападак і прэтэнзій, не варта баяцца «высокіх градусаў». Магчыма, гэта толькі пацвярджае тое, што абмяркоўваецца нешта вельмі значнае.

## Калі ўзнікнуць канфлікты

Калі ў выкладчыка атрымаецца стварыць спрыяльны адукацыйны асяродак, заснаваны на павазе, упэўненасці адзін у адным і даверы, то

верагоднасць узнікнення канфліктаў вельмі малая[8]. Аднак канфлікты ўсё ж могуць узнікнуць. Сваркі і моцныя рознагалоссі — гэта выпрабаванне для выкладчыка, якое патрабуе ад яго мэтанакіраваных дзеянняў: ён павінен умяшацца ў сітуацыю, і яго патрабаванні павінны быць дакладнымі і зразумелымі.

Калі канфлікт носіць асабісты характар, не варта вырашаць яго ў прысутнасці ўсіх астатніх удзельнікаў. У такіх выпадках выкладчык павінен папрасіць замешаных у ім удзельнікаў паважаць іншых і адкласці высвятленне адносін па гэтай праблеме да канца заняткаў. У залежнасці ад сур'ёзнасці канфлікту выкладчык можа настойваць на сваім удзеле ў вырашэнні гэтага канфлікту або проста прапанаваць сваю дапамогу.

Калі праблема звязана з тэмамі, якія абмяркоўваюцца падчас навучання, важна абмеркаваць яе ўсім разам. Тады ўсе ўдзельнікі атрымаюць каштоўны і карысны вопыт паспяховага вырашэння канфліктаў, і з'явіцца магчымасць выкарыстаць дадзены канфлікт у навучанні. Калі сітуацыя моцна напружаная, важна, каб выкладчык заставаўся спакойным. Удзельнікі, якія не задзейнічаны ў канфлікце, прыслухаюцца і паспрабуюць спакойна ўрэгуляваць сітуацыю. Калі гэта неабходна, можна запатрабаваць ад удзельнікаў узяць сябе ў рукі, каб можна было абмеркаваць праблему спакойна. Пасля гэтага выкладчык можа падкрэсліць, што адрозненні ў меркаваннях натуральныя, але ў той жа час неабходна паважаць меркаванні іншых гэтак жа, як мы хацелі б, каб паважалі наша меркаванне. Сур'ёзныя рознагалоссі ў групе трэба ўспрымаць сур'ёзна, таму што яны даюць нам магчымасць даведацца для сябе пра нешта новае. Неабходна папрасіць абодва бакі паспрабаваць выказаць сваю пазіцыю спакойна і дакладна. Кожны з бакоў павінен мець магчымасць выказацца да канца, каб яго не перабівалі. Калі бакі, якія да гэтага былі вельмі эмацыйна ўцягнутыя ў спрэчку або ўсё яшчэ ўцягнутыя ў яе, бачаць, што іх меркаванне паважаюць, яны, верагодна, будуць трымацца бліжэй да праблемы і выкарыстаюць магчымасць аргументаваць сваю пазіцыю ўзважана.

7. Добрыя дзеянні выратуюць свет (Нарвежскі Чырвоны Крыж, 2005)
8. За ўсю нашу дзесяцігадовую працу з маладымі людзьмі, прадстаўнікамі розных краін і культур, мы ні разу не зведалі якога-небудзь сур'ёзнага канфлікту паміж удзельнікамі. Прычына ў тым, па нашым меркаванні, што было выдаткавана дастаткова часу для таго, каб яны «пазналі» адзін аднаго і ў групе склалася сяброўская і надзейная атмасфера

## Парады кіраўніку

**Выбар практыкаванняў:**
- Вызначыце мэты навучання.
- Выберыце практыкаванні, якія адпавядаюць узросту ўдзельнікаў і памеру групы.
- Аб'ядноўвайце розныя тыпы практыкаванняў.
- Можна пачаць з практыкаванняў знаёмства.
- Выкарыстайце размінкі:
  – у пачатку навучання;
  – для «разрыву» працяглых блокаў і каб атрымаць «зарад энергіі»;
  – для акцэнтавання важных момантаў.

**Размяшчэнне ўдзельнікаў у класе:**
- Першапачаткова варта пасадзіць удзельнікаў у форме паўкола.
- Падрыхтуйце сталы і крэслы для працы ў групах.

**Праца ў групах:**
- Дакладна тлумачце групам іх заданні.
- Паведаміце групам, колькі ім даецца часу.
- Дапамагайце групам падчас працы.
- Пакіньце дастаткова часу для таго, каб групы маглі прадставіць вынікі сваёй працы.
- Паспрабуйце зрабіць так, каб кожны член групы працаваў.

**Даклады:**
- Добра падрыхтуйцеся.
- Сканцэнтруйце ўвагу на асноўных момантах. Занадта шмат матэрыялу за адзін раз можа ўсё сапсаваць.
- Імкніцеся прыводзіць прыклады з асабістага вопыту.
- Карыстайцеся планам з ключавымі словамі.
- Кажыце зразумелай, простай моваЙ.
- Кажыце гучна і выразна, падтрымлівайце зрокавы кантакт і выкарыстоўвайце мову цела.
- Уважліва сачыце за рэакцыяй групы на тое, што вы кажаце.
- Тэхнічныя сродкі — гэта добра, але не перастарайцеся з іх выкарыстаннем.
- Даклад працягласцю больш за паўгадзіны варта падзяліць на дзве часткі, а ў перапынку правесці размінкі.

**Агульнае абмеркаванне:**
- Стварыце атмасферу павагі, адкрытасці і гатоўнасці слухаць іншых. Тады ўдзельнікі будуць адчуваць сябе больш спакойна, павысіцца ўзровень даверу.
- Заклікайце да актыўнага ўдзелу.
- Заклікайце ўдзельнікаў выказваць свае думкі і разважаць, спрабуйце пазбягаць пытанняў, на якія можна адказаць «так/не».
- Не бойцеся цішыні.
- Звяртайцеся проста да тых, хто амаль увесь час маўчыць.
- Заўсёды падводзьце вынікі дыскусіі і рабіце высновы.



# РАЗДЗЕЛ 3

## Уступныя практыкаванні і размінкі

Ёсць шэраг кароткіх практыкаванняў і размінак, якія могуць дапамагчы вам у працэсе навучання і стаць важным дадаткам да практыкаванняў па міжкультурнаму ўзаемаразуменню, правах чалавека і вырашэнню канфліктаў. Уступныя практыкаванні і размінкі не варта недаацэньваць. Яны дапамагаюць арганізаваць стасункі, спрыяюць разнастайнасці, робяць працэс навучання больш энергічным і цікавым. На ўроку размінкі можна выкарыстоўваць з самымі рознымі мэтамі. Па-першае, каб «сабраць» дзяцей у пачатку ўрока, падрыхтаваць іх да сумеснай творчай працы. Па-другое, у сярэдзіне ўрока — для змены дзейнасці. Па-трэцяе, пасля ролевай гульні або гарачай дыскусіі — для зняцця эмацыйнага напружання. Акрамя таго, многія размінкі могуць самі па сабе быць добрай завязкай тэмы, якая абмяркоўваецца на ўроку. Не бойцеся незвычайнасці гэтай формы! Выкарыстоўвайце размінкі!

## Знаёмства

**Прадстаўленне адзін аднаго**

Калі ўдзельнікі не знаёмыя адзін з адным, асабліва калі ім давядзецца правесці разам некалькі дзён, варта выдзеліць час для знаёмства. Гэтае практыкаванне рэкамендуецца праводзіць на пачатку курса.

Удзельнікі рассаджваюцца паўколам, у форме падковы, і тыя, што сядзяць побач, утвораць пары. Калі ўдзельнікаў няцотная колькасць і хтосьці застаўся адзін, да яго далучаецца выкладчык. Парам даецца заданне пагаварыць адзін з адным пяць хвілін і высветліць як мага больш адзін пра аднаго: як завуць суразмоўцу, адкуль родам, у якой школе або ўніверсітэце вучыцца, дзе працуе, якія захапленні мае, у якую краіну хацеў бы з'ездзіць? Каму ён хацеў бы падарыць ружу або з кім ён хацеў бы павячэраць?

Праз пяць хвілін суразмоўцы прадстаўляюць адзін аднаго. Той, каго прадстаўляюць, устае, а той, хто прадстаўляе, застаецца сядзець. Пасля кожнага прадстаўлення было б ветлівым паапладзіраваць. Калі ў групе больш за 18 чалавек, прадстаўленні варта правесці ў некалькі этапаў, з перапынкам або размінкай.

**Гульня ў імёны з мячом**

Усе ўдзельнікі становяцца ў кола, аднаму з іх даецца мячык. Удзельнік з мячом называе сваё імя і кідае мячык наступнаму. Наступны ўдзельнік называе сваё імя і кідае мячык далей. Так працягваецца, пакуль кожны не назваў сваё імя. Потым правілы ўскладняюцца: удзельнік з мячом называе сваё імя, затым імя іншага ўдзельніка і кідае яму мячык. Так працягваецца, пакуль усе не назвалі сваё імя і імя іншага чалавека яшчэ па адным разе.



**Гульня ў імёны**

Усе ўстаюць у кола. Адзін з удзельнікаў называе сваё імя і адначасова робіць які-небудзь рух. Яго сусед павінен паўтарыць імя і рух, а потым назваць сваё імя і зрабіць іншы рух. Трэці ўдзельнік паўтарае імя і рух першага і другога, а затым дадае свае і гэтак далей. Паступова паўтарэнне становіцца ўсё складаней, але ў той жа час усё больш забаўным. Удзельнікі могуць крыху «суфліраваць» адзін аднаму. Апошнім павінен паўтарыць імёны ўсіх удзельнікаў выкладчык.

**«Сцежка імёнаў»**

Удзельнікі сядзяць у коле, вядучы — у цэнтры. Вядучы бярэ ў рукі мяккі прадмет, напрыклад згорнуты ў трубку аркуш паперы. У пачатку гульні вядучы выкрыквае імя аднаго з удзельнікаў, а потым адразу ж спрабуе «ўдарыць» яго папяровай трубкай па галаве. Гэты ўдзельнік павінен «выратаваць» сябе, выкрыкваючы імя іншага ўдзельніка, інакш вядучы яго ўдарыць. Той, чыё імя назвалі, паднімае руку ўверх, каб паказаць, дзе ён сядзіць. Вядучы спрабуе цяпер ударыць гэтага ўдзельніка, а той, у сваю чаргу, ратуючы сябе, павінен назваць імя трэцяга, пакуль яго не ўдарылі. Так працягваецца, пакуль вядучаму не ўдасца ўдарыць кагосьці з удзельнікаў па галаве. Тады той, хто прайграў, выходзіць у сярэдзіну і становіцца вядучым.

Гэтае практыкаванне рэкамендуецца для груп, дзе ўдзельнікі ўжо крыху пазнаёміліся адзін з адным, напрыклад, пасля некалькіх дзён заняткаў.

**Важнае месца**

Для гэтага практыкавання спатрэбіцца мапа Беларусі і іголка для кожнага ўдзельніка. Практыкаванне добра падыходзіць для класа, у якім вучацца дзеці, што нарадзіліся ў розных рэгіёнах Беларусі або дзеці мігрантаў.

Кожны ўдзельнік думае пару хвілін аб тым месцы ў Беларусі, якое мае для яго/яе асаблівае значэнне, запісвае ключавое слова і тлумачыць, чым яно для яго/яе асаблівае. Калі ўсе гатовы, кожны па чарзе падыходзіць да мапы і ўкалвае іголку ў «сваё» месца і распавядае іншым пра яго асаблівасці. Гэтае практыкаванне падыходзіць для стварэння добрай атмасферы, паколькі ў кожнага ёсць магчымасць распавесці крыху пра сябе.

**Мая радзіма**

Гэтае практыкаванне добра падыходзіць для груп, удзельнікі якіх з'ўляюцца прадстаўнікамі розных краін або рэгіёнаў. Удзельнікі дзяляцца на групы па краінах/рэгіёнах, з якіх яны прыехалі. Не страшна, калі адны групы будуць меншымі, другія — большымі. Групам даецца

30 хвілін на тое, каб падрыхтаваць прэзентацыю сваёй краіны/рэгіёна вусна або ў выглядзе ілюстрацыі. Цікавымі момантамі для такой прэзентацыі могуць быць: геаграфія, прырода, жывёльны свет, насельніцтва, вядомыя асобы, гісторыя, мастацтва, палітыка, спорт і інш. Астатнія ўдзельнікі могуць задаваць пытанні і рабіць каментары падчас прэзентацыі.

## Чаканні і правілы паводзін на занятках

**Якія нашы чаканні?**

Калі вы плануеце прысвяціць вывучэнню правоў чалавека цыкл заняткаў, мы рэкамендуем у пачатку выдзеліць час высвятленню чаканняў удзельнікаў ад працэсу навучання.

Усе ўдзельнікі атрымліваюць самаклейныя аркушыкі паперы, на кожным з якіх яны павінны адказаць на адно з наступных пытанняў:

1) Што я чакаю ад навучання?
2) Што я чакаю ад самога сябе?
3) Што я чакаю ад групы?
4) Што я чакаю ад выкладчыкаў?

Удзельнікі павінны пісаць разборліва, каб усе маглі гэта прачытаць, лепш за ўсё вялікімі літарамі. Гэтае апытанне павінна быць ананімным. Пакуль удзельнікі пішуць (10 хвілін), вядучы рыхтуе чатыры вялікія аркушы. Зверху на кожным аркушы пішацца адно з пералічаных вышэй пытанняў — у якасці загалоўка. Калі ўдзельнікі гатовы, яны прыклейваюць свае аркушыкі з адказамі на вялікі аркуш. Далей зачытваюцца адказы з маленькіх аркушыкаў. Гэта робяць альбо самі ўдзельнікі (лепш па два чалавекі на аркуш), альбо выкладчык.

Пры дапамозе дадзенага практыкавання ўдзельнікі паведамляюць сабе, адзін аднаму і выкладчыку, чаго яны чакаюць ад навучання, а выкладчык можа прыкладна ўявіць сабе ўзровень ведаў і ўяўленняў навучэнцаў пра новую тэму. Аркушыкі з адказамі можна прымацаваць на сцяну, каб удзельнікі маглі пры неабходнасці звяртацца да іх.

**Правілы паводзін**

Калі ўдзельнікі будуць знаходзіцца разам некалькі дзён, пажадана дамовіцца аб правілах навучання. Лепш за ўсё выпрацаваць такія правілы разам. Калі кожны ўдзельнік зробіць свой унёсак у складанне правіл, то ўсе разам адчуюць сваю адказнасць за іх выкананне. Зразумелыя і справядлівыя правілы дапамогуць пазбегнуць канфліктаў і станоўча адаб'юцца на навучанні.



Удзельнікі могуць падумаць некалькі хвілін (магчыма таксама абмеркаванне ў парах), якія правілы патрэбны для таго, каб навучанне прынесла найбольшую карысць. Гэтыя прапановы павінны быць абмеркаваныя. Калі група дасягнула згоды з нагоды якога-небудзь правіла, яно запісваецца на вялікі аркуш. Прынятыя правілы становяцца «дамовай», абавязковай для ўдзельнікаў і выкладчыка. Тэкст «дамовы» павінен быць вывешаны на сцяне.

**Прыклады некаторых правіл:**

- Паважайце адзін аднаго.
- Не спазняйцеся на заняткі (час заняткаў датычыць усіх членаў групы. Прыходзячы своечасова, вы праяўляеце павагу да іншых, уключаючы кіраўніка).
- Не перабівайце адзін аднаго.
- Падніміце руку, калі хочаце нешта сказаць.
- Адключыце мабільныя тэлефоны.
- Абмяркоўвайце праблему, а не чалавека.
- Важна не тое, хто правы, а тое, што правільна.
- Недарэчных пытанняў не бывае.
- Можа быць некалькі правільных адказаў, а не толькі адзін.
- Кожны можа ўхіліцца ад удзелу ў дыскусіі, калі ёсць нейкая тэма, якую гэты ўдзельнік не жадае абмяркоўваць.
- Зыходзьце са здаровага сэнсу.



Калі група будзе праводзіць разам некалькі дзён, пажадана пагадзіцца адносна такіх правіл, як:

- Усе павінны паснедаць, каб зарадзіцца энергіяй на ўвесь дзень.
- Паважайце іншых людзей, якія знаходзяцца ў тым жа месцы, што і вы.
- Усе ўдзельнікі павінны быць у сваіх пакоях у 23.00.
- Не павінна быць ніякага шуму пасля 24.00.

## Размеркаванне па групах

Спосаб дзялення на групы мае важнае значэнне як для стасункаў, так і для навучання. Часам склад груп нічога не значыць, і ўдзельнікі могуць самі падзяліцца на групы. Тады кіраўніку дастаткова сказаць, што трэба разбіцца на групы, напрыклад, па чатыры чалавекі.

Аднак нярэдка больш мэтазгодна свядома падзяліць удзельнікаў неяк інакш. Гэта робіцца для таго, каб сабраць удзельнікаў, якія яшчэ не пазнаёміліся, у адну групу. У іншых выпадках можна падзяліць па розных групах людзей, якія ўвесь час разам. Варта пазбягаць фарміравання «элітных» ці «слабых» груп. Няўдала спланаванае і дрэнна праведзенае дзяленне на групы можа ўсё сапсаваць. Вопыт паказвае, што ўдзельнікам падабаецца, калі склад груп кожны раз розны, так што яны не працуюць кожны раз з аднымі і тымі ж людзьмі.

**2 + 2 = 4**

Просты спосаб падзяліцца на групы — папрасіць удзельнікаў павярнуцца да свайго суседа, каб утварылася пара. Потым дзве суседнія пары аб'ядноўваюцца ў чацвёрку. Гэты спосаб амаль не займае часу і падыходзіць для першых заняткаў, калі ўдзельнікі яшчэ зусім не ведаюць адзін аднаго, а таксама для заданняў, для выканання якіх паходжанне ўдзельнікаў не мае значэння.

**1,2,3,4,5 — 1,2,3,4,5, — 1,2,3,4,5**

Часта людзі, якія ведаюць адзін аднаго вельмі добра, садзяцца разам на занятках. Для таго, каб групы кожны раз не былі аднолькавымі, мэтазгодна выкарыстаць іншы спосаб дзялення на групы, які змяшае ўдзельнікаў выпадковым чынам. Тады ўдзельнікі, не вельмі добра знаёмыя адзін з адным, атрымаюць магчымасць папрацаваць разам.

Дзяленне адбываецца так: першы ўдзельнік, які сядзіць у паўколе, кажа «адзін», другі — «два», трэці — «тры» і гэтак далей, да патрэбнай колькасці груп, напрыклад, пяці. Пасля пяці разлік пачынаецца спачатку: шосты кажа «адзін», сёмы — «два» і гэтак далей. Калі разлік скончаны, вядучы прапануе сабрацца ў групы па нумарах («першыя нумары», «другія нумары», «трэція нумары», «чацвёртыя нумары» і, нарэшце, «пятыя нумары»).



**Латарэя**

Можна падзяліцца на групы выпадковым чынам — выцягваючы кветачкі з нумарам групы. Цікава кветачкі з нумарам замяніць, напрыклад, цукеркамі ў абгортках рознага колеру — па колькасці патрэбных груп.

**Дзяленне па якіх-небудзь асаблівых прыкметах**

Можна папрасіць удзельнікаў падзяліцца па групах па якіх-небудзь асаблівых прыкметах: па полу, удзельніках з розных школ, гарадоў ці краін або па моўнай прыналежнасці.

**Групы «аматараў»**

Удзельнікі размяшчаюцца паўколам. Кіраўнік задае пытанне першым двум (тром, чатыром, пяці — у залежнасці ад неабходнай колькасці груп): «Якая твая самая любімая кветка?», ці «Якая самая любімая марка аўтамабіля?», ці «У якім горадзе ты марыш пабываць?» і т.п. Удзельнікі даюць адказы, і кіраўнік разлічвае па парадку астатніх удзельнікаў, фарміруючы групы «аматараў».

## Практыкаванні для разважання і камунікацыі

**Дзённік**

Калі навучанне працягваецца некалькі дзён запар, кіраўнік можа прапанаваць удзельнікам весці дзённік з запісамі іх перажыванняў і разважанняў: чаму яны навучыліся; набыты вопыт; новыя сябры; што ім здаецца важным і што — цяжкім; як можна выкарыстоўваць тое, чаму навучыліся і г.д. Калі выкладчык прапануе вядзенне дзённіка, неабходна таксама падкрэсліць, што дзённік — гэта прыватная ўласнасць, якая не можа быць прачытаная іншымі без дазволу на тое аўтара. Такі дзённік можа ў далейшым выкарыстоўвацца як крыніца інфармацыі пры заключным падвядзенні вынікаў ці ацэнцы навучання.

**Сцэнгазета**

У самым пачатку навучання выкладчык можа павесіць на сцяну вялікі плакат — сцэнгазету. На плакаце ўдзельнікі могуць маляваць, пісаць вершы, свае пажаданні і патрабаванні ці звяртацца да іншых удзельнікаў. Усё гэта робіцца ананімна.

**Дыялог у кавярні**

Дыялог у кавярні выкарыстоўваецца, калі неабходна абмеркаванне адной праблемы з розных бакоў. Выкладчык дзеліць удзельнікаў на маленькія групы, якія рассаджваюцца за розныя сталы, як у кавярні. Мэта — абмеркаваць адзін з бакоў праблемы (загадзя неабходна вызначыць бакі праблемы). Адзін удзельнік застаецца пастаянна

за адным і тым жа сталом. У той час як усе іншыя ўдзельнікі — наведвальнікі стала-кавярні пасля пяціхвіліннага абмеркавання аднаго боку праблемы пераходзяць за іншы стол і там прымаюць удзел у абмеркаванні ўжо наступнага боку вызначанай праблемы. І так праз усе сталы. Праца завершана тады, калі ўсе ўдзельнікі, за выключэннем тых, хто заставаўся за сталамі пастаянна, пабывалі за сталом вызначаную колькасць разоў (выкладчык вырашае, колькі разоў). Тыя, хто пастаянна заставаўся на месцы, робяць прэзентацыю абмеркаванняў для ўсёй аўдыторыі.

Дыялог у кавярні — добрая магчымасць для стварэння творчай і дынамічнай працы ў групе. Ва ўдзельнікаў ёсць магчымасць убачыць, якія новыя ідэі прыносяць новыя людзі. Працягласць практыкавання залежыць ад выкладчыка і колькасці ўдзельнікаў.

**Мікрафон для прадухілення перашкод і злоўжывання часам**

У ідэале ўсе ўдзельнікі працэсу навучання павінны атрымаць час для таго, каб выказаць свае думкі. Часам гэтага не атрымліваецца, паколькі хтосьці можа пастаянна перарываць, а хтосьці — казаць без прыпынку. У такіх сітуацыях выкладчык і група могуць пагадзіцца выкарыстоўваць «мікрафон» ці «жэтоны».

«Мікрафонам» можа быць любая рэч, якую трымае той, хто гаворыць. Гэта можа быць, напрыклад, вялікі маркер або згорнутая папера. Толькі той, у каго мікрафон, мае права казаць. Мікрафон перадаецца далей па колу іншым выступоўцам.

У тых сітуацыях, калі часу застаецца мала і некаторыя ўдзельнікі занадта шмат гавораць, выкладчык можа выдаваць «жэтоны» працягласцю адна, дзве ці тры хвіліны. І такім чынам рэгуляваць час, які даецца таму або іншаму ўдзельніку для выказвання свайго пункту гледжання.

## Размінкі

Размінкі — гэта дынамічныя і забаўныя практыкаванні, якія прадугледжваюць фізічную актыўнасць, дзе ўдзельнічае ўся група. Яны не займаюць шмат часу, як правіла, не больш за дзесяць хвілін, і ўдзельнікі атрымліваюць важную перадышку паміж заняткамі. Размінкі ствараюць станоўчую атмасферу і дапамагаюць сфарміраваць ва ўдзельнікаў пачуццё адзінства.

Размінкі можна выкарыстоўваць для таго, каб:

- пачаць дзень весела і з новымі сіламі;
- паразмаўляць і лепей пазнаёміцца з іншымі ўдзельнікамі;
- зрабіць перапынак у занятках і зарадзіцца энергіяй;
- пачаць вывучэнне новай тэмы/праблемы або праілюстраваць яе.

**Вітанні**

Гэтая размінка можа выкарыстоўвацца, каб «растапіць лёд» сярод людзей, якія адзін аднаго не ведаюць. Практыкаванне паказвае з дапамогай розных цырымоній вітання адзін аднаго, што грамадствы — шматаблічныя.

Зрабіце копіі дадзенай табліцы, разрэжце іх на часткі і складзіце часткі ў чашу або капялюш. Кожнаму ўдзельніку дастаткова адной цырымоніі вітання. Папрасіце ўдзельнікаў прывітаць іншых удзельнікаў, дэманструючы сваю цырымонію вітання.

| |
|---|
| Павітайце, абняўшы і пацалаваўшы па тры разы ў абедзве шчакі |
| Павітайце, абняўшы і пацалаваўшы па два разы ў абедзве шчакі |
| Павітайце так, каб мужчыны і жанчыны не дакраналіся адзін да аднаго |
| Павітайце, абняўшы і пацалаваўшы па чатыры разы ў абедзве шчакі |
| Павітайце, склаўшы рукі ў паставу малітвы і ледзь падаўшыся наперад |
| Павітайце, تручыся адзін аб аднаго насамі |
| Павітайце гарачымі абдымкамі |
| Павітайце моцным і надзейным поціскам рукі |
| Павітайце, стоячы ў паўметры адзін ад аднаго слабым поціскам рукі |

Павітаўшы адзін аднаго, удзельнікі ўсаджваюцца паўколам. Выкладчык можа задаць наступныя пытанні:

- Што паказвае дадзенае практыкаванне?
  (Разнастайнасць людзей можа быць адным з адказаў)
- Некаторыя вітанні характэрныя для пэўных краін. Паспрабуйце адгадаць для якіх?
  (Тыя, хто паказваў тое ці іншае прывітанне, могуць адгадваць першымі):
  - *Павітайце, абняўшы і пацалаваўшы па тры разы ў абедзве шчакі (Галандыя, Сербія, Бельгія);*
  - *Павітайце, абняўшы і пацалаваўшы па два разы ў абедзве шчакі (Партугалія, Іспанія, Боснія і Герцагавіна, Харватыя);*
  - *Павітайце так, каб мужчыны і жанчыны не дакраналіся адзін да аднаго (Самалі);*
  - *Павітайце, абняўшы і пацалаваўшы па чатыры разы ў абедзве шчакі (Францыя);*
  - *Павітайце, склаўшы рукі ў паставу малітвы і ледзь падаўшыся наперад (Японія);*
  - *Павітайце, тручыся адзін аб аднаго насамі (эскімосы);*

- *Павітайце гарачымі абдымкамі (Расія, Палестына);*
- *Павітайце моцным і надзейным поціскам рукі (Германія, Нарвегія);*
- *Павітайце, стоячы ў паўметры адзін ад аднаго слабым поціскам рукі (Вялікабрытанія).*

ПЫТАННІ ДЛЯ АГУЛЬНАЙ ДЫСКУСІІ:

- У якой ступені дадзеныя вітанні з'яўляюцца стэрэатыпамі? Ці ўсе немцы ціснуць моцна рукі? Ці ўсе эскімосы труцца насамі?
- Якое вітанне было для вас найбольш дыскамфортным? Чаму?
- Якое вітанне было для вас найбольш камфортным? Чаму?
- Ці аказваліся вы калі-небудзь у няёмкай сітуацыі, калі вы віталі «няправільна»?

Важна, каб выкладчык падкрэсліў, што гэтае практыкаванне не накіравана на ўмацаванне стэрэатыпаў, а хутчэй, наадварот.

**60 секунд — адна хвіліна?**

Часта можна пачуць, што час — паняцце адноснае. Аднак што на самой справе маецца на ўвазе?

Удзельнікі сядзяць кожны на сваім крэсле, і выкладчык раздае наступныя інструкцыі:

1. Удзельнікі павінны прыбраць свае гадзіннікі ці ўключаныя мабільныя тэлефоны.
2. Усе ўстаюць і трымаюць вочы заплюшчанымі. Заданне — не садзіцца да таго часу, пакуль выкладчык не скажа: «Падрыхтаваліся. Пачалі!» Тады кожны ўдзельнік адлічвае пра сябе 60 секунд і можа садзіцца, калі думае, што хвіліна ўжо прайшла.
3. Сеўшы, яны зноў могуць расплюшчыць вочы. Важна, каб практыкаванне праходзіла ў цішыні.

Гэтая размінка можа быць выкарыстана для таго, каб звярнуць увагу ўдзельнікаў на тое, што мы ўсе па-рознаму ўспрымаем час. Нягледзячы на тое, што мы належым да адной культуры, час мы ўспрымаем па-рознаму.

(NB: Над тым/той, хто сеў(ла) апошнім(яй), не трэба смяяцца. Можа быць, у чалавека проста «павольны» дзень...)

**Шыхтаванне**

Гэтае простае практыкаванне дапамагае лепш зразумець значэнне супрацоўніцтва і месца чалавека або групы людзей у грамадстве.

Задача ў тым, каб выбудаваць шыхт па вызначанай прыкмеце. Напрыклад, па росту, калі самы высокі становіцца на адным канцы, а самы нізкі — на другім. Група можа таксама выбудоўвацца па больш складаных прыкметах, такіх, як, напрыклад, узрост, колькасць дзён, пакінутых да дня нараджэння, памер абутку і інш. Пры выбудоўванні не дазваляецца ні размаўляць, ні пісаць. Пасля таго, як група выбудавалася, вядучы правярае правільнасць пабудовы.

Пасля завяршэння практыкавання група можа прааналізаваць, як складалася супрацоўніцтва. Калі было цяжэй за ўсё выбудаваць шыхт? Чаму? Ці патрэбен быў групе лідэр для таго, каб скаардынаваць працу? Якія высновы можна зрабіць з гэтага?

**Вецер дзьме**

Усе ўдзельнікі, акрамя аднаго — вядучага, садзяцца на крэслы, утвараючы кола. Вядучы кажа, напрыклад: «Вецер дзьме на таго, хто ў красоўках», і тады ўсе ўдзельнікі, абутыя ў красоўкі, павінны ўстаць, знайсці іншае вольнае крэсла і сесці на яго. Той, хто застаўся без крэсла, становіцца вядучым, устае ў кола і кажа: «Вецер дзьме на таго, у каго... (напрыклад, ёсць упрыгожанні, рамень, чырвоныя туфлі, акуляры і інш.), і гульня працягваецца.

**Дакраніся да пляча**

Удзельнікі становяцца ў кола, тварам унутр. Адзін чалавек стаіць па-за колам, яго задача — дакрануцца да пляча аднаго з тых, хто стаіць у коле. Той, да каго дакрануліся, выбягае з кола, бяжыць па колу на сваё месца. Той, хто дакрануўся, таксама бяжыць па колу, але ў іншым накірунку. На паўдарозе яны сустракаюцца, вітаюцца і называюць свае імёны. Толькі пасля гэтага ім можна працягнуць бег. Той, хто прыбяжыць апошнім, застаецца па-за колам, зноў пачынае гульню — дакранаецца да пляча ўжо іншага ўдзельніка.

**Дом, чалавек, землятрус**

Удзельнікі дзяляцца на групы па трое і ўтвараюць фігуры. Двое з кожнай тройкі бяруцца за рукі і паднімаюць іх. Гэта «дом». Трэці ўдзельнік — «чалавек» заходзіць пад рукі двух першых, у «дом». Рукі апускаюцца, зачыняючы «чалавека» ў сярэдзіне «дома» і абараняючы яго. «Дамы» неабходна ўтварыць па колькасці троек. Адзін удзельнік — вядучы стаіць у цэнтры, акружаны «дамамі».

Задача вядучага — сказаць «дом», «чалавек» або «землятрус». Калі вядучы кажа «дом», то ўдзельнікі, якія ўтвараюць дамы, паднімаюць рукі, выпускаюць аднаго «чалавека» і спрабуюць знайсці сабе іншага. Калі вядучы кажа «чалавек», то ўсе «людзі» выходзяць з «дамоў» і спрабуюць знайсці сабе новыя «дамы». Тады ўсе ўдзельнікі, якія ўтвараюць дамы, павінны падняць рукі так, каб «людзі» маглі «заходзіць» і «выходзіць». Калі вядучы, які стаіць у цэнтры, кажа «землятрус», усе «дамы» «бурацца» і трэба «будаваць» іх па-новаму, з новых удзельнікаў. Вядучы, які да гэтага

казаў «дом», «чалавек» або «землятрус», цяпер таксама ўключаецца ў гульню і становіцца «домам» або «чалавекам». Удзельнік, які застаўся адзін і не стаў ні «чалавекам», ні «домам», становіцца ў цэнтр і вядзе гульню далей.

У гэтую гульню неабходна згуляць некалькі разоў, перш чым усе зразумеюць яе сэнс і разбяруцца, што яны павінны рабіць. Але калі ўсе зразумеюць правілы і ўцягнуцца, гульня стане дынамічнай і вясёлай.

**Мама з дзецьмі, слон і пальма**

У гэтым практыкаванні ўдзельнікі ўтвараюць фігуры. Усе становяцца ў кола, тварам адзін да аднаго, а ў цэнтры кола вядучы. У пачатку гульні вядучы дае каманды: «маці і дзеці», «слон» або «пальма» і паказвае на аднаго з удзельнікаў. Абраны ўдзельнік разам са сваімі суседзямі ўтвараюць фігуру, а вядучы пачынае лічыць. Калі яны не паспеюць утварыць фігуру да ліку «дзесяць», сярэдні ўдзельнік з тройкі становіцца вядучым, устае ў цэнтр і выбірае новага ўдзельніка, а той са сваімі суседзямі ўтвараюць новую фігуру.

Перад пачаткам гульні важна растлумачыць, як будуюцца фігуры. Можна ўзяць трох удзельнікаў і паказаць на іх, як будаваць фігуру. Пасля таго, як яны «разагрэліся» і навучыліся хутка і без памылак будаваць фігуры, вядучы можа прапанаваць ім пабудаваць новыя фігуры. Можна, напрыклад, прапанаваць «матацыкл», «цягнік» і «самалёт». Гэтае практыкаванне вельмі дынамічнае і вясёлае.

**«Маці і дзеці».** Удзельнік, якога абралі, паказвае маці, якая размешвае суп у вялікай каструлі. Адной рукой ён паказвае каструлю, а другой размешвае ў ёй суп шырокімі кругавымі рухамі. Удзельнікі па баках садзяцца на кукішкі і паказваюць дзяцей, якія смокчуць вялікі палец у чаканні ежы.

**«Слон».** Удзельнік, якога абралі, паказвае хобат слана, выцягваючы наперад рукі, складзеныя разам, і рухаючы імі ўверх і ўніз. Удзельнікі па баках паказваюць вушы слана, выцягваючы рукі над галавой у паўкола, адначасова адхіляючыся ў бок ад «хобата».

**«Пальма».** Удзельнік, якога абралі, падымае рукі ўверх, паказваючы самае высокае лісце пальмы. Удзельнікі па баках выцягваюць рукі ўверх і паказваюць бакавое лісце пальмы, нахіліўшыся па баках.

**Фігуры**

Утвараюцца два колы з роўнай колькасцю ўдзельнікаў, адно кола ў сярэдзіне другога. Удзельнікі становяцца тварам да твару, з прамежкам у 1 метр. Тыя, што знаходзяцца ўсярэдзіне, павінны стаяць нерухома, а тыя, што звонку, надаюць «унутраным» форму, рухаючы іх рукамі, нагамі, галовамі і г.д. Калі адзін удзельнік стварыў з іншага фігуру, ён пераходзіць да наступнага. Тыя ўдзельнікі, каму ўжо надалі форму, павінны застыць у гэтым становішчы, пакуль наступны ўдзельнік не прыйдзе і не створыць для яго новую форму. Прыкладна праз пяць хвілін удзельнікі мяняюцца месцамі, гэта значыць, «унутраныя» становяцца «вонкавымі» і надаюць форму «ўнутраным».

Пасля таго, як удзельнікі нейкі час папрактыкаваліся, неабходна падвесці вынікі і прааналізаваць гульню. Што адчувалі ўдзельнікі, калі надавалі форму іншым? Што яны адчувалі, калі ім самім надавалі форму? На што ў іх ішло больш часу: на тое, каб надаць форму іншым, або на прыняцце формы? Чаму? Якую выснову мы можам для сябе з гэтага зрабіць?

Гэтае практыкаванне паказвае, што людзі фарміруюць адзін аднаго праз кантакт і зносіны. Мы выпрабоўваем на сабе ўплыў іншых і з'яўляемся ў пэўнай ступені «прадуктам» іншых. Таму мы павінны клапаціцца пра іншых і ўплываць адзін на аднаго станоўча. Гэтае практыкаванне можна выкарыстоўваць у сувязі з тэмамі «ідэнтычнасць» і «міжкультурнае ўзаемаразуменне».

**Дакрануцца да падлогі**

1. Растлумачце ўдзельнікам, што да падлогі дазволена дакранацца толькі 9 часткамі цела: абедзвюма нагамі, абедзвюма рукамі, лакцямі, каленямі і лбом.
2. Удзельнікі — у цэнтры пакоя. Вядучы называе лічбы ад 1 да 9, напрыклад 6, і абвяшчае, што ўдзельнікі павінны дакрануцца да падлогі 6 часткамі цела. Паўтарыце яшчэ раз, выбраўшы лічбу ад 1 да 9.
3. Далей удзельнікам неабходна знайсці сабе партнёра. Выберыце лічбу ад 2 да 18. Цяпер удзельнікам прыйдзецца ў пары ўтварыць фігуру і дакрануцца да падлогі столькімі часткамі, колькі было названа вядучым. Паўтарыце яшчэ раз.
4. На заключным этапе ўдзельнікі разбіваюцца на яшчэ большыя групы, напрыклад, па чатыры, шэсць або дзевяць чалавек. Вядучы называе лічбу, якая абазначае колькасць пунктаў (частак цела), якімі гэтая група павінна дакрануцца да падлогі.

Пасля таго, як гэтае практыкаванне праведзена некалькі разоў, можна коратка падагульніць. Пра што думалася ўдзельнікам, калі ім прыйшлося «ахвяраваць сабой» і ўскласці на сябе выкананне самых складаных задач? Ці ўсе ў групе атрымалі магчымасць прыняць рашэнне, каб выканаць заданне?

Дадзенае практыкаванне дэманструе, што часам нам неабходна прымаць калектыўнае рашэнне, і тады ва ўсіх нас розныя ролі. Часам нам прыходзіцца «ахвяраваць сабой» і брацца за выкананне складаных задач.

**«Сляпы»**
Удзельнікі размяшчаюцца ў коле, седзячы на падлозе. У сярэдзіне ўдзельнік з заплюшчанымі вачыма, які прыкідваецца сляпым. Перад «сляпым» ляжыць якая-небудзь рэч, напрыклад ключы. Тыя, хто сядзіць у коле, спрабуюць па чарзе падкрасціся да «сляпога» і «выкрасці» ключы. «Сляпому» забаронена падглядваць, а астатнім удзельнікам — падкрадацца ўсім разам адначасова ці шумець, каб адцягнуць увагу. Калі «сляпы» адчувае, што хтосьці набліжаецца да ключоў, ён(яна) павінен(на) паказаць ці ўказаць у той бок. Калі ён(яна) не памыліўся, то той удзельнік, які падкрадаўся, вяртаецца на месца і саступае наступнаму. Той, у каго атрымаецца выкрасці ключы, — наступны «сляпы».

**Танец пад музыку**
Удзельнікі сядзяць на падлозе ў коле, вядучы — у сярэдзіне. Іграе спакойная музыка. Усе слухаюць у цішыні. Праз некаторы час вядучы ўстае, падыходзіць да аднаго з ўдзельнікаў і паказвае рухам рукі, каб той/тая ўстаў(ла). Вядучы «дырыжыруе» выбраным удзельнікам, паказваючы рухі сваёй далонню. Удзельнік «танчыць», паўтараючы гэтыя рухі і трымаючы сваю далонь сіметрычна далоні вядучага на адлегласці прыкладна 10 см. У хуткім часе вядучы просіць іншага ўдзельніка заняць яго месца і выклікае новага сабе ў пару і г.д. Паступова ў коле з'яўляюцца некалькі такіх «танцуючых» пар, дзе адзін — вядучы, а другі — танцуючы.

«Натанцаваўшыся», можна абмеркаваць дадзенае практыкаванне і тое, што адбывалася. Асноўная выснова — людзі ўплываюць адзін на аднаго і фармуюць адзін аднаго.

**«Чалавечая машына»**
Дадзенае практыкаванне паказвае, наколькі мы залежныя адзін ад аднаго і што часта нам прыходзіцца супрацоўнічаць, каб дамагчыся той або іншай мэты. Практыкаванне паказвае таксама, што разам мы можам дамагчыся больш, чым паасобку.

Удзельнікі становяцца ў шэраг у пакоі. Заданне — стварыць «чалавечую машыну». Адзін удзельнік пачынае з якога-небудзь руху і гуку, якія ён/яна працягвае паўтараць яшчэ і яшчэ. Гэта можа быць, напрыклад, паварот галавы справа-налева, зноў і зноў. Наступны ўдзельнік прыдумляе іншы рух і гук, якія падыходзілі б да першага. І так па шэрагу -- усе ўдзельнікі са «сваімі» рухамі і гукамі. Вядучы можа нагадваць, што рухі і гукі павінны гарманіраваць з рухамі ўдзельнікаў, якія стаяць побач. Такім чынам ствараецца «чалавечая машына». Калі «машына» створана, вядучы можа задаваць тэмп яе «працы»: хутчэй-павольней і гук яе «працы»: цішэй-гучней.





# РАЗДЗЕЛ 4

## Правы чалавека

Што на самой справе гэта такое — правы чалавека? У гэтым раздзеле мы бліжэй падыдзем да гэтага паняцця і пагаворым пра тое, што правы чалавека — гэта, з аднаго боку, этычныя нормы паводзін людзей у грамадстве і, з іншага боку, юрыдычныя абавязацельствы дзяржаў у адносінах да сваіх грамадзян. Мы таксама закранем гісторыю правоў чалавека. Паваротнай падзеяй у гісторыі іх развіцця стала прыняцце Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека ў 1948 годзе, пасля заканчэння Другой сусветнай вайны. Пасля таго, як дзяржавы пагадзіліся адносна правоў чалавека, была распачата праца па іх ажыццяўленні. У дадзеным раздзеле мы закранем механізмы абароны правоў чалавека і таго, як на самой справе яны працуюць. Паколькі адна справа — запісы на паперы, зусім іншае — як гэта працуе ў рэальным жыцці.

Растлумачыць, што такое правы чалавека, можа быць як лёгкім, так і складаным заданнем. Усё залежыць ад таго, якія мэты ставяцца. Прыводзячы прыклады з жыцця, мы паспрабуем акрэсліць самыя важныя аспекты правоў чалавека.

Кожную хвіліну на Зямлі нараджаецца каля 150 дзяцей. Хтосьці з іх нараджаецца ў Еўропе, хтосьці — у Афрыцы, Азіі, Аўстраліі або ў Амерыцы. У кагосьці з іх цёмны колер скуры, у кагосьці — светлы. Хтосьці — хлопчык, а хтосьці — дзяўчынка. Незалежна ад таго, дзе з'яўляюцца на свет гэтыя дзеці і ў якіх умовах, усе яны — неабароненыя істоты, цалкам залежныя ад клопату людзей, якія іх акружаюць. Ніводнае немаўля не можа выжыць толькі сваімі ўласнымі сіламі. Без ежы і клопату ён(яна) загіне. Аднак, хаця яны і бездапаможныя, у іх шмат сілы. Яны дапытлівыя, у іх ёсць здольнасць успрымаць веды і жаданне выжыць. Патрапіўшы ў добрыя ўмовы для жыцця, у іх будзе магчымасць стаць асобамі.

Праблема ў тым, што ў сучасным свеце дзеці нараджаюцца ў неаднолькавых умовах, вырастаюць у розных краінах і ў розных рэчаіснасцях. Хтосьці нараджаецца ў мірнай дэмакратычнай дзяржаве, дзе магчымасці больш-менш для ўсіх роўныя. Хтосьці нараджаецца ў дзяржаве, дзе ідзе вайна або іншыя канфлікты; дзе мала ежы і жылля; дзе людзі ўшчэмлены ў правах і не маюць магчымасці прымаць удзел у грамадскім жыцці на роўных; дзе няма магчымасці хадзіць у школу, вучыцца і развівацца. Хтосьці жыве ў страху і не мае магчымасці выказацца. Ва ўсіх гэтых дзяцей сумныя перспектывы далейшага жыцця і росту, задавальнення сваіх патрэб і жаданняў, перспектыў уплыву на жыццё свайго ўласнага грамадства.

Якія адносіны ўсё гэта мае да правоў чалавека?

Да правоў чалавека гэта мае адносіны ў тым сэнсе, што яны «спрабуюць» змяніць апісаную рэчаіснасць. Мэта ў такім разе — забяспечыць усім без выключэння годнае жыццё. Самая галоўная характарыстыка правоў чалавека — тое, што яны абараняюць абсалютна ўсіх, незалежна ад таго, які колер скуры ў чалавека, хлопчык ён ці дзяўчынка, — у кожнага ёсць чалавечая годнасць. Для абароны годнасці чалавека і існуюць правы чалавека, якія вызначаюць мінімальныя ўмовы існавання чалавека. Калі няма годных умоў для жыцця, годнасць чалавека знявакана. Такія правы, як права на жыццё, ежу, свабоду і асабістую недатыкальнасць, развіццё і ўдзел у жыцці грамадства і дзяржавы, атрыманне ад грамадства і дзяржавы дапамогі ў выпадку нястачы ці хваробы — мінімальныя стандарты, замацаваныя ў міжнародных дакументах і канстытуцыях дзяржаў. Правы чалавека існуюць для таго, каб самыя асноўныя патрэбы чалавека былі забяспечаны. Як відаць з прыведзенага тут спісу, гаворка ідзе не толькі пра матэрыяльныя патрэбы, але і пра патрэбы чалавека як істоты сацыяльнай. Ні ў якім разе нельга супрацьпастаўляць адны патрэбы другім, тлумачыць сутнасць правоў чалавека толькі на нейкай адной групе патрэб.

Гістарычнае развіццё паказвае, хто і што стаіць на варце правоў чалавека. Якраз таму, што мы нараджаемся і паміраем у межах той ці іншай дзяржавы, дзяржаўныя ўлады абавязаны захоўваць нашы правы.

Гістарычнае развіццё таксама паказвае, што, хаця правы чалавека і ўніверсальныя, г.з. распаўсюджваюцца на ўсіх людзей, шмат яшчэ патрэбна зрабіць, каб яны сапраўды «працавалі на карысць» усіх людзей на Зямлі.

Акаляючая нас рэчаіснасць добра дэманструе, якія аспекты правоў чалавека важныя сёння. Правы чалавека — гэта правы *чалавека* і абавязкі *дзяржавы*.

«Калі я кажу, што ў мяне ёсць права на нешта, гэта значыць, што тыя, у каго ёсць улада, павінны папрацаваць і зрабіць нешта для мяне.

Калі ж у мяне ёсць нейкая свабода, гэта значыць, што ёсць такая сфера ў маім жыцці, у якую тыя, у каго ёсць улада, не павінны ўмешвацца. Маё права — гэта абавязак улады нешта зрабіць, мая свабода — гэта забарона ёй дзейнічаць у якой-небудзь галіне».

*М. Навіцкі «Улада і асоба»*

Ідэя, у прынцыпе, простая. Мэта — дасягнуць ажыццяўлення гэтай ідэі — прыгожая, але складаная. Правы чалавека — гэта як мінулае, так і сучаснасць, гэта інструмент сёння і мэта заўтрашняга дня.

Правы чалавека вызначаюць, якія абавязацельствы ўлады маюць у адносінах да людзей. Кожная дзяржава адказвае за забеспячэнне аднолькавага стаўлення да ўсіх людзей незалежна ад колеру скуры, полу, мовы, рэлігіі, палітычных ці іншых поглядаў, нацыянальнасці і сацыяльнага паходжання, маёмаснага становішча, нараджэння і іншых умоў. Улады нясуць адказнасць за прадастаўленне кожнаму свабод (слова, сумлення, перасоўвання, сходаў і асацыяцый) і правоў (на ўдзел у кіраванні дзяржавай, на інфармацыю, на справядлівы суд, на ўласнасць, на карыстанне дасягненнямі культуры), абароны (ад дыскрымінацыі, ад катаванняў і жорсткага абыходжання, ад любога самаўпраўства з боку ўладных структур) і сацыяльных даброт, такіх як бясплатная пачатковая і сярэдняя адукацыя, медыцынская дапамога, сацыяльная падтрымка.

## Этычныя асновы

Сутнасць правоў чалавека — у жаданні абараніць чалавечую годнасць. З гэтай мэтай правы чалавека вызначаюць некаторыя асноватворныя стандарты жыцця, якія павінны быць выкананы. Іх універсальнасць вынікае з таго, што, прынамсі, ў гэтых адносінах усе людзі роўныя. Такім чынам, чалавечая годнасць і раўнапраўе — гэта ключавыя каштоўнасці правоў чалавека. Правы чалавека заснаваны на этычных нормах. Права на жыццё (гэта значыць забарона смяротнага пакарання і любых пазасудовых распраў) заснавана на ўяўленні аб недапушчальнасці пазбаўлення жыцця. Права на свабоду вынікае з уяўлення аб недапушчальнасці ўтрымліваць кагосьці ў няволі. Права на абарону ад дыскрымінацыі заснавана на ўяўленні аб тым, што ўсе мы, незалежна ад нашых адрозненняў, — прадстаўнікі роду чалавечага. Права на годны ўзровень жыцця заснавана на ўяўленні аб недапушчальнасці адмаўляць людзям у ежы і неабходных для жыцця рэчах. Права на інфармацыю і свабода слова патрэбны ўсім нам таму, што чалавек не можа існаваць без стасункаў з іншымі людзьмі, а недатыкальнасць прыватнага жыцця і свабода пераканання ў — таму, што кожнаму з нас неабходна асабістая прастора, якую ніхто не павінен парушаць без яго згоды.

Чалавечая годнасць і раўнапраўе гэта ключавыя каштоўнасці правоў чалавека.

Ці ўяўляюць, зыходзячы з гэтага, правы чалавека найменшае агульнае кратнае ўніверсальнай этыкі? Многія лічаць, што так, у той час, як іншыя сцвярджаюць, што маральныя нормы зменлівыя і залежаць ад часу і месца. У нас зараз няма неабходнасці даваць ацэнку гэтаму пытанню. Дастаткова сказаць, што правы чалавека прызнаюцца сёння ўсімі дзяржавамі, з чаго мы можам зрабіць выснову, што іх этычныя асновы таксама падзяляюцца ва ўсім свеце.

Асноватворныя этычныя каштоўнасці складаюць падмурак і забяспечваюць нарматыўную легітымнасць міжнароднай сістэме правоў чалавека, якая стваралася пасля Другой сусветнай вайны і якая вызначае правы людзей і надзяляе дзяржавы абавязкамі іх забяспечваць. Паколькі ўсе людзі жывуць у дзяржавах, то дзяржавы павінны ствараць умовы для выканання і самі выконваць правы чалавека. Таму ўлада дзяржавы не можа быць абсалютнай. Яна павінна абмяжоўвацца такім чынам, каб для насельніцтва краіны ствараліся мінімальныя стандарты годнага жыцця.

Правы чалавека гэта тыя правы, якія павінны мець людзі ў адносінах да дзяржавы, у якой яны жывуць.



## Перадгісторыя

Гісторыя правоў чалавека такая ж старажытная, як і гісторыя самога чалавецтва. На працягу стагоддзяў людзі змагаліся з несправядлівасцю і аўтарытарнымі кіраўнікамі, за свабоду і лепшыя ўмовы жыцця. У гісторыі чалавецтва правы чалавека прайшлі шлях ад ідэі да канкрэтных правоў, за якія змагаюцца групы людзей і асобныя людзі, і нарэшце — да міжнародных абавязацельстваў дзяржаў.

Асноўны механізм правоў чалавека заснаваны на старажытнай ідэі прад'яўлення ўмоў тым, хто мае ўладу, каб яны не маглі ажыццяўляць сваю ўладу бескантрольна, а дзейнічалі на карысць свайго народа. Ужо 4000 гадоў таму ў Іраку ў Законах Хамурапі адзначалася, што ўлада не павінна ажыццяўляцца адвольна: «Няхай царствам кіруе справядлівасць (…) і не дазволіць моцным прыгнятаць слабых… адукоўвае краіну і будзе на карысць народа». Але хаця ідэя правоў чалавека неаднаразова ўзнікала потым у гісторыі філасофіі, гісторыя чалавецтва ў значнай ступені стваралася кіраўнікамі, якія эксплуатавалі свой народ або ўцягвалі яго ў войны і канфлікты.

Паралельна з тэхналагічнымі, эканамічнымі і палітычнымі зменамі змяніліся таксама і ўладныя адносіны ў грамадстве. Павольна, але слушна розныя групы вылучалі патрабаванні аб пашырэнні свабоды і павазе да сваіх правоў. Тыя, хто валодалі ўладай, паступова былі вымушаны лічыцца з гэтымі патрабаваннямі.

Першым важным дакументам, які вызначыў правы індывідаў у адносінах да ўлад, была англійская Вялікая Хартыя вольнасцяў 1215 г. Гэтая «Вялікая дэкларацыя правоў» была напісана дваранамі і духавенствам у знак пратэсту супраць злоўжывання каралём сваёй уладай, каб прымусіць яго падпарадкоўвацца закону. У гэтым дакуменце быў пералічаны шэраг свабод, такіх як права грамадзян на ўласнасць, забарона празмерна высокіх падаткаў і роўнасць перад законам. Хаця кароль і не выконваў Вялікую хартыю, гэты дакумент меў вялікі ўплыў, яго часта цытавалі і спасылаліся на яго.

У 17 і 18 стагоддзях шэраг еўрапейскіх філосафаў, у тым ліку Джон Лок (1632—1704 г.), увялі паняцце «натуральныя правы чалавека». Гэта правы, якія належаць чалавеку толькі таму, што ён з'яўляецца чалавекам, а не таму, што ён мае адносіны да той ці іншай краіны, рэлігіі або групы. Ідэі Лока аказалі вялікі ўплыў на развіццё правоў чалавека ў эпоху Асветы. Ён лічыў, што ўсе людзі нараджаюцца свабоднымі і роўнымі і валодаюць аднолькавымі правамі. У сваёй тэорыі прававой дзяржавы ён сцвярджаў, што законы павінны распаўсюджвацца і на кіраўнікоў.

Ідэі Асветы аб правах чалавека таксама мелі вялікі ўплыў у Францыі ў 18 стагоддзі. Расла незадаволенасць грамадзян палітыкай эксплуатацыі, якую праводзіў кароль і арыстакратыя, у тым ліку празмернымі падаткамі.

Падчас Французскай рэвалюцыі 1789 г. грамадзяне аб'ядналіся пад лозунгам «Свабода, роўнасць і братэрства» і ў адпаведнасці з філасофіяй Лока сталі вылучаць патрабаванні свабоды слова, сумлення, законнасці, абароны права ўласнасці і права займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю. У Дэкларацыі правоў чалавека і грамадзяніна, якая з'явілася на хвалі рэвалюцыі, гаварылася, што «людзі нараджаюцца і застаюцца свабоднымі і роўнымі ў правах». Новыя ідэі аб тым, як арганізоўваць адносіны паміж грамадзянамі і ўладамі, уключаючы прынцып роўнасці перад законам, прыйшлі на змену ранейшай сістэме прывілеяў арыстакратыі. Хаця за рэвалюцыяй наступіла рэакцыя, і тысячы людзей былі незаконна пазбаўлены жыцця падчас крывавых беспарадкаў і ў наступныя гады, дэкларацыя ўсё ж мела вялікае значэнне для палітычнага развіцця ў Еўропе.

У канцы 18 стагоддзя ідэі правоў чалавека атрымалі падтрымку і ў Амерыцы. У 1776 г. большасць брытанскіх калоній у Паўночнай Амерыцы абвясцілі сваю незалежнасць ад Брытанскай імперыі. У Амерыканскай Дэкларацыі незалежнасці быў замацаваны шэраг правоў чалавека. У 1791 г. пад уплывам Французскай рэвалюцыі ў Канстытуцыю былі ўнесены папраўкі, якія гарантавалі грамадзянам шэраг свабод і атрымалі назву Біль аб правах.

Французская і амерыканская дэкларацыі набылі міжнароднае значэнне, а правы чалавека былі ўключаны ў многія канстытуцыі, якія прымаліся ў той час у Еўропе. Канстытуцыя Нарвегіі гарантуе, напрыклад, такія правы, як свабода слова, права ўласнасці і не быць пакараным без справядлівага судовага разбіральніцтва.

Хаця асобныя дзяржавы і ўключалі правы чалавека ў свае канстытуцыі, правы чалавека ўсё ж не сталі ўніверсальнымі, гэта значыць не распаўсюджваліся на ўсіх людзей ва ўсім свеце.

## Правы чалавека ў Беларусі. Гістарычны агляд

Праблема правоў чалавека мае даволі багатую гісторыю і ў Беларусі. Звязваецца яна са з'яўленнем першых помнікаў права — апублікаваных збораў законаў. Да іх належыць збор княскіх пастаноў X—XII стст. «Руская праўда», Полацкія і Смаленскія граматы XIII-XIV стст., якія замацоўвалі правы асобных катэгорый жыхароў гэтых земляў, напрыклад, права халопаў валодаць маёмасцю, займацца гандлем і г.д.

Першым узорам феадальнай прававой дзяржавы на беларускіх землях было Вялікае княства Літоўскае, Рускае, Жамойцкае і іншых земляў (ВКЛ). Развіццё дзяржаўнага заканадаўства Вялікага княства замацавана ў Статутах 1529-га, 1566-га і 1588-га гадоў. Дзяржаўнае заканадаўства княства ў XV—XVI стст. грунтавалася на папярэдніх прававых распрацоўках: на беларускіх землях да XV ст. дзейнічала звычаёвае права, якое рэгулявала ўсе правадачыненні ў грамадскім жыцці паводле народных звычаяў і традыцый. У Статутах выкладзены нормы, якія вызначылі парадак утварэння і дзейнасці дзяржаўных органаў, саслоўныя правы. У Статуце 1588 года замацаваны прынцып адзінства права для ўсяго насельніцтва ВКЛ, сюды ўвайшлі нормы дзяржаўнага (гэтак званага канстытуцыйнага) права. Гэта было новай з'явай нават у заканадаўчай практыцы еўрапейскіх краін. У Статуце 1588 года размежаваны паўнамоцтвы заканадаўчай і выканаўчай галін улады. Законы выдаваліся абраным прадстаўнічым органам — Соймам, а вялікі князь меў толькі права подпісу законаў.

Статут 1588 года аказаў уплыў на далейшае развіццё заканадаўчых актаў на тэрыторыі Беларусі. На падставе яго ных палажэнняў была складзена першая ў Еўропе Канстытуцыя — Канстытуцыя Рэчы Паспалітай (1791 г.). Пасля далучэння Беларусі да Расійскай імперыі амаль да 1830 года тут захоўвалася дзеянне Статута.

На фарміраванне стаўлення да правоў чалавека ў беларускім грамадстве паўплывала таксама тое, што тут мірна ўжываліся дзве хрысціянскія канфесіі — каталіцтва і праваслаўе. Беларускі менталітэт адмаўляў унітарнасць грамадска-палітычнага жыцця, нецярпімасць да іншадумства, канцэнтрацыю ўсёй улады ў руках адной асобы. Рэлігійная талерантнасць суседнічала побач з цярпімасцю да іншага ладу жыцця, звычаяў, паводзін. Беларусь стала другой радзімай для соцень тысяч яўрэяў, выгнаных з краін Заходняй Еўропы і Міжземнамор'я. У беларускім грамадстве яўрэі захавалі свае нацыянальныя традыцыі, данеслі свой нацыянальны генафонд да XX ст. У Беларусі нарадзіліся першы прэзідэнт Ізраіля Хаім Вейцман, прэм'ер-міністры гэтай краіны Менахем Бегін і Шымон Перас.

У XVI ст. у Беларусі шырока распаўсюджваюцца ідэі эпохі Рэнесансу і Рэфармацыі — гуманізму, зацвярджэння самакаштоўнасці чалавека і яго жыцця. Адзін з буйных прадстаўнікоў грамадскай думкі Беларусі таго часу А. Валян пісаў: «А то з'яўляецца непарушным і вечна працягнутым правам чалавечай прыроды: нікому не рабіць крыўды, кожнаму аддаць тое, што яму належыць».

Амаль да XIX ст. у беларускай гісторыі няма выпадкаў асуджэння да смяротнага пакарання за вальнадумства, атэізм і інш. На беларускай зямлі знаходзілі абарону дысідэнты з суседніх краін, напрыклад рускія стараверы, якія захавалі сваю веру і да цяперашніх часоў. У Беларусі ў XV—XVI стст. знайшлі прытулак і падтрымку прыхільнікі розных радыкальных плыняў краін Еўропы і Азіі. Тут шырока распаўсюдзіліся ідэі іспанскага філосафа, ідэолага найбольш радыкальнага крыла Рэфармацыі Мігеля Сэрвэта, разгарнулі сваю дзейнасць арыяне з іх сацыяльным ідэалам камун. Адсутнасць сацыяльнага, рэлігійнага і палітычнага прыгнёту ў Вялікім княстве Літоўскім, а потым і ў Рэчы Паспалітай, у склад якой уваходзілі беларускія землі, прыцягнула ўвагу французскіх вучоных-энцыклапедыстаў. Рэч Паспалітую яны лічылі найбольш дасканалай дзяржавай, прыкладам для іншых краін. Жан Жак Русо, вядомы французскі пісьменнік і філосаф, нават меркаваў пераехаць у Беларусь, куды яго запрашаў буйны землеўласнік з Гродзеншчыны Антоній Тызенгаўз. Толькі выпадак перашкодзіў выкананню гэтага плана.

Ва ўмовах Расійскай імперыі пытанні выканання правоў чалавека і павагі да іх знаходзілі належнае месца ў праграмах нацыянальна-вызваленчага руху. У паўстаннях 1794 і 1830—1831 гадоў жыхары гарадоў выступалі за вяртанне гарадскога самакіравання паводле магдэбургскага права. З тых часоў у Беларусі папулярны заклік: «За вашу і нашу свабоду».

У свядомасці беларускага грамадства з даўніх часоў усталявалася думка пра тое, што не кіраўнікі дзяржавы ці ўрад даюць чалавеку яго асноўныя правы. Яны толькі складаюць законы, закліканыя абараняць правы чалавека, якія ён мае па факце нараджэння. У сярэдзіне XVII ст. вядомы правазнаўца Беларусі і Літвы Адам Алізароўскі пісаў: «Правіцелі не маюць права ўкінуць сваіх падданых у няволю не толькі сілай, але і ўстанаўленнем правоў. Гэтаму прынцыпова супраціўна Боская права, прыроднае права і права народаў. Бо ніякія законы не могуць санкцыянаваць несправядлівасць».

Чарговая спроба пабудовы прававой дзяржавы была зроблена ў лютым 1918 года. 19 лютага Выканаўчы камітэт 1-га Усебеларускага з'езду (снежань 1917 г.) пастанавіў узяць уладу ў свае рукі, што было зафіксавана ў Першай Устаўной грамаце. Наступнымі ўстаўнымі граматамі абвяшчалася Беларуская Народная Рэспубліка і незалежнасць Беларусі. Граматамі закладваліся асновы Канстытуцыі БНР, былі сфармуляваны агульнадэмакратычныя прынцыпы пабудовы прававой дзяржавы. Так, Другая Устаўная грамата абвяшчала свабоду слова, друку, сходаў, безумоўную свабоду сумлення, недатыкальнасць асобы, роўныя правы ў карыстанні роднай моваў для ўсіх народаў, што жылі ў Беларусі.

*(Паводле С.С.Бубен, Т.С. Процька «Правы чалавека». Мн., 2001)*

## ААН і ўніверсальныя правы чалавека

Сучасныя міжнародныя правы чалавека ўпершыню ўбачылі свет у рамках ААН (Арганізацыі Аб'яднаных Нацый) у 1948 г., калі была прынята Ўсеагульная дэкларацыя правоў чалавека. Толькі тады правы чалавека ўпершыню сталі ўніверсальнымі.

Перадумовамі прыняцця Ўсеагульнай дэкларацыі сталі Другая сусветная вайна і стварэнне ААН. Вайна забрала больш за 50 мільёнаў жыццяў, былі разбураны і знаходзіліся ў руінах цэлыя краіны і тэрыторыі. Нацысцкі рэжым, акрамя захопніцкай вайны супраць іншых краін, вёў вайну супраць асобных груп насельніцтва. Яўрэі, цыгане, гомасэксуалісты, інваліды і іншыя прызнаваліся непаўнавартаснымі нацысцкім рэжымам. Нацысцкая дзяржава інстытуцыяналізавала дыскрымінацыю і прыняла законы аб розным стаўленні да людзей. Нюрнбергскія законы 1935 г. абвяшчалі:

*Забараняюцца шлюбы паміж яўрэямі і грамадзянамі нямецкай ці роднаснай крыві (…) Забараняюцца пазашлюбныя сувязі паміж яўрэямі і грамадзянамі нямецкай ці роднаснай крыві. (…) Тыя, хто парушаць гэту забарону, будуць несці пакаранне ў турме.*

Канцэнтрацыйныя лагеры або лагеры знішчэння, як іх яшчэ называюць, сталі жахлівым сімвалам зла. У іх былі забіты мільёны людзей, 6 мільёнаў — проста таму, што яны яўрэі.

Агульны вопыт людзей і ўладаў, якія перажылі жахі Другой сусветнай вайны, дазволіў ім прыйсці да згоды аб неабходнасці стварэння сусветнай арганізацыі, закліканай працаваць над падтрыманнем міру ў свеце. ААН была створана ў ЗША у чэрвені 1945 г. на канферэнцыі ў Сан-Францыска, дзе абмяркоўваліся мандат і правілы дзейнасці новай арганізацыі.

Тон перамовам задавалі краіны, якія перамаглі ў Другой сусветнай вайне[9]. Першапачаткова іх не моцна цікавілі правы чалавека. Аднак на канферэнцыі прысутнічалі прадстаўнікі многіх недзяржаўных арганізацый, і яны сумесна з дэлегатамі з шэрагу невялікіх краін актыўна лабіявалі правы чалавека, спрабуючы вынесці іх у цэнтр абмеркавання. Акрамя гэтай актыўнасці, была яшчэ адна акалічнасць, якая схіліла дзяржавы да ўключэння правоў чалавека ў кола важнейшых задач ААН: справаздачы аб тым, што адбывалася ў канцэнтрацыйных лагерах падчас Другой сусветнай вайны.

Экстрэмальны характар і маштабнасць таго, што адбылося, расплюшчылі вочы сусветнай супольнасці на неабходнасць міжнароднай абароны правоў чалавека. Такая абарона павінна была абапірацца на міждзяржаўную арганізацыю, якая была б здольная спыніць сілавое ўмяшальніцтва і сачыць за тым, каб дзяржавы прымалі законы, якія адпавядаюць правам чалавека. Нельга было больш дапусціць, каб улады ў нейкай дзяржаве прыгняталі сваё насельніцтва, а іншыя дзяржавы і міжнародная супольнасць не мелі б права і абавязку ўмяшацца. Статут ААН 1945 г. абвяшчае, што ААН павінна працаваць над умацаваннем міру і супрацоўніцтва паміж дзяржавамі і абараняць правы чалавека. Аднак у Статуце ААН не гаварылася аб змесце правоў чалавека. Таму была створана спецыяльная камісія для выпрацоўкі азначэнняў правоў чалавека.

Камісія ААН па правах чалавека складалася з 18 краін-удзельніц, якія прадстаўлялі ўсе кантыненты і належалі да розных рэлігій і светапоглядаў[10]. Пасля двух гадоў перамоў праца камісіі завяршылася прыняццем пастановы аб Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека ад 10 снежня 1948 г., якая ўспрымаецца шмат кім як найважнейшы дакумент, які ААН калі-небудзь распрацоўвала[11]. З 56 дэлегацый 48 прагаласавала «за», 8 устрымалася[12]. Ні адна дзяржава не прагаласавала «супраць».

Усеагульная дэкларацыя складаецца з 30 артыкулаў, якія даюць азначэнні правам чалавека. З прыняццем дэкларацыі правы чалавека сталі часткай міжнароднага публічнага права і глабальнай канцэпцыяй. Упершыню ў гісторыі былі распрацаваны міжнародныя правілы, якія апісваюць тое, як дзяржавы павінны ставіцца да сваіх грамадзян. Такім чынам ААН умешвалася ў суверэнітэт дзяржавы. Тое, як органы ўлады ў дзяржаве ставяцца да свайго насельніцтва, перастала быць унутранай справай дзяржавы, а стала і справай міжнароднай супольнасці.




ААН, 10 снежня 1948 г. Прынята Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека.

## Прыняцце Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека адбылося

Прадстаўнік Амерыкі ў Камісіі па правах чалавека прапанаваў наступны тэкст для Артыкула 1 Дэкларацыі: «Усе людзі створаны роўнымі», ідэнтычна таму, як запісана ў Дэкларацыі незалежнасці ЗША (1776 г.). Жаночы прадстаўнік Індыі выказала нязгоду з тым, што ў Дэкларацыі будзе запісана «ўсе людзі, г. зн., мужчыны» (паколькі «людзі» ў множным ліку перакладаецца і як «мужчыны»). Яе аргумент быў у тым, што фраза можа быць успрынята літаральна, а як жа тады быць з жанчынамі? Прадстаўніку Савецкага Саюза не спадабалася слова «створаны», паколькі яно магло намякаць на «створаны па вобразу і падабенству Бога». Савецкі Саюз не прымаў рэлігію і не мог падпісацца пад падобнай фармулёўкай! Пасля доўгіх дэбатаў нарадзілася нарэшце фармулёўка: «Усе людзі нараджаюцца свабоднымі і роўнымі ў сваёй годнасці і правах».



У кнізе «Гісторыя правоў чалавека» (2004 г.) Мішэліін Р. Ішэй піша, што за кожнай гістарычнай заваёвай у сферы правоў чалавека надыходзіў перыяд рэакцыі. Яркім прыкладам гэтаму можа стаць прынцып усеагульнасці, за які змагаліся яшчэ падчас Французскай рэвалюцыі, але які быў выцеснены нацыяналістычнай рэакцыяй. Аднак яна адзначае, што рэакцыйныя сілы ўсё ж не могуць цалкам адмяніць заваёвы мінулага. Наадварот, гісторыя захоўвае заваёвы правоў чалавека, і кожнае новае пакаленне будуе ўсё новыя чаканні і надзеі і адштурхоўваецца ад таго, што ўжо дасягнулі папярэднікі, і само працягвае змагацца за паляпшэнне свайго існавання і вызваленне ад аўтарытарных кіраўнікоў.

Сучаснае разуменне правоў чалавека, зафіксаванае ва Ўсеагульнай дэкларацыі, можна лічыць сінтэзам некалькіх лепшых эпізодаў бесперапыннага працэсу гістарычнага развіцця чалавецтва.

### Якія правы?

Першыя два артыкулы Ўсеагульнай дэкларацыі ўтрымліваюць у сабе галоўныя каштоўнасці: *чалавечая годнасць і раўнацэннасць*. У Артыкуле 1 гаворыцца, што «усе людзі нараджаюцца свабоднымі і роўнымі ў сваёй годнасці і правах (…)». Артыкул 2 развівае канцэпцыю роўнасці, падкрэсліваючы, што ўсе людзі валодаюць аднымі і тымі ж правамі: «Кожны чалавек павінен валодаць усімі правамі і свабодамі, абвешчанымі дадзенай Дэкларацыяй, без якога б ні было адрознення, як, напрыклад, у адносінах расы, колеру скуры, полу, мовы, рэлігіі, палітычных або іншых перакананняў, нацыянальнага або сацыяльнага паходжання, маёмаснага, саслоўнага або іншага становішча (…)». Гэта палажэнне часта называюць прынцыпам у абарону ад дыскрымінацыі. Артыкулы 3—30 падрабязней вызначаюць змест розных правоў.

Нярэдка правы чалавека падзяляюць на дзве групы: а) асабістыя (іх часта называюць «грамадзянскімі», але гэты ж тэрмін выкарыстоўваецца ў беларускім Грамадзянскім кодэксе ў цалкам іншым значэнні, таму мы рэкамендуем казаць менавіта пра асабістыя правы) і палітычныя правы; б) сацыяльныя, эканамічныя і культурныя правы. Першую групу часта называюць «правамі першага пакалення». Правы, якія адносяцца да яе, былі сфармуляваны ў эпоху Асветы. Другую катэгорыю часта называюць «правамі другога пакалення», іх прызнання дамагаўся міжнародны працоўны рух у сувязі з прамысловай рэвалюцыяй у 19 і 20 стагоддзях[13].

**Асабістыя (грамадзянскія) правы** абараняюць права на жыццё, свабоду і асабістую недатыкальнасць, недатыкальнасць прыватнага і сямейнага жыцця, свабоду думкі і сумлення, права на справядлівы суд і абарону

ад самавольства, свабоду слова і права на інфармацыю, свабоду сходаў і асацыяцый, свабоду перасоўвання.
**Палітычныя правы** абараняюць права на ўдзел у кіраванні краінай — праз права абіраць і быць абраным, права займаць дзяржаўныя пасады без якой-небудзь дыскрымінацыі.
**Эканамічныя правы** забяспечваюць права на годны ўзровень жыцця, а таксама так званыя працоўныя правы: права свабоднага выбару любога віду дзейнасці, не забароненага законам, права на справядлівую аплату працы і спрыяльныя ўмовы працы, права на адпачынак, права на стварэнне і ўдзел у прафсаюзах, права на адстойванне сваіх працоўных інтарэсаў.
**Сацыяльныя правы** забяспечваюць права на падтрымку дзяржавы пры страце працы, хваробе, непрацаздольнасці і ў іншых выпадках, якія знаходзяцца па-за сферай кантролю самога чалавека.
**Культурныя правы** забяспечваюць права на адукацыю, удзел у культурным жыцці, выкарыстанне дасягненняў навукі і мастацтва, абарону аўтарскага права.

## Дакументы і абавязацельствы дзяржаў

Усеагульная дэкларацыя хаця і ўяўляе сабой завершаны працоўны дакумент, але адначасова з'яўляецца і пачаткам, паколькі розніца паміж тэкстам на паперы і рэчаіснасцю застаецца вялікай.

Сіла Ўсеагульнай дэкларацыі ў тым, што яна з'яўляецца ўсеагульнай дамовай і ўяўляе сабой ідэал таго, якім чынам дзяржавы павінны ставіцца да сваіх уласных грамадзян. Прыняцце Дэкларацыі ААН паслужыла сігналам дзяржавам таму, што прынятая дамова павінна паважацца імі. Усеагульная дэкларацыя, такім чынам, — важны палітычны дакумент. Дзяржавы, якія не моцна клапоцяцца аб тым, каб прытрымлівацца прынцыпаў дэкларацыі, шкодзяць сваёй рэпутацыі на міжнародным узроўні. Аднак, як і ў іншых міжнародных дэкларацыях, ва Усеагульнай дэкларацыі ёсць у першую чаргу палітычная і «маральная» сіла, але няма юрыдычнай. Менавіта адсутнасць юрыдычнай сілы прымусіла Камісію па правах чалавека працаваць далей над магчымасцю прыняцця канвенцый аб правах чалавека[14].

Канвенцыя — гэта дакумент, які мае юрыдычны статус і ўяўляе сабой абавязацельствы для дзяржаў. Ратыфікуючы канвенцыі, дзяржавы абавязуюцца прытрымлівацца і выконваць палажэнні, запісаныя ў іх, і рэгулярна прадстаўляць справаздачы ў ААН (звычайна, кожны чацвёрты год) аб ажыццяўленні і выкананні палажэнняў канвенцый.

Перыяд халоднай вайны паміж Захадам і Усходам, ініцыяваны ў 1950—1960-х гадах Савецкім Саюзам і ЗША, паўплываў на эфектыўнасць працы ААН і прытармазіў міжнароднае супрацоўніцтва і магчымасці міжнароднага ўплыву. Працаваць Камісіі па правах чалавека стала складаней, і толькі праз 18 гадоў, у 1966 годзе, стала магчымым прыняцце Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах і Міжнароднага пакта аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах. Гэтыя пакты не працавалі яшчэ доўгі час. Канвенцыі ўступаюць у сілу толькі пасля таго, як вызначаная колькасць дзяржаў іх падпішуць і ратыфікуюць. Дадзеныя міжнародныя пакты ўступілі, такім чынам, у сілу толькі ў 1973 годзе, пасля таго, як 35 краін іх падпісалі і ратыфікавалі.

Дадзеныя два пакты разам з Усеагульнай дэкларацыяй правоў чалавека называюць звычайна Міжнародным білем аб правах. Яны — падмурак міжнароднай сістэмы правоў чалавека. На сённяшні дзень ужо больш за 155 дзяржаў ратыфікавалі міжнародныя пакты 1966 года.

Міжнародная дэкларацыя аб правах чалавека мае маральную і палітычную сілу. Канвенцыя мае ў дадатак юрыдычныя абавязацельствы дзяржаў, якія яе ратыфікавалі.

Пасля 1948 года ААН было распрацавана шмат розных дэкларацый і канвенцый, накіраваных на абарону пэўных правоў ці груп. Былі таксама распрацаваны рэгіянальныя канвенцыі ў Еўропе, Амерыцы, Афрыцы і на Блізкім Усходзе. Так, для Нарвегіі і іншых краін Еўропы асабліва важнай з'яўляецца Еўрапейская канвенцыя аб абароне правоў чалавека і асноўных свабод (1950 г.). Гэтая канвенцыя гарантуе, што і нарвежац, і басніец, і расіянін маюць роўныя правы, зафіксаваныя ў гэтым дакуменце. Для ўсіх канвенцый характэрна тое, што яны працягваюць у нейкім сэнсе палажэнні, запісаныя ва Ўсеагульнай дэкларацыі, або спасылаюцца на яе.

У агульнай колькасці сёння існуе ўжо каля ста дакументаў ААН. Найбольш важнымі з іх з'яўляюцца:

- Канвенцыя аб папярэджанні злачынства генацыду і пакаранні за яго (1948 г.)
- Канвенцыя аб статусе ўцекачоў (1951 г.)
- Міжнародная канвенцыя аб ліквідацыі ўсіх форм расавай дыскрымінацыі (1965 г.)
- Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах (1966 г.)
- Міжнародны пакт аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах (1966 г.)
- Канвенцыя супраць дыскрымінацыі жанчын (1979 г.)
- Канвенцыя супраць катаванняў і іншых жорсткіх, бесчалавечных або зневажаючых годнасць відаў абыходжання і пакарання (1984 г.)
- Канвенцыя аб правах дзіцяці (1989 г.)

## БССР і Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека

У СССР і Савецкай Беларусі стаўленне да Ўсеагульнай дэкларацыі правоў чалавека вызначалася агульнымі падыходамі да праблемы права, правоў і свабод асобы і іх месца ў дзяржаве. Правы чалавека разглядаліся як помнік гісторыі, што не мае ніякага практычнага значэння, як абстрактная метафізічная катэгорыя, якой не месца ў рэальным дзяржаўна-прававым развіцці. Замест натуральнага права сцвярджалася, што пры сацыялізме правы і свабоды чалавека вызначаюцца прынцыпамі сацыяльна-эканамічнага і палітычнага ладу на кожным этапе развіцця грамадства. Чалавек разглядаўся толькі як грамадзянін, статус якога поўнасцю залежаў ад дзяржавы. Пра чалавека як суб'екта правоў і свабод у марксісцка-ленінскай філасофіі нават не ўзгадвалася. Рэалізацыя правоў і свабод, пералічаных у Дэкларацыі, не магла адбыцца таксама з-за агульнага прыніжэння ролі права. Панаванне класавага падыходу стрымлівала міжнародныя кантакты, магчымасць карыстацца замежнай практыкай. Лічылася, што толькі савецкая практыка вартая ўвагі, бо пры капіталізме свабода чалавека абавязкова абмежавана эксплуататарскімі класамі. Развіццю правоў і свабод у БССР не спрыяла татальнае адзяржаўленне грамадскага жыцця. Чалавек доўгі час заставаўся маленькай гайкай дзяржаўнага механізму. У псіхалогіі грамадзян сфарміравалася такое разуменне ўзаемадачыненняў дзяржавы і асобы, пры якім асоба выступае прасіцелем, а не раўнапраўным партнёрам.

СССР і БССР прынцыпова не прызнавалі міжнароднай правасуб'ектнасці асобы, доўгі час выступалі супраць увядзення пасады Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека, які б мог разглядаць індывідуальныя скаргі. Цікавасць міжнароднай супольнасці да выканання правоў чалавека да пачатку 90-х гадоў расцэньвалася гэтымі краінамі як умяшальніцтва ва ўнутраныя справы дзяржавы. Тэкст дэкларацыі быў невядомы ў грамадстве, ён шырока не абмяркоўваўся, не друкаваўся.

Сітуацыя пачала змяняцца з утварэннем незалежнай беларускай дзяржавы — Рэспублікі Беларусь. Сёння наша краіна — удзельніца практычна ўсіх універсальных дамоваў па правах чалавека. Паступова была знята большасць агаворак, што рабілася БССР падчас падпісання розных міжнародных дакументаў па правах чалавека.

*(Паводле С.С.Бубен, Т.С. Процька «Правы чалавека». Мн., 2001)*

### Абарона правоў чалавека

Працэс абароны правоў чалавека адбываецца ў тры этапы. Спачатку распрацоўваюцца міжнародныя дакументы, якія вызначаюць абавязацельствы дзяржаў у сферы правоў чалавека. Пасля складання тэксту міжнароднай канвенцыі дзяржавы павінны ратыфікаваць яе і прыняць на сябе, такім чынам, вызначаныя абавязацельствы. Трэцім этапам з'яўляецца выкананне дзяржавамі абавязацельстваў па рэалізацыі правоў чалавека на тэрыторыі краіны. Для таго, каб міжнародныя канвенцыі мелі максімальнае ўздзеянне і легітымнасць, неабходна, каб іх ратыфікавала як мага больш краін. ААН і іншыя міжнародныя арганізацыі выконваюць таму важную функцыю, у той час як дзяржавы нясуць адказнасць за рэалізацыю. У грамадзян ёсць правы, а ў дзяржаў — абавязацельствы забяспечваць гэтыя правы.

### Нацыянальная абарона

Найбольш абавязальным спосабам, які дзяржава можа выкарыстоўваць у працы над рэалізацыяй міжнародных правоў чалавека, з'яўляецца забеспячэнне іх у заканадаўстве дзяржавы. Многія дзяржавы сёння ўжо маюць заканадаўства, якое добра абараняе правы чалавека, і без праблем ратыфікуюць міжнародныя канвенцыі. Іншыя ж павінны правесці вялікую падрыхтоўчую працу, каб правесці нацыянальнае заканадаўства ў адпаведнасць з канвенцыяй. Перш чым дзяржава ратыфікуе канвенцыю, яна звычайна вывучае, якія абавязацельствы канвенцыя ўтрымлівае і якім чынам яна можа іх выканаць. Часта дзяржаўныя ўлады бываюць вымушаны змяніць сваё нацыянальнае заканадаўства, каб прывесці яго ў адпаведнасць з міжнароднымі канвенцыямі.

Калі Нарвегія ратыфікавала ў 1970 годзе Канвенцыю ААН аб ліквідацыі ўсіх форм расавай дыскрымінацыі, нарвежскае заканадаўства неабходна было прывесці ў адпаведнасць з палажэннямі, запісанымі ў канвенцыі. Вынікам гэтага працэсу стала ўнясенне новага параграфа ў Крымінальны кодэкс. У §135а запісана, што чалавек можа быць пакараны ў выглядзе штрафаў або двух гадоў турмы за «публічнае выказванне пагрозлівага або высмейвальнага характару; заснаванае на рэлігійнай, расавай, нацыянальнай ці этнічнай прыналежнасці ці на падставе колеру скуры, якое вядзе да нянавісці, пераследу або пагарды адносна чалавека або групы людзей. Тое ж самае датычыць і абраз у адрас людзей нетрадыцыйнай сэксуальнай арыентацыі».

З іншага боку, хаця Нарвегія падпісала і ратыфікавала Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах і Міжнародны пакт аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах 1966 года, якія ўступілі ў юрыдычную сілу ў 1973 годзе, закон аб правах чалавека, які прадугледжвае ўкараненне міжнародных пактаў і Еўрапейскай канвенцыі аб правах чалавек у заканадаўства краіны, быў прыняты нарвежскім парламентам толькі ў 1999 годзе.

Вельмі важным з пункту гледжання абароны правоў чалавека з'яўляецца пункт 1 арт. 8 беларускай Канстытуцыі: «Рэспубліка Беларусь прызнае прыярытэт агульнапрызнаных прынцыпаў міжнароднага права і забяспечвае адпаведнасць ім заканадаўства».

Дзяржаве не абавязкова адпавядаць параметрам, апісаным у канвенцыях, да іх ратыфікацыі. Аднак ад дзяржавы чакаецца, што заканадаўства краіны будзе прыведзена ў адпаведнасць з палажэннямі канвенцый у разумныя тэрміны. Фактар часу даволі важны, асабліва што датычыць асобных правоў чалавека. Рэалізацыя Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах чакаецца як мага хутчэй пасля ратыфікацыі яго дзяржавай. Іншая сітуацыя з Міжнародным пактам аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах. Прычына таму — неабходнасць дастатковых фінансавых рэсурсаў для пабудовы школ або паляпшэння сістэмы аховы здароўя, што адрозніваецца, напрыклад, ад магчымасці забеспячэння свабоды веравызнання. Часта ў дзяржаў ёсць магчымасць устрымацца ад некаторых абавязацельстваў у канвенцыях. Такая магчымасць існуе для таго, каб прыцягнуць як мага больш дзяржаў да падпісання і ратыфікацыі міжнародных дамоў.

Як мы згадвалі раней, у грамадзян ёсць правы, у дзяржаў — абавязацельствы. Адказнасць за парушэнне правоў чалавека ляжыць таму цалкам на дзяржаўных уладах. Разгледзім гэта на наступным прыкладзе. Уявім, што хтосьці быў збіты на вуліцы групай маладых людзей. Па сутнасці, гэта не з'яўляецца парушэннем правоў чалавека, а звычайнае крымінальнае злачынства. Калі ж чалавек быў збіты прадстаўніком улады, напрыклад паліцэйскім, збіццё становіцца парушэннем правоў чалавека, паколькі здзейснена яно прадстаўніком улады. Да гэтага часу ў многіх краінах свету пры арыштах або ўзяцці пад варту прадстаўнікамі выканаўчай улады парушаецца права на свабоду і асабістую недатыкальнасць.

Выкарыстаны прыклад можна ўскладніць. На дзяржаве ляжыць адказнасць не толькі паважаць правы чалавека і не парушаць іх. У дзяржавы ёсць таксама адказнасць абараняць правы чалавека і дамагацца таго, каб яны паважаліся і шанаваліся ў большай ступені. Гэта значыць, вяртаючыся да апісанага вышэй выпадку збіцця чалавека, мы можам казаць, што яго права можна лічыць парушаным і ў тым выпадку, калі ён не атрымаў эфектыўнай падтрымкі і абароны з боку дзяржавы. Абавязак дзяржавы — стварыць эфектыўную судовую сістэму, якая б аператыўна разбіралася з выпадкамі перавышэння паўнамоцтваў з боку ўлад і карала вінаватых. Эфектыўнае расследаванне і пакаранне — моцныя сігналы для грамадства, якія прадухіляюць падобныя парушэнні ў будучыні. Забеспячэнне дастатковага патрулявання вуліц з мэтай бяспекі грамадзян — таксама абавязак дзяржавы. Гэтак жа, як і дастатковае фінансаванне паліцыі і судоў; сацыяльныя праекты, накіраваныя на тое, каб заняць моладзь і адцягнуць іх ад вуліцы; інфармацыйныя кампаніі для насельніцтва. У выпадках парушэння правоў чалавека з боку дзяржавы, дзяржава таксама абавязана выплаціць кампенсацыю пацярпелым[15].

## Адказнасць дзяржавы — паважаць, абараняць і выконваць правы чалавека






Еўрапейская канвенцыя аб абароне правоў чалавека і Еўрапейскі суд па правах чалавека ў Страсбургу аднолькавыя як для Тамары з Расіі, так і для Сенада з Босніі, Пітэра з Нарвегіі і Франко з Італіі.

Калі чалавек лічыць, што яго(яе) правы парушаны, у яго(яе) павінна быць магчымасць звярнуцца ў суд. У выпадку, калі справа прайграна ў судзе, даведзена да Вярхоўнага суда і прайграна і там, у чалавека ёсць магчымасць падаць скаргу ў органы ААН або ў Еўрапейскі суд па правах чалавека[16]. Чым дакладней будзе вызначана адказнасць дзяржавы ў тым ці іншым выпадку парушэння правоў чалавека, тым лягчэй будзе весці і выйграць справу. Нарвегія прайграла ўжо даволі шмат спраў у Еўрапейскім судзе па правах чалавека ў Страсбургу, і паводле рашэнняў суда «змяніла» сваю палітыку.

Складаней давесці віну дзяржавы ў тых выпадках, калі прысутнічае відавочна недастатковая прафілактычная праца з боку дзяржавы. Складана давесці ў судзе, што дзяржава ўскосна вінавата ва ўзнікненні крымінальных моладзевых груп, бо праводзіла даволі пасіўную моладзевую палітыку.

Важна, каб усе, у каго засяроджана ў руках адміністрацыйная ўлада і хто дзейнічае ад імя дзяржавы, ведалі аб правах чалавека. Паліцыя, міграцыйныя службы, дзіцячыя ўстановы; работнікі турмаў, аховы здароўя

(асабліва псіхіятрыі) і адукацыі — усе яны павінны валодаць ведамі аб правах чалавека. Як, зрэшты, і грамадства ў цэлым. Важна таму, каб дзеці вывучалі правы чалавека ў школах. Дзяржавы могуць таксама ствараць органы, якія працуюць над абаронай правоў чалавека, як, напрыклад: упаўнаважаны па правах дзіцяці, па працы супраць дыскрымінацыі; цэнтры правоў чалавека і розныя дадатковыя структуры ў паліцыі.

З краін былога Савецкага Саюзу інстытут упаўнаважанага па правах чалавека (амбудсмэна) адсутнічае толькі ў двух — Беларусі і Туркменістане.

У Беларусі пытанне аб увядзенні дадзенай пасады актыўна абмяркоўвалася з сярэдзіны 90-х гадоў. Быў падрыхтаваны праект Закона «Аб Упаўнаважаным па правах чалавека ў Рэспубліцы Беларусь», канцэпцыя і структура якога былі прадстаўлены на парламенцкіх слуханнях па правах чалавека ў чэрвені 1998 года. Законапраект быў перададзены для прыняцця Нацыянальнаму сходу, але так і не быў разгледжаны.

У сённяшнім глабальным свеце важна і тое, каб дзяржавы бралі на сябе *міжнародную адказнасць*. Дзяржавы павінны выступаць з крытыкай, калі іншыя дзяржавы парушаюць правы чалавека. Неабходна пераглядаць эканамічнае супрацоўніцтва з тымі краінамі, якія дазваляюць сабе грубыя парушэнні правоў чалавека, і рабіць такім чынам сігнал аб тым, што падобнае не будзе прымацца сусветнай супольнасцю. Многія дзяржавы вядуць даволі актыўную працу на міжнародным узроўні, накіраваную на паляпшэнне сітуацыі з правамі чалавека ў свеце. Выкарыстоўваючы знешнюю палітыку і палітыку аказання дапамогі, дзяржавы, ажыццяўляючы двухбаковыя перамовы, могуць выступаць з больш канкрэтнымі патрабаваннямі ў адносінах да краін-партнёраў.

**Грамадзянская супольнасць**

Тэрмін «грамадзянская супольнасць» часта выкарыстоўваецца, калі гаворка ідзе аб дэмакратыі і правах чалавека. Грамадзянская супольнасць абазначае ўсе інстытуты грамадства, якія не адносяцца да сферы дзяржаўнай улады ці апарата ўлады. Адным з важнейшых інстытутаў грамадзянскай супольнасці з’яўляюцца няўрадавыя арганізацыі (NGO) (зноска 17), якія таксама называюць незалежнымі, таму што яны вольныя думаць і казаць, не клапоцячыся аб афіцыйнай пазіцыі дзяржавы.

Многія з такіх арганізацый створаны энтузіястамі, якія маюць намер працаваць над рэалізацыяй правоў чалавека. Часта такія арганізацыі становяцца выразнікамі інтарэсаў неабароненых груп — уцекачоў, дзяцей, зняволеных, прастытутак і іншых. Важнай мэтай іх працы з’яўляецца ўздзеянне і ціск на дзяржаўныя ўлады для паляпшэння сітуацыі гэтых груп. Арганізацыі маюць шырокую грамадскую падтрымку і высока кампетэнтныя ў сваіх спецыфічных абласцях. У дэмакратычных краінах улады да іх часта прыслухоўваюцца і прымаюць іх меркаванне сур’ёзна. Нярэдка паміж арганізацыямі і дзяржавай завязваецца дыялог, і ў многіх краінах арганізацыі атрымліваюць ад дзяржавы маральную і фінансавую падтрымку[18].

У арганізацый розныя мэты і метады працы. Акрамя кансультатыўнай дзейнасці і канкрэтнай дапамогі асобным людзям, яны могуць назіраць за сітуацыяй з правамі чалавека і даваць рэкамендацыі ўладам. Яны таксама могуць распаўсюджваць інфармацыю аб канкрэтных справах і праблемах у СМІ, каб стварыць большы ціск з боку грамадства. Многія з іх займаюцца важнай асветніцкай працай. Шэраг арганізацый аказваюць фінансавую і прафесійную дапамогу іншым па абароне правоў чалавека ў розных краінах.

Прыклады такіх няўрадавых арганізацый у Нарвегіі — гэта Нарвежская арганізацыя дапамогі ўцекачам (NOAS), Асацыяцыя інвалідаў (FFO), «Выратуйце дзяцей», Нарвежскі Хельсінкскі камітэт, Антырасісцкі цэнтр і «Міжнародная амністыя — Нарвегія». Многія з іх маюць партнёрскія арганізацыі за мяжой і належаць да шырэйшых міжнародных сетак. Так, «Міжнародная амністыя» — найбуйнейшая міжнародная праваабарончая арганізацыя, якая налічвае больш за 2 мільёны членаў.

У краінах, дзе адбываюцца грубыя парушэнні правоў чалавека, улады могуць успрымаць недзяржаўныя арганізацыі як назойлівыя і пагрозлівыя, паколькі яны крытыкуюць дзяржаву. У многіх краінах актывістаў-праваабаронцаў пераследуюць і забіваюць. Таму важна, каб праваабаронцы з розных краін выказвалі салідарнасць, паведамлялі пра тое, што адбываецца, і дапамагалі адзін аднаму ўсемагчымымі спосабамі.

## Развіццё праваабарончага руху ў Беларусі

У канцы 80-х гадоў, калі адкрылася праўда пра масавыя сталінскія расстрэлы ў Курапатах пад Мінскам, была створана ініцыятыўная група Беларускага камітэта памяці ахвяраў сталінізму «Камітэт-58» (58 — нумар расстрэльнага артыкула сталінскага Крымінальнага кодэксу), якая 19 кастрычніка 1988 года абвясціла пра заснаванне першай легальнай праваабарончай арганізацыі «Мартыралог Беларусі». Адзін з заснавальнікаў арганізацыі, пісьменнік Васіль Быкаў тады сказаў: «Мы павінны скласці велічны мартыралог нашых страт і нашых пакутнікаў. Гэта ляжа вуглавым каменем у падмурку нацыянальнай свядомасці, стане важным элементам гістарычнай памяці і гарантам. Гарантам будучыні народа, які праз генацыд, кроў і знявагу з упартасцю асуджанага рвецца да сонца, дабра і справядлівасці». Асноўнымі праблемамі, якімі займаўся «Мартыралог», былі дапамога ахвярам сталінскіх рэпрэсіяў, выкрыццё злачыннай сутнасці сталінізму, падрыхтоўка дэмакратычных зменаў у беларускім грамадстве.

З прыходам да ўлады А.Лукашэнкі ў Беларусі распачалася рэстаўрацыя аўтарытарнай сістэмы, галоўнымі задачамі якой стаў кантроль над усімі праявамі




Вядомыя беларускія праваабаронцы Гары Паганяйла (Беларускі Хельсінкскі камітэт) і Алесь Бяляцкі (Праваабарончы цэнтр «Вясна»).

грамадскай актыўнасці і барацьба з іншадумствам, пашырыліся рэпрэсіі. У выніку ўзнікла вострая неабходнасць у шматбаковай дзейнасці праваабарончых арганізацый. Увосень 1995 года быў заснаваны Беларускі Хельсінкскі камітэт, а ўвесну 1996 года быў утвораны Праваабарончы цэнтр «Вясна-96», які праз два гады займеў назву «Праваабарончы цэнтр «Вясна». Таксама ў другой палове 90-х гадоў былі створаны іншыя праваабарончыя арганізацыі, такія як «Прававая дапамога насельніцтву»
(1998 г.), «Незалежнае таварыства прававых даследаванняў», «Цэнтр па правах чалавека» і інш. Пазней з'явіліся «Праваабарончы альянс», Камітэт абароны рэпрэсаваных «Салідарнасць», Беларускі Дом правоў чалавека. Нягледзячы на пазбаўленне рэгістрацыі большасці праваабарончых беларускіх арганізацый у 2003—2004 гадах, а таксама ўвядзенне крымінальнай адказнасці за дзейнасць у складзе незарэгістраваных арганізцый, праваабарончы рух у Беларусі развіваецца і ўмацоўваецца.

**Сродкі масавай інфармацыі**

Свабодныя і незалежныя СМІ з'яўляюцца адным з важнейшых інстытутаў дэмакратычнага грамадства, і таму іх роля ў праваабарончай дзейнасці неацэнная. Яны сочаць за выкананнем важных задач, такіх як інфармаванне грамадскасці, арганізацыя дэбатаў, крытыка грамадства і ўлады, інфармаванне аб вартых крытыкі акалічнасцях і іх выкрыццё. СМІ маюць вялікую магчымасць уплыву на грамадскую думку, таму іх часта называюць чацвёртай уладай. А гэта накладае велізарную адказнасць. Аб парушэнні правоў чалавека мы даведваемся з тэлебачання, радыё і газет. У свабодным і дэмакратычным грамадстве СМІ павінны быць «вартавым сабакай», які заўсёды паведамляе, як толькі дзяржава пачынае злоўжываць сваёй уладай. Калі СМІ звяртаюць сваю ўвагу на парушэнні правоў і вартыя крытыкі акалічнасці, гэта стварае ціск на ўлады, мэта якога — дамагчыся станоўчых зменаў.

У многіх краінах небяспечна быць журналістам, пісаць або выказвацца аб парушэнні правоў чалавека. Аўтарытарныя кіраўнікі не любяць негатыўнай ацэнкі свайго кіравання і могуць звярнуцца да супрацьпраўных спосабаў, каб пазбегнуць крытыкі. Штогод забіваюць многіх журналістаў. Вялікая колькасць журналістаў нязменна аказваецца ў турмах за крытыку палітыкі ўладаў.

З тым, у якім становішчы знаходзіцца свабода слова ў Беларусі, можна пазнаёміцца на сайце Беларускай асацыяцыі журналістаў (http://www.baj.by).

У 2006 годзе быў забіты 81 журналіст і 5 супрацоўнікаў прэсы.
Больш за 1400 былі падвергнутыя нападам і пагрозам.

**Бізнэс-структуры**

Бізнэс карыстаецца вельмі шырокім уплывам у грамадстве і таксама можа рознымі спосабамі ўмацоўваць правы чалавека. Па-першае, прамыслоўцы могуць прадаставіць сваім работнікам надзейную ахову здароўя, стварыць камфортныя і бяспечныя ўмовы працы, дазволіць дзейнасць прафсаюзаў, а таксама забяспечыць удзел работнікаў у прыняцці рашэнняў па пытаннях, якія іх закранаюць. Прадпрыемствы і кампаніі павінны супрацоўнічаць з органамі ўлады і працаваць, выконваючы пры гэтым правы чалавека.

У наш час існуе шмат кампаній і прадпрыемстваў, якія працуюць адразу ў шэрагу краін. Гэта так званыя транснацыянальныя кампаніі (ТНК), якія выкарыстоўваюць міжнародныя вытворчыя ланцужкі, пераносячы вытворчасць у краіны з таннай працоўнай сілай і прадаючы сваю прадукцыю ў іншых краінах па больш высокіх коштах. Многія з гэтых прадпрыемстваў маюць вялікі абарот і валодаюць велізарным уплывам. Са 100 найбуйнейшых эканамічных адзінак свету 51 — гэта ТНК, у той час як 49 — гэта дзяржавы[19]. У той час як большасць дзяржаў падлягаюць дэмакратычнаму кантролю, гэтага зусім нельга сказаць аб кампаніях[20]. Часта важнейшым матывам іх дзейнасці з'яўляецца імкненне зарабіць як мага больш грошай, і, на жаль, ёсць прыклады таго, што гэта робіцца за кошт ушчамлення правоў чалавека. У апошнія гады ААН і

іншыя арганізацыі шчыльна пачалі займацца гэтымі праблемамі. У 1999 г. па ініцыятыве ААН была створана сусветная сетка прадпрыемстваў «Глобал кампакт», у якую ўваходзяць кампаніі, якія імкнуцца працаваць з выкананнем дзелавой этыкі і правоў чалавека. Яе мэта — павысіць разуменне грамадствам ступені адказнасці бізнэсу ў абароне правоў чалавека. Многія кампаніі прызнаюцца сёння ў тым, што падзяляюць такую адказнасць і распрацавалі ўласныя этычныя стандарты сваёй дзейнасці.

Кампаніі, якія прыходзяць у краіны, дзе маюцца масавыя парушэнні правоў чалавека, павінны спрабаваць палепшыць сітуацыю. Яны могуць вылучаць патрабаванні ўладам краіны, перш чым рабіць інвестыцыі, і не мірыцца з карупцыяй. Калі яны даведаюцца аб парушэнні правоў, то могуць запатрабаваць вызвалення палітычных зняволеных, заявіць аб неабходнасці дазволу на дзейнасць прафсаюзаў і непрымальнасці катаванняў. Тое, што прадпрыемствы захоўваюць правы чалавека, павінна быць само сабой зразумелым. Дзіцячая праца не павінна быць дазволенай, а дзейнасць кампаніі павінна засноўвацца на прафесійных правах работнікаў, а таксама свабодзе слова і аб'яднання.

Многія лічаць, што кампаніі павінны трымацца далей ад краін, дзе адбываюцца сур'ёзныя парушэнні правоў чалавека, такім чынам пазбаўляючы ўлады ў гэтай краіне легітымнасці. Іншыя лічаць, што бізнэс можа працаваць і там, але ў той жа час павінен быць крытычным да таго, што адбываецца. Яны мяркуюць, што бізнэс, выкарыстоўваючы свае сувязі, можа аказаць уплыў на дзяржавы і ў асобных сітуацыях спыніць катаванні, выратаваць жыцці людзей там, дзе дзеянні іншых арганізацый не дасягаюць поспеху.

**Грамадзяне**

Хаця правы чалавека найперш з'яўляюцца адказнасцю дзяржавы, грамадзяне таксама вельмі шмат значаць. Кожны асобна ўзяты чалавек можа змяніць сітуацыю. Варта памятаць, што дзяржава складаецца з грамадзян, якія разам складаюць нешта большае. І як індывіды, мы заўсёды валодаем магчымасцю паўплываць на сітуацыю. Тыя, хто пачаў думаць аб правах чалавека і фармуляваць свае думкі ў зваротах, запісах і кнігах, былі асобна ўзятыя людзі. Як і асобна ўзятыя людзі і групы людзей першымі выйшлі на вуліцы, на дэманстрацыі з апеляцыямі і пратэстамі.

## Дысідэнцкі рух: Савецкі Саюз і Беларусь

У Савецкім Саюзе так званы дысідэнцкі рух зараджаецца з сярэдзіны 60-х гадоў. Спробы супраціву прыгнечанню асобы былі і раней, аднак толькі пасля хрушчоўскай «адлігі» з'яўляюцца людзі, якія абараняюць асобу з пазіцый правоў чалавека. Паколькі СССР падпісаў асноўныя міжнародныя пакты і канвенцыі аб правах чалавека, гэта давала грамадзянам фармальныя падставы змагацца за іх выкананне.

«Дысідэнцтвам мы называем сукупнасць рухаў, груп, тэкстаў і індывідуальных учынкаў, разнастайных і рознанакіраваных па сваіх мэтах і задачах, але вельмі блізкіх па асноўных прынцыповых установках:

- негвалтоўнасць;
- галоснасць;
- рэалізацыя асноўных правоў і свабод «явачным парадкам»;
- патрабаванне выканання закона;

па формах грамадскай актыўнасці:

- стварэнне непадцэнзурных тэкстаў;
- аб'яднанне ў незалежныя (часцей за ўсё — непалітычныя па сваіх мэтах) грамадскія асацыяцыі;
- зрэдку — публічныя акцыі (дэманстрацыі, распаўсюд улётак, галадоўкі і інш.);

і па выкарыстанні інструментарыю:

- распаўсюд літаратурных, навуковых, праваабарончых, інфармацыйных і іншых тэкстаў праз самвыдат і заходнія мас-медыя;
- петыцыі, адрасаваныя ў савецкія афіцыйныя інстанцыі, і «адкрытыя лісты», звернутыя да грамадскай думкі (айчыннай і замежнай); у канчатковым выніку петыцыі, як правіла, таксама патрапілі ў самвыдат і/або публікаваліся за мяжой.

Унутры самога дысідэнцкага свету асаблівае месца займаў праваабарончы рух, які аб'яднаў да гэтага разрозненыя праявы незалежнай грамадзянскай і культурнай ініцыятывы ў адзінае цэлае. Праваабаронцы стварылі адзінае інфармацыйнае поле, якое падтрымлівалася самой дысідэнцкай актыўнасцю (факт, які радыкальна адрознівае дадзеную з'яву, напрыклад, ад разрозненых спробаў стварыць палітычнае падполле ў 1950-е гг.)».

*(Матэрыялы па гісторыі дысідэнцкага руху аб'яднання «Мемарыял»)*

Хрушчоўская «адліга» надала новы імпульс для барацьбы за правы чалавека і ў Беларусі. Пра гэта сведчыць у тым ліку колькасць асуджаных грамадзян паводле артыкула «Антысавецкая агітацыя і прапаганда», а таксама па іншых артыкулах Крымінальнага кодэксу, якія абмяжоўвалі правы чалавека: з 1953-га па 1988 год яна дасягае некалькі сотняў чалавек.

Сярод смелых і адважных змагароў за правы чалавека варта назваць Міхаіла Кукабаку, беларускага дысідэнта, які за незалежную журналісцкую дзейнасць, крытыку адсутнасці свабод і правоў у СССР, распаўсюд Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека і іншыя праваабарончыя дзеянні каля 17 гадоў утрымліваўся ў псіхіятрычных бальніцах і калоніях і быў вызвалены з турмы толькі ў канцы 1988 года.

Напачатку 50-х гадоў студэнт Эрнст Сабіла быў першы раз асуджаны за свае рэлігійныя погляды і адсядзеў у суме 12 гадоў, але не скарыўся. У канцы 50-х

гадоў браты Лявон і Міхась Белыя ў Менску распаўсюджвалі ўлёткі ў абарону беларускай мовы, за што былі асуджаны да лагераў. Напачатку 60-х гадоў на філфаку БДУ КДБ была выкрыта антысавецкая група, студэнтаў выключылі з універсітэта, а іхні лідэр Кім Хадзееў атрымаў другі тэрмін за антысавецкую дзейнасць. Гродзенскія студэнты Аляксандр Раманаў і Сяргей Каленчанка адкрыта выступілі супраць уводу савецкіх войскаў у Чэхаславакію ў 1968 годзе, за што былі асуджаныя. Мінскія студэнты Алесь Разанаў, Віктар Ярац, Юрка Голуб ды іншыя ў 1968 годзе выступілі са зваротам аднавіць навучанне ва ўніверсітэце на беларускай мове, за што былі выключаны з ВНУ. Група маладых навукоўцаў з Акадэміі навук, у ліку якіх былі Міхась Чарняўскі, Зянон Пазняк, Мікола Прашковіч, Алесь Каўрус, Валянцін Рабкевіч ды інш., у 70-я гады выступала за дэмакратычныя ды палітычныя змены ў развіцці Беларусі, кантактавалі з украінскімі дысідэнтамі, за што былі абвінавачаны ў нацыяналізме і пазбаўлены пэўны час магчымасці працаваць па спецыяльнасці. Пісьменнік Васіль Быкаў быў пераследаваны КДБ і савецкай уладаю за дэмакратычныя погляды і жаданне ў сваіх творах узняць ідэі гуманізму і чалавечнасці вышэй за догмы камуністычнай партыі і сацыялістычнага рэалізму.

Гэты спіс герояў, якія паасобку ці невялікімі групамі змагаліся за правы чалавека, можна працягваць і далей. Але таксама трэба адзначыць, што ў Беларусі ў савецкія часы праваабаронцы і дысідэнты не склалі цэльнага праваабарончага руху, так як гэта, напрыклад, адбылося ў Расіі ці ва Украіне. Як адзначаў адзін з членаў найбольш актыўнай антысавецкай групы «Акадэмічны асяродак» — Міхась Чарняўскі, «усе мы разам з'яўляліся па сутнасці антыкамуністамі і дэмакратамі па перакананнях. Аднак мы свядома імкнуліся пазбегнуць магчымых абвінавачванняў у антыкамунізме. Мы зыходзілі з таго, што беларуская адраджэнская інтэлігенцыі, гатовай да нейкіх дзеянняў, на той час было вельмі мала. Наш даволі кволы рух было лёгка прыдушыць, і мы не маглі траціць сілы яшчэ і на агульнадэмакратычныя задачы. Лічылася, што гэтым можа займацца маскоўская інтэлігенцыя, мы ж павінны былі канцэнтравацца на нацыянальным. Нават у час акупацыі Чэхаславаччыны ў 1968 г. пасля цяжкага роздуму і дыскусій было вырашана ўстрымацца ад публічных акцый пратэсту».

*(Алесь Бяляцкі, пісьменнік, гісторык, старшыня Праваабарончага цэнтра «Вясна»)*

Мы ўсе можам зрабіць вельмі шмат для абароны правоў чалавека. Мы можам пачаць абмяркоўваць праблемы правоў чалавека са сваімі блізкімі, на працы або ў школе. Мы можам пісаць лісты ў газеты, тэлефанаваць ім, арганізоўваць дабрачынныя акцыі, праводзіць дэманстрацыі і кампаніі. Калі мы гатовы прысвяціць праваабарончай працы больш часу, мы можам уступіць у арганізацыі і працаваць у іх добраахвотнікам. Мы таксама нясем вялікую адказнасць і як выбаршчыкі. Нам неабходна аддаваць свой голас палітыкам, якія занепакоены праблемай правоў чалавека як у нашай краіне, так і за мяжой. Далей важна ўсвядомлена падыходзіць да таго, што мы робім як спажыўцы. «Думайце глабальна, дзейнічайце лакальна» — вось лозунг, які можна паспяхова выкарыстоўваць.

Мы — людзі, і залежым ад іншых, і самі ў нейкай ступені трымаем у руках жыцці іншых. У нашых сілах — нашкодзіць іншым і, адпаведна, несці адказнасць за тое, каб не рабіць гэтага. У нас ёсць не толькі свабода прымаць уласныя рашэнні, але і абавязак прымаць адказнасць за іх. Акрамя таго, каб выкарыстаць нашу свабоду патрабаваць выканання нашых правоў, мы таксама павінны выконваць наш абавязак паважаць правы іншых. І калі мы становімся сведкамі прыгнёту, дыскрымінацыі або парушэння права чалавека, мы абавязаны на гэта рэагаваць.

Ніколі не сумнявайцеся ў тым, што маленькія групы захопленых людзей, якія думаюць могуць змяніць свет. На самой справе толькі ім і ўдавалася змяніць штосьці.

Маргарэт Мід

## Міжнародная абарона

Міжнародная супольнасць мае шэраг механізмаў стымулявання і ўплыву, у некаторых выпадках — нават прымусу дзяржаў да выканання правоў чалавека, паколькі яна валодае заканадаўча замацаваным правам крытыкаваць. Яна можа таксама выкарыстоўваць і іншыя формы рэагавання, калі дзяржавы не выконваюць свайго абавязку па захаванні правоў чалавека. На Сусветнай канферэнцыі па правах чалавека ў Вене ў 1993 г., у якой удзельнічала 171 дзяржава з прыкладна 200 існуючых, зноў было падкрэслена, што правы чалавека з'яўляюцца «легітымным міжнародным пытаннем».

Далей мы разгледзім сістэму ААН як важнейшую глабальную сістэму абароны правоў чалавека. Мы таксама коратка разгледзім рэгіянальныя сістэмы, міжнародныя крымінальныя суды і недзяржаўныя органы.

## Сістэма ААН

У Арганізацыі Аб'яднаных Нацый ёсць некалькі механізмаў уплыву на дзяржавы, каб «прымусіць» іх паважаць і выконваць правы чалавека. Міжнародная сістэма правоў чалавека развівалася паступова, па меры з'яўлення ўсё новых і новых канвенцый і неабходнасці «кантролю». На сённяшні дзень гэта сістэма ўяўляе сабой «складаную» разгалінаваную сістэму, дзе выкарыстоўваюцца як палітычныя, так і юрыдычныя механізмы ціску.

### Юрыдычныя механізмы

Пасля ратыфікацыі канвенцый аб правах чалавека дзяржавы абавязуюцца накіроўваць справаздачы ў ААН аб выкананні канвенцый

на нацыянальным узроўні. Справаздачы разглядаюцца так званымі канвенцыйнымі органамі, як правіла, гэта Камітэт супраць катаванняў, Камітэт па правах дзіцяці і інш.[21] Камітэты складаюцца з незалежных экспертаў, якія аналізуюць справаздачы і даюць каментары аб тым, дзе праца ідзе паспяхова, а што можна палепшыць. Камітэты разглядаюць справаздачы толькі тых дзяржаў, якія ратыфікавалі тыя ці іншыя канвенцыі. Палажэнні многіх канвенцый даюць магчымасць і інстытутам грамадзянскай супольнасці дасылаць «свае» справаздачы па той ці іншай канвенцыі і «сваё» бачанне сітуацыі ў дзяржаве. Грамадскія незалежныя арганізацыі могуць таксама прысутнічаць пры разглядзе справаздач у ААН і выступаць са сваімі каментарамі.

Рэспубліка Беларусь з'яўляецца ўдзельніцай Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах, Міжнароднага пакта аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах, Канвенцыі аб ліквідацыі ўсіх форм расавай дыскрымінацыі, Канвенцыі супраць катаванняў і іншых жорсткіх, бесчалавечных або зневажаючых годнасць відаў абыходжаньня і пакараньня, Канвенцыі аб ліквідацыі ўсіх форм дыскрымінацыі ў дачыненні да жанчын і Канвенцыі аб правах дзіцяці.

Часта камітэты, якія разглядаюць справаздачы ад дзяржаў, адмаўляюцца ад адкрытых канфрантацый з апошнімі на карысць «канструктыўнага дыялогу», хаця механізмы ААН, пра якія мы будзем казаць пазней, падпадаюць пад так званыя крытычныя дыялогі. Канструктыўны дыялог з'яўляецца важнай часткай працы, якую праводзіць ААН па паляпшэнні сітуацыі з правамі чалавека, але часта паведамленні аб такіх дыялогах «патанаюць» у патоку інфармацыі, якая даецца СМІ, арыентаванымі, у сваю чаргу, на праблематычныя аспекты навін. Неабходна падкрэсліць, што кожны дзень над справаздачамі працуюць шмат людзей: у дзяржавах, дзе іх складаюць, і ў ААН, дзе іх аналізуюць.

Любы чалавек або групы людзей маюць таксама магчымасць накіраваць скаргу ў ААН, калі лічаць, што іх правы былі парушаны дзяржавай. У гэтым выпадку камітэт або іншы адпаведны орган у ААН будзе разглядаць такую скаргу[22]. Ад дзяржаў, у сваю чаргу, чакаецца, што яны будуць улічваць рашэнні, вынесеныя па тых ці іншых скаргах. Прывядзем наступны прыклад таго, якім чынам усё гэта працуе. Некалькі гадоў таму бацькі чацвярых дзяцей падалі скаргу на Нарвегію адносна выкладання рэлігіі ў сярэдняй школе. Камітэт па правах чалавека ААН разгледзеў скаргу ў 2004 годзе і выказаў наступнае меркаванне: той від, у якім існуе і выкладаецца дадзены прадмет, уступае ў відавочную супярэчнасць з артыкулам 18 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах. Ад Нарвегіі чакалася, што да меркавання камітэта прыслухаюцца і выкладанне прадмета будзе зменена такім чынам, каб яно адпавядала палажэнням пакта.



Першая скарга з Беларусі была зарэгістравана ў Камітэце ААН па правах чалавека ў 1997 годзе. Згодна з апублікаванай у красавіку 2009 года статыстычнай справаздачай упраўлення Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека, на той момант з 64 зарэгістраваных зваротаў супраць Беларусі камітэтам былі разгледжаны па сутнасці 17, з іх у 16 выяўлены парушэнні правоў чалавека беларускай дзяржавай.

Нягледзячы на міжнародныя абавязацельствы, якія прыняла на сябе Рэспубліка Беларусь, ратыфікаваўшы Пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах і Факультатыўны пратакол да яго, ніводнае меркаванне камітэта не было ўлічана беларускімі ўладамі і ніводная з ахвяраў парушэння правоў чалавека не была ўзноўлена ў правах. Міністэрства замежных спраў Беларусі, на якое ўскладзены абавязак па кантролю за выкананнем міжнародных дамоў дзяржаўнымі органамі, сваю пазіцыю ў пытанні выканання меркаванняў камітэта сфармулявала наступным чынам: «Што датычыць рэалізацыі абавязкаў Рэспублікі Беларусь па Факультатыўным пратаколе да Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах ад 16 снежня 1966 года, улічваецца, у прыватнасці, *рэкамендацыйны характар* меркаванняў Камітэта па правах чалавека» (*з адказу на зварот заснавальнікаў пазбаўленага рэгістрацыі Праваабарончага цэнтра «Вясна» адносна ігнаравання меркавання Камітэта аб парушэнні права на асацыяцыю членаў арганізацыі і неабходнасці ўзнаўлення іх у правах*).

**Палітычны ціск**

У сучасным свеце існуюць вялікія праблемы ў сферы правоў чалавека. Часта яны з'яўляюцца вынікам таго, што дзяржавы свядома парушаюць правы чалавека і не жадаюць мяняць сваю палітыку. Гэта могуць быць аўтарытарныя рэжымы і органы ўлады, што дыскрымінуюць этнічныя групы, вядуць агрэсіўныя вайсковыя дзеянні, выкарыстоўваюць катаванні, выкраданні, забойствы і іншыя дзеянні, якія парушаюць правы чалавека. Усё гэта з'яўляецца сур'ёзнымі праблемамі для ААН.

Многія з дзяржаў, якія дапускаюць прыгнёт, не ратыфікавалі канвенцыі або, калі і зрабілі гэта, не ўспрымаюць наступстваў ратыфікацыі сур'ёзна. Некаторыя ігнаруюць патрабаванне накіроўваць справаздачы ў канвенцыйныя органы.

Так, Рэспубліка Беларусь, ратыфікаваўшы першы Факультатыўны пратакол да Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах (уступіў у сілу 30 снежня 1992 года), абавязалася падаваць перыядычныя даклады па сітуацыі з правамі чалавека ў краіне. Разам з тым, апошні перыядычны даклад у камітэт Беларусь падала 6 лістапада 1997 года, сваё абавязацельства па падачы наступных дакладаў, якія павінны былі быць прадстаўлены 7 лістапада 2001 года і 7 лістапада 2006 года, Рэспубліка Беларусь праігнаравала. Ратыфікаваўшы Канвенцыю супраць катаванняў (уступіла ў сілу 26 чэрвеня 1987 года), Рэспубліка Беларусь

таксама абавязалася падаваць перыядычныя даклады аб яе выкананні. Да канца 2008 года ўрад падаў тры даклады -- першапачатковы і два перыядычныя. Трэці перыядычны даклад, які павінен быў быць прадстаўлены ў 1996 годзе, быў пададзены толькі ў красавіку 2000 г. Чацвёрты і пяты перыядычны даклады, якія павінны былі быць прадстаўленыя 25 чэрвеня 2000-га і 25 чэрвеня 2004 года, да моманту выдання гэтай кнігі пададзены не былі.

У падобных выпадках ААН спрабуе арганізаваць палітычны ціск на дзяржаву з тым, каб змяніць гэту практыку. Важнейшымі органамі ААН, якія служаць гэтай мэце, з’яўляюцца Генеральная Асамблея, Савет бяспекі і нядаўна створаны Савет па правах чалавека.

Агульным для гэтых трох органаў з’яўляецца тое, што ўсе яны могуць прымаць рэзалюцыі. Рэзалюцыі — гэта заявы ад імя сусветнай супольнасці, якія ўтрымліваюць агляд бягучай сітуацыі, а таксама рэкамендацыі адказнай дзяржаве і іншым дзяржавам па яе выпраўленні. Такім чынам, рэзалюцыі не толькі даюць сігналы дзяржавам, што парушаюць правы чалавека, але і сусветнай супольнасці ў цэлым. Мэта рэзалюцый — у тым, каб прыцягнуць увагу да праблемы і стварыць міжнародны ціск, які павінен змяніць яе ў станоўчы бок.

*Генеральная Асамблея ААН*

Генеральная Асамблея ААН — галоўны дырэктыўны орган ААН, у якім кожная краіна мае свайго прадстаўніка. Артыкул 10 Статуту ААН устанаўлівае, што па ўсіх пытаннях і праблемах, якія патрапляюць пад паўнамоцтвы ААН, могуць быць праведзены слуханні на пасяджанні Генеральнай Асамблеі і вынесеныя дырэктывы. Могуць быць таксама ініцыяваны дадатковыя ці новыя даследаванні, а таксама выпрацаваны рэкамендацыі па паляпшэнні сітуацыі з правамі чалавека.

Рэзалюцыі, вынесеныя Генеральнай Асамблеяй, не маюць юрыдычнай сілы. Аднак тыя ці іншыя рэзалюцыі могуць валодаць даволі вялікай сілай, асабліва калі яны прыняты аднагалосна.

*Савет бяспекі ААН*

Савет бяспекі ААН складаецца з пяці краін — пастаянных членаў савета, і дзесяці краін, якія абіраюцца членамі савета на два гады. Краіны — пастаянныя члены Савета бяспекі ААН — гэта Францыя, Кітай, Расійская Федэрацыя, Вялікабрытанія і ЗША[23]. Статут ААН вызначае асноўную функцыю Савета бяспекі: падтрыманне міру на Зямлі і ўсеагульнай бяспекі. Савет бяспекі можа абмяркоўваць «нязгоды» ў глабальным свеце, якія могуць, у сваю чаргу, прывесці да маштабных канфліктаў. Часта гэта сітуацыі, калі адбываецца сталае парушэнне правоў чалавека, што вядзе да сусветных праблем.



Савет бяспекі выносіць таксама рэзалюцыі, якія маюць наступствы для паляпшэння сітуацыі з правамі чалавека, асабліва гэта датычыць увядзення міратворчых сіл. Савет бяспекі можа таксама выступаць з ініцыятывай стварэння трыбуналаў і міжнародных судоў для краін ці рэгіёнаў, якія знаходзяцца ў сітуацыі канфлікта ці вайны і не маюць магчымасці забяспечыць эфектыўную судовую сістэму. Такім чынам былі створаны суды па былой Югаславіі і Руандзе[24]. Савет бяспекі можа таксама дасылаць дырэктыву аб разглядзе той або іншай сітуацыі ў краіне ў Міжнародны крымінальны суд, які працуе з 1998 года ў пастаянным рэжыме. Гэтыя суды хаця і не могуць выправіць бягучую сітуацыю ў той ці іншай краіне, але ўсё ж з’яўляюцца важнымі інструментамі ўздзеяння ў сённяшнім свеце.

*Савет па правах чалавека ААН*

Калі правы чалавека — толькі адна са сфераў працы для Генеральнай Асамблеі ААН і Савета бяспекі, то для Савета па правах чалавека ААН — гэта галоўная сфера дзейнасці.

Савет быў створаны ў 2006 г. наўзамен Камісіі па правах чалавека ААН, якая займалася ў свой час стварэннем Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека. У Савеце — 47 месцаў, падзеленых паміж краінамі з усіх частак свету. Савет збіраецца на пасяджанні тры разы на год, не лічачы экстранных пасяджанняў. Ён можа адыгрываць даволі вялікую ролю, асабліва калі ўзнікаюць тэрміновыя крызісныя сітуацыі ў свеце, з мэтай папярэджання эскалацыі канфлікту.

Задача Савета — устанавіць больш-менш перыядычную сістэму ацэнкі сітуацыі з правамі чалавека ў свеце. Да таго, як тыя ці іншыя дзяржавы будуць абраны членамі Савета, аналізуецца сітуацыя з правамі чалавека ў дадзеных краінах і палітыка, якая вядзецца ў гэтай галіне.

У Савета таксама ёсць паўнамоцтвы ствараць так званыя спецыяльныя працэдуры, каб збіраць і запытваць інфармацыю аб сітуацыі з правамі чалавека па краінах або па аспектах правоў чалавека. На сённяшні дзень налічваецца каля сарака такіх працэдур. Аднымі з важнейшых з’яўляюцца сёння спецыяльныя дакладчыкі ці працоўныя групы, якія складаюцца з некалькіх незалежных экспертаў.

Адны працоўныя групы назіраюць за сітуацыяй з правамі чалавека ў асобна вызначаных геаграфічных раёнах і краінах. Працоўныя групы працуюць у Паўднёвай Афрыцы, Чылі, Афганістане, на тэрыторыі былой Югаславіі, у Іраку, Іране, Бірме, Руандзе, Судане, у Дэмакратычнай Рэспубліцы Конга і ў Палестыне.

У чэрвені 2004 года была прынята рэзалюцыя Камісіі па правах чалавека ААН з рашэннем аб увядзенні пасады Спецыяльнага дакладчыка па пытаннях правоў чалавека ў Беларусі. Задачай спецдакладчыка з’яўлялася ўсталяванне кантактаў

з урадам і народам Беларусі для вывучэння становішча з правамі чалавека ў краіне і прадстаўленне адпаведнай справаздачы камісіі. Урад Беларусі цалкам адмовіўся ад супрацоўніцтва са спецдакладчыкам, ні разу не даўшы дазволу на наведванне краіны. У чэрвені 2007 года, згодна з рашэннем Савета ААН, пасада спецдакладчыка па Беларусі была скасавана, што стала своеасаблівым крокам насустрач беларускім уладам, ад якіх у сваю чаргу чакаліся станоўчыя зрухі ў галіне выканання правоў чалавека і сваіх абавязацельстваў перад беларускімі грамадзянамі і міжнароднай супольнасцю.

Іншыя працоўныя групы працуюць па тэмах. У такім разе розныя геаграфічныя тэрыторыі могуць быць аб'яднаны праблемнай сітуацыяй. У апошнія гады самымі гарачымі тэмамі для працоўных груп былі:

- дзіцячая прастытуцыя;
- гандаль дзецьмі і распаўсюд дзіцячай парнаграфіі;
- унутрана перамешчаныя асобы;
- права на забеспячэнне харчаваннем;
- права на развіццё;
- праваабаронцы;
- права на жыллё;
- правы меншасцяў;
- свабода слова.

Уся інфармацыя, сабраная і апрацаваная спецыяльнымі дакладчыкамі і працоўнымі групамі, сцякаецца ў Савет па правах чалавека. Засноўваючыся менавіта на гэтай інфармацыі, Савет выносіць рэзалюцыі, якія крытыкуюць тую ці іншую дзяржаву, і выпрацоўвае рэкамендацыі па паляпшэнні сітуацыі з правамі чалавека ў той ці іншай краіне. Мэта такой працы — стварэнне ціску на міжнародным узроўні з тым, каб паўплываць на палітыку дзяржаў да лепшага.

**Іншыя сродкі ўздзеяння**

У 1990-х гадах Камісіяй па правах чалавека ААН былі ўнесены новыя карэктывы ў сваю працу. У мэтах эфектыўнай абароны правоў чалавека больш увагі было накіравана на патрэбы дзяржаў у дарадчай і тэхнічнай дапамозе. Адным дзяржавам прадастаўляецца, напрыклад, экспертная дапамога ў працы над гарманізацыяй уласнага заканадаўства з міжнароднымі стандартамі па правах чалавека, другім — у далейшым навучанні ў галіне правоў чалавека суддзяў, адвакатаў і работнікаў пенітэнцыярнай сістэмы.

З 1982 года Цэнтр правоў чалавека ААН у Жэневе з'яўляецца асноўным офісам ААН па правах чалавека. У 1993 г. на Генеральнай Асамблеі ААН быў уведзены новы інстытут — Вярхоўны камісар па правах чалавека, задача якога — каардынаваць працу ААН у сферы правоў чалавека і кіраваць працай офіса ў Жэневе. У Вярхоўнага камісара ёсць таксама паўнамоцтвы выступаць з уласнымі ініцыятывамі і прапановамі, незалежна ад рэзалюцый Савета па правах чалавека ААН.

Многія офісы на месцах былі створаныя па ініцыятыве Вярхоўнага камісара і вядуць назіральную ці дарадчую дзейнасць у тых краінах, дзе яны размешчаны. Такія офісы ёсць у краінах былой Югаславіі, Паўднёвай Афрыцы, Калумбіі і Камбоджы.

**Цяжкасці**

Сістэма правоў чалавека ААН мае таксама шмат цяжкасцяў. Недахоп фінансавых і, як следства, чалавечых рэсурсаў — адна з іх.

Іншая сур'ёзная праблема — існуючая напружанасць паміж палітычным прагматызмам, з аднаго боку, і прынцыпамі маралі і правоў чалавека -- з другога. ААН — арганізацыя, якая ўсё ж адлюстроўвае інтарэсы дзяржаў-членаў. Спрэчныя пытанні, характэрныя для міжнароднай палітыкі, пераносяцца і на арганізацыю, дзе назіраецца тэндэнцыя групавання краін адпаведна інтарэсам, якія яны пераследуюць, і палітычным пазіцыям. Адна з такіх размежавальных ліній — гэта лінія, якая падзяляе развітыя краіны і краіны, якія развіваюцца. Краіны, якія развіваюцца могуць заяўляць аб жаданні паляпшаць сітуацыю ў галіне правоў чалавека ў сваіх краінах і крытыкаваць у далейшым развітыя краіны ў недастатковай падтрымцы з іх боку. Развітыя краіны, у сваю чаргу, абараняюць свае інтарэсы. У выніку не ўсе хацелі б актыўна падтрымліваць і спрыяць далейшаму прагрэсу краін, якія развіваюцца. Перамовы паміж краінамі вельмі часта кіруюцца інтарэсамі рэальнай палітыкі і завяршаюцца кампрамісамі, дзе ідэі салідарнасці часта прыносяцца ў ахвяру.

Некаторыя краіны — члены ААН маюць больш рэальнай улады, чым іншыя. Магчыма, з-за таго, што ААН хацела б захаваць добрыя адносіны з той ці іншай дзяржавай, крытыка сітуацыі ў той ці іншай краіне звычайна не такая моцная, якой магла б быць. Падобны прагматызм у палітыцы, калі правы чалавека саступалі інтарэсам рэальнай палітыкі, з'явіўся адной з прычын пераўтварэння Камісіі ў Савет па правах чалавека ААН. Камісія атрымала ў свой час вельмі шмат крытычных заўваг з нагоды сваёй празмернай палітызаванасці. Яркім прыкладам з'яўляецца тое, што ніколі не была створана працоўная група, каб разгледзець сітуацыю ў Кітаі або Тыбеце, хаця было відавочна, што там вялікія праблемы. Стварэнне падобнай працоўнай групы выклікала заўсёды пратэст з боку Кітая, які, у сваю чаргу, з'яўляецца пастаянным членам Савета Бяспекі ААН. Ці атрымаецца ў створанага Савета па правах чалавека адхіліцца ад празмернай палітызаванасці, пакажа час.

## Рэгіянальныя сістэмы

Існуюць таксама і рэгіянальныя сістэмы абароны правоў чалавека. У Еўропе маецца цэлы шэраг міждзяржаўных арганізацый, якія займаюцца правамі чалавека. Так, для таго, каб лепш абараняць правы чалавека, дзяржавы, якія ўваходзяць у Савет Еўропы, прынялі ў 1950 г. Еўрапейскую канвенцыю аб правах чалавека. Для кантролю за выкананнем правоў быў заснаваны Еўрапейскі суд па правах чалавека, які стаў важнай інавацыяй. Грамадзяне краін — членаў Савета Еўропы могуць падаць у суд скаргу на сваю дзяржаву, калі лічаць, што яна парушыла іх правы. Адзіная ўмова пры гэтым — справа грамадзяніна да моманту падачы ў Еўрапейскі суд павінна быць разгледжана вышэйшай судовай інстанцыяй краіны. Еўрапейскі суд па правах чалавека паўнамоцны прымаць рашэнні па скаргах, якія маюць абавязковае значэнне для дзяржаў-членаў.

У той час, як Савет Еўропы сочыць за тым, каб дзяржавы выконвалі свае юрыдычныя абавязацельствы ў галіне правоў чалавека, Арганізацыя па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (АБСЕ) сочыць за выкананнем палітычных абавязацельстваў. АБСЕ працуе, выкарыстоўваючы дыпламатыю, пасрэдніцтва і стварэнне інстытутаў для развіцця дэмакратыі і павагі правоў чалавека. У адрозненне ад ААН і Савета Еўропы, АБСЕ прымае толькі палітычныя рашэнні. Гэтыя рашэнні не з'яўляюцца заканадаўчымі.

Што датычыць Еўрапейскага Саюза (ЕС), гэта арганізацыя таксама адыгрывае вялікую ролю ў забеспячэнні бяспекі, дэмакратыі і правоў чалавека. Да дзяржаў, якія імкнуцца стаць членамі ЕС, прад'яўляюцца даволі жорсткія патрабаванні.

За межамі Еўропы важнымі арганізацыямі, якія абараняюць правы чалавека, з'яўляюцца Арганізацыя амерыканскіх дзяржаў і Афрыканскі саюз (раней — Арганізацыя афрыканскага адзінства). Міжамерыканская сістэма была заснавана Арганізацыяй амерыканскіх дзяржаў у 1948 годзе. Пасля ўступлення ў сілу Амерыканскай канвенцыі аб правах чалавека ў 1978 годзе ў Амерыцы была сфарміравана сістэма абскарджання парушэнняў правоў чалавека, аналагічная сістэме Савета Еўропы, дзе вышэйшым судовым органам з'яўляецца Міжамерыканскі суд па правах чалавека.

У 1981 годзе Арганізацыя афрыканскага адзінства прыняла Хартыю правоў чалавека і народаў, якая ўступіла ў сілу ў 1986 г. Важнейшым органам, які забяспечвае выкананне гэтай хартыі, з'яўляецца Афрыканская камісія па правах чалавека. У 2002 годзе Арганізацыя афрыканскага адзінства была ператворана ў Афрыканскі саюз. У Афрыканскага саюза ёсць спецыяльны суд, які мае права прымаць рашэнні па справах аб парушэннях правоў чалавека.



## Міжнародны крымінальны суд (ICC)

Дзяржавы могуць не выконваць сваіх абавязацельстваў, ухіляючыся ад крымінальнага пераследу асоб, якія здзейснілі ці здзяйсняюць грубыя парушэнні правоў чалавека падчас вайсковых канфліктаў. Часта гэта зацягвае канфлікты і ўскладняе задачу ўсталявання міру і спакою.

Для таго, каб расследаваць і пачаць крымінальны пераслед асоб, якія абвінавачваюцца ў злачынствах супраць чалавецтва, генацыдзе і вайсковых злачынствах, у 1998 г. быў заснаваны Міжнародны крымінальны суд. Суд размяшчаецца ў Гаагу, у Нідэрландах і можа ажыццяўляць крымінальны пераслед па злачынствах, здзейсненых на тэрыторыі ці грамадзянамі дзяржаў, якія ратыфікавалі статут гэтага суда. Суд прызваны дапаўняць нацыянальныя суды дзяржаў, якія нясуць асноўную адказнасць за крымінальны пераслед на такіх падставах. Міжнародны крымінальны суд прымае да разгляду справы, толькі калі нацыянальныя ўлады ўхіляюцца ад судовага разбіральніцтва ці няздольны ажыццявіць крымінальнае расследаванне належным чынам.

Дзяржавы становяцца ўдзельнікамі МКС (а злачынствы, здзейсненыя іх грамадзянамі або на іх тэрыторыі, — падсуднымі яму) па факце ратыфікацыі Рымскага статуту.

Да верасня 2009 года Рымскі статут ратыфікавалі 110 дзяржаў ва ўсім свеце. Рэспубліка Беларусь Рымскі статут не падпісала і, такім чынам, дзяржавай-удзельніцай Міжнароднага крымінальнага суда не з'яўляецца.

## Грамадскія арганізацыі

Міжнародныя грамадскія арганізацыі таксама адыгрываюць важную ролю ў абароне правоў чалавека. Сярод найбольш вядомых — Міжнародная амністыя, Артыкул 19, Хьюман Райтс Вотч і Хельсінкскія камітэты. У сферы абароны правоў чалавека таксама працуюць прафсаюзы, рэлігійныя супольнасці і дабрачынныя арганізацыі.

Усе гэтыя арганізацыі ўдзельнічаюць у працы ААН і іншых міжнародных арганізацый для таго, каб паўплываць і зрабіць больш эфектыўнай міжнародную праваабарончую дзейнасць. Многія ўяўляюць сабой буйныя міжнародныя сеткі і адыгрываюць важную ролю ў распаўсюдзе інфармацыі, прадстаўленні рэкамендацый і аказанні ціску на дзяржаўныя органы ўлады з мэтай паляпшэння сістэмы па абароне правоў чалавека. Нярэдка недзяржаўныя арганізацыі аб'ядноўваюцца па вызначаных пытаннях і такім чынам фарміруюць сілы, альтэрнатыўныя дзяржаўным уладам. Такая сіла часта называецца міжнароднай грамадзянскай супольнасцю.

## Гуманітарнае ўмяшальніцтва

У адных сітуацыях дзяржаўныя ўлады вінаваты ў грубых парушэннях правоў чалавека і сваіх грамадзян, у другіх — у дзяржаў не хапае рэсурсаў

прадухіліць такія парушэнні. Войны ў Харватыі і Босніі-Герцагавіне ў пачатку 1990-х гадоў, генацыд у Руандзе ў 1994 годзе, вайна ў Косава ў 1998—1999 гадах і нядаўні канфлікт у Судане — усё гэта прыклады тых сітуацый, дзе пацярпелі тысячы людзей, мірных грамадзян. Многія лічаць, што ў падобных сітуацыях неабходна ўзброенае ўмяшальніцтва міжнароднай супольнасці для выратавання жыццяў мірных грамадзян.

Гуманітарнае ўмяшальніцтва — гэта ўзброенае ўмяшальніцтва некалькіх дзяржаў для таго, каб спыніць генацыд (знішчэнне народа) альбо іншыя грубыя парушэнні правоў людзей.

Гуманітарнае ўмяшальніцтва — даволі спрэчная мера, паколькі яна парушае важны прынцып суверэннасці дзяржавы. Абаронцы ўзброенага ўмяшальніцтва лічаць, што міжнародная супольнасць не можа заставацца раўнадушнай,назіраючы агрэсію той ці іншай дзяржавы, накіраваную на ўласнае грамадзянскае насельніцтва. У міжнароднай супольнасці ў такім разе ёсць маральны абавязак умяшацца. Інакш у чым сэнс міжнароднай сістэмы правоў чалавека? Другія лічаць, што падобнае ўмяшальніцтва ўяўляе сабой небяспечную тэндэнцыю, паколькі парушае прынцып суверэнітэту дзяржавы і можа таксама злоўжывацца ў інтарэсах рэальнай палітыкі. І потым, хто мае права вырашаць, ці неабходна гуманітарнае ўмяшальніцтва? Праціўнікі сцвярджаюць, што няма на сённяшні дзень нейтральнага міжнароднага органа ў свеце, які мог бы прымаць такія рашэнні, і нагадваюць, што Савет Бяспекі ААН з'яўляецца палітычным органам, у якім толькі некаторыя «абраныя» дзяржавы маюць права вета.

Прынцып суверэнітэту дзяржавы застаецца на сённяшні дзень нагодай для дыскусій. Некалькі гадоў таму была створана міжнародная камісія, задачай якой было даследаванне магчымасцяў міжнароднай супольнасці ў выпадках злоўжывання дзяржавамі сваёй уладай і ў выпадках бездапаможнасці дзяржавы ў абароне ўласнага грамадзянскага насельніцтва. Канчатковая справаздача камісіі «Адказнасць абараняць» (зноска 25) паказвае на тое, што суверэнітэт дзяржавы прадугледжвае адказнасць і што асноўнай адказнасцю дзяржавы з'яўляецца забеспячэнне бяспекі насельніцтва. Выснова наступная: у тых сітуацыях, калі мірнае насельніцтва бяспраўнае і падвяргаецца гвалту, знявагам і знішчэнню і калі дзяржава сама ці адказная за гэта ці не ў сілах справіцца з такой сітуацыяй, прынцып неўмяшальніцтва цалкам губляе сваю сілу. Адказнасць тады перакладаецца на міжнародную супольнасць. Былы Генеральны сакратар ААН Кофі Анан сфармуляваў гэта так: «Калі гуманітарнае ўмяшальніцтва — непрымальны метад і ўяўляе сабой замах на суверэнітэт дзяржавы, якім чынам мы наогул можам рэагаваць на тое, што адбываецца ў Руандзе, у Срэбрэніцы — месцах, дзе маюць месца сістэматычныя грубейшыя парушэнні правоў чалавека, якія супярэчаць усім прававым прынцыпам, на якія абапіраецца існаванне чалавецтва?»

### Правы чалавека ў развіцці

Правы чалавека не дадзены нам раз і назаўсёды, а з'яўляюцца вынікам доўгага гістарычнага працэсу і знаходзяцца ў няспынным развіцці. Іх не трэба лічыць чымсьці само сабой зразумелым, а неабходна ўвесь час абараняць. Мы далёка прасунуліся ў вызначэнні правоў і сталі сведкамі таго, што большасць дзяржаў іх прынялі. Сёння ў свеце абмяркоўваюцца канкрэтныя механізмы абароны правоў чалавека — юрыдычныя, палітычныя, эканамічныя і вайсковыя (гуманітарная інтэрвенцыя).

Нягледзячы на станоўчае гістарычнае развіццё сітуацыі, голад застаецца важнейшай праблемай, звязанай з правамі чалавека. Хаця насельніцтва свету ў цэлым ніколі раней не мела столькі багацця і ведаў, каля 1,2 мільярда людзей недаядаюць. Сёння неабходна працаваць над ліквідацыяй гэтай бяздоннай беднаты, якая не дае людзям жыць годна. Варта не толькі праводзіць шырокамаштабную працу для таго, каб многія змаглі скарыстацца правамі чалавека, але яшчэ і абмяркоўваць іх змест. Менавіта таму, што правы чалавека з'яўляюцца неад'емнай часткай рэчаіснасці і няспынна развіваюцца, і ўзнікаюць складаныя дылемы. Адна дылема звязана з канфліктам паміж рознымі правамі. Права на свабоду слова можа, напрыклад, знаходзіцца ў супярэчнасці з правам на абарону ад расізму. Што пераважвае ў такім выпадку? Публікацыя карыкатур на прарока Мухамеда ўвесну 2006 года прывяла да гарачых дэбатаў аб межах свабоды слова і адказнасці ў адносінах да рэлігіі. Ці павінна павага да рэлігіі іншых людзей абмяжоўваць свабоду слова? Ці магчыма дазволіць казаць абсалютна ўсё?

Нашы сучасныя полікультурныя грамадствы спараджаюць мноства дылем. Што рабіць у выпадку, калі правы чалавека ўступаюць у канфлікт з рэлігіяй ці культурай? Ці можна лічыць заходняй фанабэрыстасцю патрабаванне забараніць насіць чадру ў школе? А як наконт хіджаба, які французскія ўлады забаранілі насіць у школе; шлюбаў па дамоўленасці паміж бацькамі жаніха і нявесты; іншых поглядаў на правы жанчын?

Змаганне з тэрарызмам таксама аказвае ўздзеянне на рэалізацыю правоў чалавека. У многіх краінах узмацняюцца меры назірання за людзьмі, абмяжоўваецца свабода перасоўвання, і кантроль дзяржавы становіцца ўсё мацнейшым. Многія ўказваюць на парадокс, які заключаецца ў тым, што ў змаганні з тэрорам мы выкарыстоўваем сродкі, якія падрываюць тыя каштоўнасці, якія мы хочам абараніць. Што лічыць правільным і дзе праходзяць межы?

Прыведзеныя вышэй пытанні — толькі некаторыя з шэрагу шматлікіх, на якія не абавязкова існуюць адназначныя адказы, прынамсі, на дадзены

момант. Можа быць, лепш за ўсё вырашаць гэтыя дылемы, пастаянна абмяркоўваючы іх? Якія наступствы нашы адказы, тыя выбары, якія мы робім, будуць мець для нашага грамадства заўтра? Жывыя дыскусіі з'яўляюцца паказчыкам плюралізму, важнага для правоў чалавека. Яны таксама паказваюць, што правы чалавека не ўяўляюць сабой нейкія аб'ектыўныя веды ці пэўную ідэалогію. Правы чалавека — гэта хутчэй сфера, якая развіваецца, дзе прасочваецца як маральная, так і юрыдычная логіка. Магчыма, на гэтай аснове і са здаровай доляй скепсісу нам і варта разглядаць спрошчаныя чорна-белыя адказы?

Гэта не азначае, што адказ ніколі не будзе знойдзены ці што людзі не змогуць прыйсці да згоды. На кожнае пытанне ёсць шмат адказаў, і кожны дзень іх становіцца ўсё больш. Пытанне аб рабстве інтэнсіўна абмяркоўвалася 200 гадоў таму. Сёння забарону рабства ніхто не ставіць пад пытанне. Сто гадоў таму выбарчае права для жанчын таксама выклікала моцную эмацыйную рэакцыю і дэбаты, стаяла першым пытаннем у палітычным раскладзе дня грамадства. Жаночае абразанне, нягледзячы на тое, што гэты звычай абараняецца ў асобных культурах, сёння ацэньваецца як ушчамленне правоў чалавека і шырока асуджаецца.

Ёсць шэраг іншых пытанняў, дзе развіццё ідзе ў вызначаным накірунку. Так, адмена смяротнага пакарання знаходзіць шырокую падтрымку, ва ўсякім разе ў Еўропе, дзе ад краін — членаў Савета Еўропы патрабуюць яе адмены. Правы гомасэксуалістаў — пытанне, якое знаходзіць сёння ўсё большае і большае разуменне.

Мы можам быць упэўненымі ў тым, што многія з сённяшніх дылем атрымаюць сваё вырашэнне. А пакуль мы павінны працягваць складаць уласныя меркаванні, і калі нам гэта будзе здавацца цяжкім, то варта звярнуцца да ключавых каштоўнасцяў правоў чалавека: раўнацэннасці і чалавечай годнасці. Бывае, што з адным ці некалькімі людзьмі абыходзяцца так, нібыта ў іх няма чалавечай годнасці, — гэта парушае дух правоў чалавека.

### Важныя пункты для падрыхтоўкі даклада аб правах чалавека

- Этычнай асновай правоў чалавека з'яўляецца чалавечая годнасць і раўнацэннасць усіх людзей.

- Правы чалавека — гэта правы асобных людзей у адносінах да дзяржавы, у якой яны жывуць: права на жыццё, роўнасць перад законам, свабода слова, рэлігіі, права на школьнае навучанне, права на сацыяльныя выгоды, бяспеку і гэтак далей. У іх аснове ляжыць прынцып недыскрымінацыі: усе людзі маюць аднолькавыя правы, незалежна ад полу, расы, колеру скуры, рэлігіі, этнічнай ці нацыянальнай прыналежнасці або іншых прыкмет.


Пераход ад камуністычнай сістэмы да дэмакратыі — шлях доўгі і складаны. Мінск, верасень 2009 г.

- Ідэі правоў чалавека не новыя. Тыя, хто мае ўладу, не могуць адвольна карыстацца ёю, яны павінны забяспечыць жыхарам краіны іх асноўныя правы. Правы чалавека былі ўпершыню запісаны ў форме юрыдычных абавязацельстваў дзяржаў падчас Французскай (1789 г.) і амерыканскай (1776 г.) рэвалюцый і паступова ўвайшлі ў канстытуцыі многіх дзяржаў (напрыклад, у нарвежскую 1814 года, у канстытуцыю Расійскай імперыі — з 1905 года, СССР — з 1918 года, сучаснай Расіі — з 1993 года, Рэспублікі Беларусь — з 1994 года).

- Горкі вопыт Другой сусветнай вайны прывёў да стварэння ААН. Нацысцкія канцэнтрацыйныя лагеры і сістэматычная дыскрымінацыя і знішчэнне яўрэяў, цыган, гомасэксуалістаў і іншых груп людзей сталі важнымі прычынамі ўключэння правоў чалавека ў паўнамоцтвы ААН.

- Камісія ААН па правах чалавека, у якую ўвайшлі 18 прадстаўнікоў з усяго свету, патраціла больш за два гады на распрацоўку Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека. Дэкларацыя была прынята 10 снежня 1948 года і складаецца з 30 артыкулаў, якія можна падзяліць на дзве катэгорыі: 1) артыкулы, прысвечаныя палітычным і грамадзянскім і 2) сацыяльным, эканамічным і культурным правам. Упершыню правы чалавека сталі ўніверсальнымі, гэта значыць сталі датычыць усіх людзей у свеце.

- У 1966 г. ААН быў прыняты Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах. Гэты пакт з'яўляецца палітычна абавязковым для дзяржаў, якія яго ратыфікуюць. Сёння існуе больш за 100 міжнародных дакументаў аб правах чалавека.

- Праца з правамі чалавека ажыццяўляецца ў тры этапы: 1) распрацоўка дакументаў, 2) ратыфікацыя іх дзяржавамі, 3) іх рэалізацыя. У цэлым можна сказаць, што сённяшнія праблемы правоў чалавека звязаны найперш з рэалізацыяй.

- Асноўную адказнасць за выкананне, абарону і ўмацаванне правоў чалавека нясуць дзяржавы. Механізмамі працы з'яўляюцца гарманізацыя нацыянальных законаў з міжнароднымі стандартамі па правах чалавека, крымінальнае расследаванне і вынясенне судовых прысудаў за парушэнне правоў чалавека, інстытут упаўнаважанага па правах чалавека, спецыяльныя меры, накіраваныя на абарону правоў неабароненых груп насельніцтва, а таксама асветніцкая і інфармацыйная дзейнасць.

- Таксама і іншыя інстытуты грамадства могуць працаваць над умацаваннем правоў чалавека. Важнейшымі з такіх інстытутаў з'яўляюцца няўрадавыя арганізацыі, СМІ, бізнэс, асобныя грамадзяне.

- Існуюць міжнародныя механізмы абароны правоў чалавека. Юрыдычнымі механізмамі з'яўляюцца распрацаваныя ААН і іншымі арганізацыямі канвенцыі, якія прадугледжваюць адпаведныя сістэмы справаздачнасці. Палітычнымі механізмамі з'яўляюцца рэзалюцыі, якія прымаюцца Генеральнай Асамблеяй ААН, Саветам Бяспекі ААН і Саветам па правах чалавека, а таксама іншымі міжнароднымі арганізацыямі. Іншыя механізмы — гэта прафесійная і тэхнічная падтрымка, міратворчыя аперацыі і гуманітарныя інтэрвенцыі.

- Таксама існуюць рэгіянальныя сістэмы абароны правоў чалавека. Для нас, еўрапейцаў, важнейшай з іх з'яўляецца Канвенцыя Савета Еўропы аб правах чалавека і, адпаведна, Еўрапейскі суд па правах чалавека.

- Правы чалавека важныя як для таго, каб патрабаваць выканання сваіх уласных правоў, так і для таго, каб абараняць правы іншых. Яны не дадзены нам раз і назаўжды. Іх патрэбна абараняць кожны дзень.

---

9 Беларусь (БССР) з'яўляецца адной з краін — заснавальніц ААН.



10 Для таго, каб знайсці агульную мову і агульны падмурак для этычнага фундамента, ЮНЕСКА (Арганізацыі ААН па пытаннях адукацыі, навукі і культуры) было даручана сабраць меркаванні ўсіх буйных цывілізацый і рэлігій пра разуменне «агульнага дабра» і іх пажаданні, што павінна быць уключана ў тэкст Усеагульнай дэкларацыі. Камісія таксама аспрэчыла меркаванне пра тое, што правы з'яўляюцца «выключна» заходняй канцэпцыяй, якая ўзнікла ў эпоху Асветы, хаця мысліцелі гэтага перыяду сапраўды зрабілі вялікі ўнёсак у распрацоўку пытання.

11 У камісію, якая займалася распрацоўкай Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, уваходзіў у тым ліку і прадстаўнік Беларусі (БССР).

12 Беларусь (БССР) пры галасаванні ўстрымалася.

13 Гэтыя катэгорыі таксама называюць першым і другім пакаленнямі правоў, зыходзячы з іх храналагічнай паслядоўнасці.

14 Успрыманне Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека стала з часам такім шырокім, што яе статус неабавязковага юрыдычнага дакумента некалькі змяніўся. На дэкларацыю часта спасылаюцца як на юрыдычна абавязковы дакумент, засноўваючыся на прававым звычаі ў міжнародным праве.

15 Былыя выхаванцы дзіцячых дамоў; маракі, якія ўдзельнічалі ў вайсковых дзеяннях; качэўнікі-цыгане і саамы — гэта групы, якія атрымалі ад нарвежскай дзяржавы кампенсацыю за несправядлівае ў свой час да іх стаўленне.

16 Рэспубліка Беларусь не з'яўляецца членам Савета Еўропы і не ратыфікавала Еўрапейскую канвенцыю аб абароне правоў чалавека і асноўных свабод, адпаведна, грамадзяне краіны не могуць падаваць скаргі ў Еўрапейскі суд па правах чалавека.

17 Ад англійскага Non-Governmental Organisation — «няўрадавая арганізацыя».

18 Арганізацыі павінны вельмі асцярожна падыходзіць да супрацоўніцтва з дзяржаўнымі органамі і старацца не ўстанаўліваць занадта цесны кантакт, паколькі яны могуць падпасці пад крытыку за страту незалежнасці.

19 Steger, Manfred B: Globalization A very short introduction, New York, Oxford University Press Inc., 2003, s 48

20 Выключэнне складаюць прадпрыемствы, доля дзяржаўнай уласнасці ў якіх складае больш за 50 %.

21 Не ўсе канвенцыі маюць свае канвенцыйныя органы. Тады для кантролю і адсочвання сітуацыі ў дзяржавах выкарыстоўваюцца іншыя механізмы. У любым выпадку чакаецца, што дзяржавы будуць супрацоўнічаць з ААН і накіроўваць у ААН справаздачы пасля ратыфікацыі канвенцый.

22 Падобны разгляд часта адзначаецца як квазі(паў) юрыдычная працэдура.

23 Пастаянныя члены маюць права вета. Гэта азначае, што аднаго голасу дастаткова для накладання вета на тую ці іншую рэзалюцыю.

24 Гэта суды, прызначэнне якіх — працаваць толькі з канфліктнай сітуацыяй на працягу вызначанага адрэзку часу. Таму называюцца ad-hoc-суды.

25 Даклад Міжнароднай камісіі па пытаннях умяшальніцтва і дзяржаўнага суверэнітэту, снежань 2001 г.




Практыкаванні па тэме
«Правы чалавека»

# ЧАЛАВЕЧАЯ ГОДНАСЦЬ

**Тэма:**

Чалавечая годнасць і ўніверсальнасць правоў чалавека.

**Мэта:**

Звярнуць увагу на тое, што паняцце «годнасць чалавека» з'яўляецца падмуркам правоў чалавека.

Ці задумваліся вы калі-небудзь над тым, што такое годнасць чалавека?
Пачуццё чалавечай годнасці з'яўляецца, калі мы адчуваем, што з намі або з іншымі людзьмі паступілі несправядліва. Мы праяўляем тады спагаду і ставім сябе на месца іншых людзей. Калі мы бачым, што іншыя людзі знаходзяцца ў зневажальных умовах: у беднаце ці голадзе, іх збіваюць і зневажаюць у паліцыі, пазбаўляюць без суда маёмасці, свабоды, а часам і жыцця, забараняюць думаць і выказваць свае думкі ўслых, мець зносіны з іншымі людзьмі, пазбаўляюць сродкаў да існавання, — мы адчуваем, што зняважана іх чалавечая годнасць. Чалавечая годнасць — аснова правоў чалавека і іх універсальнасці, г. зн. іх існавання для ўсіх людзей без выключэння. Нягледзячы на тое, што ў нас розны колер скуры, мы належым да розных палоў, прытрымліваемся розных палітычных або рэлігійных поглядаў ці сэксуальных арыентацый, у нас ва ўсіх роўныя правы. Азначэнне і разуменне годнасці чалавека адлюстравана ў многіх культурах. Часам яго называюць залатым правілам: «Стаўся да іншых гэтак жа, як хацеў бы, каб ставіліся да цябе». Гэтае ж правіла зафіксавана і ва Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека. Давайце паразважаем аб годнасці чалавека і паспрабуем даць ёй азначэнне.

**Практычная рэалізацыя:**

Дадзенае практыкаванне ўключае ў сябе абмен ідэямі, працу ў групах, агульнае абмеркаванне і даклад. Выкананне практыкавання можа аказацца няпростым і можа выкарыстоўвацца як уступнае практыкаванне, так і на заключным этапе.

| | |
|---|---|
| **Час:** | Ад 1,5 да 3 гадзін. |
| **Што неабходна?** | Памяшканне, у якім магчыма праводзіць працу ў групах, вялікія лісты і фламастэры, ручкі і папера, па адным асобніку Усеагульнай дэкларацыі на кожнага ўдзельніка. |
| **Падрыхтоўка:** | Даклад аб Усеагульнай дэкларацыі з акцэнтам на годнасць чалавека і прынцып універсальнасці правоў чалавека. |

**Парадак выканання:**

1. У пачатку выкладчык коратка тлумачыць, што правы чалавека — гэта правы, якія ёсць ва ўсіх людзей ужо таму, што яны — людзі. У нас усіх ёсць права казаць, што мы хочам; ісці і ехаць, куды мы хочам; удзельнічаць у палітычным жыцці грамадства. У нас ёсць права на ежу, адзенне і адукацыю; права верыць або не верыць у Бога і г.д. Тое, што ва ўсіх ёсць аднолькавыя правы, называецца прынцыпам недыскрымінацыі. Этычнай асновай правоў чалавека з'яўляецца ідэя аб унікальнасці кожнага чалавека. Выконваючы гэта практыкаванне, мы падыдзем бліжэй да паняцця «чалавечая годнасць».
2. Кожнаму ўдзельніку даецца адна хвіліна падумаць над нейкай адной сваёй самай лепшай рысай характару. Напрыклад: шчодры, добры сябар, працаздольны і інш. NB: у ва ўсіх нас ёсць цудоўныя рысы характару. Усе распавядаюць затым коратка пра сябе і пра рысу свайго характару. Гэтае заданне можна даваць толькі ў класе, дзе дзеці добра ведаюць адзін аднаго, дастаткова адкрытыя і настроены на сумесную працу. Пасля завяршэння выкладчык выносіць наступныя пытанні на ўсеагульнае абмеркаванне:

– *Рысу характару, якую вы вызначылі як лепшую ў сабе, вы цэніце і ў іншых людзях?*
– *Што мы маем на ўвазе, калі гаворым, што мы паважаем саміх сябе і іншых людзей?*
– *Калі ў іншых людзей ёсць тыя добрыя рысы, якіх няма ў нас, вартыя яны нашай павагі ці не?*
– *Ці ўсе людзі заслугоўваюць павагі? Чаму?*

Ва ўдзельнікаў, хутчэй за ўсё, будуць розныя адказы і меркаванні, і выкладчыку неабходна падкрэсліць, што трэба паважаць розныя меркаванні. Хто-небудзь, напэўна, пачне прыводзіць доказы, чаму «злыя» людзі не вартыя павагі. У такім разе неабходна адзначыць, што ўсе людзі могуць паступаць як па-злому, так і па-добраму. Часта людзі паступаюць нядобра або становяцца, напрыклад, злачынцамі пад уплывам асяроддзя, у якім яны знаходзяцца. Паколькі ў нас усіх ёсць патэнцыял быць добрымі і злымі, можна сцвярджаць, што людзі не бываюць толькі злымі. Неабходна таксама рабіць розніцу паміж чалавекам і яго ўчынкамі. Калі мы кажам, што хтосьці — дрэнны або злы, можна падумаць, што мы не дапускаем магчымасці таго, што гэты нехта можа выправіцца. У гісторыі чалавецтва ёсць незлічоная колькасць прыкладаў таго, як людзі, якія здзейснілі жудасныя ўчынкі і злачынствы, змяняліся пасля ў лепшы бок. Калі вы згодныя з гэтым, мы можам зрабіць выснову, што неабходна паважаць і злых людзей. У дадзеным выпадку пад «павагай» мы не маем на ўвазе пазітыўнае стаўленне да любога ўчынку (інакш наогул знікне мяжа паміж

дабром і злом). Але, не прымаючы (асуджаючы) пэўныя дзеянні, мы не пазбаўляем чалавека яго права на павагу як чалавечай асобы. (10 хвілін)

3. Выкладчык дзеліць удзельнікаў на групы, якія паспрабуюць даць азначэнне годнасці чалавека і растлумачыць значэнне фразы «паважаць чалавечую годнасць». (15—20 хвілін)
4. Групы прадстаўляюць вынікі працы аўдыторыі. Неабходна пагадзіцца ў азначэнні. Напрыклад: годнасць чалавека азначае тое, што ў кожнага чалавека ёсць каштоўнасць, толькі таму, што ён — чалавек. Паважаць чалавечую годнасць — значыць паважаць псіхічную, духоўную і фізічную цэласнасць іншага чалавека. Грунтуючыся на дадзеным азначэнні, выкладчык можа задаць наступныя навадныя пытанні: ці могуць людзі вырашаць, ёсць у іншых людзей чалавечая годнасць або няма? (5 хвілін)
5. Удзельнікі зноў разыходзяцца па сваіх групах. Цяпер ім даецца заданне знайсці прыклады ідэалогій, краін/грамадстваў, дзе людзі або групы людзей пазбаўлены сваёй годнасці. Якія наступствы такой сітуацыі? Ідэі/адказы запісваюцца на вялікія лісты/плакаты. (30—45 хвілін)
6. Групы прадстаўляюць вынікі працы аўдыторыі. (5 хвілін)
7. Выкладчык робіць даклад аб Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека. Галоўная думка: мэтай правоў чалавека была абарона чалавечай годнасці. (10—45 хвілін у залежнасці ад таго, як глыбока выкладчык хацеў бы асвятліць тэму)
8. Удзельнікі ў групах павінны знайсці артыкулы Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, дзе агаворваецца чалавечая годнасць. Важна таксама зачытаць прэамбулу дэкларацыі. (10 хвілін)

### Возьмем пад ўвагу:

Задача правоў чалавека — абараніць чалавечую годнасць, забяспечыўшы ўсім людзям роўныя правы. Гісторыя навучыла нас таму, што чалавечую годнасць неабходна абараняць. Калі мы бачым, што хтосьці пазбаўлены тых жа правоў, што і астатнія, мы разумеем, што дадзеныя людзі ўшчэмлены ў сваіх правах. Беднага таксама з'яўляецца прычынай таго, што людзям недасяжна годнае жыццё, таму эканамічныя і сацыяльныя правы не менш важныя, чым «правы першага пакалення». Грубыя парушэнні правоў чалавека заўсёды пачынаюцца з малога. Нельга маўчаць, калі мы бачым, як людзі падвяргаюцца дыскрымінацыі, насмешкам, катаванням ці іншаму абыходжанню, што зневажае чалавечую годнасць. Павага да годнасці чалавека ствараецца намі самімі, навакольнымі людзьмі і дзяржавай, у якой мы жывем.



Калі было б усё так проста! Калі б толькі былі кепскія людзі, якія рабілі б не па-добраму, і ўсё, што трэба было б, — гэта аддзяліць іх ад нас і знішчыць. Але тая лінія, што адрознівае добрае ад дрэннага, праходзіць праз сэрца кожнага чалавека. І хто б вырашыўся знішчыць частку свайго ўласнага сэрца?

Аляксандр Салжаніцын

Паняцці «годнасць чалавека» і «раўнапраўе» замацаваны ў згаданым вышэй «залатым правіле», якое, у сваю чаргу, можна прасачыць у многіх культурах і рэлігіях. Гэтыя паняцці сталі асноўнымі пры падпісанні Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека (10 снежня 1948 г.).

- Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека, Артыкул 1: «Усе людзі нараджаюцца свабоднымі і роўнымі ў сваёй годнасці і правах. Яны надзелены розумам і сумленнем і павінны паступаць у адносінах адзін да аднаго ў духу братэрства». (Генеральная Асамблея ААН).
- Індуізм: «Гэта і ёсць спачуванне: не рабі іншым таго, што магло б прынесці табе боль, калі б тое ж самае было зроблена табе. Не трэба абыходзіцца з іншымі так, каб самому было непрыемна ад такога абыходжання. У гэтым і заключаецца мараль». (Махабхарата XIII 114.8)
- Даасізм: «Стаўся да поспехаў і стратаў свайго суседа як да сваіх уласных». (Тай Шанг Інг П'ен/ Tai Shang Ying P'ien)
- Канфуцый: «Не рабі іншым людзям таго, чаго не любіш сам». (Гутаркі 15, 23)
- Іудаізм: «Тое, што табе непрыемна, ты не павінен рабіць іншым людзям. У гэтым усё правіла, усё астатняе — каментары да яго». (Талмуд, Шаббат 3id)
- Хрысціянства: «Як вы б хацелі, каб іншыя ставіліся да вас, так вы і павінны ставіцца да іншых. Такі закон». (Евангелле ад Мацвея 7:12)
- Іслам: «Ніхто — няверуючы да таго часу, пакуль не пажадае для свайго брата таго, чаго жадаў для сябе самога». (Сунна, 40 Ахадыт аль-Навaві, 13)
- Платон: «Пакуль я ў здаровым розуме, я буду ставіцца да іншых людзей так, як хацеў бы, каб яны ставіліся да мяне».
- Катэгарычны імператыў Імануіла Канта: «Рабі па такім правіле, якое ты б хацеў бачыць агульным для ўсіх правілам». (Крытыка чыстага розуму)

### Варыяцыя 1:

Вядучы зачытвае ўслых дадзены прыклад і выносіць яго на агульнае абмеркаванне. Гэта вядомая цытата Джона Ролза аб справядлівасці:

*«Некалькі паважаных людзей сабраліся, каб выпрацаваць правілы, па якіх грамадства будзе жыць. Калі будзе дасягнута згода адносна правіл, усе гэтыя паважаныя людзі памруць, каб потым «зноўку» нарадзіцца. Аднак, яны не могуць ведаць, якімі яны народзяцца зноў: будуць яны мужчынамі ці жанчынамі, беднымі ці багатымі, са светлым ці цёмным колерам скуры».*

Вядучы пытаецца: да якіх правіл яны б прыйшлі ў такім разе? Чаму?

**Варыяцыя 2:**

Хоць і запісана ў многіх міжнародных дакументах аб правах чалавека, што ў кожнага чалавека ёсць годнасць, ці так гэта ў рэчаіснасці? Знайдзіце прыклады, якія паказваюць, што некаторыя людзі або групы людзей «менш каштоўныя», чым другія. Знайдзіце прыклады таго, як дзяржава, людзі ці мы самі ставімся да іншых як да ніжэйшых.

**Варыяцыя 3:**

Часта мы аб'ядноўваем людзей у групы, даем ім характарыстыкі. Ці здаралася такое з вамі? Ці з'яўляецца такое дзяленне непавагай да чалавечай годнасці? Ці мае гэта адносіны да таго, што мы хутчэй успрымаем людзей як групу, а не як асобы? Ці адчувалі вы самі калі-небудзь, што ваша годнасць была зняважана — у школе, дома ці ў грамадстве?

**Годнасць чалавека — каштоўнасць для грамадства. Чым больш шануецца годнасць чалавека, тым грамадства больш развітае.**



## Усеагульная Дэкларацыя правоў чалавека

**Прэамбула**

*Прымаючы да ўвагі,* што прызнанне годнасці, уласцівай усім членам чалавечай сям'і, і роўных і неад'емных правоў іх з'яўляецца асновай свабоды, справядлівасці і ўсеагульнага міру; і

*прымаючы да ўвагі,* што грэбаванне і пагарда да правоў чалавека прывялі да варварскіх актаў, якія абураюць сумленне чалавецтва, і што стварэнне такога свету, у якім людзі будуць мець свабоду слова і перакананняў і будуць свабодныя ад страху і нястачы, абвешчана як высокае імкненне людзей; і

*прымаючы да ўвагі,* што неабходна, каб правы чалавека ахоўваліся ўладай закона ў мэтах забеспячэння таго, каб чалавек не быў змушаны звяртацца ў якасці апошняга сродку да паўстання супраць тыраніі і прыгнёту; і

*прымаючы да ўвагі,* што неабходна садзейнічаць развіццю дружалюбных адносін паміж народамі; і

*прымаючы да ўвагі,* што народы Аб'яднаных Нацый пацвердзілі ў Статуце сваю веру ў асноўныя правы чалавека, у годнасць і каштоўнасць чалавечай асобы і ў раўнапраўе мужчын і жанчын і вырашылі садзейнічаць сацыяльнаму прагрэсу і паляпшэнню ўмоў жыцця пры большай свабодзе; і

*прымаючы да ўвагі,* што дзяржавы-ўдзельніцы абавязаліся садзейнічаць, у супрацоўніцтве з Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый, усеагульнай павазе і захаванню правоў чалавека і асноўных свабод; і

*прымаючы да ўвагі,* што ўсеагульнае разуменне характару гэтых правоў і свабод мае велізарнае значэнне для поўнага выканання гэтага абавязацельства,

*ГЕНЕРАЛЬНАЯ АСАМБЛЕЯ*

*абвяшчае* дадзеную Усеагульную дэкларацыю правоў чалавека ў якасці задачы, да выканання якой павінны імкнуцца ўсе народы і дзяржавы для таго, каб кожны чалавек і кожны орган грамадства, нязменна маючы на ўвазе дадзеную Дэкларацыю, імкнуліся шляхам асветы і адукацыі садзейнічаць павазе гэтых правоў і свабод і забеспячэнню, шляхам нацыянальных і міжнародных прагрэсіўных мерапрыемстваў, да усеагульнага і эфектыўнага прызнання і ажыццяўлення іх як сярод народаў дзяржаў — удзельніц Арганізацыі, так і сярод народаў тэрыторый, якія знаходзяцца пад іх юрысдыкцыяй.

## САМЫЯ НЕАБХОДНЫЯ ПАТРЭБЫ

**Тэма:**

Правы чалавека.

**Мэта:**

Удзельнікі навучання павінны зразумець, што для годнага, паўнавартаснага жыцця ва ўсіх людзей ёсць аднолькавыя, самыя неабходныя патрэбы. Выкананне правоў чалавека неабходна для таго, каб гэтыя патрэбы былі здаволеныя.

Ва ўсіх нас розныя мовы і рэлігіі, розны колер скуры і нацыянальнасць, розныя традыцыі. Калі спытаць пра нашыя самыя неабходныя патрэбы, мы наўрад ці будзем канцэнтравацца на тым, што нас адрознівае ад іншых, хутчэй наадварот — што паміж намі агульнага. Для добрага жыцця нам усім неабходна адчуваць сябе самастойнымі, свабоднымі людзьмі, якія заўсёды маюць магчымасць выбару месца працы і пражывання, сяброў і ворагаў, веры і няверы, ладу жыцця і палітычнага рэжыму ў краіне. Нам неабходна пачуццё абароненасці (немагчыма спакойна жыць, не будучы ўпэўненым, што цябе не могуць ні з таго ні з сяго ў любую хвіліну забіць, пасадзіць у турму або збіць) і датычнасці да жыцця іншых людзей, усяго грамадства.

Калі патрэбы людзей больш ці менш задаволены ў грамадстве, можна сказаць, што такое грамадства — камфортнае. Калі наадварот — людзям не хапае ежы і адзення, дрэнна з жыллём, яны несвабодныя і не маюць магчымасці вучыцца і развівацца, такое грамадства, хутчэй за ўсё, раздзіраюць канфлікты, насілле і войны.

**Практычная рэалізацыя:**

Практыкаванне пачынаецца з працы ў групах, з наступнымі прэзентацыямі і агульным абмеркаваннем. У канцы таксама магчымы даклад.

**Час:** Ад 1,5 да 3 гадзін.
**Што неабходна?** Вялікія адрыўныя лісты і фламастэры, па адным асобніку Усеагульнай дэкларацыі на кожнага ўдзельніка.
**Падрыхтоўка:** Даклад па тэме «Правы чалавека» і гісторыі стварэння Усеагульнай дэкларацыі.

**Парадак выканання:**

1. Удзельнікі дзяляцца на групы і атрымліваюць заданне пагадзіцца адносна патрэб чалавека, неабходных для добрага, камфортнага і годнага жыцця. Патрэбы запісваюцца на вялікія лісты. (10 хвілін)
2. Вядучы запісвае названыя патрэбы на дошку, падзяліўшы іх на 3 катэгорыі: 1) матэрыяльныя патрэбы; 2) нематэрыяльныя патрэбы; 3) грамадскія патрэбы (глядзіце ніжэй схему-ілюстрацыю). Абмеркаванне пачынаецца пасля таго, як усе патрэбы названы і запісаны. Вядучы запісвае на дошцы/плакаце адказы на наступныя пытанні:
   - Якія наступствы таго, што матэрыяльныя патрэбы людзей задаволеныя? (Дабрабыт грамадства). Якія наступствы таго, што яны не задаволеныя? (Бедната, якая вядзе да пачуцця прыніжанасці, залежнасці ад багатых і тых, хто мае уладу)
   - Якія наступствы таго, што нематэрыяльныя патрэбы людзей задаволеныя? (Свабода, самапавага, магчымасць асабістага развіцця) Якія наступствы таго, што яны не задаволеныя? (Несвабода, прыніжанасць, немагчымасць асабістага развіцця)
   - Якія наступствы таго, што грамадскія патрэбы людзей задаволеныя? (Пачуццё бяспекі, надзейнасці, уключанасці ў жыццё грамадства і дзяржавы). Якія наступствы таго, што яны не задаволеныя? (Пачуццё небяспекі, ненадзейнасці, аўтарытарны рэжым). (10 хвілін)
3. Вядучы падводзіць вынік: у тым грамадстве, дзе патрэбы людзей задаволеныя, ёсць больш верагоднасці таго, што ў такім грамадстве добра жыць і ў ім пануе мір. Калі ж патрэбы людзей незадаволеныя, ёсць больш верагоднасці незадаволенасці людзей, падстаў для канфліктаў, насілля. Усе патрэбы — матэрыяльныя, нематэрыяльныя і грамадскія — важныя, паколькі яны ўзаемна дапаўняюць адна адну. Калі якія-небудзь з іх незадаволены, верагоднасць прыніжанасці асобы, залежнасці ад моцных ці багатых узрастае. Галоўная ідэя Усеагульнай дэкларацыі ў тым, што асноўныя патрэбы людзей у грамадстве павінны быць задаволены. (3—5 хвілін)
4. Вядучы робіць даклад аб Усеагульнай дэкларацыі, канцэнтруючыся на той ідэі, што яна ўтрымлівае патрэбы чалавека і магчымасці іх задавальнення з тым, каб забяспечыць людзям добрае годнае жыццё. (10—30 хвілін)
5. Удзельнікі вяртаюцца ў свае групы з заданнем прачытаць Усеагульную дэкларацыю і знайсці артыкулы, якія абараняюць патрэбы людзей, якія яны назвалі ў пачатку выканання практыкавання. Нумары артыкулаў запісваюцца іншым колерам, насупраць вызначаных патрэб. (10 хвілін)
6. Вынікі прадстаўляюцца аўдыторыі. Вядучы можа выкарыстаць выпадак, каб зачытаць артыкулы Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека. (5 хвілін)

**Возьмем пад ўвагу:**

Ва ўсіх нас ёсць асноўныя патрэбы ў жыцці. Для таго, каб наша жыццё было мірным, добрым і спакойным, важна, каб такія матэрыяльныя

патрэбы, як ежа, адзенне, жыллё; нематэрыяльныя патрэбы, як свабода і магчымасць асабістага развіцця; і грамадскія патрэбы, як спакой, парадак і прадказальнасць, былі задаволены. Правы чалавека існуюць для таго, каб яны былі рэалізаваны ў якасці асноўных патрэб чалавека.

| | *Задаволены* | *Незадаволены* |
|---|---|---|
| *Матэрыяльныя патрэбы:*<br>Ежа, вада, адзенне, жыллё і інш. | Дабрабыт грамадства | Бедната |
| *Нематэрыяльныя патрэбы:*<br>Свабода (слова, перасоўвання, сходаў), адукацыя, асабістае развіццё, адпачынак, творчасць, вера і нявера ў Бога, каханне, стасункі і інш. | Свабода<br>Магчымасць асабістага развіцця | Несвабода<br>Немагчымасць асабістага развіцця |
| *Грамадскія патрэбы:*<br>Спакой і парадак, бяспека, абарона, стабільнасць, прадказальнасць, чыстае навакольнае асяроддзе, доступ да інфармацыі | Бяспека | Небяспека |
| *Вынік:*<br>грамадства | Спакойнае, мірнае | Неспакой і канфлікты |

### **Варыяцыя:** Гульня ў хованкі

*Тэма:*
Мы — розныя, але правы ва ўсіх нас аднолькавыя.

*Мэта:*
Зразумець, што адрозненні паміж намі неабходныя, і нічога страшнага ў гэтым няма.

*Час:* 30 хвілін.

1. Удзельнікі ўтвараюць кола. Ці ёсць жадаючы быць вядучым, з павязкай на вачах?
2. Выкладчык паварочвае вядучага некалькі разоў вакол сябе і падводзіць да каго-небудзь з удзельнікаў у коле. Вядучы дакранаецца да адзення, валасоў, твару і спрабуе ўгадаць удзельніка.
3. Практыкаванне заканчваецца, калі ўсе ўдзельнікі пабывалі вядучымі.






Маленькая дзяўчынка з бабуляй просяць міласціну на адной з вуліц Віцебска.
Лістапад 1998 г.

**Абмеркаванне:**
- Як вы думаеце, навошта мы рабілі гэтае практыкаванне?
- Як вы пазналі, хто гэта быў з удзельнікаў?
- Што, калі б у кагосьці быў іншы колер скуры ці вачэй?
- Што, калі б ва ўсіх былі аднолькавыя насы, валасы або вушы?
- Навошта нам усім аднолькавыя правы, калі ўсе мы — розныя?

**У свеце дастаткова сродкаў і рэсурсаў, каб задаволіць чалавечыя патрэбы. Але недастаткова, каб задаволіць чалавечую прагнасць.**

**Махатма Гандзі**

# НОВАЯ ПЛАНЕТА

### Тэма:

Уводзіны ў правы чалавека.

### Мэта:

Удзельнікі навучання павінны сфармуляваць правілы, неабходныя для таго, каб забяспечыць павагу чалавечай годнасці і стварыць добрае грамадства. Яны павінны зразумець, што правы чалавека — гэта правілы, закліканыя вырашыць менавіта гэту задачу.

Часта правілы ўяўляюць як тое, што накладае абмежаванні на нашу жыццядзейнасць. Калі мы падумаем добра, то высветлім, што правілы важныя для таго, каб забяспечыць людзям справядлівае абыходжанне і абарону. На працягу ўсёй гісторыі чалавецтва існавалі законы і правілы паводзін людзей у грамадстве. Калі б усе маглі рабіць тое, што хочуць, то грамадства стала б культываваць права мацнейшага. Тады галоўным будзе з'яўляцца не карысць грамадства, а ўлада. Такім чынам, законы і правілы неабходны для стварэння парадку, прадказальнасці і міру. Некаторыя філосафы называлі такія правілы «грамадскай дамовай», у якой кожны чалавек свядома ахвяруе часткай сваёй свабоды, узамен атрымліваючы абарону і стабільнасць. Але якога ж кшталту правілы нам патрэбны?

### Практычная рэалізацыя:

Практыкаванне пачынаецца з працы ў групах, затым групы прадстаўляюць свае вынікі аўдыторыі, заслухоўваецца даклад, і ў канцы зноў праводзіцца праца ў групах. Магчыма праводзіць некаторыя элементы асобна, але рэкамендуецца рабіць усе заданні разам.

**Час:** 3 гадзіны.

**Што неабходна?** Прасторнае памяшканне, у якім можна праводзіць працу ў групах, вялікія лісты і фламастэры, ручкі і папера, па адным асобніку Усеагульнай дэкларацыі на кожнага ўдзельніка.

**Падрыхтоўка:** Даклад аб гісторыі і станаўленні правоў чалавека і змесце Усеагульнай дэкларацыі.

### Парадак выканання:

1. Кіраўнік дзеліць удзельнікаў на невялікія групы і тлумачыць заданне: *На Зямлі адбылася катастрофа, і ўсё жыццё аказалася знішчаным. Вы — адзіныя з усіх людзей, для каго знайшлося месца на ракеце, якая ляціць на цалкам новую планету. Гэтая планета вельмі падобная на Зямлю, на ёй ёсць горы, азёры, горныя раўніны, моры і атмасфера, якая дазваляе нам дыхаць. Там ёсць прырода, лясы, трава, садавіна на дрэвах, гародніна і жывёлы. Адзінае, чаго няма, — гэта людзей, вы — першыя. Паступова вы размнажаецеся, і вас становіцца больш. У вас, як у самых першых людзей, ёсць прывілей — вызначыць, якія правілы будуць дзейнічаць у грамадстве на гэтай планеце. Такім чынам, ваша заданне: выпрацаваць 10 правіл, якія будуць датычыць усіх людзей на планеце, каб яны маглі жыць шчасліва.* Важна, каб члены груп прыйшлі да згоды наконт правіл. Правілы трэба запісаць на вялікім лісце, і вы можаце самі прыдумаць назву новай планеты. (25 хвілін)
2. Усе сустракаюцца на агульным сходзе, дзе групы прадстаўляюць і абгрунтоўваюць правілы. Падчас выступу вядучы дае магчымасць для абмеркавання. Верагодна, групы выпрацуюць шмат аднолькавых правіл, і каб пазбегнуць паўтораў, вядучы можа сказаць, што адна група прадстаўляе толькі некалькі правіл, якія ўсе абмяркоўваюць, а затым даць слова наступнай групе. (10 хвілін)
3. Вядучы робіць даклад аб гісторыі правоў чалавека і прадстаўляе Усеагульную дэкларацыю (тэкст выдаецца ўсім). (20 хвілін)
4. Далей удзельнікі працуюць у тых жа групах. Заданне заключаецца ў тым, каб параўнаць правілы сваёй планеты з артыкуламі Усеагульнай дэкларацыі. Якія артыкулы рэгулююць тыя ж адносіны, што і вашы правілы? Побач з правілам неабходна запісаць нумар артыкула, пажадана фламастэрам іншага колеру. (15 хвілін)
5. Калі групы гатовы, усе сустракаюцца на агульным сходзе і прадстаўляюць вынікі. Верагодна, удзельнікі высветлілі, што многія з іх правіл супадаюць са зместам Усеагульнай дэкларацыі. Гэта добрая падстава для таго, каб зачытаць розныя артыкулы Дэкларацыі і лепш азнаёміцца з імі. (10 хвілін)

### Возьмем пад ўвагу:

Правы чалавека ўяўляюць сабой каштоўнасці і нормы, агульныя для ўсіх людзей на Зямлі. Гэта ўдзельнікі ведалі і раней, паколькі выпрацавалі шмат аднолькавых каштоўнасцяў і норм для сваёй уласнай планеты. Калі ў 1948 г. была прынята Усеагульная дэкларацыя, правы чалавека ўпершыню сталі ўніверсальнымі. Тады краіны — ўдзельніцы ААН заявілі, што будуць абараняць і ўмацоўваць правы чалавека, і гэта будзе адносіцца да ўсіх. Усеагульная дэкларацыя заклала аснову міжнароднай сістэмы правоў чалавека, якая з тых часоў атрымала далейшае развіццё.

### Варыяцыя 1:

Правы чалавека могуць натхніць на стварэнне этыкі правоў чалавека, каб высветліць, як людзям варта было б ставіцца адзін да аднаго. Можа быць, з выпрацаваных намі правіл мы маглі б таксама выпрацаваць абавязкі?

Папрасіце ўдзельнікаў скласці спіс абавязкаў у адпаведнасці з правіламі, якія яны выпрацавалі ў групах. Напрыклад, права на жыццё суадносіцца з абавязкам паважаць жыццё іншага чалавека. Папрасіце ўдзельнікаў распрацаваць дэкларацыю абавязкаў па ўзору дэкларацыі правоў чалавека. Паколькі ва Усеагульнай дэкларацыі 30 артыкулаў, кожнай групе варта распрацаваць ад 5 да 10 артыкулаў.

### **Варыяцыя 2:** Правілы для абароны і справядлівасці

1. Няхай удзельнікі падумаюць, навошта нам наогул патрэбны правілы, у чым іх сэнс? Правілы могуць быць у сямейным жыцці, паміж суседзямі ці ў гульні. Дайце слова кожнаму ўдзельніку. Запісвайце ідэі на лісце пад двума загалоўкамі: «Абарона» і «Справядлівасць».
2. Растлумачце ўдзельнікам, што ўсе гэтыя ідэі могуць быць суаднесены з вялікімі ідэямі: абарона і справядлівасць. У гульні заўсёды ёсць правілы для таго, каб яна была справядлівай. Правілы сямейнага жыцця могуць спрыяць парадку, чысціні і добрай атмасферы ў доме і бараніць такім чынам здароўе і дабрабыт сям'і. Правілы дапамагаюць нам вучыцца ў школе, жыць мірна з суседзямі і абараняць нас ад крыміналу. Добрыя правілы спрыяюць добрым адносінам з іншымі людзьмі, мы ўсведамляем сваю адказнасць і ўспрымаем іншых людзей сур'ёзна. Папрасіце ўдзельнікаў прывесці прыклады правілаў, якія абараняюць нас ад небяспек і бедаў. Папрасіце іх падумаць, якіх правілаў прытрымліваюцца дома іх бацькі:? Як гэтыя правілы абараняюць дзяцей? Якія патрэбы ёсць у дзяцей і як яны суадносяцца з гэтымі правіламі?
3. Вядучы тлумачыць удзельнікам, што правы чалавека сфармуляваны для таго, каб абараніць людзей і забяспечыць справядлівасць. Удзельнікі дзяцца на групы, чытаюць Усеагульную дэкларацыю і спрабуюць вызначыць, якія артыкулы ў ёй забяспечваюць «справядлівасць» якія — «абарону».
4. Прэзентацыя вынікаў працы ў групах.



## ЗНАЙДЗІЦЕ НІТКІ!

### Тэма:

Справядлівасць і несправядлівасць, роўнасць.

### Мэта:

Навучэнцы павінны адчуць несправядлівасць няроўнасці.

Усе мы калі-небудзь адчувалі несправядлівасць таго, што адбывалася з намі або іншымі людзьмі.

### Практычная рэалізацыя:

Гэтае вясёлае практыкаванне можна праводзіць як у памяшканні, так і на вуліцы. Практыкаванне пачынаецца з таго, што ўдзельнікі шукаюць схаваныя ніткі для пляцення сетак, і завяршаецца агульнай дыскусіяй.

**Час:** 30 хвілін.
**Што неабходна?** Ніткі трох колераў.

### Парадак выканання:

1. У вядучага ёсць ніткі трох колераў. Разрэжце клубкі прыкладна на 20—30 маленькіх нітак кожны і схавайце іх дзе-небудзь. Пажадана, каб два з выбраных колераў былі вельмі яркімі, чырвоным ці жоўтым напрыклад. Трэці колер — няяркі, не вельмі заўважны.
2. Падзяліце ўдзельнікаў на 3 групы, якія будуць спрабаваць знайсці нітку свайго колеру.
3. Групам даецца ўсяго толькі 5 хвілін для таго, каб знайсці ніткі, паколькі не трэба, каб яны іх усе знайшлі.
4. Палічыце, колькі нітак знайшла кожная з груп. Выйграла тая, якая адшукала больш за ўсё нітак.

### Абмеркаванне:

- Як адчувалася быць членам групы, якая выйграла?
- Як адчувалася быць членам групы, якая прайграла?
- Якая з груп знайшла больш за ўсіх нітак? Чаму?
- Калі б мы гулялі яшчэ раз, членам якой групы ты хацеў/ла б быць? Чаму?
- Ці была гульня несправядлівай?
- Ці магчыма выканаць гэтае практыкаванне справядлівым чынам?

- Падумайце пра гульні, якія вы ведаеце: што робіць іх несправядлівымі? (напрыклад, футбол: у кожнай камандзе роўная колькасць ігракоў, ці не так?)

### Возьмем пад ўвагу:

Справядлівасць азначае, што людзі знаходзяцца ў роўных умовах і ставяцца да іншых, адпаведна, на роўных.





## ДАВАЙЦЕ АБМЯРКУЕМ СПРАВЯДЛІВАСЦЬ

### Тэма:

Правы чалавека грунтуюцца на справядлівасці.

### Мэта:

Даць зразумець, што справядлівасць — важны прынцып, які павінен «кіраваць» нашымі дзеяннямі і які з'яўляецца падмуркам правоў чалавека.

Большасць з нас хоць раз у жыцці адчувалі несправядлівасць. Асабліва гэта датычыць маленькіх дзяцей, паколькі яны — самыя слабыя істоты ў грамадстве, дзе правілы ўсталёўваюцца дарослымі. Дзеці вельмі адчувальныя да несправядлівасці. Мы ўсе былі калісьці дзецьмі і адчувалі сябе бездапаможнымі. У 1948 годзе, пасля жахаў Другой сусветнай вайны была прынята Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека. Самым важным прынцыпам, на якім грунтуюцца правы чалавека, з'яўляецца прынцып справядлівасці. Паколькі ва ўсіх людзей ёсць чалавечая годнасць, яе неабходна паважаць і ставіцца да ўсіх на роўных. Нягледзячы на наша шмат у чым падобнае пачуццё несправядлівых адносінаў, мы дагэтуль назіраем, што да людзей ставяцца па-рознаму як у нашай краіне, так і за мяжой. Часта словы занадта далёкія ад справы. Таму важна тлумачыць моладзі неабходнасць абароны справядлівасці і справядлівага стаўлення.

### Практычная рэалізацыя:

Практыкаванне пачынаецца з абмену ідэямі, працягваецца працай у групах і агульнай дыскусіяй. Яно раскрывае тэму свабоды, цярпімасці, адказнасці, мірнага суіснавання. Групы таксама могуць пайсці «далей» і распрацаваць «Слоўнік правоў чалавека», уключыўшы іншыя паняцці і аспекты правоў чалавека.

**Час:** 45 хвілін.
**Што неабходна?** Вялікія адрыўныя лісты і ручкі/фламастэры.

### Парадак выканання:

1. Спытайце ўдзельнікаў аб іх асацыяцыях адносна словаў «справядліва/несправядліва». Запішыце іх на лісце або дошцы. (10 хвілін)
2. Удзельнікі дзяляцца на маленькія групы і атрымліваюць заданне даць азначэнне слову «справядлівасць». (5 хвілін)
3. Запісаныя на лістах азначэнні развесце па сценах. Калі азначэнні вельмі розныя, папрасіце групу скласці ўсе азначэнні/ідэі ў адно агульнае. (5 хвілін)
4. Абмеркаванне. (20 хвілін)




Моладзевая акцыя супраць арыштаў па палітычных матывах. Мінск, 1 мая 2006 г.

- Ці важная справядлівасць? Чаму?
- Ці маглі б вы ўзгадаць адну справядлівую і несправядлівую сітуацыю з вашага жыцця?
- Што стварае несправядлівасць?
- Як адчуваецца несправядлівасць?
- Ці заўсёды атрымліваецца ўстанавіць справядлівасць?
- Як мы можам устанавіць/забяспечыць справядлівасць у школе/у грамадстве/вакол нас/у краіне/у свеце?

5. Вядучы зачытвае Артыкул 2 Усеагульнай дэкларацыі аб тым, што правы чалавека распаўсюджваюцца на ўсіх, незалежна ад іх полу, колеру скуры, этнічнай, нацыянальнай ці рэлігійнай прыналежнасці. Правы чалавека — выражэнне таго, што нацыянальныя дзяржавы і сусветная супольнасць бяруць за аснову прынцып справядлівасці для функцыянавання грамадства. (5 хвілін)

### Возьмем пад ўвагу:

Усе людзі ведаюць, што такое справядлівасць. Асабліва дзеці гэта добра ведаюць. Справядлівасць грунтуецца на ідэі, што ўсе людзі роўныя, і таму ніхто не мае права ставіцца да людзей прадузята на падставе якіх-небудзь знешніх прыкмет. Правы чалавека заснаваны на прынцыпе справядлівасці, пра што і дамовіліся краіны — ўдзельніцы ААН падчас працы над Усеагульнай дэкларацыяй правоў чалавека.

## Справядліва?

Напрыклад, нельга лічыць справядлівай аплату працы, калі ў розных рэгіёнах бюджэтнікі за аднолькавую працу атрымліваюць розны заробак. Несправядлівым з'яўляецца становішча дзяцей, якія навучаюцца ў прыватных школах, у параўнанні з вучнямі дзяржаўных школ, таму што дзяржава ніяк не кампенсуе іх бацькам грошай на навучанне, хаця яны плацяць падаткі, якія ідуць у тым ліку на аплату «бясплатнай» адукацыі.



## ШТО МЫ ВЕДАЛІ РАНЕЙ?

**Тэма:**

Правы чалавека.

**Мэта:**

Навучэнцы павінны пераканацца ў тым, што нешта яны ўжо ведаюць пра правы чалавека.

Многія лічаць, што правы чалавека — гэта нешта складанае і недасягальнае, нешта, што разумеюць толькі палітыкі і навукоўцы. Але калі мы падумаем крыху, то зразумеем, што правы чалавека маюць адносіны да навакольнай рэчаіснасці і што нешта пра іх мы напэўна ўжо ведаем. Вось толькі што?

### Практычная рэалізацыя:

У гэтым практыкаванні ўдзельнікі адказваюць на пытанні. Практыкаванне — уводзіны ў правы чалавека, і тут не важна дакладнае і правільнае веданне таго, што такое правы чалавека.

**Час:** 1 гадзіна.

**Што неабходна?** Дошка ці адрыўныя лісты паперы, фламастэры, папера, ручкі, анкета з пытаннямі для кожнага ўдзельніка.

**Падрыхтоўка:** Падрыхтуйце загадзя копіі анкет для кожнага ўдзельніка.

### Парадак выканання:

1. Кіраўнік называе пытанні, раздаўшы копіі анкеты з пытаннямі кожнаму ўдзельніку.
2. Удзельнікі «блукаюць» па пакоі і распытваюць адзін аднаго. Тыя, хто адказваюць, могуць падпісацца пад сваімі адказамі, калі хочуць. Такім чынам удзельнікі дзяляцца сваімі ведамі адзін з адным. Іншы варыянт: кожны адказвае сам на пытанні. (20 хвілін)
3. Вядучы «ідзе» па пытаннях і просіць удзельнікаў даць падрабязныя адказы. Адказы запісваюцца на дошцы або лісце ў выглядзе ключавых слоў. Не абавязкова, каб ва ўдзельнікаў былі адказы на ўсе пытанні. Акрамя таго, можа быць шмат адказаў на тыя ці іншыя пытанні, і, можа быць, не ўсе адказы — «правільныя». Варыянт: вучні аб'ядноўваюцца ў групы ў залежнасці ад таго, на якія пытанні яны атрымалі большую колькасць адказаў. Потым прадстаўляюць вынікі.



**Возьмем пад ўвагу:**

Калі мы добра падумаем, то выявім, што на самой справе мы ведаем шмат аб правах чалавека. Гэта таму, што яны маюць адносіны да рэчаіснасці, у якой мы ўсе знаходзімся і жывем.

## Анкета з пытаннямі: ці можаце вы назваць:

- Якое-небудзь права чалавека (дастаткова аднаго)?
- Краіну, дзе адбываюцца грубыя (масавыя, сістэматычныя) парушэнні правоў чалавека?
- Які-небудзь дакумент, які абараняе правы чалавека?
- Групу людзей, якіх праследуюць?
- Краіну, дзе ўшчамляюцца правы людзей па прычыне іх этнічнай прыналежнасці?
- Краіну, дзе ўшчамляюцца правы людзей па прычыне іх рэлігійных перакананняў?
- Краіну, дзе розныя групы людзей знаходзяцца ў стане канфлікту?
- Арганізацыю, якая абараняе правы чалавека на міжнародным узроўні? У нашай краіне?
- Фільм ці кнігу аб парушэннях (выкананні) правоў чалавека?
- Краіну, дзе адбываюцца катаванні людзей?
- Краіну, дзе сітуацыя з правамі чалавека стала лепш?
- Краіну, з якой людзям нельга эміграваць?
- Права чалавека, якое парушаецца ў школе ці дома?
- Чалавека, які змагаецца за правы чалавека?
- Права, якога часам пазбаўлены жанчыны?
- Права, якое павінны былі б мець усе дзеці?
- Права, якога некаторыя людзі пазбаўлены ў вашым грамадстве?
- Права, якое ёсць у іншых, але якога пазбаўлены вы?
- Права, якога вы ніколі не былі пазбаўлены?
- Парушэнне правоў чалавека, датычнае вас асабіста?

# ЯКІЯ ПРАВЫ ПАРУШАНЫ?

### Тэма:

Розныя правы чалавека.

### Мэта:

Удзельнікі павінны пазнаёміцца з рознымі правамі чалавека і разгледзець іх у цяперашняй рэчаіснасці.

Мы часта чуем пра тое, што штодня ў свеце парушаюцца правы чалавека. Гэта могуць быць дзеці ў Афрыцы, якія паміраюць ад голаду; людзі, якія падвяргаюцца расавай дыскрымінацыі або катаванням; уцекачы, якім няма прытулку. Гэта адбываецца як у нашай краіне, так і за мяжой. Ці ведаеце вы, якія правы парушаны?

### Практычная рэалізацыя:

Гэта практыкаванне, дзе ўдзельнікі працуюць у групах, ствараюць «свае» маленькія гісторыі, якія прадстаўляюцца аўдыторыі і абмяркоўваюцца.

| | |
|---|---|
| **Час:** | 45 хвілін. |
| **Што неабходна?** | Магчымасці для працы ў групах. |
| **Папярэднія веды:** | Удзельнікі павінны загадзя ведаць Усеагульную дэкларацыю правоў чалавека. |

### Парадак правядзення:

1. Растлумачце, што мэта практыкавання — лепш пазнаёміцца з правамі, запісанымі ў дэкларацыі. Вядучы зачытвае якую-небудзь гісторыю. Напрыклад:
   *«Марыя — журналіст. Яна напісала артыкул, які выклікаў абурэнне аднаго ёй незнаёмага, але, відаць, уплывовага чалавека. На наступны дзень яе выкрадаюць незнаёмыя людзі. Ніхто не ведае, дзе яна знаходзіцца. Яе збіваюць, падвяргаюць катаванням, патрабуючы публічна адмовіцца ад сваіх абвінавачванняў на адрас уплывовай асобы, і ўтрымліваюць некалькі месяцаў. У паліцыі доўга не хацелі прымаць заяву аб выкраданні, супрацоўнікі праваахоўных органаў не прадпрымаюць ніякіх мер для яе вызвалення».*
   Удзельнікі павінны паспрабаваць здагадацца, пра парушэнне якіх правоў, зафіксаваных у артыкулах дэкларацыі, ідзе размова. Дайце час на роздум. Потым абмеркаванне. (Кіраўнік павінен дапамагчы ўдзельнікам прыйсці да разумення таго, што ў дадзенай сітуацыі парушаны свабода слова, свабода і асабістая недатыкальнасць, забарона катаванняў.)
2. Вядучы дзеліць удзельнікаў на групы па 4—5 чалавек і дае заданне напісаць сваю ўласную гісторыю пра парушэнне правоў чалавека. Калі ўдзельнікаў мала, гісторыю можа пісаць кожны. Прыклады могуць быць выкарыстаны з рэальнага жыцця. (10—20 хвілін)
3. Кожная група прадстаўляе сваю гісторыю аўдыторыі, пакуль іншыя спрабуюць вызначыць, якія правы парушаны.

### Возьмем пад ўвагу:

Мы пазнаёміліся з рознымі правамі чалавека і з рознымі відамі парушэнняў. Парушэнні правоў чалавека адбываюцца кожны дзень як у нашай краіне, так і за мяжой. Толькі ведаючы пра іх, мы ў стане штосьці зрабіць, каб прадухіліць парушэнні правоў чалавека.




Супрацоўнікі міліцыі вырываюць у маладога чалавека сцяг. Мінск, 16 верасня 2005 г.

# ПАНТАМІМА АБ ПРАВАХ ЧАЛАВЕКА

**Тэма:**

Правы чалавека.

**Мэта:**

У лёгкай форме гульні навучэнцы павінны працягнуць знаёмства з рознымі правамі чалавека.

Якім чынам, напрыклад, чацвёра маладых людзей могуць паказаць сітуацыю прымусовага шлюбу, не выдаўшы пры гэтым ніводнага гуку? Як адлюстраваць уцекача, якому не даюць сховішча? Неверагодна, наколькі творчыя і разнастайныя сцэнкі можна паказаць на тэму правоў чалавека. Асабліва калі вы праводзіце іх паміж тэарэтычнымі заняткамі — тады нядрэнна бывае пасмяяцца і парухацца.

**Практычная рэалізацыя:**

Гэта практыкаванне, якое звычайна вельмі падабаецца ўдзельнікам, таму што яно прадугледжвае творчасць і фізічную актыўнасць. Замест Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека можна выкарыстаць Еўрапейскую канвенцыю.

| | |
|---|---|
| **Час:** | 45 хвілін. |
| **Што неабходна?** | Падрыхтаваць памяшканне для працы ў групах і прадстаўлення пантамім. |
| **Папярэднія веды:** | Удзельнікі павінны загадзя пазнаёміцца з Усеагульнай дэкларацыяй. |
| **Падрыхтоўка:** | Спіс артыкулаў Усеагульнай дэкларацыі, на падставе якіх групы будуць паказваць пантамімы. Для гэтай мэты добра падыходзяць артыкулы 5, 12, 14, 16, 17, 18, 19, 20, 24 і 26. |

**Парадак выканання:**

1. Падзяліце ўдзельнікаў на невялікія групы. Кожнай групе даецца артыкул з Усеагульнай дэкларацыі. Заданне — падрыхтаваць пантаміму (нямую сцэнку), якая паказвае парушэнне дадзенага артыкула. Важна, каб групы не ведалі, у якой групы які артыкул, і рэпеціравалі пантамімы ў асобных памяшканнях. (15—20 хвілін)
2. Усе ўдзельнікі садзяцца паўколам, каб кожны з іх мог бачыць усё, што адбываецца «на сцэне». Удзельнікі павінны мець на руках асобнікі Усеагульнай дэкларацыі.






3. Першая група выступае са сваёй пантамімай, а астатнія ўдзельнікі спрабуюць адгадаць, пра які артыкул Дэкларацыі ідзе размова. Тыя, хто думаюць, што ведаюць адказ, паднімаюць рукі, але нічога не кажуць. Вядучы падкрэслівае, што група павінна паказаць пантаміму да канца, каб яе не перарывалі і падчас яе не размаўлялі.
4. Далей кіраўнік выбірае аднаго чалавека, які зачытвае адпаведны артыкул з Усеагульнай дэкларацыі, пра які, па яго меркаванні, і была пантаміма. Калі група кажа, што адказ няправільны, пытаюцца ў іншага ўдзельніка. Пасля таго, як абвешчаны правільны адказ, наступныя групы выступаюць са сваімі пантамімамі.

# ЧЫТАННЕ ГАЗЕТ ПРАЗ «АКУЛЯРЫ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА»

**Тэма:**

Знаёмства з правамі чалавека.

**Мэта:**

Удзельнікі павінны зразумець, што правы чалавека датычаць нас усіх і фармуюць грамадства, у якім мы жывем.

Правы чалавека фарміруюць наша паўсядзённае жыццё. Амаль усё, што мы робім, ацэньваецца на падставе правоў чалавека, няважна, рэалізаваны яны, рэалізуюцца зараз ці парушаюцца. Цікава было б надзець «акуляры правоў чалавека» і агледзецца вакол сябе ў грамадстве. Вы калі-небудзь думалі пра тое, што выбар пары года і працягласць вашага адпачынку можна разглядаць праз прызму вашага права на адпачынак? А калі вы пераязджаеце ў іншы горад ці едзеце за мяжу, гэта з'яўляецца рэалізацыяй вашай свабоды перамяшчэння? Надзеньце акуляры правоў чалавека і знайдзіце прыклады ў газетах, якія паказваюць, што правы выкананы, парушаюцца ці знаходзяцца ў працэсе рэалізацыі.

**Практычная рэалізацыя:**

Практыкаванне пачынаецца з працы ў групах, затым групы прадстаўляюць вынікі на агульным сходзе.

**Час:** 45 хвілін.

**Што неабходна?** Вялікія лісты, фламастэры, газеты, нажніцы, клей.

**Парадак выканання:**

1. Кіраўнік дзеліць удзельнікаў на невялікія групы, якія павінны будуць знайсці матэрыялы ў газетах: артыкулы, фотаздымкі, лісты чытачоў, рэкламу, анонсы і інш., якія ілюструюць:
   1) выкананне правоў чалавека;
   2) працэсы паляпшэння сітуацыі з правамі чалавека;
   3) парушэнне правоў чалавека.
   Удзельнікі могуць пафантазіраваць і пашукаць прыклады, якія адносяцца да ўсіх трох катэгорый, выразаць адпаведныя матэрыялы і прыклеіць іх на вялікі ліст. Неабходна спасылацца на адпаведны канкрэтны артыкул Усеагульнай дэкларацыі. (20-30 хвілін)
2. Групы прадстаўляюць вынікі сваёй працы аўдыторыі.





Журналістам перашкаджаюць здымаць затрыманні ўдзельнікаў акцыі салідарнасці з палітзняволенымі і рэпрэсаванымі. Мінск, 16 кастрычніка 2009 г.

**Возьмем пад ўвагу:**

Правы чалавека непасрэдна звязаны з фарміраваннем нашага грамадства, і таму — з ходам нашага жыцця. Многае з таго станоўчага, што дасягнута грамадствам, з'яўляецца, на самой справе, рэалізацыяй правоў чалавека. Многае з адмоўнага можа быць звязана з парушэннем правоў чалавека. Такім чынам, працэсы, якія адбываюцца тут і цяпер, часта можна разглядаць у святле бягучай працы па паляпшэнні сітуацыі з правамі чалавека. Правы чалавека вызначаюць нашу рэчаіснасць.

## ГІСТОРЫЯ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА Ў МАЁЙ КРАІНЕ

**Тэма:**

Гісторыя правоў чалавека ў маёй краіне.

**Мэта:**

Удзельнікі павінны даведацца аб станаўленні правоў чалавека на працягу гісторыі і пераканацца, што людзі заўсёды змагаліся за выкананне правоў чалавека як у сябе дома, так і ў іншых краінах.

Усе дзеці ў Нарвегіі ходзяць у школу і атрымліваюць бясплатную медыцынскую дапамогу. Калі ім спаўняецца 18 гадоў, яны атрымліваюць права прымаць удзел у палітычным жыцці: галасаваць і быць абранымі ў парламент. Рабочыя і служачыя маюць права на годныя ўмовы працы, дастатковы заробак і кампенсацыю ў выпадку хваробы. Калі хтосьці з чымсьці не згодны ці мае іншае меркаванне, ён можа напісаць у газету або арганізаваць дэманстрацыю. Так было не заўсёды. За правы, даступныя нам сёння, змагаліся актывісты і праваабаронцы, часам ахвяруючы сваімі жыццямі. І ў Нарвегіі, і ў іншых краінах ёсць барацьбіты за правы, якім мы павінны сказаць вялікі дзякуй. Дзякуючы ім мы можам сказаць, што развіццё гісторыі правоў чалавека — пазітыўнае. Але, хаця сітуацыя з правамі чалавека развіваецца ў станоўчы бок, важна памятаць, што ёсць краіны, якія не гарантуюць правы чалавека для сваіх грамадзян у той ступені, у якой яны гарантаваны ў нарвежскім грамадстве. У многіх краінах становішча застаецца складаным. І нават у нашай краіне, якая некалькі гадоў запар выбіраецца ААН лепшай краінай для жыцця, існуе дастаткова праблем.

**Практычная рэалізацыя:**

Практыкаванне засноўваецца на працы ў групах. З працягласцю правядзення практыкавання можна вар'іраваць: скараціць або зрабіць больш аб'ёмным, дадаўшы самастойную працу над праектамі.

| | |
|---|---|
| **Час:** | Ад 1 гадзіны да 1 тыдня. |
| **Што неабходна?** | Папера і ручкі, вялікія адрыўныя лісты, маркеры. Доступ да інфармацыі: СМІ, бібліятэка, Інтэрнэт і інш. |
| **Папярэднія веды:** | Удзельнікі павінны загадзя мець агульнае ўяўленне аб правах чалавека. |

**Парадак правядзення:**

1. Падзяліце ўдзельнікаў на групы і дайце заданне знайсці прыклады, якім чынам правы чалавека развіваліся ў краіне. У залежнасці ад таго, колькі ў групе чалавек, кіраўнік можа выбіраць, спыніцца падрабязна на адной тэме і выдаткаваць на яе больш часу, або ўзяць некалькі тэм. Можна разгледзець гісторыю змагання за правы груп (напрыклад, правы жанчын, дзяцей, меншасцяў, рабочых або ўцекачоў) ці разгледзець гісторыю развіцця палітычных інстытутаў, сістэмы адукацыі і аховы здароўя. Можна паспрабаваць сабраць інфармацыю аб тым, якая была сітуацыя раней: падзеі або людзі, якія змянілі сітуацыю да лепшага. Практыкаванне можа быць вельмі творчым, і толькі фантазія ўстанаўлівае межы, якім чынам групы будуць працаваць і прадстаўляць вынікі. Прэзентацыі могуць быць яркімі: з выкарыстаннем фотаздымкаў, малюнкаў, музыкі; з выкарыстаннем эсэ, гістарычных апавяданняў/інтэрв'ю і інш.
2. Групы прадстаўляюць вынікі сваёй працы.

**Возьмем пад ўвагу:**

Абарона правоў чалавека не адбываецца сама па сабе. Многія людзі і групы людзей дамагаліся ажыццяўлення правоў чалавека ўласнымі і сумеснымі высілкамі — тых правоў, якія мы часам успрымаем як само сабой зразумелымі. Правы чалавека знаходзяцца ў няспынным развіцці. Заўсёды, калі дасягнуты адзін пэўны ўзровень развіцця грамадства, адкрываецца другі. Для таго, каб зразумець, чаму так добра жывецца сёння ў Нарвегіі, неабходна зрабіць «вандроўку» ў мінулае.

Многія ўцекачы — гэта барацьбіты за правы чалавека, якія вымушаны ўцякаць са сваіх уласных краін з-за таго, што яны былі занадта крытычнымі адносна свайго ўраду. Яны падвяргаюцца пераследу, і многія з іх знаходзяцца непасрэдна ў смяротнай небяспецы.

**Варыяцыя:**

**Доўгая вандроўка ў правы чалавека**

1. Кіраўнік тлумачыць, што такія дакументы, як Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека (1948 г.) і Еўрапейская канвенцыя (1950 г.) — у гістарычнай перспектыве «маладыя» дакументы.
2. Удзельнікі складаюць спіс людзей, якія, як яны думаюць, змаглі б адказаць на наступныя пытанні: ці стала жыццё наогул і жыццё дзяцей у прыватнасці лепш у нашым горадзе за апошнія 100 гадоў? Бабулі і дзядулі, пажылыя сваякі і суседзі — гэта тыя, хто мог бы даць адказы на такое пытанне. Удзельнікі могуць узяць у іх інтэрв'ю.
3. Добра, калі б пажылыя людзі змаглі прыйсці ў клас для інтэрв'ю. Таксама цікава было б паслухаць адразу некалькіх людзей, некалькі гісторый.



Зала паседжанняў беларускага парламента. 2009 год.

4. Пасля інтэрв'ю і аповядаў папрасіце ўдзельнікаў параўнаць тое, што яны пачулі, напрыклад, з тэкстам Дэкларацыі правоў чалавека, Еўрапейскай канвенцыі.

### Абмеркаванне:

- Ці паважаліся раней у гісторыі правы дзяцей?
- Якія правы не паважаліся? Чаму?
- Ці хацелі б вы жыць у той час?
- Ці змянілася як-небудзь сітуацыя для дзяцей з цягам часу? Да лепшага ці горшага?



## МІЖНАРОДНЫЯ ЗАКОНЫ – ГЭТА АДКАЗНАСЦЬ ДЗЯРЖАВЫ

### Тэма:

Як міжнародныя дамовы аб правах чалавека прыводзяць да зменаў у дзяржавах.

### Мэта:

Удзельнікі павінны зразумець, што ААН і іншыя міжнародныя арганізацыі сфармулявалі правы чалавека ў выглядзе міжнародных дэкларацый і канвенцый і што дзяржавы нясуць адказнасць за іх выкананне.

Калі людзі вядуць дыскусіі аб правах чалавека, то абмяркоўваюцца, як правіла, іх парушэнні. Добра «прадаюцца» толькі навіны пра канфлікты і праблемы, таму іх і перадаюць СМІ. Аднак важна разумець, што кожны дзень праводзіцца вялікая праца, дзякуючы якой сітуацыя з правамі чалавека павольна, але няўхільна паляпшаецца. Адным з важнейшых органаў, якія ствараюць гэтыя перамены, з'яўляецца ААН, паколькі ў ААН прымаюцца міжнародныя дамовы аб правах чалавека. Дзяржавы абавязуюцца паважаць і выконваць правы чалавека, калі падпісваюць і ратыфікуюць міжнародныя дэкларацыі і канвенцыі. Але як гэта адбываецца? Што азначае ратыфікацыя міжнароднай дамовы? У чым розніца паміж дэкларацыямі і канвенцыямі? Як гэта ўплывае на нашу рэчаіснасць?

### Практычная рэалізацыя:

Дадзенае практыкаванне — гэтае спалучэнне абмеркавання на агульным сходзе і тлумачэнні выкладчыка, якім чынам дакументы ААН аб правах чалавека ўплываюць на дзяржавы.

**Час:** 45 хвілін.

**Што неабходна?** Дошка і крэйда, вялікі ліст і фламастэры.

**Падрыхтоўка:** Вядучы павінен растлумачыць, як дакументы ААН аб правах чалавека ўплываюць на дзяржавы.

### Парадак выканання:

1. Кіраўнік пачынае з пытання пра тое, ці магчыма ў сённяшнім свеце дзіцяці нарадзіцца па-за якой-небудзь дзяржавай? *(Намалюйце чалавека, як паказана на ілюстрацыі.)* У свеце жывуць больш за 6 мільярдаў чалавек, і ўсе нараджаюцца ў адной з 200 існуючых дзяржаў. Дзяржавы маюць органы ўлады (парламент, суд, урад і іншыя органы выканаўчай

улады), якія вызначаюць жыццё насельніцтва краіны, прымаючы законы, сочачы за іх выкананнем і праводзячы тую ці іншую палітыку *(кіраўнік малюе на дошцы дзяржаву і яе насельніцтва, як паказана на ілюстрацыі)*.

2. Кіраўнік працягвае: калі органы дзяржавы далучаюцца да міжнародных дамоваў аб правах чалавека, яны бяруць на сябе пэўныя абавязацельствы. Далей кіраўнік пытаецца, як, па меркаванні ўдзельнікаў, ААН распрацоўвае дакумент аб правах чалавека? Удзельнікі выказваюць розныя прапановы, кіраўнік каментуе і дадае. *(Праз грунтоўныя шматбаковыя працэсы перамоў паміж дзяржавамі, калі фармулёўкі канчатковага дакумента часта з'яўляюцца кампрамісам для дзяржаў з рознымі меркаваннямі)*. Існуюць два асноўныя віды дакументаў аб правах чалавека: дэкларацыі і канвенцыі. У той час, як дэкларацыя з'яўляецца чыста палітычным і маральным дакументам, ратыфікацыя (далучэнне да канвенцыі) прадугледжвае выкананне юрыдычных абавязацельстваў. Палажэнні канвенцый становяцца часта часткай нацыянальных канстытуцый, паколькі дзяржавы, ратыфікаваўшы канвенцыі аб правах чалавека, абавязуюцца прывесці нацыянальныя законы ў адпаведнасць з імі. *(Праілюструйце гэтае палажэнне, намаляваўшы стрэлкі ад дэкларацый і канвенцый і паказаўшы, якім чынам яны ўплываюць на дзяржавы; гл. ілюстрацыю)*. Важна таксама падкрэсліць значэнне «дыялогу» паміж ААН і дзяржавамі, які ўзнікае з абавязку дзяржаў падаваць справаздачы ў ААН. Рэгулярна, часта раз у два ці чатыры гады, улады павінны падаваць у ААН справаздачу аб ходзе рэалізацыі канвенцыі. ААН, са свайго боку, уважліва вывучае справаздачы і паведамляе дзяржавам, у якой частцы рэалізацыя праходзіць добра, а што можна было б палепшыць. Каб інфармацыя аб становішчы з правамі чалавека была больш аб'ектыўнай, часта ў ААН разглядаюць 2 даклады: ад ураду краіны і ад праваабарончых арганізацый. Неабходна задаць навучэнцам пытанне: навошта патрэбен «альтэрнатыўны» даклад, напісаны праваабаронцамі?

**Возьмем пад ўвагу:**

Калі кажуць аб правах чалавека, нярэдка акцэнтуюць увагу на іх парушэннях, забываючы, такім чынам, аб станоўчым развіцці, якое адбываецца ў многіх краінах. Важна памятаць, што большасць краін свету далучыліся да міжнародных канвенцый аб правах чалавека і ўзялі на сябе пэўныя юрыдычныя абавязацельствы. Улады абавязаны суадносіць нацыянальныя законы з палажэннямі канвенцый. Яны таксама адказныя за тое, каб усе служачыя, прадстаўнікі дзяржаўнай улады (паліцэйскія, супрацоўнікі бальніц, службы аховы дзяцінства, сістэмы выканання пакарання, міграцыйных органаў і гэтак далей) атрымлівалі інфармацыю пра законы і падзаконныя акты і ведалі, што яны павінны рабіць, каб выконваць правы. Дзяржава таксама абавязана даводзіць да ведама насельніцтва, якія правы ёсць у пражываючых у дадзенай краіне.

Тры стадыі працы над міжнароднымі дакументамі:

1) заканадаўчая стадыя (распрацоўка міжнародных дакументаў);

2) стадыя ратыфікацыі (дзяржавы ратыфікуюць канвенцыі);

3) стадыя рэалізацыі (дзяржавы рэалізуюць правы чалавека ў дачыненні да свайго насельніцтва).

## Факты аб дэкларацыях і канвенцыях:

*Дэкларацыя* — гэта палітычны і маральны дакумент. Гэта важна ведаць і разумець. Калі адна дзяржава прымае тую ці іншую міжнародную канвенцыю, яна пасылае свайго роду сігнал іншым дзяржавам. А для дзяржаў, як і для людзей, важна трымаць сваё слова. Калі дзяржава кажа адно, а робіць іншае, гэта падрывае легітымнасць дзяржавы і давер да яе іншых краін, што можа адмоўна адбіцца на супрацоўніцтве паміж краінамі. У адрозненне ад дэкларацыі, *канвенцыя* — гэта дакумент, які прадугледжвае юрыдычныя наступствы для дзяржаў, якія яе ратыфікавалі (падпісанне адбываецца па спецыяльнай працэдуры; парламент павінен загадзя ўхваліць канвенцыю). Дзяржавы абавязуюцца:

1. Выконваць міжнародныя правы чалавека. Як правіла, дзяржавы прымаюць адпаведны нацыянальны закон, які абараняе пэўныя правы чалавека.
2. Рэгулярна паведамляць аб ходзе рэалізацыі (як правіла, раз у чатыры гады).

Часам дзяржавы абавязуюцца прымаць прадстаўнікоў ААН або іншай міжнароднай арганізацыі для ацэнкі ходу працы па рэалізацыі правоў чалавека.

Канвенцыі аб правах чалавека часта ўтрымліваюць палажэнні, якія дазваляюць дзяржавам не выконваць пэўныя абавязацельствы ў надзвычайных сітуацыях ці ў стане вайны. Гэта называецца дэрагацыя. Дзяржавы могуць таксама ў сувязі з ратыфікацыяй рабіць пэўныя агаворкі, гэта значыць устанавіць, што асобныя палажэнні канвенцыі не з'яўляюцца для іх абавязковымі.




- **Краіны павінны ўнесці змены ў свае законы такім чынам, каб яны адпавядалі абавязацельствам, якія яны ўзялі на сябе, падпісваючы канвенцыю.**
- **Краіны павінны прадстаўляць рэгулярную справаздачу Камітэту ААН аб ажыццяўленні гэтых абавязацельстваў.**
- **Камітэт ААН разглядае справаздачу, выносіць сваё меркаванне і дае рэкамендацыі.**



# НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АБАРОНА: ДЗЯРЖАВА І ІНШЫЯ

## Тэма:

Як правы чалавека абараняюцца дзяржавай.

## Мэта:

Удзельнікі павінны зразумець, што на дзяржаўных уладах ляжыць адказнасць за выкананне правоў чалавека і што іншыя інстытуты ў грамадстве таксама важныя.

Дзяржаўныя ўлады адказныя за выкананне правоў чалавека ў першую чаргу. Але акрамя дзяржавы існуюць шматлікія інстытуты грамадзянскай супольнасці: сродкі масавай інфармацыі, грамадскія незалежныя арганізацыі, адвакатура, а таксама бізнэс-структуры, якія могуць адыгрываць вялікую ролю ў прасоўванні і абароне правоў чалавека.

## Практычная рэалізацыя:

Гэта практыкаванне засноўваецца на дыскусіі паміж кіраўніком і ўдзельнікамі.

**Час:** 3 гадзіны.

**Што неабходна?** Дошка і крэйда або вялікія адрыўныя лісты і маркеры.

**Падрыхтоўка:** Даклад аб механізмах абароны правоў чалавека нацыянальнымі інстытутамі. Падборка матэрыялаў для працы ў групах ці спіс сайтаў, на якіх ёсць неабходная для працы інфармацыя (калі можна арганізаваць працу ў камп'ютарызаваным класе).

## Парадак выканання:

1. Вядучы пытаецца ва ўдзельнікаў, хто ў першую чаргу адказны за выкананне правоў чалавека. (Правы чалавека — гэта правілы, якія вызначаюць абавязкі дзяржавы ў адносінах да сваіх грамадзян. Таму на дзяржаве ляжыць адказнасць за выкананне гэтых абавязкаў) Вядучы распавядае коратка пра кожны «сродак» захавання правоў чалавека, якія ёсць у дзяржавы:
   - Законы: парламент павінен клапаціцца аб тым, каб правы чалавека былі часткай нацыянальнага заканадаўства.
   - Судовая сістэма: калі адбываецца парушэнне правоў чалавека, павінна быць праведзена расследаванне здарэння, заведзена судовая справа. Парушальнікі павінны панесці пакаранне.



Праваабаронца Алег Волчак удзельнічае ў пікеце ў абарону палітзняволенага Аляксандра Казуліна. Кастрычнік 2007 г.

- Стварэнне інстытутаў, задача якіх — клапаціцца аб тым, каб правы чалавека выконваліся ў грамадстве (напрыклад, інстытут упаўнаважанага па правах чалавека).
- Навучанне правам чалавека ўсіх работнікаў інстытутаў выканаўчай улады. Таксама важна, каб вучні вывучалі правы чалавека ў школах.
- Дзяржава сама павінна паважаць правы чалавека. Дзяржаўныя прадпрыемствы і інстытуты павінны дзейнічаць у адпаведнасці з прававымі стандартамі як ва ўласнай краіне, так і за мяжой. (15 хвілін)

2. Вядучы пытаецца далей: якія інстытуты грамадзянскай супольнасці могуць працаваць з правамі чалавека для павышэння павагі да іх? Як працуюць гэтыя інстытуты?
   - Сродкі масавай інфармацыі (стаяць на варце, задаюць тэмы для абмеркаванняў, надаюць праблемам галоснасць).
   - Недзяржаўныя, грамадскія арганізацыі (напрыклад, Чырвоны Крыж, Міжнародная Амністыя, хельсінкскія камітэты, аб'яднанні пенсіянераў).
   - Прадпрыемствы індустрыі і бізнэсу: паважаючы і выконваючы правы сваіх работнікаў.
   - Самі грамадзяне: паважаючы правы іншых людзей і рэагуючы на парушэнні правоў — сваіх і чужых; публікуючы свае меркаванні ў газетах, у Інтэрнэце, удзельнічаючы ў грамадскіх акцыях (дэманстрацыях і г.д.), у працы НДА. (20 хвілін)
3. Абмеркаванне:
   - Чаму дзяржаўныя ўлады важныя для захавання правоў чалавека і павагі да іх?
   - Ці можна сказаць, што розныя грамадскія інстытуты ўзаемадапаўняюць адзін аднаго? Чаму? (10 хвілін)

### Возьмем пад ўвагу:

Дзяржаўныя ўлады валодаюць палітычнай сілай. Складаючы і прымаючы законы, яны вырашаюць, якім будзе жыццё грамадзян у дзяржаве. Дзяржаўныя ўлады ратыфікуюць канвенцыі і абавязуюцца, такім чынам, выконваць іх. Іншыя грамадскія інстытуты: сродкі масавай інфармацыі, незалежныя грамадскія арганізацыі і бізнэс — таксама важныя. Яны адыгрываюць розныя ролі і маюць у сваім распараджэнні розныя магчымасці ўплыву на грамадства і дзяржаўную ўладу. Важна памятаць і тое, што кожны асобна ўзяты чалавек можа зрабіць вельмі многае.

### Варыяцыя:

Удзельнікі дзяляцца на групы і, выбраўшы сабе адзін які-небудзь грамадскі інстытут, разглядаюць падрабязней метады яго працы па абароне правоў чалавека. Гэта могуць быць упаўнаважаны па правах чалавека, праваабарончая арганізацыя, газета, прадпрыемства або які-небудзь чалавек/грамадскі дзеяч.

Можна таксама заняцца якой-небудзь адной прававой праблемай: напрыклад, правамі жанчын, рэалізацыяй прынцыпаў свецкай дзяржавы ў школе, абаронай грамадзян ад самаўпраўства супрацоўнікаў праваахоўных органаў. Удзельнікі дзяляцца на групы і разглядаюць дзяржаўныя і грамадскія інстытуты, якія працуюць у гэтай сферы:

- Што сказана ў законах? Ці прыняты новыя законы?
- Ці створаны інстытуты?
- Ці існуюць арганізацыі, якія працуюць над рэалізацыяй гэтых правоў?
- СМІ: ці пісалі яны пра гэта?

## РАЗГЛЯД СКАРГІ Ў КАМІТЭЦЕ ААН ПА ПРАВАХ ЧАЛАВЕКА

**Тэма:**

Камітэт ААН па правах чалавека.

**Мэта:**

Удзельнікі павінны атрымаць уяўленне аб тым, што такое Камітэт ААН па правах чалавека і якім чынам адбываецца прыняцце рашэнняў па індывідуальных зваротах (скаргах) дадзеным міжнародным органам. Удзельнікі будуць ведаць пра механізм падачы скаргі на парушэнне сваіх правоў у камітэт.

Клопат аб выкананні правоў чалавека не з'яўляецца толькі ўнутранай справай дзяржавы, а ўяўляе законны інтарэс міжнароднай супольнасці ў асобе ўпаўнаважаных органаў. Адзін з такіх аўтарытэтных органаў — Камітэт ААН па правах чалавека, створаны згодна з Міжнародным пактам аб грамадзянскіх і палітычных правах. Камітэт складаецца з 18 членаў, якія абіраюцца дзяржавамі, але з'яўляюцца незалежнымі ад іх. Камітэт не з'яўляецца судовым органам, але тым не менш яго-ныя працэдуры падобныя да судавытворчасці.

Працэдура падачы і разгляду індывідуальных зваротаў рэгулюецца Факультатыўным пратаколам да Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах. На сённяшні дзень бакамі пратакола з'яўляюцца больш за 90 дзяржаў, у іх лік з 10 студзеня 1992 года (дата ратыфікацыі пратакола) уваходзіць Беларусь. Канстытуцыя Беларусі таксама ўтрымлівае нормы, якія замацоўваюць права грамадзян звяртацца ў міжнародныя інстытуты па правах чалавека. Так, згодна з артыкулам 61 Канстытуцыі, «кожны мае права згодна з міжнародна-прававымі актамі, ратыфікаванымі Рэспублікай Беларусь, звяртацца ў міжнародныя арганізацыі з мэтай абароны сваіх правоў і свабод, калі вычарпаны ўсе наяўныя ўнутрыдзяржаўныя сродкі прававой абароны».

Са скаргай у камітэт могуць звярнуцца толькі індывідуальныя асобы, якія лічаць, што з'яўляюцца ахвярамі парушэння правоў чалавека, замацаваных у пакце. Для таго, каб скарга была прынята камітэтам да разгляду, павінны быць выкананы абавязковыя фармальныя патрабаванні да яе.

Уся працэдура разгляду скаргі камітэтам ажыццяўляецца ў пісьмовым выглядзе. Калі скарга прызнаецца камітэтам прымальнай, пра гэта інфарміруецца адпаведная дзяржава і заяўнік. На працягу 6 месяцаў дзяржава абавязана прадставіць тлумачэнні, інфармацыю, а таксама ўказаць, якія меры яна прыняла ці збіраецца прыняць на карысць заяўніка. Падчас тэрміна, прадстаўленага дзяржаве на тлумачэнні, яна можа ўзнавіць парушаныя правы чалавека, і тады камітэт прымае рашэнне аб спыненні справы.



Калі камітэт прыйдзе да высновы, што правы чалавека не былі парушаны, ён паведамляе пра гэта адпаведнай дзяржаве і заяўніку. У выпадку выяўлення парушэння правоў чалавека камітэт указвае на рашэнні (дзеянні), якія ён кваліфікуе як парушэнне, а таксама на адпаведныя палажэнні пакта. Канстатуючы парушэнне правоў чалавека, камітэт звяртаецца да дзяржавы з заклікам прыняць адпаведныя меры для ўзнаўлення парушаных правоў і кампенсавання нанесеных стратаў.

**Практычная рэалізацыя:**

Практыкаванне пачынаецца з дакладу вядучага, працягваецца працай у групах і прэзентацыямі, затым адбываецца агульнае абмеркаванне. Заканчваецца практыкаванне паведамленнем вядучага адносна высноваў, зробленых Камітэтам ААН па правах чалавека. У якасці падрыхтоўкі да практыкавання вядучы напярэдадні знаёміць удзельнікаў са зместам правоў, якія будуць разглядацца падчас практычных заняткаў, а таксама ўдзяляе ўвагу дапушчальным абмежаванням правоў, прадугледжаным у Міжнародным пакце аб грамадзянскіх і палітычных правах.

**Час:** 3 гадзіны.

**Што неабходна?** Прасторнае памяшканне з магчымасцю працы ў групах, копіі Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах, копіі Факультатыўнага пратакола кожнаму ўдзельніку, інструкцыя па працэдуры падачы скаргі ў Камітэт ААН па правах чалавека.

**Падрыхтоўка:** Даклад аб абавязках дзяржаў, якія ратыфікавалі Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах і Факультатыўны пратакол да яго, Камітэце ААН па правах чалавека; паведамленне пра працэдуру падачы скаргі і разгляду справаў у Камітэце ААН па правах чалавека; матэрыялы рэальных спраў, якія разглядаліся Камітэтам ААН па правах чалавека.

**Парадак выканання:**

1. Вядучы робіць даклад аб Міжнародным пакце аб грамадзяскіх і палітычных правах, абавязках дзяржаў у сувязі з ратыфікацыяй пакта і Факультатыўнага пратакола да яго, аб Камітэце ААН па правах чалавека і працэдуры падачы індывідуальнага звароту. (30 хвілін)
2. Удзельнікі дзяляцца на 3 групы (першая выконвае ролю дзяржавы, якая парушыла правы чалавека; другая — ролю ахвяры парушэння правоў чалавека; трэцяя — ролю Камітэта ААН па правах чалавека). Кожная група займае асобнае месца, і памяшканне ператвараецца




ў своеасаблівую залу паседжання камітэта. Пры гэтым вядучы падкрэслівае, што ў рэальнасці працэдура разгляду справы камітэтам ажыццяўляецца ў пісьмовым выглядзе, таму прапанаваная ролевая гульня носіць умоўны і навучальны характар.
Кожная група атрымлівае матэрыялы рэальнай справы, якая разглядалася Камітэтам ААН па правах чалавека. Напрыклад:

*10 снежня 2000 года, у Сусветны дзень правоў чалавека, у Брэсце каля Цэнтральнага ўніверсальнага магазіна актывіст праваабарончага руху У. Вялічкін раздаваў гараджанам тэкст Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека. Праз некаторы час ён быў затрыманы супрацоўнікамі міліцыі і прыцягнуты да адміністратыўнай адказнасці за правядзенне несанкцыянаванага пікета (аштрафаваны на 20 базавых адзінак). Перад гэтым У. Вялічкін атрымаў дазвол на правядзенне акцыі з колькасцю ўдзельнікаў да 10 чалавек на стадыёне «Будаўнік», тэрыторыя якога з'яўляецца па рашэнні Брэсцкага гарвыканкама адзіным месцам для правядзення падобных мерапрыемстваў, аднак адмовіўся ад гэтай магчымасці з-за таго, што мэта пікетавання не будзе дасягнута па прычыне аддаленасці стадыёна і адсутнасці там людзей. Па меркаванні У. Вялічкіна, ён не з'яўляўся арганізатарам незаконнага пікетавання, а толькі рэалізоўваў свае права на распаўсюд інфармацыі, прадугледжанае ў арт. 34 Канстытуцыі Беларусі і ч. 2 арт. 19 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах.*



Групам неабходна абмеркаваць сутнасць справы і выпрацаваць сваю пазіцыю ў залежнасці ад ролі, якую яна выконвае: ахвяра павінна дакладна сфармуляваць свае прэтэнзіі да дзяржавы, дзяржава — падрыхтаваць свае аргументы ў падтрымку раней прынятага рашэння на нацыянальным узроўні, камітэт — прыняць рашэнне, ці ў дадзенай сітуацыі было парушэнне правоў чалавека. (1 гадзіна)

3. Групы прадстаўляюць выпрацаваныя пазіцыі і аргументы. Старшынствуе ў «працэсе» прадстаўнік «камітэта», які дазваляе «бакам» задаваць пытанні і рабіць удакладненні. «Камітэт» таксама робіць неабходныя ўдакладненні для прыняцця ўласнага рашэння па справе. (20 хвілін)
4. «Камітэт» выпрацоўвае і абвяшчае канчатковае рашэнне па справе. (20 хвілін)
5. Агульнае абмеркаванне. Вядучы звяртае ўвагу «бакоў» на правільнасць ці памылковасць прыведзеных у спрэчцы аргументаў. Затым знаёміць групу з сапраўдным рашэннем Камітэта ААН па правах чалавека, прынятым па дадзенай справе. (30 хвілін)

*Камітэт па правах чалавека палічыў немэтазгодным ацэньваць дзеянні заяўніка адносна таго, ці з'яўляліся яны пікетаваннем ці не. Замест гэтага камітэт указаў, што дзяржава-ўдзельніца не спаслалася ні на адну з падстаў, дапушчальных для абмежавання свабоды меркаванняў, пералічаных у ч. 3 арт. 19 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах. Камітэт нагадаў, што артыкул 19 пакта дапускае абмежаванні, толькі калі яны адпавядаюць закону і неабходныя: а) для павагі правоў і рэпутацыі іншых і б) для аховы нацыянальнай бяспекі ці грамадскага парадку, аховы здароўя ці маральнасці насельніцтва. Камітэт палічыў, што дзеянні заяўніка — раздача тэкстаў Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека — незалежна ад таго, праходзілі яны ў кантэксце пікету ці не, без усялякіх сумневаў, не ўяўлялі пагрозы грамадскаму парадку і іншым пералічаным каштоўнасцям. Таму, па меркаванні Камітэта ААН па правах чалавека, у дадзеным выпадку Беларусь парушыла ч. 2 арт. 19 пакта ў дачыненні да праваабаронцы.*

6. Выкладчык распавядае пра абавязкі дзяржаў выконваць рашэнні камітэта. Ён адзначае, што дзяржава, якая адобрыла міжнародны кантроль, мае палітычны і маральны абавязак падпарадкавацца рашэнню камітэта, што звычайна і адбываецца на практыцы. Камітэт прызначае па кожнай справе тэрмін, як правіла, 180 дзён, на працягу якіх дзяржава павінна прадставіць інфармацыю пра меры, прынятыя для выканання рэкамендацый.



Ролевая гульня. «Камітэт па правах чалавека» ацэньвае, ці парушыла дзяржава правы.

Абмяркоўваюцца наступныя «хворыя» пытанні: ці з'яўляюцца рашэнні камітэта юрыдычна абавязковымі для дзяржавы? Ці ёсць слабасці ў працы Камітэта ААН па правах чалавека? Якія вы яшчэ ведаеце міжнародныя інстанцыі, куды чалавек можа звярнуцца са скаргай на парушэнне сваіх правоў дзяржавай? (20 хвілін)

**Возьмем пад ўвагу:**

У адпаведнасці з палажэннямі Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах заснаваны Камітэт па правах чалавека. У пакце першапачаткова былі ўстаноўлены дзве працэдуры міжнароднага кантролю: а) дзяржава абавязана сістэматычна прадстаўляць Камітэту даклады аб ажыццяўленні палажэнняў пакта; б) дзяржава можа накіраваць у камітэт паведамленне аб парушэнні іншай дзяржавай правоў чалавека (пакуль ніводная дзяржава не скарысталася такой магчымасцю). Камітэт упаўнаважаны таксама прымаць і разглядаць індывідуальныя звароты (скаргі), і дадзеная працэдура рэгулюецца Факультатыўным пратаколам да Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах. Сесіі (паседжанні) Камітэта па правах чалавека праходзяць тры разы на год. Улічваючы вялікую колькасць скаргаў, якія разглядаюцца камітэтам, іх разгляд звычайна доўжыцца ад 1 да 4 гадоў. Камітэт па правах чалавека знаходзіцца ў Жэневе.



## АДЗІН НА АДЗІН З ДЗЯРЖАВАЙ

**Тэма:**

Еўрапейскі суд па правах чалавека ў Страсбургу.

**Мэта:**

Удзельнікі павінны атрымаць уяўленне аб тым, што такое Еўрапейскі суд па правах чалавека, і зразумець, што любы грамадзянін краіны — ўдзельніцы Савета Еўропы можа падаць у суд на сваю дзяржаву і патрабаваць абароны сваіх правоў.

Еўрапейскія краіны прымалі актыўны ўдзел у працы над Усеагульнай дэкларацыяй правоў чалавека. Праца над юрыдычна абавязковымі дакументамі заняла яшчэ больш часу, як аказалася. Заходнееўрапейскія краіны, якія супрацоўнічалі праз Савет Еўропы, не хацелі чакаць і пачалі, такім чынам, працу над сваёй «уласнай» канвенцыяй аб правах чалавека. Еўрапейская канвенцыя аб абароне правоў чалавека і асноўных свабод была прынята 4 лістапада 1950 года. Усе краіны Еўропы — члены Савета Еўропы, абавязаны ратыфікаваць канвенцыю. Пасля ратыфікацыі нацыянальныя законы павінны быць прыведзены ў адпаведнасць з палажэннямі дадзенай канвенцыі.

Для таго, каб пераканацца, што краіны выконваюць палажэнні канвенцыі, Саветам Еўропы быў створаны Еўрапейскі суд па правах чалавека. Калі хтосьці лічыць, што яго/яе правы былі парушаны, а магчымасці судовай сістэмы ў сваёй уласнай краіне вычарпаны, ён/яна могуць ініцыяваць справу супраць сваёй дзяржавы ў Еўрапейскім судзе па правах чалавека. У выпадку пройгрышу справы дзяржавай яна абавязана, выплаціўшы істцу грашовую кампенсацыю, перагледзець свае законы і прывесці іх у адпаведнасць з рашэннем суда.

У газеце «Афтэнпостэн» 10 лістапада 2006 года была апублікавана нататка: «Раніцай, яшчэ да ўзыходу сонца, Саід-Хусейн Імакаеў (23) ехаў на «Ладзе» белага колеру дадому, у вёску Новыя Атагі ў Чачні, 17 снежня 2000 года. Па дарозе ён быў спынены на кантрольным пункце расійскімі салдатамі, узброенымі аўтаматамі Калашнікава. Паводле паказанняў сведак, малады чалавек быў выцягнуты з машыны і кінуты ў ваенную машыну, якая хутка паімчала з месца. З тых часоў яго ніхто не бачыў. Учора Расіяй была праіграна справа ў Судзе па правах чалавека ў Страсбургу, і сям'і зніклага было прысуджана 100 000 еўра ў якасці кампенсацыі. Акрамя ўсяго іншага, Расія была прызнана вінаватай у парушэнні права на жыццё і ў нездавальняючым расследаванні дадзенага злачынства.

### Практычная рэалізацыя:

Практыкаванне пачынаецца з даклада вядучага, працягваецца працай у групах і заканчваецца прэзентацыямі і агульным абмеркаваннем. У выпадку, калі вядучы вырашыць глыбей раскрыць тэму, даклад можна зрабіць на некалькі дзён раней. У груп, такім чынам, будзе больш часу, каб сабраць інфармацыю і падрыхтавацца да працы.

**Час:** 90 хвілін.
**Што неабходна?** Прасторнае памяшканне з магчымасцю працы ў групах, копіі Еўрапейскай канвенцыі аб абароне правоў чалавека і асноўных свабод кожнаму ўдзельніку.
**Падрыхтоўка:** Даклад аб Еўрапейскай канвенцыі і Еўрапейскім судзе па правах чалавека; падборка кароткіх пераказаў спраў, якія слухаліся ў Еўрапейскім судзе.

### Парадак выканання:

1. Вядучы робіць даклад аб Еўрапейскай канвенцыі і Еўрапейскім судзе па правах чалавека ў Страсбургу. (15 хвілін)
2. Удзельнікі дзяляцца на групы, і кожная з іх атрымлівае прыклад справы, якая слухалася ў Еўрапейскім судзе па правах чалавека. Пажадана, каб гэта былі справы з розных краін, прысвечаныя розным аспектам якога-небудзь аднаго права, пра якое ўжо ішла размова на папярэдніх занятках. У дадатак да інфармацыі вядучага ўдзельнікамі ў Інтэрнэце могуць быць знойдзены дадатковыя звесткі. Групам неабходна адказаць на наступныя пытанні: хто з'яўляецца бакамі ў справе? Пра што дадзеная справа? У чым абвінавачваецца дзяржава? У парушэнні якога артыкула(аў) Еўрапейскай канвенцыі аб абароне правоў чалавека і асноўных свабод абвінавачваецца дзяржава? Якое рашэнне суда? Якія наступствы рашэння суда для пацярпелага/істца? Якія наступствы рашэння суда для дзяржавы? (55 хвілін, у тым ліку час на размінку)
3. Групы прадстаўляюць вынікі сваёй працы для астатніх удзельнікаў. (15 хвілін)
4. Вучні самастойна абагульняюць усю атрыманую інфармацыю ў выглядзе табліцы, схемы. Напрыклад, якія аспекты дадзенага права можна вылучыць на падставе аналізу спраў; у якіх выпадках Еўрапейскі суд выносіць рашэнні на карысць істца; якія аргументы могуць прыводзіць бакі ў Еўрапейскім судзе? (10 хвілін)
5. Абмеркаванне: (10 хвілін)
   - Чаму Еўрапейская канвенцыя аб абароне правоў чалавека і асноўных свабод важная для нас?
   - Якія адносіны Еўрапейская канвенцыя аб абароне правоў чалавека і асноўных свабод мае да Еўрапейскага суда па правах чалавека?
   - Ці з'яўляюцца рашэнні суда абавязковымі для дзяржавы? Што гэта азначае?
   - Ці ёсць слабасці ў працы Еўрапейскага суда па правах чалавека?
   - Якія мы можам зрабіць высновы з разабраных прыкладаў?
   - Ці існуюць іншыя міжнародныя судовыя інстанцыі? Што вы ведаеце пра іх?

### Возьмем пад ўвагу:

Еўрапейская канвенцыя аб абароне правоў чалавека і асноўных свабод уяўляе сабой бачанне адносна асноўных правоў і свабод. Канвенцыя — юрыдычна абавязковы дакумент для краін — удзельніц Савета Еўропы. З тым, каб надаць выкананню палажэнняў Канвенцыі большую значнасць, быў створаны Еўрапейскі суд па правах чалавека. Усе людзі, якія знаходзяцца на тэрыторыі краіны — ўдзельніцы Савета Еўропы, маюць магчымасць «пажаліцца» на сваю дзяржаву ў судзе. Такая ж магчымасць ёсць у груп людзей і арганізацый. Адзінай умовай прыняцця справы на разгляд у суд з'яўляецца той факт, што справа была разгледжана вышэйшым судовым органам краіны і па ёй было вынесена тое ці іншае рашэнне. У Нарвегіі гэта азначае, што чалавек павінен быў прайграць сваю справу ў Вышэйшым судзе Нарвегіі, перш чым яна можа быць даслана на разгляд у Еўрапейскі суд па правах чалавека.

Рашэнні Еўрапейскага суда па правах чалавека абавязковыя для дзяржаў. Правы, запісаныя ў Еўрапейскай канвенцыі аб абароне правоў чалавека і асноўных свабод, — аднолькавыя як для спадара Тарык з Турцыі, Мішэль з Францыі, Дадо з Босніі-Герцагавіны, так і для Але, Мухамеда і Кары з Нарвегіі.

## ДАВАЙЦЕ ПРААНАЛІЗУЕМ СІТУАЦЫЮ З ПРАВАМІ ЧАЛАВЕКА

**Тэма:**

Правы чалавека.

**Мэта:**

Удзельнікі павінны ацаніць сітуацыю з правамі ў сваёй уласнай краіне, засноўваючыся на артыкулах Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека.

Хаця большасць людзей у Нарвегіі жывуць даволі добра, сітуацыя ўсё ж не зусім ідэальная, калі мы лепей прыглядзімся. Па вуліцах Осла ходзяць шмат жабракоў, і занадта часта мы можам бачыць наркаманаў у брудным адзенні, з няўпэўненай паходкай і ранамі на руках і нагах. Мы рэгулярна чытаем у газетах пра старых у дамах састарэлых, якія не атрымліваюць тую дапамогу, якая ім патрэбна. Правы многіх уцекачоў не выконваюцца, і ААН крытыкуе Нарвегію за фізічныя катаванні, таму што падазраваныя ў злачынствах занадта доўга знаходзяцца ў папярэднім зняволенні. І ці ёсць на самой справе свабода рэлігіі ў Нарвегіі, калі ў нашай краіне ёсць дзяржаўная царква? Давайце прааналізуем сітуацыю з правамі чалавека ў вашай краіне!

**Практычная рэалізацыя:**

Практыкаванне пачынаецца з працы ў групах, яе вынікі прадстаўляюцца на агульным сходзе. Практыкаванне добра падыходзіць для ўдзельнікаў з розных краін. У дадзеным апісанні мы выкарысталі ў якасці матэрыялу Усеагульную дэкларацыю, але можна таксама выкарыстаць Еўрапейскую канвенцыю аб правах чалавека ці іншы міжнародны дакумент.

**Час:** 45 хвілін—1,5 гадзіны.

**Што неабходна?** Вялікае памяшканне, у якім можна працаваць у групах, ручкі і папера, вялікія лісты і самаклейныя лісточкі.

**Што трэба ведаць?** Удзельнікі ўжо павінны ведаць аб правах чалавека і аб тым, якія органы і ўстановы ў іх краіне забяспечваюць абарону правоў чалавека.

**Падрыхтоўка:** Вялікія лісты з калонкай злева для адзнак ад аднаго да пяці. Унізе ліста пералічаны ў выглядзе спісу чатыры-пяць розных артыкулаў Усеагульнай дэкларацыі. Для аналізу падыходзяць многія артыкулы, напрыклад 5, 12, 14, 16, 17, 18, 19, 20, 24 і 26 (гл. ілюстрацыю).



**Парадак выканання:**

1. Практыкаванне можна правесці па-рознаму, у залежнасці ад складу групы. Удзельнікаў можна падзяліць на дзве-тры групы, якія сканцэнтруюць сваю ўвагу на розных артыкулах Усеагульнай дэкларацыі. Напрыклад, адна група прааналізуе сітуацыю з артыкуламі 5, 12, 14, 16, другая — з артыкуламі 17, 18, 19, 20 і трэцяя — з артыкуламі 22, 24 , 25 і 26. Калі ўдзельнікі — прадстаўнікі розных краін, то іх варта падзяліць па прыналежнасці да той ці іншай краіны і прапанаваць папрацаваць з аднолькавымі артыкуламі. На падставе шкалы адзнак ад 1 да 5, дзе 5 — гэта вышэйшы бал, групы павінны ацаніць сітуацыю ў краіне адносна розных правоў чалавека. NB: яны павінны ўлічваць не толькі тое, ці замацаваны правы ў законах, але і тое, якой з'яўляецца сапраўдная сітуацыя. Адзнакі выстаўляюцца па наступных крытэрыях:
   - Адзнака 5: усе члены грамадства карыстаюцца дадзеным правам.
   - Адзнака 4: большасць членаў грамадства карыстаюцца дадзеным правам.



Затрыманая за святкаванне Дня волі моладзевая актывістка ў міліцэйскім аўтобусе. Мінск, сакавік 2002 г.

- Адзнака 3: прыкладна палова грамадства карыстаецца дадзеным правам.
- Адзнака 2: толькі нязначная колькасць людзей карыстаецца дадзеным правам.
- Адзнака 1: толькі тыя, хто мае ўладу, карыстаюцца дадзеным правам і ніхто іншы.

  Удзельнікі пры дапамозе самаклейных лісточкаў адзначаюць, якую адзнаку яны паставілі. (30 хвілін)

2. Групы прадстаўляюць свой аналіз на агульным сходзе. Важна, каб у іх было дастаткова часу для абгрунтавання выстаўленых адзнак. Пасля тлумачэння кожнай адзнакі адводзіцца час для пытанняў і каментарыеў астатніх удзельнікаў. Вядучы можа дапаўняць. Калі паўстануць важныя контраргументы да выстаўленых адзнак, і група сама зменіць сваё меркаванне, адзнаку варта адкарэктаваць. (У групах з удзельнікамі з розных краін важна падкрэсліць, што мэта практыкавання — не ў тым, каб «зарабіць» як мага больш высокую адзнаку, а асвятліць сітуацыю з асобнымі правамі чалавека максімальна аб’ектыўна. Практыкаванне не павінна ператварацца ў спаборніцтва паміж краінамі.)

### Возьмем пад ўвагу:

Мы ўбачылі, што правы чалавека з’яўляюцца канкрэтным інструментам, які мы можам выкарыстаць для вымярэння якасці нашага ўласнага грамадства і іншых грамадстваў. Як розныя правы рэалізуюцца для насельніцтва? Што працуе добра і ў чым заключаюцца важнейшыя праблемы?



## РЭБУС АБ СВАБОДЗЕ СЛОВА

### Тэма:

Свабода слова.

### Мэта:

Удзельнікі павінны зразумець сутнасць свабоды слова: што грунтуецца яна на стасунках, дыялогу, аргументацыі і дэбатах. Свабода слова важная для жыцця чалавека і з’яўляецца неабходнай умовай для развіцця дэмакратыі.

Ці думалі вы калі-небудзь над тым, як вы атрымліваеце веды? І якім чынам вы перадаяце свае веды іншым? Слухаючы іншых, мы вучымся. Калі мы кажам, слухаюць і вучацца іншыя. Гэта і ёсць аснова свабоды слова і выказвання: мець магчымасць удзельнічаць у адкрытым дыялогу. У дадатак да таго, што ў людзей ёсць прыроджаная запатрабаванасць стасункаў з іншымі людзьмі, у людзей павінна быць магчымасць атрымліваць аб’ектыўную інфармацыю аб навакольным іх свеце. У тых выпадках, калі ў навукоўцаў ёсць магчымасць аспрэчыць тэорыі адзін аднаго і прадставіць свае доказы, можна казаць аб развіцці навукі. Толькі ў тым выпадку, калі хто-небудзь кажа пра памылку, з’яўляецца магчымасць яе выправіць. Пры дапамозе распаўсюду інфармацыі і крытычных разваг была зроблена выснова аб тым, што Сусвету — 13 мільярдаў гадоў і што жыццё ў ім развівалася эвалюцыйным шляхам. Ніхто яшчэ не знайшоў лепшых аргументаў, каб даказаць адваротнае.

Развіццё нашых ведаў і наша развіццё як такое спынілася б без свабоды слова і выказвання. Калі мы добра падумаем, то зразумеем, што сённяшнія мабільныя тэлефоны, камп'ютары, Інтэрнэт, вакцыны, аўтамабілі, шматпавярховыя будынкі і многія іншыя «фантастычныя» рэчы — у пэўным сэнсе вынікі свабоды слова. Свабода слова і выказвання — неабходная ўмова як для развіцця навукі і думкі, так і для развіцця грамадства ў цэлым.

### Практычная рэалізацыя:

Гэта вясёлае практыкаванне, дзе групам трэба скласці, разгадаць рэбусы і скласці атрыманыя словы ў адзін сказ.

**Час:** 45 хвілін.
**Што неабходна?** Памяшканне, падрыхтаванае для працы ў групах, папера і ручкі.
**Падрыхтоўка:** Кіраўнік павінен загадзя сфармуляваць які-небудзь сказ аб свабодзе слова.

### Парадак выканання:

1. Вядучы дзеліць удзельнікаў на групы, якія атрымліваюць заданне стварыць рэбус, які стане словам, якое вядучы загадаў(ла). Загаданых слоў павінна быць столькі ж, колькі і груп; і групы не павінны ведаць словы адзін аднаго. Прыкладам сказа, у які могуць быць складзены загаданыя словы, можа быць: «Людзям неабходна свабода слова, каб пабудаваць дэмакратычнае грамадства». (5 хвілін)
2. Склаўшы рэбус свайго слова, група абменьваецца разгаданымі словамі з іншымі групамі і спрабуе скласці з іх сказ. (10 хвілін)
3. Абмеркаванне: (30 хвілін)
   - Як вырашылі ў групе, якім чынам будзе складацца рэбус? (Ці многія былі актыўнымі ў групе? Ці адпрэчваліся некаторыя ідэі/прапановы? Чаму?)
   - Якім чынам удалося разгадаць рэбус іншай групы? (Ці ўсе былі актыўнымі ў разгадванні? Як працавалася: у згодзе ці ў вострых спрэчках? Ці адпрэчваліся ідэі? Чаму?)
   - Якім чынам вы «знайшлі» сказ? (З дапамогай дыялогу і абмеркавання? Ці былі варыянты іншых прапаноў? Чаму іх адпрэчылі?)
   - Ці выкарыстоўваем мы дыялог і абмеркаванне для таго, каб вырашыць праблемы нашага паўсядзённага жыцця? Прыклады.
   - Ці большая верагоднасць таго, што будзе знойдзена аптымальнае рашэнне, калі больш людзей удзельнічаюць у абмеркаванні і прапаноўваюць свае ідэі? Чаму? Прывядзіце прыклады (таксама прыклады зменаў у грамадстве, тэхналогіі, сямейных адносінах).
   - Чаму важна, каб усе выказалі сваё меркаванне? Чаму важная свабода слова і выказвання меркаванняў?
   - Якія наступствы адсутнасці свабоды слова і выказвання меркаванняў?

### Возьмем пад ўвагу:

Нават такое простае практыкаванне — вынік сумесных стасункаў, дыялогу і дыскусій. Канчатковы правільны сказ — гэта вынік розных меркаванняў, ідэй і аргументаў. Чым больш галасоў, тым больш творчай працы і выбару. Таму важна, каб у кожнага была магчымасць выказацца і быць выслуханым. Толькі ў такім разе можна ўзважыць розныя альтэрнатывы, адкінуць няўдалыя, і выбраць правільныя. Свабода слова і выказвання, такім чынам, з'яўляецца таксама неабходнай умовай для развіцця асобы чалавека і яго/яе ўпэўненасці ў сабе.



## ШТО ТАКОЕ СВАБОДА СЛОВА?

«Сказаць часам бывае нялёгка, але захоўваць маўчанне — небяспечна»[26]

### Тэма:

Свабода слова.

### Мэта:

Удзельнікі павінны зразумець асноўныя аспекты свабоды слова.

Свабода слова з'яўляецца адным з важнейшых правоў чалавека. Толькі праз адкрытае абмеркаванне з аргументамі і контраргументамі мы можам вырашыць праблемы і знайсці лепшыя спосабы арганізацыі жыцця грамадства. Хоць сацыяльныя і палітычныя «ісціны» — гэта «ісціны» іншага роду, у арозненне ад навуковых, лепшыя рашэнні можна знайсці ўсё ж толькі шляхам выкарыстання разумнага сэнсу, вядзення дыялогу і абмеркаванняў. Паколькі ў кожнага чалавека ёсць годнасць, усе павінны валодаць свабодай і правам выказваць уласныя меркаванні. Аднак свабода слова грунтуецца не толькі на індывідуальным праве выказваць свае думкі, але таксама і на ўяўленні аб тым, што мы павінны мець свабоду і магчымасць выказваць сваё меркаванне і распаўсюджваць інфармацыю праз газеты, тэлебачанне, радыё, Інтэрнэт, «жывыя часопісы» ці іншыя каналы інфармацыі. Яшчэ адзін важны момант — гэта наша права запытваць і атрымліваць інфармацыю ад афіцыйных улад.

### Практычная рэалізацыя:

Практыкаванне пачынаецца з самастойнай працы ўдзельнікаў, а затым яны прыступаюць да працы ў групах. Практыкаванне завяршаецца агульнай дыскусіяй.

**Час:** 1,5 гадзіны.
**Што неабходна?** Вялікія лісты і фламастэры.

### Парадак выканання:

1. Вядучы просіць удзельнікаў падумаць адну хвіліну пра тое, што яны будуць адчуваць, калі ім нельга будзе казаць тое, што яны думаюць аб рэчах, якія вельмі важныя для іх? Пасля гэтага ён просіць усіх распавесці пра гэтыя пачуцці. Што адбудзецца, калі я скажу вам: «Забараняю вам думаць пра маленькую белую мыш»? Чаму?
2. Вядучы тлумачыць, што свабода слова з'яўляецца важным правам чалавека і зачытвае артыкул 19 Усеагульнай дэкларацыі: кожны чалавек мае права на свабоду перакананняў і на свабоднае выказванне

іх; гэта права ўключае свабоду бесперашкодна прытрымлівацца сваіх перакананняў і свабоду шукаць, атрымліваць і распаўсюджваць інфармацыю і ідэі любымі сродкамі, незалежна ад дзяржаўных межаў. Важнейшымі элементамі свабоды слова з'яўляюцца (іх варта запісаць на вялікім лісце, які будзе бачны і падчас працы ў групах):

- Свабода выказваць сваё меркаванне (свабода самавыяўлення).
- Свабода шукаць, атрымліваць і распаўсюджваць інфармацыю і ідэі (свабода слова, свабода інфармацыі)
  - вусна, пісьмова ці ў мастацкай форме;
  - у любым сродку масавай інфармацыі (свабода друку);
  - незалежна ад межаў (свабода міжнароднай камунікацыі).

3. Вядучы дзеліць удзельнікаў на чатыры групы (у залежнасці ад колькасці ўдзельнікаў).
   Першая і трэцяя група займаецца праблемай свабоды слова ў грамадстве, а другая і чацвёртая — свабодай слова ў школе. Групы запісваюць адказы на вялікіх лістах паперы.
   - Па якіх прыкметах можна бачыць, што ў грамадстве (у школе) ёсць свабода слова (наяўнасць ці адсутнасць розных незалежных (гэта значыць недзяржаўных) газет, тэле- і радыёканалаў, тэатраў, кінастудый, патрабаванняў да знешняга выгляду і адзення і гэтак далей)? (Можна параўнаць сітуацыю дэмакратычнага грамадства з дыктатурай.)
   - Што разумеецца пад паняццем «адкрытае грамадства»? Ці звязана гэтае паняцце з правам атрымліваць інфармацыю (свабода інфармацыі)? Якія механізмы забяспечваюць наша права шукаць і атрымліваць інфармацыю? (У школе гэта могуць быць класныя сходы, вучнёўскі савет, школьная газета, агульныя дэбаты і інш.) У грамадстве ў цэлым гэта могуць быць журналісты, якія працуюць у розных СМІ, адкрытасць кіравання, парламента і інш.
   - Чаму важная магчымасць пошуку і атрымання інфармацыі?
   - Знайдзіце прыклады як сучасныя, так і гістарычныя, якія ілюструюць адсутнасць/частковую адсутнасць свабоды слова. Як можна бачыць, што свабода слова ў грамадстве абмежаваная?
     (30 хвілін)
4. Групы прадстаўляюць вынікі сваёй працы аўдыторыі.

### Абмеркаванне:

- Ці можнаназіраць, што розныя меркаванні выказваюцца ў грамадстве/школе?
- Чаму права шукаць і атрымліваць інфармацыю з'яўляецца важнай часткай свабоды слова?
- Часта кажуць, што грамадства з'яўляецца «адкрытым» ці «закрытым». Што маецца на ўвазе? Не маглі б вы прывесці прыклады?
- Часта мы бачым, як у недэмакратычных краінах, дзе ўсё вырашаюць некалькі чалавек, якія ўтрымліваюць уладу, свабода слова абмяжоўваецца. Чаму яна абмяжоўваецца? Чаму дыктатары баяцца свабоды слова?

### Возьмем пад ўвагу:

Свабода слова — гэта важнае права чалавека. Каб адчуваць сябе свабодным, неабходна мець магчымасць выяўляць сябе і выказваць сваё меркаванне. Свабода слова абараняе права на выказванне, а таксама змест таго, што выказваецца. Для таго, каб у грамадстве ўсталявалася рэальная свабода слова, дзяржава павінна забяспечыць усім людзям і аб'яднанням людзей магчымасць выказвацца. Свабода слова звязана з усімі сродкамі камунікацыі. Мы можам выяўляць сябе праз тэатр, фільмы, музыку, адзенне, нават праз прычоску, якую мы носім. Таксама важна мець права распаўсюджваць і атрымліваць інфармацыю. У дзяржавах, дзе грамадзяне пазбаўлены свабоды слова, дзе забаронена крытыка, сітуацыя з іншымі правамі чалавека таксама знаходзіцца ў дрэнным стане. Людзі часта не ведаюць, што адбываецца навокал, і таму не маюць магчымасці неяк змяніць сітуацыю. Ступень свабоды слова паказвае, такім чынам, сітуацыю з правамі чалавека ў грамадстве ў цэлым. Таму кажуць, што дэмакратычныя грамадствы — гэта адкрытыя грамадствы, а недэмакратычныя — закрытыя. Свабода слова — гэта неабходная ўмова існавання дэмакратычнага грамадства.

### Варыяцыя:

Знайдзіце гістарычныя і сучасныя прыклады рэжымаў, якія забаранялі кнігі і ўшчамлялі свабоду слова. Якія кнігі забараняліся? Чаму яны забараняліся? У якіх краінах небяспечна быць журналістам? Чаму?

Ва ўсіх ёсць права шукаць і атрымліваць інфармацыю. Аднак не заўсёды магчыма патрабаваць доступу да інфармацыі. Калі інфармацыя можа выклікаць пагрозу нацыянальнай бяспекі ці бяспекі грамадства, або стаць прычынай беспарадкаў і злачынстваў, пагражаць здароўю і маралі, або замахвацца на добрае імя і рэпутацыю асобна ўзятых людзей, прадастаўленне інфармацыі можа быць забаронена.

---

26. Прыказка. Крыніца: Cun Ca Ki Ca, Kalilu Tera, Abidjan: Edition Edilis 2002.

## «КАЛІ ТРОЛЬ ВЫЙДЗЕ НА СОНЦА, ТО ЁН ЛОПНЕ АД СВЯТЛА»

*(з нарвежскіх казак)*

### Тэма:

Свабода слова.

### Мэта:

Удзельнікі павінны адчуць ролю свабоды слова для дэмакратыі і павагі правоў чалавека.

Троль — асноўны герой нарвежскіх казак. Гэта самае вялікае і выродлівае стварэнне, якое калі-небудзь бачыў чалавек, да таго ж злоснае, як д'ябал і пажырае людзей. Троль небяспечны і хаваецца ў цёмным лесе, і дрэнна таму, хто яго сустрэне! Троль не баіцца нічога, акрамя сонца! Калі апынецца на сонцы, то адразу ж разляціцца на кавалачкі! Казкі пра троля вельмі добра ілюструюць важную функцыю свабоды слова і яе ролю ў жыцці грамадства. Толькі тады, калі небяспечныя і зласлівыя меркаванні будуць «выцягнуты на святло», аддадзены галоснасці, стане магчымым іх ацэньваць, аргументаваць супраць і нейтралізаваць іх. Асабліва важная роля журналістаў, паколькі ў іх задача «сонца», якое асвятляе тое, што адмоўна і небяспечна; тое, што павінна быць аддадзена крытыцы і абмеркаванню. Роля журналістаў — выносіць пытанні на парадак дня і ўплываць на грамадскую думку. Тое ж самае могуць рабіць і асобныя людзі, пасылаючы свае артыкулы і нататкі ў газеты і іншыя сродкі масавай інфармацыі.

### Практычная рэалізацыя:

Гэтае практыкаванне заснавана на працы ў групах і заключным агульным абмеркаванні. Практыкаванне добра падыходзіць для больш працяглай і глыбокай працы над тэмай.

**Час:** 1,5 гадзіны.
**Што неабходна?** Папера і ручкі, вялікія адрыўныя лісты, маркеры, нажніцы і клей, друкаваныя выданні (газеты і часопісы), Інтэрнэт.

### Парадак выканання:

1. Кіраўнік дзеліць вучняў на групы і дае заданне прааналізаваць падрыхтаваныя выкладчыкам пакеты матэрыялаў (газетныя артыкулы, расшыфроўкі запісаў радыё- і тэлеперадач, дыскусіі на інтэрнэт-форумах), прысвечаныя якой-небудзь вострай тэме (неабавязкова звязанай з правамі чалавека). Задача груп — знайсці прычыны ўзнікнення дыскусіі, аргументы за і супраць. Хто і як пачаў дыскусію або абмеркаванне той ці іншай тэмы: журналісты ці іншыя групы насельніцтва? Ці выказваўся хто-небудзь па дадзеным пытанні? Ці спрыяла дадзеная дыскусія таму, што новая інфармацыя стала даступнай грамадству? (30 хвілін)
2. Вынікі працы ў групах прадстаўляюцца аўдыторыі. (5 хвілін)
3. Абмеркаванне (10 хвілін)
   - Чаму свабода слова важная для грамадства?
   - Ці даведаліся вы што-небудзь новае для сябе, працуючы над заданнем?
   - Чаму ўдзельнікам дыскусій і дэбатаў важна выказаць сваё меркаванне публічна?
   - Ці ведаеце вы іншыя прыклады дыскусій, якія прывялі да змен у грамадстве?
   - Часта на журналістаў спрабуюць аказаць ціск, пераследуюць і забіваюць. У чым прычына гэтага, па вашым меркаванні?

### Возьмем пад ўвагу:

Свабода слова — адно з самых важных правоў чалавека. Толькі тады, калі ў людзей ёсць права казаць тое, што яны думаюць, шукаць і запытваць інфармацыю, магчыма крытыка на адрас урада і ўплыў на жыццё грамадства і краіны. Многія журналісты робяць важную працу, звяртаючы ўвагу на праблемы ў грамадстве. Многім з іх пагражае небяспека. Кожны год шмат журналістаў пазбаўляюцца жыцця толькі таму, што яны выконваюць сваю працу.

## ФАКТЫ:

*81 журналіст і 5 асістэнтаў журналістаў былі забіты ў 2006 годзе. Больш за 1 400 журналістаў падвергнуліся нападам і пагрозам.*

*У Беларусі да гэтага часу невядомы лёс тэлеаператара Дзмітрыя Завадскага, гвалтоўна выкрадзенага ў 2000 годзе; не выяўлены забойцы журналістаў Веранікі Чаркасавай (забітая ў 2004 годзе) і Васіля Гроднікава (2005 год). За сваю прафесійную дзейнасць журналісты падвяргаюцца крымінальнаму пераследу і кідаюцца за краты. Кожны год дзесяткі журналістаў падвяргаюцца арыштам, затрыманням, збіццю падчас выканання сваіх абавязкаў. Беларусь займае адно з апошніх месцаў у свеце па становішчы са свабодай слова і друку. Так, у сусветным рэйтынгу свабоды друку за 2008 год, вызначаным «Рэпарцёрамі без межаў», са 173 краін Беларусь займала 154-ю пазіцыю; згодна з рэйтынгам «Freedom House» аб свабодзе друку, Беларусь займала 188-е месца са 195 магчымых.*

7 ліпеня 2000 года бясследна знік журналіст Дзмітрый Завадскі. Да гэтага часу лёс яго невядомы.






У кастрычніку 2004 года загінула ад шматлікіх нажавых раненняў журналістка Вераніка Чаркасава. Забойцы да гэтага часу не знойдзены.



**Варыяцыя 1:**

Напішыце нататку аб выкананні свабоды слова ў школе і пашліце яе ў мясцовую газету.

**Варыяцыя 2:**

Знайдзіце гісторыю палітыка або журналіста, які сказаў ці напісаў тое, што не спадабалася ўраду, і якога(ую) пераследвалі па гэтай падставе, пасадзілі ў турму або пазбавілі жыцця. Такую інфармацыю можна знайсці на інтэрнэт-сайтах Міжнароднай Амністыі, ПЕН-клубаў.

**Варыяцыя 3:**

Высветліце: што такое цэнзура? Ці чулі вы калі-небудзь, каб нешта або хтосьці падвяргаўся цэнзуры?



Фотакарэспандэнт Андрэй Лянкевіч падчас выканання прафесійных абявязкаў.

## ЦІ ПАВІННА БЫЦЬ ДАЗВОЛЕНА КАЗАЦЬ АБСАЛЮТНА ЎСЁ?

**Тэма:**

Межы свабоды слова.

**Мэта:**

Удзельнікі павінны зразумець, што ёсць шмат дылем і спрэчных момантаў, звязаных са свабодай слова.

Публікацыя карыкатур на прарока Мухамеда ўвесну 2006 года прывяла да гарачых дыскусій аб межах свабоды слова і адказнасці за выказванні ў прэсе. Хтосьці лічыць, што войны пачынаюцца са слоў, не важна словы гэтыя з вуснаў СМІ, палітыкаў ці навукоўцаў, і таму свабода слова павінна быць абмежаваная. Іншыя лічаць, што абмежаванне свабоды слова можа прывесці да несправядлівасці ў грамадстве і што абмежаванне — не вырашэнне праблемы. Свабода слова — адно з самых важных правоў, якія гарантуюць існаванне адкрытага і дэмакратычнага грамадства, якое засноўваецца на правах чалавека. Аднак ці павінны быць дазволены абсалютна любыя выказванні? Ці магчыма свабода слова без межаў? Ці гэта прывядзе да негатыўных наступстваў?

### Практычная рэалізацыя:

Выкананне дадзенага практыкавання прадугледжвае спачатку працу ў групах, затым агульную дыскусію.

**Час:** 45 хвілін.

**Што неабходна?** Папера і ручка.

### Парадак правядзення:

1. Кіраўніку неабходна пераканацца ў тым, што ўдзельнікі разумеюць, што такое свабода слова. Адна (або некалькі) група спрабуе знайсці пазітыўныя бакі 100 % свабоды слова ў грамадстве і аргументы супраць абмежавання свабоды слова. Іншая (ыя) група(ы) спрабуе знайсці негатыўныя бакі 100 % свабоды слова ў грамадстве і аргументы на карысць абмежавання свабоды слова. (10 хвілін)
2. Групы прадстаўляюць сваю працу аўдыторыі. Важна памятаць, што кіраўніку не трэба каментаваць на дадзеным этапе! Групы павінны выслухаць адзін аднаго.
3. Падводзячы вынікі і робячы высновы, важна, каб вядучы «вызваліў» удзельнікаў ад прыналежнасці да групы, каб яны не адчувалі сябе прывязанымі да меркаванняў, прадстаўленых групай.

### Абмеркаванне:

- Чаму свабода слова лічыцца ключавой каштоўнасцю дэмакратыі?
- Якія негатыўныя наступствы абмежавання свабоды слова?
- Што можа быць пазітыўнага ў абмежаванні свабоды слова?
- Ці абмежаваная свабода слова ў Беларусі?

### Возьмем пад ўвагу:

Свабода слова — ключавая каштоўнасць дэмакратыі, абароненая законам (Канстытуцыяй). У той жа час многія еўрапейскія ўрады абмяжоўваюць свабоду слова. Выказванні, якія выклікаюць расізм, не дазваляюцца. Не ўсе згодны з тым, што свабода слова павінна быць абмежаванай. Можа быць, лепшым спосабам вырашэння дадзенай дылемы з'яўляецца бесперапыннае абмеркаванне гэтай праблемы?

### ААН і свабода слова:

У артыкуле 19 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах гаворыцца пра абмежаванне свабоды слова. У артыкуле запісана, што свабода слова «накладае асаблівыя абавязкі і асаблівую адказнасць». Свабода слова, такім чынам, можа быць падвергнута абмежаванням, але толькі ў межах закона і калі гэта неабходна для:

1) павагі правоў і рэпутацыі іншых асоб;
2) аховы дзяржаўнай бяспекі, грамадскага парадку, здароўя і маральнасці насельніцтва.

У артыкуле 20 гэтыя абмежаванні дапаўняюцца наступным чынам:

1. Любая прапаганда вайны павінна быць забароненая законам.
2. Любы выступ на карысць нацыянальнай, расавай або рэлігійнай нянавісці, які ўяўляе сабой падбухторванне да дыскрымінацыі, варожасці або гвалту, павінен быць забаронены законам.

### Свабода слова ў Нарвегіі

Свабода слова абаронена Канстытуцыяй Нарвегіі. У той жа час Крымінальны кодэкс забараняе дзеянні, якія «выклікаюць нянавісць, прыводзяць да пераследу і пагарды адносна асобы або групы асоб па прычыне яго(яе)/іх рэлігіі, расы, колеру скуры, нацыянальнасці і грамадзянства». Дадзеная забарона грунтуецца на артыкуле 4 Канвенцыі ААН па ліквідацыі ўсіх форм расавай дыскрымінацыі, якая абавязвае дзяржавы лічыць незаконнымі дзеянні па распаўсюдзе расавай нянавісці або падбухторванні да яе; гвалтоўныя дзеянні або падбухторванне да іх у адносінах да асобы або групы асоб з іншым колерам скуры ці этнічнага паходжання, а таксама любыя дзеянні падтрымкі (фінансавай у тым ліку) расістаў. Усё гэта злачынствы, за якія прадугледжваецца крымінальнае пакаранне.



Надпіс «Я за свабоду друку. А вы?» на майцы маладога чалавека з газетамі. Мінск, ліпень 2000 г.

## Свабода слова ў Беларусі

У Беларусі свабода слова гарантуецца артыкуламі 33 і 34 Канстытуцыі. Асноўны Закон таксама ўтрымлівае забарону на дзейнасць аб'яднанняў, «якія вядуць прапаганду вайны, сацыяльнай, нацыянальнай, рэлігійнай і расавай варожасці» (арт. 5). Гэтае палажэнне Канстытуцыі развіта ў Крымінальным кодэксе, артыкул 130 якога прадугледжвае адказнасць за «наўмысныя дзеянні, накіраваныя на распальванне расавай, нацыянальнай, рэлігійнай варожасці ці розні, на прыніжэнне нацыянальнага гонару і годнасці».

Разам з тым Крымінальны кодэкс Беларусі ўтрымлівае шэраг артыкулаў, якія з'яўляюцца дзейсным сродкам барацьбы са свабодай слова: арт. 367 — «Паклёп у дачыненні да прэзідэнта Рэспублікі Беларусь», арт. 368 — «Знявага прэзідэнта Рэспублікі Беларусь», арт. 369 — «Знявага прадстаўніка ўлады». З увядзеннем у дзеянне гэтых артыкулаў (2001 год) крытыка прэзідэнта або высокіх дзяржаўных чыноўнікаў у сродках масавай інфармацыі ці іншых публічных выступах, узгадванне заганных для іх фактаў сталі небяспечнымі для аўтараў. Гэта пагражае не толькі вялікім штрафам, але і турэмным зняволеннем як для аўтараў крытычных выказванняў, так і для рэдактара, які дазволіў апублікаваць гэтае выказванне на старонках сваёй газеты. Звяртае на сябе ўвагу і тое, што гонар прэзідэнта і прадстаўнікоў улады трапляюць у шэраг аб'ектаў, якія больш каштоўныя для грамадства, чым гонар звычайнага чалавека.

З 2006 года Крымінальны кодэкс папоўніўся новым арт. 369.1 — «Дыскрэдытацыя Рэспублікі Беларусь», накіраваным на абмежаванне свабоды выказвання меркаванняў. Пад дыскрэдытацыяй разумеецца «прадастаўленне замежнай дзяржаве, замежнай або міжнароднай арганізацыі заведама ілжывай інфармацыі аб палітычным, эканамічным і сацыяльным, ваенным або міжнародным становішчы Рэспублікі Беларусь, прававым палажэнні грамадзян Рэспублікі Беларусь або яе органаў улады». Пры наяўнасці агульнай адказнасці за паклёп прымяненне новай нормы накіравана выключна супраць апанентаў і крытыкаў афіцыйных уладаў, а таксама журналістаў і праваабаронцаў. Крымінальная адказнасць за дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі (арт. 193.1 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь) пазбаўляе магчымасці выказвання меркавання прадстаўнікоў аб'яднанняў, якія не маюць афіцыйнага статусу, пра іх дзейнасць забараняецца паведамляць у СМІ.

### Варыяцыя 1:

Увосень 2005 года ў дацкай газеце «Jullands Posten» былі апублікаваны карыкатуры на прарока Мухамеда. У пачатку 2006 года нарвежскі хрысціянскі часопіс «Magazinet» і некаторыя іншыя выданні перадрукавалі тыя ж карыкатуры. Маляванне прарока Мухамеда забаронена ісламам, таму карыкатуры ўспрыняліся як высмейванне рэлігіі. Іх публікацыя прывяла да масавых пратэстаў і дэманстрацый у многіх краінах. На Блізкім Усходзе пасольствы Даніі і Нарвегіі былі падпалены і разгромлены. У агульнай колькасці пацярпела каля двухсот чалавек.

У Беларусі за перадрук карыкатур на прарока Мухамеда на 3 гады пазбаўлення волі ў калоніі ўзмоцненага рэжыму быў асуджаны намеснік галоўнага рэдактара недзяржаўнай газеты «Згода» Аляксандр Здзвіжкоў. Журналіст быў прызнаны вінаватым у «наўмысных дзеяннях, накіраваных на распальванне расавай, нацыянальнай, рэлігійнай варожасці ці розні, прыніжэнні нацыянальнага гонару і годнасці, здзейсненых службовай асобай з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў», а газета зачынена. Пазней пакаранне А. Здзвіжкову было зменшана да трох месяцаў пазбаўлення волі.

Дадзеныя публікацыі сталі прычынай абмеркаванняў і дэбатаў у многіх краінах свету аб неабходнасці абмежавання свабоды слова.

- А якое ваша меркаванне? Ці павінна свабода слова быць абмежаваная ў знак павагі да рэлігій іншых людзей?
- Ці магчымыя наогул выпадкі, дзе вера і рэлігія могуць крытыкавацца або быць падвергнутыя іроніі?
- Што разумеецца пад цэнзурай?
- Што такое самацэнзура?




### Варыяцыя 2:

Былы кіраўнік Гуманна-этычнага камітэта Нарвегіі Лаш Гюле неяк сказаў: «Можна патрабаваць павагі да свайго права верыць, але нельга патрабаваць павагі да сваёй веры». Як вы думаеце, што ён хацеў гэтым сказаць?



# Я ТАКСАМА ХАЧУ ВЫРАШАЦЬ

### Тэма:

Права на ўдзел у палітычным жыцці.

### Мэта:

Удзельнікі павінны ўсвядоміць важнасць удзелу ў палітычным жыцці.

Часта можна пачуць: «Народ мае тых палітыкаў, якіх заслугоўвае!» Магчыма, у гэтым ёсць доля ісціны. У дэмакратычнай дзяржаве мы, простыя грамадзяне, выбіраем сабе ўлады. На нас і ляжыць адказнасць за выбар разумных, справядлівых палітыкаў, якія паважаюць правы чалавека, а не тых, хто аддасць уладу якім-небудзь асобным групам у грамадстве. Дакладна вядома толькі адно: калі чалавек не выкарыстае сваё права голасу, у яго/яе няма тады ніякага ўплыву. Ці справядлівыя тады папрокі на адрас палітыкаў аб тым, што яны такія-сякія і ні на што непрыдатныя, калі людзі самі не прымаюць удзелу ў палітычным жыцці грамадства? Калі мы хочам змяніць грамадства і жыццё, неабходны ўдзел!

Ніхто не зрабіў большай памылкі, чым тыя, хто наогул нічога не зрабіў, паколькі яны маглі б зрабіць хоць нешта.

### Практычная рэалізацыя:

Дадзенае практыкаванне заснавана на працы ў групах з наступнай агульнай дыскусіяй.

**Час:** 45 хвілін.

**Што неабходна?** Папера і ручка.

### Парадак выканання:

1. Вядучы дзеліць удзельнікаў на групы і просіць адказаць на наступнае пытанне: якім чынам людзі могуць уплываць на жыццё грамадства? Адказы запісваюцца на паперы або дошцы. (Абмяркуйце механізмы ўплыву людзей на жыццё ў сям'і, у школе, у адносінах з суседзямі, выкарыстоўваючы права голасу і выбару, свабоду слова, права пісаць у газету, збірацца ў клубах па інтарэсах, ствараць арганізацыі, кампаніі, дэманстрацыі і інш.). (10 хвілін)
2. Групы прадстаўляюць вынікі сваёй працы ў аўдыторыі. Калі вядучы лічыць, што не ўсе механізмы ўплыву былі ўзгаданы, ён можа прапанаваць дзецям спіс магчымых дзеянняў і абмеркаваць эфектыўнасць кожнага з іх:

- мірныя дэманстрацыі, маршы і паходы, шэсці з рознымі патрабаваннямі;
- сходы і мітынгі — праводзяцца звычайна ў месцах масавай канцэнтрацыі людзей. Звычайна на іх гаворацца прамовы ў падтрымку таго ці іншага рашэння, раздаюцца агітацыйныя матэрыялы ў падтрымку сваёй пазіцыі;
- страйкі, у тым ліку «сядзячыя» — напрыклад, адмова ад працы, звязаная з вызначанымі патрабаваннямі;
- пікетаванне — сходы невялікіх груп людзей, напрыклад, каля ўрадавых будынкаў або каля завода, дзе ідзе страйк, каб праінфармаваць усіх працоўных;
- акцыі пратэсту і салідарнасці — сімвалічныя дзеянні, якія дазволяць прадэманстраваць сваю пазіцыю па тым ці іншым пытанні, арганізацыя галадовак або напаўтэатралізаваных дзеянняў;
- грамадзянская ініцыятыва — паколькі не заўсёды трэба «змагацца» супраць кагосьці. Часам для вырашэння праблемы дастаткова нам самім разам нешта зрабіць. Напрыклад, правесці акцыю па прыбіранні смецця ў горадзе;
- кампанія ў СМІ — размяшчэнне агітацыйных матэрыялаў у газетах і часопісах, дамова з журналістамі адносна стварэння агітацыйных артыкулаў і радыёматэрыялаў, выступ па радыё актывістаў;
- улётkавая кампанія — ва ўлётках выкладаецца пазіцыя групы, яе заклікі, прапановы да гараджан; улёткі расклейваюцца на вуліцах, вывешваюцца ў памяшканнях на спецыяльных стэндах, раскладаюцца па паштовых скрынях.

3. Вядучы просіць удзельнікаў вярнуцца ў «свае» групы. Заданне зараз — знайсці артыкулы ва Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, якія абараняюць правы і магчымасці тых механізмаў уплыву, якія былі вызначаны ўдзельнікамі (асабліва важныя артыкулы 19, 20 і 27).

### Абмеркаванне:

- Чаму можа быць важным выказаць сваё меркаванне аб жыцці/стане грамадства і яго праблемах?
- Чаму важна, каб як мага больш людзей маглі ўплываць на жыццё грамадства/краіны?
- Рашэнні, прынятыя разам, лепшыя, чым рашэнні, прынятыя толькі людзьмі, якія маюць уладу? Чаму?
- Якім групам у грамадстве неабходна падтрымка? (Дзеці, пажылыя людзі, інваліды, уцекачы і інш.) Што неабходна зрабіць для таго, каб іх голас быў пачуты? Якая іх сітуацыя ў Беларусі? Прывядзіце прыклады.





Моладзь сама хоча вырашаць свой лёс.

### Возьмем пад ўвагу:

У кожнага чалавека ёсць магчымасць уплываць на жыццё свайго грамадства. Асобна ўзятыя людзі пачалі ў свой час філасофстваваць аб правах чалавека і фармуляваць свае ідэі ў публічных выступах, запісах і кнігах. Гэта, ізноў жа, асобна ўзятыя людзі апелявалі, пратэставалі, натхнялі і патрабавалі, нарэшце, каб дзяржавы ўзялі сабе за правіла паважаць правы чалавека. Не было б усіх гэтых людзей, не з’явілася б Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека. Застаецца яшчэ шмат працы для таго, каб правы чалавека паважаліся. Але самая важная праца адбываецца ў галовах «простых» грамадзян, у паўсядзённым іх жыцці і ўдзеле ў сацыяльным і палітычным жыцці грамадства.

Дэмакратычны рэжым — недасканалы. Аднак на сённяшні дзень гэта найлепшая альтэрнатыва.

### ФАКТЫ:

ГАЛАСАВАННЕ НА ВЫБАРАХ У НАРВЕЖСКІ ПАРЛАМЕНТ У 2005 ГОДЗЕ:

77 % — прагаласавала тых, хто мае права голасу;
55 % — тыя, хто галасаваў першы раз, каму ад 18 да 21 гадоў;
53 % — эмігрантаў;
49 % — эмігрантаў, не выхадцаў з Еўропы.

# ГРАМАДЗЯНСКАЯ СУПОЛЬНАСЦЬ

**Тэма:**

Грамадзянская супольнасць.

**Мэта:**

Удзельнікі павінны зразумець, што такое грамадзянская супольнасць і якую ролю яна адыгрывае ў рэалізацыі правоў чалавека.

«Грамадзянская супольнасць» — гэта тэрмін, які часта выкарыстоўваецца, калі мы гаворым пра дэмакратыю і правы чалавека. Кажуць, што грамадзянская супольнасць — гэта «вартавы сабака», які прыглядае за ўладамі, крытыкуе органы ўлады і карэктуе іх дзейнасць. Грамадзянская супольнасць таксама забяспечвае большую разнастайнасць у грамадстве. Але што ж гэта такое — грамадзянская супольнасць?

**Практычная рэалізацыя:**

Гэта цікавае практыкаванне пачынаецца з таго, што ўсе ўдзельнікі выходзяць у цэнтр пакоя і ўтвараюць групы па зададзеных прыкметах. Далей ідзе кароткі даклад. Практыкаванне завяршаецца размовай аб грамадзянскай супольнасці.

**Час:** 45 хвілін.
**Што неабходна?** Прасторнае памяшканне, самаклейныя лісточкі з назвамі роляў.
**Падрыхтоўка:** Кароткі даклад або прэзентацыя.

**Парадак выканання:**

1. Вядучы тлумачыць, што гэтае практыкаванне павінна паказаць, што такое грамадзянская супольнасць і незалежныя арганізацыі. Выкладчык гаворыць, што ўсім удзельнікам будуць прысвоены новыя ролі, і наклейвае самаклейныя лісточкі з назвамі роляў на кожнага ўдзельніка. Размеркаванне роляў павінна адбывацца выпадковым чынам, без старанных узважванняў і разваг (аднак у асаблівых выпадках важна, каб асобныя ўдзельнікі не атрымалі «непажаданую» ролю).
2. Вядучы тлумачыць, што ўдзельнікі зараз павінны згрупавацца на падставе сваіх новых роляў: з кім, як яны лічаць, яны могуць утварыць групу? (5—10 хвілін). Пасля таго, як удзельнікі разбіліся на групы, вядучы робіць агляд утвораных груп. Звычайна складаецца чатыры групы:
   I. Ролі, якія валодаюць ПАЛІТЫЧНАЙ УЛАДАЙ (палітычны і дзяржаўны ўладны апарат, які прадстаўляе дзяржаўныя ўстановы).
   II. Ролі, якія валодаюць ЭКАНАМІЧНАЙ УЛАДАЙ (бізнэс і іншыя арганізацыі, якія атрымліваюць прыбытак).
   III. Ролі, якія валодаюць РЭЛІГІЙНАЙ УЛАДАЙ (лідэры розных духоўных абшчын).
   IV. Ролі, ЯКІЯ НЕ ВАЛОДАЮЦЬ УЛАДАЙ (розныя групы ў грамадстве, якія не валодаюць ні палітычнай, ні эканамічнай уладай).

   Часам фарміруюцца іншыя групы, і такое размеркаванне зусім неабавязкова з'яўляецца «няправільным». І усё ж мэта гэтага практыкавання ў тым, каб зразумець розныя сацыяльныя функцыі гэтых чатырох груп. Таму важна, каб вядучы дапамагаў удзельнікам, якія выбралі відавочна «чужую» групу. Тады варта папрасіць удзельніка растлумачыць свой выбар, адкарэктаваць яго і накіраваць у «правільную» групу.

   Спачатку вядучы просіць усіх удзельнікаў групы I распавесці, чаму яны выбралі гэтую групу. Ці ёсць у іх агульныя рысы і як яны рэагуюць на іншых членаў групы? Якая іх роля ў грамадстве? Падчас прадстаўлення роляў вядучы тлумачыць, што гэтая група валодае палітычнай уладай у грамадстве (і манаполіяй на выкарыстанне сілавых органаў, такіх як паліцыя і войска).

   Затым вядучы просіць кожнага ўдзельніка з групы II выказаць сваё меркаванне. Па меры іх выказванняў вядучы тлумачыць, што члены гэтай групы арганізуюць вытворчасць тавараў і паслуг, атрымліваюць прыбытак і таму валодаюць эканамічнай уладай.

   Далей прадстаўляе сябе група III — кіраўнікі рэлігійных супольнасцяў. Гэтыя людзі ў пэўнай ступені валодаюць «духоўнай» уладай.

   Напрыканцы вядучы просіць удзельнікаў групы IV распавесці, чаму яны выбралі гэтую групу. Выкладчык павінен першапачаткова растлумачыць, што гэтыя сацыяльныя групы не маюць палітычнай, эканамічнай ці духоўнай улады, а наадварот, з'яўляюцца неабароненымі групамі, і таму маюць патрэбу ў падтрымцы і дапамозе з боку грамадства. Калі гэтыя групы самаарганізуюцца, то яны ўсе разам складаюць грамадзянскую супольнасць.
3. Далей вядучы можа намаляваць кола (якое ўяўляе грамадства) і падзяліць яго на чатыры сегменты (глядзіце ілюстрацыю), затым растлумачыць схему.
   - дзяржаўныя органы і ўстановы маюць палітычную ўладу;
   - бізнэс-структуры маюць эканамічную ўладу;
   - рэлігійныя канфесійныя супольнасці маюць духоўную ўладу;
   - грамадзянская супольнасць не мае ні палітычнай, ні эканамічнай улады. Яна мае патрэбу ў падтрымцы іншых сфер грамадства. Мэта грамадзянскай супольнасці ў тым, каб самаарганізоўвацца і ўплываць на іншыя сферы грамадства, патрабуючы выканання правоў чалавека. Гэта часта называюць актывісцкай дзейнасцю.

**Абмеркаванне:**

- Прывядзіце прыклады інстытутаў грамадзянскай супольнасці.
- Чаму людзі ствараюць праваабарончыя і гуманітарныя арганізацыі?
- Не маглі б вы прывесці прыклады праваабарончых арганізацый? Якія з іх нацыянальныя, а якія — міжнародныя?
- Некаторыя арганізацыі не хочуць атрымліваць фінансаванне ад дзяржавы або бізнэсу. Як вы думаеце чаму?
- Ці варта ўступаць у арганізацыі і падтрымліваць іх?
- Чаму грамадзянская супольнасць важная для дзяржавы?
- Навошта нам трэба глабальная грамадзянская супольнасць?

**Возьмем пад ўвагу:**

Пачынаючы з канца 19 стагоддзя і ўсё 20 стагоддзе ў грамадстве фарміраваўся ўсё больш буйны сегмент, які прынята называць «грамадзянская супольнасць», мэтай якой з'яўляецца ўплыў на органы ўлады і бізнэс-структуры. Грамадзянская супольнасць уключае ў сябе праваабарончыя і гуманітарныя арганізацыі, а таксама іншыя групы, якія аб'ядноўваюцца для таго, каб змагацца за важную для іх справу. Паколькі гэтыя арганізацыі не з'яўляюцца часткай дзяржаўнага ўладнага апарата, іх называюць незалежнымі, няўрадавымі арганізацыямі (ад ангельскага NGOs: Non Governmental Organisations — «няўрадавыя арганізацыі»). Часта яны маюць сваё бачанне сітуацыі і могуць быць крытычна настроены ў адносінах да палітыкі ўлады. Сучасныя праваабарончыя арганізацыі ствараюць міжнародную праваабарончую сетку для таго, каб умацаваць свае пазіцыі і працаваць на міжнародным узроўні. Таму сёння існуе маштабная міжнародная грамадзянская супольнасць, якая з'яўляецца важным фактарам уплыву ў міжнароднай палітыцы.

**Права чалавека на аб'яднанне — гэта права ствараць і ўступаць у арганізацыю для таго, каб абараняць свае інтарэсы і інтарэсы іншых.**



**Ролі:**

Дэпутат парламента.
Прэм'ер-міністр.
Суддзя.
Генерал.
Паліцэйскі.
Фабрыкант.
Уладальнік гасцініцы.
Уладальнік акцый.
Селянін, фермер.
Палітык (які не знаходзіцца ва ўладзе).
Святар.
Імам.
Тэлевядучы.
Дзіця.
Беспрацоўны.
Пенсіянер.
Гомасэксуаліст.
Лесбіянка.
Уцякач.
Прастытутка.
Інвалід.
Чалавек, які адсядзеў тэрмін у турме.
Інжынер.
Доктар.
Журналіст.
Спявак.
Навукоўца.
Актывіст-праваабаронца.
Наркаман.
Зняволены.
Хворы анкалагічным захворваннем.

## Вызначальныя сілы грамадства



# ПРАВААБАРОНЧЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ

### Тэма:

Праваабарончыя арганізацыі.

### Мэта:

Пазнаёміцца з праваабарончымі арганізацыямі і метадамі іх працы.

Хаця асноўная адказнасць за выкананне правоў чалавека ляжыць на дзяржаве і ўладах, праца многіх недзяржаўных арганізацый у галіне правоў чалавека незаменная. Працуюць яны па-рознаму: хтосьці робіць даклады і выяўляе парушэнні правоў чалавека, хтосьці збірае адзенне, ежу і іншыя неабходныя для жыцця рэчы для маламаёмасных людзей, хтосьці арганізуе кампаніі і дэманстрацыі. Ва ўсім свеце існуюць тысячы праваабарончых арганізацый. Самая буйная, відаць, — гэта Міжнародная Амністыя, якая налічвае больш за два мільёны членаў. Прыклады такіх арганізацый у Нарвегіі — гэта аддзяленне Міжнароднай Амністыі ў Нарвегіі, Нарвежскі Хельсінкскі камітэт, Нарвежская арганізацыя для ўцекачоў, «Выратуем дзяцей», Аб'яднанне людзей з абмежаванымі магчымасцямі і Антырасісцкі цэнтр.

### Практычная рэалізацыя:

**Час:** 60 хвілін і больш.
**Што неабходна?** Доступ да інфармацыі (Інтэрнэт, бібліятэка); магчыма таксама наведванне праваабарончых арганізацый.

### Парадак выканання:

1. Вядучы просіць удзельнікаў назваць спосабы і метады, якія магчыма выкарыстаць для таго, каб палепшыць жыццё грамадства. Калі нехта назаве незалежныя, недзяржаўныя або добраахвотныя арганізацыі, папрасіце растлумачыць, што гэта за арганізацыі. Калі ніхто не назаве такія арганізацыі, спытайце ўдзельнікаў: як яны разумеюць словазлучэнне «незалежная грамадская арганізацыя» і чым, па іх меркваванні, займаецца такая арганізацыя. Адказы і ідэі запісваюцца на дошцы:
   - недзяржаўныя/добраахвотныя/незалежныя ад афіцыйнай палітыкі краіны, ад урада;
   - як правіла, не прымацаваны да якіх-небудзь пэўных палітычных партый;
   - як правіла, маюць сваіх членаў;
   - атрымліваюць фінансаванне ад розных грамадскіх інстытутаў (членскія ўнёскі, ад прадпрыемстваў прамысловасці і бізнэсу, ад дзяржавы, праз дабрачынныя акцыі).
2. Вядучы распавядае аб тым, што існуе шмат незалежных арганізацый, якія працуюць у сферы правоў чалавека. У чым заключаецца іх праца?
   - назіраюць і робяць даклады аб сітуацыі з правамі чалавека як ва ўласнай краіне, так і ў іншых краінах;
   - аказваюць юрыдычную дапамогу маламаёмасным і неабароненым групам насельніцтва;
   - працуюць альбо над рашэннем нейкай праблемы, альбо ў нейкім «канфліктным» рэгіёне (напрыклад: з правамі дзяцей, уцекачоў, свабодай слова і інш.);
   - праводзяць інфармацыйную і асветніцкую працу;
   - часта з'яўляюцца часткай міжнароднай сеткі;
   - ажыццяўляюць праекты, накіраваныя на пэўныя групы насельніцтва (маламаёмасныя, наркаманы, уцекачы, інваліды, пенсіянеры, дзеці і інш.);
   - займаюцца лабіяваннем у палітыцы і г.д.
     Папрасіце ўдзельнікаў прывесці прыклады відаў дзейнасці незалежных арганізацый.
   - Ці ёсць у вас вопыт такой працы? Ці з'яўляецеся вы членам якой-небудзь арганізацыі?
   - Якім чынам дзейнасць такіх арганізацый дапамагае развіццю дэмакратыі?
3. Папрасіце ўдзельнікаў вызначыць, якія праблемы з правамі чалавека ў краіне, па іх меркаванні, патрабуюць вырашэння. Гэта могуць быць, напрыклад, медыцынская дапамога дзецям, хворым анкалагічнымі захворваннямі, абарона дзяцей ад жорсткага абыходжання ў сям'і, дапамога бяздомным людзям, вымушаным перасяленцам, працоўным мігрантам, інвалідам, людзям, якія ўтрымліваюцца ў месцах пазбаўлення волі, наркаманам і г.д. Удзельнікі дляцца на групы. Кожная група атрымлівае заданне на тыдзень: прыдумаць, якую ім хацелася б «стварыць» незалежную арганізацыю, даць ёй назву і вызначыць тэму, сферу яе працы, метады і інш.
4. На наступным занятку групы прадстаўляюць вынікі сваёй працы.

### Возьмем пад ўвагу:

Незалежныя няўрадавыя арганізацыі займаюцца важнымі для грамадства справамі ў дадатак да таго, што робяць дзяржаўныя ўлады. Арганізацыі могуць таксама займацца «карэкціроўкай» урадавай палітыкі і выступаць з яе крытыкай. Існаванне і праца арганізацый, якія «сочаць» і крытыкуюць дзеянні ўлады, вельмі важныя. Гэта таксама дае магчымасць грамадзянам зрабіць свой унёсак у паляпшэнне сітуацыі з правамі чалавека ў той ці іншай краіне. У дэмакратычных дзяржавах да меркаванняў праваабарончых арганізацый прыслухоўваюцца, у недэмакратычных — на іх насылаюць ганенні і рэпрэсіі.

**Варыяцыя:**

Кіраўнік дзеліць вучняў на групы, якія атрымліваюць заданне наведаць якую-небудзь праваабарончую арганізацыю, што працуе ў вашым горадзе, і пагутарыць з яе актывістамі. Заданне — атрымаць адказы на наступныя пытанні:

- Якая мэта арганізацыі?
- Якія яе метады працы?
- Хто з'яўляецца членамі?
- Якім чынам фінансуецца дзейнасць арганізацыі?
- Ці ёсць актыўныя арганізацыі ў вашым раёне?
- Чаго яны дамагліся?

## ФАКТЫ:

*Няўрадавыя незалежныя арганізацыі ствараюцца людзьмі, якія «хварэюць» за тую ці іншую справу. Звычайна такія арганізацыі становяцца «голасам» неабароненых груп у грамадстве: уцекачоў, дзяцей, інвалідаў, зняволеных, прастытутак і інш. У такіх арганізацый часта наладжаны добры кантакт з насельніцтвам і ёсць уласныя члены. Многія з іх — прафесійныя арганізацыі, і з іх меркаваннем лічацца і прэса, і ўлады. Праваабарончая дзейнасць — не эксклюзіўная дзейнасць для асобна ўзятай групы людзей, а людзей розных прафесій, прыхільнасцяў і перакананняў.*

# ПРАВААБАРОНЦЫ

**Тэма:**

Праваабаронцы.

**Мэта:**

Удзельнікі павінны зразумець, наколькі важная роля асобных людзей і груп людзей у змаганні за правы чалавека.

**Практычная рэалізацыя:**

Практыкаванне пачынаецца з абмену ідэямі, працягваецца доўгай (не менш за 2 тыдні!) дамашняй працай у групах і завяршаецца прэзентацыямі ў аўдыторыі.

| | |
|---|---|
| **Час:** | Ад 15 да 45 хвілін на адным уроку — для фармулёўкі праблемы і размеркавання заданняў; тыдзень для самастойнай працы ў групах; 1 урок для прэзентацыі вынікаў. |
| **Што неабходна?** | Папера і ручкі, вялікія адрыўныя лісты паперы і маркеры, нажніцы і клей; доступ да інфармацыі: бібліятэка, Інтэрнэт, друкаваныя выданні. |

**Парадак выканання:**

1. Вядучы запрашае ўдзельнікаў да абмену ідэямі і меркаваннямі: хто такі праваабаронца? (Чалавек, які робіць важную працу для таго, каб палепшыць сітуацыю з правамі чалавека для групы людзей або ўсяго народа; які змагаецца за вялікую свабоду.) Ці ёсць у вас нейкія прыклады? Вядомыя праваабаронцы ў свеце: Анры Дзюнан, Марцін Лютэр Кінг, Нэльсан Мандэла, маці Тэрэза, Флоранс Найцінгейл, Махатма Гандзі, Вацлаў Гавел і многія заснавальнікі праваабарончых арганізацый. Звяжыцеся з праваабарончымі арганізацыямі ў вашым рэгіёне.
2. Вядучы дзеліць удзельнікаў на групы, якія атрымліваюць заданне «разгледзець бліжэй» таго ці іншага праваабаронцу. Групам неабходна адказаць на наступныя пытанні: кароткая біяграфія дадзенага чалавека? Чаму ён ці яна сталі праваабаронцамі? Якая яго/яе мэта? У якім палітычным рэжыме ён/яна працуюць і за якія правы змагаюцца? Якія цяжкасці ён/яна выпрабоўваюць? Якія яго/яе «перамогі»?
3. Групы прадстаўляюць вынікі сваёй працы аўдыторыі.



Беларускія праваабаронцы перадаюць у Адміністрацыю прэзідэнта петыцыю супраць смяротнага пакарання ў Беларусі. Мінск, 10 снежня 2009 г.

### Возьмем пад ўвагу:

Ёсць вельмі шмат людзей, якія ўзялі на сябе адказнасць змагацца за правы чалавека і за свабоду. Многія з гэтых людзей заслужылі глыбокую павагу ў свеце. Важна, аднак, памятаць, што ёсць вельмі шмат людзей, якія працуюць над паляпшэннем сітуацыі з правамі чалавека кожны дзень, але якія не трапляюць у газеты або на старонкі часопісаў.

### Варыяцыя:

- Ці ведаеце вы людзей, якія не настолькі вядомыя, але робяць вялікі ўнёсак сваёй дзейнасцю ў паляпшэнне сітуацыі з правамі чалавека ў вашай краіне або ў іншых краінах? Тыя, каго мы можам назваць «нябачнымі героямі».
- Што падобнае і адрознае паміж праваабаронцамі і «нябачнымі героямі»?

### ФАКТЫ:

*Праваабаронцы «атрымалі» ў 1998 годзе сваю ўласную дэкларацыю – Дэкларацыю ААН аб праваабаронцах. Дадзеная дэкларацыя – доказ таго, што міжнародная супольнасць высока цэніць працу праваабаронцаў і хацела б абараніць іх больш.*

**Маленькі камар можа нарабіць у спальні шмат шуму.**



## ПРАВЫ ДЗІЦЯЦІ

### Тэма:

Правы дзіцяці.

### Мэта:

Удзельнікі павінны зразумець спецыфіку правоў дзіцяці як групавых правоў, вылучэнне якіх звязана з асаблівай неабароненасцю дзяцей і немагчымасцю для іх самастойна абараняць свае правы.

Быць дзіцянём можа быць выдатна! Дзіця, якое расце ў бяспецы, якога любяць бацькі, мае шмат магчымасцяў у жыцці, можа бесклапотна гуляць, атрымліваць асалоду ад дзяцінства; усё гэта закладзе трывалую аснову багатага дарослага жыцця. Нарвегія — гэта краіна, дзе многія дзеці жывуць менавіта так, чым можна быць цалкам задаволеным. Але і ў нашай краіне ёсць дзеці, якія пакутуюць, бацькі якіх злоўжываюць псіхаактыўнымі рэчывамі, безнаглядныя дзеці. У іншых частках свету дзеці могуць жыць у горшых умовах. Многія не могуць хадзіць у школу і павінны працаваць, іншыя падвяргаюцца сэксуальнаму прымусу, у некаторых няма бацькоў, і яны вымушаны жыць на вуліцы. Паколькі дзеці — гэта самая неабароненая група ў грамадстве, важна працаваць над тым, каб даць ім абарону і не дапусціць іх прыгнёту. Працаваць з дзецьмі — значыць працаваць на будучыню!

### Практычная рэалізацыя:

Спачатку праводзіцца доўгая дамашняя праца ў групах, затым яе вынікі прадстаўляюцца на агульным сходзе. Практыкаванне завяршаецца дакладам кіраўніка пра стан правоў дзіцяці ў Рэспубліцы Беларусь.

**Час:** 45—90 хвілін.
**Што неабходна?** Ручкі і папера, вялікія лісты, па асобніку Канвенцыі ААН аб правах дзіцяці кожнаму ўдзельніку.
**Падрыхтоўка:** Даклад аб правах дзіцяці.

### Парадак выканання:

1. Кіраўнік раздае асобнікі Канвенцыі аб правах дзіцяці і называе тэму: «Чаму ў дзіцяці павінны быць асобыя правы?» Затым ён дзеліць удзельнікаў на невялікія групы, якія павінны будуць за тыдзень знайсці прыклады таго, як дзеці жывуць у цяжкіх умовах і (ці) падвяргаюцца прыгнёту. Прыклады можна ўзяць з гісторыі ці з сучаснасці, з Беларусі ці з іншых краін свету. Удзельнікам можна прапанаваць знайсці прыклады асобных груп, якія маюць большыя праблемы, чым астатнія

(інваліды, этнічныя меншасці, дзеці-сіроты, дзеці вуліцы, уцекачы, дзеці вайны, дзеці-салдаты і інш.). Прыклады запісваюцца на вялікіх лістах паперы. (20—30 хвілін)

2. Групы робяць выступы на агульным сходзе. Вядучы павінен уважліва сачыць за выступамі і прасіць удзельнікаў распавесці крыху пра прычыны праблем, якія дзеці зведваюць (зведвалі). Што, па меркаванні групы, можна зрабіць, каб палепшыць сітуацыю?
3. Вядучы робіць кароткі даклад аб правах дзіцяці ў Рэспубліцы Беларусь.

### Возьмем пад ўвагу:

Дзеці — гэта неабароненая група ў грамадстве, паколькі яны цалкам залежаць ад стаўлення да іх з боку дарослых. І раней, і зараз некаторыя дзеці жывуць у вельмі цяжкіх умовах. Некаторыя не могуць задаволіць свае асноўныя патрэбы такія як ежа, адзенне і жыллё, многія падвяргаюцца прыгнёту. Іншыя жывуць ва ўмовах вайны і ўзброеных канфліктаў. Паколькі дзецям неабходна асаблівая абарона, ААН прыняла ў 1989 г. Канвенцыю аб правах дзіцяці, якая рэгулюе тое, як дзяржава павінна абыходзіцца з дзецьмі. Важным яе пунктам з'яўляецца палажэнне аб праве дзіцяці быць пачутым адносна пытанняў, якія яго датычаць.

### Варыяцыя 1:

Працягнуць працу па дадзенай тэме можна рознымі спосабамі. Можна прасачыць гісторыю напісання і прыняцця Канвенцыі аб правах дзіцяці; або разгледзець якую-небудзь тэму больш падрабязна (напрыклад, становішча дзяцей у краінах, якія развіваюцца, гандаль дзецьмі, дзіцячая праца, дзеці-ўцекачы, дзеці- інваліды і інш.).

### Варыяцыя 2:

Падрыхтуйце прэзентацыю пра праблему, звязаную з правамі дзіцяці, якая была вырашана ў Беларусі. Чаму сітуацыя палепшылася? Якія інстытуты грамадства змагаліся за паляпшэнне сітуацыі? Якімі былі асноўныя сродкі змагання? Можна ў якасці прыкладу ўзяць дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі, з сіндромам Даўна; дзяцей, якія належаць да меншасцяў (цыгане, іншыя меншасці), дзяцей-сірот і г.д.

### Варыяцыя 3:

Пазнаёмцеся з захапляльнай (і часта малавядомай) гісторыяй Эгеланцін Джэб! Удзельнікі рыхтуюць прэзентацыю пра гэтую жанчыну, якая ўпершыню стварыла дэкларацыю аб правах дзіцяці і заснавала арганізацыю «Save the Children» («Выратуем дзяцей») у Вялікабрытаніі.





У такіх умовах жывуць дзеці з сем'яў уцекачоў з Нагорнага Карабаха. Баку, май 2003 г.

### Важныя дакументы аб правах дзіцяці:

| | |
|---|---|
| **1923—1924 гг.** | Дэкларацыя аб правах дзіцяці (Эгланціне Джэб/Ліга нацый). |
| **1959 г.** | Дэкларацыя ААН аб правах дзіцяці. |
| **1989 г.** | Канвенцыя ААН аб правах дзіцяці[27]. |

*1 чэрвеня — Міжнародны дзень абароны дзяцей. Ён заснаваны ў лістападзе 1949 года рашэннем сесіі Міжнароднай дэмакратычнай федэрацыі жанчын і ўпершыню праведзены ў 1950 годзе. Міжнародны дзень абароны дзяцей — гэта напамін дарослым аб неабходнасці выконваць правы дзяцей на жыццё, на свабоду меркавання і рэлігіі, на адукацыю, адпачынак і вольны час, на абарону ад дыскрымінацыі, фізічнага і псіхалагічнага гвалту, на абарону ад эксплуатацыі.*

### Правы дзяцей ў Беларусі

Зараз у Беларусі жыве больш як 1 785 387 дзяцей. Пры гэтым за апошнія 15 гадоў значна скарацілася колькасць дзіцячага насельніцтва, у прыватнасці з 2003-га па 2009 год — на 300 тысяч.

Функцыі абароны правоў і інтарэсаў дзіцяці ў Беларусі ажыццяўляюць органы апекі і папячыцельства мясцовых выканкамаў і адміністрацый,

сектары аховы дзяцінства ў аддзелах адукацыі, камісіі па правах непаўналетніх. У краіне таксама працуе Нацыянальная камісія па правах дзіцяці і яе прыёмныя ў рэгіёнах, дзе разглядаюць вусныя і пісьмовыя паведамленні грамадзян, у тым ліку дзяцей, па сацыяльна-педагагічных пытаннях. Разам з тым у краіне з боку дзяржаўных органаў адсутнічае сацыяльная замова на супрацоўніцтва з грамадскімі арганізацыямі ў сферы выканання пэўных праграм па падтрымцы сям'і і вырашэнні праблем дзяцей, абароне іх правоў.

Сур'ёзнай праблемай для краіны з'яўляецца сацыяльнае сіроцтва: агульная колькасць дзяцей, якія выхоўваюцца ў дзяржаўных інтэрнатных установах, у 2008 годзе склала 22 467 чалавек, пры гэтым колькасць дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў і якія знаходзяцца на поўным дзяржаўным забеспячэнні ў дзіцячых інтэрнатных установах, у 2009 годзе склала 8 924 дзіцяці. У Беларусі функцыянуюць 135 дзіцячых інтэрнатных устаноў, у тым ліку 10 дамоў дзіцяці для дзяцей да трох гадоў.

Беларусь займае адно з першых месцаў у Еўропе па колькасці дзяцей, якія ўтрымліваюцца ў выпраўленчых установах. Агульная колькасць непаўналетніх, якія знаходзяцца ва ўсіх тыпах выпраўленчых і адукацыйных устаноў закрытага тыпу, па даных на канец 2008 года, склала 1 156 чалавек. Станоўчым момантам з'яўляецца тэндэнцыя скарачэння гэтага паказальніка з кожным годам, паўналетнім усё больш выносяцца прысуды, не звязаныя з пазбаўленнем волі. Аднак да гэтага часу ў краіне не атрымалі належнага распаўсюду аднаўленчыя падыходы адносна дзяцей, якія апынуліся ў канфлікце з законам, паколькі не зацверджана канцэпцыя ювенальнай юстыцыі, якая б садзейнічала нарматыўнаму інтэграванню міжнародных стандартаў у беларускае заканадаўства.

---

27. Рэспубліка Беларусь ратыфікавала Канвенцыю аб правах дзіцяці 28 ліпеня 1990 года. Канвенцыя ўступіла ў сілу для Беларусі з 21 кастрычніка 1990 года.



# ТАК БЫ ХАЦЕЛАСЯ ПАГАВАРЫЦЬ З КІМ-НЕБУДЗЬ ПРА ГЭТА

## Тэма:

Права на абарону ад насмешак і гвалту.

## Мэта:

Удзельнікі павінны высветліць прычыны і наступствы насмешак і высмейванняў. Адчуць сябе на месцы пацярпелых і пераканацца ў тым, што чалавек, які стаў сведкам гвалту, можа паўплываць на сітуацыю.

Усе дзеці і маладыя людзі ведаюць, што такое насмешкі. Многія могуць распавесці гісторыі, дзе аб'ектамі насмешак былі або яны самі, або іншыя людзі. Насмешкі могуць быць як адкрытымі, так і «закрытымі». Адкрытыя насмешкі — гэта дражнілкі, штурханне, збіццё, адбіранне рэчаў, напады, пагрозы, абзыванне грубымі словамі. «Закрытыя» насмешкі — гэта распаўсюд чутак пра таго ці іншага чалавека. Часта насмешкі прывязаны да рэлігіі, колеру скуры, культурнай прыналежнасці, сэксуальнай арыентацыі ці асаблівых патрэб або звычак чалавека. Як адкрытыя, так і «закрытыя» насмешкі — акты фізічнай і/ці псіхічнай знявагі чалавека — могуць глыбока раніць і пакінуць у душы чалавека след на доўгія гады.

## Практычная рэалізацыя:

Дадзенае практыкаванне — ролевая гульня з наступнай дыскусіяй. Ролевая гульня павінна адпавядаць групе і сітуацыі, у якой яна будзе выкарыстана. Пры арганізацыі гульні і раздачы сцэнак-заданняў вядучы павінен памятаць аб тым, што ў дзяцей можа быць уласны вопыт з высмейваннем.

**Час:** 60 хвілін.
**Што неабходна?** Прасторнае памяшканне, копіі сцэнак для кожнай групы, копіі схем «гісторыі з рэчаіснасці».

## Парадак выканання:

1. Перш чым удзельнікі пачнуць рыхтаваць свае сцэнкі, важна, каб яны ведалі, што такое насмешкі, што яны могуць мець месца ў школе, у секцыях і клубах, на працоўным месцы і г.д. Пажадана таму спачатку спытаць удзельнікаў, як яны разумеюць насмешкі. Затым удзельнікі дзяляцца на 3 групы, і кожная атрымлівае кароткую сцэнку. (15 хвілін)
2. Кожная група паказвае сваю сцэнку. Не трэба іх каментаваць, пакуль усе не прадэманструюць свае сцэнкі. Каментары і наступная дыскусія могуць будавацца на адказах на наступныя пытанні:
   - Адкуль вы бралі ідэі для паказу сцэнкі: з гісторый, фільмаў аб насмешках або з сапраўднага жыцця?

- Сцэнка 1: ці былі выказаны канструктыўныя прапановы ў першай сцэнцы? Ці было сказана штосьці, што толькі пагоршыла сітуацыю?
- Сцэнка 2: ці лёгка было размаўляць шчыра з сябрам, які сам кпіць? Увогуле, якія метады могуць мець станоўчы эфект, а якія — негатыўны?
- Сцэнка 3: ці лёгка было размаўляць шчыра з сябрам, з якога смяюцца і жартуюць? Які ёсць выхад для таго, з каго смяюцца?

3. Пасля дадзенай дыскусіі вядучы просіць траіх удзельнікаў пераказаць тры рэальныя гісторыі (гл. ніжэй). Спытайце пра адчуванні, меркаванні і абмяркуйце прычыны насмешак і шляхі вырашэння дадзенай праблемы.

### Абмеркаванне:

- Як вы думаеце, што адчувае чалавек, калі з яго/яе смяюцца і жартуюць?
- Ці вінаваты сам(а) той/тая, з каго смяюцца і жартуюць?
- Ці спрабуюць «жартаўнікі» даказаць нешта самі, калі смяюцца і жартуюць з іншых?
- Ці з'яўляюцца насмешкі і высмейванне гвалтам?
- Ці магчыма высмейваць, не жадаючы таго?
- Ці маюць насмешкі і высмейванне адносіны да дэманстрацыі сілы/улады?
- Ці можна пазбегнуць насмешак і высмейвання?
- Ці ёсць у вас сябар/сяброўка, з якога(ой) смяюцца і жартуюць? Ці павінны вы распавесці пра гэта даросламу чалавеку, хаця ваш(а) сябар/сяброўка папрасіў(ла) вас нікому не распавядаць?
- Якія самыя звычайныя прычыны, за якія высмейваюцца іншыя людзі?
- Хто адказны і хто можа вырашыць праблему высмейвання і насмешак?

### Возьмем пад ўвагу:

Насмешкі і высмейванне іншых людзей з'яўляюцца непавагай да годнасці чалавека. Насмешак немагчыма пазбегнуць, але можна папярэдзіць у некаторай ступені, калі казаць адкрыта пра гэту праблему, не закрываць на яе вочы, рэагаваць на яе. Насмешкі і высмейванне — гэта парушэнне Артыкула 1 Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, якая заклікае нас ставіцца адзін да аднаго ў духу братэрства.

### Далейшая праца:

- Калі група творчая, удзельнікам можна прапанаваць напісаць сваю ўласную п'есу і паказаць яе іншым.
- Члены групы таксама могуць арганізаваць дэбаты па тэме «Насмешкі ў школе».
- Можна арганізаваць групу падтрымкі пацярпелым ад насмешак і высмейвання ў школе.

## Сцэнкі для ролевай гульні

**Сцэнка 1:**
Вучань звяртаецца да дарослага ў школе (настаўніка ці іншай аўтарытэтнай асобы) і спрабуе сказаць, што яго аднакласніка высмейваюць. Настаўнік — чалавек кансерватыўных поглядаў. Ён першапачаткова не вельмі верыць у разважнасць вучняў. Класны кіраўнік таксама не хоча брацца за гэту справу. Іншыя настаўнікі не лічаць падобнае праблемай і не прызнаюць факта насмешак або высмейвання вучня наогул. Рэагуе толькі школьная медсястра і ўспрымае справу сур'ёзна, але ў яе так шмат іншай працы, што няма часу і сіл заняцца гэтай праблемай.

**Сцэнка 2:**
Група вучняў спрабуе «пагаварыць» з вучаніцай, якая высмейвае навучэнку малодшых класаў.

**Сцэнка 3:**
Група пяцікласнікаў абмяркоўвае сітуацыю іх сябра, з якога кпяць старшакласнікі. Яны вельмі хочуць дапамагчы яму і абмяркоўваюць, якім чынам яны могуць гэта зрабіць.

## Рэальныя гісторыі

**Гісторыя 1:**

*Мне 14 гадоў, і з мяне пастаянна смяюцца. Амаль на кожным уроку я сяджу адзін, паколькі ніхто не хоча сядзець побач са мной. Адзін з нешматлікіх маіх сяброў амаль увесь свой час праводзіць з іншымі, бо баіцца, што калі будзе са мной, будуць смяяцца і з яго таксама. Калі ласка, дапамажыце мне. Мне вельмі страшна, і часам я падумваю скончыць са сваім жыццём. Хацелася б памерці. Я быў у лекара.*

Майк

**Гісторыя 2:**

*Я хаджу ў сярэднюю школу, і з мяне смяюцца ўжо пяты год запар. Мне ніколі б і ў галаву не прыйшло пакрыўдзіць іншых людзей, але ад адчаю я таксама пачала высмейваць іншых. Я б вельмі хацела пагаварыць з кім-небудзь, калі з мяне смяяліся, але мне было вельмі сорамна тады. Я адчувала сябе вінаватай ва ўсім, дурной, нуднай і выродлівай. Я адчуваю, што гэтыя мае пачуцці яшчэ са мной.*

Анне

**Гісторыя 3:**

*У нас у школе ёсць некаторыя «насмешнікі», якія высмейваюць аднаго са знаёмых мне вучняў. Мне вельмі шкада яго. Ён нікому не кажа пра гэта. «Насмешнікі» забіраюць таксама ў яго і грошы. Ён заўсёды плача. Адзін раз яны забралі яго акуляры, зламалі іх і спусцілі ў прыбіральню. Што я магу зрабіць, каб спыніць гэта? Я не хачу быць такой, як гэтыя «насмешнікі».*

Катрынэ

## Варыяцыя 1:

Вядучы распавядае эпізод са свайго дзяцінства, дзе фігуруюць насмешкі ці жарты. Удзельнікі бяруць інтэрв'ю ў сваіх сваякоў аб дзяцінстве, насмешках, бойках.

## Варыяцыя 2:

Удзельнікі могуць знайсці інфармацыю ў Інтэрнэце аб высмейванні настаўнікаў у школе. Ці былі яны сведкамі чаго-небудзь падобнага? Як можна вырашыць такую праблему?



# ПРАВЫ ЖАНЧЫН

## Тэма:

Правы жанчын.

## Мэта:

Удзельнікі павінны зразумець прычыны вылучэння правоў: дыскрымінацыя жанчын шырока распаўсюджана, таму жанчынам патрабуецца асаблівая абарона.

Нягледзячы на тое, што ўсе людзі — і жанчыны, і мужчыны — валодаюць чалавечай годнасцю, жанчын часта называюць слабым полам. Хаця жанчыны ў большасці сваёй фізічна слабейшыя за мужчын, несправядліва, калі ў жыцці яны маюць менш магчымасцяў, чым мужчыны. Але, на жаль, часта бывае менавіта так. Калі апісваць рэальнасць, то можна сказаць, што жанчыны падвяргаюцца сістэматычнаму няроўнаму абыходжанню і дыскрымінацыі. Гэта адносіцца да ўсіх краін свету. Жанчыны складаюць 70 % самага беднага насельніцтва свету і распараджаюцца ўсяго 1 % маёмасці ў свеце. Яны складаюць 65 % ад агульнай колькасці непісьменных у свеце і маюць меней за 10 % ад агульных прыбыткаў у свеце. Нават у сучасным дэмакратычным грамадстве, такім як нарвежскае, жанчыны атрымліваюць меншы заробак, чым мужчыны, і займаюць значна менш кіруючых пасад у бізнэсе і ў дзяржаўным кіраванні. Жанчыны ў асноўным з'яўляюцца ахвярамі гвалту ў сям'і. Нягледзячы на дыскрымінацыю і няроўнае абыходжанне, гісторыя змагання за правы жанчын за апошнія сто гадоў паказвае, што ёсць сэнс змагацца. Жанчыны ва ўсім свеце ніколі не мелі большай абароны сваіх правоў, чым сёння.

## Практычная рэалізацыя:

Удзельнікі працуюць у групах, затым абмяркоўваюцца вынікі групавой працы і даецца заключны даклад.

**Час:** 45—90 хвілін.
**Што неабходна?** Ручкі і папера, вялікія лісты, па асобніку Канвенцыі ААН аб правах жанчын на кожнага.
**Падрыхтоўка:** Даклад аб правах жанчын.

## Парадак выканання:

1. Кіраўнік дзеліць удзельнікаў на невялікія групы, якія павінны знайсці прыклады таго, што правы дзяўчын/жанчын ушчэмлены. Прыклады можна браць з гісторыі або сучаснасці. Прыклады могуць быць сведчаннямі ці таго, што жанчыны ўвогуле ўшчэмлены ў правах, ці



Жанчыны збіраюць лён на калгасным полі. Гродненская вобласць, верасень 2006 г.

таго, як асобныя групы дзяўчын/жанчын (інваліды, уцякачкі, дзяўчаты-салдаты, прастытуткі і інш.) ушчэмлены ў сваіх правах больш, чым іншыя. Прыклады запісваюцца. (20—30 хвілін)

2. Групы робяць прэзентацыі на агульным абмеркаванні. Кіраўнік актыўна сочыць за прэзентацыямі і просіць групы крыху распавесці пра прычыны, з-за якіх дзяўчыны/жанчыны маюць праблемы. Ці ёсць у групы нейкія думкі аб тым, што можна зрабіць, каб палепшыць сітуацыю? (10 хвілін)
3. Кіраўнік робіць даклад аб правах жанчын з акцэнтам на тое, што абарона правоў жанчын становіцца ўсё лепш. (15 хвілін)

### Возьмем пад ўвагу:

Сёння ў многіх краінах свету дзяўчыны і жанчыны маюць тыя ж магчымасці, што мужчыны ў шмат якіх сферах. Але хаця сітуацыя многіх жанчын ніколі не была такой добрай, як зараз, агульная карціна паказвае, што правы жанчын усё яшчэ сістэматычна «адсоўваюць» убок. Грамадства сфарміравала структуры ўлады, якія ўзначальваюцца мужчынамі, і ў большасці краін мы можам бачыць традыцыі, якія дыскрымінуюць жанчын. Стэрэатыпы працягваюць дамінаваць. Горш за ўсё справа ў краінах, якія развіваюцца. Аднак ход развіцця правоў жанчын паказвае, што мае сэнс змагацца за станоўчыя змены. Ніколі так шмат дзяўчынак не наведвала школу, ніколі так шмат жанчын не займалася працай, якая аплачваецца, ніколі не было так шмат жанчын-палітыкаў, і ніколі так шмат жанчын не мела і не выкарыстоўвала выбарчае права. Трэба працягваць змагацца за раўнапраўе жанчын.

### Важныя дакументы аб правах жанчын:

1789 г. Дэкларацыя правоў жанчыны і грамадзянкі (Алімпія дэ Гуж).
1953 г. Канвенцыя ААН аб палітычных правах жанчын[28].
1967 г. Дэкларацыя аб ліквідацыі дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын.
1979 г. Канвенцыя ААН аб ліквідацыі ўсіх форм дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын[29].

## ФАКТЫ АБ ДЗЯЎЧАТАХ І ЖАНЧЫНАХ

*У апошнія дзесяцігоддзі сітуацыя дзяўчат і жанчын ва ўсім свеце палепшылася ў многіх сферах. Больш дзяўчат мае магчымасць вучыцца і атрымліваюць адукацыю, жанчыны атрымалі выбарчае права амаль ва ўсіх краінах і ў большай ступені ўдзельнічаюць у палітычным жыцці. Нягледзячы на станоўчыя тэндэнцыі развіцця, лічбы адназначна кажуць аб тым, што ўсё яшчэ захоўваецца шэраг сур'ёзных праблем:*

- *Больш за мільярд чалавек жыве сёння ў беднаце. Пераважную большасць з іх складаюць жанчыны.*
- *Жанчыны складаюць толькі 16 % членаў парламентаў ва ўсім свеце. Жанчыны таксама рэдка прадстаўлены і на іншых адказных пасадах.*
- *Штогод некалькі мільёнаў жанчын ва ўсім свеце становяцца ахвярамі гандлю людзьмі ў глабальнай сэкс-індустрыі.*
- *80 % уцекачоў свету і ўнутраных перасяленцаў — жанчыны. Яны ў большай ступені падвяргаюцца гвалту і прыгнёту, хваробам і голаду.*
- *Кожную хвіліну памірае адна жанчына ў сувязі з цяжкай цяжарнасцю, абортам ці пры родах. Штогод гэта лічба складае каля 530 000 смерцяў, чаго можна пазбегнуць, забяспечыўшы жанчынам доступ да якасных медыцынскіх паслуг.*

(Па матэрыялах сайта www.fokuskvinner.no на 5 лютага 2007 г.)
(Крыніца: UNIFEM, UNFPA і UNESCO, 2005)

28 Канвенцыя была ратыфікавана Беларуссю 5 чэрвеня 1954 года, уступіла ў сілу 9 лістапада 1954 года.

29 Канвенцыя была ратыфікавана Беларуссю 22 снежня 1980 года, уступіла ў сілу 3 верасня 1981 года. 30 кастрычніка 2003 года Рэспубліка Беларусь ратыфікавала Факультатыўны пратакол да Канвенцыі, прызнаўшы права падаваць індывідуальныя паведамленні (скаргі) у Камітэт па ліквідацыі дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын. Пратакол уступіў у сілу 3 мая 2004 года.

# ЖАНОЦКАСЦЬ І МУЖЧЫНСКАСЦЬ

**Тэма:**

Раўнапраўе.

**Мэта:**

Навучэнцы павінны зразумець, што нашы ўяўленні пра «жаночы» і «мужчынскі» характары з'яўляюцца ў большай ступені стэрэатыпамі.

Магчыма, мужчыны і жанчыны маюць больш падабенстваў, чым мы думаем?

**Практычная рэалізацыя:**

Удзельнікі пачынаюць выкананне практыкавання ў парах. Практыкаванне заканчваецца агульнай дыскусіяй.

**Час:** 20—30 хвілін.

**Парадак выканання:**

1. Удзельнікі ў парах распавядаюць адзін аднаму пра тое, што яны лічаць характэрным для іх полу. (5 хвілін)
2. Цяпер кожны можа распавесці ўсім, пра што яны пагадзіліся ў парнай гутарцы. Іншыя ўдзельнікі могуць каментаваць і задаваць пытанні. Кіраўнік павінен імкнуцца не пускацца ў глыбокія дыскусіі пра якія-небудзь асобныя інтарэсы ці рысы.
3. Пасля таго, як усе больш-менш выказаліся, кіраўнік адкрывае агульную дыскусію: ці магчыма з дакладнасцю на 100 % сказаць, што для аднаго полу характэрны адны інтарэсы і рысы, а для другога — іншыя, ці яны ўсё ж перакрыжоўваюцца? Ці паказвае гэта, што абодва полы больш падобныя, чым мы думаем?

**Возьмем пад ўвагу:**

Усе людзі розныя. Не існуе ні абсалютна аднолькавых мужчын, ні абсалютна аднолькавых жанчын. Таму стэрэатыпы аб тым, што прадстаўнікі аднаго полу, хутчэй за ўсё, падобныя адзін на аднаго — памылковыя. Многія дзяўчынкі далёка не заўсёды любяць гуляць у лялькі, а аддаюць перавагу футболу або лажанню па дрэвах. Многія мужчыны, напрыклад, лічаць нудным заняткам глядзець футбол па тэлевізары і аддаюць перавагу ўтульнаму ўладкаванню на канапе і рукадзеллю.



# САЦЫЯЛЬНЫ ПОЛ

**Тэма:**

Раўнапраўе.

**Мэта:**

Навучэнцы павінны атрымаць уяўленне аб тым, што такое сацыяльны пол.

У тую хвіліну, калі біялагічны пол чалавека становіцца вядомым, ці ва ўлонні маці, ці пры нараджэнні, да яго аўтаматычна «прад'яўляюцца» пэўныя чаканні, і з гэтага моманту ўсе, хто акружае, пачынаюць фарміраваць у чалавека сацыяльны пол. Калі нараджаецца дзяўчынка, ёй дораць у асноўным адзенне ружовых тонаў; калі хлопчык — блакітных. Рэчы ў падарунак — мабыць, першая прыкмета таго, як успрымаецца пол і свет навокал прадстаўнікамі розных палоў. З часам дзеці разумеюць, што кожны дзень, на працягу ўсяго жыцця да іх «прымацаваны» тыя або іншыя чаканні, вызначаныя як характэрныя для іх біялагічнага полу.

«Гэта падарунак хлопчыку ці дзяўчынцы?» — мы часта чуем у краме. Прадаўцы не пытаюцца звычайна пра інтарэсы дзіцяці. «Сацыяльны пол» уплывае на жыццё людзей, склад іх думак, дзеянняў і самаадчуванне. Тое, як мы, мужчыны або жанчыны, паводзім сябе, апранаемся, размаўляем, смяемся, мае, у вялікай ступені, свой пачатак у культуры. «Сацыяльны пол» з'яўляецца, магчыма, самай важнай часткай сацыяльнай арганізацыі ў грамадстве і перадаецца з пакалення ў пакаленне. Ён таксама ўстанаўлівае межы і таму можа мець негатыўную ролю. Там, дзе «сацыяльны пол» прыводзіць да дыскрымінацыі, неабходна з ім змагацца. Як у старыя часы, так і ў нашым сучасным свеце, «сацыяльны пол» прыводзіць да дыскрымінацыі як жанчын, так і мужчын.

**Азначэнне:**

«Сацыяльны пол» — вынік прыналежнасці да пэўнай культуры, традыцый і стэрэатыпаў. Яго можна вызначыць як «чаканні, якія існуюць у грамадстве ў адносінах да прадстаўніка таго або іншага біялагічнага полу».

«Жанчынай не нараджаюцца, жанчынай становяцца».

Сімона дэ Бавуар

**Практычная рэалізацыя:**

Практыкаванне пачынаецца з самастойнай працы (10 хвілін), перш чым пачнецца агульная дыскусія. Важна, каб былі спакойная і расслабленая абстаноўка падчас выканання дадзенага практыкавання, мэта якога —

паказаць, наколькі важны «сацыяльны пол» у нашым жыцці. Непажадана, каб практыкаванне ператварылася ў высвятленне, каму складаней у гэтым жыцці: мужчынам ці жанчынам. Дыскрымінацыя і ўшчамленне ў правах аднолькава раняць абодва полы. Паспрабуйце таксама не ствараць іерархіі відаў дыскрымінацыі і паважаць меркаванні прадстаўнікоў абодвух палоў.

**Час:** 1—3 гадзіны.
**Што неабходна?** Ліст паперы для кожнага ўдзельніка.

## Парадак выканання:

1. Вядучы распавядае пра розніцу паміж біялагічным і сацыяльным полам. (10 хвілін)
2. Вядучы просіць удзельнікаў зручна размясціцца на крэслах, разняволіцца і закрыць вочы, калі яны хочуць. Затым вядучы прапануе ўявіць наступную сітуацыю: «Аднойчы вы прачынаецеся і выяўляеце, што належыце да іншага біялагічнага полу. Усё вакол вас такое ж, як і заўсёды, і жыццё ваша такое ж, толькі пол іншы».
   - Напішыце пяць рэчаў, якія змяніліся б у вашым жыцці.
   - Падумайце, якой будзе рэакцыя вашых блізкіх, сяброў, калег.
   - Ці зменіцца ваша месца ў грамадстве?
   - Знайдзіце слова або апісанне таго, як вы сябе адчувалі, выконваючы дадзенае заданне. (10 хвілін)

   Удзельнікі не павінны размаўляць паміж сабой, пакуль выконваюць практыкаванне.
3. Калі ўдзельнікі гатовы, вядучы пытаецца спачатку прадстаўнікоў мужчынскага полу (якія ўявілі сабе, як гэта — быць дзяўчынкай/жанчынай) пра тое, як бы змянілася іх жыццё і як яны адказалі на пытанні. Памятайце! Не трэба каментаваць або задаваць пытанні падчас прэзентацый удзельнікамі свайго бачання. Важна таксама, каб спачатку выказаліся ўсе прадстаўнікі мужчынскага полу, перш чым пачнуць выказвацца прадстаўнікі жаночага. Паспрабуйце стварыць спакойную атмасферу і паважаць усе выступы ўдзельнікаў. Важна таксама прадставіць удзельнікам дастаткова часу для выступаў. (10 хвілін ці больш у залежнасці ад колькасці ўдзельнікаў)

## Абмеркаванне:

- Што вы думаеце пра дадзенае практыкаванне?
- Ці было што-небудзь, што ўразіла вас? Ці прыйшлі вам у галаву якія-небудзь новыя ідэі?
- Якім чынам уплывае «сацыяльны пол» на наша жыццё?
- Ці ёсць у вас якія-небудзь каментары да выказванняў прадстаўнікоў мужчынскага полу з нагоды іх прэзентацый «Як гэта — быць дзяўчынкай/жанчынай?»?



- Ці ёсць у вас якія-небудзь каментары да выказванняў прадстаўнікоў жаночага полу з нагоды іх прэзентацый «Як гэта — быць хлопчыкам/мужчынам?»?
- Якім чынам «сацыяльны пол» можа служыць абгрунтаваннем для дыскрымінацыі мужчын?
- Якім чынам «сацыяльны пол» можа служыць абгрунтаваннем для дыскрымінацыі жанчын?

## Возьмем пад ўвагу:

Наш «сацыяльны пол», у адрозненне ад біялагічнага, вызначаецца нашай культурай, перадаецца з пакалення ў пакаленне і рэалізуецца праз сацыялізацыю ў грамадстве, традыцыі і стэрэатыпнае мысленне аб тым, якімі «павінны» быць жанчыны, якімі — мужчыны. Паколькі «сацыяльны пол» існуе на многіх «узроўнях» у грамадстве і мае свой пачатак далёка ў мінулым, «дзейнічае» ў сучаснасці і пераносіцца на будучыню, яго даволі цяжка змяніць. Аднак змяніць яго магчыма, што даказвае працэс эмансіпацыі жанчын. У сілу таго, што «сацыяльны пол» уяўляе сабой даволі цвёрдыя абмежавальныя рамкі, гэта можа прывесці да дыскрымінацыі асобных людзей, што часта можна назіраць у нашым паўсядзённым жыцці.

## Варыяцыя 1:

Удзельнікі дзяліцца на групы, атрымліваюць газеты і часопісы і заданне: прааналізаваць, якім чынам «мужчынскасць» адлюстроўваецца на рэкламных плакатах, а якім чынам — «жаноцкасць»; выразаць некалькі рэклам і параўнаць іх. Нешта ёсць у іх агульнае?

1. Ці ёсць розніца ў манеры трымацца, у паказе цела мужчыны і жанчыны? Калі яны стаяць, сядзяць, ляжаць?
2. Ці ёсць розніца ў тым, як яны трымаюць галаву, як намаляваны іх вусны і вочы? Які выраз твару?
3. Якім чынам яны апранутыя?
4. Якія адносіны паміж мужчынам і жанчынай, як «паказана» ў рэкламе?
5. Якім чынам яны выкарыстаны ў адносінах да таго прадукта, які рэкламуецца?

Кожная з груп працуе над адным з дадзеных пытанняў (15 хвілін) і прадстаўляе вынікі сваёй працы аўдыторыі.




### Варыяцыя 2:

Вядучы тлумачыць розніцу паміж біялагічным і «сацыяльным» полам: «Давайце паразважаем крыху пра наша жыццё. Разняволімся, супакоімся і ўзгадаем:

- Якіх колераў у нас было адзенне ў дзяцінстве?
- На дні нараджэння мы атрымлівалі падарункі. Ці мелі яны якія-небудзь адносіны да нашага полу?
- Мы раслі. У нас з'яўляліся сябры. Сярод іх больш хлопчыкаў ці дзяўчынак? Чаму?
- Якую адукацыю і прафесію я бачу для сябе? Ці ўплывае мой біялагічны пол і «сацыяльны» пол на выбар адукацыі і прафесіі?
- Калі мы пачынаем думаць пра сябе і ацэньваць навакольны свет менавіта з пункту гледжання нашага полу? Чаму?



## ХАТНІ ГВАЛТ

### Тэма:

Правы жанчын.

### Мэта:

Удзельнікі павінны атрымаць уяўленне пра праблему, якая вельмі распаўсюджана, але рэдка абмяркоўваецца, — хатні гвалт.

Гвалт над жанчынамі менш за ўсё адбываецца «на публіцы», г. зн. у грамадскім жыцці. Часцей за ўсё гэта здараецца дома, у чатырох сценах, і паміж людзьмі, якія добра ведаюць адзін аднаго. Самы распаўсюджаны від хатняга гвалту — гэта фізічнае ўжыванне сілы. Гісторыі, выкарыстаныя ў дадзеным практыкаванні, заснаваныя на рэальных падзеях.

«Гвалт над жанчынамі, верагодна, самае сур'ёзнае парушэнне правоў чалавека. Пакуль гэта праблема застаецца, мы не можам сказаць, што мы прасунуліся наперад у тым, што датычыць раўнапраўя, развіцця і міру».

Кофі Анан, былы Генеральны сакратар ААН

### Практычная рэалізацыя:

Практыкаванне заснавана на працы ў групах з наступнай агульнай дыскусіяй. Памятайце, што хатні гвалт — вельмі распаўсюджаная праблема і што хтосьці з удзельнікаў, магчыма, зведаў яго. Дайце зразумець, што ніхто не абавязаны распавядаць больш, чым ён таго хоча. Прадстаўнікі мужчынскага полу маюць звычай неадэкватна рэагаваць на некаторыя моманты ў правядзенні практыкавання, таму тут асабліва важнай з'яўляецца карэктная і ўважлівая пазіцыя настаўніка.

**Час:** 1,5—2 гадзіны.

**Што неабходна?** Вялікія лісты паперы, маркеры, копіі аднаго ці некалькіх гісторый відавочцаў (гл. ніжэй), копіі кожнай групе «Кіраўніцтва для агульнага абмеркавання».

**Падрыхтоўка:** Копіі гісторый відавочцаў, копіі «Кіраўніцтва для агульнага абмеркавання».

### Парадак выканання:

1. Апытайце вучняў: што, па іх меркаванні, маецца на ўвазе пад «хатнім гвалтам»? Адказы запісваюцца на дошцы або на паперы. Важна не каментаваць і не задаваць пытанняў на гэтым этапе. Затым кіраўнік

знаёміць дзяцей з агульнапрынятым юрыдычным азначэннем (гл. ніжэй азначэнне ААН). (10 хвілін)
2. Вядучы дзеліць удзельнікаў на групы. Мінімальная колькасць груп — тры. Раздайце копіі гісторый відавочцаў, якія групы могуць выкарыстоўваць як зыходны пункт для абмеркавання. Гісторыі відавочцаў — тры розныя, але тыя ж самыя гісторыі могуць давацца і розным групам. Раздайце таксама копіі «Кіраўніцтва для агульнага абмеркавання» кожнай групе. Ніхто не павінен адчуваць сябе абавязаным казаць больш, чым ён сказаў.
3. Праца ў групах пачынаецца са знаёмства з тэкстамі гісторый відавочцаў і працягваецца абмеркаваннем у групе. Абмеркаванне павінна адбывацца паводле «Кіраўніцтва для агульнага абмеркавання». (1 гадзіна)
4. Выкананне практыкавання працягваецца агульным абмеркаваннем.

### Абмеркаванне:

- Як праходзіла праца ў групах? Ці былі гісторыі відавочцаў праўдападобнымі? Былі пытанні па тэме ці не? Калі групы «працуюць» з рознымі гісторыямі відавочцаў, папрасіце іх сказаць сваё меркаванне аб гісторыях. Пасля вы можаце вызначыць, адпавядаюць яны рэчаіснасці ці не.
- Хатні гвалт — гэта звычайная праблема ў вашым горадзе/раёне/краіне?
- Якія правы чалавека закранае хатні гвалт?
- Чаму ў большасці выпадкаў мужчыны з'яўляюцца «крыніцамі» гвалту над жанчынамі, а не наадварот?
- Як могуць змагацца з праблемай хатняга гвалту:
  а) цэнтральныя ўлады;
  б) мясцовыя ўлады;
  у) людзі, якія выпрабавалі на сабе хатні гвалт;
  г) сябры, суседзі.
- Параўнайце вынікі працы групы з пунктамі, запісанымі ў пачатку выканання практыкавання. Ці былі названы хатні гвалт? Калі не, то чаму?
- Якія іншыя формы гвалту над жанчынамі ўзгадваліся падчас дыскусіі? Запішыце і іх.

### Возьмем пад ўвагу:

Гвалт над жанчынамі — адна з самых распаўсюджаных праблем у сучасным свеце. Па прычыне таго, што звычайна ён здараецца дома, у чатырох сценах, складана дакладна сказаць, наколькі дадзеная праблема распаўсюджана. Статыстычныя дадзеныя паказваюць усё ж, што кожная чацвёртая жанчына ў свеце падвяргаецца хатняму гвалту. Часта хатні гвалт разглядаецца як унутраная справа сям'і. Аднак, паводле Канвенцыі ААН аб ліквідацыі ўсіх форм дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын 1979 года, хатні гвалт павінен разглядацца як парушэнне правоў чалавека, і таму ў крымінальныя кодэксы ўсіх краін павінны быць унесены адпаведныя артыкулы, што кваліфікуюць хатні гвалт як злачынства.

У Беларусі Крымінальны кодэкс не ўтрымлівае такога паняцця, як «гвалт у сям'і», аднак прадугледжваецца пакаранне за акты гвалту над асобай, уключаючы збіццё і прычыненне рознага цяжару шкоды здароўю. Асобнага закона аб гвалце ў сям'і няма, хаця праект закона аб прадухіленні хатняга гвалту быў распрацаваны яшчэ ў 2002 г., але так і не быў разгледжаны.

У апошнія гады праблема гвалту ў сям'і выклікае да сабе павышаную ўвагу з боку праваахоўных органаў і грамадскасці. Цікавасць кампетэнтных органаў да дадзенай праблемы абумоўлена найперш тым, што ахвяры сямейна-бытавых канфліктаў складаюць найбольш шматлікую групу сярод загінуўшых і пацярпелых ад любых злачынстваў. Напрыклад, толькі за першых 9 месяцаў 2007 года ў Беларусі было здзейснена 199 забойстваў менавіта ў сферы сямейна-пабытавых адносінаў. У маштабах рэспублікі ў сярэднім гэта два забойствы ў дзень, калі блізкія людзі забіваюць адзін аднаго з асаблівай жорсткасцю. Нараўне з забойствамі, самагубствам і цялеснымі пашкоджаннямі, наступствамі гвалту ў сям'і могуць быць і розныя псіхічныя расстройствы, часам незваротныя, страта самапавагі ахвярай.

У верасні—лістападзе 2008 года Цэнтр сацыялагічных і палітычных даследаванняў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў рамках Сумеснай нацыянальнай інфармацыйнай кампаніі па процідзеянні хатняму гвалту пад эгідай Прадстаўніцтва ААН у Рэспубліцы Беларусь правёў даследаванне па ацэнцы сітуацыі ў галіне хатняга гвалту ў Рэспубліцы Беларусь, запланаванае ў рамках рэалізацыі Нацыянальнага плана дзеянняў па забеспячэнні гендэрнай роўнасці на 2008—2010 гг. Атрыманыя вынікі даследавання паказалі, што 4 з 5 жанчын Беларусі ва ўзросце 18—60 гадоў падвяргаюцца псіхалагічнаму гвалту ў сям'і, кожная чацвёртая (з рознай частатой) — фізічнаму гвалту, 22,4 % жанчын зазнаюць эканамічны і 13,1 % — сэксуальны гвалт з боку свайго мужа або сталага партнёра. Прычым амаль кожная дзясятая жанчына (8 %) зазнае на сабе і фізічны, і сэксуальны гвалт дома, і кожная дзясятая жанчына (9,5 %) падвяргалася фізічнаму гвалту з боку мужа/партнёра падчас цяжарнасці. Перажыўшы фізічны і сэксуальны гвалт, толькі 6% мужчын і 46,8 % жанчын звяртаюцца за дапамогай.

### Азначэнне ААН паняцця «хатняга гвалту»:

*Канвенцыя ААН аб ліквідацыі ўсіх форм дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын вызначае гвалт над жанчынамі як «любое гвалтоўнае дзеянне, якое выцякае ў фізічнае, сэксуальнае і псіхалагічнае разбурэнне жанчыны, уключаючы пагрозы, прымус і абмежаванне волі, незалежна ад таго, адбываецца гэта ў грамадстве або ў асабістым жыцці». Сюды таксама ўключаны «фізічны, сэксуальны і псіхалагічны гвалт у сям'і, збіццё, фізічны гвалт над жанчынай, згвалтаванне, якія-небудзь традыцыйныя і культурныя абрады, што наносяць шкоду жанчыне, а таксама гвалт, прымус і дамаганне, якое адбываецца на працоўным месцы, па месцах вучобы, прымус жанчын да занятку прастытуцыяй».*

## НЕКАТОРЫЯ ФАКТЫ АБ ГВАЛЦЕ НАД ЖАНЧЫНАМІ

- *19 % праблем са здароўем у жанчын у развітых краінах — следства гвалту з боку мужчын.*
- *Хатні гвалт — адна з асноўных прычын гібелі жанчын у свеце.*
- *5 000 дзяўчат і жанчын гінуць ад рук членаў сваіх сем'яў у так званых «забойствах гонару».*
- *4 мільёны жанчын і дзяўчат у год купляюцца і прадаюцца ва ўсім свеце для прастытуцыі ці рабства.*
- *700 000 жанчын прадаюцца ў сэксуальнае рабства ў Еўропе.*
- *Згвалтаванне — самае схаванае злачынства, і фактычныя лічбы могуць быць у 50 разоў большымі, чым тыя, што вядомыя на сёння. Кожны год каля 9 000 жанчын падвяргаюцца згвалтаванню ў Нарвегіі.*
- *Даследаванні паказваюць, што жанчыны з абмежаванымі магчымасцямі часцей за ўсё становяцца ахвярамі гвалту.*

Крыніцы: www.unifem.org / www.unfpa.org / www.krisesenter.com

**Гісторыя відавочца 1: Эстэр**

У лістападзе 1955 года муж Эстэр прыйшоў дадому п'яны і не знайшоў жонкі з дачкой дома — яны былі ў гасцях у суседзяў. Ён пайшоў да суседзяў і запатрабаваў, каб тыя ішлі дадому. Калі яны прыйшлі, ён, зачыніўшы за сабой дзверы, сказаў дачцэ: «А цяпер я паразмаўляю з мамай». Затым ён выцягнуў сякеру, швабру і нож, пачаў крычаць на жонку і абвінавачваць у тым, што яна не прыгатавала ежу і не зрабіла ніякай працы па дому. Пасля гэтага ён стаў біць сваю жонку па твары кулакамі, вырваў у яе пасму валасоў і штурхаў ботамі. Сарваў затым з яе верхняе адзенне, кінуў на ложак і працягваў збіваць. Усё гэта адбывалася на вачах іх васьмігадовай дачкі. Дачка ўмольвала яго на каленах спыніцца. У выніку ён спыніўся. Ён скінуў жонку Эстэр з ложка і заснуў. У тую ж ноч Эстэр памерла.

**Гісторыя відавочца 2: Каці**

Каці спрабавала пазбавіцца ад свайго жаніха, які пачаў выяўляць гвалтоўныя тэндэнцыі, зняла сабе кватэру ў іншым горадзе. Ён знайшоў яе і там, працягваў тэлефанаваць і надакучаць. Аднойчы ён сустрэў яе каля дому, калі яна вярталася з працы, і запатрабаваў, каб тая вярнулася да яго. Ён «заманіў» яе ў бліжэйшы лес, дзе спрабаваў задушыць сваім швэдрам. На наступны дзень, прыйшоўшы на працу, яна распавяла сваім калегам, што баіцца, што яе былы жаніх можа яе забіць. Праз некалькі дзён яе былы жаніх напіўся і прыйшоў чакаць яе пасля працы. Калі яна выйшла, ён пачаў ужываць да яе сілу. Казаў, што яны разам павінны наведаць яго сваякоў. Па дарозе да сваякоў яны некалькі разоў спыняліся на машыне. З-за пагроз і бачачы, у якім стане ён быў, Каці пагадзілася на сэкс, аднак той быў занадта п'яны. Каці спрабавала растлумачыць, што не хоча больш мець нічога агульнага з ім, што яго вельмі раззлавала. Ён зняў з сябе рамень і задушыў Каці, а цела схаваў у канаве і прыкрыў галінкамі.

**Гісторыя відавочца 3: Сара**

Сара — жанчына, якая жыве ў тваім двары. Яна замужам, і ў яе двое маленькіх дзяцей. Часам яе муж бывае вельмі злосным і б'е яе кулакамі. У апошні час ён нават пачаў біць палкай і рэмнем. Два месяцы таму ён разбіў бутэльку аб яе галаву. Сара хоча ўцячы з дому, але муж пагражае, што заб'е яе. У яе два малалетніх сыны, і пакінуць іх яна не можа. Учора яе даставілі ў бальніцу з пераламаным носам і сінякамі, якія, як яна сказала, яна атрымала, зваліўшыся з прыступак.

### Кіраўніцтва для агульнага абмеркавання

1. Аналіз злачынства:
   - Што вы думаеце аб злачынстве, якое здарылася?
   - Дзе такое можа адбыцца, па вашым меркаванні? Ці можа гэта адбыцца там, дзе вы жывяце?
   - Чаму адбылося дадзенае здарэнне?
   - Ці ёсць нешта, што можа апраўдаць такое здарэнне?
   - Як пацярпелая магла б абараніць сябе?

2. Перанос на сацыяльную рэчаіснасць:
   - Ці ведаеце вы або чулі, каб хто-небудзь зведаў на сабе хатні гвалт?
   - Якія тыпы хатняга гвалту здараюцца ў нашым грамадстве?
   - Куды пацярпелыя могуць звярнуцца за дапамогай?
   - Павінна ўмешвацца паліцыя ў такіх выпадках ці не? Ці будзе ўмяшальніцтва паліцыі з'яўляцца парушэннем права на прыватнае жыццё і прыватную прастору?



- Якая ўлада ёсць у жанчын у такіх выпадках? Якая ўлада — у мужчын?
- Ці ведаеце вы аб выпадках хатняга гвалту, дзе пацярпелым аказаўся мужчына?
- Як можна прадухіліць хатні гвалт?
- Што могуць/павінны зрабіць:
  а) улады;
  б) навакольныя людзі;
  у) пацярпелыя;
  г) сябры і суседзі.

**Працяг працы:**

- Збярыце інфармацыю аб арганізацыях, якія дапамагаюць і працуюць з ахвярамі хатняга гвалту. Высветліце, як ідуць справы з гэтай праблемай там, дзе вы жывяце.
- Кіраўнік можа звярнуцца ў мясцовае аддзяленне міліцыі з тым, каб высветліць яе рэакцыю/дзеянні на паведамленні аб хатнім гвалце, або ў мясцовыя крызісныя цэнтры, або іншыя арганізацыі і запрасіць іх прадстаўнікоў правесці лекцыю па дадзенай праблеме.
- Міжнародная Амністыя праводзіла ў 2005-м і 2006 годзе кампанію, накіраваную на барацьбу супраць гвалту і дыскрымінацыі жанчын у Нарвегіі. Звярніцеся на старонку арганізацыі ў Інтэрнэце, каб даведацца больш пра гэту акцыю.



# МАМА, ТАТА... Я — ГОМАСЭКСУАЛІСТ, АЛЕ МНЕ ЗАНАДТА ЦЯЖКА[30]

**Тэма:**

Правы гомасэксуалістаў.

**Мэта:**

Праінфармаваць аб сітуацыі з гомасэксуалістамі, правы якіх часта парушаюцца ў грамадстве.

На вуліцах можна ўсё часцей і часцей бачыць вясёлых і спакойных гомасэксуалістаў — людзей з горда паднятай галавой. Тое, што сітуацыя з правамі гомасэксуалістаў на сённяшні дзень лепшая, чым раней, з'яўляецца вынікам доўгага змагання за змену стаўлення людзей да дадзенай групы ў нарвежскім грамадстве. Не раней як у 1972 годзе гомасэксуалізм у Нарвегіі лічыўся злачынствам. Сітуацыя сёння хоць і нашмат лепшая, чым раней, многія гомасэксуалісты ўсё ж не рашаюцца «паказвацца» ў грамадстве. Камусьці з іх сорамна, хтосьці баіцца быць асуджаным навакольнымі людзьмі. У грамадстве і ў нашы дні існуе яшчэ шмат стэрэатыпаў у адносінах да людзей нетрадыцыйнай сэксуальнай арыентацыі.

**ФАКТЫ:**

---

*«Большасць гомасэксуалістаў-мусульман лічаць за лепшае не выдаваць сваю сэксуальную арыентацыю. У грамадстве да іх існуе вялікая непрыязнасць. Калі яны і вырашаюцца «выйсці з шафы», то рызыкуюць зведаць адчужанасць і непрыязнасць з боку сваіх сваякоў і калег», — кажа Мансур Саберы (родам з Ірана). («Афтэнпостэн», 2 сакавіка 2006 г.)*

*Хрысціянская група «Да цэласнасці» лічыць гомасэксуалізм грахом і імкнецца дапамагчы гомасэксуалістам, якія «пакутуюць» ад свайго становішча. «Наша дапамога можа прывесці да змены сэксуальнай арыентацыі, — кажа кіраўнік групы Енс Фрэдрык Брэне ў інтэрв'ю газеце «Дагсавісен». — Група «Да цэласнасці» складаецца са святароў і «збавіцеляў душ» з розных царкоўных абшчын і свабодных цэркваў Нарвегіі». (Нарвежскае агенцтва навін, 27 сакавіка 2006 г.)*

*Даследаванне «Быць маладым у Нарвегіі», праведзенае ў 2002 годзе, паказвае, што 21 % маладых людзей-гомасэксуалістаў — этнічных нарвежцаў — спрабавалі скончыць жыццё самагубствам. Колькасць маладых людзей, не этнічных нарвежцаў, складае 36 %.*

---

### Практычная рэалізацыя:

Дадзенае практыкаванне заснавана на дыскусіі. Вядучаму трэба быць асцярожным падчас абмеркавання, паколькі магчыма, што некаторыя ўдзельнікі самі яшчэ не зусім вызначыліся са сваёй сэксуальнай арыентацыяй.

**Час:** 45 хвілін.
**Што неабходна?** Вялікія адрыўныя лісты і маркеры.
**Падрыхтоўка:** Вядучы можа загадзя сабраць некаторую інфармацыю аб гомасэксуалізме.

### Парадак выканання:

1. Вядучы пачынае з таго, што большасць людзей лічыць сэксуальную арыентацыю прыватнай справай. Права на недыскрымінацыю па прычыне сэксуальнай арыентацыі з'яўляецца важным правам чалавека. Яно замацавана ў канстытуцыях многіх еўрапейскіх краін. Сітуацыя ў Нарвегіі, датычная месца гомасэксуалістаў у грамадстве і іх правоў, змянілася з часам у лепшы бок. Тым не менш і ў тэкстах законаў усё яшчэ можна прасачыць няроўнае стаўленне да гомасэксуалістаў, напрыклад, у законах па ўсынаўленні дзяцей. Хаця многія з нас і не гавораць адкрыта аб сваёй сэксуальнасці, ёсць даволі шмат грамадскіх дзеячаў, якія выказваюцца адкрыта і смела.
2. Вядучы дзеліць удзельнікаў на групы. Заданне — успомніць грамадскіх дзеячаў, якія адкрыта кажуць аб сваёй сэксуальнай арыентацыі; не важна, гомасэксуалісты яны, гетэрасэксуалы або трансвестыты. Чаму, як вы думаеце, яны зрабілі выбар казаць аб гэтым адкрыта? (20 хвілін)

### Абмеркаванне:

- Чаму дагэтуль праблемна быць гомасэксуалістам у Нарвегіі? Прыклады.
- Сучасныя культуры. Ці больш цярпімыя яны да гомасэксуалізму, чым традыцыйныя?
- Статыстыка паказвае, што ў асноўным пажылыя людзі менш цярпімыя да гомасэксуалістаў, чым моладзь. Як вы можаце гэта растлумачыць?
- Як вы думаеце, чаму існуе шмат стэрэатыпаў у адносінах да гомасэксуалістаў у рэлігійным асяроддзі, будзь то хрысціянства або іслам?
- Чаму адкрытасць па дадзенай тэме вядзе да большай цярпімасці? Ці маюць ліберальныя каштоўнасці адносіны да ведаў?
- Чаму для маладых людзей-гомасэксуалістаў важна, каб «дарослыя» гомасэксуалісты выступалі і казалі пра гэта? Прыклады.
- Што могуць зрабіць гомасэксуалісты, калі іх правы парушаюцца? Што магу зрабіць я, калі назіраю дыскрымінацыю дадзенай групы людзей?

### Возьмем пад ўвагу:

Многія з нас разглядаюць каханне як самае галоўнае ў жыцці. Меця магчымасць кахаць іншага чалавека — выдатна. Большасць з нас — гетэрасэксуалы, г. зн. мы адчуваем каханне і прыхільнасць да супрацьлеглага полу. Каля 5% людзей — гомасэксуалісты, г. зн. маюць пачуцці кахання і прыхільнасці да людзей «свайго» полу. Гомасэксуалізм — натуральная альтэрнатыва. Дыскрымінацыя на глебе сэксуальнай арыентацыі забароненая, і калі вы сталі сведкай яе, у вас ёсць грамадзянскі абавязак умяшацца/адрэагаваць на такую сітуацыю.

**Ёсць усё яшчэ шмат краін у свеце, заканадаўства якіх забараняе сэксуальныя адносіны паміж людзьмі аднаго полу. Гомасэксуалістам Судана, Саудаўскай Аравіі, Емена, Ірана, Афганістана і Пакістана пагражае сёння смяротнае пакаранне, калі стане вядома аб іх сэксуальнай арыентацыі.**

30. Нарвежскі падлетак напісаў гэта ў сваёй перадсмяротнай запісцы бацькам да таго, як скончыць жыццё самагубствам.

## МОЖНА ЎВАЙСЦІ?

**Тэма:**

Правы ўцекачоў.

**Мэта:**

Удзельнікі павінны даведацца пра сітуацыі, у якіх аказваюцца ўцекачы, і пра іх правы, адчуць салідарнасць з людзьмі, якім прыйшлося пакінуць свае краіны.

Канвенцыя ААН аб статусе ўцекачоў дае наступнае азначэнне паняццю ўцякача: «Чалавек, вымушаны пакінуць сваю краіну па прычыне пераследу па прыкмеце расы, веравызнання, грамадзянства, прыналежнасці да пэўнай сацыяльнай групы або палітычных перакананняў». Чалавек, які атрымаў статус уцекача ў той ці іншай краіне, мае юрыдычна замацаваныя, непарушныя правы, у тым ліку і права на свабоду перамяшчэння і ўз'яднання са сваёй сям'ёй. На сённяшні дзень у свеце налічваецца каля 12 мільёнаў уцекачоў. Многія з іх — жанчыны і дзеці. Каля 24 мільёнаў — «уцекачы ўнутры сваёй краіны» або ўнутрана перамешчаныя асобы. Яны не так моцна абароненыя юрыдычна, як уцекачы, якія атрымалі сховішча ў якой-небудзь іншай краіне[31].

Уцекачы, з'язджайце дадому! Яны з'ехалі б, каб маглі.

**Практычная рэалізацыя:**

Дадзенае практыкаванне пабудавана на ролевай гульні. Вучні дзяляцца на тры групы. Важна, каб кіраўнік ведаў, ці ёсць сярод вучняў уцекачы. Магчыма, ім лепш не прымаць удзелу ў ролевай гульні, паколькі гэта можа выклікаць моцныя эмоцыі. Групам не абавязкова быць аднолькавымі па колькасці ўдзельнікаў. Некаторыя ўдзельнікі могуць быць «назіральнікамі».

**Час:** 60 хвілін.

**Што неабходна?** Папера і ручкі, ролевыя карты, правесці мяжу на падлозе крэйдай або мэбляй.

**Падрыхтоўка:** Зрабіце копіі ролевых карт для кожнага ўдзельніка, падрыхтуйце пакой. Правядзіце лінію-мяжу (крэйдай на падлозе або з дапамогай вяроўкі, працягнутай праз клас). Адзін са сталоў выкарыстоўваецца як стол запісу ў офісе па эміграцыі. Кіраўніку пажадана вывучыць Канвенцыю ААН аб статусе ўцекача і выкарыстоўваць яе пры выкананні практыкавання.



**Парадак выканання:**

1. Практыкаванне пачынаецца з кароткага апытання: што ведаюць удзельнікі пра ўцекачоў? Адказы запісваюцца на стэндзе з адрыўной паперай. Яны спатрэбяцца пазней, падчас агульнага абмеркавання.
2. Вядучы тлумачыць удзельнікам, што дадзенае практыкаванне — гэта ролевая гульня пра групу людзей, якія пакінулі сваю краіну (краіна А), дзе ідзе вайна, і якая знаходзіцца па дарозе ў іншую, мірную краіну (краіна Б).
3. Вядучы зачытвае наступны тэкст:
   *У цёмную, халодную і дажджлівую ноч на мяжу з краінай Б прыбыла вялікая колькасць уцекачоў. Яны ўцякаюць ад вайны ў краіне А і дабраліся да мяжы краіны Б. Яны — галодныя, змерзлыя і стомленыя. У іх няма з сабой ні грошай, ні якіх-небудзь іншых дакументаў, акрамя пашпартоў. Іміграцыйныя афіцэры ў краіне Б «па-рознаму» глядзяць на такую сітуацыю: некаторыя хочуць дазволіць уцекачам перасекчы мяжу, іншыя — не. Уцекачы — зусім у роспачы і спрабуюць выкарыстаць розныя аргументы для таго, каб пераканаць афіцэраў прапусціць іх у краіну Б.*
   Папрасіце «ўцекачоў» і «іміграцыйных афіцэраў» падрыхтавацца «іграць» сваю ролю і растлумачце, якія аргументы яны могуць выкарыстоўваць. Раздайце ўдзельнікам ролевыя карты і дайце 15 хвілін на падрыхтоўку.
4. Ролевая гульня пачынаецца. Кіраўнік па абставінах вырашае, калі трэба спыніць гульню. У сярэднім 10 хвілін дастаткова для дэманстрацыі сцэнкі.
5. Дайце назіральнікам 5 хвілін на падрыхтоўку сваіх высноваў.

**Абмеркаванне:**

- Ці справядліва абышліся з уцекачамі?
- Паводле Арт. 14 Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека і Канвенцыі ААН аб статусе ўцекачоў 1951 года людзі маюць права шукаць сховішча. Ці дамагліся ўцекачы выканання сваіх правоў? Калі не, то чаму?
- Ці павінна дзяржава мець магчымасць не прымаць ці высылаць назад людзей, якія шукаюць сховішча?
- Ці выслалі б вы ўцекачоў, калі б працавалі іміграцыйным афіцэрам? Што, калі б уцекачам пагражаў смяротны прысуд у іх краіне?
- З якімі праблемамі сутыкаюцца ўцекачы ў краіне Б?
- Што магчыма зрабіць, каб вырашыць гэтыя праблемы?
- Што можна зрабіць, каб прадухіліць сітуацыю, калі людзі вымушаны бегчы са сваёй краіны?

**Возьмем пад ўвагу:**

У свеце сёння налічваецца некалькі мільёнаў уцекачоў, якія перажылі канфлікты, войны і асабістыя трагедыі. Многія з іх — змагары за правы чалавека, якія праводзілі актыўную працу ў сферы правоў чалавека ў сваёй уласнай краіне да таго, як ім прыйшлося яе пакінуць. Усе людзі, без выключэння, якія пакінулі свае краіны, знаходзяцца ў складанай сітуацыі. У іх ёсць права на дапамогу і ўважлівае стаўленне з боку ўлад той краіны, дзе яны ў выніку апынуліся.

У 1999 годзе ў Брусэлі былі знойдзены трупы двух афрыканскіх хлопчыкаў у аддзеле для шасі ў самалёце авіякампаніі «Сабена». Калі іх знайшлі, яны ляжалі адзін каля аднаго, адубелыя ад холаду, у самалёце, які накіроўваўся з афрыканскай Гвінеі ў Еўропу. У руцэ аднаго з хлопчыкаў быў знойдзены ліст-зварот да «Вашага правасхадзіцельства і адказных у Еўропе». У лісце была просьба аб дапамозе: «Дапамажыце нам. Мы вельмі пакутуем у Афрыцы. Тут вайна, хваробы і голад. У дзяцей няма магчымасці вучыцца (...) Калі вы бачыце, што мы рызыкавалі нашымі жыццямі, то гэта таму, што мы занадта пакутуем у Афрыцы».

**Ролевая карта ўцекача**

Аргументы і дзеянні ўцекача

Падрыхтуйце аргументы і распрацуйце тактыку дзеянняў. Вы можаце самі вырашаць, паступаць і аргументаваць вам ад усёй групы ці ад сябе асабіста.

Вы можаце выкарыстаць наступныя аргументы ў дадатак да вашых уласных:

- У нас ёсць права шукаць сховішча.
- Нашы дзеці — галодныя. У вас ёсць маральная адказнасць дапамагчы нам.
- Нас заб'юць, калі вы вернеце нас у нашу краіну.
- У нас няма грошай.
- Нам больш няма куды ісці.
- Я працаваў доктарам у маім горадзе.
- Мне патрэбна толькі часовая абарона, датуль, пакуль сітуацыя не палепшыцца ў маёй краіне.
- Іншым уцекачам было дазволена заехаць у краіну.

Да працы над ролевай гульнёй падумайце над наступнымі магчымасцямі:

- Ці вы раздзеліцеся або адлучыцеся ад групы, калі вас папросіць пра гэта іміграцыйны афіцэр?
- Ці пагодзіцеся вы вярнуцца ў сваю краіну, калі вас паспрабуюць туды выслаць?

Вы будзеце іграць ролю «змешанай» групы ўцекачоў. Таму падумайце над складаннем свайго вобраза: узрост, пол, сямейнае становішча, прафесія, багаты/бедны, рэлігійная прыналежнасць, ці ёсць у вас з сабой якія-небудзь рэчы і інш.

**Ролевая карта іміграцыйнага афіцэра**

Аргументы і дзеянні іміграцыйнага афіцэра

Падрыхтуйце аргументы і распрацуйце тактыку дзеянняў. Вы можаце самі вырашаць, паступаць і аргументаваць вам ад усёй групы ці ад сябе асабіста.

Вы можаце выкарыстаць наступныя аргументы ў дадатак да вашых уласных:

- Вы ў цяжкім становішчы: немагчыма адасланць уцекачоў назад.
- У выпадку, калі адашляце ўцекачоў назад, на вашым сумленні будзе іх магчымы арышт, катаванні або смерць.
- У нас ёсць юрыдычны абавязак прыняць уцекачоў.
- У іх няма зусім грошай, і ім, напэўна, запатрабуецца дапамога дзяржавы. А наша краіна — не такая ўжо багатая.
- Ці можаце вы даказаць, што вы «сапраўдныя» ўцекачы, г. зн. што вам пагражае небяспека ў вашай краіне? Можа быць, вы на самой справе проста шукаеце лепшага жыцця?
- Паміж нашымі краінамі існуе ваеннае і эканамічнае супрацоўніцтва. Таму мы не можам прадаставіць вам сховішча.
- Ці ёсць у вас прафесійная падрыхтоўка, неабходная нашай краіне?
- У нашай краіне і так ужо шмат уцекачоў. Нам трэба клапаціцца аб тым, каб «абараняць» сваіх уласных людзей. Вы б лепш паехалі ў багацейшыя краіны.
- Калі мы прымем вас, прыедзе яшчэ больш уцекачоў.
- Вы не валодаеце нашай мовай, вызнаяце іншую рэлігію, ясце іншую ежу. Вы не зможаце таму інтэгравацца ў наша грамадства.
- Вы можаце выклікаць палітычную нестабільнасць у нашай краіне.
- Магчыма, вы на самой справе — тэрарысты або здзейснілі якія-небудзь цяжкія злачынствы ў сябе дома.

Да працы над ролевай гульнёй падумайце над наступнымі магчымасцямі:

- Ці дазволіце вы ўсім уцекачам перасекчы мяжу вашай краіны?
- Ці дазволіце вы толькі некаторым з іх перасекчы мяжу вашай краіны?
- Ці «падзеліце» вы іх на групы па ўзросту, прафесіі, эканамічнаму стану?
- Ці вы зробіце што-небудзь іншае?



**Ролевая карта назіральніка**

Ваша роля — назіраць за гульнёй. У канцы вас папросяць пракаментаваць убачанае і пачутае. Двое ці больш назіральнікаў могуць «працаваць» разам і зрабіць агульныя каментары.

Падчас назірання звярніце ўвагу на наступнае:

- Розныя ролі «ўцекачоў» і «іміграцыйных афіцэраў».
- Аргументы, якія выкарыстоўваюцца імі, і манера выкарыстання аргументаў.
- Будзьце напагатове і рэгіструйце ўсе віды парушэнняў правоў чалавека/правоў уцекачоў.

## Варыяцыі:

- Правядзіце ролевую гульню яшчэ раз, калі ўдзельнікі памяняюцца ролямі. Назіральнікі могуць фіксаваць адрозненні паміж першай і другой гульнямі, асабліва калі ў першы раз уцекачам удалося адстояць большасць сваіх правоў.
- Практыкаванне можна працягнуць увядзеннем ролі прадстаўніка Упраўлення Вярхоўнага камісара ААН па справах уцекачоў, які садзейнічае ўцекачам з краіны А.
- Група можа захацець даведацца больш аб правах уцекачоў. Інфармацыю ў такім разе можна знайсці ў Інтэрнэце на сайце Упраўлення Вярхоўнага камісара ААН па справах уцекачоў (www.unhcr.org). Можна скласці даклад, сабраўшы больш падрабязную інфармацыю па наступных аспектах:
  - аргументы, якія выкарысталі ўцекачы, угаворваючы іміграцыйных афіцэраў пусціць іх у краіну;
  - розныя ганебныя прыклады паводзінаў з боку іміграцыйных афіцэраў/уладаў;
  - рэкамендацыі краіне Б, датычныя абароны правоў ўцекачоў.

## Парады па далейшай працы:

- Збярыце больш інфармацыі аб уцекачах у Беларусі аб тым, якія цяжкасці ў паўсядзённым жыцці яны маюць. Магчыма паспрабаваць узяць інтэрв'ю ў каго-небудзь з іх. Можна таксама звязацца з мясцовымі камітэтамі па справах уцекачоў.
- Азнаёмцеся глыбей з правамі ўцекачоў. Некаторыя ўдзельнікі могуць атрымаць заданне прааналізаваць Канвенцыю ААН аб статусе ўцекачоў (1951 г.) і зрабіць невялікую прэзентацыю па яе зместу.
- Удзельнікі могуць таксама даведацца, якія арганізацыі займаюцца праблемамі ўцекачоў: як яны працуюць і што канкрэтна робяць.



Афганскія дзеці ў лагеры ўцекачоў. Хіва Бахурудзін, паўночны Афганістан, лістапад 2001 г.

### Ідэі для правядзення акцый:

Звяжыцеся з мясцовымі арганізацыямі, якія займаюцца пытаннямі ўцекачоў у вашай краіне, і даведайцеся, ці можаце вы чым-небудзь дапамагчы. У Нарвегіі ёсць, напрыклад, Нарвежская арганізацыя для ўцекачоў, якая працуе ў сферы абароны правоў уцекачоў. Нарвежскі Чырвоны Крыж мае патрэбу часта ў гідах для ўцекачоў. Гідамі могуць быць усе, хто хацеў бы дапамагчы ўцекачам пазнаёміцца з краінай і справіцца з паўсядзённымі клопатамі.



У Беларусі вы можаце звязацца і прапанаваць сваю дапамогу Беларускаму таварыству Чырвонага Крыжа, Службе па кансультаванні ўцекачоў Беларускага руху медработнікаў, Міжнароднаму аб'яднанню па навукова-даследчых і інфармацыйна-адукацыйных праграмах «Развіццё», Цэнтру творчасці дзяцей і моладзі «Эўрыка» (займаецца дапамогай дзецям-уцекачам), Гродненскаму аб'яднанню грузін, Міжнароднай дабрачыннай арганізацыі афганцаў «Афганская абшчына», Міжнароднаму аб'яднанню «Афганская абшчына, зямляцтва і ўцекачы», Фонду падтрымкі вымушаных мігрантаў і ўцекачоў «Інтэграцыя-А».

---

31. Лічбы з гадавой справаздачы арганізацыі «Дапамога ўцекачам» (Flyktningshjelpen) за 2006 год.

## РЭЛІГІЯ І ТРАДЫЦЫІ СУТЫКАЮЦЦА З ПРАВАМІ ЧАЛАВЕКА

**Тэма:**

Правы чалавека і рэлігія, культура і традыцыя.

**Мэта:**

Зразумець, што некаторыя элементы рэлігій, культур і традыцый могуць знаходзіцца ў супярэчнасці з правамі чалавека.

Рэлігіі, культуры і традыцыі часта маюць вельмі даўнюю гісторыю, і некаторыя іх элементы, напэўна, заставаліся нязменнымі сотні гадоў. Міжнародныя правы чалавека, наадварот, з'яўляюцца адносна «маладымі» ў гістарычнай перспектыве. У сённяшняй рэчаіснасці мы можам назіраць некаторыя элементы культур, традыцый і рэлігій, якія знаходзяцца ў канфлікце з правамі чалавека. У асобных выпадках звычаі тлумачацца і абгрунтоўваюцца рэлігіяй, хаця гэта неабавязкова так. Мы таксама можам бачыць, што рэлігійныя пісанні могуць супярэчыць правам чалавека. Асобныя цытаты з Бібліі, Карана і іншых святых пісанняў не адказваюць сённяшнім патрабаванням правоў. На працягу гісторыі мы бачым шмат прыкладаў таго, як рэлігійныя догмы станавіліся прычынай забойства мільёнаў людзей. Свабода жанчын і іх удзел у грамадскім жыцці, абразанне жанчын, а таксама пытанне аб прымусовых шлюбах, гомасэксуалізм і аборты — цэнтральныя, памежныя тэмы і праблемы, дзе сёння сутыкаюцца рэлігія, культура, традыцыі і правы чалавека.

**Практычная рэалізацыя:**

Практыкаванне пачынаецца з працы ў групах, затым групы прадстаўляюць вынікі на агульным сходзе і праводзіцца абмеркаванне. Можна парэкамендаваць гэтае практыкаванне для груп, разнастайных у культурных і рэлігійных адносінах, а таксама ў межах школьных заняткаў па грамадазнаўству, паліталогіі, этыцы, асновах рэлігіі.

**Час:** 2 гадзіны.
**Што неабходна?** Ручкі і папера.

**Парадак выканання:**

1. Вядучы распавядае, што практыкаванне закранае ўзаемаадносіны паміж рэлігіяй, традыцыяй і культурай, з аднаго боку, і правамі чалавека — з другога. Заданне — знайсці элементы рэлігійных пісанняў або практыкі, якія супярэчаць правам чалавека. Важна адзначыць, што традыцыі і звычаі многіх культур, якія вядуць да парушэння правоў чалавека, часта абгрунтоўваюць рэлігійнымі ўстаноўкамі, хаця рэлігійныя пісанні і растлумачэнні рэлігійных тэкстаў зусім неабавязкова падтрымліваюць такія інтэрпрэтацыі. Таму многія не пагадзіліся б з тым, што рэлігія з'яўляецца прычынай парушэння правоў чалавека. У гэтым практыкаванні варта паказаць як раз такія прыклады. Вядучы дзеліць удзельнікаў на некалькі груп па рэлігійна-культурнаму паходжанню, затым усім удзельнікам даецца па асобніку Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека. (NB: некаторыя ўдзельнікі могуць быць атэістамі і таму адчуваць дыскамфорт у любой з груп. Аднак нас цікавіць рэлігійна-культурнае паходжанне ўдзельнікаў, а не іх рэлігійная прыналежнасць ці светапогляд. Нават нарвежскі ўдзельнік-нехрысціянін, хутчэй за ўсё, будзе знаёмы з хрысціянскай верай, культурай і практыкай у Нарвегіі. Менавіта гэтыя веды і маюць значэнне ў дадзеным практыкаванні. Тое ж самае датычыць і атэістаў ці ўдзельнікаў, якія вызнаюць іншую рэлігію. Групам даецца наступнае заданне:
   - Знайсці ў рэлігійных пісаннях сваёй культуры ці рэлігійнай практыцы, культуры/традыцыях элементы, якія супярэчаць правам чалавека. Што гэта за элементы і як іх тлумачаць і апраўдваюць? Паспрабуйце прывесці канкрэтныя прыклады. Калі вам складана прывесці прыклады з сучаснасці, удзельнікі могуць паспрабаваць знайсці прыклады з мінулага. Яны таксама могуць выбраць прыклады са сваіх краін або з краін з такой жа рэлігійнай культурай.
   - Які артыкул Усеагульнай дэкларацыі быў парушаны? (30 хвілін)
2. Прадстаўленне на агульным сходзе. Удзельнікі і вядучы могуць каментаваць сказанае або задаваць пытанні.

**Абмеркаванне:**

- Ці цяжка было знайсці элементы рэлігійных пісанняў або рэлігійнай практыкі, якія парушаюць правы чалавека?
- Ці лягчэй было знайсці прыклады з мінулага? Ці адбылося нейкае развіццё? Па якіх прычынах?
- Як былі пераадолены элементы рэлігіі, культуры і традыцый, якія супярэчаць правам чалавека? Прыклады?
- Ці маюцца ў розных рэлігіях агульныя элементы, якія парушаюць правы чалавека? (Як накант дыскрымінацыі жанчын і гомасэксуалістаў?)
- У выпадку канфлікту паміж рэлігіяй, традыцыяй і культурай, з аднаго боку, і правамі чалавека — з іншага, што будзе мець перавагу? Чаму?




Акцыя ў абарону асуджаных да смяротнага пакарання геяў Ірана. Мінск, снежань 2009 г.

**Возьмем пад ўвагу:**

Рэлігійныя пісанні можна інтэрпрэтаваць па-рознаму. Многія лічаць, што рэлігіі варта рэінтэрпрэтаваць па-новаму ў кантэксце сучаснасці. Большасць людзей падзяляюць меркаванне аб тым, што рэлігіі змяняюцца з часам. Іншыя лічаць, што рэлігіі ўсё ж больш «кансерватыўныя» і «адстаюць» ад развіцця грамадства ў цэлым. Рашэнне пра дазвол жанчынам мець сан святара і біскупа ў Нарвегіі з'яўляецца прыкладам таго, як рэлігія адаптавалася да развіцця грамадства. Сёння гомасэксуалізм, свабода жанчын, права на роўнае стаўленне і ўдзел у жыцці грамадства ўсё яшчэ з'яўляюцца не да канца вырашанымі пытаннямі паміж рэлігіяй і правамі чалавека. Па прычыне недахопу ведаў і часта з-за наяўнасці вельмі цесных сувязяў паміж рэлігіяй, культурай і традыцыяй, не заўсёды аднолькава лёгка вызначыць, што з'яўляецца рэлігіяй, а што — культурай і традыцыяй. У наш час правы чалавека з'яўляюцца ўніверсальнай каштоўнаснай базай і заканадаўчай асновай існавання чалавека. Хаця многія людзі рэлігійныя, мы ўсё ж можам назіраць імкненне ўсё большай колькасці дзяржаў да секулярнай формы кіравання, гэта значыць да такой, пры якой законы незалежныя ад рэлігійных установак. Пры гэтым правы чалавека будуць больш важкімі (прынамсі паводле законаў), чым рэлігійныя звычаі і традыцыі, якія супярэчаць ім. Рэлігіі павінны прызнаць дэмакратыю як форму грамадскага ўладкавання. Там, дзе рэлігія ідзе насуперак правам чалавека, правам чалавека павінна быць аддадзена перавага.

**ФАКТЫ:**
СПРАВА АМІНЫ ЛАВАЛ

---

*У сакавіку 2002 года Аміна Лавал была асуджана шарыяцкім судом Бакоры (Нігерыя, штат Катсіна) да смяротнага пакарання праз забіванне камянямі. Злачынства яе складалася ў тым, што ў яе было пазашлюбнае дзіця. Навіна пра яе пакаранне абляцела ўвесь свет. Міжнародная Амністыя пачала актыўную кампанію па гэтай справе для таго, каб стварыць магутны міжнародны ціск для адмены гэтага пакарання. У 2003 годзе Аміна Лавал была апраўдана вышэйшым шарыяцкім судом і адпушчана на волю. Генеральны сакратар Міжнароднай Амністыі ў той перыяд Петэр Айдэ заявіў, што справа супраць Аміны Лавал была ўзбуджана незаконна. Паводле міжнародных дакументаў па стандартах правоў чалавека, сэксуальнае жыццё з добраахвотнай згоды людзей — асабістая справа людзей і асабістае права. Арыштоўваць і асуджаць жанчыну за яе сэксуальнае жыццё з'яўляецца адкрытай дыскрымінацыяй.*

---

## ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ ГЛАБАЛІЗАЦЫІ

**Тэма:**

Глабалізацыя.

**Мэта:**

Удзельнікі павінны атрымаць веды аб глабалізацыі: яе прычынах і наступствах.

Людзі падарожнічаюць сёння па свеце як ніколі шмат. Яны і пераязджаюць з месца на месца часцей, чым у мінулыя часы. Межы і пашпарты адыгрываюць усё меншую ролю сёння, што асабліва заўважна ў Еўрапейскім Саюзе. Знікаюць мытні. Людзі па ўсёй планеце маюць доступ да адных і тых жа тавараў і могуць глядзець адны і тыя ж тэлевізійныя праграмы. Усё гэта вынікі глабалізацыі. Глабалізацыя прыводзіць да таго, што людзі розных культур жывуць сёння бок у бок. Фінансавыя і таварныя абароты адбываюцца нашмат хутчэй сёння, нягледзячы на межы. Нацыянальныя і транснацыянальныя кампаніі знаходзяцца ў самых розных краінах і спрыяюць усё большай узаемазалежнасці. Глабалізацыя прыносіць з сабой і новыя цяжкасці: развіццё аднаго рэгіёна ўплывае на развіццё другога. Куртка, якую вы купляеце ў Нарвегіі, магчыма, пашыта маленькай дзяўчынкай у Кітаі, якая з-за беднасці вымушана пакінуць школу і працаваць на фабрыцы. Таму глабалізацыя патрабуе, каб дзяржавы, арганізацыі і ўсе мы бралі на сябе большую адказнасць, чым раней.

«Сябры, усё на самой справе проста: калі ў нас не атрымаецца ператварыць глабалізацыю на карысць для ўсіх, то яна нікому не будзе на карысць». (Былы Генеральны сакратар ААН Кофі Анан на Сусветным эканамічным форуме 28 студзеня 2001 года)

**Практычная рэалізацыя:**

Гэта практыкаванне пачынаецца з абмену ідэямі, працягваецца працай у групах і заканчваецца прэзентацыямі і агульным абмеркаваннем. Галоўнае — не канчатковая ісціна, а камунікацыя і дыялог паміж удзельнікамі ў працы над пошукам і аналізам інфармацыі.

**Час:** 90 хвілін.

**Што неабходна?** Папера і ручкі, вялікія лісты паперы, маркеры, нажніцы і клей. Інфармацыйны матэрыял: артыкулы, фотаздымкі, газеты, часопісы і брашуры; доступ да Інтэрнэту, бібліятэкі.

**Падрыхтоўка:** Інфармацыя аб глабалізацыі.



**Парадак выканання:**

1. Вядучы тлумачыць удзельнікам, што мэта практыкавання — скласці інфарматыўны зборнік, які ўключае ў сябе азначэнні, факты, падзеі і асобы, якія асацыююцца з глабалізацыяй. У пачатку можна апытаць удзельнікаў, якія асацыяцыі ў іх выклікае слова «глабалізацыя». Адказы запісваюцца на дошку/плакат.
2. Спытайце затым пра іншыя блізкія да глабалізацыі паняцці, якія таксама могуць быць уключаны ў «слоўнік». Напрыклад:
   - азначэнне такіх слоў і паняццяў, як Міжнародны валютны фонд або назвы вялікіх кампаній;
   - самыя важныя пытанні, датычныя глабалізацыі;
   - людзі, якія асацыююцца з глабалізацыяй або антыглабалізацыйным рухам;
   - транснацыянальныя карпарацыі або міжнародныя арганізацыі;
   - ілюстрацыі, карціны і мультфільмы;
   - цытаты.
3. Удзельнікі дзяляцца на невялікія групы. Заданне — выбраць матэрыял, які, па іх меркаванні, найбольш важны. Яны могуць, вядома, таксама выкарыстоўваць і дадаваць уласныя ідэі, выяўляць творчасць! Яны таксама самастойна вырашаюць, якім чынам рабіць прэзентацыю матэрыяла: у выглядзе кнігі ці плаката або неяк па-іншаму. (30—60 хвілін, у залежнасці ад таго, колькі часу ёсць у распараджэнні і як глыбока вывучаецца матэрыял). Калі групы гатовы, яны прадстаўляюць вынікі сваёй працы аўдыторыі.

**Абмеркаванне:**

- Ці спадабалася практыкаванне? Чаму навучыліся?
- Якая інфармацыя здзівіла больш за ўсё? Чаму?
- Ці былі нейкія супярэчнасці ў інфармацыі? Ці, можа, памылкі?
- Якія перавагі і недахопы глабалізацыі?
- Якія наступствы глабалізацыі?
- Ці трэба перашкаджаць працэсу глабалізацыі?
- Ці бачыце вы якія-небудзь наступствы глабалізацыі ў вашым паўсядзённым жыцці? Дрэнныя ці добрыя?
- Якім чынам глабалізацыя можа «рухаць наперад» правы чалавека?
- Якую ролю адыгрываюць маладзёвыя арганізацыі ў глабальным свеце?

Завяршыце працу «зваротам» да ідэй, якія былі выказаны ў пачатку і запісаны на дошцы. Папрасіце ўдзельнікаў дадаць новыя словы і паняцці, з якімі яны пазнаёміліся падчас выканання практыкавання. Кіраўнік можа таксама дадаваць словы і паняцці, калі лічыць, што нешта важнае не было названа.




Фестываль нацыянальных меншасцяў. Выступаюць прадстаўнікі грузінскай дыяспары. Гродна, 13 чэрвеня 2008 г.

### Возьмем пад ўвагу:

Мы жывем сёння ў глабальным свеце, што прадугледжвае новыя рэаліі і новыя цяжкасці. Мы ўсё больш залежныя адзін ад аднаго: тое, што мы «робім» у адным месцы, аказвае ўплыў на «іншае». Глабалізацыя вядзе да таго, што краіны, арганізацыі і людзі нясуць вялікую адказнасць. Мы павінны думаць не толькі аб тым, што адбываецца з намі па суседству, але і ведаць, што нашы дзеянні «разыходзяцца коламі па вадзе» ў іншых месцах зямнога шара. Добры заклік: «Думай глабальна, дзейнічай лакальна!» Наступны раз, калі вы будзеце выбіраць сабе рэч у краме, пераканайцеся, што яна не зроблена рукамі малалетняга працоўнага. Аднак важна памятаць і аб станоўчых баках глабалізацыі. Такіх, напрыклад, як развіццё сеткі праваабарончых арганізацый, якое спрыяе больш канструктыўнай сумеснай працы.



## УВЕСЬ СВЕТ У АДНОЙ ВЁСЦЫ

### Тэма:

Эканамічныя, сацыяльныя і культурныя правы.

### Мэта:

Удзельнікі павінны ўбачыць несправядлівасць размеркавання рэсурсаў і дабрабыту ў глабальным свеце.

Самы вялікі парадокс нашай сучаснасці ў тым, што ёсць месцы на Зямлі, дзе галадаюць людзі. Нягледзячы на тое, што агульны ўзровень багацця і росквіту сёння высокі як ніколі, у свеце хранічна недаядаюць каля 800 мільёнаў чалавек. Больш за мільярд чалавек у свеце жывуць на менш чым адзін долар у дзень.

### Практычная рэалізацыя:

Дадзенае практыкаванне — пра няроўнасць, недахоп дабрабыту і магчымасцяў для развіцця ў свеце з пункту гледжання глабалізацыі і правоў чалавека.

**Час:** 1,5 гадзіны.
**Што неабходна?** Папера і ручкі, каляровыя алоўкі, маркеры.
**Падрыхтоўка:** Копіі лістоў з пазначэннямі ўдзельнікам.

### Парадак выканання:

1. Кіраўнік раздае ўдзельнікам лісты паперы і просіць выконваць інструкцыі. Папрасіце ўдзельнікаў уявіць сабе, што ўвесь свет (больш за 6 мільярдаў чалавек) «ператварыўся» ў адну маленькую вёску, у якой толькі 10 чалавек жыхароў. У першым шэрагу абвядзіце алоўкам сябе. Вядучы працягвае, паведамляючы, што:
   - 5 жыхароў вёскі хранічна недаядаюць і галадаюць (50 % насельніцтва Зямлі). Пачынаючы знізу, закрэсліце 5 кубкаў у другім шэрагу.
   - 8 з іх жывуць у вельмі хісткіх, дрэнных дамах (80 % насельніцтва Зямлі), уключаючы людзей, якія жывуць у трушчобах, бяздомных, уцекачоў. Пачынаючы знізу, закрэсліце 8 дамоў.
   - 7 з іх не ўмеюць чытаць (70 % насельніцтва Зямлі). Пачынаючы знізу, закрэсліце 7 кніг у чацвёртым шэрагу.
   - У аднаго чалавека ў распараджэнні знаходзіцца 60 % дабрабыту Зямлі, што азначае, што іншыя дзевяць павінны дзяліць паміж сабой пакінутыя 40 %. Закрэсліце першыя шэсць пачак грошай у пятым шэрагу.

- Усяго толькі ў 1 % насельніцтва Зямлі ёсць персанальныя камп'ютары (адна дзясятая камп'ютараў на лісце з пазначэннямі). Закрэсліце 9 камп'ютараў цалкам і дзясяты напалову.
- Усяго толькі ў 1 % насельніцтва Зямлі ёсць магчымасць атрымаць вышэйшую адукацыю. Закрэсліце 9 студэнцкіх капелюшоў цалкам і дзясяты напалову.
- Паглядзіце яшчэ раз на ліст і вырашыце, ці трэба вам памяняць месцазнаходжанне «сябе». Сваю новую пазіцыю абвядзіце двума кружкамі.

2. Папрасіце ўдзельнікаў выслухаць наступныя сцверджанні:
   - Калі ў вас ёсць магчымасць наступнага прыёму ежы, пакупкі адзення, калі ў вас ёсць дах над галавой, вы адносіцеся да багатых жыхароў вёскі.
   - Калі ж вы або вашы бацькі маюць рахунак у банку і ў кашальку, вы адносіцеся па шкале багацця да самых багатых.
3. Прадстаўце зараз апошнія статыстычныя дадзеныя аб адукацыі, здароўі, наяўнасці вады, санітарных і вайсковых выдатках і інш. са Справаздачы па развіцці чалавечага патэнцыялу або справаздачы Сусветнага банка аб прагрэсе ў галіне развіцця. Калі ёсць час і магчымасць выкарыстання Інтэрнэту, удзельнікі могуць падзяліцца на групы і самі знайсці статыстыку з вышэйназваных крыніц. 45 хвілін)
4. Кіраўнік запрашае ўдзельнікаў да абмеркавання адрознення статыстычных дадзеных па розных краінах. Абмеркаванне можа «выявіць»:
   - Супярэчнасці, якія паказваюць гэтыя дадзеныя.
   - Ці падобныя іх уласныя ўмовы жыцця з тым, што паказваюць статыстычныя дадзеныя.
   - Адносіны паміж дадзенымі і (не)захаваннем правоў чалавека з-за беднасці.
   - Якія мэты і прыярытэты ў галіне развіцця, па меркаванні ўдзельнікаў, павінны быць у той або іншай краіны? Чаму?

   Папрасіце ўдзельнікаў спачатку самастойна падумаць над дадзенымі пытаннямі, абмеркаваць іх затым з іншымі і прадставіць у выніку аўдыторыі.

### Возьмем пад ўвагу:

Рэсурсы і даброты размеркаваны ў сённяшнім свеце непароўну і несправядліва. Розніца з кожным годам павялічваецца, так што багатыя людзі становяцца яшчэ больш багатымі. Маёмасць дзесяці самых багатых людзей у свеце складае разам 1 840 мільярдаў крон[32]. Гэта — амаль столькі ж, колькі адзін мільярд чалавек зарабляе ў год. Паводле Праграмы развіцця ААН, гэтай жа сумы было б дастаткова для таго, каб «выцягнуць» людзей з экстрэмальнай беднасці, калі б грошы былі інвеставаны ў праекты па развіцці. 1,1 мільярда самых бедных людзей на Зямлі зарабляюць у сярэднім усяго каля 1 900 крон у год або каля пяці крон у дзень паводле статыстыкі, прадстаўленай Сусветным банкам. Няроўнае размеркаванне рэсурсаў можа быць прычынай канфліктаў і войн.

**ФАКТЫ:**

МЭТЫ РАЗВІЦЦЯ ТЫСЯЧАГОДДЗЯ:

---

*У 2000 годзе ААН прадставіла свой «рэцэпт» выкаранення беднасці ў свеце. Гэты «рэцэпт» — Мэты развіцця тысячагоддзя, восем агульных мэт, дасягнуць якія намечана ў 2015 годзе. ААН, некаторыя дзяржавы і арганізацыі працуюць над дасягненнем гэтых мэт. Але ці будуць гэтыя мэты дасягнутыя?*

1. *Ліквідаваць абсалютную беднасць і голад.*
2. *Забяспечыць усеагульную пачатковую адукацыю.*
3. *Садзейнічаць раўнапраўю палоў і пашырэнню правоў жанчын.*
4. *Скараціць дзіцячую смяротнасць.*
5. *Палепшыць ахову мацярынскага здароўя.*
6. *Змагацца з ВІЧ/СНІДам, малярыяй і іншымі захворваннямі.*
7. *Забяспечыць экалагічную стабільнасць.*
8. *Сфарміраваць сусветнае партнёрства ў мэтах развіцця.*

---

32. 1 нарвежская крона складае прыкладна 0,18 долара ЗША.





# ДОСТУП ДА ЛЕКАЎ

## Тэма:

Здароўе, глабалізацыя, дыскрымінацыя і стэрэатыпы.

## Мэта:

Удзельнікі павінны атрымаць інфармацыю аб праве на доступ да танных лекаў як адным з аспектаў права на медыцынскую дапамогу. Таксама яны павінны абмеркаваць магчымасць канфлікту розных правоў чалавека на прыкладзе канфлікту права ўласнасці і права на медыцынскую дапамогу.

Што, калі ў вас смяротнае захворванне, лекі для лячэння якога існуюць, але ў вас няма сродкаў іх купіць? Такой была гісторыя адной судовай справы ў Паўднёвай Афрыцы ў 2001 годзе. Ад зыходу гэтай справы залежаў лёс тысячы чалавек.

## Практычная рэалізацыя:

Практыкаванне складаецца з двух частак. Частка 1 — імітацыі сучаснай судовай справы, якая слухалася ў Паўднёвай Афрыцы ў 2001 годзе. Частка 2 — дасягненне згоды.

**Час:** 3 гадзіны.
**Што неабходна?** Вялікія лісты паперы і маркеры, ролевыя карты па судовай справе, інструкцыі для працы ў групах, аранжавыя і чорная карты для ўдзельнікаў, прасторнае памяшканне.

## Парадак выканання:

**Частка 1. Судовая справа. (каля 1 гадзіны)**

1. Падрыхтуйце наступны сцэнар: «ВІЧ/СНІД — вельмі сур'ёзная і распаўсюджаная па ўсім свеце эпідэмія. Асабліва «падвергнуты паражэнню» Афрыканскі кантынент. Аб эпідэміі ідуць гарачыя дэбаты ў Паўднёвай Афрыцы — краіне, дзе мільёны бедных людзей пакутуюць і паміраюць, паколькі ў іх няма сродкаў на вельмі дарагія лекі, неабходныя для падтрымання жыцця пры дадзенай хваробе. Адзінае для іх выйсце — гэта выкарыстоўваць танныя копіі дарагіх лекаў. Буйныя фармацэўтычныя кампаніі супраць гэтага. Яны хацелі б абараніць свае права на распаўсюд лекаў, паколькі яны першапачаткова іх вырабілі. Таму кампаніі аб'ядналі свае высілкі, каб супрцьстаяць таму, каб краіны капіравалі і прадавалі лекі па больш таннаму кошту. Яны таксама пачалі судовую справу супраць паўднёваафрыканскага ўрада, які распаўсюджваў і прадаваў танныя копіі лекаў супраць

ВІЧ/СНІДу. Пытанне ў праве ўласнасці на лекі. Ці дастатковы гэта аргумент, каб перашкаджаць ажыццяўленню права людзей на жыццё і медыцынскую дапамогу? Растлумачце ўдзельнікам, што яны не будуць дакладна паўтараць працэдуру канкрэтнага судовага паседжання.
2. Удзельнікі дзяляцца на чатыры роўныя па колькасці групы, якія будуць прадстаўляць фармацэўтычную фірму «Фарма Ка», урад Паўднёвай Афрыкі, актывістаў акцыі за даступныя лекі і суддзяў.
3. Групы атрымліваюць ролевыя карты.
4. На працягу 25 хвілін групам неабходна вывучыць ролевыя карты і падрыхтавацца да слухання судовай справы. У групе абіраецца аратар/прадстаўнік і адзін/два памочнікі, якія могуць дапамагаць аратару адказваць на пытанні ў судзе.
5. Калі групы гатовыя, усе сустракаюцца ў класе.
6. У груп ёсць 5 хвілін прадставіць свой пункт гледжання на праблему і задаць усе пытанні, што ў іх ёсць. Суддзі прадстаўляюць слова групам па чарзе.
7. Пасля таго, як групы выказаліся, у суддзяў ёсць 10 хвілін, каб адказаць на зададзеныя пытанні і падвесці вынікі па прадстаўленых аргументах.

**Частка 2: Дасягненне згоды. (1 гадзіна і 40 хвілін)**
Удзельнікі дзяляцца на маленькія групы па 4 чалавекі ў кожнай. У кожнай групе павінен быць прадстаўнік фірмы «Фарма Ка», ураду, актывістаў і суддзяў.

1. Групы атрымліваюць інструкцыі. Вядучаму неабходна пераканацца, што ўдзельнікі правільна зразумелі сваё заданне і правілы выкарыстання чырвоных і зялёных картак. Групам даецца 30 хвілін для таго, каб прыйсці да згоды аб рашэнні.
2. Усе вяртаюцца ў клас, групы рассаджваюцца і прадстаўляюць вынікі сваіх дыскусій (5 хвілін). Вядучы запісвае прапановы па вырашэнні дадзенай справы на вялікі ліст паперы.
3. Калі групы скончылі свае прадстаўленні, пачынаецца абмеркаванне — падвядзенне вынікаў адносна працэсу прыняцця рашэнняў. Вядучы можа спытаць:
   - Ці лёгка было прыйсці да згоды?
   - У чым сіла і ў чым слабасць такога падыходу?
   - Ці ўзніклі якія-небудзь канфлікты паміж «прыйсці да згоды» і ўцягваннем усіх членаў групы ў дыскусію?
   - Якія пытанні былі складанымі?
4. Практыкаванне можна скончыць зачытваннем услых прысуду, вынесенага паўднёваафрыканскім судом 19 красавіка 2001 года: «Ідэя (....) доступу да танных лекаў (...) пахвальная; і абапіраючыся на маштабы ВІЧ/СНІД эпідэміі, канстытуцыйны абавязак дзяржавы — гэта паважаць, абараняць і гарантаваць фундаментальныя правы чалавека, уключаючы права на павагу годнасці чалавека і права на жыццё (якое з'яўляецца ключом да ўсіх астатніх правоў чалавека) (...) Аргументы істца (фармацэўтычных фірм) — беспадстаўныя»[33].

## Абмеркаванне:

Абмеркаванню ўжо быў пакладзены пачатак пры выкананні часткі 2 практыкавання. На дадзеным этапе можна прапанаваць пракаментаваць судовую справу і высветліць, пра якія правы чалавека ішла размова пры разглядзе дадзенай справы. Можна абмеркаваць наступныя пытанні:
- Якім было ваша меркаванне ў самым пачатку выканання практыкавання?
- Ці змянілася ваша меркаванне падчас слухання справы?
- Якое ваша меркаванне адносна двух відаў прыняцця рашэння: з дапамогай нарад і з дапамогай прыходу да згоды? Як вызначаецца паспяховы вынік справы?
- Аб якіх правах чалавека ішла размова ў дадзенай справе?
- Якім чынам дадзеныя пытанні справы суадносяцца з рэальным вопытам удзельнікаў?
- Як вырашаецца праблема даступнасці танных лекаў у вашым горадзе (рэгіёне)?

## Возьмем пад ўвагу:

Практыкаванне, якое мы толькі што зрабілі, — прыклад таго, якім чынам розныя правы чалавека могуць «уступаць у канфлікт». У дадзеным выпадку — права на ўласнасць і права на медыцынскую дапамогу. Часта неабходна выбраць адно з іх, прыносячы «ў ахвяру» другое. У дадзеным выпадку мы ўбачылі, што права на жыццё пераважала над правам на ўласнасць. У рэшце рэшт, лекі вырабляюцца для таго, каб ратаваць жыцці.

33. Цытата ўзята з падручніка «Компас», Даведніка па правах чалавека для моладзі, практыкавання «Доступ да медыкаментаў». Пераклад Ліліян Юрт.

**Ролевая карта судовага разгляду: фірма «Фарма Ка»**

Вы — Савет дырэктараў фірмы «Фарма Ка», вядучай у свеце па вытворчасці лекаў. «Фарма Ка» мае права рэкламаваць і прадаваць лекі, неабходныя для лячэння ВІЧ/СНІДу. Для вас важна падтрымліваць канкурэнтаздольнасць фірмы і зарабляць грошы на радасць трымальнікаў акцый, таму вы абараняеце права фірмы ўстанаўліваць кошты на продаж вашай прадукцыі, якія складаюцца, у сваю чаргу, з выдаткаў на навуковыя даследаванні, вытворчасць лекаў і заработнай платы супрацоўнікаў. Дазволіць іншай фірме капіраваць і прадаваць распрацаваную вамі прадукцыю танней — значыць нашкодзіць вашым прыбыткам і з часам разбурыць вашу фірму. Таму вы ўтварылі альянс з іншымі фармацэўтычнымі фірмамі для таго, каб перашкаджаць дзяржаве капіраваць і вырабляць «вашы» лекі. Калі трэба, вы гатовы пачаць судовую справу супраць дзяржаўных уладаў. На гэтай падставе вы і ініцыявалі судовы разгляд супраць ураду Паўднёвай Афрыкі.

Вам неабходна дасканала падрыхтавацца да прадстаўлення вашых аргументаў і абароны сваёй пазіцыі. У вас будзе толькі 5 хвілін на іх прэзентацыю.

**Ролевая карта судовага разгляду: урад Паўднёвай Афрыкі**

Вы — вопытныя палітыкі, члены ўраду Паўднёвай Афрыкі. Урад рыхтуе адказ на ініцыяваны фармацэўтычнымі фірмамі судовы разгляд справы супраць ураду. Фармацэўтычная фірма «Фарма Ка» спрабуе перашкодзіць таму, каб дзяржавы маглі капіраваць лекі і прадаваць іх па ніжэйшым кошце, чым установлены вытворцам. У прынцыпе, вы згодны з пазіцыяй фірмы «Фарма Ка».
У той жа час народныя рухі пад кіраўніцтвам «Кампаніі за даступныя лекі» сцвярджаюць, што ў дзяржавы ёсць канстытуцыйны абавязак гарантаваць насельніцтву недарагія лекі, асабліва што датычыць такіх сур'ёзных хвароб, як ВІЧ/СНІД. Вам прыйшлося рэагаваць на патрабаванні народных рухаў і вы далі дазвол на імпарт танных лекаў-копій (замяняльнікаў) з Інданэзіі.

Вам неабходна дасканала падрыхтавацца да прадстаўлення вашых аргументаў і абароны сваёй пазіцыі. У вас будзе толькі 5 хвілін на іх прэзентацыю.

**Ролевая карта судовага разгляду: «Кампаніі за даступныя лекі»**

Вы — група актывістаў, якія прадстаўляюць «Кампанію за даступныя лекі» ў Паўднёвай Афрыцы. Вы сцвярджаеце, што на дзяржаве ляжыць адказнасць забяспечыць насельніцтву доступ да недарагіх лекаў, асабліва што датычыць лекаў супраць такіх сур'ёзных хвароб, як ВІЧ/СНІД. Урад адгукнуўся на вашы патрабаванні і дазволіў імпарт танных лекаў-копій (замяняльнікаў) з-за мяжы.
Вы таксама сцвярджаеце, што на дзяржаве ляжыць адказнасць забяспечваць фінансавую дапамогу людзям, пацярпелым ад ВІЧ/СНІДу, і арганізацыям, якія працуюць з дадзенымі хваробамі.
У той жа час супраць Паўднёвай Афрыкі фармацэўтычнымі фірмамі была ініцыявана судовая справа. Фірмы маюць намер перашкодзіць дзяржаве імпартаваць танныя замежныя лекі-замяняльнікі. Таму вы вырашаеце ўтварыць альянс з дзяржавай у гэтай справе і абараняць яе ролю ў забеспячэнні лекамі насельніцтва.

Вам неабходна дасканала падрыхтавацца да прадстаўлення вашых аргументаў і абароны сваёй пазіцыі. У вас будзе толькі 5 хвілін на іх прэзентацыю.

**Ролевая карта судовага разгляду: суддзі**

Вы — група суддзяў па справе, ініцыяванай фармацэўтычнымі фірмамі супраць Паўднёвай Афрыкі для таго, каб перашкаджаць рашэнню ўрада аб імпарце таннейшых лекаў-замяняльнікаў з-за мяжы. Актывісты групы «Кампанія за даступныя лекі» падтрымліваюць рашэнне ўрада.

Ваша роля — запрасіць усе тры бакі, каб тыя абвясцілі свае пазіцыі. Вам не трэба каментаваць або штосьці вырашаць пасля кожнай прэзентацыі бакоў. Ваша роля — найперш асвятліць тое ці іншае пытанне і выслухаць аргументы бакоў.

Складанасць заключаецца ў тым, каб нейкім чынам вырашыць такую праблему, дзе розныя правы чалавека ўступаюць у канфлікт адзін з адным. Адказнікі (урад і актывісты «Кампаніі за даступныя лекі») адстойваюць права на жыццё і павагу годнасці чалавека. Існец (фармацэўтычная фірма «Фарма Ка») адстойвае права на ўласнасць. Выпіска з рэферата дадзенага судовага разгляду абвяшчае: «Права на жыццё і павагу годнасці чалавека — самыя галоўныя правы чалавека. Яны — падмурак для ўсіх іншых правоў. Абавязваючыся будаваць грамадства, заснаванае на павазе годнасці і правоў чалавека, мы павінны даваць правам прыярытэт. Дзяржава павінна дэманстраваць такі прыярытэт усёй сваёй дзейнасцю, уключаючы пакаранні людзей, якія здзейснілі тыя ці іншыя злачынствы».

Супраць

Права на ўласнасць замацавана ў арт. 25 Канстытуцыі Паўднёвай Афрыкі, які абвяшчае: «Уласнасць 25(I). Ні ў каго не можа быць адабрана ўласнасць, і ніякі закон не можа дапусціць пазбаўлення ўласнасці».

Вам неабходна падрыхтаваць пытанні ўсім тром бакам. На фармуляванне пытанняў і выслухоўванне аргументаў у вас будзе 10 хвілін.



**Інструкцыі для маленькіх груп (частка 2)**

Вы — маленькая група з чатырох чалавек, кожны з якіх прадстаўляе адзін з бакоў:

- «Фарма Ка»;
- урад Паўднёвай Афрыкі;
- актывісты «Кампаніі за даступныя лекі»;
- суддзі.

**Інструкцыі:**

1. Спачатку высветліце, якая ў вас роля.
2. Далей кожны прадстаўляе свае думкі: чым, па вашым меркаванні, справа скончыцца. Калі вы думаеце, што выйсце/рашэнне будзе лёгка знайсці, вы выкарыстоўваеце аранжавую карту. Калі вы думаеце, што выйсце/рашэнне будзе цяжка знайсці, вы выкарыстоўваеце чорную карту.
3. Заданне зараз — прыйсці да згоды паміж усімі чатырма бакамі. Рашэнні неабходна прымаць толькі пасля таго, як выкажацца кожны ўдзельнік групы. Суддзя «кіруе» абмеркаваннем і выступае апошнім.
   - Раўнд 1: растлумачце сваю пазіцыю.
   - Раўнд 2: распавядзіце ваша бачанне завяршэння справы.
   - Раўнд 3: абмяркуйце розныя магчымасці завяршэння справы.
4. Уважліва выслухайце адзін аднаго. Пасля выступу ўдзельніка астатнія тры павінны, выкарыстоўваючы каляровыя карткі, намякнуць на магчымасці агульнага рашэння.
5. Пасля таго, як група прыйшла да згоды, выбіраецца адзін удзельнік-аратар, які прадстаўляе меркаванне групы аўдыторыі.

## Ролевая гульня «АРГАНІЗАЦЫЯ АБ’ЯДНАНЫХ НАЦЫЙ»

### Тэма:

Арганізацыя Аб’яднаных Нацый.

### Мэта:

Удзельнікі павінны пазнаёміцца са структурай ААН, з магчымасцямі і абмежаваннямі ААН.

У Артыкуле 26 Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека гаворыцца, акрамя ўсяго іншага, што «...адукацыя павінна садзейнічаць дзейнасці ААН па падтрыманні міру». Імітацыя структуры ААН, дзе ўдзельнікі іграюць ролі амбасадараў розных краін, — дзейсны педагагічны метад, які спрыяе разуменню магчымасцяў і абмежаванняў ААН.

### Практычная рэалізацыя:

Дадзенае практыкаванне — імітацыя структуры і працы ААН. Яно складаецца з трох этапаў:

1. **Падрыхтоўчы этап з акцэнтам на наступныя тры аспекты:**
   I. ААН і яе праца.
   II. Краіна — ўдзельніца ААН: яе ўрад, палітычныя інтарэсы.
   III. Актуальныя праблемы сучаснага свету.
2. **Удзел у ролевай гульні.**
   Падрыхтоўчы этап пераходзіць цяпер у дзеянне: удзельнікі — амбасадары розных краін — удзельніц ААН — практыкуюцца выступаць на публіцы, рыхтаваць прапановы па рэзалюцыях, вучацца слухаць іншых, эфектыўна выкарыстоўваць свой час, весці перамовы і кансультацыі.
3. **Ацэнка працы.**
   На дадзеным этапе важна падвядзенне вынікаў працы. Неабходна распрацаваць крытэрыі для ацэнкі імітацыі працы ААН.

Роля кіраўніка ў дадзеным практыкаванні заключаецца не ў тым, што ён/яна — эксперт, а ў тым, што ён/яна тут хутчэй дарадца і памочнік удзельнікаў.

**Час:** 2 гадзіны.

**Падрыхтоўка:** Вядучаму неабходна падумаць і падрыхтаваць пералік надзённых праблем у сучасным свеце, над якімі ўдзельнікі маглі б працаваць.



### Парадак выканання:

1. Выберыце некалькі актуальных на сённяшні дзень у свеце праблем. Выберыце некаторых удзельнікаў — прадстаўнікоў розных краін — удзельніц ААН. Растлумачце, што іх задача — зразумець і высветліць пазіцыю той ці іншай краіны па адным пытанні з выбраных для разгляду ў дадзеным практыкаванні.
2. Калі ўдзельнікі скончылі свой аналіз, папрасіце кожнага «амбасадара» напісаць прапанову па рэзалюцыі для Генеральнай Асамблеі ААН па тым пытанні, якое закранае іх рэгіён ці краіну. Прапанова па рэзалюцыі павінна ўтрымліваць падрабязнае апісанне праблемы і план паляпшэння сітуацыі па дадзенай праблеме, а таксама якую ролю ў гэтым будзе адыгрываць ААН. Удзельнікам трэба будзе пераканаць іншых, што іх рэзалюцыя — аптымальнае для ўсіх выйсце і заслугоўвае сур’ёзнага разгляду. Удзельнікі затым параўноўваюць усе прадстаўленыя рэзалюцыі і знаходзяць сабе альянс/падтрымку. Растлумачце ўдзельнікам, што хутчэй за ўсё ім прыйдзецца змяніць свае меркаванні, свае рэзалюцыі і прыйсці да згоды для таго, каб рэзалюцыі сапраўды «прайшлі».
3. Пачынаецца ААН-форум: удзельнікі сядзяць у коле, перад імі назва краіны, якую яны прадстаўляюць. Вядучы або хто-небудзь з удзельнікаў выконвае ролю «Генеральнага сакратара». Для форума павінны быць устаноўлены правілы (напрыклад: удзельнікі называюць адзін аднаго «амбасадар з...»; можна выказвацца/выступаць, калі Генсакратар даў слова і інш.).
4. «Генеральны сакратар» адкрывае слуханне рэзалюцый, іх абмеркаванне і галасаванне па іх. Любы ўдзельнік можа папрасіць аб галасаванні для падтрымкі рэзалюцыі пасля таго, як яна прадстаўлена. Але для таго, каб яна была прынята да галасавання, неабходна падтрымка іншага «амбасадара». Для таго, каб рэзалюцыя «прайшла», неабходна дзве траціны галасоў.
5. Практыкаванне завяршаецца вуснай або пісьмовай ацэначнай анкетай і ўключае ацэнку працы асобных удзельнікаў, новых ведаў аб ААН і ролі арганізацыі ў сучасным глабальным свеце.

### Возьмем пад ўвагу:

Мы пераканаліся ў тым, што структура ААН, дзе прадстаўлены ўсе дзяржавы, даволі складаная. Дзяржавы прадстаўляюць свае грамадствы і спрабуюць «прасоўваць» свае інтарэсы, ведучы шматбаковыя перамовы ў ААН. Дзяржавы пагаджаюцца аб агульных рэзалюцыях праз дыскусіі, узважванні, адстойванні пазіцый і ідучы на кампраміс. Прынятыя ААН рэзалюцыі — гэтае заявы па актуальных на сённяшні дзень у свеце пытаннях.

## ФАКТЫ:

*Рэзалюцыя ААН – гэта фармальна прынятае рашэнне тым ці іншым органам ААН. У кожнага органа ААН ёсць права прымаць рэзалюцыі. У рэчаіснасці рэзалюцыі прымаюцца ў асноўным Саветам Бяспекі ААН або Генеральнай Асамблеяй ААН. Юрыдычны статус прынятых рэзалюцый неаднаразова з'яўляўся тэмай гарачых дэбатаў. Большасць экспертаў не ўспрымаюць рэзалюцыі ААН як юрыдычна абавязваючыя да іх выканання. У іх хутчэй палітычная функцыя, паколькі яны ўяўляюць сабой агульную заяву большасці краін свету.*






## СПРАВЯДЛІВАЯ ВАЙНА?

### Тэма:

Правы чалавека, вайна і гуманітарнае ўмяшальніцтва.

### Мэта:

Удзельнікі павінны адчуць усю складанасць і супярэчлівасць праблемы гуманітарнага ўмяшальніцтва для абароны правоў чалавека, прадухілення гуманітарных катастроф і генацыду.

У апошнія гады мы не раз назіралі сур'ёзныя парушэнні правоў чалавека і выкарыстанне гэтых парушэнняў у якасці аргумента для пачатку вайсковых дзеянняў. Прыхільнікі так званага гуманітарнага ўмяшальніцтва лічаць, што ў асобных выпадках увядзенне міжнароднага кантынгенту войск ААН на тэрыторыю дзяржавы, дзе ідзе грамадзянская вайна, праводзіцца палітыка генацыду, масава парушаюцца асноўныя правы і свабоды чалавека, — маральна апраўдана. Сусветная супольнасць не можа ў такіх выпадках сядзець склаўшы рукі і глядзець, што дзяржавы або не жадаюць абараніць сваіх грамадзян, або не могуць гэтага зрабіць. У нашым глабальным свеце сёння мы ўсе адказныя адзін за аднаго. Там, дзе нацыянальныя ўлады не могуць або не жадаюць, сусветная супольнасць павінна ўмяшацца. Апаненты прыхільнікаў гуманітарнага ўмяшальніцтва прытрымліваюцца іншага меркавання. Яны лічаць, што ідэя «гуманітарнага ўмяшальніцтва» ўяўляе сабой небяспечную тэндэнцыю ў міжнароднай палітыцы, паколькі парушаецца ў такім разе прынцып суверэннасці дзяржавы і ненападу адзін на аднаго. Апаненты таксама сцвярджаюць, што абарона правоў чалавека можа выкарыстоўвацца як «прыкрыццё» нацыянальных знешнепалітычных інтарэсаў. І потым, хто можа вырашаць, калі можа быць пачата і здзейснена гуманітарнае ўмяшальніцтва? Зноў-такі можна ўспомніць пра пацыфізм: любая вайна, незалежна ад матыву, не можа быць маральна апраўданай, паколькі заўсёды прадугледжвае забойствы людзей. Такое меркаванне далёка не адзінкавае. Ці ўсё ж, як сказаў былы Генеральны сакратар ААН Кофі Анан, «калі гуманітарнае ўмяшальніцтва з'яўляецца недапушчальным парушэннем прынцыпу ненападу, то якім чынам можна тады «адказаць» на такія грубейшыя парушэнні правоў чалавека, якія здарыліся ў Руандзе, Босніі, Косава і Судане?»

### Практычная рэалізацыя:

Дадзенае практыкаванне заснавана на працы ў групах з наступнай агульнай дыскусіяй. Гэта даволі складанае практыкаванне і больш за ўсё падыходзіць для тых груп, дзе ёсць вялікая цікавасць да знешняй і міжнароднай палітыкі.

**Час:** 1—3 гадзіны.
**Што неабходна?** Вялікія лісты паперы і маркеры, падрыхтаваныя пакеты матэрыялаў па кожным выпадку гуманітарнага ўмяшальніцтва.

### Парадак выканання:

1. Кіраўнік пачынае з тлумачэння таго, што паняцце «гуманітарнае ўмяшальніцтва» — даволі новае паняцце ў міжнароднай палітыцы. «Гуманітарнае ўмяшальніцтва» — гэта сітуацыя, калі адна або некалькі дзяржаў уводзяць войскі на тэрыторыю іншай дзяржавы для таго, каб прадухіліць сур'ёзныя парушэнні правоў чалавека і абараніць мірнае насельніцтва. «Гуманітарнае ўмяшальніцтва» «парушае» важнейшы прынцып міжнароднай палітыкі — прынцып суверэннасці дзяржавы (г. зн. дзяржава сама распараджаецца на сваёй тэрыторыі).
2. Удзельнікі дзяцца на групы і атрымліваюць заданне: як рэагавала сусветная супольнасць (ААН, НАТА і іншыя міжнародныя арганізацыі) у тэрміновых і небяспечных сітуацыях, калі жыццё многіх мірных людзей знаходзілася ў небяспецы? У якасці такіх прыкладаў могуць быць узяты: сітуацыя ў Руандзе ў 1994 г., у Срэбрэніцы ў Босніі і Герцагавіне ў 1995 г., у Косава ў Сербіі ў 1999 г. і ў Судане ў 2006 г. Групам неабходна зрабіць наступнае:
   - Апісаць сітуацыю і яе цяжкасці.
   - Якая перадгісторыя сітуацыі?
   - Якой была рэакцыя міжнароднай супольнасці на сітуацыю?
   - Хто выступіў ад імя міжнароднай супольнасці?
   - Што можна было прадпрыняць, якія былі альтэрнатывы?
   - Ці было «гуманітарнае ўмяшальніцтва» фактычнай альтэрнатывай? Чаму?
   - Якое выніковае становішча мірнага насельніцтва?
   - Ці ўсе ў групе згодны з абраным вырашэннем дадзенай сітуацыі? Што можна было б зрабіць па-іншаму?
   - Ці магчыма было зрабіць усё па-іншаму?
3. Групы прадстаўляюць вынікі сваёй працы аўдыторыі.

### Абмеркаванне:

- Якія станоўчыя бакі «гуманітарнага ўмяшальніцтва»?
- Якія негатыўныя бакі «гуманітарнага ўмяшальніцтва»?
- Што негатыўнае ў парушэнні прынцыпу суверэннасці дзяржавы?
- У чым розніца паміж вайной у мэтах самаабароны, якая дапускаецца міжнародным правам, і «гуманітарным умяшальніцтвам»? У чым падабенства?
- Ці павінна толькі Арганізацыя Аб'яднаных Нацый вырашаць, у якіх выпадках можа быць здзейснена «гуманітарнае ўмяшальніцтва»? У чым перавагі ў такім разе? У чым недахопы?
- У 1999—2004 гадах многія расійскія праваабарончыя арганізацыі прапаноўвалі ўвесці войскі ААН у Чачэнскую рэспубліку для забеспячэння абароны правоў мірнага насельніцтва. Як вы лічыце, чаму гэта не было зроблена? Як вы самі паставіліся б да гуманітарнага ўмяшальніцтва ў дзеянні расійскага ўрада?

### Возьмем пад ўвагу:

У свеце адбылося шмат розных зменаў на працягу апошніх ста гадоў. Развіццё інфармацыйных тэхналогій прывяло да таго, што кожны дзень мы чуем паведамленні аб войнах, канфліктах і катастрофах, якія адбываюцца «недзе там», далёка ад нашай краіны. У дадатак да інстытута дзяржавы з'явіліся іншыя інстытуты, якія фарміруюць і ўплываюць на развіццё нашага сучаснага свету. Гэта шматлікія міжурадавыя, міжнародныя недзяржаўныя і дзяржаўныя арганізацыі. ААН — адна з важнейшых арганізацый у свеце. У такім «клубку» фарміруюцца і агульныя маральныя нормы і каштоўнасці, як, напрыклад: правы чалавека і міжнароднае права. Тое, што свет становіцца ўсё «меншым» і людзі выпрацоўваюць агульныя маральныя каштоўнасці і юрыдычныя нормы, спрыяе таму, што, як адзначаюць многія, цяжка сёння ўспрымаць канфлікты і войны як далёкія ад нас. Больш таго, некаторыя сцвярджаюць у нашы дні, што ва ўсіх нас ёсць абавязак думаць і трывожыцца аб канфліктах і імкнуцца дапамагчы, калі мы ў стане гэта зрабіць. На нас ляжыць адказнасць. «Гуманітарнае ўмяшальніцтва» — гэта працяг у ланцужку падобнай аргументацыі. Правы чалавека і міжнароднае права — гэта рэчы, якія датычаць усіх у свеце, і сусветнай супольнасці неабходна «лічыцца з гэтым». Сур'ёзныя парушэнні правоў чалавека ці этнічныя чысткі не могуць быць толькі ўнутранай справай той ці іншай дзяржавы.

### Варыяцыя:

Суверэннасць дзяржавы заўсёды была і застаецца асноўным прынцыпам міжнароднай палітыкі. Толькі тады, калі дзяржавы будуць паважаць межы адзін аднаго, можна казаць аб стабільнасці ў свеце. Такое становішча рэчаў прадугледжвае тое, што на сваёй тэрыторыі дзяржава можа рабіць усё, што хоча. А гэта, у сваю чаргу, можа быць праблематычным у тых выпадках, калі дзяржавы не ў стане забяспечыць бяспеку насельніцтва або калі яны самі з'яўляюцца агрэсарамі. Адзіны магчымы спосаб абараніць насельніцтва ў такіх выпадках — гэта ўмяшальніцтва сусветнай супольнасці, што прадугледжвае парушэнне нацыянальных межаў.

Сёння можна назіраць пераасэнсаванне прынцыпу суверэннасці дзяржаў. Самая галоўная выснова ў справаздачы міжнароднай камісіі «Адказнасць абараніць» 2004 года — тое, што суверэннасць дзяржавы прадугледжвае адказнасць дзяржавы. Адказнасць, найперш, забяспечыць бяспеку насельніцтва, і ляжыць яна, у першую чаргу, на дзяржаўных уладах. Другая выснова справаздачы — тое, што там, дзе мірнае насельніцтва пакутуе, знаходзіцца ў небяспецы і ўлады краіны не хочуць ці не могуць абараніць сваё насельніцтва, прынцып суверэннасці дзяржавы губляе сваю сілу. Адказнасць абараніць мірных людзей «перакладаецца» ў такім разе на сусветную супольнасць.

Абмяркуйце дэталі такога аспекта сённяшняй міжнароднай палітыкі.

## Некаторыя азначэнні:

Часта можна чуць, што міжнародная сістэма — гэта анархічная сістэма. Слова «анархія» паходзіць з грэчаскага «анархас» і азначае «без кіраўніка». Міжнародная палітыка апісваецца як анархічная, паколькі няма ні дзяржаў, ні альянсаў дзяржаў, якія кіравалі б гэтай сістэмай. Няма ні цэнтральнага ўрада, ні суда, ні паліцыі. Тое, што ёсць, — гэта суверэнныя дзяржавы, непадсправаздачныя ніякай вышэйшай інстанцыі.

Суверэннасць дзяржавы засноўваецца на прызнанні насельніцтвам цэнтральнай улады на той ці іншай тэрыторыі і на прызнанні іншымі дзяржавамі. Прызнанне дзяржаў, аднак, не тое ж самае, што прызнанне ўрадаў. Непапулярныя дыктатарскія рэжымы суверэнныя не менш, чым дэмакратычныя. Суверэннасць з'яўляецца тады, калі ўладам дадзена легітымнасць, але не дзеяннем уладаў.

Прынцып суверэннасці — не абсалютны. Калі дзяржавы падпісваюць міжнародныя дамовы, яны ў некаторай ступені «аддаюць» сваю суверэннасць і бяруць на сябе абавязацельствы. Пазітыўныя бакі дамоваў лічацца больш «каштоўнымі», чым негатыўныя (г. зн. страта суверэнітэту).

Міжнародная супольнасць — гэта група дзяржаў, у якіх агульныя інтарэсы і якія ўдзельнічаюць у міжнародных арганізацыях для таго, каб дамагацца задавальнення гэтых інтарэсаў. Гэта азначае, што ў адносінах паміж дзяржавамі ёсць нарматыўны элемент: адносіны рэгулююцца пры дапамозе правоў і абавязкаў, а не толькі змаганнем за ўладу і сферы ўплыву.

У сучасным свеце існуе «напружанасць» паміж прынцыпам абсалютнага суверэнітэту дзяржавы і выкананнем міжнародных дамоваў. Калі, напрыклад, дзяржава парушае правы чалавека, ці можа яна працягваць карыстацца «прывілеямі», якія дае міжнароднае права? Напрыклад, заставацца ўдзельнікам ААН? Ці павінна сусветная супольнасць (ААН ці іншыя арганізацыі) мець права на гуманітарнае ўмяшальніцтва?



# ТЭМПЕРАТУРА ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА Ў ШКОЛЕ

**Тэма:**

Актуальнасць правоў чалавека ў нашым жыцці.

**Мэта:**

Удзельнікі павінны навучыцца аналізаваць сітуацыю з правамі чалавека ў рэгіёне і ў школе.

Правы чалавека — гэта не толькі нешта, што датычыць іншых людзей «недзе там». Гэта датычыць нас з вамі. У нашым паўсядзённым жыцці, у стасунках з другімі ў нас ёсць выбар: выконваць правы чалавека або парушаць іх. А як ідуць справы ў вашай школе?

**Практычная рэалізацыя:**

Дадзенае практыкаванне — даволі шырокае даследаванне. Выкананне практыкавання можа запатрабаваць супрацоўніцтва з кіраўніцтвам школы. Мэта — выявіць сітуацыі, якія патрабуюць паляпшэння і паправак.

**Час:** 1—3 гадзіны плюс час на падрыхтоўку.
**Што неабходна?** Вялікія лісты паперы і маркеры, анкеты, доступ да інфармацыі: Інтэрнэт.

**Парадак выканання:**

1. Кіраўнік прапануе ўдзельнікам даць ацэнку сітуацыі з правамі чалавека ў школе, запоўніўшы ацэначную анкету. Яны павінны ўважліва прачытаць пытанні і сур'ёзна падумаць, наколькі гэта адпавядае іх успрыманню атмасферы ў школе. Адказы па шкале ад 1 да 4, дзе адзнака 4 — лепшая. (20—30 хвілін)
2. Падрыхтуйцеся да агульнага абмеркавання, начарціўшы на дошцы ці вялікім лісце паперы шкалу ад 1 да 4. Папрасіце затым удзельнікаў адказаць на пытанні. Памятайце! Некаторыя ўдзельнікі могуць не захацець здаць свае адказы раней за іншых. Таму можна сабраць усе анкеты і раздаць іх зноў выпадкова, каб ананімнасць была захаваная.
3. Абмяркуйце адказы анкет, звяртаючы асаблівую ўвагу на наступныя моманты:
   а) Якія правы чалавека выконваюцца ў школе цалкам?
   б) Дзе, па вашым меркаванні, ёсць прававыя праблемы?
   у) Ці датычныя вы ці вашы сябры да стварэння такой сітуацыі?
   г) Ці рэпрэзентатыўныя запоўненыя анкеты для ўсёй школы? Ці можна чакаць іншых адказаў ад школьнікаў іншых класаў?

д) Што неабходна зрабіць, каб палепшыць прававое становішча ў школе? Што вы асабіста і вашы сябры можаце зрабіць, каб павысіць павагу да правоў чалавека ў школе?

4. Вярніцеся да пытання 12 аб адказнасці. Як група, што вы маглі б зрабіць, каб палепшыць сітуацыю? Складзіце спіс ідэй/ініцыятыў. Абмяркуйце іх у групе.

### Возьмем пад ўвагу:

Школа — грамадства ў мініяцюры. Правы чалавека могуць тут як паважацца, так і парушацца. Важна, каб у школе практыкавалася дэмакратыя і павага правоў чалавека. Такая атмасфера спрыяе, у сваю чаргу, супрацоўніцтву, цярпімасці і вялікім магчымасцям для самаразвіцця.

**Мы вывучаем правы чалавека не для таго, каб практыкаваць іх у будучыні, а рабіць гэта тут і цяпер!**



### Ацэначная анкета

Пытанні складзены, грунтуючыся на Еўрапейскай канвенцыі аб абароне правоў чалавека і асноўных свабод і пратаколаў да яе. Прачытайце ўважліва пытанні і добра падумайце, ці супадаюць яны з вашым меркаваннем і адчуваннем жыцця школы. Адказаць неабходна па шкале ад 1 да 4, дзе 4 — лепшая адзнака.

1 = не/ніколі    2 = рэдка    3 = часта    4 = так/заўсёды

| ПЫТАННЕ: | АДКАЗ: |
|---|---|
| 1. У маёй школе вучні адчуваюць сябе ў бяспецы і знаходзяцца пад абаронай. (Арт. 2 і 3) | |
| 2. Вучняў не дыскрымінуюць па прычыне абранага імі стылю ў адзенні, таварышаў або хобі па-за школай. (Арт. 14, пратакол 12) | |
| 3. Ва ўсіх роўныя магчымасці ў школе і доступ да рэсурсных матэрыялаў. (Арт. 14, пратакол 12) | |
| 4. Вучні і настаўнікі асудзілі б, калі б назіралі дыскрымінацыю і зневажальныя дзеянні або прадметы (Арт. 2, 9, Арт. 14, пратакол 12) | |
| 5. Пры ўзнікненні канфліктаў мы спрабуем вырашыць іх мірным шляхам, дамаўляючыся адзін з адным. (Арт. 2 і 3) | |
| 6. Пры выкарыстанні мер па падтрыманні дысцыпліны (уключаючы выправаджэнне і адлічэнне), усім гарантавана роўнае і бесстароннее стаўленне ў тым выпадку, калі кагосьці караюць, хтосьці вінаваты. (Арт. 6) | |
| 7. Асоба, якую абвінавачваюць у тым, што яна зрабіла нешта не так, невінавата да таго часу, пакуль не даказана адваротнае. (Арт. 6) | |
| 8. Мая прыватная прастора і ўласнасць паважаюцца. (Арт. 8; Арт. 1 пратакол 1) | |
| 9. У нашай школе добра прымаюць самых розных вучняў, настаўнікаў і адміністратараў, незалежна ад іх рэлігійнай або этнічнай прыналежнасці. (Арт. 1, 9, 10 і 14; пратакол 12) | |
| 10. Ва ўсіх у школе ёсць магчымасць удзельнічаць падчас прыняцця рашэнняў (асабіста або ў групе) для таго, каб выпрацоўваць школьную палітыку і правілы жыцця школы. (Арт. 3, 11; пратакол 1) | |
| 11. У вучняў ёсць дастаткова часу для адпачынку, неабходнага для вучобы ў добрых умовах. (Арт. 4) | |
| 12. Я адчуваю сваю адказнасць, калі назіраю выпадкі дыскрымінацыі ці паводзіны іншых, якія не спрыяюць бяспецы і камфортнаму знаходжанню ў школе. (Арт. 1 і 29) | |



# РАЗДЗЕЛ 5

## Міжкультурнае ўзаемаразуменне

*Габрыэль Гарсіа Маркес у «Адзіноце Лацінскай Амерыкі»:*

> *Гэта натуральна, што яны настойваюць на тым, каб вымяраць нас меркай, якую яны выкарыстоўваюць для сябе, забываючы, што разбуральныя дзеянні жыцця — не адно і тое ж для ўсіх і што пошукі нашай уласнай ідэнтычнасці з'яўляюцца настолькі ж цяжкімі і крывавымі для нас, як гэта было для іх. Інтэрпрэтацыя нашай рэчаіснасці з дапамогай «ненашых» вобразаў робіць нас толькі яшчэ больш невядомымі, несвабоднымі і адзінокімі*[34].

Часам бывае вельмі важна ўбачыць сябе збоку. Што, калі мы былі б іншымі, — якім чынам ацэньвалі б мы сябе? Такі мысліцельны эксперымент зрабіў бы нас разумнейшымі. Магчыма, мы лепш бы зразумелі сябе: чаму мы такія, якія ёсць? На адлегласці, абстрагаваўшыся, выразней відаць прычыны і перадумовы, якія нас сфарміравалі. Магчыма, мы б убачылі, што наша ўспрыманне сябе патрабуе карэкціроўкі. Магчыма, мы б убачылі, што мы — не такія свабодныя і самастойныя, як мы заўсёды думалі. Што мы «сфарміраваны» нашай вуліцай, горадам і краінай, бацькамі, культурай і рэлігіяй. Можна працягваць «марыць»: што, калі б я вырас(ла) у іншым месцы, напэўна, не быў(ла) бы такім ці такой. Паколькі тады ўжо іншыя людзі, іншая вуліца, горад і краіна, рэлігія і культура пакінулі б на мне свой след.

Можна «паэксперыментаваць» далей і падумаць: ці дасць нам новае ўспрыманне новае разуменне іншых? Цалкам можа быць, што яно таксама запатрабуе некаторыя новыя нюансы. Ці «сфарміраваны» іншыя гэтак жа, як і я: месцам, дзе выраслі і жылі; бацькамі, традыцыямі харчавання і музыкі. Агульнае для нас усіх — гэта тое, што нас фарміруе навакольнае асяроддзе.

Падобныя разважанні і пошукі — важныя для разумення іншых культур. Яны даюць нам неабходныя веды. Паколькі, грунтуючыся на ведах і разуменні, мы робім выбар і дзейнічаем. Мэтай дадзенай кнігі з'яўляецца таксама навучыць дзейнічаць. Нягледзячы на тое, што мы знаходзімся пад уздзеяннем акаляючай рэчаіснасці, у нас заўсёды ёсць свабода рабіць свой уласны выбар.

## Што такое міжкультурнае ўзаемаразуменне?

Міжкультурнае ўзаемаразуменне прадугледжвае здольнасць разумець працэсы, якія працякаюць у шматкультурных грамадствах. Фарміраванне гэтай здольнасці прадугледжвае асабісты рост, таму што адначасова з фарміраваннем новых ведаў расце эмпатыя і здольнасць да стасункаў і дзейнасці ў міжкультурным кантэксце. У пачатку мы дадзім азначэнне шматкультурнага грамадства, а затым абмяркуем асноўныя паняцці культуры і ідэнтычнасці. Гэта складаныя паняцці, і мы ўбачым, што на людзей уплываюць вельмі многія фактары. У кожнага чалавека ёсць сваё ўнікальнае спалучэнне якасцяў, сацыяльных роляў і вопыту. Людзі адной і той жа культуры могуць моцна адрозніваца адзін ад аднаго, у той час як людзі рознага паходжання могуць мець шмат агульнага.

Тое, што людзі розных культур жывуць побач, часта ўспрымаецца як праблема. Нярэдка праблемы тлумачацца культурнымі адрозненнямі. З чаго складаюцца культурныя адрозненні і чаму яны ўяўляюць для нас праблему? Мы ўбачым, што адрозненні робяць жыццё багацейшым, але адначасова могуць ствараць канфлікты ў грамадстве або паміж індывідамі. Цэлы шэраг важнейшых праблем звязаны не столькі з адрозненнямі як такімі, а з вобразамі, якія фарміруюцца ў народаў адзін пра аднаго, паводзінамі людзей у канфліктных сітуацыях. Як справіцца з выклікамі шматкультурнасці?

## Шматкультурнае грамадства

Гісторыя развіцця чалавецтва праяўляецца сёння ў кангламераце розных культур, традыцый, рэлігій і ладаў жыцця. Геаграфічнае становішча, прыродныя рэсурсы, клімат, міграцыя, арганізацыя ўлады, рэлігія і доўгі пералік іншых умоў з'яўляюцца вызначальнымі для развіцця культур. Складана падлічыць, колькі існуе ў свеце культур, таму што гэта залежыць ад таго, як мы вызначаем паняцце «культура». Калі зыходзіць з моўнай агульнасці, то ў свеце каля 5000 розных культур[35]. Калі падзяліць іх прыкладна на 200 краін свету, атрымаецца, што большасць дзяржаў шматкультурныя.

Якія характарыстыкі шматкультурнага грамадства? Самая важная — гэта суіснаванне розных культур, калі людзі і групы людзей рознага культурнага паходжання жывуць разам. У такім грамадстве ўзнікаюць так званыя шматкультурныя сітуацыі, калі людзі маюць адносіны адразу да некалькіх культур.

Шматкультурнае грамадства — грамадства з многімі рознымі культурамі, рэаліямі і людзьмі.

Прычыны таго, што сёння большасць грамадстваў можна назваць шматкультурнымі, звязаны з глабалізацыяй і імклівымі зменамі апошніх дзесяцігоддзяў. Часта кажуць, што свет стаў нам бліжэй. Сучасныя інфармацыйныя і камунікацыйныя тэхналогіі аказалі велізарны ўплыў на наша жыццё. Рэальнасць СМІ змянілася, і штодня мы даведваемся пра падзеі, якія адбываюцца далёка ад нас. Акрамя таго, рэзка вырасла міжнароднае абарачэнне тавараў, ідэй і культурных уздзеянняў. Свет стаў бліжэй і таму, што людзі больш падарожнічаюць сёння. Усяго 100 гадоў таму назад людзі даволі шмат падарожнічалі за межамі свайго горада, але

мала хто ездзіў за мяжу — гэта была прывілея шчасліўчыкаў і багатых людзей. Сёння мы падарожнічаем нашмат больш, часта ў самыя аддаленыя месцы на зямным шары. Гэтыя перамяшчэнні звязаны з працай, а таксама нашай цікаўнасцю і жаданнем выпрабаваць нешта новае і незвычайнае. Як правіла, мы вяртаемся дадому, узбагачаныя новымі ведамі і вопытам. Многія падарожнічаюць супраць сваёй волі, спрабуючы сысці ад вайны, канфлікту ці беднасці, у надзеі на лепшае жыццё ў іншым месцы. Таму сусветная супольнасць стала больш разнароднай і разнастайнай, чым раней. Людзі з розным колерам скуры, рознай нацыянальнасці, рэлігіі і культуры жывуць побач адзін з адным.

Падобную сітуацыю шматкультурнасці можна назіраць і ў Нарвегіі. Тэма, якая выклікае найбольш дэбатаў, — разнастайнасць культур у сучасным нарвежскім грамадстве. Вельмі часта можна чуць два меркаванні: першае — аб тым, што ў нарвежцаў няма вопыту сумеснага пражывання з людзьмі, «на іх непадобнымі»; другое — аб тым, што нарвежскае грамадства доўга было гамагенным або аднастайным, што датычыць культуры. Аднак гэта не зусім так. Саамы і такія этнічныя меншасці, як квены, фіны, цыгане і яўрэі, пражывалі на тэрыторыі Нарвегіі стагоддзямі. Краіна засялялася перасяленцамі. Нашы карані — у гэтых народах. Іншае пытанне — як далёка назад у гісторыю мы хочам ісці, каб знайсці свае карані.

Шматкультурныя грамадствы — сённяшняя рэчаіснасць. Сустрэча з людзьмі іншага паходжання ўзбагачае нас. Непадобнае часта выклікае цікавасць і можа прадставіць нам праблему з іншага боку. Абмен меркаваннямі і ідэямі розных людзей можа натхніць і прапанаваць новыя рашэнні, няважна, ідзе размова аб праблемах тэхналогіі, эканомікі, філасофіі ці мастацтва. Мы знаёмімся з іншымі звычаямі і традыцыямі, з новымі стравамі, модай, прычоскамі і фільмамі. Новыя светапогляды, рэлігіі і жыццёвыя каштоўнасці прыўносяць у жыццё разнастайнасць. Гісторыя паказвае, што змешванні культур узбагачаюць мастацтва, культуру і спрыяюць навуковаму прагрэсу. Без культурнага абмену мінулага жыццё не было б такім, якім яно ёсць сёння.

Шматкультурнае грамадства можа таксама прывесці і да складаных праблем. Развіццё адбываецца так імкліва і нераўнамерна, што спыніць яго складана, але складана і зразумець. Некаторыя людзі разглядаюць хуткае развіццё як пагрозу для сябе і грамадства ў цэлым. Адрозненні культур, недахоп ведаў і разумення паміж «карэнным» і прышлым насельніцтвам можа прывесці да абмежавання стасункаў і кантактаў. «Іншыя» могуць быць сустрэты з недаверам, касымі поглядамі, могуць узнікаць непаразуменні, страх і канфлікты, спалучаныя з гвалтам.

Наколькі б складанымі ні былі праблемы, мы павінны паспрабаваць вырашыць іх найлепшым чынам. Таму што адно, прынамсі, зразумела: шматкультурныя грамадствы прыйшлі да нас назаўжды, калі толькі людзі не пачнуць ужываць жорсткія сродкі, такія як этнічныя чысткі, масавыя дэпартацыі, інтэрнаванне або апартэід — усе гэтыя грубыя парушэнні правоў чалавека. Але для таго, каб у такіх грамадствах добра жылося, варта культываваць станоўчыя элементы культур і выкараняць адмоўныя. Для гэтага патрэбны веды, разуменне і дыялог. Абмеркаванні «шматкультурнасці» павінны датычыць грамадства, якое мяняецца, і ахопліваць прадстаўнікоў розных груп у грамадстве.

## Культура

Паняцці — гэта інструменты, якія мы выкарыстоўваем для апісання феноменаў і сувязяў. Паняцце культуры — адно з самых складаных паняццяў, паколькі яно ахоплівае так шмат. Вось простае азначэнне культуры: «Тое агульнае, што мае група людзей і што адрознівае яе ад іншых груп»[36]. Аднак гэтае азначэнне нічога не кажа аб тым, што стварае гэтыя культурныя асаблівасці, і аб змесце культуры. Ніжэй мы вылучым некалькі пунктаў гледжання, якія могуць быць карыснымі для разумення культуры і яе фарміравання.



Канстытуцыя «Зарачанскай рэспублікі» на розных мовах. Вільнюс, ліпень 2009 г.

**«Культурныя коды ў галаве»**

Звычайна культуру ўяўляюць як нейкую рэч, якая належыць пэўнаму народу, мае фізічныя межы і заснавана на мінулым[37]. Тыповым прыкладам гэтага можна лічыць нацыянальныя культуры, напрыклад нарвежскую, шведскую, самалійскую ці амерыканскую. У аснове гэтага ўяўлення

ляжыць гіпотэза аб тым, што, напрыклад, нарвежцы, якія пражываюць у адным месцы і падзяляюць гістарычную спадчыну, набываюць агульныя рысы, уласцівыя толькі ім.

У гэтым сэнсе культуру можна разумець як мадэль рэчаіснасці, якая знаходзіцца ў галаве індывіда і ўтрымлівае няпісаныя правілы паводзінаў, звароту да іншых людзей, уяўленні пра дабро і зло. Гэтыя правілы, якія мы засвойваем, з'яўляючыся членамі пэўнага грамадства, культуролаг Ёйвінд Дал называе «кодамі ў галаве»[38]. Напрыклад, існуюць коды, якія лічацца «нарвежскімі». Многія нарвежцы падзяляюць адзінае разуменне — агульны ключ да таго, як патрэбна тлумачыць нарвежскія выразы, у той час як яны недаступныя проста так любому чалавеку звонку. Усе нарвежцы разумеюць ідыёму «скакаць пасля Вірколы», але яна, верагодна, зусім незразумелая ненарвежцам. Такім жа чынам і ў іншых груп ёсць уласныя культурныя коды, якія нарвежцам нялёгка будзе зразумець. У гэтым сэнсе можна рабіць абагульненні аб культурных адрозненнях на нацыянальным узроўні. Існуюць адрозненні паміж Нарвегіяй, Самалі і В'етнамам. У Нарвегіі звычайнымі з'яўляюцца разводы і кансэнсуальныя шлюбы, у той час як у Самалі і В'етнаме яны рэдкасць. Іншымі словамі, ёсць значныя культурныя адрозненні паміж «намі» і «імі».

Паняцце «коды ў галаве» ўказвае на тое, што асобныя людзі маюць і выкарыстоўваюць сістэму культурных рэферэнцый. Таму кожная сустрэча паміж людзьмі становіцца сустрэчай культур, дзе сутыкаюцца коды, знакі, правілы і сістэмы. Калі нарвежцы едуць у адпачынак за мяжу, яны бяруць з сабой «нарвежскія коды». Яны, відавочна, будуць вітацца з іншымі людзьмі пры дапамозе поціску рукі, а не, напрыклад, прыціскаючыся насамі адзін да аднаго і не цалуючыся ў шчаку тройчы. Такім жа чынам турысты, эмігранты і іншыя людзі прыносяць з сабой свае культурныя коды, калі прыязджаюць у Нарвегію. Усе мы з'яўляемся носьбітамі культуры ў нашай сустрэчы з іншымі людзьмі.

Мы ўсе — носьбіты той ці іншай культуры.

Такое разуменне культуры распаўсюджваецца і на паняцце «субкультура». Субкультура — гэта больш дробная група ці супольнасць, якая мае выразныя агульныя прыкметы і каштоўнасныя перавагі, што аб'ядноўваюць яе. Можна сказаць, што ў субкультур існуюць уласныя «коды». У якасці прыкладаў можна назваць культуру матацыклістаў, скаўтаў, прадпрымальнікаў, моладзевую культуру і гэтак далей.

Субкультура — групы людзей ці меншыя па памеру супольнасці, у якіх ёсць аднолькавыя рысы.



Са сказанага можна зрабіць выснову, што людзі могуць належаць да розных культур у адзін і той жа час. Мы з'яўляемся адначасова носьбітамі нацыянальнай культуры і розных субкультур. У пэўных сітуацыях розныя культурныя ролі актывізуюцца і набываюць значнасць. На футбольным матчы вы перш за ўсё прыхільнік спортклуба «Валерэнга» і член фанацкага клуба «Клан», у той час як на наступны дзень на працы вы ўжо настаўнік. Такія «культуры» таксама, як правіла, хтосьці назірае збоку. Таму правамерна казаць аб культурных адзінствах, такіх, напрыклад, як «нарвежцы», «хрысціяне», «немцы», «медсёстры» і г.д. Катэгарызацыя людзей на падставе іх агульных прыкмет — гэта спосаб функцыянавання ў свеце і разумення свету, які дапамагае нам лягчэй мець стасункі адзін з адным.

Людзі могуць адначасова належаць да некалькіх культур.

Вышэй мы ўжо казалі, што культура — гэта «коды ў галаве». Аднак гэтыя коды не вызначаны раз і назаўжды, а могуць змяняцца падчас стасункаў паміж людзьмі. Адносіны і стасункі могуць прывесці да стварэння новых кодаў, якія індывіды канструююць самі ва ўзаемадзеянні з іншымі. Тут мы падыходзім да больш дынамічнага разумення культуры.

**Культура дынамічная**

Сёння ўсё часцей ставіцца пад сумнеў традыцыйнае разуменне культуры як чагосьці, чым людзі «валодаюць». У святле сённяшніх імклівых культурных зменаў і змешванняў з-за глабалізацыі становіцца ўсё складаней успрымаць культуру як нешта абмежаванае і статычнае. Наадварот, можна сказаць, што культура знаходзіцца ў пастаянным змяненні. Тое, што мы часта ўспрымаем як «нарвежскую культуру», можна назваць змешанай культурай, якая пастаянна ўпітвае ў сябе новыя імпульсы. Яна інтэрнацыяналізуецца і змяняецца ў выніку ўплыву СМІ, навукі, падручнікаў, індустрыі забаваў, глабалізацыі эканомікі, моды і стыляў. На гэтым фоне актуальна азначэнне культуры, якое даў Томас Хюланд Эрыксэн: «Культура — гэта зменлівая супольнасць людзей, якая штораз ствараецца і змяняецца, калі людзі робяць нешта сумесна»[39]. Культура — гэта не клетка, у якую можна заштурхаць людзей і спрабаваць зразумець іх «звонку», а хутчэй дынамічнае поле, якое ўзнікае падчас стасункаў паміж людзьмі. Новыя ўражанні і вопыт атрымліваюць актуальнасць, і падчас узаемадзеянняў людзей ствараюцца новыя культурныя рэферэнтныя рамкі. Культура — гэта ўсё тое, што ствараецца шляхам зносін і камунікацыі.

Культура — дынамічная і знаходзіцца ў пастаянным развіцці.



Абодва падыходы да разумення і станаўлення культуры (дынамічнасць і пастаянныя змены) з'яўляюцца важнымі інструментамі нашай інтэрпрэтацыі рэчаіснасці.

### Фарміраванне ідэнтычнасці

Разуменне працэсу фарміравання ідэнтычнасці з'яўляецца важным, калі мы працуем з праблемай міжкультурнага ўзаемаразумення. Чым лепш мы будзем ведаць, хто мы, тым лягчэй нам будзе разумець іншых.

Хто я? Я — жанчына. Мне 35 гадоў. Я — маці траіх дзяцей і «не вельмі» хрысціянка. Я — музыка і галасую за Левую партыю. Я — нарвежка, але я — і многае іншае. Калі вы спытаецеся іншых людзей пра тое, хто я, магчыма, яны не апішуць мяне так, як я толькі што сама сябе апісала. Ідэнтычнасць мае адносіны да таго, як чалавек апісвае самога сябе, з аднаго боку. З другога боку, якім чынам яго/яе апісваюць і ўспрымаюць іншыя людзі. Ідэнтычнасць дае нам азначэнне і спрыяе таму, што людзі розныя.

Наша ідэнтычнасць шматстайная, і мноства фактараў адыгрывае ролю ў яе фарміраванні. Некаторыя з іх непадуладныя нашай волі: у прыватнасці, нашы бацькі і акалічнасці нараджэння. Спадчыннасць і гены вызначаюць, якога колеру нашы вочы — блакітныя ці карыя і хто мы — хлопчык ці дзяўчынка. Да чаго мы больш схільныя — да тэорыі ці да спорту?

Культура таксама важная для фарміравання ідэнтычнасці. Тое, што людзі заўсёды носяць з сабой «схаваныя коды», з'яўляецца праявай таго, што мы выпрабоўваем на сабе ўплыў грамадства. Мова, на якой мы размаўляем, і нашы паводзіны адчуваюць на сабе ўплыў бацькоў, школы і акаляючага нас грамадства. Нарадзіўся я ў ЗША, Нарвегіі, Судане ці Кітаі? Жыву я ў забяспечанай ці ў беднай сям'і? Належу я да большасці ці да меншасці? Дамінуе ў грамадстве адна ці некалькі рэлігій? Мая сям'я рэлігійная ці не?

Афрыканская прыказка гаворыць: «Як ты думаеш пра мяне, так ты і ставішся да мяне: як ты на мяне глядзіш, як ты са мной абыходзішся, як ты да мяне прыслухоўваешся, — такім я і буду».

На працягу стагоддзяў абмяркоўвалася, у якой ступені людзі з'яўляюцца прадуктам спадчыннасці і асяроддзя, а ў якой — вынікам уласнай актыўнасці. Гэта ўсё цікавыя пытанні для абмеркавання і даследавання. Дзе заканчваецца «я» і пачынаецца «мы»? Праз кантакт з іншымі мы фарміруем асобу адзін аднаго. Самыя паслядоўныя сцвярджаюць, што па-за залежнасцю ад адносін з іншымі няма ніякага «я», паколькі індывіды фарміруюцца менавіта ў адносінах. «У пачатку былі адносіны», сцвярджае навукоўца Марцін Бубер.

Мы зыходзім з таго, што ідэнтычнасць чалавека з'яўляецца вынікам спадчыннасці, асяроддзя і ўласнай волі. Хаця мы не можам кантраляваць усе гэтыя фактары, усё ж мы многае вырашаем самі. Хачу я займацца ў тэатральнай групе, спяваць у хоры ці гуляць у гандбол? Я хачу стаць рокерам ці панкам, доктарам ці аўтамеханікам? Я выбіраю «Чырвоны альянс» ці «Прагрэсіўную партыю»? Распавесці мне аб сваёй гомасэксуальнасці ці працягваць утойваць яе? Ці буду я правяраць свае рэлігійныя сумневы? Хачу я жыць у горадзе ці ў вёсцы? Я хачу выйсці замуж за Кнута ці Ахмеда? Мы робім выбар на падставе каштоўнасцяў, якія маюць для нас важнае значэнне.

Калі мы паглядзім навокал, то пабачым, што ў грамадстве ёсць людзі, якія ідуць «супраць плыні», якія жывуць нетрадыцыйным і незвычайным чынам. Многія супраціўляюцца ціску грамадства, сям'і ці рэлігійнай суполкі і маюць дастаткова волі і мужнасці, каб ісці сваім шляхам. Калі ў вас паўстаў сур'ёзны канфлікт з бацькамі, то вы не можаце памяняць іх як сваіх біялагічных продкаў, але вы можаце парваць з імі адносіны ці прыкласці вялікія высілкі для таго, каб змяніць іх стаўленне да вас. Вера ў свабоду свабоднага выбару з'яўляецца асноўнай умовай нашай адказнасці за выбар, які мы робім, і за нашы дзеянні.

Ідэнтычнасць чалавека з'яўляецца вынікам спадчыннасці, асяроддзя і ўласнага выбару.

Вельмі важна задумвацца над падобнымі пытаннямі. Сэнс не ў тым, каб пагадзіцца з тым, што «правільна», а ў тым, каб разважаць і думаць аб прычынах, якія вядуць да фарміравання нас такімі, якія мы ёсць, і чаму мы становімся рознымі. Тут адыгрываюць ролю шмат розных фактараў. Томас Хюланд Эрыксан паспрабаваў вызначыць важнейшыя з іх: пол, мова, месца нараджэння, сваякі, нацыянальнасць, этнічная прыналежнасць, сям'я, узрост, адукацыя, індывідуальнасць, палітыка, лад жыцця, клас і рэлігія. У дадатак — тое, што перажыта раней, наш вопыт. Мы становімся рознымі, бо розныя фактары ўплываюць на стварэнне нашай ідэнтычнасці. Не існуе двух абсалютна падобных адзін на аднаго людзей. Мы ўсе — унікальныя і незаменныя індывіды.

Мы ўсе — унікальныя і незаменныя індывіды.

Няправільна вылучаць толькі адну якасць ці адзін бок чалавека. Гэтае ж адбываецца, калі мы падзяляем людзей на катэгорыі. Увогуле, першапачаткова няма нічога дрэннага ў тым, каб групаваць людзей па нейкіх адметных прыкметах. Наадварот, для людзей натуральна структураваць свет такім чынам. Але трэба разумець, што гэта таксама можа мець негатыўныя наступствы як для індывідаў, так і для грамадства. Мы можам адчуваць сябе дрэнна, калі нязменна вылучаюць толькі адну нашу якасць, бо мы значна больш за яе. Быць «тоўстым» ці «акулярыкам» — вялікі цяжар. Праблемы ўзнікаюць, калі адна якасць ці характарыстыка акцэнтуюцца ў сітуацыях, калі гэта не павінна мець ніякага значэння. Калі вы спрабуеце ўладкавацца на працу інжынерам, вашы рэлігійныя перакананні або колер скуры не павінны адыгрываць ніякай ролі. Многія людзі, напэўна, адчуваюць, што часта вылучаецца толькі адна іх якасць, якая можа адмоўна характарызаваць чалавека. Такія словы, як «эмігранты», «гомасэксуалісты», «цёмнаскурыя» і «мусульмане», успрымаюцца як катэгарызацыі, паколькі адна ўласцівасць або прыналежнасць акцэнтуецца на шкоду іншым і выкарыстоўваецца ў адмоўным сэнсе. Калі СМІ дастаткова часта будуць паведамляць, што «злачынства здзейсніў эмігрант», то эмігранты будуць адчуваць сябе аб'ектамі стыгматызацыі.

Катэгарызацыя людзей можа прывесці да таго, што ўражанні, якія ў нас ёсць адзін пра аднаго, сказяцца так, што асоба з яе рознымі ўласцівасцямі і сацыяльнымі ролямі «знікне». Калі мы адкрытыя і ўспрымаем адзін аднаго як цэласных людзей, то атрымаем больш цікавую, шматбаковую і правільную карціну свету.

Няправільна вылучаць у чалавеку толькі адну яго/яе якасць ці рысу характару.



## Ідэнтычнасць і сацыяльны кантэкст

Аказваючыся ў розных умовах і сітуацыях, выяўляюцца розныя бакі характару чалавека і яго ідэнтычнасці. Сацыяльны кантэкст «вызначае», якія аспекты нашай ідэнтычнасці рэлевантныя ў тым ці іншым выпадку. Дома мы — бацькі і каханыя, на працы мы — калегі, у вольны ад працы час — спартсмены або сябры.

Розныя аспекты ідэнтычнасці і прыналежнасці чалавека выяўляюцца ў розных сітуацыях.

Некаторыя аспекты ідэнтычнасці і прыналежнасці не паддаюцца зменам нават у тым выпадку, калі змяняецца сацыяльны кантэкст. Жанчына заўсёды застанецца жанчынай, і з узростам мала што можна зрабіць. Некаторыя аспекты могуць змяняцца. Дзіця, якое нарадзілася ў Нарвегіі ў пакістанскай сям'і, не выбірала само сваю прыналежнасць да меншасці, як і дзіця, народжанае ў этнічна нарвежскай сям'і, не выбірала сваёй прыналежнасці да большасці. Аднак абодва яны зведаюць пацвярджанне сваёй ідэнтычнасці ў паўсядзённым жыцці. Незалежна ад таго, як доўга чалавек родам з Пакістана пражыў у Нарвегіі, яго/яе будуць успрымаць як меншасць. Зменіцца сацыяльны кантэкст, зменіцца адпаведна прыналежнасць да меншасці або большасці. Калі чалавек родам з Пакістана падарожнічае па месцах, дзе шмат такіх, як ён(яна), будзь гэта ў Осла або Пакістане, ён(яна) становяцца часткай большасці. Гэтак жа і нарвежац, які вандруе па Афрыцы або па мікрараёне Грэнланд у Осла, дзе пражываюць у асноўным прадстаўнікі этнічных меншасцяў, становіцца прадстаўніком меншасці.

Некаторыя аспекты нашай ідэнтычнасці зменяцца, паўтараючы змены сацыяльнага кантэкста.

Новыя для нас соцыумы могуць «вылучыць» тыя ці іншыя аспекты нашай ідэнтычнасці без нашай магчымасці кантраляваць гэты працэс. Можа здарыцца, што мы выявім тыя бакі сваёй асобы, аб існаванні якіх і не падазравалі. Дзве нарвежскія вандроўніцы, якія наведалі сельскую мясцовасць у Кітаі дваццаць гадоў таму, распавядалі потым, як іх там высмеялі за доўгія насы. Такім чынам, толькі пасля таго, як яны сустрэлі людзей з іншым тыпам носа, нарвежскія кабеты звярнулі ўвагу на свае ўласныя насы. Гэта, відаць, падштурхнула вандроўніц да новых думак. Пазітыўных ці негатыўных — гэта ўжо іншае пытанне. Зыходзячы з таго, што часта мы самі выбіраем для сябе соцыумы, у нас няма неабходнасці быць у тым асяроддзі, у якім мы не хацелі б быць. Хутчэй за ўсё, і гэтыя вандроўніцы не вярнуліся больш у тую сельскую мясцовасць. Аднак, не




Беларускі праваабаронца Т. Рэвяка з чачэнскімі студэнтамі ў музеі рэпрэсаваных народаў. Інгушэція, студзень 2007 г.

заўсёды мы можам самі выбіраць сабе соцыумы. Людзі, якія падвяргаюцца, напрыклад, насмешкам у школе ці на працоўным месцы, з'яўляюцца прыкладам сацыяльнай стыгматызацыі. У такіх выпадках бывае цяжка, але трэба паспрабаваць памяняць школу/працу.

Быць уцекачом — таксама ідэнтычнасць, якую часта не выбіраюць, але якую ствараюць знешнія абставіны. Нягледзячы на тое, што такая ідэнтычнасць непажаданая, немагчыма ад яе пазбавіцца, паколькі яна «навешана» на чалавека большасцю. Калі падлетка з каранямі з Босніі спыталі, як доўга ён быў уцекачом у Нарвегіі, ён адказаў гнеўна: «Я пражыў у Нарвегіі большую частку майго жыцця. Колькі трэба мне тут пражыць, каб перастаць быць уцекачом?» Калі б той жа хлопчык вырашыў вярнуцца ў Боснію, у яго, напэўна, узніклі б падобныя праблемы. Хутчэй за ўсё, яго б не прымалі за «сапраўднага» баснійца, а за «паўнарвежца».

Часам тыя якасці, якія чалавек лічыць станоўчымі, могуць таксама быць падвергнутымі стыгматызацыі. Напрыклад, ярлык «выдатніка» ці чалавека, «які заўсёды робіць усё няправільна», можа быць праблематычным. Галоўная думка тут у тым, што іншыя людзі часта «вызначаюць» чалавека і яго/яе сутнасць. Хаця і могуць некаторыя ярлыкі быць станоўчымі, успрымаюцца яны вельмі часта як абмежаванні.



На чалавека могуць павесіць ярлыкі, якія ён/яна не хацеў(ла) бы мець.

У сённяшнім шматкультурным грамадстве тэрмін «ідэнтычнасць» з'яўляецца важным. Цікавасць да ідэнтычнасці выклікана не толькі нашай уласнай патрэбай у пошуку свайго месца ў зменлівай і разнастайнай рэчаіснасці, але і цікаўнасцю да людзей з іншых культур. Калі мы сустракаем людзей, якія думаюць і дзейнічаюць інакш, як мы, мы часта звяртаемся да паняцця культуры, каб зразумець: тлумачэнне ў тым, што ў іх іншая культура. Паколькі фарміраванне ідэнтычнасці — вельмі складаны працэс, абумоўлены шматлікімі фактарамі, апісанне культуры рызыкуе аказацца занадта спрошчаным. Розны вопыт стварае розных людзей. Але агульны вопыт можа па-рознаму паўплываць на розных людзей, хаця іх паходжанне і адукацыя з'яўляюцца больш-менш падобнымі. Людзі адной культуры могуць быць вельмі рознымі, у той час як людзі розных культур могуць мець шмат агульнага. Праваабаронца з Осла можа мець значна больш агульнага са сваім калегам з Беларусі, чым з таксістам са свайго роднага горада. Кожная сустрэча — гэта сустрэча двух асоб, а не культур.

Кожная сустрэча — гэта сустрэча двух асоб, а не культур.

## Стварэнне ідэнтычнасці ўцекачоў і эмігрантаў

Тысячы нарвежцаў — імігранты. Яны маюць адносіны да розных культур, ці, як гэта па-іншаму называецца, змешаную ідэнтычнасць[40]. Эмігранты ў Нарвегіі — вельмі разнастайная група людзей, што з'яўляюцца выхадцамі з больш чым двухсот краін. Некаторыя з іх — з сёлаў і непісьменныя, іншыя — з вышэйшай адукацыяй і высокімі пасадамі ў сваіх былых краінах.

Прыналежнасць да некалькіх культур можа абагачаць і быць каштоўнай. У чалавека ёсць тады ў распараджэнні вялікая пляцоўка для дзеянняў і лепшыя перадумовы разумення навакольнай рэчаіснасці. У некаторых атрымліваецца стварыць так званую культурную сумесь, дзе няма сэнсу раз'ядноўваць культуры. Для іншых жа прыналежнасць адразу да некалькіх культур, і ідэнтычнасць эмігранта можа аказацца даволі складанай справай; як у прыведзеным раней прыкладзе з баснійскім хлопчыкам.

Многія ўцекачы і эмігранты адчуваюць, што іх «прывязваюць» да іх новай краіны. Жыццё, якім яны жылі раней, да прыезду ў новую краіну, «знікае». Разам з ім «знікае» і былая ўпэўненасць у паўсядзённым жыцці ў выглядзе ўласнага дома, сям'і, дзяцей, сваякоў, сяброў, мовы і працы. Цяпер яны апынуліся ў незнаёмай для іх рэчаіснасці і павінны нанава «будаваць» сваё жыццё. Шмат гонару прыйдзецца «праглынуць», калі дарослым мужчынам і жанчынам, якія ўсё жыццё клапаціліся пра сябе самі, давядзецца шукаць дапамогі ў новай дзяржавы. Многія адчуюць, што

іх кваліфікацыі не ацэньваюцца на тым жа высокім узроўні, як «дома», і што сацыяльныя нормы радзімы «не працуюць» на новым месцы. Цяжка пачынаць спачатку і быць часткай новай рэчаіснасці. І хаця многія з іх спрабуюць вывучыць новую для іх мову, толькі меншасць з іх будуць размаўляць на новай мове без акцэнту. Наколькі будзе хапаць ім ведання мовы, настолькі шырокія будуць іх магчымасці ў жыцці.

Існуе і іншая дылема: на што абапірацца ў фарміраванні сваіх поглядаў і пры прыняцці рашэнняў? Часам іх каштоўнасці і нормы будуць уступаць у супярэчнасць з нарвежскімі. Ці абіраць ім добра знаёмыя з дзяцінства каштоўнасці ці каштоўнасці новага для іх грамадства? Часта такая дылема адносна выбару можа прыводзіць да расчаравання. Маладая дзяўчына з Самалі можа адчуць, што такія дзеянні, як клопат аб малодшых членах сям'і, дапамога па дому, цнатлівасць, павага да старэйшых не выклікаюць у грамадстве Нарвегіі такой жа вялікай павагі, як на яе радзіме. Больш за тое, каштоўнасці, якія сфарміравалі яе ідэнтычнасць, могуць не падабацца тут і не прымацца.

## Цяжкасці шматкультурнага грамадства

Калі абмяркоўваюцца цяжкасці шматкультурнага грамадства, адрозненні паміж культурамі выкарыстоўваюцца ў якасці аргументаў. Гіпотэза тады такая: цяжкасці звязаны з тым, што людзі — прадстаўнікі розных культур — жывуць поплеч. Мы яшчэ закранем адрозненні паміж культурамі і паглядзім, чаму яны могуць ствараць складанасці і праблемы. Але спачатку паглядзім, дзе культуры сустракаюцца і судакранаюцца паміж сабой. Пры сустрэчах адбываюцца кантакты і культурны ўзаемаабмен; пры сустрэчах жа ўзнікаюць складанасці і праблемы.

## Сустрэчы культур

Зыходзячы з таго, што ўсе мы — носьбіты той ці іншай культуры, любая наша сустрэча з іншымі людзьмі можа разглядацца як сустрэча культур. Мы сустракаемся адзін з адным на працоўным месцы, у школе, у грамадстве, «у літаратуры» і г.д.

Заўсёды цікава сустрэць людзей іншай культуры, адрознай ад нашай. Мы вучымся, развіваемся і атрымліваем новыя імпульсы і ідэі. Аднак, паколькі ў нас ёсць «сваё» разуменне «нармальнасці», такія сустрэчы могуць быць часам праблематычнымі. Людзі іншай культуры могуць мець «іншае» разуменне звычаяў і традыцый і кідаць выклік, такім чынам, нашым перакананням. Іншымі словамі, у нас розныя чаканні, калі мы сустракаем адзін аднаго. Чым ярчэй выяўлены адрозненні, тым складаней могуць быць сустрэчы паміж культурамі. Мы можам аказацца ў разгубленасці, не разумець, здзіўляцца і нават раздражняцца. Зыходзячы з некаторых нашых закаранелых перакананняў, мы можам паставіцца да іншай культуры не з цікавасцю і «адкрытым» мысленнем, а з негатыўнымі стэрэатыпамі. Таму нам неабходна працаваць над сабой, каб падобныя сустрэчы ўзбагачалі нас, а не наадварот.

Зразумець адзін аднаго можа быць складана, паколькі многія элементы нашай культуры непрыкметныя для нас. Яны як верхавіна ледніка, якую звычайна толькі і можна ўбачыць, паколькі вялікая частка схавана ад вачэй пад вадой. Такім жа чынам мы бачым толькі «малую частку» культуры. Архітэктура, будынкі, літаратура, жывапіс, стыль адзення, музыка, мова, ежа і інш. — гэта тое, што відаць на паверхні. Нябачная частка — гэта гісторыя, рэлігія, лад жыцця, нормы і каштоўнасці, адносіны да часу і прасторы, прыроды і г.д.

З-за таго, што ў нас ёсць уласнае разуменне таго, што з'яўляецца «звычайным», і паколькі многія элементы не бачныя адразу, узнікаюць непаразуменні і праблемы. Нарвежка будзе хутчэй за ўсё абражана, калі мужчына-мусульманін адмовіцца вітацца з ёй за руку. У падобнай сітуацыі пажадана ведаць пра некаторыя аспекты мусульманскай культуры і пра тое, што не зусім звычайна, калі мужчыны і жанчыны ціснуць адзін аднаму рукі ў знак вітання. Калі б нарвежка ведала пра гэта «ўтоенае» правіла, яна б не ўспрымала падобную сітуацыю як непрыманне яе канкрэтнай персоны. Тое, што людзі ўкладваюць розныя значэнні ў словы і паняцці, таксама з'яўляецца формай «нябачнага багажу». Такія паняцці, як час, сям'я, гонар, вернасць, сорам і здрада, маюць розныя значэнні ў розных культурах.

Тое, што мы не заўсёды разумеем адзін аднаго, неабавязкова азначае, што мы зусім розныя і маем на ўвазе розныя рэчы. Гэта можа быць вынікам «нябачнай» культуры». Чым даўжэй мы маем зносіны адзін з адным, тым больш «нябачных» элементаў культуры мы выяўляем. Чым больш мы вучымся адзін у аднаго, тым больш непаразуменняў можна будзе пазбегнуць.

## Этнацэнтрызм і культурны рэлятывізм

Сустракаць носьбітаў іншых культур мы можам або з пазіцый этнацэнтрызму, або культурнага рэлятывізму. Ёйвінд Дал дае наступныя тлумачэнні дадзеным паняццям: «Мы — этнацэнтрысты, калі лічым, што наша манера паводзін і лад жыцця, нашы крытэрыі «нармальнасці», наша культура — самыя лепшыя. Этнацэнтрыст звычайна здзіўляецца: «Як іншыя могуць не разумець гэтага?» Супрацьлеглым этнацэнтрызму, адзначае спадар Дал, ёсць культурны рэлятывізм. Абсалютна ўсё разглядаецца ў такім выпадку як адноснае, у кожнага сваё разуменне. Мы не можам, такім чынам, выкарыстоўваць нейкую стандартную меру ў адносінах да традыцый іншых і незнаёмых людзей. Усе выказванні, учынкі і выпадкі павінны разумецца зыходзячы з іх кантэксту. Калі чалавек — на

сто працэнтаў культурны рэлятывіст, гэта можа прывесці ў выніку да абыякавасці, якая робіць немагчымым адрозніванне культурных працэсаў па іх якасці, маралі і ўзроўню развіцця[41].

Дал кажа аб немагчымасці існавання на практыцы чыста этнацэнтрысцкіх ці культурна-рэлятывісцкіх адносінаў. Мы згодны з ягоным меркаваннем. Этнацэнтрыст не задаў бы таго пытання, што мы задалі ў пачатку раздзела пра бачанне самога/самой сябе збоку. Мы лічым, тым не менш, гэта разумнай тактыкай. Паколькі ўсе мы падвяргаемся ўплыву навакольнай рэчаіснасці, нам неабходна імкнуцца да настолькі нейтральнай пазіцыі, наколькі гэта наогул магчыма, быць адкрытым і ставіцца да іншых людзей з павагай[42].

Развіваць у сабе здольнасць да суперажывання і паставіць сябе на месца іншых вельмі важна таксама і пры сустрэчы з новымі людзьмі. Гэта называецца тады здольнасцю выходзіць за межы сваёй культуры і адкрывацца новаму і нязведанаму. Гэта вельмі цікавы працэс, дзе мы расцем над сабой. Уменне ставіць сябе на месца іншых дае нам магчымасць лепш зразумець іншых людзей. Тое, што раней мы лічылі іншым, зменяецца. Адрозненні могуць станавіцца ўсё больш непрыкметнымі, а то і зусім знікнуць. Часам нашы ідэі, звычка думаць і верыць натыкаюцца на новыя, невядомыя нам ідэі. Калі вытрымаюць яны, будзем мы адчуваць сябе ў большай бяспецы. Калі не вытрымаюць, мы можам смела іх адкінуць і думаць па-новаму.

Быць адкрытым не азначае аўтаматычнага станоўчага ўспрымання звычак іншых людзей ці поўнай павагі іншых культур. Паколькі тады існуе небяспека так званай нармалізацыі: калі чалавек не толькі прызнае «іншае, непадобнае», але і ўхваляе яго. Правы чалавека ў такім выпадку — добры арыенцір для ўсталявання межаў дапушчальнага. Дыскрымінацыя, жаночае абразанне, гвалтоўнае выдаванне замуж, забойства, катаванні і іншыя парушэнні правоў чалавека не павінны дапускацца ні ў якім выпадку.

Мы павінны паспрабаваць зразумець усё, але не ўсё прыняць.
Парушэнне правоў чалавека прымаць нельга.

## Падабенствы культур

Больш за ўсё кажуць пра адрозненні паміж культурамі. Магчыма, гэта натуральна, таму што найперш мы заўважаем тое, што нас адрознівае ад іншых. Аднак, робячы акцэнт на адрозненнях, мы губляем многае, у прыватнасці падабенствы. Для таго, каб захаваць баланс і не перабольшваць значэнне адрозненняў, варта падрабязней спыніцца на падабенствах паміж культурамі. Бо розныя культурныя звычаі і традыцыі можна ўспрымаць і як варыянты чагосьці агульначалавечага.

Нарвежскія нацыянальныя строі адрозніваюцца ад традыцыйных убораў Фіджы і Іспаніі. Аднак гэтыя краіны аб'ядноўвае тое, што ва ўсіх іх ёсць нацыянальныя строі. Хаця краіны і рэгіёны маюць свае спецыфічныя традыцыі песень, але агульнай для ўсіх іх з'яўляецца сама іх наяўнасць. Культура песні з'яўляецца праявай патрэбы людзей у самавыяўленні, сацыяльнай агульнасці і выказванні сваіх пачуццяў з дапамогай музыкі. Так, розныя традыцыі будаўніцтва і архітэктуры можна растлумачыць праз агульную патрэбу ў абароне ад непагадзі і ветру, у той час як рэлігіі можна разумець як варыянты задавальнення патрэбы ў тлумачэнні таемства жыцця і стварэнні агульных маральных норм. Культурныя асаблівасці можна разумець як лакальныя формы выражэння чагосьці агульнага.

Культурныя адрозненні могуць разумецца як варыяцыі таго, што ёсць ва ўсіх людзей агульнага.

## Адрозненні культур і наступствы

Адрозненні культур могуць разумецца як адрозненні наогул паміж людзьмі. Нашы асаблівыя характарыстыкі адрозніваюць нас ад іншых людзей. Самыя яркія адрозненні мы можам бачыць, чуць, нюхаць. Людзей адрознівае манера апранацца, густы ў музыцы, танцы, баўленне часу. Некаторыя адрозненні заўважныя не адразу.

Пара з Нарвегіі была аднойчы на адпачынку ў Гамбіі і дамовілася з мясцовымі жыхарамі паехаць па моры. Сустрэчу прызначылі на 10 гадзін. У прызначаны час нарвежцы былі на месцы, гамбійцы — не. Чым больш часу праходзіла, тым больш раздражняліся нарвежцы. Калі нарэшце гамбійцы з'явіліся на месцы, пара не вытрымала: «Чаму вы прыйшлі так позна? Вы не цэніце наш час!» — «Мы цэнім ваш час, — адказалі гамбійцы спакойна. — Ваш час належыць вам, і вы самі распараджаецеся, як яго патраціць».

Рознае разуменне часу — гэта адрозненне культур. Прыведзены прыклад паказвае, што раздражненне — частая рэакцыя на выклік нашаму разуменню «нармальнасці» (у дадзеным выпадку — прыйсці своечасова). Прыклад таксама ілюструе, што сустрэчы прадстаўнікоў розных культур могуць навучыць чамусьці новаму.

Рознае разуменне часу — рознае і ў некалькі іншым разуменні дадзенага слова. Для некаторых гісторыя з'яўляецца важным фактарам для стварэння ідэнтычнасці. У той час як большасць нарвежскіх дзяцей не ведаюць свайго роду далей бабуль і дзядуль, самалійскія дзеці могуць назваць па імёнах сваіх самых далёкіх сваякоў. Так, разглядаць сябе як звяно ў ланцужку гістарычнага развіцця можа быць важным для адных людзей і зусім няважным для іншых.

Калектывізм — індывідуалізм — іншая вось, па якой адрозніваюцца культуры. Ці лаяльныя людзі больш да супольнасцяў і гатовы рабіць тое, што чакае ад іх калектыў, або мэта іх жыцця — ажыццявіць сваё ўласныя жаданні і рэалізаваць сябе? Адносіны паміж мужчынамі і жанчынамі — яшчэ адзін фактар, які вызначае адрозненні паміж культурамі. Ці выразна размежаваны і вызначаны іх ролі, ці ў іх больш-менш аднолькавыя правы на ўдзел у грамадскім жыцці?

У дадатак да пералічаных адрозненняў ёсць і іншыя: якім чынам людзі ставяцца да рэлігіі? Пабудавана жыццё грамадства на рэлігійных догмах ці не? Ці мірацца людзі з тым, што ўлада не пароўну размеркавана ў грамадстве? Ці прынята паказваць свае пачуцці на публіцы? Што лічыцца прэстыжным у грамадстве: ролі ў адпаведнасці з усталяванымі традыцыямі і іерархіяй ці адукацыя, высокі прыбытак і ўдзел у рэаліці-шоу на тэлебачанні? Адрозненні «ўсплываюць», калі прадстаўнікі розных культур сустракаюцца або сутыкаюцца адзін з адным.

Рэакцыя людзей на адрозненні культур залежыць ад таго, як часта той ці іншы чалавек сустракаў прадстаўнікоў іншых культур. У краінах, куды прыехала даволі вялікая колькасць эмігрантаў за кароткі перыяд, будзе адбывацца больш культурных сутыкненняў, чым у краінах, дзе змены адбываліся не так радыкальна. Тое, якім чынам дзяржавы спраўляюцца з адрозненнямі культур, мае вялікае значэнне. Нарвегія заўсёды вяла даволі «асцярожную» іміграцыйную палітыку, так што людзі паступова прывыкалі жыць бок у бок з людзьмі — прадстаўнікамі іншых культур.

### «Багатае» грамадства

Разнастайнасць шматкультурнага грамадства дае нам больш магчымасцяў выбару. Калі мы выбіраем японскую, індыйскую або в'етнамскую кухню ці калі мы спыняемся на вуліцы, каб паслухаць заморскую музыку, — усё гэта відавочныя і станоўчыя вынікі шматкультурнасці ў грамадстве. Мы так прывыклі да такога прывілеяванага становішча рэчаў, што рэдка задумваемся над гэтым.

Я падымаюся раніцай і гляджу на каляндар, які быў прыдуманы ў часы Рымскай імперыі. За лічбы мы можам дзякаваць арабскаму свету. Я нацягваю на сябе блакітныя джынсы, якія «родам» з ЗША, швэдар з Расіі і накідваю шаль, якую я купіла ў Індыі. Па радыё чуюцца афрыканскія рытмы. Я саджуся за сняданак, п'ю кітайскую гарбату і ем французскі паштэт. Артыкул у ранішняй газеце, надрукаванай «дзякуючы» вынаходніку — немцу Гютэнбергу, напісаны журналістам з Палестыны. Я думаю аб запланаванай на сёння сустрэчы з чачэнцам Цімурам, адным з маіх вучняў. Як трэба сустрэць яго? І не забыцца б забраніраваць білет у Турцыю.



Тое, што людзі розныя, як правіла, не з'яўляецца праблемай. Тое, што ў людзей розныя рысы твару, хобі, адзенне і г.д., звычайна ўспрымаецца добра. Розныя палітычныя інтарэсы і погляды таксама ў асноўным паважаюцца. Адрозненні не ўспрымаюцца як нешта негатыўнае і не перашкаджаюць камунікацыі. Група дзяўчынак-падлеткаў па дарозе ў рэстаран піцы можа спрачацца аб тым, якую піцу замовіць, таму што каму-небудзь з іх у сілу сваёй культуры не дазволена есці свініну. Гэта звычайная справа сёння, і дзяўчынкі, безумоўна, знойдуць тое, што задаволіць усіх.

Калі людзі розных культур сустракаюць адзін аднаго адкрыта і з павагай, такія сустрэчы могуць быць станоўчымі. Заходнім людзям, якія пастаянна знаходзяцца ў стрэсавым стане, карысна было б сустракаць часцей афрыканцаў з іх больш дасканалым разуменнем часу і камфорту. Многіх бацькоў радуе тое, што іх дзеці ўжываюць менш алкаголю ў выніку зносінаў з дзецьмі эмігрантаў-мусульман[43]. Бізнэсмэны — прадстаўнікі традыцыйных культур — таксама многаму могуць навучыцца ў бізнэсмэна-нарвежца, які можа спыніць сход, бо яму час забіраць сваіх дзяцей з дзіцячага садка.

Шматкультурнае грамадства — багатае грамадства таксама і таму, што ў ім вырастаюць людзі з экстразапасам звычаяў і традыцый, якія могуць прынесці новыя каштоўнасці і магчымасці. «Піянерамі» ў Нарвегіі называюць маладых людзей цёмнага колеру скуры, пра якіх напісалі кнігу «Маладыя, цемнаскуры і нарвежац»[44]. Піянер — значыць першапраходзец. Дадзены тытул даецца ім найперш за іх валоданне рознымі культурамі і ўменне бачыць грамадства як са знешняга, так і з унутранага боку.

### Сутыкненні культур

У асобных выпадках адрозненні паміж культурамі могуць прывесці да канфліктаў і супярэчнасцяў у грамадстве. Большасць канфліктаў можна вырашыць, спрабуючы зразумець іх прычыны, гэта значыць культурныя асаблівасці ўцягнутых у канфлікты бакоў.

Многія нарвежскія школы сутыкнуліся з такой праблемай, што некаторыя этнічныя ці рэлігійныя групы забараняюць, каб староннія бачылі аголенае цела чалавека. Гэта прывяло да праблем у школах, звязаных з прыняццем школьнікамі душа пасля заняткаў фізкультурай. Пасля таго, як бакі ўступілі ў дыялог, школы знайшлі рашэнне гэтай праблемы. Жаданне мусульман мець пакой для малітвы таксама выклікала бурныя грамадскія дэбаты. Першы раз, калі гэта пытанне было паднята, многія адрэагавалі адмоўна, таму што лічылі, што рэлігія — гэта асабістая справа кожнага, і грамадскія ўстановы, як і прыватныя прадпрыемствы, не павінны аплачваць падобныя памяшканні. Аднак паступова гэта патрэба атрымала прызнанне, і сёння ў краіне ёсць шэраг пакояў для малітваў.

Яшчэ адна праблема рэлігійнага плану выявілася, калі асобныя мячэці захацелі склікаць вернікаў на пятнічную малітву, выкарыстоўваючы гучнагаварыцелі. Пасля доўгіх дыскусій, дзе, у прыватнасці, была праведзена паралель з нарвежскімі званамі, было прынята рашэнне, якое задаволіла ўсіх: скліканне на пятніцкую малітву было дазволена, але была ўсталявана максімальная мяжа гучнасці.

Многія з культурных праблем, якія раней лічыліся складанымі, паступова знайшлі сваё вырашэнне. Сёння нярэдка можна ўбачыць нарвежскіх салдат у цюрбанах ці супрацоўніц крамы «ІКЕЯ» ў хіджабах; яны — жывы прыклад шматкультурнасці. Напэўна, і сённяшнія канфлікты і балючыя тэмы гэтак жа знойдуць сваё вырашэнне ў будучыні.

**Традыцыйныя і сучасныя грамадствы**

Часта канфлікты культур тлумачаць тым, што прадстаўнікі «традыцыйных» і «сучасных» грамадстваў жывуць разам, і тым, што культуры супрацьстаяць адна адной.

Працэс мадэрнізацыі апісвае развіццё грамадства ў выніку ў тым ліку тэхналагічных і прамысловых зменаў. Аграрнае грамадства, заснаванае на натуральным абмене, знікае, саступаючы месца міжнароднай грашовай эканоміцы і аплачваемай працы. Змяняецца і лад жыцця людзей. Часта адбываецца пераход ад калектыўнай культуры да індывідуальнай і ад традыцыйных роляў да большага раўнапраўя паміж паламі і абароны правоў жанчыны. Лакальныя, часта патрыярхальныя грамадскія структуры саступаюць нацыянальным і міжнародным законам і інстытутам. Такія функцыі сям'і, як выхаванне дзяцей і догляд састарэлых, матэрыяльная падтрымка дзяцей у пачатку іх дарослага жыцця, у значнай ступені перакладаюцца з плячэй бацькоў на дзяржаву. Секулярызацыя грамадства, калі паніжаецца значэнне рэлігіі, таксама з'яўляецца следствам мадэрнізацыі.

Дзяржавы і грамадствы вельмі па-рознаму перажываюць працэс мадэрнізацыі, які можа працякаць як паступова, так і рэзкімі скачкамі. Унутры дзяржаў традыцыйнае часта суседнічае з сучасным. Нарвегія, як і большасць заходніх краін, — прыклад тыповай сучаснай дзяржавы. Дзякуючы эміграцыі ў краіне пражывае шмат людзей — выхадцаў з традыцыйных грамадстваў.

Параўнанне традыцыйнае — сучаснае можа падвяргацца крытыцы, паколькі яна можа стварыць уражанне, што сучаснае грамадства лепшае і больш развітае, чым традыцыйнае. Такая перспектыва можа ўмацаваць стэрэатыпы адносна людзей — прадстаўнікоў традыцыйнай культуры. Мы хацелі б падкрэсліць, што не падзяляем меркаванне аб тым, што мадэрнізацыя заўсёды ўяўляе рух наперад, бо на шляху да мадэрнізацыі могуць быць згублены станоўчыя элементы і каштоўнасці. З іншага боку, нельга з упэўненасцю сказаць, што трэба безумоўна прытрымлівацца ўсіх элементаў традыцыйнай культуры. Каштоўнасці і дзеянні трэба ацэньваць паасобку. Хаця выбар слоў можа падацца некалькі няўдалым у дадзеным апісанні, мы лічым, што такі аналіз важны для лепшага разумення канфліктаў паміж культурамі.

Людзей, якія выраслі ў традыцыйнай культуры, можа расчароўваць жыццё сучаснага грамадства. Многія жанчыны могуць адчуваць ціск як з боку сваёй традыцыйнай культуры, так і з боку сучаснай. Некаторыя ўспрымаюць як праблему тое, што каштоўнасці, у якіх яны былі выгадаваны і якія адстойваюць, не прызнаюцца важнымі ў новым грамадстве, як, напрыклад, нізкі статус у грамадстве жанчыны — хатняй гаспадыні. Некаторыя жанчыны знаходзяць прывабнымі новыя каштоўнасці свабоды і асабістай незалежнасці і хацелі б мець больш незалежнае становішча, чым прынята ў іх культуры. Такое жаданне жанчын можа сустрэць супраціў з боку патрыярхальнай структуры сям'і. Сваякі-мужчыны баяцца, што жанчыны становяцца занадта заходнімі на шкоду сям'і і самім жанчынам. Так, мужы могуць лічыць, што іх роля пад пагрозай, і адчуваць няўпэўненасць у адносінах да каштоўнасцяў новай культуры.

Дзеці і падлеткі — прадстаўнікі нацыянальных меншасцяў — могуць адчуваць, што яны стаяць адной нагой тут, другой — там, а іх паўсядзённае жыццё складаецца з бясконцай змены двух розных кантэкстаў. Сям'я можа вылучаць строгія патрабаванні паслухмянства і павагі і ісці насуперак таму, што дзеці вывучаюць у нарвежскіх школах аб незалежнасці і самастойнасці. Для закаханых могуць быць цяжкімі строгія сямейныя правілы, калі яны бачаць, што нарвежскія падлеткі паводзяць сябе нашмат вальней. А што, калі падлеткаў запрашаюць на вечарынку ці паехаць у лагер з класам, а бацькі ставяцца да гэтага скептычна? Калі яны на вечарынцы, ці павінны яны паддацца ціску аднакласнікаў ужываць алкаголь, ці паважаць забароны рэлігіі і бацькоў? У культурах, дзе распаўсюджаны шлюбы па дамоўленасці бацькоў, маладыя людзі могуць сутыкнуцца з больш сур'ёзнай дылемай: ці павінны яны прыняць абранага бацькамі мужа, ці зрабіць свой уласны выбар, рызыкуючы ўступіць у канфлікт з сям'ёй? Незалежна ад таго, які выбар яны зробяць, ён усё роўна будзе няправільным.

> «Калі я раблю нешта не так, мой бацька кажа мне: «Глядзі ўніз! Пакажы мне павагу!» У той жа час настаўнік кажа: «Глядзі мне ў вочы, пакажы мне павагу!»
>
> Лавілін Рыхель Брэнна[45]

Названае — усяго толькі невялікі пералік асабістых праблем, з якімі могуць сутыкнуцца тыя, хто як бы знаходзіцца паміж дзвюма культурамі.

Дыхатамія «традыцыйнае» і «сучаснае» крытыкуецца за спрашчэнне рэчаіснасці. Тут важна сказаць, што ёсць мноства прыкладаў, якія ідуць насуперак гэтай мадэлі і ствараюць больш складаную рэчаіснасць. Людзі — выхадцы з традыцыйных культур — могуць мець сучаснае, ліберальнае стаўленне да пытання аб раўнапраўі палоў, у той час як прадстаўнікі сучаснага грамадства могуць быць кансерватыўнымі ў пытаннях змагання за правы жанчын, рэлігіі і адносінаў да гомасэксуалізму. Многія этнічныя нарвежцы, асабліва прадстаўнікі некаторых хрысціянскіх абшчын, маюць вельмі строгія коды адзення, забарону на ўжыванне спіртных напояў і моцнае жаданне кантраляваць падлеткаў. Падлеткі з такіх сем'яў могуць у той жа ступені, што і дзеці эмігрантаў, адчуваць унутраны раскол. Міжкультурнае ўзаемаразуменне звязана са складанасцю міжасабовых адносін, з аднаго боку, і з культурнымі кодамі ў галаве — з другога. Нам неабходна памятаць, што сустракаюцца заўсёды два індывіды, а не дзве культуры.

Пра дзяцей эмігрантаў гавораць: «Ні тут, ні там».

Мы хочам сказаць: «І тут, і там».

## Павага да «непадобных» людзей

У грамадстве, дзе адбываецца змешванне культур, людзі могуць палічыць некаторыя звычаі другіх чужымі і дзіўнымі. Заўсёды знойдуцца рэчы, з якімі цяжка пагадзіцца. Аднак, у пераважнай большасці, людзі мірна суіснуюць адзін з адным. Гэта даказвае, што мы не абавязкова павінны быць аднолькавымі, каб паважаць адзін аднаго.

Многія нарвежцы, напэўна, не прымаюць адмову мужчын-мусульман вітацца з прадстаўніком супрацьлеглага полу за руку ці нашэння мусульманскімі жанчынамі хіджаба. Аднак гэта дапускаецца. Такія элементы некаторых эмігранцкіх культур, як, напрыклад, патрыярхальна-іерархічная структура сям'і, строгія рэлігійныя правілы, гвалтоўная выдача замуж, могуць не падабацца шмат каму, але з імі ўсё роўна прыходзіцца ўжывацца. Некаторыя прадстаўнікі меншасцяў, у сваю чаргу, могуць негатыўна рэагаваць на звычкі і традыцыі большасці. Ім можа не падабацца высокі працэнт разводаў, звычка ўжывання алкаголю, секулярызм і тое, што называецца непрыстойным адзеннем. Таксама адносіны да старасці і старых людзей могуць выклікаць здзіўленне. Нягледзячы на гэта, прадстаўнікі меншасцяў талерантныя да таго, што большасць нарвежцаў жыве менавіта так.

Сутыкненні культур адбываюцца не толькі паміж этнічнымі нарвежцамі і эмігрантамі. Мы ўжо казалі, што некаторыя хрысціянскія абшчыны могуць мець такія строгія правілы, як забарона дзяўчатам насіць штаны, выступаць на сходах, танчыць або мець сэксуальныя адносіны да замужжа. Як і іншыя культурныя групы, яны не прымаюць ужывання алкагольных напояў і гомасэксуальных адносін. Ёсць групы маладых людзей у грамадстве, адносіны да якіх з боку большасці даволі амбівалентныя. Гэта маладыя людзі з пірсінгам, татуіроўкамі, прычоскамі іракез, у доўгім чорным адзенні, з нячэсанымі валасамі і г.д. Тым не менш людзі цярпімыя да іх стылю і ладу жыцця.

Вядома, выпадкі дыскрымінацыі і расізму здараюцца і ў Нарвегіі, хаця большасць людзей, хутчэй за ўсё, не ахарактарызуюць нарвежскае грамадства як расісцкае[46]. Іміграíнты, напэўна, успрымаюць нарвежскае грамадства як расісцкае ў большай ступені, чым этнічныя нарвежцы. Так, кожны трэці эмігрант сцвярджае, што зведаў(ла) дыскрымінацыю на працоўным месцы. Важна працаваць над выкараненнем дадзенай праблемы як для людзей, якіх гэта закранула, так і для грамадства ў цэлым. Інструменты вырашэння не павінны быць накіраваны толькі на этнічных нарвежцаў, паколькі крыніцамі расізму могуць быць як тыя, так і другія[47]. Тым не менш мы хацелі б яшчэ раз падкрэсліць, што большасць насельніцтва ў Нарвегіі не расцэньвае грамадства як расісцкае і лічыць расавую дыскрымінацыю не вельмі распаўсюджанай праблемай[48]. Праблема можа раздувацца ў сродках масавай інфармацыі, але калі справа даходзіць да адносін паміж людзьмі, тыя паводзяць сябе ветліва і пачціва ў адносінах адзін да аднаго. Людзі розныя, але так і павінна быць. Калі толькі выбар каштоўнасцяў і ладу жыцця добраахвотны і абраныя каштоўнасці не канфліктуюць з правамі чалавека, выбар іншых людзей неабходна паважаць, нават калі ён адрозніваецца ад нашага ўласнага выбару.

Адносна пытанняў, з якімі мы не згодны, неабходна весці адкрытыя дыскусіі. Неабходна выкарыстоўваць свае права свабоды слова і выказвання, удзелу ў жыцці грамадства і прыняцці рашэнняў. Дэмакратыя будуецца на тым, што людзі рацыянальныя і робяць разумны выбар. Вельмі важным з'яўляецца доступ да актуальнай інфармацыі. Таму нам не трэба баяцца цяжкасцяў зносін. Можа быць, балюча выцягнуць канфлікт наверх. Але толькі гледзячы рэчаіснасці ў вочы, можна справіцца з праблемамі і дамагчыся станоўчых перамен. Калі ў нас не атрымаецца пераканаць адзін аднаго, нам неабходна хаця б пагадзіцца з тым, што людзі такія, якія ёсць. Павага да іншага, непадобнага і ёсць корань дэмакратыі.

Павага непадобнасці і альтэрнатыўнасці — корань дэмакратыі.

## Ушчамленне правоў чалавека па прыкмеце культуры і рэлігіі

Культурныя змены з'яўляюцца часткай гістарычнага развіцця, у якім тэхналагічныя, нарматыўныя і шэраг іншых элементаў узаемадзейнічаюць адзін з адным. Свет змяняецца, і людзі змяняюцца разам з ім. Тое, што было звычайным і звыклым тысячу ці сто гадоў таму, зараз ужо не з'яўляецца звычайным.

Дыскрымінацыя жанчын і гомасэксуалістаў, шлюбы па прымусе, гвалт і забойствы з помсты за зняважаны гонар раней былі распаўсюджанымі ў многіх грамадствах, уключаючы нарвежскае. У нашай краіне мужчынам аж да 1868 г. па законе дазвалялася ўжываць сілу да сваёй жонкі[49]. Шлюбы па прымусе таксама былі даволі распаўсюджанымі. Аднак гэтыя звычаі сышлі ў мінулае, паколькі сфарміраваліся нацыянальная і міжнародная сістэмы нормаў, у тым ліку і сістэма правоў чалавека. Сёння міжнародная супольнасць дасягнула згоды, напрыклад, у тым, што шлюб па прымусе, абразанне жанчын, гвалт і забойствы ў абарону гонару з'яўляюцца грубымі парушэннямі правоў чалавека. Але паколькі змены патрабуюць часу, мы назіраем, што такія парушэнні ўсё яшчэ адбываюцца ў асобных краінах/раёнах. І хоць гэтыя дзеянні забароненыя, патрабуецца час, перш чым нормы стануць паўсюдна прымальнымі ва ўсіх пластах грамадства. У Пакістане, Афганістане і шэрагу афрыканскіх краін дагэтуль існуюць групы, якія практыкуюць гвалт і забойствы з пачуцця помсты[50].

Калі людзі з гэтых краін пераязджаюць у развітыя краіны, яны могуць прынесці з сабой свае мясцовыя звычаі. У выніку маладыя людзі могуць апынуцца ў цяжкіх умовах у гэтых новых краінах. Бацькі могуць забараняць ім сустракацца да шлюбу, іх пазбаўляюць права самім абраць мужа ці жонку. Хаця ахвярамі, у пераважнай большасці выпадкаў, з'яўляюцца жанчыны, мужчыны таксама пакутуюць ад такіх парадкаў. Калі маладыя людзі пачынаюць супрацьстаяць патрыярхальнай і кантралюючай структуры сям'і, ім могуць пагражаць. Пры разводзе яны могуць быць выгнаны з сям'і. Зноў і зноў маладыя жанчыны і мужчыны падвяргаюцца гвалту і вымушаны збегчы ад сваёй сям'і. У некаторых выпадках жанчын забіваюць, гэта так званыя забойствы «для абароны гонару».

Большасць людзей, якія жывуць у Нарвегіі, згодны з тым, што апісаныя дзеянні непрымальныя. Яны з'яўляюцца так званай антыкультурай, як выказаўся нарвежац пакістанскага паходжання Номан Мубашыр[51]. Нягледзячы на тое, што тых, хто здзяйсняе падобныя злачынствы, мала, іх цяжка выявіць. Традыцыі «сядзяць» глыбока ў культурах; і паколькі падобныя дзеянні падлягаюць пакаранню, адбываюцца яны ўпотай.

Многія нясуць адказнасць за супрацьдзеянне такога роду парушэнням правоў чалавека. Асноўную адказнасць нясуць дзяржаўныя органы. Выпадкі парушэння правоў чалавека павінны расследавацца, а вінаватыя — несці пакаранне. Прысуды з'яўляюцца важнымі сігналамі як для патэнцыйных парушальнікаў, так і для людзей, якія адмаўляюцца заяўляць аб правапарушэннях у органы правапарадку. Павінны быць рэалізаваны меры інфармацыйнага характару, нацэленыя на адпаведныя сацыяльныя групы, і праводзіцца больш маштабная праца па фарміраванні каштоўнасцяў і нормаў. Улады многіх еўрапейскіх краін падвяргаліся ўжо не раз крытыцы за пасіўнасць і няправільнае





Жанчыны ў паранджах. Паўночны Афганістан, лістапад 2001 г.

разуменне культурна-рэлятывісцкай пазіцыі і абвінавачваліся ў ігнараванні парушэнняў правоў чалавека для таго, каб захаваць добрыя адносіны з меншасцямі. Аднак у апошнія гады было вынесена даволі шмат абвінаваўчых прысудаў па справах аб забойствах у абарону гонару ў Нарвегіі, Даніі і Швецыі.

Важна, каб меншасці самі асуджалі падобныя парушэнні. Гэта важны сігнал парушальнікам, які таксама можа мець канструктыўнае ўздзеянне адносна адмоўных стэрэатыпных уяўленняў аб меншасцях, якія могуць распаўсюджвацца ў грамадстве[52]. Сродкі масавай інфармацыі (СМІ) адыгрываюць важную ролю ў выяўленні парушэнняў правоў чалавека і прыцягненні да падобных выпадкаў грамадскай увагі. Павышэнне адкрытасці можа прывесці да таго, што індывіды, якія знаходзяцца на раздарожжы, атрымаюць падтрымку ўласнага выбару. Аднак СМІ павінны сачыць за тым, каб не перадаваць загадзя складзеную карціну рэчаіснасці, паколькі апублікаваныя матэрыялы атрымліваюць шырокі грамадскі водгук і могуць умацаваць забабоны ў адносінах да пэўнай групы.

Таксама і рэлігія можа абгрунтоўваць парушэнні правоў чалавека. На працягу гісторыі рэлігійная аргументацыя ўжо выкарыстоўвалася

для прыгнёту і дыскрымінацыі жанчын і гомасэксуалістаў. Аднак і рэлігійныя інтэрпрэтацыі залежаць ад сацыяльных змен. У Нарвегіі, як і ў многіх іншых краінах, змаганне за раўнапраўе палоў і правы гомасэксуалістаў «дабралася» і да царквы, дзе таксама, як і ў грамадстве ў цэлым, парог цярпімасці нашмат вышэйшы. Сёння жанчыны могуць стаць святарамі і біскупамі, што было неверагодна яшчэ сорак гадоў таму. Цалкам распаўсюджана і ўзвядзенне ў сан святара людзей, якія маюць нетрадыцыйную сэксуальную арыентацыю. Адважныя людзі выступалі і адстойвалі сваё меркаванне, і гэтым мы зрабілі яшчэ крок наперад да раўнацэннасці ўсіх людзей. Нягледзячы на такое станоўчае развіццё, у асобных хрысціянскіх супольнасцях усё яшчэ захоўваецца няроўнае стаўленне да жанчын, забабоны супраць гомасэксуалізму.

Падобнага развіцця ў адносінах да жанчын і людзей нетрадыцыйнай сэксуальнай арыентацыі не адбылося ў мусульманскім і іншых рэлігійных асяроддзях. Разам з культурнымі традыцыямі і звычаямі рэлігія ўсё яшчэ можа выкарыстоўвацца для апраўдання дыскрымінацыі. Зыходзячы з гэтага, многія жанчыны-мусульманкі маюць менш свабоды ў сямейным і грамадскім жыцці, чым мужчыны-мусульмане, а гомасэксуалісты і лесбіянкі рызыкуюць быць падвергнутымі асуджэнню, калі заявяць пра сябе адкрыта.

Даследаванні пацвярджаюць, што цяжкасці зведваюць як гомасэксуалісты-мусульмане, так і гомасэксуалісты-хрысціяне. Яны баяцца распавядаць пра сваю сэксуальную арыентацыю з-за магчымасці нападак і выгнання. Людзі, якія не могуць свабодна і адкрыта існаваць, адчуваюць, што іх годнасць не настолькі ж каштоўная, як годнасць іншых. Так, многія падлеткі з нетрадыцыйнай сэксуальнай арыентацыяй палічылі такую сітуацыю настолькі цяжкай, што скончылі жыццё самагубствам.

У 1995 г. у Нарвегіі перад тым, як здзейсніць самагубства, хлопчык напісаў сваім бацькам: «Мама і тата, я гомасэксуаліст. Але гэта занадта цяжка».

Для многіх людзей рэлігія з'яўляецца важнай часткай іх культуры і ідэнтычнасці. На адным з нашых курсаў сямнаццацігадовы Алі сказаў, што «ўсе правы чалавека ёсць у маёй рэлігіі. Трэба проста прытрымлівацца яе». Незалежна ад той рэлігіі, якую людзі вызнаюць, многія прытрымліваліся такіх жа перакананняў, як і Алі, чэрпалі сілу жыцця ў рэлігіі і яе маральных запаведзях. Аднак рэлігіі не павінны быць закрытымі для крытыкі. Дзеянні веруючых людзей неабходна ацэньваць гэтак жа, як і дзеянні няверуючых. Непрымальная тая практыка, якая апраўдвае і правакуе парушэнні правоў чалавека.

Парушэнні правоў чалавека могуць знайсці абгрунтаванне ў традыцыі і рэлігіі. Парушэнні непрымальныя, незалежна ад іх абгрунтавання.



Культурныя канфлікты і парушэнні правоў чалавека, якія тлумачацца культурай, могуць мець наступствы для ўсяго грамадства і стварыць канфлікты паміж групамі ў грамадстве. Напрыклад,дзеянні, якія дыскрымінуюць жанчын і гомасэксуалістаў і апраўдваюцца рэлігіяй або традыцыяй, могуць распаліць канфлікт у нарвежскім і іншых сучасных грамадствах, дзе дамінуюць свецкія каштоўнасці і дасягнуты прагрэс у раўнапраўі паміж паламі і змаганні за правы гомасэксуалістаў.

Якім чынам улады могуць спраўляцца з падобнымі канфліктамі? Пры грубых парушэннях адказ відавочны: парушэнне правоў чалавека нельга цярпець, неабходна ўключыць механізмы прававой дзяржавы. Роўным чынам неабходна прымаць меры асветніцкага характару і меры па фарміраванні светапогляду. Калі культурны канфлікт узнікае ў кропцы сутыкнення розных правоў чалавека, мы маем справу са складанымі дылемамі. Яркі прыклад таму — рэакцыя на карыкатуры на прарока Мухамеда ўвесну 2006 г. Свабода слова і вялікая талерантнасць да выкарыстання сатыры, характэрная для заходнееўрапейскіх краін, зрабіла магчымым публікацыю карыкатур на прарока Мухамеда, што прывяло, у сваю чаргу, мусульман свету ў раз'юшанасць і прымусіла іх выйсці на дэманстрацыі пратэсту, паколькі яны лічылі, што былі ўшчэмленыя ў праве на веру. Гэты прыклад паказвае, што культурныя канфлікты могуць прымаць вельмі сур'ёзны паварот, і падкрэслівае, наколькі важна стварыць умовы для стасункаў паміж рознымі групамі ў грамадстве і працаваць над навучаннем разуменню іншых культур і правам чалавека.

## Стэрэатыпы і прадузятасці

Адрозненні паміж культурамі, якія патрабуюць сур'ёзнай увагі, існуюць. Аднак мы хацелі б сказаць, што самыя вялікія цяжкасці шматкультурнага грамадства ствараюць не адрозненні, а хутчэй нашы стэрэатыпы і прадузятасці. Стэрэатыпы і прадузятасці могуць быць даволі далікатнай і няёмкай тэмай, бо яны дэманструюць слабасць людзей. Але ведаць пра іх існаванне неабходна.

Стэрэатыпы ствараюцца шляхам катэгарызацыі людзей, дзялення іх на групы па якой-небудзь прыкмеце, якая аб'ядноўвае. Як правіла, гэта даволі простыя абагульненні тыпу: усе нарвежцы ходзяць на лыжах; жыхары поўначы Нарвегіі лаюцца матам; французы любяць віно; афрыканцы любяць сэкс; гомасэксуалісты манерныя; феміністак не хвалюе іх знешнасць.

Стэрэатыпы — дзяленне людзей на катэгорыі і групы па якой-небудзь прыкмеце, якая іх аб'ядноўваючае.

Уолтар Ліпман — аўтар паняцця «стэрэатып» у грамадскіх навуках, вызначае стэрэатыпы як «малюнкі ў нашай галаве». Ён сцвярджаў, што

разуменне і вобраз іншых людзей складаецца ў нас праз другарадныя крыніцы інфармацыі, а не праз прамы кантакт. Так, часта мы бачым тое, што «хочам» бачыць, а не тое, што ёсць на самой справе; меркаванні нашы не заўсёды змяняюцца нават пры асабістай сустрэчы з прадстаўніком той ці іншай групы.[53]. Стэрэатыпы бываюць станоўчыя і адмоўныя. «Бабулі добрыя» і «в'етнамцы працавітыя» — класічныя прыклады станоўчых стэрэатыпаў.

Падзяляць людзей на катэгорыі — цалкам нармальная з'ява. Падзяляючы на катэгорыі, мы такім чынам спрашчаем свет: тады яго лягчэй зразумець і выпрацаваць сваё стаўленне. Таму мэта — не пазбавіцца ад стэрэатыпаў цалкам, а задумацца пра іх негатыўныя наступствы. Стэрэатыпы могуць прычыняць шкоду, калі выкарыстоўваюцца, не зважаючы на індывідуальныя адрозненні людзей. Нягледзячы на тое, што часта стэрэатыпы моцныя, яны могуць карэктавацца, калі мы, напрыклад, сустракаем людзей, якія «не ўпісваюцца» ў наш «малюнак» або ў стэрэатып адносна той ці іншай групы людзей.

Прадузятасці — гэта «зацвярдзелыя», закаранелыя стэрэатыпы. З іх дапамогай мы загадзя складаем меркаванне пра што-небудзь ці пра каго-небудзь, загадзя «судзім». Калі ў нас ужо склаліся прадузятасці ў адносінах да якой-небудзь групы людзей, нам наўрад ці захочацца змяняць складзенае меркаванне, нават калі будзе новая інфармацыя і сустрэчы з дадзенай групай людзей.

Кіраўнік адной праваабарончай арганізацыі ў Расіі распавяла такі выпадак: аднойчы ёй сустрэўся малады чалавек, рускі па нацыянальнасці. Той лічыў, што ўсе чачэнцы злыя, і таму ўсіх, хто пражываў за межамі Чачэнскай рэспублікі, трэба высылаць назад ў рэспубліку і абнесці Чачню сцяной. На пытанне, ці сустракаў ён сам калі-небудзь чачэнцаў, ён адказаў: «Так, сустракаў. У войску служыў з адным хлопцам з Чачні». На пытанне: «Ну і што за чалавек быў той хлопец, з якім ты служыў?» — той адказаў: «Ды добры быў хлопец, нармальны». «Але як тады ты можаш ведаць, што ўсе чачэнцы — дрэнныя?» — спытала праваабаронца. «Я проста ведаю», — адказаў хлопец.

Стэрэатыпы і прадузятасці фарміруюцца і перадаюцца праз камунікацыю, адукацыю, сродкі масавай інфармацыі і паўсядзённае жыццё. Неабходна разумець, што яны ўплываюць на тое, як мы сябе паводзім. Адмоўныя стэрэатыпы і прадузятасці прыводзяць да адчужэння людзей адзін ад аднаго. А калі людзі перастаюць мець стасункі, памяншаецца магчымасць «выправіць» уласныя ўкаранелыя перакананні і павялічваецца верагоднасць стварэння вобразу ворага.

Як ты можаш ведаць, якіх людзей ты «не любіш», калі ты іх ніколі не сустракаў(ла)?

### «Мы» і «яны»

Падзяляючы іншых людзей на групы, мы такім чынам ствараем «сваю» групу. Самае распаўсюджанае дзяленне — гэта дзяленне на «мы» і «яны». Гэта наша катэгарызацыя, бо гэта мы паказваем, якім чынам мы ўспрымаем іх, а не іх уласнае разуменне і ўспрыманне саміх сябе. Гэта скажа нямала пра нас саміх. Мы ствараем уласны вобраз праз тое, як мы апісваем і характарызуем іншых.

У гісторыі было незлічонае мноства катэгарызацый на «нас» і «іх». Відаць, падобнае дзяленне існуе ў любым грамадстве; і не заўсёды яно негатыўнае. У спартыўных спаборніцтвах, напрыклад, дзяленне «мы — яны» мае станоўчае адценне. Падчас футбольнага матчу мы адчуваем сябе як «мы», калі хварэем за Нарвегію ці Італію. У такім разе дзяленне на «мы» і «яны» выклікае азарт. Аднак неабходна мець на ўвазе і негатыўны псіхалагічны момант дадзенага дзялення. Такое дзяленне выкарыстоўвалася і выкарыстоўваецца даволі мэтанакіравана ў палітыцы, у сродках масавай інфармацыі і на іншых сацыяльных арэнах з мэтай стварэння ў грамадстве базы для агрэсіі і вайны. Яўрэі, саамы, цыгане, тутсі, баснійцы і многія іншыя народы былі вызначаны ў свой час як «яны», «іншыя» і сталі ахвярамі агрэсіі і генацыду.

У сённяшняй Нарвегіі і ў іншых заходнееўрапейскіх краінах эмігранты і мусульмане вызначаюцца часта як «іншыя»: не этнічныя нарвежцы, не валодаюць нарвежскай мовай, іншай веры, выглядаюць па-іншаму. Нягледзячы на тое, што група не гамагенная і ўключае ў сябе самыя розныя мовы, культуры і веры, успрымаюцца яны, у першую чаргу, як іншыя.

Калі з учынкаў аднаго асобна ўзятага чалавека мы фарміруем сваё меркаванне пра цэлую групу, мы выкарыстоўваем стэрэатыпы, каб скласці тое ці іншае меркаванне. Калі, напрыклад, эмігрант з Албаніі збівае сваёй жонку, можна часта пачуць наступнае: «Такая ў іх культура» ці «Здзекавацца з жанчыны — у іх, у мусульман, звычайная справа». Калі ж жонку збівае нарвежац, гэта прыпісваецца да яго персанальных характарыстык: б'е, таму што неўраўнаважаны ці таму што дэбашыр. Мужчына-дэбашыр становіцца, такім чынам, выключэннем з нашых пазітыўных стэрэатыпаў аб нарвежцах або выключэннем з правіл у той час як дэбашыр-албанец уяўляецца як тыповая характарыстыка эмігранта з Албаніі. Спасылкі на культуру ўмацоўваюць негатыўныя стэрэатыпы, у дадзеным выпадку: «мы — нарвежцы» і «яны — эмігранты».

Стэрэатыпы і прадузятасці ёсць і ў прадстаўнікоў меншасцяў. Калі рабіць высновы, грунтуючыся на забаўляльнай літаратуры і тэлевізійных праграмах, такіх як, напрыклад, мыльная опера «Гатэль Цэзар», можна вельмі лёгка скласці меркаванне пра нарвежцахўяк пра фрывольных, легкадумных людзей, якія злоўжываюць алкаголем. Калі мы чуем

негатыўныя стэрэатыпы зноў і зноў і не карэктуем іх у адпаведнасці з рэчаіснасцю, мы ў большай ступені падвяргаемся ўплыву з боку іншых людзей. Гэта прыводзіць да адчужэння паміж людзьмі. Галоўная высnova — стэрэатыпы і прадузятасці фарміруюць нашу рэальнасць.

Кантакт і стасункі паміж рознымі людзьмі могуць адкарэктаваць памылковыя ўяўленні, створаныя стэрэатыпамі і прадузятасцямі. Праведзеныя сярод этнічных нарвежцаў апытанні аб эмігрантах пацвярджаюць гэта. Кантакт паміж людзьмі вызначае наша стаўленне да тых ці іншых людзей. Нарвежцы, *якія маюць стасункі* з эмігрантамі, звычайна лепшага меркавання пра іх, чым тыя, якія з імі *не маюць стасункаў*. Чым больш «кропак сутыкнення» і зносінаў, тым больш ствараецца станоўчых эмоцый і адносін[54].

Вельмі важна «думаць» і рабіць высновы, калі мы бачым, як іншыя людзі падзяляюць людзей на катэгорыі: вешаюць на людзей ярлыкі і пазбаўляюць іх такім чынам індывідуальнасці. У людзей заўсёды ёсць агульныя характарыстыкі: напрыклад, нарвежцы па нацыянальнасці, эмігранты, гомасэксуалісты, мусульмане, хрысціяне, са светлым ці цёмным колерам скуры. Аднак усе людзі розныя. Кожны чалавек мае «свой» унікальны набор характарыстык, прыналежнасцяў і рысаў. Многія нарвежцы зусім не любяць хадзіць на лыжах і многія мусульмане нерэлігійныя. Дзяленне людзей на групы «хавае» рэчаіснасць: там, дзе ёсць шмат колераў, мы бачым толькі два: чорны і белы. Неабходна памятаць, што сустракаюцца людзі, індывіды, а не групы або культуры. Як кажа Лавілін Брэна, «не давай характарыстыку іншаму чалавеку; дазволь яму самому даць сабе характарыстыку».

Не давай характарыстыку іншаму чалавеку, дазволь яму самому даць сабе характарыстыку.

## Дыскрымінацыя

Стэрэатыпы і прадузятасці могуць прывесці да дыскрымінацыі. Дыскрымінацыя — гэта неабгрунтаванае парушэнне правоў чалавека ці групы людзей. Дыскрымінацыя па колеру скуры або расы называецца расізмам[55].

Дыскрымінаваць — значыць ушчамляць у правах звычайна з мэтай дэманстрацыі ўласнай перавагі над тым ці іншым чалавекам.

Дыскрымінацыя таксама можа быць мэтанакіраванай палітыкай, але не абавязкова[56]. Недыскрымінацыя з'яўляецца «ідэалам» не толькі ў Нарвегіі, але і ў многіх іншых заходнееўрапейскіх краінах. Дыскрымінацыя забаронена законам. Дыскрымінацыя можа таксама з'яўляцца вынікам структуры грамадства. Напрыклад, нейкае правіла ці збор правіл жыцця грамадства можа ў выніку ўтрымліваць дыскрымінацыю, хаця першапачаткова і не стваралася з такой мэтай.

У 1998 годзе ў газеце «Дагбла» быў апублікаваны артыкул пра маладога чалавека з цёмным колерам скуры, які 17 разоў быў спынены паліцыяй на вуліцах Осла. Прычынай было тое, што ён ездзіў на даволі дарагім веласіпедзе, і паліцэйскія думалі, што ён яго скраў. Інакш адкуль у цемнаскурага хлопца такі «навароченый» веласіпед? Хаця кожная такая праверка паліцыяй і не была матывавана расізмам, усе праверкі ў комплексе падштурхоўваюць да думкі пра расісцка матываваныя дзеянні паліцыі.

Па прычыне таго, што ў адных людзей больш улады, чым у другіх, наступствы дыскрымінацыі з боку тых, хто мае ўладу, звычайна больш сур'ёзныя. Палітыкі, журналісты, кіраўнікі, чыноўнікі і дзяржслужачыя, паліцэйскія і супрацоўнікі турмаў, іміграцыйныя ўлады могуць злоўжываць уладай.

Дыскрымінацыя — гэта ідавочная непавага да годнасці чалавека і парушэнне яго/яе правоў. Калі назіраецца сістэматычнае ўшчамленне ў правах той ці іншай групы людзей у грамадстве — час біць трывогу. Калі ў прадстаўнікоў меншасці менш правоў, чым у прадстаўнікоў большасці, напрыклад, у атрыманні адукацыі, на рынку працы, жылля ці ў іншых сферах, гэта можа прывесці ў канчатковым выніку да фрустрацыі, агрэсіі і канфліктаў. Калі некаторыя людзі ці групы людзей увесь час характарызуюцца ў грамадстве як «іншыя», яны, у рэшце рэшт, пачынаюць сапраўды лічыць сябе такімі. Ніхто ад гэтага не выйграе, як правіла.

У 2000 годзе кафэ-бар, размешчаны на вуліцы Торгата ў Осла, быў пакараны штрафам у 30 тысяч крон за расізм. Гэта быў першы падобнага кшталту штраф у Нарвегіі. У рашэнні суда было запісана, што «ў суддзяў склалася ўражанне, што даволі доўгі час у дадзенай установе адмаўлялася наведвальнікам у наведванні бара па прычыне іх колеру скуры і этнічнай прыналежнасці, паколькі толькі тых наведвальнікаў, якія былі падобныя на замежнікаў, прасілі прад'явіць дакументы і студэнцкія пасведчанні.

Часам памылкова можна палічыць той ці іншы выпадак дыскрымінацыяй. Напрыклад, калі невідушчы палітык не быў абраны ў кіраўнічую структуру муніцыпалітэта, ён(яна) можа палічыць гэта дыскрымінацыяй,

хаця могуць быць і іншыя прычыны, акрамя слепаты. Абвінавачванні ў дыскрымінацыі становяцца «лёгкай здабычай» у такім выпадку. Таму неабходна ўважліва разглядаць прычыны таго ці іншага выпадку, каб не памыліцца, ахарактарызаваўшы яго як расізм.

Часам свайго ўласнага вопыту стасункаў бывае недастаткова, каб адолець стэрэатыпы. Адзін выхадзец з Босніі, які сам зведаў на сабе негатыўнае стэрэатыпнае мысленне, пераехаўшы жыць у г. Драмен, сказаў: «Больш не мог заставацца ў Сандзе, занадта шмат панаехала туды эмігрантаў». Пазнаваць і разумець — гэта адно, а выкарыстоўваць веды ў паўсядзённым жыцці — зусім іншае. Можна сказаць, мы вучымся гэтаму ўсё жыццё.




Надпіс «Час забіваць» і свастыка на сцяне мячэці ў Слоніме. Лістапад 2002 г.

## Чыя інтэграцыя?

Інтэграцыя з'яўляецца важным фактарам для функцыянавання шматкультурнага грамадства. Яе мэта — уключыць прадстаўнікоў меншасцяў у інстытуты грамадства, стварыць групавую ідэнтычнасць і культурныя асаблівасці. Вельмі часта інтэграцыя разглядаецца як мэта ў палітыцы, як, зрэшты, і самімі меншасцямі ў многіх краінах.



У сувязі з гэтым асноўнае пытанне: дзе можна патрабаваць «падобнасці» і дзе можна дапускаць «рознасць»? Дзе дзяржава патрабуе адзінства і дзе дазваляе меншасцям быць «асаблівымі»? Мы ўзгадвалі ўжо пра тое, што правы чалавека могуць быць добрым арыенцірам, што дапушчальна, а што — не. Дзеянні, накіраваныя на парушэнні правоў чалавека, непрымальныя. Аднак у асобных выпадках правоў чалавека можа быць недастаткова ці розныя правы могуць аказацца «ў канфлікце». Выйсцем у такім выпадку можа быць разгляд і абмеркаванне праблемы з усіх бакоў.

У розных еўрапейскіх краінах праводзіцца розная інтэграцыйная палітыка. У той час як прадстаўнікам рэлігійных меншасцяў Нарвегіі дазволена насіць такія галаўныя ўборы ў навучальных установах, як хіджаб і цюрбан, у Францыі гэта забаронена[57]. Калі дацкі ўрад упарта настойвае на абароне права на свабоду слова і выказвання пасля факту апублікавання карыкатур — выяваў прарока Мухамеда ўвесну 2006 года, то нарвежскі ўрад абраў больш нейтральную пазіцыю, настойваючы на праяўленні большай павагі да пытанняў веры. Пытанні аб тым, што можа цярпецца, выліваюцца звычайна ў гарачыя дэбаты. Пад талерантнасцю падразумеваецца тое, што людзям прыходзіцца мірыцца з тым, што першапачаткова яны недалюбліваюць. Тады, калі «непадобнасць» сапраўды робіць нам выклік, неабходна талерантнае да яе стаўленне. Талерантнасць патрэбна ўсім групам у грамадстве: як прадстаўнікам меншасці, так і прадстаўнікам большасці.

Усе грамадствы, культуры, рэлігіі і асобна ўзятыя людзі знаходзяцца ў працэсе няспынных зменаў і развіцця. Тое ж самае адбываецца і з нашымі тлумачэннямі і разуменнямі свету і навакольнай рэчаіснасці. Грамадствы, дзе прадстаўлены шматлікія розныя культуры і рэлігіі, — частка сённяшняй рэчаіснасці. Калі ў 1970 годзе толькі паўтара працэнта насельніцтва Нарвегіі складалі эмігранты, то сёння лічба паднялася да васьмі працэнтаў[58]. Часта можна пачуць, што гэта эмігранты, якіх неабходна інтэграваць у грамадства. Мы лічым, што і этнічным нарвежцам неабходна таксама прыкласці высілкі, каб здолець успрыняць «новую» рэчаіснасць. Найперш прызнаць, што рэчаіснасць сапраўды новая. У некаторых выпадках гэта можа прывесці да таго, што нашы ўстойлівыя ўяўленні падвергнуцца пераацэнцы і пераасэнсаванню. «Дай мне колер скуры», — сказаў адзін вучань другому. «Добра», — адказаў той і перадаў яму аловак карычневага колеру. Абодва вучні былі афрыканцамі.

Сацыялагічныя даследаванні паказваюць, што большасць людзей у Нарвегіі разглядаюць эмігрантаў як багацце для нарвежскага грамадства. 86 % разглядаюць наяўнасць людзей розных культур у грамадстве як станоўчы фактар. Трое з чатырох апытаных лічаць, што эмігранты працавітыя[59].

Эмігранты і прыезджыя таксама павінны прыняць новую для іх рэчаіснасць. Часта можна бачыць, што людзі адной культуры трымаюцца разам, селяцца непадалёку адзін ад аднаго. «Шукаць» месца, дзе іх не ўспрымаюць як іншых, непадобных, — натуральна для людзей. Праблемы пачынаюцца ў тым выпадку, калі яны «выключаюць» сябе з грамадскага жыцця. Калі эмігранты не лічаць неабходным, напрыклад, валодаць мовай, у іх змяншаецца магчымасць аддаць свой голас на выбарах, разабрацца ў паведамленнях-выкліках да доктара ці ў аплаце рахункаў[60]. Некаторыя элементы культур таксама могуць знізіць магчымасці інтэграцыі. Так, традыцыя «прывезці сабе жонку з радзімы» — тэма, якая вельмі абмяркоўваецца сёння. У першую чаргу выказваюцца перасцярогі адносна таго, што маладыя людзі прымушаюцца да жаніцьбы. Далей, ёсць меркаванне, што прыналежнасць прыезджых да «традыцыйных грамадстваў» непажаданая, паколькі можа стаць прычынай шматлікіх канфліктаў у Нарвегіі[61].

Самае аб'ёмнае даследаванне сярод моладзі — дзяцей эмігрантаў — паказвае іх станоўчы погляд на інтэграцыю. Яны хацелі б быць часткай грамадства, мець сяброў-нарвежцаў, выкарыстоўваць веданне нарвежскай мовы. У той жа час іх этнічная прыналежнасць — моцны фактар. Тыя, каму ўдаецца «разабрацца» ў сітуацыі, выбірае лепшае з абедзвюх культур. Моладзь, якая шануе сваіх бацькоў, з аднаго боку, і бярэ шмат што з нарвежскай культуры, — з другога, больш упэўненая ў сабе і больш задаволеная жыццём у цэлым[62]. Такім чынам, захаванне элементаў сваёй уласнай культуры з'яўляецца пазітыўным фактарам для паспяховай інтэграцыі чалавека ў грамадства. Так як і нарвежцам не хацелася б адмаўляцца ад традыцыйнага святкавання Калядаў ці лясных прагулак па нядзлях, эмігрантам не хацелася б адмаўляцца ад некаторых элементаў сваёй роднай культуры. Захаванне традыцый і нормаў роднай культуры спрыяе хутчэй стабільнай сітуацыі ў грамадстве. Традыцыі з'яўляюцца таксама рэсурсам, неабходным для таго, каб справіцца з новай сацыяльнай і эмацыянальнай рэчаіснасцю.

Нягледзячы на тое, што прыхільнасць да сваёй роднай культуры з'яўляецца важнай для паспяховай інтэграцыі, не меншую ролю адыгрываюць грамадскія рамкі. У эмігрантаў і прадстаўнікоў меншасцяў не заўсёды ёсць такія ж магчымасці, як у прадстаўнікоў большасці. Прадаўцы па тэлефоне, напрыклад, у якіх першапачаткова не нарвежскія імёны, распавядаюць, што лягчэй прыцягнуць патэнцыйнага пакупніка, калі яны называюцца нарвежскімі імёнамі, як Ян Ульсэн, напрыклад. Таксама на рынку працы і жылля многія эмігранты могуць адчуваць сябе апошнімі ў чарзе. Усё гэта можа мець негатыўныя наступствы для самаадчування і ўпэўненасці ў сабе. І наўрад ці людзі будуць адчуваць сябе як дома.



Мы павінны спрабаваць удзельнічаць у жыцці адзін аднаго і запрашаць адзін аднаго «ў сваю рэчаіснасць». «Якая карысць ад таго, што я ведаю шмат пра Ірак і іракцаў, калі я не сустрэў у жыцці ніводнага іракца?» — усклікнуў аднойчы адзін з удзельнікаў на нашым курсе. Запрашаць адзін аднаго «ў сваю рэчаіснасць» не азначае, што мы павінны «бегаць» з распасцёртымі рукамі і абдымаць усіх запар. Зразумела, што людзі бываюць розныя, і не з усімі хочацца ўступаць у кантакт. Аднак у нас павінна быць сіла волі для таго, каб быць адкрытымі да іншых людзей і не дазваляць стэрэатыпам і прадузятасцям разбураць стасункі, якія могуць аказацца карыснымі для абодвух бакоў.

## Шматкультурная рэчаіснасць

Шматкультурнае грамадства — гэта рэчаіснасць, дзе людзі розных культур жывуць па суседству. Грамадствы ніколі раней не былі настолькі разнастайнымі, як зараз, і глабалізацыя хутчэй узмоцніць, чым зверне назад гэтую тэндэнцыю.

Разнастайнасць культур з'яўляецца вялікім прывілеем, які дае шмат магчымасцяў. Каб паспяхова скарыстаць існуючыя культурныя адрозненні, мы павінны навучыцца мірна жыць адзін з адным. Вялікай складанасцю тут можа аказацца пошук добрых інструментаў для вырашэння праблем, якія спараджае складаная культурная сітуацыя. Часам культурныя асаблівасці даюць нам выпрабаванні. Правы чалавека, як універсальныя каштоўнасці і юрыдычныя нормы, з'яўляюцца добрым інструментам для ацэнкі межаў прымальнага. Парушэнні правоў чалавека непрымальныя, не важна, абгрунтоўваюцца яны культурай, традыцыяй ці рэлігіяй. Правы чалавека абавязваюць нас быць занепакоенымі сітуацыяй. Нават калі ў кагосьці іншае паходжанне, мы абавязаны ўмешвацца ў выпадках парушэнняў і дыскрымінацыі.

> «Гэтак жа ўпарта не прымайце несправядлівасць, нават калі яна не закранае асабіста вас».
>
> Арнульф Ёверланд

Акрамя таго, у грамадстве пажадана існаванне «шырокага поля» для разнастайнасці. Усе людзі розныя. Так і павінна быць. Калі мы хочам, каб нас саміх паважалі за нашы каштоўнасці і выбар, мы гэтак жа павінны паважаць іншых. Адным з важных інструментаў для стварэння добрага міжкультурнага грамадства з'яўляецца, такім чынам, прыняцце іншасці. Акрамя гэтага, вельмі важным з'яўляецца дыялог, у якім складаюцца і захоўваюцца агульныя правілы гульні. Без кантактаў і стасункаў стэрэатыпы і прадузятасці будуць паглыбляцца. Магчымасць удзелу ў дыялогу закладзена ў кожным з нас, але прадугледжвае наяўнасць

здольнасці аказваць давер і веру ў добрыя намеры адзін аднаго. Тое, як мы вырашым сённяшнія праблемы, паўплывае на наш заўтрашні дзень.

Культурная разнастайнасць з'яўляецца крыніцай абмену, абнаўлення і творчасці, яна гэтак жа неабходна чалавецтву, як біялагічная разнастайнасць — прыродзе. Такім чынам, культурныя адрозненні з'яўляюцца агульнай спадчынай чалавецтва, якую неабходна захоўваць. Разнастайнасць ладаў жыцця і паводзін груп дазваляе нам чэрпаць разуменне і натхненне з шырэйшага спектру рэчаў. Адрозненні даюць нам нязменную магчымасць выбіраць рашэнні і знаходзіць новыя.

**Пункты да даклада аб міжкультурным узаемаразуменні:**

- У некаторым сэнсе ўсе краіны свету сталі шматкультурнымі.

- Гісторыя большасці дзяржаў полікультурная. Карэнныя народы засялялі тэрыторыю пэўнай дзяржавы першапачаткова, пакуль міграцыя нарэшце не прывяла да больш складанага складу насельніцтва. Сучасная глабалізацыя прыводзіць як да працоўнай міграцыі, так і да міграцыі, выкліканай войнамі і канфліктамі.

- Паняцце культура — складанае. Культура можа быць «схаваным кодам» большай ці меншай устойлівасці, таму мы тлумачым рэчаіснасць пэўным чынам. Культура таксама можа быць дынамічнай і зменлівай.

- Мы ўсе з'яўляемся носьбітамі культуры.

- Субкультура — гэта малыя групы або супольнасці, якія маюць выразныя адметныя рысы. Мы можам адначасова належаць да некалькіх культур.

- Наша ідэнтычнасць шматгранная і з'яўляецца вынікам спадчыннасці, асяроддзя і свабоднай волі чалавека.

- Усе мы — унікальныя і незаменныя індывіды. Таму няправільна было б асобна вылучаць нейкую адну якасць ці прыналежнасць у чалавеку. Заўсёды сустракаюцца індывіды, а не культуры.

- Паколькі мы з'яўляемся носьбітамі культур, кожная сустрэча можа лічыцца шматкультурнай. Але паколькі ў нас ёсць сваё разуменне нормы і паколькі вельмі значная частка культуры не ўсведамляецца намі, такія сустрэчы могуць быць праблематычнымі. Часам у нас таксама бываюць негатыўныя чаканні.

- Этнацэнтрызм і культурны рэлятывізм — гэта два супрацьлеглыя пункты гледжання, з дапамогай якіх можна сустракаць людзей іншых культур. Пры такіх сустрэчах варта імкнуцца быць адкрытымі і спрабаваць зразумець іншых з улікам іх паходжання і светапогляду. Гэта не значыць, што трэба прымаць усё. Паводзіны, якія парушаюць правы чалавека, цярпець нельга.

- Культурныя адрозненні ўзбагачаюць нас і робяць жыццё разнастайным, але таксама могуць прывесці да канфліктаў у грамадстве і паміж асобнымі людзьмі.

- Традыцыйныя культурныя і рэлігійныя звычаі многія стагоддзі прыводзілі да дыскрымінацыі асобных людзей/груп. Нават сёння мы назіраем, што традыцыя і рэлігія могуць апраўдваць практыку парушэння правоў чалавека.

- Людзі і культуры — розныя. Усе людзі хочуць, каб іх выбар паважалі. Павага да непадобнасці з'яўляецца сутнасцю дэмакратыі.

- Сацыяльныя стэрэатыпы і прадузятасці — гэта катэгарызацыя людзей або груп, якія падзяляюць пэўныя агульныя характарыстыкі. Катэгарызацыя спрашчае рэчаіснасць і прыводзіць да таго, што асобны чалавек з яго складанай асобай «губляецца» ў групе. У выніку катэгарызацыі можа павялічвацца адлегласць паміж людзьмі, скарачацца магчымасць для дыялогу, узнікаюць дыскрымінацыя і канфлікт.

- Дыялог і стасункі могуць адкарэктаваць стэрэатыпы і прадузятасці. Таму мы павінны працаваць над сабой, каб павышаць узровень нашых ведаў і разумення іншых людзей і культур, каб стаць адкрытымі, праяўляць давер і павагу, адыгрываць актыўную ролю ў шматкультурных грамадствах.

---

34. Цытата з Элізабэт Айдэ і Ане Хэге Сімансэн «Убачыць свет з іншага боку»/ Elisabeth Eide and Anne Hege Simonsen: A se verden fra et annet sted, Oslo, Cappelen, 2004 г.
35. Джон Махер і Джудзі Гроўз «Прадстаўляючы Хомскага»/ Maher, John og Groves, Judy: Introducing Chomsky, Icon Books Ltd., Grange Road, Duxford, Cambridge CB2 4GF, 1999 г.
36. Caplex, інтэрнэт-выданне. 13.09.2006 г.

37. Ёйвінд Дал «Сустрэча людзей. Міжкультурная камунікацыя»/ Øyvind Dahl: Møter mellom mennesker Interkulturell kommunikasjon, Oslo, Gyldendal Norsk Forlag, 4. opplag 2004 s. 57.
38. Там жа, старонка 59.
39. Томас Хюланд Эрыксэн (рэд.) «Міжкультурнае ўзаемаразуменне»/ Thomas Hylland Eriksen (red): Flerkulturell forståelse, Tano Aschehoug 1997, s. 25.
40. Нягледзячы на тое, што часта гавораць, што замежнікі маюць комплексную ідэнтычнасць, дадзенае меркаванне можа адносіцца да ўсіх.
41. Ёйвінд Дал «Сустрэча людзей. Міжкультурная камунікацыя»/ Øyvind Dahl: Møter mellom mennesker. Interkulturell kommunikasjon, Oslo, Gyldendal Norsk Forlag, 4. opplag, 2004 г.
42. Складана быць абсалютна нейтральным, паколькі ва ўсіх ёсць свой назапашаны вопыт.
43. У справаздачы Міністэрства аховы здароўя (кастрычнік 2006 г.) Нарвегіі гаворыцца, што маладыя людзі, якія жывуць у Осла, ужываюць менш спіртных напояў, чым раней. Адна з магчымых прычын гэтага — тое, што маладыя людзі падчас стасункаў з маладымі людзьмі, выхадцамі з сем'яў замежнікаў, паддаюцца ўплыву культуры непіцця.
44. Інфармацыя Арганізацыі супраць дыскрымінацыі ў грамадстве (OMOD), жнівень 2006 г.
45. Цытата з кнігі Djulaha! Om å forstå annerledeshet, Loveleen Rihel Brenna, Kristiansand, Høyskoleforlaget, 2001 г.
46. Са справаздачы дэпартамента па інтэграцыі, люты, 2007 г.
47. Амаль усе пісьмовыя каментары да вышэйназванай справаздачы адзначалі гэта.
48. Там жа, старонка 11.
49. Правы мужчын рэгламентаваліся тым жа параграфам закона, што і правы землеўласніка ў адносінах да наёмных работнікаў.
50. Па ацэнках уладаў Пакістана, кожны год колькасць забойстваў з меркаванняў гонару складае не менш за 4000. (Артыкул Унні Вікан, газета «Aftenposten» ад 04.10.2006г.).
51. Мубашыр.
52. Многія прадстаўнікі меншасцяў лічаць, што не маюць такога абавязку, таму што яны звязаны з такімі парушэннямі не ў большай ступені, чым этнічныя нарвежцы. У прынцыпе, мы згодны з такімі сцверджаннямі, але лічым, што дыяспары меншасцяў усё ж з'яўляюцца значнымі аб'яднаннямі, таму што могуць рабіць моцны ўплыў на людзей, якія маюць амаль тое ж паходжанне, што і яны самі.
53. Ёйвінд Дал «Сустрэча людзей. Міжкультурная камунікацыя»/ Øyvind Dahl: Møter mellom mennesker. Interkulturell kommunikasjon, Oslo, Gyldendal Norsk Forlag, 4. opplag, 2004 г.
54. Інфармацыя Цэнтральнага статыстычнага бюро, 2005 г.
55. Многія лічаць сёння няправільным і недапушчальным казаць пра расы паміж людзьмі. Ёсць толькі адна раса — мы ўсе.
56. Адны з самых яскравых прыкладаў дыскрымінацыі з боку дзяржавы — гэта апартэід у Паўднёвай Афрыцы і гітлераўская Германія. Абедзве дзяржавы замацавалі дыскрымінацыю ў дзяржаўных законах і ва ўтварэнні дзяржаўных органаў для выканання дыскрымінацыі. Факт дыскрымінацыі ў законе быў і ў Нарвегіі, калі яўрэі, цыгане, саамы і гомасэксуалісты не мелі тых жа правоў, што і іншыя групы ў грамадстве, а былі вызначаны як грамадзяне другога гатунку.
57. У школах Осла забаронена з нядаўніх часоў дзяўчынкам насіць хіджаб. Прычынай забароны сталі цяжкасці ў кантактах паміж настаўнікам і вучаніцай, калі тая ў нікабе. У Францыі і нікаб, і хіджаб у школах забаронены.
58. Замежнікі — гэта і дзеці, чые бацькі (маці і бацька) эмігравалі ў Нарвегію.
59. Са справаздачы дэпартамента па інтэграцыі, люты 2006 г.
60. Такі тып «ізаляцыі» — не спецыфічны, а даволі распаўсюджаны феномен для прадстаўнікоў меншасцяў у Нарвегіі. Паралельны прыклад — нарвежцы, якія пражываюць у Іспаніі і не імкнуцца да актыўнага ўдзелу ў жыцці грамадства.
61. Каля 75% людзей — выхадцаў з Пакістана, якія пражываюць у Нарвегіі, знаходзяць сабе мужа ці жонку ў Пакістане. 22% шлюбаў — гэта шлюбы паміж людзьмі — выхадцамі з Пакістана, якія пражываюць у Нарвегіі. (Інфармацыя Цэнтральнага статыстычнага бюро, 2005 г.).
62. Міжнароднае даследаванне ICSEY разглядзела, як моладзь — дзеці замежнікаў — уліваюцца ў жыццё грамадства ў 14 еўрапейскіх краінах, у тым ліку ў Нарвегіі. Прафесар нарвежскага ўніверсітэта ў Бергене Давід Лакланд Сэм лічыць, што вынікі даследавання развейваюць міф пра тое, што звычайна гэтая моладзь спраўляецца горш, чым карэнная моладзь, і што ў яе менш упэўненасці ў сабе з-за распаўсюджанай дыскрымінацыі ў грамадстве. (www.forskning.no).




# Практыкаванні па тэме «Міжкультурнае ўзаемаразуменне»

# ШМАТКУЛЬТУРНАЕ ГРАМАДСТВА

**Тэма:**

Шматкультурнае грамадства.

**Мэта:**

Удзельнікі павінны пазнаёміцца з паняццем «шматкультурнасць» і зразумець, як яна праяўляецца ў розных краінах і грамадствах.

У свеце існуе некалькі тысяч этнічных груп, якія насяляюць больш за 200 дзяржаў. Часта гавораць, што шматкультурнае грамадства пераважае сёння, у той час як гамагенныя грамадствы ўжо практычна не існуюць. Але што ж азначае полікультурнасць? Па-першае, гэта можа азначаць, што ў адным грамадстве існуе мноства культур. Па-другое, гэта можа азначаць, што ёсць людзі, звязаныя адначасова з некалькімі культурамі, гэта значыць існуюць шматкультурныя людзі. Па-трэцяе, людзі з розных культур сустракаюцца, і ўзнікаюць шматкультурныя сітуацыі, якія могуць ствараць цяжкасці для свету, грамадстваў і людзей. Міжкультурнае ўзаемаразуменне прадугледжвае, такім чынам, разуменне шматкультурных грамадстваў, шматкультурных сітуацый і людзей — прадстаўнікоў розных культур.

**Практычная рэалізацыя:**

У пачатку практыкавання, пасля ўступнай інфармацыі вядучага, удзельнікі працуюць у групах: збіраюць інфармацыю і рыхтуюць прэзентацыі, якія затым прадстаўляюцца аўдыторыі.

| | |
|---|---|
| **Час:** | 1,5—2 гадзіны ці 45 хвілін урока + два тыдні дамашняй падрыхтоўкі. |
| **Што трэба падрыхтаваць:** | Прасторнае памяшканне, зручнае для працы ў групах, магчымасць выкарыстання бібліятэкі, ксеракса і Інтэрнэту; атлас, газеты, вялікія лісты, нажніцы, клей, рознакаляровыя маркеры. |

**Парадак выканання:**

1. Вядучы дае кароткія звесткі аб «шматкультурным грамадстве». Галоўнае — падкрэсліць, што большасць грамадстваў у сучасным свеце складаецца з людзей розных культур. (15 хвілін)
2. Удзельнікі дзяляцца на групы. Кожная група выбірае адну краіну і высвятляе наступныя пытанні: якія яны ведаюць этнічныя групы, на колькіх мовах яны размаўляюць, якія маюцца рэлігіі, нацыянальныя строі, ежа, напоі, музыка, мастацтва і г.д. Кожная група рыхтуе сваю насценгазету. (Пры тлумачэнні гэтага задання настаўнік павінен памятаць, што яно можа спрыяць умацаванню стэрэатыпаў і прадузятасцяў, паколькі дзеці не змогуць знайсці нічога, акрамя самых прымітыўных звестак. Каб пазбегнуць гэтага, трэба некалькі разоў на працягу ўсяго занятка падкрэсліць, што ўсе нашы ўяўленні аб іншых культурах часцей за ўсё стэрэатыпныя.)
3. Групы прадстаўляюць сваю працу аўдыторыі. Астатнія могуць задаваць пытанні. (45 хвілін)

**Абмеркаванне:**

- Што такое культура?
- Што такое субкультура? Якія субкультуры вы ведаеце?
- Што такое шматкультурнае грамадства?
- Ці з'яўляецца Беларусь шматкультурным грамадствам? Ці ёсць у сучасным свеце краіны, на 100 % аднастайныя ў культурных адносінах?
- Ці павінны людзі пераязджаць у нейкую краіну ці ў пэўную частку краіны, каб стварыць шматкультурныя грамадствы, ці культура можа «прыйсці» ў грамадства?
- Як «культуры» могуць перамяшчацца з адной краіны ў другую? (Вайна, эканамічныя ўцекачы, турысты, мастацтва, Інтэрнэт, СМІ і інш.) Чаму часам узнікаюць канфлікты паміж культурамі?
- Ці існуюць добрыя і дрэнныя культуры? (Або: ці ёсць добрыя і дрэнныя элементы ўнутры ўсіх культур?)
- Што становіцца ў шматкультурным грамадстве?
- Ці можа адзін чалавек быць шматкультурным? Якім чынам?
- Чаму я навучыўся, выконваючы гэта практыкаванне? Што я магу з яго вынесці?

**Возьмем пад ўвагу:**

У шматкультурным грамадстве людзі розных культур жывуць побач. Гэта можа ўзбагачаць грамадства, але можа і ствараць канфлікты. У наш час амаль усе краіны і грамадствы -шматкультурныя. Праблема заключаецца ў тым, як зрабіць жыццё ў шматкультурным грамадстве камфортным для ўсіх.

# ШМАТКУЛЬТУРНАЯ НАРВЕГІЯ

### Тэма:

Шматкультурная Нарвегія.

### Мэта:

Зразумець і пераканацца, што Нарвегія была і ёсць шматкультурнай краінай.

Нарвегія — не гамагенная дзяржава, як любяць думаць многія. Наадварот, нарвежскае грамадства складаецца з многіх розных народнасцяў у дадатак да этнічных нарвежцаў. Наша нарвежская культура таксама зведвае імпульсы звонку. Мы любім есці спагеці, тако і кебаб — стравы, якія родам не з Нарвегіі. Лепшыя фільмы таксама зроблены не тут. Нягледзячы на тое, што мы зведваем многія імпульсы звонку, у шмат каго пры слове «шматкультур'е» узнікаюць асацыяцыі з эмігрантамі і ўцекачамі. Ці правільна гэта? І чаму гэта так? Нарвежскае грамадства развіваецца ў той час, як усе члены грамадства прымаюць удзел у гэтым працэсе.

### Практычная рэалізацыя:

Практыкаванне пачынаецца з уступнай інфармацыі вядучага, працягваецца працай у групах, дзе ўдзельнікі збіраюць інфармацыю і рыхтуюць прэзентацыі, якія прадстаўляюцца затым аўдыторыі.

**Час:** 1,5—2 гадзіны.
**Што неабходна?** Прасторнае памяшканне, падрыхтаванае для працы ў групах, магчымасць выкарыстання бібліятэкі, ксеракса і Інтэрнэта; атлас, газеты, вялікія лісты, нажніцы, клей, рознакаляровыя маркеры.

### Парадак выканання:

1. Кіраўнік дзеліць удзельнікаў на групы, якія атрымліваюць заданне сабраць інфармацыю аб розных этнічных групах, якія жывуць у Нарвегіі. Кожны з удзельнікаў бярэ на сябе адну групу. Хтосьці бярэ для аналізу саамаў, хтосьці — квенаў, цыган, эмігрантаў і прыезджых з заходнееўрапейскіх і ўсходнееўрапейскіх краін; хтосьці — этнічных нарвежцаў. Удзельнікам неабходна высветліць: колькі людзей налічваецца ў групе; якія ў іх культурныя асаблівасці і традыцыі; якая вера, традыцыі ў адзенні, ежы, музыцы, і падрыхтаваць цікавыя прэзентацыі. (90 хвілін ці больш)
2. Удзельнікі прадстаўляюць вынікі сваёй працы аўдыторыі.



### Абмеркаванне:

- Ці заўсёды Нарвегія была краінай з многімі разнастайнымі культурамі?
- Што ўказвае на тое, што Нарвегія — шматкультурная краіна сёння?
- Ці ставімся мы да некаторых культур як да больш «блізкіх» нашай культуры? Чаму?
- У Нарвегіі даволі мала амерыканцаў, але шмат людзей, якія прыехалі не з заходнееўрапейскіх краін. І ўсё ж Нарвегія атрымлівае часта характарыстыку «амерыканізаванай» краіны. Чаму, як вы думаеце?
- Якім чынам розныя культуры ў нарвежскім грамадстве ўплываюць адна на адну? Ці можна сцвярджаць, што яны робяць ўзаемны ўплыў і што элементы адной культуры сталі элементамі і іншай? Прывядзіце прыклады.
- Якія цяжкасці ўзнікаюць у шматкультурнай Нарвегіі?
- Якім чынам шматкультур'е спрыяе развіццю грамадства ў Нарвегіі?

### Возьмем пад ўвагу:

Нарвегія — шматкультурная краіна, у якой розныя культуры ўплываюць адна на адну. Ёсць шмат станоўчых бакоў жыцця ў шматкультурным грамадстве, але ёсць і цяжкасці. Усе жыхары Нарвегіі прымаюць удзел у развіцці грамадства.

### Варыяцыя:

Калі ёсць у групе прадстаўнікі не толькі нарвежскай нацыянальнасці, яны могуць прадставіць свае культуры: распавесці пра гісторыю, звычаі, нацыянальнае адзенне, стравы і інш. Можна таксама запрасіць «дарослага» прадстаўніка культуры — бацькоў ці кагосьці яшчэ — прыйсці ў групу і распавесці пра «іх» жыццё ў Нарвегіі. Расказ пра тое, як гэта — быць прыезджым у Нарвегіі, можа аказацца вельмі цікавым. Што ёсць добрага і станоўчага? Якія асноўныя цяжкасці? Што здзівіла пры прыездзе? У чым адрозненні нарвежскай культуры ад іх уласнай?

## ФАКТЫ
## ПРА ЭМІГРАНТАЎ У НАРВЕГІІ:

*Па дадзеных на 2005 год, у Нарвегіі пражывала каля 301 000 эмігрантаў першага пакалення і 64 000 чалавек, чые бацькі родам не з Нарвегіі. У цэлым замежнікі складаюць 8 % насельніцтва Нарвегіі, прадстаўнікі якіх родам з прыкладна 200 розных краін свету. Дзесяць самых шматлікіх груп людзей родам з Пакістана, Швецыі, Даніі, Ірака, В'етнама, Самалі, Босніі і Герцагавіны, Ірана, Турцыі, Сербіі і Чарнагорыі.*

# ШТО ТАКОЕ КУЛЬТУРА?

**Тэма:**

Паняцце «культура», міжкультурнае ўзаемаразуменне.

**Мэта:**

Удзельнікі павінны зразумець, што «культура» — паняцце шматзначнае. Культура можа разумецца як пастаянная рыса той ці іншай групы людзей, а таксама як сфера, якая пастаянна развіваецца.

«Культура» — паняцце, якое мае даволі шырокае значэнне. Мы кажам, напрыклад, пра нарвежскую, французскую, афрыканскую, кітайскую культуру. У такіх выпадках «культура» выкарыстоўваецца для геаграфічнага апісання разнашчэння людзей. Аднак «культура» можа выкарыстоўвацца і ў іншых значэннях: як моладзевая культура, культура замежнікаў, высокая культура, культура ежы і піцва. Усе гэтыя азначэнні ілюструюць шырокае выкарыстанне паняцця «культура». Што ж такое культура?

**Практычная рэалізацыя:**

Спачатку ўдзельнікі працуюць самастойна, затым — агульнае абмеркаванне. Калі ў групе ёсць прадстаўнікі малых народаў, добра было б адвесці ім асобнае месца на заключным этапе — агульным абмеркаванні. Гэта як узбагаціць дыскусію, так і дасць ім болей матывацыі і ўпэўненасці ў сабе.

**Час:** 1–1,5 гадзіны.
**Што неабходна?** Прасторнае памяшканне, вялікія лісты паперы і ручкі.
**Падрыхтоўка:** Даклад — уводзіны ў паняцце «культура».

**Парадак выканання:**

1. Кожнаму ўдзельніку даецца чысты ліст паперы, на якім пасярэдзіне яны пішуць слова «КУЛЬТУРА» і праводзяць ад яго 10 ліній ва ўсе бакі. Над кожнай лініяй яны запісваюць асацыяцыі, якія выклікае ў іх слова «культура». (10 хвілін) Затым яны параўноўваюць свае лісты з суседам. Пасля гэтага вядучы просіць удзельнікаў падзяліцца сваімі думкамі. Ключавыя словы вядучы запісвае на дошцы.
2. Кіраўнік дае невялікую лекцыю аб розных значэннях слова «культура». Галоўная ідэя — тое, што слова «культура» выкарыстоўваецца ў розных значэннях рознымі навукамі (гісторыяй, сацыялогіяй, псіхалогіяй, этыкай, этнаграфіяй). Часта мы думаем аб культуры як пра нешта статычнае, як пра сфарміраваныя «коды ў галаве». Аднак важна памятаць, што культуры змяняюцца і дапаўняюцца з цягам часу. Культура — гэта больш ці менш устойлівыя коды, якія спрыяюць пэўнаму ўспрыманню намі свету. Культура дынамічная і знаходзіцца ў нязменным развіцці. Што ўплывае на гэтыя коды? Ці толькі спадчыннасць («кроў»)? Многія фактары: сям'я, школьнае выхаванне, месца жыхарства (горад—вёска, сталіца—правінцыя), прыналежнасць да пэўнага сацыяльнага пласта, прафесія, узроставыя, гендэрныя, індывідуальныя асаблівасці. (15 хвілін)
3. Вядучы распавядае пра паняцце «субкультура». Удзельнікі затым разыходзяцца па групах і спрабуюць знайсці прыклады розных субкультур. Важна падкрэсліць, што гаворка ідзе не толькі пра моладзевыя субкультуры. Якія іх характарыстыкі? (15 хвілін)
4. Абмеркаванне. (15 хвілін)
   - Ці цяжка было разважаць пра паняцце «культура»? Чаму?
   - Людзі часта апісваюцца як «носьбіты культур». Што маецца на ўвазе пад гэтым?
   - Ці магчыма прыналежнасць чалавека адразу да некалькіх культур?
   - Ці можаце вы прывесці прыклады змены культур?
   - Прывядзіце прыклады культур, якія запазычвалі некаторыя элементы з іншых культур?

**Возьмем пад ўвагу:**

Звычайна мы думаем пра культуру як пра «рэч», якая належыць людзям, у якой ёсць фізічныя межы і якая бярэ свой пачатак у мінулым. У такіх выпадках мы гаворым аб нацыянальнай культуры. Мы думаем пра культуру як пра нешта атрыманае ў спадчыну ад нашых бацькоў; тое, што мы, безумоўна, перададзім нашым дзецям, няхай і ў крыху змененым выглядзе. Можна часта пачуць таксама, што ў грамадстве ёсць шмат субкультур. Тады маюцца на ўвазе меншыя па памеры групы людзей, у якіх ёсць нешта агульнае. Гэта могуць быць, напрыклад, фанаты футбола, хрысціяне, панкі і іншыя. Чалавек, як правіла, належыць адразу да некалькіх культур. Адзін са спосабаў разумення — знаходжанне ў пастаянным развіцці і змяненні ў выніку зносінаў з людзьмі — носьбітамі розных культур.

**Некаторыя азначэнні**

**Што такое культура?**

Аўтар кнігі «Сустрэчы людзей» (2004 г.) Ёйвінд Дал прадстаўляе некалькі спрошчаную тэорыю таго, якім чынам выкарыстоўваецца слова «культура».

1. Культура — як духоўнае жыццё і такія ж «прадукты», як літаратура, жывапіс, музыка, тэатр, тэлебачанне і інш.
2. Культура — як дзеянне: некалькі пашыранае разуменне культуры, якое прадугледжвае аспект культуры ў якім-небудзь дзеянні ці артэфакце (прадмеце): спорт, хобі, навучанне, сацыяльная праца, спажыванне, ежа, адзенне.
3. Культура — як спадчына і памяць: традыцыі, культурны ландшафт, культура прыбярэжных пасяленцаў, прадметы культуры... Тое, што са старажытнасці з'яўляецца носьбітам калектыўнай ідэнтычнасці: мова, рэлігія, казкі, эпасы і інш.
4. Культура — як асаблівасць ладу жыцця: культура каменнага веку, культура індзейцаў, японская культура, бізнэс-культура, культура матацыклістаў.
5. Культура — як падабенства ў меркаваннях: культурныя коды, ідэі, каштоўнасці, нормы, ідэнтычнасць.

СУБКУЛЬТУРА — групы людзей ці супольнасці, меншыя па памеры, якія маюць якую-небудзь агульную характарыстыку, што іх аб'ядноўвае. Для многіх людзей больш важнай з'яўляецца іх прыналежнасць да субкультуры, чым да нацыянальнай культуры.



# ТЫ ЗНАЧЫШ ШМАТ

## Тэма:

Асоба.

## Мэта:

Удзельнікі павінны зразумець, што асоба кожнага чалавека складаецца з мноства розных роляў, адносін і ўласцівасцяў, што ўсе людзі — складаныя індывіды і што таму няправільна і несправядліва акцэнтаваць увагу толькі на адной характарыстыцы/рысе.

Ці задумваліся вы калі-небудзь аб тым, колькі ў вас роляў? Для бацькоў вы — перш за ўсё дзіця: сын ці дачка. У школе вы — прыяцель і вучань. Для каханага(й) вы — каханая(ы). Ну і акрамя ўсяго іншага, вы, мусіць, швед, нарвежац ці, можа быць, кітаец. Вы можаце быць футбалістам, аматарам камп'ютараў ці займацца балетам. Справа ў тым, што вы — гэта шмат усяго рознага, і розныя вашы бакі актывізуюцца ў розных сітуацыях. Вы — складаны індывід, роўна як і ўсе астатнія людзі!

## Практычная рэалізацыя:

Гэта забаўнае практыкаванне, у якім удзельнічаюць усе, размясціўшыся на падлозе.

**Час:** 30 хвілін.

**Што трэба падрыхтаваць?** Прасторнае памяшканне, зручнае для рухомай гульні.

**Падрыхтоўка:** Вядучы павінен падрыхтаваць спіс розных прыналежнасцяў/характарыстык чалавека.

## Парадак правядзення:

1. Група становіцца ў кола вакол вядучага, які стаіць у цэнтры пакоя.
2. Кіраўнік называе прыкмету (характэрную рысу або ўласцівасць), якая з'яўляецца часткай асобы чалавека. Гэтыя прыкметы могуць быць звязаны з полам, нацыянальнасцю, інтарэсамі, фізічнымі характарыстыкамі, захапленнямі і інш. Калі кіраўнік, напрыклад, кажа: «Дзяўчына!», то ўсе дзяўчаты павінны выйсці ў цэнтр кола. Калі ўсе змаглі пабачыць усіх дзяўчат, яны могуць вярнуцца на сваё месца. Калі кіраўнік кажа: «Нарадзіўся за мяжой!», усе, хто нарадзіўся за мяжой, выходзяць у цэнтр кола. Важна, каб кіраўнік называў шмат розных прыкмет і ўласцівасцяў, напрыклад: спартсмен, эмігрант, мае братоў

ці сясцёр, зялёныя вочы, рэлігійны, бландын, не цікавіцца футболам, рокер, належыць да двух культур, сваякі жывуць за мяжой, закаханы, належыць да меншасці, палітычна актыўны, носіць акуляры і інш. Усе ўдзельнікі з пэўнай прыналежнасцю становяцца ў кола.

### Абмеркаванне:

- Што вы думаеце пра гэтае практыкаванне і чаму, як вы думаеце, мы яго рабілі?
- Ці даведаліся вы што-небудзь новае адзін пра аднаго?
- Ці даведаліся вы што-небудзь новае пра саміх сябе?
- Ці ёсць нейкія ідэнтычнасці, якім часцей надаецца значэнне? У якой сувязі? Чаму? Да якіх наступстваў гэта прыводзіць? Ці правільна гэта і справядліва?
- Ці ёсць у вас нейкія прыналежнасці/рысы, якія вы не хацелі б мець? Як вы іх набылі?

### Возьмем пад ўвагу:

Людзі — складаныя індывіды, якія маюць шмат прыналежнасцяў і характарыстык. Шмат што вызначае, хто мы і што складае нашу асобу. Нашы прыналежнасці актывізуюцца ў розных сітуацыях. Часам на пярэдні план выходзяць тыя нашы прыкметы, якія нам не падабаюцца. Можа быць, я таксама часам вылучаю прыкметы людзей, якія ім не падабаюцца? Нашы характарыстыкі робяць нас унікальнымі і незаменнымі.

### Варыяцыя:

Ролевая гульня: удзельнікі разыгрываюць сітуацыю, дзе чалавек «іншы», непадобны на другіх, і яму гэта падабаецца.

«Дзе б я ні быў і што б я ні рабіў, адзінае, што яны заўважалі, дык гэта тое, што я тоўсты!»

Маленькі хлопчык пра свае школьныя гады



## ЦІ САМ ТЫ СТВАРАЕШ СВАЮ ІДЭНТЫЧНАСЦЬ?

### Тэма:

Ідэнтычнасць.

### Мэта:

Удзельнікі павінны зразумець, што многія фактары ўплываюць на фарміраванне ідэнтычнасці чалавека.

Ці думалі вы калі-небудзь пра тое, што многае з таго, што складае вашу асобу, мае адносіны да рэчаў, якія цалкам па-за вашым кантролем? Не вы ж вырашалі, у якой краіне нарадзіцца і вырасці. І не вы самі выбралі вашых бацькоў і лад жыцця, рэлігію (хаця часта людзі прыходзяць да рэлігіі ці атэізму самі, без уплыву родных). Ваша ідэнтычнасць, такім чынам, складаецца з многіх розных фактараў. Культура, у якой мы «нараджаемся», уплывае на фарміраванне нашай ідэнтычнасці. Гэта адрознівае кітайца, напрыклад, ад нарвежца. Пры гэтым трэба памятаць, што кітаец, які вырас у Нарвегіі, не вельмі моцна будзе адрозніваца ад нарвежца, але вельмі моцна — ад кітайца, які вырас у Кітаі. І кітаец, які выхоўваўся ў сям'і доктара ў Пекіне, не так ужо моцна будзе адрозніваца ад сына доктара ў Осла. У той жа час людзі «ствараюць» сябе самі, выбіраючы для сябе каштоўнасці ў жыцці і адносіны да таго ці іншага пытання. Вы самі цалкам можаце змяніць горад ці краіну пражывання, калі адчуваеце, што менавіта там зможаце больш поўна рэалізавацца. Гэта робіць і кітаец, і нарвежац. Мы залежым адзін ад аднаго і фарміруем асобы адзін аднаго праз кантакт і дыялог.

«Мужчына і жанчына — не проста самі па сабе... Яны таксама і асяроддзе, у якім яны жывуць; горад і вуліца, дзе яны навучыліся хадзіць; цацкі, з якімі яны гулялі ў дзяцінстве; ежа, якую яны елі; школа, у якой яны вучыліся; спорт, якім яны займаліся; пісьменнікі, якіх яны чыталі, і Бог, у якога яны вераць».

Самерсэт Моэм «Лязо брытвы»

### Практычная рэалізацыя:

Удзельнікі пачынаюць працу самастойна, запаўняючы табліцы сваіх прыналежнасцяў/рысаў/здольнасцяў. Выкананне практыкавання працягваецца агульным абмеркаваннем.

**Час:** 45 хвілін.
**Што неабходна?** Ручкі і табліцы.
**Падрыхтоўка:** Табліца — ліст паперы з пытаннямі.

### Парадак выканання:

1. Вядучы пачынае з тлумачэння, што мэта практыкавання — высветліць, якім чынам фарміруецца наша ідэнтычнасць. Ёсць многія фактары, якія садзейнічалі і садзейнічаюць станаўленню нашай асобы і якія робяць нас непадобнымі на іншых. Некаторыя фактары мы можам «выбіраць» самі, а некаторыя дадзены нам ад нараджэння.
2. Усім удзельнікам раздаецца ліст паперы з пытаннямі/табліцай:
   - Якія вашы самыя важныя элементы ідэнтычнасці?
   - З якімі прыналежнасцямі і характарыстыкамі вы нарадзіліся?
   - Якія прыналежнасці вы выбралі самі?
   - Ці належыце вы да якой-небудзь групы? Якой?
   - Ці змушалі вас да якой-небудзь прыналежнасці? Якой?

### Абмеркаванне:

- Якія пачуцці ў вас былі, калі вы адказвалі на пытанні?
- Ці задавалі вы сабе і раней пытанні: «Хто я? Што я?» і «Чаму я стаў(ла) такім(ой), якім(ой) я ёсць?»
- Ці было нешта, што вас здзівіла ў адказах?
- З якімі рысамі/асаблівасцямі чалавек нараджаецца? А якія набывае ў жыцці?
- Якія бакі ідэнтычнасці чалавека з'яўляюцца вынікам пабочнага ўплыву?
- Адносна якіх бакоў сваёй ідэнтычнасці чалавек вырашае сам?
- Якія бакі сваёй ідэнтычнасці чалавек хацеў бы мець? (Напрыклад, у школе ці сярод сяброў)
- За якія бакі сваёй ідэнтычнасці мы змагаемся?
- Чаму людзям вешаюць ярлыкі ці прыпісваюць якасці/прыналежнасці, якія яны самі б не хацелі? Ці здаралася падобнае з вамі ці з іншымі людзьмі, якіх вы ведаеце?
- Якія могуць быць наступствы сітуацыі, калі чалавеку прыпісваюцца якасці/прыналежнасці? Як можна справіцца з падобнай сітуацыяй?
- Што важней: прыналежнасць і асяроддзе, у якіх мы нарадзіліся, ці тое, кім і чым мы хочам стаць? Ці ёсць тут узаемасувязь?
- Ці дапамог дадзены «аналіз» убачыць сябе самога па-новаму?
- Ці дапамог дадзены «аналіз» убачыць іншых людзей па-іншаму/па-новаму? Чаму і якім чынам?
- Мы ўплываем на іншых людзей, і на нас уплываюць іншыя. Ці нясем мы адказнасць адзін за аднаго?

### Возьмем пад ўвагу:

Не мы адны фарміруем нашу ідэнтычнасць і асобу. Некаторыя фактары дадзены нам ад прыроды, як, напрыклад: блакітныя ці карыя вочы, пол. Некаторыя маюць адносіны да таго, у якой краіне і грамадстве мы нарадзіліся, да якой культуры належым; хто мы па нацыянальнасці; належым да большасці ці меншасці ў грамадстве; багатыя мы ці бедныя. Гэтыя фактары могуць змяняцца, у тым ліку і намі самімі. Такія элементы ідэнтычнасці, як заняткі тым ці іншым відам спорту, маляванне, ігра на музычным інструменце, пачуццё павагі або непавагі да рэлігіі, цікавасць да палітыкі — мы першапачаткова выбіраем самі. Наша ідэнтычнасць фарміруецца, такім чынам, з рысаў і асаблівасцяў, з якімі мы нарадзіліся, з навакольнай рэчаіснасці і ўласнага выбару.

### Варыяцыя:

Кажуць, што мы вучымся адзін у аднаго. Часта можна бачыць, што людзі, якія добра ведаюць адзін аднаго і праводзяць шмат часу разам, уплываюць адзін на аднаго так моцна, што яны развіваюць асаблівыя манеры і звычкі, якія, у сваю чаргу, «пазнаюцца» толькі той групай людзей, у якой чалавек «круціцца». Гэта называецца сацыяльнымі кодамі. Прыкладам такой «звычкі», вельмі папулярнай сярод сённяшняй нарвежскай моладзі, якая не існавала яшчэ 15 гадоў таму, з'яўляецца жэст «дай пяць», калі людзі пляскаюць у далоні адзін аднаго, каб пазначыць, што ў іх нешта атрымалася. Чаму навучыўся ты ў сваіх сяброў? Чаму навучыліся яны ў цябе? Ці ёсць у вас агульная мова, звычкі і г.д.?

## МОЙ УЛАСНЫ ГЕРБ

**Тэма:**

Ідэнтычнасць.

**Мэта:**

Удзельнікі павінны задумацца над станоўчымі рысамі іх характараў і асаблівасцямі іх асобаў.

У старыя часы ў некаторых сем'яў былі свае ўласныя сямейныя гербы. У асноўным гэта былі багатыя і ўплывовыя сем'і, чые гербы складаліся з сімвалаў, якія характарызавалі сям'ю. Калі сям'я была веруючай, герб мог утрымліваць якія-небудзь рэлігійныя сімвалы; калі гэта была сям'я паляўнічых, хутчэй за ўсё, іх герб упрыгожвала якая-небудзь жывёла. Іншымі сімваламі маглі быць: збожжа, палі, рыба, вінаградная лаза і інш. Якім бы ты хацеў бачыць свой уласны герб?

**Практычная рэалізацыя:**

Практыкаванне заключаецца ў тым, каб раздаць кожнаму ўдзельніку чысты ліст паперы з контурамі герба, які яны павінны будуць размаляваць. (гл. ілюстрацыю)

**Час:** 45 хвілін.
**Што неабходна?** Копіі контураў герба кожнаму ўдзельніку, каляровыя алоўкі, ручкі.
**Падрыхтоўка:** Кіраўніку неабходна падрыхтаваць пытанні.

**Парадак выканання:**

1. Вядучы раздае лісты паперы з контурамі герба кожнаму ўдзельніку.
2. Заданне ўдзельнікам: «намаляваць» на гербе адказы на наступныя пытанні:
   - Самае добрае, што здарылася са мной у жыцці...
   - Мой самы вялікі поспех...
   - Мой самы шчаслівы момант у жыцці...
   - Тры самыя важныя для мяне інтарэсы...
   - Тры рэчы, якія я вельмі добра ўмею рабіць...
   - Я хачу стаць...
   - Лепшае ўва мне — гэта...
   - Тое, што для мяне мае вялікае значэнне, — гэта...
   - Гэта, я спадзяюся, здарыцца са мной у будучыні...

   У «стужцы» герба, унізе, можна напісаць тры самыя лепшыя рысы свайго характару.
3. Калі ўдзельнікі гатовы, гербы можна развесіць па сценах.





**Абмеркаванне:**

- Што вы адчувалі, калі трэба было думаць «пра сябе»?
- Ці цяжка было знайсці ў сабе станоўчыя рысы характару/асобы? Чаму?
- Ці можам мы зрабіць выснову, што мы ўсе ўмеем штосьці рабіць вельмі добра?
- Якім чынам мы можам «выкарыстоўваць» нашы станоўчыя бакі?

**Возьмем пад ўвагу:**

Усе людзі каштоўныя. Ва ўсіх ёсць станоўчыя бакі, рысы і здольнасці. Нашы здольнасці, веды і вопыт — гэта рэсурсы, якія неабходна выкарыстоўваць у жыцці. На нас ляжыць адказнасць як выкарыстоўваць іх, так і развіваць іх далей.





## МАЁ ДЗЯЦІНСТВА

**Тэма:**

Разнастайнасць, адрозненні і падабенствы паміж людзьмі.

**Мэта:**

Удзельнікі павінны адчуць, што існуе шмат розных магчымасцяў вырасці і што трэба ўмець разумець і суперажываць іншым людзям.

На працягу жыцця людзі набываюць розны вопыт і таму рознае разуменне і погляды на жыццё. Мы становімся «рознымі», паколькі вырастаем у розных месцах, у розных сацыяльных і эканамічных умовах, у розных рэлігіях; ці паколькі мы пераязджаем на новыя месцы, мы набываем новы вопыт. Усе гэтыя фактары аказваюць свой уплыў, як і мова, на якім мы размаўляем, і пол, да якога належым. Ва ўсіх нас наша «асаблівае» дзяцінства, і ўсе мы ў нейкі ступені застаемся дзецьмі! Даведваючыся пра дзяцінства іншых, мы можам больш даведацца пра іншых людзей і адрозненні паміж намі.

**Практычная рэалізацыя:**

Гэта даволі «простае» практыкаванне праводзіцца ў выглядзе дыялогу ўдзельнікаў у малых групах. Яно вельмі падыходзіць для групы, дзе вучні добра ведаюць адзін аднаго і адчуваюць сябе даволі камфортна. Практыкаванне ні ў якім разе не павінна стаць псіхааналізам. Павага ўдзельнікаў адзін да аднаго тут вельмі важная. Удзельнікам неабавязкова адказваць на ўсе пытанні.

**Час:** 45 хвілін.
**Што неабходна?** Прасторнае памяшканне, падрыхтаванае для працы ў групах.

**Парадак выканання:**

1. Кіраўнік дзеліць удзельнікаў на невялікія групы. Мэта — гутарка пра ўласнае дзяцінства. Калі гутарка ў пачатку «не клеіцца», удзельнікі могуць задаваць адзін аднаму больш канкрэтныя пытанні. Напрыклад, такія:
   - Ці вялікая ў цябе сям'я?
   - Што табе падабалася рабіць больш за ўсё ў вольны час?
   - З якімі цацкамі ты гуляў? У якія гульні?
   - Ці строгія твае бацькі? Як цябе каралі, калі ты рабіў штосьці не так?
   - У цябе шмат сяброў у двары?

- Якая твая любімая страва?
- Колькі табе было гадоў, калі ты пайшоў у школу? Ці падабалася табе хадзіць у школу?
- Ці хадзіш ты ў нядзельную ці якую-небудзь іншую школу?
- Ці прыходзілася табе працаваць, калі ты быў маленькім?
- Ці прыходзілася табе глядзець за малодшымі братамі і сёстрамі?
- Ці ўсяго табе хапала? Чаго не хапала?
- Якія святы табе больш за ўсё падабаліся? Як вы адзначалі іх у сям'і?
- Да каго ты звяртаўся, калі трэба было пагаварыць пра складаныя рэчы/пачуцці?
- Ці былі там, дзе ты вырас, людзі іншай нацыянальнасці, рэлігіі і культуры? Ці меў ты з імі зносіны?
- Ці былі там, дзе ты вырас, уцекачы? Як ім жылося?
- Якая палітыка ў краіне, у якой ты жывеш? Ці ўплывае гэта на цябе якім-небудзь чынам?

### Абмеркаванне:

- Якое ваша меркаванне пра дадзенае практыкаванне?
- У вашых дзяцінствах было больш падабенстваў ці адрозненняў? Што было падобнае? Што рознае?
- Ці было так, што хто-небудзь з вас з аднаго і таго ж месца, але маеце розны вопыт? Чаму гэта так, як вы думаеце?
- Ці былі хто-небудзь з вас з аднаго і таго ж месца, і маеце аднолькавы вопыт? Чаму гэта так, як вы думаеце?
- Як вы думаеце, ці ва ўсіх дзяцей вашага двара такія ж успаміны пра дзяцінства, як у вас?

### Возьмем пад ўвагу:

Людзі вырастаюць у розных умовах. Ёсць шмат іншых фактараў, у дадатак да полу, колеру скуры, нацыянальнасці і рэлігіі, якія садзейнічаюць таму, што людзі становяцца рознымі. Нават тыя, у каго, здавалася б, аднолькавыя магчымасці, выкарыстоўваюць іх па-рознаму.

Самае асноўнае ў жыцці выбраць ніхто не можа: месца нараджэння, пол і бацькоў.



## ПАДОБНЫЯ ЦІ НЕ?

### Тэма:

Адрозненні і падабенствы.

### Мэта:

Удзельнікі павінны зразумець, што кожны чалавек у чымсьці падобны на іншых, а ў чымсьці адрозніваецца ад іх; на розных падставах (прыкметах) мы можам аб'ядноўвацца ў групы з рознымі людзьмі.

Ты высокі, а я — не, але мы абодва ходзім па Зямлі. Ты верыш у Бога, а я не веру ні ўва што, акрамя жыцця, якое — тут і цяпер. Ты размаўляеш на фарсі, а я — па-нарвежску, але мы абодва ведаем англійскую. Табе падабаецца футбол, а мне — камп'ютарныя гульні, але мы абодва любім плаваць. Усе мы — унікальныя і асаблівыя асобы. Часам мы ганарымся сабой, а другі раза мы гатовы праваліцца ад сораму скрозь зямлю. Гэтак жа, як і многія іншыя.

### Практычная рэалізацыя:

Гэта вясёлае практыкаванне, якое добра падыходзіць або ў пачатку заняткаў , або як «паўза» ў працы па тэме «Ідэнтычнасць» і інш. Важна выканаць практыкаванне хутка.

**Час:** 30 хвілін.
**Што неабходна?** Прасторнае памяшканне і крэсла кожнаму.

### Парадак выканання:

1. Удзельнікі ўтвараюць кола з крэслаў. Кожнаму даецца паўхвіліны, каб падумаць і знайсці ў сабе што-небудзь такое, чаго няма ў іншых у групе. Гэта могуць быць або ўражанні ад перажытага, або штосьці іншае.
2. Кіраўнік выбірае аднаго ўдзельніка, каб пачаць. Той называе «сваю» асаблівасць, напрыклад: «Я тры разы быў у Турцыі». Калі ні ў кога іншага ў групе не было таго ж самага (вандроўкі тры разы ў Турцыю), то іншы ўдзельнік працягвае гульню, называючы ўжо «сваю» асаблівасць. Калі хтосьці пазнае сябе ў названым, ён павінен сказаць: «Я таксама» і сесці на калені таго, хто гэтую асаблівасць назваў. Калі хтосьці яшчэ сябе ў гэтым «пазнае», то таксама садзіцца на калені да таго, хто гэтую асаблівасць назваў. Затым усе вяртаюцца на свае крэслы, і той жа ўдзельнік называе іншую сваю асаблівасць. Калі яму удасца знайсці асаблівасць, характэрную толькі для яго, працягвае ўжо наступны ўдзельнік. Першы тур скончаны, калі ўсе ўдзельнікі выявілі нешта «сваё», тое, што адрознівае іх ад астатніх у групе.

3. Пачынаецца другі тур, сэнс якога — знайсці як мага больш падабенстваў. Вядучы прыбірае адно крэсла і просіць каго-небудзь з удзельнікаў стаць у цэнтры. Той называе характарыстыку, якую, па ягоным меркаванні, ён дзеліць з многімі ў групе. Напрыклад: «Я люблю музыку». Усе, хто «любіць музыку», павінны ўстаць са свайго крэсла і знайсці сабе іншае. Той, хто застанецца без крэсла, называе наступную характарыстыку. Практыкаванне працягваецца да таго часу, пакуль усім весела, або да таго, калі стане відавочна, як шмат агульнага ва ўсіх удзельнікаў.
4. Абмеркаванне:
   - Што было працей выявіць: адрозненні паміж намі ці падабенствы?
   - Якія характарыстыкі падабенстваў паміж намі?
   - Падумайце яшчэ раз над характарыстыкамі, якія вы назвалі. Можа быць, тое, што робіць вас іншым, было б падобнай рысай у іншай групе?
   - Маглі б некаторыя характарыстыкі быць характэрнымі для ўсіх людзей у свеце?
   - Ці могуць адрозненні прывесці да рознага/няроўнага стаўлення да людзей?
   - Што адбываецца, калі людзі спрабуюць зменшыць ці выкараніць адрозненні?
   - Мы павінны змагацца з адрозненнямі ці прымаць іх?
   - У якіх выпадках нам неабходна прымаць адрозненні?
   - Ці могуць адрозненні быць выкарыстаны ў станоўчым плане?
   - Ці трэба нам больш падабенстваў паміж людзьмі ў грамадстве? Або трэба больш раўнапраўя?

### Возьмем пад ўвагу:

У свеце налічваюцца тысячы самых розных культур. Існуюць таксама адрозненні паміж прадстаўнікамі адной культуры. Не бывае цалкам аднолькавых людзей. Чым больш мы ведаем адзін пра аднаго, тым больш мы разумеем, як мы падобныя. Ва ўсіх нас ёсць агульная патрэба ў ежы, сне, бяспецы, у блізкасці і каханні. Нягледзячы на адрозненні паміж намі, у нас шмат агульнага. Пакуль адрозненні не парушаюць правоў чалавека, іх неабходна прымаць, а не змагацца з імі. Адрозненні робяць свет цікавым.



## КАШТОЎНАСЦІ

### Тэма:

Каштоўнасці.

### Мэта:

Удзельнікі павінны абмеркаваць этычныя каштоўнасці, якія ляжаць у аснове нашых адносінаў і ўчынкаў; атрымаць інфармацыю аб тым, што людзі рознай культуры могуць тлумачыць каштоўнасці па-рознаму.

Этычныя каштоўнасці — гэта асноўныя прынцыпы, кіруючыся якімі мы робім той ці іншы выбар. Яны — адлюстраванне нашай ідэнтычнасці і асобы: што мы лічым прымальным, пажаданым; што мы гатовы абараняць. Каштоўнасці — спосаб выяўлення культуры і супольнасці людзей. Пытанне толькі ў тым, ці ўсе людзі падзяляюць агульнае ўяўленне аб тым, што такое каштоўнасці. Каштоўнасці часта з’яўляюцца асновай для нашых учынкаў, але не заўсёды. Што з таго, што мы на словах ставімся станоўча да іншых людзей і іх асаблівасцяў, калі мы не дэманструем гэта ў паўсядзённым жыцці? З іншага боку, магчыма, і добра, што негатыўныя адносіны да іншых не выліваюцца ў нашы дзеянні.

### Азначэнні:

**Мараль** (ад лацінскага moralis — звычаі і звычкі) — гэта норавы: вучэнне аб маральных поглядах — этыка; сістэма нормаў і правілы, якія лічацца належнымі ў грамадстве ці групе людзей, і паводзіны, якія адпавядаюць дадзеным нормам і правілам.
**Этыка** (ад грэчаскага ethos — звычай) — гэта вучэнне аб нормах і каштоўнасцях, якія кіруюць нашымі ўчынкамі і вызначаюць, што — добра і што — дрэнна. Этычны: маральны, правільны[63].

Людзі берагуць і абараняюць свае этычныя каштоўнасці.

### Практычная рэалізацыя:

Удзельнікі працуюць спачатку ў парах, якія затым збіваюцца ў чацвёркі. Завяршаецца практыкаванне агульным абмеркаваннем.

**Час:** 1,5 гадзіны.
**Што неабходна?** Прасторнае памяшканне, падрыхтаванае для працы ў групах. Папера, ручкі, налепкі, газеты. Добра, калі ёсць магчымасць выкарыстоўваць бібліятэку ці Інтэрнэт.
**Падрыхтоўка:** Спіс з 20 каштоўнасцямі, копія для кожнага ўдзельніка.

### Парадак выканання:

1. Вядучы тлумачыць, што дадзенае практыкаванне — аб этычных каштоўнасцях, і дае азначэнне. Кожны ўдзельнік атрымлівае спіс з 20 каштоўнасцямі, якія напісаны на лістах у рознай паслядоўнасці. Прыклады каштоўнасцяў: міжкультурнае ўзаемаразуменне, свабода веравызнання, гонар, парадак, супрацоўніцтва, вера, богапаслухмянства, любоў, поспех, сціпласць, свабода слова, салідарнасць, дыялог, цярпімасць, талерантнасць, дэмакратыя, годнасць чалавека, раўнапраўе, павага, адказнасць, сумленнасць, справядлівасць. Удзельнікі працуюць у парах. Заданне — падзяліць каштоўнасці на 2 катэгорыі: 5 — самых важных і 5 — няважных. (10 хвілін)
2. Калі пары скончылі працу, яны аб'ядноўваюцца яшчэ з адной парай і працуюць у групе з чатырох чалавек. Групе неабходна выбраць толькі адну каштоўнасць для працы. Удзельнікам, пажадана засноўваючыся на сваім уласным вопыце, неабходна абмеркаваць і адказаць на наступныя пытанні:
   а) Чаму вы выбралі менавіта гэтую каштоўнасць?
   б) Пра што гэтая каштоўнасць і якое значэнне яна мае для нас?
   в) Якім чынам выяўляецца гэтая каштоўнасць у нашым грамадстве і свеце?
   г) Што ўказвае на тое, што гэтая каштоўнасць шануецца?
   д) Што перашкаджае таму, каб гэтая каштоўнасць шанавалася?
3. Удзельнікі прадстаўляюць вынікі сваёй працы аўдыторыі.

### Абмеркаванне:

- Як праходзіла абмеркаванне каштоўнасцяў? Ці цяжка было выбраць самыя важныя каштоўнасці? Чаму?
- У кожнай культуры ёсць свае каштоўнасці і ў людзей — свае. Ці заўсёды яны супадаюць?
- Культуры розныя. Ці так гэта, што ў розных культур розныя каштоўнасці? Як вы думаеце, маладыя людзі з ЗША, Кітая або Пакістана выбралі б тыя ж самыя каштоўнасці, што і вы?
- Ці можна падзяліць каштоўнасці на тыя, якія спрыяюць развіццю і дабрабыту ў грамадстве, і тыя, якія толькі спрыяюць «самаразвіццю»? Можаце прывесці прыклады?
- Чаму важна разважаць і быць упэўненым у «сваіх» каштоўнасцях?
- Ці так моцна мы паважаем каштоўнасці іншых людзей, як свае ўласныя?
- Ці могуць этычныя каштоўнасці не супадаць з каштоўнасцямі правоў чалавека? Як ставіцца да такіх каштоўнасцяў?
- Ці можаце вы прывесці прыклады каштоўнасцяў, якія змяніліся ў тым ці іншым грамадстве з цягам часу (напрыклад, адносна раўнапраўя палоў, нетрадыцыйнай сэксуальнай арыентацыі, плюралізму рэлігій і інш.)?
- Якім чынам мы выбіраем каштоўнасці, якія становяцца часткай нашай ідэнтычнасці і асобы?
- Ці з'яўляюцца каштоўнасці асновай для нашых меркаванняў, адносінаў і ўчынкаў?
- Ці цяжка «выкарыстоўваць» тыя каштоўнасці, якія мы лічым важнымі, у паўсядзённым жыцці? Чаму? Прывядзіце прыклады.
- Ці «адкінулі» вы якія-небудзь каштоўнасці ў жыцці пасля таго, як даведаліся нешта новае?

### Возьмем пад ўвагу:

Этычныя каштоўнасці — гэта аснова нашых поглядаў, меркаванняў і ўчынкаў. У людзей могуць быць розныя тлумачэнні адных і тых жа каштоўнасцяў, і людзі розных культур могуць аддаваць прыярытэт адным каштоўнасцям, а не іншым. Гэта можа ствараць праблемы ў шматкультурным грамадстве. Аднак, калі мы ўпэўнены ў выбраных каштоўнасцях, тады нам лягчэй думаць крытычна. Правы чалавека абараняюць тыя каштоўнасці, якія з'яўляюцца агульнымі для ўсіх людзей на Зямлі.

### Варыяцыя:

**Плакат аб каштоўнасці**
Мэта дадзенага практыкавання — паказаць, што этычныя каштоўнасці ляжаць у аснове правоў чалавека. Вядучы дзеліць удзельнікаў на групы, якія бяруць на разгляд адну якую-небудзь каштоўнасць і робяць аб ёй плакат. Плакат павінен утрымліваць:
- Кароткае азначэнне каштоўнасці.
- Малюнак, які адлюстроўвае каштоўнасць.
- Адзін ці некалькі артыкулаў Усеагульнай дэкларацыі, што абараняюць дадзеную каштоўнасць.
- Аналіз тых правоў чалавека, якія адлюстроўваюць дадзеную каштоўнасць. Што канкрэтна гэта азначае? У каго ёсць такое права? Як рэалізуецца гэта права ў краіне/свеце?
- Прыклады парушэння дадзенага(ых) права(оў) чалавека.

Групы прадстаўляюць свае плакаты аўдыторыі.

---

63. www.caplex.no, 09.04.2007, запыт слова «мараль» і «этыка»

# У МЯНЕ ЁСЦЬ ВЫБАР

**Тэма:**

Ідэнтычнасць і мужнасць.

**Мэта:**

Удзельнікі павінны ўсвядоміць, што яны самі выбіраюць, якімі хочуць быць і кім стаць і самі нясуць адказнасць за свае ўчынкі.

Нягледзячы на тое, што мы зведваем уплыў іншых людзей і абставінаў, мы самі можам вырашаць, кім і чым хацелі б быць. Для адных людзей гэта зрабіць лёгка, паколькі яны больш упэўнены ў сваіх поглядах і перакананнях, а іншыя людзі прымаюць іх выбар. Для другіх зрабіць такі выбар можа быць вельмі цяжка. Можа быць, таму, што чалавек не ўпэўнены ў сабе ці ў тым, што ён мае на ўвазе, або таму, што іншыя людзі не паважаюць/не прымаюць яго выбару. У апошнім выпадку працэс фарміравання асобы можа стаць даволі хваравітым. Мы «фарміруем» сябе ў асноўным у маладыя гады. Якія свае перакананні варта адстойваць? Усе нашы выбары, як маленькія, так і вялікія, гавораць пра нас: хто мы і якімі хочам быць.

> Часта мы робім тое, пра што нас просяць людзі, якія для нас з'яўляюцца аўтарытэтам. «Рабі што хочаш. Але не забудзься, што ты мой сын. І ведаеш, што гэта значыць?» — спытаў ён. «Гэта значыць, што б ты ні рабіў, гэта не павінна нашкодзіць мне. Ніхто не скажа, што ты зрабіў нешта дрэннае. Усе будуць казаць, што ты мой сын, які зрабіў нешта дрэннае. Ты частка маёй ідэнтычнасці».
>
> Цытата з кнігі Кадафі Заман і Лавілін Кумар (2001 г.)

**Практычная рэалізацыя:**

Практыкаванне пачынаецца з самастойнай працы, калі кожны ўдзельнік думае над нейкай асобнай праблемай, якая будзе абмяркоўвацца ў канцы. Пасля ўступнай фазы ўдзельнікі дзяляцца на невялікія групы. Праца ў групах можа быць простай, напрыклад толькі гутарка і дыскусія, або больш аб'ёмнай — з падрыхтоўкай прэзентацый, з фотаздымкамі, дакладамі, адпаведнымі артыкуламі і інш.



**Час:** Ад 45 хвілін да некалькіх гадзін.

**Што неабходна?** Калі спрошчаны варыянт практыкавання, нічога загадзя рыхтаваць не трэба. Калі праца ў групах будзе больш аб'ёмнай, неабходна падрыхтаваць паперу, ручкі, забяспечыць доступ да інфармацыі: бібліятэкі, друкаваных выданняў, Інтэрнэта.

**Парадак выканання:**

1. Вядучы прапануе ўдзельнікам падумаць: ці прымалі яны калі-небудзь такое рашэнне ў жыцці, з якім былі нязгодныя навакольныя; калі прыйшлося ісці «супраць» іншых? Ці прымалі яны рашэнні, з якімі навакольныя людзі былі згодныя? Якое рашэнне было прасцей прыняць? (5—10 хвілін)
2. Вядучы дзеліць удзельнікаў на невялікія групы (па 3—4 чалавекі ў кожнай). Палова груп павінна будзе знайсці прыклады людзей, якія аказвалі супраціў сваёй сям'і, грамадству, культуры, каб зрабіць свой выбар. Гэта могуць быць як вядомыя, так і не вельмі вядомыя людзі. Другая палова груп павінна вызначыць каштоўнасці, разуменне і ўспрыманне якіх змянілася ў грамадстве, што прывяло, у сваю чаргу, да паляпшэння становішча асобных людзей ці цэлых груп. Гэта можа быць, напрыклад, стаўленне да жанчын, да моладзі, да людзей нетрадыцыйнай сэксуальнай арыентацыі, да людзей з цёмным колерам скуры і інш. Групе таксама трэба будзе паспрабаваць вылучыць чалавека, які адыграў вялікую ролю ў гэтых зменах. Ці каштавала гэта яму вялікай канфрантацыі? Групы могуць падрыхтаваць як вусныя, так і пісьмовыя прэзентацыі. (20 хвілін)
3. Групы прадстаўляюць вынікі сваёй працы аўдыторыі.
4. Абмеркаванне:
   - Ці цяжка было ацэньваць самога сябе і свой каштоўнасны выбар? Што кажуць пра нас гэтыя гісторыі? Пра таго, хто прыняў тое ці іншае рашэнне? Пра іншых людзей? Пра тых, хто быў супраць, і тых, каму было ўсё роўна?
   - Чаму мы робім менавіта той ці іншы выбар, а не які-небудзь яшчэ?
   - Як гэта — выбіраць, калі іншыя не згодныя з тваім выбарам? Чаго мы баімся ў такім выпадку? Што нас адрынуць? Нечага іншага?
   - Што адбываецца з намі, калі мы асмельваемся адстойваць свае погляды і ісці супраць плыні?
   - Што адбываецца з намі, калі мы не рашаемся гэтага зрабіць, хаця і вельмі хочам?
   - Кажуць, што «мы — гэта выбар, які мы робім». Што гэта азначае?

## Возьмем пад ўвагу:

Кожны дзень мы робім той ці іншы выбар, маленькі ці вялікі: дома, у школе, на працы і ў іншых сферах жыцця. Зрабіць каштоўнасны выбар, які супярэчыць меркаванням іншых, можа быць вельмі складана. Асабліва калі гэтыя людзі — блізкія. Аднак у некаторых выпадках можа аказацца важным абараніць свой выбар, паколькі тады вы становіцеся мацнейшай асобай. Многія, хто спрыяў пазітыўным зменам у грамадстве ў галіне навукі або справядлівасці, «ішлі супраць плыні». Мы самі нясем адказнасць за свае погляды, учынкі і выбар.

Ніхто не адказны, акрамя мяне, за мае ўчынкі і выбар.

## Варыяцыя 1:

**Ролевая гульня:** адзін з удзельнікаў зрабіў выбар, з якім іншыя не згодныя.
**Ролевая гульня:** адзін з удзельнікаў — іншы, непадобны на астатніх і задаволены гэтым.

## Варыяцыя 2:

**«Анёл» і «д'ябал»**
Дазвольце ўдзельнікам распавесці сітуацыі з жыцця, у якіх яны былі «анёламі» або «д'ябламі». Можна вусна ці ў выглядзе сцэнкі. Вядучы сам можа пачаць, распавёўшы пра тое, якім паслухмяным, клапатлівым і ўважлівым ён быў. А потым распавесці, якім дрэнным і нядобрым ён быў. Удзельнікі самі вырашаюць, распавесці ім пра сваё стаўленне да людзей ці, можа быць, жывёл. Самае галоўнае тут — паказаць, што ва ўсіх людзей ёсць самыя розныя рысы і пачуцці і што спраўляемся мы з імі па-рознаму, зыходзячы з нашага выхавання і развіцця. Мы можам выбіраць, якімі мы хацелі б быць!

## Варыяцыя 3:

Узяўшы за аснову прыклады людзей, якія зрабілі іншы, чым пераважная большасць, і, магчыма, насуперак ёй выбар, удзельнікі могуць падрыхтаваць невялікія замалёўкі і сцэнкі.

## Варыяцыя 4:

У 1945 годзе ў Нюрнбергу быў створаны Міжнародны ваенны трыбунал для разгляду злачынстваў Другой сусветнай вайны. Многія абвінавачаныя прызналіся тады ў масавых забойствах, але спасылаліся на тое, што яны ўсяго толькі выконвалі загады вышэйшых камандзіраў. Умовай Нюрнбергскага працэсу было тое, што ні ў аднаго з абвінавачаных не было магчымасці абвясціць аб сваёй невінаватасці па прычыне таго, што яны ўсяго толькі выконвалі загады. Філосаф Туры Фрост сказаў, што «вобраз чалавека», які быў створаны на працэсе, даказвае, што чалавеку, у першую чаргу, павінна быць прад'яўлена абвінавачванне, якое кідае выклік яго сумленню. Ніякія акалічнасці ці загады вышэйшых не маюць значэння. Для нямецкіх салдат недастаткова было звальваць на выкананне загаду забіваць людзей. Яны павінны несці адказнасць за свае дзеянні. Фрост сцвярджае таксама, што ў кожнага чалавека ёсць этычны і маральны пачатак, якім ён павінен кіравацца. Кожны павінен думаць і вырашаць сам.

- Вы згодны з дадзеным пунктам гледжання ці не?
- Што азначае ваша згода/нязгода?

«Я зрабіў толькі тое, пра што мяне папрасілі!»

Акцыя салідарнасці ў 10-ю гадавіну гвалтоўнага выкрадання палітыка Юрыя Захаранкі. Мінск, май 2009 г.



# ПРАКТЫКАВАННЕ-ДЫЯЛОГ

**Тэма:**

Дыялог, аргументацыя, фарміраванне поглядаў.

**Мэта:**

Удзельнікі павінны зразумець, што нашы меркаванні фарміруюцца падчас гутарак і абмеркаванняў з іншымі людзьмі, што стасункі з іншымі спрыяюць самаразвіццю.

Нашы перакананні вызначаюць нашы дзеянні. Перакананні ўзнікаюць у нас, калі мы вывучаем, чытаем, бачым і адчуваем нешта на ўласным вопыце, а таксама ў выніку стасункаў з іншымі людзьмі. Калі мы сустракаемся з людзьмі, якія маюць спецыяльныя веды ці вопыт, мы можам навучыцца ў іх новаму, але наогул мы можам навучыцца ва ўсіх людзей. Таксама, калі мы сустракаемся з людзьмі, якія думаюць інакш, чым мы самі, нам даецца магчымасць пераасэнсаваць і перагледзець свае погляды. Змена меркавання можа, такім чынам, азначаць, што чалавек даведаўся нешта новае, нечаму навучыўся. Калі вы ў апошні раз змянялі сваё меркаванне?

Адкуль я ведаю, што маю рацыю, не выслухаўшы ўсе твае аргументы да канца?

Дыялог двух людзей — самае маленькае адзінства ў грамадстве, дзе адбываецца абмен культурнымі кодамі.

**Практычная рэалізацыя:**

Гэта цікавае практыкаванне, у якім удзельнікі павінны заняць пазіцыю па прапанаваным сцверджанні і патлумачыць свой выбар. Падчас абмеркавання ў іх ёсць магчымасць змяніць сваё меркаванне. Практыкаванне рэкамендуецца для груп, дзе паміж удзельнікамі ёсць пэўны давер.

**Час:** 45 хвілін.

**Што неабходна?** Прасторны пакой, тры вялікія лісты (на адным буйнымі літарамі напісана «ТАК», на другім — «НЕ», а на трэцім — «НЕ ВЕДАЮ»).

**Падрыхтоўка:** Вядучы павінен падрыхтаваць спіс прапаноў-сцверджанняў.



**Парадак выканання:**

1. Вядучы вешае лісты з надпісамі «ТАК» і «НЕ» на супрацьлеглыя сцены, на сярэднюю сцяну — ліст з надпісам «НЕ ВЕДАЮ». Далей ён просіць удзельнікаў выйсці ў сярэдзіну. Удзельнікі павінны заняць пазіцыю, зыходзячы са стаўлення да сцверджанняў, якія вядучы зачытвае. Тыя, хто згодзен са сцверджаннямі, становяцца да ліста «ТАК», нязгодныя — да ліста «НЕ», якія не вызначыліся — да ліста «НЕ ВЕДАЮ». Затым вядучы зачытвае першае сцверджанне, удзельнікі вызначаюцца з меркаваннем па ім і групуюцца ў залежнасці ад яго. Вядучы запрашае затым да абмеркавання і просіць некаторых з тых, хто згодзен са сцверджаннем, абгрунтаваць свій выбар, а потым дае слова іх апанентам. Удзельнікі могуць у любы момант памяняць сваё меркаванне і перайсці ад аднаго адказу да другога. Кожны бок павінен мець магчымасць распавесці, чаму яны лічаць менавіта так, у тым ліку і тыя, хто сумняваецца («не ведаю»). Калі хтосьці памяняў меркаванне, вядучы павінен спытаць, чаму ўдзельнік зрабіў гэта. Абмеркаванне асобных сцверджанняў доўжыцца, пакуль удзельнікам цікава абмяркоўваць (часта ад 5 да 15 хвілін). Часцей за ўсё абмяркоўваюцца ад чатырох да шасці сцверджанняў. Прыйсці да адзінага меркавання — не мэта ў дадзеным практыкаванні.
   Калі вядучы не ўпэўнены, ці хочуць удзельнікі працягнуць абмеркаванне, можна выкарыстаць сцверджанне: «Давайце скончым гэтае практыкаванне».

**Абмеркаванне:**

- Што вы думаеце пра гэтае практыкаванне?
- Як вы адчувалі сябе, калі вызначаліся? Было цяжка вызначыцца з адказам?
- Ці атрымалася ў вас выразна сфармуляваць свае думкі?
- Ці не хацелася перайсці на іншы бок тым, хто апынуўся адзін або амаль адзін?
- Ці атрымалася ў вас пераканаць іншых перайсці на свой бок?
- Чаму мы хочам, каб і іншыя былі на нашым баку?
- Ці ўплываем мы на іншых праз дыялог і абмеркаванне?
- Ці можна сказаць, што дыялог — лепшы спосаб вырашаць рознагалоссі і праблемы?

**Возьмем пад ўвагу:**

Мы ўплываем адзін на аднаго праз дыялог і аргументацыю. Іншыя ўплываюць на мяне і я ўплываю на іншых, калі кажу, што думаю. У паўсядзённым жыцці дыялог — гэта сродак абмену ведамі, вопытам, думкамі і, не ў апошнюю чаргу, культурай. Дыялог — лепшы спосаб вырашаць канфлікты.

**Прыклады сцверджанняў, якія можна абмеркаваць:**

1. Шлюб паміж двума чалавекамі розных культур — заўсёды нешчаслівы.
2. Шчасце асобнага чалавека важней за шчасце сям'і.
3. Маці трэба знаходзіцца дома першыя тры гады жыцця дзіцяці.
4. Гомасэксуалістам павінна быць дазволена заключаць шлюбы (і/ці ўсынаўляць дзяцей).
5. Пасля завяршэння вайны ўсе ўцекачы абавязаны вяртацца ў сваю краіну.
6. Давайце скончым рабіць гэтае практыкаванне.
7. Ці павінна быць дазволена катаваць тэрарыстаў?
8. Свабода слова ніколі не павінна абмяжоўвацца, нават калі гэта словы нянавісці.
9. Смяротнае пакаранне павінна быць дазволена.

**Этап 2 практыкавання (па жаданні):**

Калі ўсе згодныя з высновамі папярэдняга практыкавання (што дыялог — гэта лепшы спосаб вырашэння канфліктаў), можна зрабіць перапынак на 15 хвілін і працягнуць працу ў выглядзе гэтай гульні, мэта якой — зразумець, што за словамі павінны вынікаць справы.

**Парадак выканання:**

1. Усе ўдзельнікі выбудоўваюцца ў два шэрагі, тварам да твару. Адлегласць паміж удзельнікамі — прыкладна адзін метр. Вядучы тлумачыць заданне. На лік «тры» першы шэраг павінен адсунуць другі да сцяны. Другі шэраг спрабуе зрабіць тое ж самае з людзьмі з першага шэрагу. Звычайна практыкаванне ператвараецца ў штурханіну, дзе ўсе ці амаль усе спрабуюць сілай піхнуць адзін аднаго да сцяны.
2. Праз кароткі час вядучы дае знак завяршыць практыкаванне. Калі ўсе супакоіліся, ён бярэ аднаго ўдзельніка і спакойна, без напругі рухаецца з ім, можа быць, нават «танчыць» з ім, спачатку да адной сцяны, потым да другой.
3. Усе ўдзельнікі садзяцца і абмяркоўваюць гэтае практыкаванне. Чаму яны выкарысталі сілу, а не дыялог для выканання задання? Нагадайце ім пра практыкаванне-дыялог, якое яны толькі што рабілі. Сэнс яго быў у тым, што вырашыць праблемы можна з дапамогай дыялогу, а не сілы. Чаму мы цяпер гэтага не зрабілі?

**Возьмем пад ўвагу:**

Часта мы дзейнічаем, зыходзячы са звыклых для нас умоваў і на аснове таго, як нас навучылі. Вельмі рэдка мы спрабуем падняцца над аўтарытэтамі (вядучы) і крытычна асэнсаваць свае ўласныя дзеянні і выбар. Як правіла, мы робім тое, што нас просяць, не задаючы пытанне чаму. Гэтыя два практыкаванні паказваюць, што ёсць вялікая прорва паміж набыццём ведаў і тым, каб гэтыя веды сапраўды сталі часткай нашай асобы і ўжываліся на практыцы. Мы бесперапынна павінны працаваць над сабой.

**Варыяцыя:**

Дадзенае практыкаванне-дыялог добра падыходзіць, калі ёсць жаданне ці неабходнасць больш глыбока разгледзець і абмеркаваць тыя ці іншыя пытанні. Важна, каб кіраўнік загадзя падрыхтаваў фармулёўкі праблем. Ніжэй прыведзены некаторыя сцверджанні па тэме «Эмігранты», іх правы і адказнасць.

**Што я думаю пра цяжкасці шматкультурнага грамадства?**

- У грамадствах, дзе шмат замежнікаў і прыезджых — прадстаўнікоў розных культур, неабходна часам абмяжоўваць іх магчымасці атрымання дазволу на жыхарства ў краіне.
- Эмігрантам і замежнікам павінна быць дазволена захоўваць элементы сваёй культуры і ладу жыцця, калі яны прыязджаюць жыць у Нарвегію.
- Эмігрантам і замежнікам жаночага полу павінен аддавацца прыярытэт пры прыёме на працу ў Нарвегіі.
- Беларускія СМІ несправядлівыя ў адносінах да эмігрантаў і замежнікаў.
- Культура эмігрантаў і замежнікаў робіць грамадства разнастайным, і гэта добра.
- Рэлігія дапамагае людзям сустрэцца адзін з адным.
- Рэлігія павінна быць аддзелена ад дзяржавы.
- Усе рэлігіі павінны быць у роўнай ступені прадстаўлены на ўроках грамадазнаўства.
- Рэлігійныя законы павінны адыгрываць большую ролю, чым дзяржаўныя законы.

## ПУНКТ ГЛЕДЖАННЯ З НАГОДЫ ЦЯЖКАСЦЯЎ АІДЫ І АЛІ

### Тэма:
Дыскрымінацыя і фарміраванне сваёй пазіцыі.

### Мэта:
Удзельнікі павінны навучыцца аналізаваць сітуацыю магчымай дыскрымінацыі, адчуць несправядлівасць прадузятага стаўлення да людзей з-за іх рэлігійнай прыналежнасці.

У Нарвегіі жыве даволі шмат людзей — ненарвежцаў. Некаторыя з іх зведваюць цяжкасці ў сувязі са сваёй «непадобнасцю». Аіда і Алі — толькі двое з тых многіх, хто знаходзіцца ў цяжкім становішчы.

### Практычная рэалізацыя:
Гэта практыкаванне заснавана на дыялогу, дзе ва ўдзельнікаў ёсць магчымасць сфарміраваць сваю пазіцыю ў адносінах да праблем Аіды і Алі, з якімі яны сутыкаюцца, з'яўляючыся замежнікамі ў нарвежскім грамадстве.

**Час:** 1 гадзіна.
**Што неабходна?** Прасторнае памяшканне.

### Парадак выканання:
1. Вядучы распавядае спачатку гісторыю і праблему Аіды і яе галаўнога ўбору і называе чатыры розныя магчымасці выхаду з дадзенай сітуацыі. Удзельнікам неабходна будзе заняць тую ці іншую пазіцыю, размясціўшыся ў тым або іншым куце.
2. Калі ўсе ўдзельнікі зрабілі свой выбар, вядучы просіць аргументаваць яго. Дазваляецца памяняць сваю пазіцыю падчас выказвання аргументацыі і абмеркавання.
3. Калі ў групы ёсць жаданне і час, можна паўтарыць практыкаванне, засноўваючыся ўжо на гісторыі іншага героя — Алі.

### Цяжкасці Аіды: галаўны ўбор у школе
Аіда прыехала з Кітая ў Нарвегію тры гады таму. Яна належыць да мусульманскай меншасці, якая была забаронена ў Кітаі. Ёй добра вядома, што мусульмане падвяргаюцца дыскрымінацыі і пераследу ў іншых краінах. Аіда шмат чула пра Нарвегію як пра дэмакратычную дзяржаву, якая паважае правы чалавека. Аіда пакрывае галаву і выкарыстоўвае хустку. Хустка для яе — знак рэлігійнай прыналежнасці і адлюстравання яе ідэнтычнасці. Акрамя таго, яна выкарыстоўвае яе ў знак салідарнасці з мусульманам, якія пераследуюцца ў іншых краінах.



Выкарыстанне Аідай хусткі ўспрымаецца негатыўна ў школе. Многія настаўнікі, вучні і бацькі лічаць, што яе прымушаюць выкарыстоўваць хустку, і яна, такім чынам, з'яўляецца ахвярай мусульманскай культуры, якая дыскрымінуе. Тое, што яна ніколі не прыходзіць на школьныя вечарынкі ці пазашкольныя заняткі, толькі пацвярджае іх здагадкі, лічаць яны. Яны таксама настойваюць на тым, што хустка — гэта нязручны галаўны ўбор на ўроках фізкультуры ці плавання. Настаўнік Аіды звярнуўся да дырэктара школы, які прапанаваў наступныя рашэнні:

1. Аідзе і іншым мусульманскім дзяўчатам павінна быць дазволена насіць хусткі.
2. Аідзе і іншым мусульманскім дзяўчатам павінна быць дазволена насіць хусткі, але не на ўроках фізкультуры ці плавання.
3. Угаварыць Аіду не насіць хустку (без гвалту).
4. Забараніць у школе нашэнне хустак.

### Цяжкасці Алі: беспрацоўе
У інжынерным каледжы вы вучыліся разам з Алі, добрым хлопцам з Самалі, які да таго ж быў выдатнікам. Ён ужо даўно жыве ў краіне, выдатна валодае мовай, але захаваў і многія элементы вельмі важнай для яго самалійскай культуры. Ён веруючы мусульманін. Ён вельмі паважае сваю сям'ю і праводзіць з ёй шмат часу. Нягледзячы на тое, што Алі разаслаў шмат заявак на працу, яго ні разу не запрасілі на інтэрв'ю. У адрозненне ад Алі, вы знайшлі працу амаль адразу пасля заканчэння каледжа, хаця выпускныя адзнакі вашы былі горшымі. Алі вельмі засмучаны дадзенай сітуацыяй і думае над тым, каб памяняць сваё самалійскае імя на тыпова нарвежскае, напрыклад, Бьёрн Ульсен.

Калі б вы былі на месцы Алі, што б вы зрабілі?
1. Я выбраў бы застацца беспрацоўным. Змена імені мела б негатыўныя наступствы для маёй ідэнтычнасці.
2. Я б памяняў імя.
3. Я б памяняў імя на некаторы час, а пасля таго, як знайшоў працу, памяняў бы назад.
4. Я б з'ехаў у сваю родную краіну і паспрабаваў знайсці працу там.

### Абмеркаванне:
- Што вы думаеце пра дадзенае практыкаванне?
- Ці цяжка было заняць пазіцыю?
- Ці атрымалася ў вас выразна растлумачыць сваю пазіцыю?
- Ці былі ўдзельнікі, якія хацелі памяняць сваё рашэнне і пазіцыю?
- Ці згодны вы, што мы ўплываем адзін на аднаго праз зносіны, дыялог і дыскусіі?



- Ці супярэчылі розныя альтэрнатывы выхаду са становішча правам чалавека?

## Возьмем пад ўвагу:

Для таго, каб знайсці найлепшыя адказы на цяжкія пытанні і дылемы, неабходна ўважліва падумаць, пагаварыць і абмеркаваць з іншымі, выслухаць іх аргументы. Гэта таксама прадугледжвае абарону свайго ўласнага меркавання. Важна памятаць, што фармаванне пазіцыі ці меркавання па тым ці іншым пытанні не застаецца адным і тым жа «назаўжды». Больш за тое, часам можа быць правільным рашэнне змяніць сваё меркаванне/пазіцыю. Бо ў той ці іншай сітуацыі мы можам аказваць уплыў на становішча іншых людзей. Гэта патрабуе ад нас адказнасці. Рашэнні, якія мы прымаем, не павінны ўступаць у канфлікт з каштоўнасцямі правоў чалавека.



# ГУЛЬНЯ Ў ПЫТАННІ ПРА ТРАДЫЦЫЙНЫЯ І СУЧАСНЫЯ ГРАМАДСТВЫ

## Тэма:

Культура.

## Мэта:

Удзельнікі павінны зразумець адрозненні паміж традыцыйным і сучасным грамадствамі.

У нарвежскай шматкультурнай рэчаіснасці сустракаюцца людзі так званых традыцыйных і сучасных культур. Мадэрнізацыя — гэта паняцце, якое часта выкарыстоўваецца для апісання развіцця грамадства з прычыны вялікіх зменаў, якія прыўносяцца індустрыялізацыяй, камунікацыйнымі тэхналогіямі, секулярызацыяй і г.д. У сучасным грамадстве можна знайсці праявы традыцыйнага, у той час як у традыцыйным можна знайсці праявы сучаснага. Не ўсе члены грамадства паводзяць сябе аднолькава і практыкуюць адны і тыя ж традыцыі і звычаі. Варыяцый мноства. Як праяўляюцца адрозненні паміж традыцыйнымі і сучаснымі культурамі на практыцы?

## Практычная рэалізацыя:

Практыкаванне асабліва падыходзіць для груп, у якія ўваходзяць прадстаўнікі меншасцяў. Спачатку ўсе запаўняюць анкеты, потым ідзе агульнае абмеркаванне. Практыкаванне не павінна ператварацца ў «спаборніцтва» паміж культурамі.

**Час:** 1,5 гадзіны.
**Што трэба падрыхтаваць?** Прасторнае памяшканне, анкета для кожнага ўдзельніка, ручкі і дошка.

## Парадак працы:

1. Кіраўнік раздае анкету, пытанні якой датычаць тыповых рыс традыцыйнай і сучаснай культуры (гл. ніжэй). Кожны ўдзельнік павінен запоўніць яе як мага лепш і адказваць як мага больш шчыра. Ніякія адказы не з'яўляюцца больш «правільнымі» ці «лепшымі», чым іншыя. Падчас запаўнення анкет нельга размаўляць. (15 хвілін)
2. Агульнае абмеркаванне.

## Абмеркаванне:

- Ці лёгка вам было адказваць на пытанні? Ці былі такія пытанні, на якія вы не змаглі адказаць? Чаму?
- Ці ўсе ўдзельнікі аднолькавага паходжання адказвалі аднолькава? Пра што гэта гаворыць? (Хаця людзі могуць належаць да аднаго і таго ж грамадства, можна мець рознае разуменне і па-рознаму жыць у ім.)
- У чым станоўчыя і адмоўныя бакі традыцыйных грамадстваў?
- У чым станоўчыя і адмоўныя бакі сучасных грамадстваў?
- Як на нас уплывае тое, што ў Беларусі ёсць праявы як сучаснага, так і традыцыйнага грамадства? У школе, на працы, у вольны час і ў паўсядзённым жыцці?

## Возьмем пад ўвагу:

Паміж культурамі ёсць вялікія адрозненні, асабліва паміж так званымі традыцыйнымі і сучаснымі грамадствамі. Аднак і ў межах адной культуры ёсць варыяцыі. У Нарвегіі жыве шмат эмігрантаў з традыцыйных грамадстваў, якія з прычыны свайго паходжання вызнаюць некалькі іншыя каштоўнасці, чым гэта прынята ў Нарвегіі. Можна сказаць, што яны стаяць адной нагой у кожнай культуры. Усе культуры маюць цудоўныя бакі, а таксама і негатыўныя моманты.

## Прапановы пытанняў да анкеты

| | | |
|---|---|---|
| Тыповая сям'я ў мяне на радзіме — гэта… | тата, мама, дзеці | тата, мама, дзеці, дзядулі і бабулі па матчынай і бацькоўскай лініях |
| Калі я (падлетак) сустракаю незнаёмага чалавека, я звяртаюся да яго… | па імені | «цётка» або «дзядзька» |
| У нас дома старэйшы брат мае большую адказнасць, чым малодшыя дзеці | не | так |
| Выказаць нязгоду з дарослым… | у парадку рэчаў | непаважліва |
| Калі хтосьці спазняецца на сустрэчу… | то ён тэлефануе і папярэджвае пра гэта | то ў гэтым няма нічога страшнага |
| Калі хтосьці збіраецца будаваць дом, ён бярэ… | крэдыт у банку | пазыку ў сваякоў і сяброў |
| Калі хтосьці захворвае, то яму дапамагае… | аддзяленне фонду сацыяльнага страхавання | сям'я |
| Калі бацькі становяцца старымі, хворымі, яны жывуць… | у доме састарэлых, у доме-інтэрнаце | з астатняй сям'ёй |
| У мяне на радзіме… | індывід знаходзіцца ў цэнтры | сям'я важней за ўсё |
| У мяне на радзіме… | ёсць раўнапраўе паміж старымі і маладымі | пажылых паважаюць больш за ўсіх |
| У мяне на радзіме… | моладзь вырашае ўсё сама | моладзь павінна быць паслухмянай |
| У мяне на радзіме хлопчыкі і дзяўчынкі… | раўнапраўныя і прымаюць самастойныя рашэнні | нераўнапраўныя, і дзяўчынкі не могуць прымаць незалежныя рашэнні |
| У мяне на радзіме хлопчыкі і дзяўчынкі займаюцца фізкультурай… | сумесна | асобна |
| Мама і тата (а часам цёткі і дзядзькі)… | не вырашаюць, з кім мне трэба сустракацца | вырашаюць, з кім мне трэба сустракацца |
| Палавыя адносіны паміж людзьмі аднаго полу… | прымаюцца і паважаюцца | не прымаюцца |
| Дзяўчыны… | могуць займацца сэксам да шлюбу | не могуць займацца сэксам да шлюбу |
| Юнакі… | могуць займацца сэксам да шлюбу | не могуць займацца сэксам да шлюбу |
| Працу па дому выконваюць… | і мужчыны, і жанчыны | толькі жанчыны |
| Калі мне споўніцца 17 гадоў… | я магу рабіць усё, што хачу, і прыходзіць дадому позна | я павінен буду пытацца ў бацькоў дазволу, каб сысці з дому |
| Калі я ажанюся (выйду замуж) і ў мяне ўзнікнуць праблемы ў шлюбе… | я звярнуся да сямейнага псіхолага | я звярнуся па дапамогу да сям'і |
| Калі я вырасту… | я не буду клапаціцца пра сваіх бацькоў | я буду несці адказнасць за сваіх бацькоў і клапаціцца пра іх |

# «АБО-АБО» ЦІ «І ТОЕ, І ДРУГОЕ»

**Тэма:**

Прыналежнасць да некалькіх культур.

**Мэта:**

Удзельнікі павінны пераканацца ў тым, што многія людзі ў грамадстве маюць ідэнтычнасць, якая складаецца з элементаў некалькіх культур. Гэта можа быць праблематычным у некаторых сітуацыях, а можа быць і рэсурсам, ўзбагачае.

Многія нарвежцы — мігранты, якія нядаўна прыехалі да нас. Часта кажуць, што ў іх змешаная ідэнтычнасць. Для таго, каб лягчэй было зразумець, што гэта азначае на самой справе, дастаткова ўявіць нарвежца самалійскага паходжання і намаляваць сабе «ў галаве» два колы-культуры блізка адзін ад аднаго, напрыклад: нарвежскую і самалійскую, але якія перакрыжоўваюцца з трэцяй. Трэцяе кола — гэта «поле» перамяшчэння замежнікаў і эмігрантаў, таму што іх паўсядзённасць атрымлівае імпульсы ад абедзвюх культур. Гэта выдатна — належаць адначасова да дзвюх культур. У кагосьці атрымліваецца стварыць так званую культурную сумесь, дзе неактуальна ўжо казаць аб межах паміж рознымі культурамі. Для кагосьці падобная прыналежнасць можа быць цяжкім выпрабаваннем, асабліва ў тых сітуацыях, у якіх культуры супрацьпастаўленыя адна адной. Людзі ў такіх выпадках могуць адчуваць няўпэўненасць у сабе і заблытацца, у якой жа культуры яны адчуваюць сябе больш упэўнена.

Аднак не толькі эмігранты могуць адчуваць сябе такім чынам. Усе, хто належыць адначасова да некалькіх супольнасцяў і груп, якія адрозніваюцца адзін ад аднаго звычкамі і традыцыямі (напрыклад, малады чалавек можа быць адначасова пакорлівым вернікам праваслаўнай царквы, і рокерам), могуць адчуваць ад гэтага дыскамфорт.

Мы жывем у свеце, які няспынна мяняецца. Таму ў той або іншай ступені мы ўсе зведваем цяжкасці, звязаныя з прыняццем рашэнняў ці ўсведамленнем нашай уласнай ідэнтычнасці.

Раней я не задумваўся ні над сваёй ідэнтычнасцю, ні над тым, хто я. Я быў проста Мухарэмам! (нарвежац баснійскага паходжання)

**Практычная рэалізацыя:**

Практыкаванне пачынаецца з працы ў групах і завяршаецца агульным абмеркаваннем. Практыкаванне асабліва цікава для груп, якія складаюцца з прадстаўнікоў розных нацыянальнасцяў/культур.



**Час:** 45 хвілін-1,5 гадзіны.
**Што неабходна?** Папера і ручкі.

**Парадак выканання:**

1. Кіраўнік прадстаўляе тэму і дзеліць удзельнікаў на невялікія групы. Заданне — знайсці чалавека ў Беларусі ці ў іншай краіне, вядомага ці невядомага, які належыць адразу да некалькіх культур. Гэта могуць быць тыя, каго мы называем сёння мігрантамі ў нашай краіне, або беларусы, якія належаць да якіх-небудзь субкультур. Ці можа прыналежнасць адразу да некалькіх культур быць пазітыўнай/негатыўнай для іх? Як вы думаеце, як яны самі сябе адчуваюць? Як успрымаюць іх іншыя людзі ў грамадстве? (30 хвілін)
2. Групы прадстаўляюць вынікі сваёй працы аўдыторыі. (10 хвілін)

**Абмеркаванне. (15 хвілін)**

- Як вы думаеце, як гэта — належаць адразу да некалькіх культур? Цяжкая гэтая прыналежнасць ці не?
- Якім чынам прыналежнасць да некалькіх культур можа быць рэсурсам? Ці можа гэта выкарыстоўвацца пазітыўна? Ці можа гэта даць чалавеку ўладу?
- Ці чакаюцца ў Беларусі ад маладых людзей, якія належаць да некалькіх культур, нейкія асаблівыя ўмовы для іх паводзін у грамадстве? Калі так, то якія і чаму? Ці павінны яны выконваць пастаўленыя ім умовы?
- Што мы даведаліся пра сябе саміх?

**Возьмем пад ўвагу:**

Прыналежнасць да некалькіх культур можа быць для чалавека як пазітыўным, так і негатыўным фактам. Некаторыя маладыя людзі, якія належаць да некалькіх культур, кожны дзень «перамяшчаюцца» ад традыцыйнай да сучаснай культуры і наадварот. Сфарміраваць сваю ідэнтычнасць і асобу цяжка. Для кагосьці гэты працэс бясконцы. Прыемна ўсведамляць, што чалавек можа змяняцца на працягу ўсяго жыцця!

Сучаснае грамадства прыўносіць новыя ўмовы для культуры і ідэнтычнасці. Традыцыі і першапачатковая культура даюць ўсё менш і менш нам адказаў на пытанні: «Хто мы?» і «Як нам жыць?» Адказнасць за фарміраванне ідэнтычнасці кладзецца на чалавека самога.

# ДЗЕЦІ МІГРАНТАЎ – НА РАЗДАРОЖЖЫ

### Тэма:
Ідэнтычнасць, культура, адрозненні культур.

### Мэта:
Удзельнікі павінны паразважаць пра адрозненні культур і тыя цяжкасці, якія могуць узнікаць у носьбітаў адразу некалькіх культур.

Большасць маладых людзей – дзяцей эміграптаў – знаходзяцца сёння быццам бы ў двух кантэкстах: у нарвежскім, у якім яны аказваюцца найперш у школе і ў грамадстве ў цэлым, і ў тым, які яны атрымалі ў спадчыну ад сваіх бацькоў-эмігрантаў. Часам гэтыя кантэксты могуць быць ахарактарызаваны як «сучасны» і «традыцыйны». Для маладых людзей таму можа быць цяжкадасягальнай гармонія ў жыцці, г. зн. баланс паміж культурай бацькоў і нарвежскай культурай.

«Калі я пераехаў у Нарвегію, я страціў усіх сваіх сваякоў; тата і мама зусім змяніліся. Яны казалі ўсё больш і больш пра «нашу» культуру і «нарвежскую» культуру».

### Практычная рэалізацыя:
Гэта практыкаванне прызначана найперш для дзяцей эмігрантаў, а таксама дзяцей, якія належаць да розных рэлігійных груп ці субкультур. Практыкаванне рэкамендуецца праводзіць у змешаных групах, паколькі тады ўдзельнікі могуць дзяліцца па прыкмеце этнічнай і культурнай/субкультурнай прыналежнасці. Вядучаму неабходнаназіраць за працай у групах і «накіроўваць», калі ўзнікне такая неабходнасць.

**Час:** 1–1,5 гадзіны.
**Што неабходна?** Прасторнае памяшканне з магчымасцямі для працы ў групах, папера і ручкі.

### Практычная рэалізацыя:
1. Удзельнікі ўтвараюць невялікія групы. Яны раздзяляюць чысты ліст паперы папалам, правёўшы рысу. Вядучы тлумачыць, што мэта дадзенага практыкавання – абмеркаваць адрозненні паміж тым, чаму яны вучацца ў школе/грамадстве, і тым, чаму яны вучацца дома і ўнутры сваёй этнічнай групы. Як пазітыўныя, так і негатыўныя рэчы павінны быць названы. У адной калонцы яны запісваюць тое, чаму яны вучацца ў школе і грамадстве. У другой – чаму яны вучацца дома і ўнутры сваёй этнічнай групы. (20–30 хвілін)
2. Удзельнікі прадстаўляюць вынікі сваёй працы аўдыторыі.

### Абмеркаванне:
- Як было выконваць гэтае практыкаванне? Ці думалі вы раней пра гэту праблему? Чаму так/чаму не?
- Ці пазітыўна належаць да двух/некалькіх культур?
- Ці можаце прывесці прыклады, якія ілюструюць гэта?
- Якім чынам гэты рэсурс (прыналежнасць) можа выкарыстоўвацца ў паўсядзённым жыцці?
- Ці не стамляльна мець карані ў двух/некалькіх культурах?
- У якіх сітуацыях і як гэта праяўляецца?
- Чаму тое, чаму мы вучымся дома, можа адрозніваца ад таго, чаму мы вучымся ў школе?
- Як мы з гэтым спраўляемся? Ці цяжка спраўляцца з гэтай розніцай?
- Якім чынам я выкарыстоўваю сваё права выбіраць?

### Возьмем пад ўвагу:
Многія маладыя людзі маюць свае карані адначасова ў некалькіх культурах і «перамяшчаюцца» паміж імі ў жыцці. Гэта можа быць праблематычным, калі культуры прад'яўляюць розныя, часам супярэчлівыя ўмовы. Часам ад моладзі «патрабуецца» зрабіць выбар паміж культурамі, а гэта можа быць нялёгка. Можа здарыцца так, што наступствы выбару могуць супярэчыць каштоўнасцям правоў чалавека. Калі мы задумваемся пра падобныя праблемы, нам, можа быць, лягчэй будзе зразумець людзей, чыя рэчаіснасць – знаходзіцца адразу ў некалькіх культурах.

# ДЗЯЎЧАТЫ – ПРАДСТАЎНІЦЫ КУЛЬТУРЫ МЕНШАСЦЯЎ – «ПАМІЖ ДВУМА АГНЯМІ»

**Тэма:**

Дыскрымінацыя жанчын.

**Мэта:**

Растлумачыць, што парушэнні правоў чалавека непрымальныя, незалежна ад довадаў.

У розных культурах да хлопчыкаў і дзяўчат прад'яўляюцца розныя патрабаванні і чаканні. Ад дзяўчат, напрыклад, можа чакацца, што яны непавінны ўступаць у размову і выказваць сваё меркаванне, прынамсі за межамі свайго дома, або гаварыць і пісаць пра рэлігію ці сваё паўсядзённае жыццё. Весці размовы на важныя тэмы — гэта прывілей мужчын. Як правіла, такая сітуацыя можа назірацца ў традыцыйных грамадствах, дзе ролі мужчыны і жанчыны дакладна размежаваныя. Калі дзяўчаты з традыцыйных грамадстваў аказваюцца ў Нарвегіі, некаторыя бацькі спрабуюць абмежаваць іх сацыяльны кантакт з іншымі людзьмі. У той жа час у школе ім распавядаюць аб важнасці ўдзелу ў грамадскім жыцці і ў працэсе прыняцця рашэнняў нараўне з мужчынамі. Абедзве культуры, такім чынам, прад'яўляюць даволі моцныя і супярэчныя патрабаванні да паводзін дзяўчат, і гэта можа быць для іх псіхалагічна цяжкім выпрабаваннем.

> «Дзяўчаты — прадстаўнікі меншасцяў — як чысты ліст паперы ў «новым» для іх грамадстве. Калі я зраблю нешта няправільна, я атрымаю вялікую кляксу на лісце, так што ўсе будуць заўважаць гэту кляксу, а не белы ліст паперы. Калі я раблю што-небудзь не так, то мой бацька кажа мне: «Глядзі ўніз! Пакажы мне павагу!» Тады як настаўнік кажа: «Глядзі мне ў вочы, пакажы мне павагу!»[64]

**Практычная рэалізацыя:**

Гэтае практыкаванне — найперш для маладых людзей — дзяцей эмігрантаў, але таксама падыходзіць для нарвежцаў, якія належаць да розных рэлігійных груп ці субкультур. Практыкаванне рэкамендуецца праводзіць у змешаных групах. Вядучаму трэба быць напагатове падчас правядзення дадзенага практыкавання, паколькі можа аказацца, што хтосьці з удзельнікаў знаходзіцца ў падобнай жыццёвай сітуацыі, якая абмяркоўваецца ў практыкаванні. Вядучаму неабходна назіраць за працай у групах і накіроўваць, калі ёсць такая неабходнасць.



**Час:** 1–1,5 гадзіны.

**Што неабходна?** Прасторнае памяшканне з магчымасцю працы ў групах, папера і ручкі.

**Парадак выканання:**

1. Вядучы запрашае ўсіх да агульнай дыскусіі: якія цяжкасці могуць быць у прадстаўнікоў меншасцяў у нарвежскім грамадстве? Ці ведаеце вы пра сітуацыі, у якіх дзяўчаты знаходзяцца нібыта «паміж двума агнямі»? Якім чынам ім трэба паводзіць у такіх сітуацыях?
2. Вядучы дзеліць удзельнікаў на групы, заданне якіх: высветліць як мага болей аб праблемах дзяўчыны/жанчыны. Прадстаўніцы меншасцяў могуць зведваць:
   а) жаночае абразанне/гвалтоўную выдачу замуж;
   б) забарону ўдзельнічаць у пазашкольных мерапрыемствах (лагерах);
   в) забарону займацца спортам;
   г) забарону ўдзельнічаць у грамадскім жыцці (наведваць моўныя курсы, галасаваць і інш.).

   Ці існуюць такія праблемы там, дзе вы жывяце? Адкуль вы ведаеце пра гэта? Ці ёсць статыстычныя дадзеныя па гэтых праблемах? Ці ёсць канкрэтныя прыклады? Пашукайце ў Інтэрнэце, у друкаваных выданнях інфармацыю пра гэта. (20–30 хвілін)
3. Удзельнікі прадстаўляюць вынікі сваёй працы аўдыторыі.



**Абмеркаванне:**

- Што «гавораць» правы чалавека аб вышэйзгаданых праблемах? Прачытайце Усеагульную дэкларацыю правоў чалавека і паспрабуйце знайсці артыкулы, якія апісваюць дадзеныя праблемы.
- Ці нясе нарвежскі ўрад адказнасць за рашэнне такіх праблем, якія могуць быць традыцыямі ў некаторых культурах?
- Якія меры можа прыняць нарвежскі ўрад? (Рэгуляванне законам, супрацоўніцтва з паліцыяй, пакаранне за парушэнне, інфармацыйныя кампаніі ў школах, сярод жанчын і мужчын, у рэлігійных абшчынах.) Што трэба было б прыняць?
- Што могуць зрабіць самі меншасці? Што могуць зрабіць самі жанчыны?

## Возьмем пад ўвагу:

Раўнапраўе мужчын і жанчын застаецца ўсё яшчэ нявырашанай праблемай нават у развітых дэмакратычных краінах. Абмежаванне жанчын у правах мае свой пачатак у культуры, рэлігіі і традыцыях. Часта абмяжоўваюць правы жанчын блізкія ім людзі: сябры, бацькі, браты, мужы. Вельмі важна прыцягваць парушальнікаў да адказнасці. А таксама важна працаваць над далейшым развіццём разумення раўнапраўя паміж мужчынамі і жанчынамі.

64. Цытата з кнігі Djulaha! Om å forstå annerledeshet, Loveleen Rihel Brenna, Kristiansand, Høyskoleforlaget, 2001



# Я — НОСЬБІТ КУЛЬТУРЫ

## Тэма:

Культура і ідэнтычнасць.

## Мэта:

Удзельнікі павінны ўбачыць, як праяўляюцца адрозненні паміж культурамі. Незалежна ад таго, дзе мы, наша культура заўсёды з намі.

Усе мы выкарыстоўвалі хоць раз выраз: «Тыпова для нарвежцаў!» Можа здацца, што ва ўсіх нарвежцаў у такім выпадку ёсць нейкая агульная рыса. Такі выраз можа быць у любой краіне, не толькі ў Нарвегіі. Людзі могуць лічыць: так, ёсць асаблівасці культуры, якія нас аб'ядноўваюць. Магчыма, так і ёсць, што нарвежцы, кітайцы, амерыканцы, іракцы і іншыя паводзяць сябе па-рознаму? Акаляючае асяроддзе аказвае на нас уплыў, незалежна ад таго, хочам мы гэтага ці не, і таму мы аказваемся носьбітамі той ці іншай культуры.

Незалежна ад таго, дзе мы, наша культура заўсёды з намі, нават калі мы не заўважаем таго. Калі нарвежцы аказваюцца за мяжой, іх культура разам з імі. Тое ж самае з турыстамі і прыезджымі ў Нарвегіі.

## Практычная рэалізацыя:

Практыкаванне пачынаецца з працы ў групах і завяршаецца прадстаўленнем прэзентацый і агульным абмеркаваннем. Практыкаванне добра падыходзіць для «змешаных» груп, якія складаюцца з прадстаўнікоў розных культур.

**Час:** 1—1,5 гадзіны.
**Што неабходна?** Вялікія адрыўныя лісты паперы і маркеры.

## Парадак выканання:

1. Вядучы просіць удзельнікаў падзяліцца па краінах ці рэгіёнах, якія яны прадстаўляюць. Заданне групам: знайсці відавочныя і схаваныя прыкметы сваёй культуры. Якім чынам культура мае сваё выражэнне ў нас? (Відавочнымі прыкметамі могуць быць такія, як ежа, адзенне, архітэктура, цырымоніі/рытуалы, мова і інш. Схаванымі могуць быць такія, як каштоўнасці, паняцці і традыцыі, азначэнне «добра»—«дрэнна», структура сям'і, адносіны паміж пакаленнямі, паміж мужчынамі і жанчынамі, паняцце часу, манеры паводзін/спажывання ежы, падзел улады, роля рэлігіі і інш.) Адказы можна як

запісаць на лісце паперы, так і адлюстраваць у выглядзе малюнкаў. (30—45 хвілін)
2. Удзельнікі прадстаўляюць вынікі сваёй працы аўдыторыі. (30—45 хвілін)

### Абмеркаванне:

- Што было цяжэй: знайсці відавочныя ці схаваныя прыкметы культуры?
- Што мы маем на ўвазе, калі гаворым, што ўсе мы — носьбіты культур?
- Ці звяртаем мы больш увагі на сваю культуру, калі аказваемся ў іншай краіне? Чаму?
- Што мы хочам «паказаць» з нашай культуры, калі мы аказваемся ў іншай краіне?
- Некаторыя людзі (часта знакамітасці) характарызуюцца як відавочныя прадстаўнікі сваёй культуры. Вы можаце прывесці прыклады гэтага (з уласнай краіны і іншых краін)?
- Ці ўсе людзі ў грамадстве падзяляюць/дэманструюць тыя ці іншыя агульныя прыкметы адной культуры?
- Ці можаце вы прывесці прыклады людзей, якія «парвалі» са сваёй культурай і яе тыповымі характарыстыкамі?
- Ці могуць прыкметы іншых культур правакаваць нас/выклікаць у нас абурэнне? Прыклады?
- Ці могуць прыкметы нашай уласнай культуры правакаваць нас/выклікаць у нас абурэнне? Прыклады?
- Чаму для некаторых людзей разрыў з відавочнымі/схаванымі прыкметамі культуры можа быць праблематычным/хваравітым?

### Возьмем пад ўвагу:

Культуры «выяўляюць сябе» па-рознаму. І усе мы, хочам таго ці не, з'яўляемся носьбітамі той або іншай культуры. Пра гэта неабходна памятаць, калі мы сустракаем людзей — прадстаўнікоў іншай, адрознай ад нашай культуры. Падобныя сустрэчы могуць быць вельмі цікавымі, а могуць прынесці з сабой непаразуменні і праблемы. Нягледзячы на тое, што ў культуры ёсць нейкія пэўныя прыкметы, неабавязкова, што прыкметы культуры — гэта аўтаматычна рысы і характарыстыкі той ці іншай асобы, носьбіта дадзенай культуры. Можа быць і так, што нейкія прыкметы нашай культуры могуць выклікаць здзіўленне або раздражненне ў іншых людзей, і неабавязкова гэта будзе прыкметна для нас саміх.



# УЦЕКАЧЫ

### Тэма:

Уцекачы і ўцекачы-дзеці.

### Мэта:

Навучэнцы павінны адчуць трагічнасць становішча дзіцяці — уцекача або вымушанага перасяленца.

Хутчэй за ўсё, шмат знайшлося б уцекачоў, якія б з задавальненнем узялі б вашы праблемы замест сваіх. Ці ведаем мы пра тое, што яны перажылі, з'яўляючыся ўцекачамі, вымушанымі пакінуць свае дамы, краіну, працу, сям'ю і сяброў, і якія аказаліся там, дзе многія мясцовыя жыхары зусім не хацелі б, каб яны аказаліся?

### Азначэнні:

**Суіскальнік прытулку:** чалавек, які падае прашэнне аб прытулку ў той ці іншай краіне. Тыя, каму прадастаўлены прытулак, больш не з'яўляюцца суіскальнікамі прытулку: іх або прызналі ўцекачамі, або дазволілі застацца ў краіне, зыходзячы з сур'ёзных гуманітарных прычын.
**Уцякач:** чалавек, які атрымаў статус уцекача і дазвол жыць у краіне, дзе ён прасіў прытулак. Уцекачом можа быць прызнаны толькі той чалавек, які быў вымушаны пакінуць радзіму з-за рэальнай пагрозы яго жыццю і бяспецы.
**Вымушаны перасяленец:** грамадзянін краіны, які пакінуў сваё месца жыхарства, ратуючыся, напрыклад, ад гвалту ці праследу. Гэта тлумачыць, чаму многія чачэнцы, расійскія грамадзяне, атрымалі статус «вымушаных перасяленцаў». Уцекачы ратуюцца з родных месцаў па тых жа прычынах, але, у адрозненне ад вымушаных перасяленцаў, яны з'яўляюцца замежнымі грамадзянамі.
**Мігрант:** слова для апісання тых, хто змяняе сваё месца жыхарства, як правіла, з мэтай вучобы і працы. Адрозніваюць унутраных і замежных мігрантаў.

### Практычная рэалізацыя:

Практыкаванне дапамагае збліжэнню, больш цеснаму кантакту і заахвочвае да правядзення акцый. Вельмі важна, каб вядучы быў добра падрыхтаваны.

**Час:** 1,5 гадзіны.
**Што неабходна?** Прасторнае памяшканне, адрыўныя лісты паперы, папера і алоўкі.
**Падрыхтоўка:** Вядучы павінен ведаць пра праблемы дзяцей-уцекачоў.

**Парадак выканання:**

1. Кіраўнік робіць невялікую ўступную прамову аб прычынах, па якіх людзі вымушаны пакідаць свае краіны, і розніцы паміж суіскальнікамі прытулку, уцекачамі і замежнікамі-эмігрантамі.
2. Кіраўнік зачытвае гісторыю, якая ілюструе становішча дзяцей-уцекачоў. Напрыклад, чачэнскіх у Цэнтральнай Расіі: «Зара прыехала ў наш горад разам з маці і двума малодшымі братамі з Чачэнскай рэспублікі ў 2001 годзе. На яе радзіме ішла вайна, бацька і іншыя сваякі загінулі падчас бамбёжкі. Цяпер ёй 15 гадоў, але вучыцца яна ў 6-м класе, таму што яе не хацелі прымаць у школу — у сям'і не было ніякіх дакументаў. Зара вельмі ўзрадавалася, атрымаўшы год таму пашпарт, і зараз носіць яго з сабой заўсёды, таму што міліцыянеры спыняюць яе па некалькі разоў на дзень — правяраюць, ці не тэрарыстка яна. Жывуць яны ў антысанітарных умовах (без гарачай вады, электрычнасці, ацяплення) у пакоі старога інтэрнату, які вось-вось будзе ліквідаваны. Маці працуе пасудамыйкай у маленькай сталовай. Статус вымушаных перасяленцаў яны атрымалі толькі год таму».
3. Кіраўнік дзеліць вучняў на невялікія групы і просіць абмеркаваць сітуацыю і падумаць над наступнымі пытаннямі:
   - Як вы думаеце, што прыйшлося пераадолець Зары, каб дабрацца да нашага горада?
   - Што яна страціла, пакінуўшы сваю родную краіну?
   - Якое яе жыццё тут, у нашым горадзе?
   - Якія ў яе праблемы?
   - Ці атрымаецца ў яе вывучыць мову? Якім будзе яе жыццё да таго часу, пакуль яна не будзе валодаць рускай мовай?
   - Зара — усё яшчэ дзіця. Ці такія ж у яе правы, як і ў астатніх дзяцей?
   - Зара — мусульманка. Ці адчувае яна павагу да сябе ў нашым горадзе, як вы думаеце?
   - Ці лёгка будзе ёй знайсці працу?
   - Ці зможа яна знайсці сабе месца ў нашым грамадстве?
   - Ці трэба ёй адмовіцца ад сваёй культуры?
   - Якая ў яе будучыня, як вы думаеце?
4. Вядучы просіць удзельнікаў прадставіць асноўныя высновы сваіх дыскусій у групах.

**Абмеркаванне:**

- Быць уцекачом — гэта пазітыўна ці негатыўна? Чаму?
- Ці ведаеце вы асабіста ўцекачоў?
- Ці думалі вы калі-небудзь, што такое магло б здарыцца і з вамі?
- Ці былі беларусы калі-небудзь уцекачамі?



Скончыце абмеркаванне прапановай зрабіць што-небудзь для ўцекачоў. Можна звярнуцца для гэтага ў арганізацыі, якія займаюцца абаронай правоў уцекачоў.

**Возьмем пад ўвагу:**

Жыццё ўцекача нялёгкае. Уцекачы зведалі шмат стратаў, пакінуўшы сваю краіну. Як правіла, яны маюць цяжкасці і ў краіне, якая прадаставіла ім прытулак. Правы ўцекачоў парушаюцца вельмі часта.

**Варыяцыя:**

Удзельнікі праводзяць ролевую гульню: інсцэніроўку становішча Зары.

# «СТРАТЫ» ЎЦЕКАЧОЎ

**Тэма:**

Страты ўцекачоў.

**Мэта:**

Навучэнцы павінны паставіць сябе на месца ўцекача і, зыходзячы з гэтага, лепш зразумець жыццёвую сітуацыю ўцекачоў.

Уцекачы, якія прыязджаюць у Нарвегію, могуць зведваць самыя розныя цяжкасці. Бо ім прыходзіцца «будаваць мост» паміж мінулым, сучаснасцю і будучыняй; ператварыўшыся, хутчэй за ўсё, з большасці ў сваёй краіне ў меншасць на новым месцы. З'ехаць з краіны азначае таксама страціць звыклы побыт і, можа быць, набыць праблемы тлумачэння культурных кодаў новага грамадства. Аднак не заўсёды змена месца жыхарства можа несці з сабой толькі страты. Для маладых людзей адкрываюцца новыя магчымасці.

**Практычная рэалізацыя:**

Удзельнікі размяшчаюцца ў коле. Практыкаванне пачынаецца з самастойнай працы і завяршаецца агульным абмеркаваннем.

**Час:** 1,5 гадзіны.
**Што неабходна?** Прасторнае памяшканне, самаклейныя лісточкі, адрыўныя лісты паперы і алоўкі.

**Парадак выканання:**

1. Вядучы раздае самаклейныя лісточкі кожнаму ўдзельніку. Заданне: напісаць 5 сваіх любімых рэчаў, якія б яны ўзялі з сабой, калі б ім прыйшлося ўцякаць з дому. (5—10 хвілін)
2. Вядучы просіць удзельнікаў распавесці пра выбраныя рэчы. Удзельнікам пажадана пачаць свой расказ з самых важных, любімых рэчаў. Яны таксама могуць растлумачыць, чаму яны любімыя для іх.
3. Далей лісточкі неабходна скласці так, каб не было відаць, што на іх напісана. Ім трэба потым выцягнуць адзін любы лісточак. Астатнія раскідаць на падлозе. Затым удзельнікі зачытваюць па чарзе, якія лісточкі яны выцягнулі.
4. Вядучы тлумачыць, што ўцекачы стаяць перад такім жа выбарам. З сабой яны могуць узяць вельмі абмежаваную колькасць рэчаў.



**Абмеркаванне:**

- Што вы думаеце аб практыкаванні? Ці цяжка было выбраць толькі 5 рэчаў?
- Ці цяжка было ў выніку выбраць толькі адну рэч?
- Што губляе чалавек, якому прыходзіцца ўцякаць з краіны?
- Уцекачы да ад'езду/уцёкаў належалі да большасці ў сваёй краіне і ведалі яе культурныя коды. У новай краіне яны аказваюцца ў меншасці. Як яны адчуваюць сябе, як вы думаеце?
- Як вы думаеце, ці адчувае чалавек сябе паўнавартаснай асобай, калі не размаўляе на мове новай краіны? Ці ўспрымаюць іншыя людзі яго/яе як паўнавартаснага чалавека?
- Сябры, сваякі, дзядзькі, цёткі, стрыечныя браты і сёстры засталіся дома. Як адчувае сябе чалавек, які раптоўна пазбаўляецца апоры і надзейнасці, якую дае сям'я?
- Ці ёсць ва ўцекачоў кантроль над сітуацыяй, у якой яны апынуліся? Калі так, то які?

**Возьмем пад ўвагу:**

Уцекачы могуць мець пачуццё страты сваёй ідэнтычнасці і жыццёвай пазіцыі. У адзін дзень абясцэньваюцца іх сацыяльныя навыкі. Яны губляюць не толькі звыклае для іх кола зносінаў, але і пачуццё кантролю над рэчаіснасцю. Ва ўсіх уцекачоў ёсць свая трагічная гісторыя. Пакуль яны не вывучаць мову і культурныя коды новай краіны, ім можа быць цяжка распавесці, хто яны такія.

# «ПЯЦЬ КАЛОД»[65]

### Тэма:

Нязвыклая камунікацыя.

### Мэта:

Удзельнікі павінны адчуць, як гэта — аказацца ў грамадстве з іншымі, нязвыклымі «кодамі» і нормамі.

Ці задумваліся вы калі-небудзь над тым, што многія рэчы, якія дапамагаюць вам нармальна функцыянаваць у грамадстве, вы робіце аўтаматычна. У вас існуюць пэўныя манеры, таму што вы нарадзіліся і выраслі тут. Што адбудзецца, калі вы раптам апынецеся ў месцы, дзе іншыя нормы і каштоўнасці, нязвыклыя для вас? Ці замежнікі, якія прыязджаюць у Беларусь, адчуваюць сябе гэтак жа? Няпроста змірыцца з тым, што здольнасці чалавека ў адну хвіліну становяцца непатрэбнымі.

> У чалавека зойме шмат часу, расчараванняў і сіл, каб зразумець,
> што тое, што натуральна для аднаго, цалкам ненатуральна для другога;
> што гісторыя першага адрозніваецца ад гісторыі другога; што куміры
> і героі аднаго не з'яўляюцца кумірамі і героямі другога;
> што Бог для адных — не Бог для другіх.
>
> Леа Айцінгер, 1981 г.

### Практычная рэалізацыя:

«Пяць калод» — картачная гульня, у якой удзельнікі, не ведаючы таго, выкарыстоўваюць розныя правілы. Розныя правілы гульні абазначаюць розныя культурныя нормы. Калі гульня ўжо больш-менш у разгары, некаторыя ўдзельнікі напэўна заўважаць, што яны ўсе гуляюць па розных правілах. Разам з тым ім не дазволена размаўляць адзін з адным, і праблемы камунікацыі таму не прымусяць сябе доўга чакаць. Вядучы павінен быць гатовым да таго, што некаторыя ўдзельнікі могуць пачаць раздражняцца ці хваляваца. Лепш у такім выпадку зрабіць маленькі перапынак, перш чым пачаць агульную дыскусію.

**Час:** 1 гадзіна.

**Што неабходна?** Стол для кожнай групы ўдзельнікаў, калоды карт (толькі з картамі ад 2 да 7, плюс тузы ўсіх масцей), папера і ручкі кожнай групе і копіі інструкцыі правядзення турніру для кожнага ўдзельніка.

**Падрыхтоўка:** Кіраўнік павінен дакладна ведаць і разумець мэту і правілы гульні, прачытаць інструкцыю правядзення турніру. Падрыхтуйце і пранумаруйце неабходную колькасць сталоў.

### Парадак выканання:

1. Удзельнікі дзяляцца на групы па 4—6 чалавек і размяшчаюцца за сталамі. Кожная група атрымлівае калоду карт, інструкцыю правядзення турніру і правілы гульні «Пяць калод». Удзельнікам даецца некалькі хвілін азнаёміцца з правіламі і паспрабаваць пагуляць. Калі ўсе больш-менш гатовы да гульні, вядучы збірае правілы і тлумачыць, што падчас гульні не дазволена размаўляць адзін з адным або пісаць адзін аднаму (можна толькі маляваць ці паказваць жэстамі). Звычайна праходзіць маленькі смяшок перад тым, як пачнецца гульня «Пяць калод» — гульня без правілаў.
2. Вядучы аб'яўляе пачатак турніру. Як і на звычайным турніры, некаторым удзельнікам прыйдзецца ў той ці іншы момант пакінуць свой стол і перайсці за іншы. Вядучы будзе абвяшчаць, калі і каму трэба будзе памяняць стол. За кожным сталом гульня працягваецца ў сярэднім 5 хвілін.
3. Пасля першай змены ўдзельнікі звычайна ўзбуджаныя і горача «абмяркоўваюць», якія ўсё ж правілы гульні. Некаторыя, напэўна, лічаць, што туз — самая моцная карта; другія — што самая слабая. Некаторыя думаюць, што пікі — козыр, другія — што бубны, трэція — што козыра няма наогул. Аднак гульня больш-менш «аднолькавая» за сталамі, хіба што з маленькімі адрозненнямі. У гэтым і ёсць «сіла» гульні «Пяць калод». Асноўныя правілы — аднолькавыя для ўсіх, але некаторыя асобныя правілы розныя. Многія ўдзельнікі звычайна разумеюць даволі хутка, што правілы — розныя, але не разумеюць, у чым іх розніца.
4. Вядучы павінен сам вырашаць, калі спыніць гульню. Важна не заканчваць да таго часу, пакуль удзельнікі не адчулі расчараванне, не знерваваліся і не паспрабавалі знайсці выхад з сітуацыі.

### Абмеркаванне:

- Якія ў вас былі пачуцці, пакуль гулялі ў «Пяць калод»? Як было прытрымлівацца правілаў?
- Ці нагадвае гульня сцэны з рэальнага жыцця? Якія? Выберыце некаторыя прыклады і абмяркуйце іх.
- У чым прычыны праблем, цяжкасцяў?
- Ці падштурхнула гульня на нейкія шляхі рашэння праблем?
- Ці выявілі вы якія-небудзь здольнасці ў сабе, шукаючы выхад са становішча?

- Ці зрабілі вы нешта, што пазітыўна паўплывала на ход гульні?
- Калі вы зразумелі, што бессэнсоўна гуляць з рознымі правіламі, ці хацелася вам кінуць гуляць/здацца? Ці «здаемся» мы ў падобных сітуацыях у сапраўдным жыцці?

### Возьмем пад ўвагу:

Цяжка аказацца ў новым, незнаёмым грамадстве і разумець, што звыклае разуменне жыцця, свету і ўласныя здольнасці «не працуюць» у новай рэчаіснасці. Каб справіцца з новай рэчаіснасцю, неабходна цярпенне і жаданне пазнаваць і вучыцца.

### Правілы гульні «Пяць калод»:

(Кожнай групе даюцца правілы гульні. Аднак групы не ведаюць, што іншыя групы атрымалі іншыя, не такія, як у іх, правілы.)

1. Туз — самая слабая карта. Козыр — пікі. Козыр можна выкарыстоўваць, калі масць, што іграе, скончылася.
2. Туз — самая слабая карта. Козыра няма наогул.
3. Туз — самая моцная карта. Козыр — пікі. Козыр можна выкарыстоўваць, калі масць, што іграе, скончылася.
4. Туз — самая моцная карта. Козыр — пікі. Козыр можна выкарыстоўваць калі заўгодна.
5. Туз — самая слабая карта. Козыр — пікі. Козыр можна выкарыстоўваць калі заўгодна.
6. Туз — самая слабая карта. Козыр — бубны. Козыр можна выкарыстоўваць калі заўгодна.
7. Туз — самая моцная карта. Козыр — бубны. Козыр можна выкарыстоўваць калі заўгодна.
8. Туз — самая моцная карта. Козыр — бубны. Козыр можна выкарыстоўваць, калі масць, што іграе, скончылася.
9. Туз — самая моцная карта. Козыра няма наогул.
10. Туз — самая слабая карта. Козыр — бубны. Козыр можна выкарыстоўваць, калі масць, што іграе, скончылася.

### Інструкцыя па правядзенні турніру:

- У вас ёсць пяць хвілін на азнаямленне з правіламі і пробную гульню.
- Правілы гульні забіраюцца ва ўдзельнікаў. Ніякая славесная камунікацыя не дазволена. Можна жэстыкуляваць, маляваць, але не размаўляць, пісаць словы ці шыфры.
- Турнір пачынаецца. У вас ёсць некалькі хвілін пагуляць за «сваім» сталом.
- Калі гульня перарываецца дачасна, то пераможца — той/тая, у каго больш за ўсё карт у калодзе.





- Кожны раунд доўжыцца каля пяці хвілін. Вам паведамяць пра пачатак і канец.
- Удзельнікі пераходзяць ад стала да стала наступным чынам: пераможца (у каго больш за ўсё калод) пераходзіць, да прыкладу, ад стала 1 да стала 2, ад стала 2 да стала 3 і г.д.; той, хто прайграў (у каго менш за ўсё калод), пераходзіць «у адваротным» накірунку — ад стала 5 да стала 4, ад стала 4 да стала 3 і г.д.
- Пераможца (за высокім па нумарацыі сталом) і то, хто прайграў (за самым нізкім па нумарацыі сталом), застаюцца сядзець за сваімі сталамі.
- Нічыя дазваляецца ў алфавітным парадку.

65. Дадзенае практыкаванне першапачаткова называлася «Барнга»: па назве афрыканскай вёскі, дзе яно было прыдумана.

# Я БЯРУ НА СЯБЕ АДКАЗНАСЦЬ

### Тэма:

Цяжкасці дзяцей уцекачоў.

### Мэта:

Звярнуць увагу на цяжкасці, якія ўцекачы могуць зведваць. Што азначае для ўцекачоў інтэграцыя? Якія магчымасці інтэграцыі і яе перашкоды?

Уцекачы, якія прыязджаюць у новыя для іх краіны, прыязджаюць у пошуках бяспекі. Быць уцекачом можа аказацца асабліва цяжкім для дзяцей і падлеткаў. Разам з тыповымі для падлеткавага ўзросту праблемамі ім прыходзіцца ў такім выпадку спраўляцца яшчэ і з іншымі праблемамі: як гэта — не ведаць мовы, якія наступствы гэта мае для навучання і існавання ў грамадстве? Як гэта — заводзіць новых сяброў? Ці лёгка заводзяць такія падлеткі сабе сяброў? Ці становяцца яны «ахвярамі» стэрэатыпаў? Якія іх адносіны з бацькамі? Ці ёсць у бацькоў праца? Ці даюць бацькі свабоду дзецям, ці наадварот — спрабуюць іх больш кантраляваць? Ці адчуваюць падлеткі сябе заціснутымі паміж дзвюма культурамі: сваёй роднай і культурай новай краіны?

### Азначэнні:

**Інтэграцыя** (ад лацінскага *integrum* — цэлае) — аб'яднанне ў адно цэлае; часта ў сувязі з уцягваннем прадстаўнікоў меншасцяў у стуктуру і жыццё грамадства. Супрацьлегласць інтэграцыі — сегрэгацыя[66].

### Практычная рэалізацыя:

Дадзенае практыкаванне асабліва добра падыходзіць для падлеткаў-уцекачоў. Гэта неабароненая група, і таму важна не настойваць на тым, каб удзельнікі актыўна выказвалі свае меркаванні ці рабілі тое, што яны адмаўляюцца рабіць. Практыкаванне складаецца з дзвюх частак: першая — асэнсаванне і запаўненне анкеты з пытаннямі; другая — агульнае абмеркаванне. Часткі практыкавання могуць таксама быць праведзеныя асобна.

**Час:** 2 гадзіны.
**Што неабходна?** Прасторнае памяшканне, папера і ручкі, фотаздымкі.
**Падрыхтоўка:** Невялікая лекцыя аб становішчы падлеткаў-уцекачоў. (10—20 хвілін)



### Парадак выканання, частка 1:

1. Вядучы дае невялікую ўступную лекцыю аб становішчы падлеткаў-уцекачоў, вымушаных перасяленцаў і мігрантаў, якія знаходзяцца ў краіне, і аб чаканнях ад іх з боку грамадства і дзяржавы. Вядучы дзеліць затым удзельнікаў на невялікія групы і дае заданне: вызначыць цяжкасці ўцекачоў і чаканні ад іх з боку грамадства і дзяржавы (*прыкладамі могуць быць: справіцца са стратай, прыняць і будаваць сваю «новую» ідэнтычнасць, вывучыць мову, знайсці сяброў, паспяхова навучацца ў школе, знайсці сабе месца ў сучасным нарвежскім грамадстве, спраўляцца з выпадкамі расізму і дыскрымінацыі і інш.*). Ідэі і думкі запісваюцца на вялікія лісты паперы. (30 хвілін)
2. Групы прадстаўляюць свае «знаходкі». Добра, калі ўсе члены групы задзейнічаныя і актыўныя. Кожны член групы, напрыклад, мог бы прадставіць адну праблему. Пасля кожнай прадстаўленай праблемы вядучаму трэба паглядзець, ці ёсць такая ў іншай групы. Калі ёсць, то іншая група, магчыма, хацела б нешта дадаць з гэтай нагоды. Калі прэзентацыі цяжкасцяў/праблем зацягнуцца, дапусцім, іх шмат, пажадана зрабіць перапынак ці правесці размінку.

### Абмеркаванне:

- Як было выконваць дадзенае практыкаванне?
- Ці ўсе былі згодны адносна самых вялікіх цяжкасцяў, якія ёсць ва ўцекачоў-падлеткаў?
  Як гэта можна растлумачыць?
- Ці ёсць у беларускіх законах нейкія палажэнні, якія абцяжарваюць інтэграцыю прыезджых у наша грамадства?
- Ці ёсць у беларускай культуры моманты, якія абцяжарваюць інтэграцыю прыезджых у наша грамадства?
- Што азначае знаходзіцца паміж дзвюма культурамі?
- Ці можа здарыцца так, што ўцекачы-падлеткі з часам пачнуць думаць негатыўна пра Беларусь і больш пазітыўна пра сваю пакінутую радзіму? Чаму такое можа адбыцца?
- Што я сам(а) магу зрабіць, каб палепшыць становішча ўцекачоў?

### Парадак выканання, частка 2:

Вядучы тлумачыць, што дадзенае практыкаванне — разважанне пра сваё ўласнае жыццё. Ва ўдзельнікаў ёсць каля адной гадзіны на запаўненне анкеты з пытаннямі. Пажадана адказваць шчыра і смела, наколькі гэта магчыма.

ПЫТАННІ АНКЕТЫ:

| |
|---|
| Што я страціў(ла)? |
| Якія мае магчымасці ў новай краіне? |
| Што я магу? Што ў мяне атрымліваецца добра? |
| Што я магу зрабіць, каб палепшыць маё становішча? |
| Якім чынам я магу развівацца далей? |
| Што чакаю ад сябе самога/самой? А што гадоў праз пяць? |
| Як мне гэтага дамагчыся? |

### Абмеркаванне:

Удзельнікі і вядучы разам разглядаюць пытанні. Удзельнікі выбіраюць самі, ці хочуць яны агучыць свой адказ на тое ці іншае пытанне, ці не.

### Возьмем пад ўвагу:

Падлеткі-ўцекачы маюць шмат цяжкасцяў у сваім паўсядзённым жыцці. Ім трэба справіцца са сваімі стратамі і вырашыць для сябе, якім чынам яны могуць «перамяшчацца» паміж культурамі. Ім неабходна ведаць, што ад іх ёсць пэўныя чаканні, як ад сваёй уласнай культуры, так і ад «новага» грамадства/дзяржавы. Ім прыйдзецца вучыцца і да шмат чаго прыстасоўвацца.

### Варыяцыя:

Паказаць удзельнікам фільм — гісторыю ўцекача, які добра справіўся з новай для яго рэчаіснасцю, у новай для яго краіне, або запрасіць якога-небудзь уцекача ў клас для гутаркі і размовы.

66. www.caplex.no, 29.04.2007, запыт слова «інтэграваць»



## МОЙ ГЕРОЙ

### Тэма:

Адносіны людзей да людзей-ідэалаў.

### Мэта:

Удзельнікі павінны зразумець, чаму ў нас ёсць узоры «ідэальных людзей», і якім чынам па гэтых узорах можна здагадацца аб каштоўнасцях, якія дамінуюць у грамадстве.

У большасці з нас ёсць ідэал — чалавек, на якога мы хацелі б быць падобнымі, ці якім мы вельмі моцна захапляемся. Чаму і навошта гэта нам трэба, уласна кажучы?

### Практычная рэалізацыя:

Практыкаванне пачынаецца з самастойнай працы ўдзельнікаў і працягваецца агульнай дыскусіяй. Практыкаванне будзе больш займальным, калі інфармацыя пра яго будзе дадзена ўдзельнікам крыху загадзя, і ў іх будзе магчымасць прынесці з сабой фотаздымкі, малюнкі свайго «героя».

**Час:** 45 хвілін.
**Што неабходна?** Папера і ручкі, прасторнае памяшканне.
**Падрыхтоўка:** Вялікі ліст паперы, падзелены на дзве калонкі: «Люблю больш за ўсё» і «Люблю менш за ўсё».

### Парадак выканання:

1. Кіраўнік просіць удзельнікаў добра падумаць і выбраць свайго героя — чалавека, якім яны захапляюцца. Гэта можа быць як гістарычная, так і сучасная асоба. Удзельнікі запісваюць імя «героя» і сцісла тлумачаць на лісце паперы, чаму ён ім падабаецца, не падпісваючыся. Лісты паперы вешаюцца на сцяну. (10 хвілін)
2. Удзельнікі чытаюць выказванні аб героях, размешчаныя на сцяне. (10—15 хвілін) Кожны ўдзельнік, не кажучы нікому іншаму, павінен вырашыць пра сябе, які з напісаных «герояў» яму падабаецца больш, а які — менш за ўсіх. Імёны гэтых герояў яны запісваюць на вялікім лісце паперы, загадзя падрыхтаваным вядучым.

### Абмеркаванне:

- Ці спадабалася вам практыкаванне? Чаму? Чаму не?
- Ці многія выбралі сабе новых герояў пасля таго, як прачыталі, якія героі ў іншых удзельнікаў?

- Якія героі аказаліся самымі папулярнымі? Якія пачуцці мелі тыя ўдзельнікі, якія выбралі гэтых герояў?
- Якія героі аказаліся непапулярнымі? Якія пачуцці мелі тыя ўдзельнікі, якія выбралі гэтых герояў?
- Ці былі такія героі, пра якіх раней ніхто не чуў? Якія пачуцці мелі тыя ўдзельнікі, хто іх выбраў, даведаўшыся, што пра іх не чулі аднакласнікі?
- Была якая-небудзь заканамернасць у выбраных героях ці не? Больш было сярод іх мужчын ці жанчын? Яны былі прадстаўнікамі большасці ці меншасці ў грамадстве?
- Ці ёсць сярод герояў тыповыя сучасныя героі? Ці маглі б яны быць выбранымі ў героі і ў ранейшыя часы? Ці з'яўляюцца яны знакам таго, што грамадства змяняецца?
- Ці маюць выбраныя героі адносіны да інфармацыі, якую мы атрымліваем са СМІ ці ў школе?
- Ці павінны героі меншасцяў быць больш прыкметнымі ў грамадстве? Якім чынам гэтага можна дасягнуць?

### Возьмем пад ўвагу:

Важна думаць і разважаць, чаму мы выбіраем сабе тых ці іншых герояў у якасці ідэалу. Якім чынам мы выбіраем сабе ідэал чалавека: з падачы школы, сродкаў масавай інфармацыі ці з іншых крыніц? Часта героі могуць распавесці нам аб каштоўнасцях у тым ці іншым грамадстве. Нашы героі — не абавязкова героі іншых людзей.

Ва ўсіх нацый ёсць свае героі, пра якіх дзеці атрымліваюць інфармацыю ў школе і якімі захапляюцца. Часам такія героі становяцца прыкладамі для пераймання і часткай нашага культурнага багажу. Нашы героі і куміры распавядаюць пра нашы інтарэсы, перавагі і культуру. Мы чакаем павагі да нашых герояў з боку іншых. Але паспрабуйце зірнуць на гэта з іншага боку: як быць прыезджым, хадзіць у школу ў Нарвегіі і не ведаць, такім чынам, аб героях сваёй роднай краіны? І як гэта — мець герояў, пра якіх ніхто нічога не ведае? Даведваючыся пра герояў іншых, мы даведваемся, такім чынам, і пра культуру людзей.

### Прапанова па далейшай працы:

Удзельнікі дзяліцца на групы, якія прадстаўляюць героя, пра якога раней ніхто не чуў. Ім даецца дастаткова часу (некалькі гадзін або адзін дзень) для таго, каб сабраць інфармацыю пра героя і прадставіць яго/яе астатнім у класе/групе.



## СРОДКІ МАСАВАЙ ІНФАРМАЦЫІ І ФАРМІРАВАННЕ ЎЛАСНАГА МЕРКАВАННЯ

### Тэма:

Роля сродкаў масавай інфармацыі ў стварэнні стэрэатыпаў і прадузятасцяў.

### Мэта:

Навучэнцы павінны пабачыць ролю СМІ ў фарміраванні меркаванняў і нярэдка — у стварэнні стэрэатыпаў і прадузятасцяў.

Большасць з нас атрымліваюць інфармацыю са сродкаў масавай інфармацыі. З газет, часопісаў і тэлебачання мы атрымліваем тлумачэнне рэальнасці журналістамі, фатографамі і рэдактарамі. Паколькі яны вырашаюць, якія тэмы і якія навіны нам «сервіраваць», яны таксама робяць на нас уплыў. Тое, што мы бачым, чытаем і слухаем, уплывае на наша ўспрыманне і разуменне рэчаіснасці, на нашы погляды і ўчынкі.

Дацка-турэцкі журналіст і навукоўца Ферух Ілмаз наведаў разам з дацкім фатографам у 1996 годзе тыповае невялікае мястэчка ў Турцыі. Яны прыехалі ў горад у дзень кірмашу, і фатограф «зарэгістраваў» жыццё горада, зрабіўшы шмат фотаздымкаў жанчын у традыцыйным адзенні,якія прыйшлі на кірмаш прадаваць свае тавары. Жанчыны ў «сучасным» адзенні там таксама былі, аднак засталіся без увагі фатографа. Калі Ілмаз спытаў потым свайго калегу, чаму той зрабіў фотаздымкі толькі жанчын у традыцыйным адзенні, той адказаў, што інакш не было б відаць, што фотаздымкі зроблены ў Турцыі. Выбар фатографа дэманструе, якім чынам сродкі масавай інфармацыі «паказваюць» нам рэчаіснасць[67].

### Практычная рэалізацыя:

Гэта практыкаванне даволі працаёмкае і разлічана на тыдзень працы. Удзельнікам на працягу тыдня належыць праводзіць даследаванне, якое паслужыць затым базай для агульнага абмеркавання.
Фокус дадзенага практыкавання зроблены на мігрантах і ўцекачах, таму што менавіта ў адносінах да гэтых груп СМІ распаўсюджваюць найбольшую колькасць недакладнай інфармацыі.
Практыкаванне падыходзіць таксама для разгляду становішча іншых груп: жанчын, сэксуальных меншасцяў, мусульман, хрысціян і інш.

**Час:** Частка 1: адзін тыдзень. Частка 2 — 2,5 гадзіны.

**Што неабходна?** Частка 1: папера і ручкі, вялікія лісты паперы і маркеры, газеты, часопісы, тэлебачанне, Інтэрнэт. Газет і часопісаў можа быць цалкам дастаткова.

## Парадак выканання, частка 1:

1. Збор інфармацыі.
   Удзельнікі дзяляцца на невялікія групы. На працягу аднаго тыдня яны будуць сачыць і праводзіць аналіз сродкаў масавай інфармацыі для таго, каб высветліць, як асвятляецца тэма мігрантаў і ўцекачоў.
   Вядучы можа сам вырашаць, ці ўзяць групам толькі адзін від СМІ (напрыклад, адзін канал тэлебачання), ці некалькі.
   Цікавей, калі групы возьмуць для аналіза розныя СМІ, з рознай палітычнай базай. Групам неабходна будзе канцэнтравацца на наступных пытаннях:
   - Якім чынам выкарыстоўваецца мова ў дадзеным СМІ?
   - Якім чынам апісваюцца ўцекачы і мігранты?
   - Ці выкарыстоўваецца адна і тая ж мова пры апісанні мігрантаў, уцекачоў і нарвежцаў?
   - У сувязі з чым згадваюцца мігранты і ўцекачы звычайна ў прэсе? Звычайна негатыўна ці пазітыўна?
   - Якім чынам справы, звязаныя з мігрантамі і ўцекачамі, прадстаўлены ў прэсе? Звычайна гэта галоўныя падзеі ці не? Якія фотаздымкі, ілюстрацыі выкарыстоўваюцца?
   - Асвятленне тэм пра замежнікаў/уцекачоў — абагульняльнае? З адной падзеі або справы ці робяцца высновы адносна ўсёй групы грамадства?
   - Якім чынам характарызуецца рэлігія мігрантаў, уцекачоў у прэсе?
   - Ці ёсць прыклады навешвання ярлыкоў на якія-небудзь асобныя групы?
   - Ці ёсць прыклады мыслення ці ўспрымання, якія засноўваюцца на стэрэатыпах або прадузятасцях?
   - Больш негатыўных ці пазітыўных матэрыялаў пра мігрантаў, уцекачоў у прэсе?

## Парадак выканання, частка 2:

1. Групы прадстаўляюць аўдыторыі свае «знаходкі» — сабраную інфармацыю. (20 хвілін)
2. Пасля прэзентацый груп кіраўніку неабходна падвесці вынікі і зрабіць высновы. Найперш трэба адзначыць тое, што было агульнае для груп, а затым — што было розным.

## Абмеркаванне:

- Ці можна зрабіць якую-небудзь агульную выснову адносна таго, якім чынам мігранты і ўцекачы асветленыя ў прэсе?
- Апісанні, дадзеныя ў прэсе, грунтуюцца на фактах ці на здагадках і прадузятасцях?
- Якой з'яўляецца якасць і разнастайнасць сабранай інфармацыі? Ці былі знойдзены прыклады стыгматызацыі, ушчамлення ў правах або спробы маніпуляцый, размоваў аб тэндэнцыях развіцця той ці іншай сітуацыі?
- Ці падаліся вам некаторыя артыкулы прадузятымі? А пабудаванымі на стэрэатыпах ці прадузятасцях або на іх распаўсюджванні?
- Складана ці даволі лёгка змяніць нашы перакананні адносна таго, хто такія «іншыя», прыезджыя? Чаму? Чаму не?
- Ці назіраецца тэндэнцыя абвінавачваць у сацыяльных праблемах якую-небудзь адну групу людзей?
- Многія замежнікі/уцекачы чытаюць «пра сябе» ў газетах літаральна кожны дзень. Калі вы чыталі «пра сябе» апошні раз у газетах?

Тэндэнцыі нарвежскай прэсы ўказваць у матэрыялах і артыкулах на этнічную прыналежнасць, нават у тых выпадках, калі гэта зусім неактуальна, могуць спрыяць стварэнню ўражання, што замежнікі — больш крымінальныя, чым іншыя жыхары краіны. Рэдка калі ў артыкулах можна прачытаць: этнічны нарвежац ці нарвежка. Якое стаўленне можа скласціся ў нас у такім выпадку да асобных груп у грамадстве?[68]

## Возьмем пад ўвагу:

Мы падвяргаемся ўплыву з боку сродкаў масавай інфармацыі. І, свядома ці несвядома, гэта спрыяе стварэнню або ўмацаванню нашых стэрэатыпаў і прадузятасцяў. Нам не варта «глытаць» усё, што «сервіруецца» нам у газетах, па радыё ці тэлебачанні, а крытычна і асэнсавана падыходзіць да інфармацыі, якая падаецца СМІ. Важна таксама звяртацца да некалькіх крыніц інфармацыі для таго, каб скласці больш поўную карціну.

## Далейшая праца:

Удзельнікі могуць стварыць групу назіральнікаў за прэсай, так званых вартаўнікоў. «Вартаўнікі» могуць працягваць рэгістраваць выпадкі ў прэсе, калі падаецца інфармацыя, заснаваная не на фактах і ведах, а на стэрэатыпах і прадузятасцях, якія пагаршаюць становішча і рэпутацыю замежнікаў/уцекачоў у грамадстве. Вынікам такой працы можа быць зварот у тыя ці іншыя СМІ або напісанне артыкулаў і каментароў.

Магчыма таксама прасачыць, якія падзеі асвятляюцца і апісваюцца ў мясцовай прэсе, а якія — не. Калі ўдзельнікі выявяць, што даволі важныя падзеі застаюцца за кадрам, па-за ўвагай журналістаў, яны могуць пісаць лісты-звароты ў рэдакцыі.

### Варыяцыя:

Які ўплыў ці адносіны, па вашым меркаванні, мае да зместу газеты яе ўладальнік або выдавец? Калі існуе сувязь газеты і якой-небудзь палітычнай партыі, якія могуць быць наступствы для матэрыялаў, якія друкуюцца ў газеце? Што кажуць правілы прэсы і законы краіны пра гэта?

## ФАКТЫ
## ПРАФЕСІЙНАЯ ЭТЫКА ЖУРНАЛІСТА

*Нарвежскі прафсаюз журналістаў прыняў у 1938 г. (папраўкі ўнесены ў 2005 г.) дакумент «Этычныя нормы журналіста» для ўсіх відаў СМІ. Прыводзім некаторыя вытрымкі з гэтага дакумента:*

*2. Незалежнасць і адказнасць прэсы*
*2.2. Кожная рэдакцыя і кожны яе супрацоўнік павінны адстойваць сваю незалежнасць і ўмацоўваць давер да сабе. Гэта дасць магчымасць свабодна і незалежна дзейнічаць у адносінах да тых асобных людзей і груп, якія, кіруючыся ідэалагічнымі, эканамічнымі і іншымі меркаваннямі, імкнуцца аказваць ціск на змест рэдакцыйных матэрыялаў.*

*2.3. Супрацоўнікі рэдакцыі не павінны браць на сябе заданні або прымаць даручэнні, эканамічныя ці іншыя абавязкі, якія ўступаюць у супярэчнасць з іх прафесійнымі абавязкамі. Ім варта пазбягаць выканання адначасова некалькіх роляў, што можа падарваць давер да іх. Неабходна кіравацца прынцыпам галоснасці ў справах, здольных аказаць уплыў на нейтральны статус работніка рэдакцыі.*

Беларускія журналісты таксама выпрацавалі падобны дакумент — **«Кодэкс журналісцкай этыкі»**, прыняты на VI з'ездзе «Беларускай асацыяцыі журналістаў» 2 чэрвеня 2006 года.
Вось некаторыя вытрымкі з яго:

- *Асноўная задача журналіста — забяспечыць права грамадства на дакладную і важную інфармацыю, якая дазваляе сфарміраваць адэкватнае ўяўленне пра сацыяльныя працэсы, іх сутнасць і значэнне, пра стан справаў у сучасным свеце.*





На міжнароднай спецыялізаванай выставе «Чалавек і бяспека». Мінск, чэрвень 2006 г.

- *Як і любы грамадзянін, журналіст мае права на палітычныя ды іншыя перакананні і прыхільнасці. Аднак у сваёй прафесійнай дзейнасці ён павінен заставацца нейтральным і аб'ектыўным.*
- *Паважаючы права грамадства на аб'ектыўную інфармацыю, журналіст абавязаны перадаваць дакладныя звесткі, а таксама спектр поглядаў на тое ці іншае пытанне. Навіны павінны грунтавацца на фактах і дадзеных, дакладнасць якіх можа быць праверана.*
- *Журналіст не павінен быць праваднікам эгаістычнага прыватнага ці групавога інтарэсу. Ён прызваны садзейнічаць таму, каб сродкі масавай інфармацыі аб'ектыўна адлюстроўвалі плюралізм поглядаў. Недапушчальныя ўтойванне важнай для грамадства інфармацыі, скажэнне фактаў.*
- *Прадузятасць у каментары з'яўляецца парушэннем прынцыпаў журналісцкай этыкі.*
- *Характарызаваць людзей у матэрыялах СМІ па расавай прыкмеце, веравызнанні, нацыянальнасці і становішчы, якое займае чалавек, неабходна толькі ў тых выпадках, калі гэта мае істотнае значэнне для правільнага разумення публікацыі (сюжэту).*
- *Журналіст павінен паводзіць сябе такім чынам, каб не зрабіцца ахвярай сутыкнення рэальных ці схаваных інтарэсаў. Неабходна адхіляць*




*прывілегіі ці падарункі, якія могуць паўплываць на меркаванні журналіста ці стварыць такое ўражанне.*

– *Журналіст не павінен удзельнічаць у дзеяннях ці арганізацыях, якія могуць абмежаваць незалежнасць яго меркаванняў і прычыніць шкоду яго прафесійнай сумленнасці.*
– *Прафесійны статус журналіста несумяшчальны з заняццем пасады ў дзяржаўных органах, а таксама ў кіруючых органах палітычных партый ды іншых арганізацый палітычнай скіраванасці.*
– *Журналіст абавязаны абараняць прафесійныя годнасць і прэстыж, выяўляць салідарнасць з калегамі, якіх пераследуюць за прафесійную дзейнасць.*

67. Ліндэстад і Ф'ельстад. Прэса і чужыя/ Lindstad og Fjeldstad: Pressen og de fremmede, 1999 г.
68. З кнігі Ёйвінда Дала «Сустрэчы людзей»/ Øyvind Dahl: Møter mellom mennesker, 2001 г.



# СЛУХАЕМ ГІСТОРЫІ ІНШЫХ ЛЮДЗЕЙ

### Тэма:

Успрыманне і разуменне іншых людзей.

### Мэта:

Удзельнікі павінны пераканацца ў тым, што людзі могуць тлумачыць і разумець адны і тыя ж рэчы па-рознаму. Якім чынам мы тлумачым і разумеем рэчаіснасць, звязана з нашай ідэнтычнасцю, культурай, асяроддзем і інтарэсамі.

Ні птушка, ні паляўнічы, ні фермер, ні дзіця не ўспрымуць аднолькава, скажам, той момант, калі птушка, падстрэленая паляўнічым, падае на поле фермера. Так і ў рэчаіснасці ёсць шмат «твараў», і разумець яе можна па-рознаму.

### Практычная рэалізацыя:

Вядучы зачытвае казку, якая становіцца базай для наступнай дыскусіі.

**Час:** 1 гадзіна.
**Што неабходна?** Прасторнае памяшканне, казка пра Чырвоны капялюшык і Ваўка.

### Парадак выканання:

Кіраўнік чытае казку пра Чырвоны капялюшык і Ваўка, расказаную Ваўком. Затым — агульнае абмеркаванне.

### Абмеркаванне:

- Што вы думаеце пра казку?
- Ці з'явіліся ў вас якія-небудзь новыя думкі? Чаму?
- Якая нам карысць ад таго, што мы паглядзім на тую ці іншую справу з розных, некалькіх бакоў?
- Чаму, калі прытрымліваешся выключна свайго меркавання, гэта можа прывесці да канфлікту пры сустрэчы, напрыклад, з незнаёмымі людзьмі?
- Ці павінны мы заўсёды ставіць сябе на месца іншых, каб пабачыць тую ці іншую сітуацыю з другога боку?

### Возьмем пад ўвагу:

Людзі ўспрымаюць адны і тыя ж падзеі па-рознаму. Часам гэта прыводзіць да непаразумення і канфліктаў. Важна гэта разумець і памятаць пра гэта, каб у актуальнай сітуацыі нам не забыцца паглядзець

на справу з іншага боку, паставіць сябе на месца ўцягнутых людзей. Гэта дапаможа пазбегнуць непаразумення і канфліктаў.

### Казка пра Чырвоны капялюшык, расказаная Ваўком

Я жыў у лесе, і паколькі лес — мой дом, я імкнуўся трымаць яго ў чысціні і парадку. У адзін цудоўны дзень, калі я прыбіраў смецце, пакінутае людзьмі пасля пікніка, я раптам пачуў дзіўныя гукі. Я схаваўся за дрэва і прыціх. Гэта была маленькая дзяўчынка з кошыкам у руках, якая набліжалася да мяне подскакам. На ёй было нейкае дзіўнае чырвонае адзенне, што вельмі падазрона. На галаве ў яе быў велізарны чырвоны капялюш з вэлюмам, які закрываў яе твар. Яна быццам не хацела, каб хто-небудзь яе пазнаў. Я ведаю, што нельга меркаваць пра іншых людзей толькі па іх адзенні, але паколькі яна была госцем у маім лесе, я адчуваў, што маю права даведацца пра яе болей.

Я выйшаў таму з-за дрэва і перагарадзіў ёй шлях. Я спытаў яе, хто яна такая і адкуль, — звычайныя рэчы, калі людзі сустракаюць адзін аднаго ўпершыню. Яна адказала зусім няветліва, што ёй не дазволена размаўляць з чужымі. З чужымі! Падумаць толькі! Сказаць такое мне, чый дзед, прадзед і іншыя сваякі жылі ў гэтым лесе на працягу доўгага часу. Затым яна стала крыху ветлівей і распавяла пра мэту сваёй прагулкі. Яе бабуля была хворай, і яна ішла, каб аднесці ёй абед. Праз некаторы час я зразумеў, што яна казала праўду. Аднак ёй варта было б быць больш ветлівай і не насіць такое дзіўнае адзенне.

Я дазволіў ёй ісці далей. Падумаўшы потым крыху, я вырашыў кароткім шляхам пайсці да бабулі і наведаць яе. Калі я падышоў да яе дома, я сустрэў мілую бабульку. Я ёй усё распавёў, і яна пагадзілася, што ўнучцы варта быць больш ветлівай пры сустрэчы з незнаёмымі людзьмі. Мы вырашылі разам з бабуляй разыграць дзяўчынку. Я лёг замест бабулі ў ложак, а яна схавалася пад ложкам і не павінна была выходзіць адтуль, пакуль я не скажу.

Калі дзяўчынка пастукала ў дзверы, я папрасіў яе ўвайсці ў спальню бабулі. На мне было бабуліна адзенне. Але да таго, як наогул у мяне з'явілася магчымасць што-небудзь сказаць, яна зноў пачала мяне абражаць: пачала каментаваць мае вушы і спытала, чаму яны такія велізарныя! Я быў вельмі злы. Яна ж пакрыўдзіла мяне ўжо раз! Тым не менш я паспрабаваў адказаць як мага спакайней, што такія мае вушы дапамагаюць лепш чуць. І што тады меў я на ўвазе? Вядома, тое, што мне б хацелася, каб яна прыслухоўвалася да маіх парадаў, каб яна стала больш далікатнай з іншымі людзьмі і больш асцярожнай у сваіх выказваннях. Але, думаеце, яна паслухалася маіх парадаў? Не. Яна працягвала далей. Напышліва пачала каментаваць мае вялікія вочы! Вы можаце сабе ўявіць пачуцці, што бушавалі ўва мне ў той момант. Яна была вельмі нахабнай дзяўчынкай!



Аднак я не паддаваўся на яе правакацыі і адказаў, што вялікія вочы мае для таго, каб лепш яе бачыць!

Але, вы думаеце, яна спынілася на гэтым? Ніяк не. Яна працягвала далей. Аднак наступная яе абраза зайшла занадта далёка! Я ведаю, што ў мяне вялікія зубы, і гэты факт, сказаць вам праўду, ніколі не даваўся мне лёгка. Няўжо ні пра што іншае яна не магла спытаць, як пра мае зубы? Я ведаю, што мне трэба было трымаць сябе ў руках, але ў той момант я выскачыў з ложка, зарыкаў і сказаў, што вялікія зубы ў мяне для таго, каб лягчэй было яе з'есці!

У гэтай частцы казкі я хацеў бы падкрэсліць тое, што ніколі ніякаму ваўку нецікава есці маленькіх дзяўчынак. Але калі гэтае распешчанае дзіця пачало бегаць па пакоі і крычаць, я пачаў бегаць за ёй, каб супакоіць яе. У той жа момант я пачуў, што дзверы адчыніліся, і ў дом увайшоў здаровы чалавек. Я і раней яго бачыў. Ён быў ляснічым і вышынёй амаль два метры. Калі я ўбачыў сякеру ў яго руцэ, я зразумеў, у якой небяспецы я знаходзіўся. Ззаду мяне, на маё шчасце, было акно, у якое я і выскачыў.

Бабуля так і не распавяла маю гісторыю. Больш таго, яна сказала, што я пачвара, на якую нельга спадзявацца. Я не ведаю, што здарылася з дзяўчынкай у дзіўным чырвоным адзенні пасля таго дня, але адно ясна: я так і не змог знайсці сабе спакою з тых часоў, і жыццё маё няшчаснае.

# ЯК ЗРАЗУМЕЦЬ ІНШЫЯ КУЛЬТУРЫ?

### Тэма:

Этнацэнтрызм і культурны рэлятывізм.

### Мэта:

Удзельнікі павінны засвоіць паняцці «этнацэнтрызм» і «культурны рэлятывізм».

Мы — этнацэнтрысты, калі думаем, што наша манера існавання, нашы рашэнні і разуменне свету, наша культура — самыя лепшыя.

Этнацэнтрыст не разумее і здзіўляецца, як іншыя не разумеюць і не прызнаюць гэтага. Супрацьлеглым этнацэнтрысту тыпам з'яўляецца культурны рэлятывіст, у якога погляд на свет наступны: усё адносна. Гэта азначае, што мы не можам выкарыстоўваць якія-небудзь аб'ектыўныя крытэрыі ці стандарты, каб зразумець іншых людзей і іншыя культуры. Усе выказванні, дзеянні і падзеі павінны заўсёды разумецца ў рамках кантэксту. Калі чалавек на 100 % культурны рэлятывіст, гэта можа прывесці да абыякавасці, якая робіць немагчымым адрозненне падзей і дзеянняў па якасці, маралі і ўзроўню развіцця.

> «Ні поўны этнацэнтрызм, ні поўны культурны рэлятывізм немагчымыя на практыцы і непажаданыя».
>
> «Сустрэчы культур», Ёйвінд Дал, 2004 г.

### Практычная рэалізацыя:

Практыкаванне пачынаецца з працы ў групах і завяршаецца агульным абмеркаваннем.

**Час:** 1 гадзіна.
**Што неабходна?** Папера і ручкі.

### Парадак выканання:

1. Вядучы дзеліць удзельнікаў на невялікія групы. Заданне групам: скласці спіс звычак, рэчаў, звычаяў з іншых краін і культур, якія могуць здавацца дзіўнымі ці незразумелымі для нас (напрыклад: мужчыны і жанчыны не вітаюцца адзін з адным за рукі; людзі ядуць ножкі жаб, павукоў і лічынкі; жанчынам забаронена насіць штаны; прынята ўставаць, калі ў пакой уваходзіць дарослы/пажылы чалавек; жанчыны носяць паранджу; мужчыны ходзяць у спадніцах; людзі вітаюцца, тручыся адзін аб аднаго насамі; кроўная помста; мнагажонства; жанчыны не могуць хадзіць па вуліцы без суправаджэння мужчыны; жанчыны не маюць права выказваць сваё меркаванне на сходах і інш.). Групы павінны паспрабаваць даць тлумачэнні некаторых звычаяў. (30 хвілін)
2. Групы прадстаўляюць вынікі сваёй працы аўдыторыі. Астатнія ўдзельнікі могуць каментаваць і задаваць пытанні. (10 хвілін)
3. Вядучы тлумачыць у канцы значэнне слоў этнацэнтрызм і культурны рэлятывізм. (5 хвілін)
4. Абмеркаванне. (10 хвілін)
   - Чаму некаторыя звычкі і звычаі з'яўляюцца нармальнымі для адных і ненармальнымі для другіх?
   - Ці бяруць пачатак нашы меркаванні і ацэнкі звычаяў у нашай уласнай культуры?
   - Ці былі б мы больш успрымальныя да тых звычаяў, якія мы лічым «дзіўнымі», калі б больш ведалі пра іх?
   - Ці складаней успрымаць адны звычаі і традыцыі, чым другія?
   - Ці правільна меркаваць пра іншых людзей і звычаі толькі з пазіцый нашай культуры?
   - Якія элементы нашай культуры іншыя людзі могуць палічыць дзіўнымі?
   - Ці павінны мы быць цярпімымі да тых элементаў культуры, якія супярэчаць правам чалавека?

### Возьмем пад ўвагу:

Часта мы ўспрымаем іншых людзей і культуры, зыходзячы з уласнага разумення «нармальнасці». Аднак таму, што для нас з'яўляецца ненармальным, можна знайсці тлумачэнне ў прыродзе, геаграфіі, гісторыі і культуры. Мы таксама павінны памятаць аб тым, што тое, што нармальна для нас, можа быць ненармальным для іншых. Чым больш мы даведваемся пра культуру, тым лепш мы можам зразумець адзін аднаго. Таму неабходна быць цярпімымі да іншых культур, нават калі тыя дзіўныя і незнаёмыя для нас. Толькі тыя элементы культуры, якія супярэчаць правам чалавека, цярпець нельга.

### Якія вобразы мы ствараем сабе?..

Калі сучасны заходні мужчына бачыць закрытую з галавы да ног мусульманскую жанчыну, яму ў галаву могуць прыйсці думкі пра яе зняважанасць, залежнасць і страх. Усходні мужчына, наадварот, убачыць у ёй паважаную, прагнуую да пашаны і клапатлівую жанчыну. Такім жа чынам у тыпова «па-заходняму» апранутай жанчыне заходні мужчына ўбачыць свабодную, цікавую і самастойную жанчыну. Мужчына ж, які належыць да традыцыйнай культуры, убачыць у такой жанчыне

эгаістычную, легкадумную, якая больш клапоціцца пра сябе асабіста, чым пра сваю сям'ю.

**Пытанне:** Ці магчымыя падобныя асацыяцыі і параўнанні, калі б жанчыны назіралі мужчын? Чаму? Каго звычайна ацэньваюць: мужчыну ці жанчыну? Ці можа прыведзены прыклад распавесці нам штосьці пра падзел функцый і роляў мужчын і жанчын, незалежна ад таго, у якой частцы свету чалавек знаходзіцца і да якой культуры належыць?

Адна фармацэўтычная фірма паспрабавала прадставіць на рынку паўночна-афрыканскай краіны рэкламу таблетак ад галаўнога болю. Аддзел маркетынгу фірмы палічыў, што дадзеная рэклама ілюструе, наколькі эфектыўныя таблеткі.



Не было ніякіх сумненняў у поспеху. Паўсюль развесілі вялікія плакаты. Фірма, аднак, забылася на адну важную дэталь: культура напісання ў краіне была арабскай, а значыць, чыталася напісанае справа налева. Тое ж самае датычылася і малюнкаў рэкламы — яны ўспрымаліся справа налева. (Прыклад з кнігі «Сустрэчы культур», Ёйвінд Дал, 2004 г.)



# ЗОРКА ШУКАЕ ЗОРКУ

## Тэма:

Фарміраванне групы.

## Мэта:

Удзельнікі павінны пераканацца ў тым, што ўсе людзі, свядома або несвядома, удзельнічаюць у падзеле людзей на групы на тых ці іншых падставах. Групы могуць прымаць або выключаць іншых.

Чалавек — сацыяльная істота. Немаўля не зможа выжыць адно, без апекі. Сацыяльнае жыццё верціцца вакол чалавечых супольнасцяў, таму фарміраванне груп з'яўляецца цэнтральным момантам ва ўсіх культурах і грамадствах. Структураванне па групах робіць рэчаіснасць больш зразумелай, таму што мы, акцэнтуючы асобныя якасці, можам уявіць сабе многіх людзей як адну групу. У той жа час важна разумець, што, калі мы ўключаем кагосьці ў групу, мы адначасова кагосьці выключаем. Адзін і той жа працэс спрыяе аб'яднанню грамадства і ў той жа час — сацыяльнаму падзелу і ўсталяванню межаў. Мы ўтвараем групы і выбудоўваем межы, і яны функцыянуюць, добра гэта ці дрэнна.

## Практычная рэалізацыя:

Гэта простае і забаўнае практыкаванне, у якім удзельнікі фарміруюць групы, зусім не задумваючыся навошта.

**Час:** 45 хвілін.
**Што неабходна?** Прасторнае памяшканне, маленькія налепкі ў форме зорачак, якія можна наклеіць на лоб кожнаму ўдзельніку.

## Парадак выканання:

1. Удзельнікі становяцца пасярод пакоя, у цэнтр выходзіць кіраўнік і абвяшчае, што падчас гэтага практыкавання ўдзельнікі павінны заплюшчыць вочы і што ім не дазваляецца размаўляць. Далей ён наклейвае кожнаму ўдзельніку зорачку на лоб, але так, каб ён не бачыў яе колеру. Зорачкі могуць быць чатырох або пяці колераў, каб у некалькіх удзельнікаў былі зорачкі аднаго колеру. Акрамя таго, павінна быць усяго па адной зорачцы аднаго або двух колераў.
2. Пасля таго, як кожны атрымаў па зорачцы, удзельнікі ўсё яшчэ трымаюць вочы заплюшчанымі. Кіраўнік інфармiруе ўдзельнікаў пра тое, што калі яны расплюшчаць вочы, ім трэба будзе ўтварыць групы. Кіраўнік дае каманду ўдзельнікам утварыць групы, але не кажа нічога

пра тое, як гэта трэба зрабіць. Як правіла, удзельнікі фарміруюць групы па колерах зорачак. Хаця яны і не могуць бачыць колеру сваёй зорачкі, яны дапамагаюць адзін аднаму зразумець, да якой групы яны належаць (да групы сініх зорачак, чырвоных і г.д.). Часта тыя, чый колер не паўтараецца, застаюцца стаяць адны, без групы. (2—3 хвіліны)

## Абмеркаванне:

- Ці было заданне цяжкім?
- Чаму вы разбіліся на групы менавіта такім чынам? Ці адыграў колер зорачак сваю ролю — паказаў вам на наяўнасць у вас агульнай прыкметы?
- Вы дапамагалі адзін аднаму?
- Што вы думалі, калі аб’ядноўваліся ў групы?
- Ці зведалі вы станоўчыя адчуванні, калі зразумелі, што належыце да групы? Ці адчувалі вы свайго роду адзінства? Чаму прыналежнасць да групы адчуваецца як нешта бяспечнае і добрае?
- Ці адчувалі вы сябе інакш дзякуючы колеру? Ці «ганарыліся» вы сваім колерам?
- А калі акрамя вас ні ў кога не было такога колеру? Ці аб’ядналіся «адзіночкі» ў асобную групу? Калі не — як ім было стаяць адным? Чаму можна адчуць сябе самотна, калі ты не належыш да якой-небудзь групы?
- Ці ёсць у нашай школе групы? Ці падабаецца нам, што яны ёсць?
- Калі мы становімся часткай групы? Калі мы перастаём быць часткай групы?
- Ці патрэбны нам наогул групы? Навошта?
- Чаму мы часам не адважваемся выказаць сваё меркаванне, калі знаходзімся разам з іншымі людзьмі ў групе? Ці можа гэта мець негатыўныя наступствы? Што мы можам зрабіць, каб не патрапіць у такую сітуацыю?
- Ці можна страціць частку сваёй асобы ў групе? Як?
- Ці варта тым, хто не адносіцца да пэўнай групы, сфарміраваць сваю групу? Чаму і як?

## Возьмем пад ўвагу:

Людзі ўтвараюць групы на падставе ўнутраных ці знешніх прыкмет. Важна разумець, што, утвараючы групы, мы не толькі набываем пачуццё датычнасці, адзінства і бяспекі, але таксама і «адсякаем» усіх астатніх. Часам тыя, каго не прынялі ў групу, могуць успрымаць гэта адмоўна. Магчыма, лепш будзе запрасіць у групу і іншых людзей? Прыналежнасць да групы таксама можа прывесці да таго, што мы будзем падаўляць свае асабістыя меркаванні перад меркаваннем групы. Часам гэта дрэнна.



# ПЕРШАЕ ЎРАЖАННЕ

## Тэма:

Стэрэатыпы і прадузятасці.

## Мэта:

Удзельнікі павінны задумацца над тым, як ствараецца наша першае ўражанне пра чалавека, і атрымаць уяўленне аб тым, што такое прадузятасці.

Наша першае ўражанне пра людзей становіцца часта асновай нашага стаўлення да іх. Але ці заўсёды першае ўражанне слушнае? Можа быць, не варта спяшацца з высновамі і пачакаць да таго часу, пакуль людзі лепей даведаюцца адзін пра аднаго?

## Практычная рэалізацыя:

Гэта жвавае ўступнае практыкаванне для таго, каб даведацца, якое першае ўражанне мы робім адзін на аднаго. Якія высновы мы робім, зыходзячы са знешнасці чалавека?

**Час:** 45 хвілін.
**Што неабходна?** Загадзя падрыхтаваныя пытанні.

## Парадак выканання:

1. Кожны ўдзельнік знаходзіць сабе пару. Кіраўнік задае, напрыклад, наступнае пытанне: «Любіць твой суразмоўца хадзіць на шпацыр ці не?» Абодва суразмоўцы спрабуюць здагадацца адзін пра аднаго і сказаць, што яны думаюць. Той, каго гэта датычыць, кажа, адпавядае гэта рэчаіснасці ці не. Суразмоўцы могуць потым растлумачыць адзін аднаму, чаму яны так падумалі.
2. Удзельнікі мяняюцца сваімі суразмоўцамі. Задаецца наступнае пытанне. І так можна некалькі разоў, кожны — у новых парах. Пытанні могуць быць і даволі асабістага характару. Напрыклад: «Якія ў яго інтарэсы? Ці займаецца спортам? Якую музыку любіць? Чым любіць займацца ў вольны час? Хто па прафесіі яго бацькі?» (20 хвілін)
3. Агульная дыскусія ў групе. Вядучы просіць удзельнікаў падумаць, колькі разоў яны мелі рацыю, а колькі разоў памыліліся. Якім чынам вы прыйшлі да той ці іншай высновы? Ці ўказвала штосьці ў знешнасці суразмоўцы на вашы здагадкі? Ці адпавядалі вашы здагадкі рэчаіснасці ў такіх выпадках ці не? (5 хвілін)

4. Абмеркаванне. (25 хвілін)
   - Якім чынам складаецца ў нас першае ўражанне пра незнаёмых людзей?
   - Калі мы складаем першае ўражанне пра чалавека на падставе яго/яе знешнасці, узросту, полу, культурнай прыналежнасці, стылю адзення і г.д., якую ролю могуць адыгрываць пры гэтым стэрэатыпы?



Мужчына гандлюе праснакамі на рынку ў Ташкенце. Узбекістан, кастрычнік 2001 г.

### Возьмем пад ўвагу:

Першае ўражанне пра чалавека не заўсёды бывае правільным. Часта мы выкарыстоўваем нашы прадузятасці і стэрэатыпы ў той момант, калі ў нас складаецца тое ці іншае ўражанне пра чалавека. Разумна бліжэй пазнаць чалавека, перш чым мы будзем ствараць меркаванні і высновы адносна яго/яе.



## САЦЫЯЛЬНЫЯ СТЭРЭАТЫПЫ — МАЛЮНКІ Ў НАШАЙ ГАЛАВЕ

### Тэма:

Сацыяльныя стэрэатыпы і прадузятасці.

### Мэта:

Удзельнікі павінны разабрацца ў тым, што такое сацыяльныя стэрэатыпы і прадузятасці і як яны ствараюцца.
Высветліць, як стэрэатыпы і прадузятасці выкарыстоўваюцца ў грамадстве і як да іх трэба ставіцца.

Сацыяльныя стэрэатыпы — гэта вынік апраўданага або неапраўданага аб'яднання людзей ці груп людзей па якіх-небудзь прыкметах. Амерыканскі журналіст Уолтар Ліпман упершыню ўвёў тэрмін ва ўжыванне ў грамадскіх навуках і назваў стэрэатыпы «малюнкамі ў галовах». Яго асноўным тэзісам было палажэнне аб тым, што часцей за ўсё нашы ўяўленні пра іншых людзей фарміруюцца на падставе інфармацыі з іншых крыніц, чым на непасрэдным вопыце. Крыніцы рэдка змяняюцца самі, нават пры непасрэднай сустрэчы з прадстаўніком іншай групы, таму што мы бачым тое, што мы ўжо першапачаткова запраграмаваны ўбачыць, а не тое, што адбываецца ў рэчаіснасці. Прадузятасці — гэта ўстойлівыя стэрэатыпы. Прадузятасці — гэта «меркаванні, вынесеныя загадзя», што наносяць шкоду групе людзей. У той час як стэрэатыпы — гэта перакананні ці разуменні, якія могуць падвяргацца зменам, прадузятасці — гэта адносіны, якія супраціўляюцца зменам[69].

«Раней я думаў, што ўсе, у каго доўгія валасы, наркаманы.
Зараз у мяне самога доўгія валасы».

Дзіно

### Практычная рэалізацыя:

Заданне пачынаецца з працы ў групах, потым яе вынікі прадстаўляюцца і абмяркоўваюцца на агульным сходзе. Пасля гэтага групы працягваюць абмеркаванне іншых праблем.

**Час:** 2—4 гадзіны або 3 урокі (135 хвілін).
**Што неабходна?** Прасторнае памяшканне, вялікія лісты і фламастэры, папера і алоўкі.

### Парадак выканання, частка 1 (першы ўрок):

1. Кіраўнік дзеліць удзельнікаў на невялікія групы. Кожнай групе «даецца» для працы пэўная група людзей — напрыклад, амерыканцы, эмігранты, мусульмане, праваслаўныя, камуністы і інш. Удзельнікі разам выбіраюць пяць станоўчых і пяць адмоўных якасцяў гэтай групы і запісваюць іх у два слупкі на вялікім лісце. (15 хвілін)
2. Групы прадстаўляюць вынікі сваёй працы на агульным сходзе і тлумачаць, як яны «выйшлі» на гэтыя якасці. Астатнія ўдзельнікі могуць даваць свае каментары падчас прэзентацый. (5 хвілін)

### Абмеркаванне:

- Як вы «вышлі» менавіта на гэтыя якасці? Што было лягчэй выявіць: станоўчыя ці адмоўныя якасці?
- Ці лёгка ўдзельнікі прыйшлі да згоды?
- Адкуль вы ведалі пра гэтыя якасці? Вы калі-небудзь сустракаліся з кім-небудзь з апісанай групы? (Калі не, то адкуль вы можаце ведаць, што яны менавіта такія?)
- Як вы думаеце, ці ўсе члены апісанай групы валодаюць гэтымі якасцямі?
- Ці з'яўляюцца гэтыя якасці адлюстраваннем сацыяльных стэрэатыпаў?
- Ці спрыяюць стэрэатыпы таму, што мы вешаем на людзей ярлыкі?
- Вы самі сутыкаліся з адносінамі, заснаванымі на стэрэатыпах?
- Што такое прадузятасці? Чаму ў нас ёсць прадузятасці?
- Прывядзіце прыклады адмоўных стэрэатыпаў і прадузятасцяў.
- Прывядзіце прыклады станоўчых стэрэатыпаў і прадузятасцяў.
- Ці правільна прыпісваць людзям асаблівыя якасці ці рысы характару, калі вы іх ніколі не сустракалі?
- Што б вы самі адчулі, калі б людзі сталі прыпісваць вам якасці, якімі вы не валодаеце?

Вядучы выступае з кароткім дакладам аб сацыяльных стэрэатыпах і прадузятасцях.

### Парадак выканання, частка 2 (другі ўрок):

1. Тыя ж групы цяпер спрабуюць высветліць, адкуль бяруцца стэрэатыпы і прадузятасці (веды, уласны вопыт, СМІ, бацькі, школа, палітыкі, знакамітасці, мастацтва, літаратура і інш.). Нядрэнна, калі яны змогуць прывесці прыклады. (15 хвілін)
2. На агульным сходзе групы прадстаўляюць і абмяркоўваюць вынікі. Вядучы запісвае самыя важныя вынікі на вялікім лісце.



### Абмеркаванне:

- Адкуль бяруцца стэрэатыпы?
- Знайдзіце прыклады таго, як бацькі, СМІ, падручнікі, палітыкі могуць удзельнічаць у фарміраванні і падтрыманні стэрэатыпаў і прадузятасцяў.
- Калі ў вас ёсць уласны вопыт і ўласныя ўражанні, ці справядліва рабіць абагульненні, калі гэты вопыт абмежаваны?
- Чаму палітыкам можа быць выгадна стварэнне або падтрыманне стэрэатыпаў і прадузятасцяў?
- Ці магчыма маніпуляваць грамадскай думкай? Хто у такім разе можа гэта зрабіць? Прывядзіце прыклады з сучаснасці ці гісторыі, калі палітыкі і (ці) улады выкарыстоўвалі стэрэатыпы і прадузятасці ў сваім палітычным змаганні. Ці ёсць у вас такія прыклады на беларускім матэрыяле?
- Ці могуць стэрэатыпы і прадузятасці быць небяспечнымі?
- Ці могуць стэрэатыпы перашкаджаць інтэграцыі?

### Парадак выканання, частка 3 (трэці ўрок):

1. Тыя ж самыя групы атрымліваюць заданне высветліць, як лепш за ўсё пераадолець стэрэатыпы і прадузятасці. (20 хвілін)
2. Усе збіраюцца разам для прэзентацый вынікаў працы ў групах і абмеркавання. (5 хвілін)

### Абмеркаванне: (20 хвілін)

- Мы бачылі прыклады таго, як стэрэатыпы і прадузятасці могуць выкарыстоўвацца ў грамадстве, у тым ліку ў кепскіх мэтах. Якія высновы мы можам з гэтага зрабіць?
- Чаму людзям у грамадстве так цяжка пазбавіцца ад стэрэатыпаў і прадузятасцяў?
- Што мы можам зрабіць у наступны раз, калі сутыкнемся са стэрэатыпамі і прадузятасцямі?
- На якіх сацыяльных арэнах мы маем магчымасць разбурыць стэрэатыпы і прадузятасці? (Дома, у школе, у рэлігійным асяроддзі, у клубе для падлеткаў і моладзі, у газеце, у палітыцы, прыцягваючы ўвагу да груп, якія дыскрымінуюцца з-за стэрэатыпаў, з'яўляючыся сумленнымі ў адносінах да сябе і іншых.)
- Што патрабуе ад нас праца па разбурэнні стэрэатыпаў і прадузятасцяў (мужнасці, незалежнасці, упэўненасці ў сваёй пазіцыі, умення пераконваць іншых)? Чаму і як?
- Што адбудзецца, калі мы не будзем спрабаваць змагацца са стэрэатыпамі і прадузятасцямі? Ці дастаткова ў нас мужнасці, каб нічога з гэтым не рабіць?

**Возьмем пад ўвагу:**

Стэрэатыпы і прадузятасці — гэта вынік схільнасці людзей аб'ядноўваць людзей у групы на падставе адной прыкметы. Размяркоўваючы людзей па групах, лёгка выпусціць з-пад увагі індывідуальнасць чалавека, паколькі тады мы бачым у ім толькі члена нейкай групы. Стэрэатыпы і прадузятасці могуць прывесці да выключэння нейкіх людзей з грамадства, здзекаў, дыскрымінацыі і расізму, а калі яны ствараюцца і падтрымліваюцца палітыкамі — да вайны і генацыду. Важна памятаць, што ва ўсіх ёсць стэрэатыпы і прадузятасці, і пытанне ў тым, як мы з імі спраўляемся. Мы можам змагацца са стэрэатыпамі і прадузятасцямі рознымі спосабамі, і гэта варта рабіць пры кожнай магчымасці.

**Мара пра свет без «чужых»... Не пра свет без адрозненняў, што важна падкрэсліць. Наадварот. Такі свет стане магчымым толькі пры ўмове, калі мы навучымся спраўляцца з агрэсіўнай рэакцыяй, якая, як ахоўны механізм, з'яўляецца на адрозненні паміж людзьмі.**

**Юлія Крысцева**

69. Цытата з Элізабэт Айдэ і Ане Хэге «Убачыць свет з іншага боку»/ Elisabeth Eide og Anne Hege Simonsen: Å se verden fra et annet sted, Oslo, Cappelens, 2004 г.



# МАША І ХАЛІД

**Тэма:**

Стэрэатыпы і прадузятасці.

**Мэта:**

Навучэнцы павінны пераканацца ў тым, што ўсе нашы ўяўленні пра незнаёмых нам людзей засноўваюцца на стэрэатыпах і прадузятасцях.

У 1996 годзе адзін малады чалавек уладкаваўся на летнюю працу ў рэдакцыі адной маленькай лакальнай газеты ў Нарвегіі. Прыйшоўшы ў рэдакцыю газеты, ён быў сустрэты ветлівай дамай у прыёмнай. Перш чым ён паспеў сказаць, што будзе працаваць у рэдакцыі гэтым летам, яна паказала яму, дзе дзверы пакоя разносчыкаў газет. Відаць, выходзячы з цёмнага колеру скуры хлопца, дама аўтаматычна зрабіла выснову, што працаваць ён будзе разносчыкам газет[70].

**Практычная рэалізацыя:**

Гэта практыкаванне, у якім усе навучэнцы ўдзельнічаюць у стварэнні расказа пра Машу з Беларусі і Халіда з Афганістана. Практыкаванне завяршаецца агульным абмеркаваннем. Практыкаванне добра падыходзіць для працы па тэме дыскрымінацыі па полавай прыкмеце ці сацыяльнай прыналежнасці людзей. Кіраўнік сам вырашае, якую групу людзей ці персанаж узяць для складання другой гісторыі. Гэта можа быць, напрыклад, расказ пра крышнаіта Пецю ці расказ пра Марыю — чалавека з абмежаванымі магчымасцямі.

**Час:** 45 хвілін.

**Што неабходна?** Прасторнае памяшканне, адрыўныя лісты паперы, маркеры розных колераў, мячык.

**Парадак выканання:**

1. Удзельнікі рассаджваюцца па колу. Кіраўнік абвяшчае ўдзельнікам, што ім будзе неабходна скласці расказ пра беларускую дзяўчынку. Кожны ўдзельнік прыдумляе па адным ці двух сказах, якія з'яўляюцца працягам пачатай гісторыі. Сказы павінны апісваць паўсядзённае жыццё беларускай дзяўчынкі па імені Маша. Вядучы пачынае сказам: «Гэта расказ пра Машу, 13-гадовую дзяўчынку з Хойнікаў» — і кідае мячык наступнаму ўдзельніку, які прыдумляе свае сказы. Пасля некалькіх хвілін (2—4) гульні расказ пра Машу больш-менш складзены.

Мячык вяртаецца да вядучага, і той працягвае гульню наступным сказам: «Маша знаёмая з хлопчыкам па імені Халід, бацькі якога прыехалі з Афганістана, і ў якога таксама ёсць свая гісторыя». Затым вядучы кідае мячык далей, іншаму ўдзельніку для працягу гісторыі пра Халіда. Усяго на гэтую частку практыкавання дастаткова 10—15 хвілін.

2. Вядучы пытаецца ва ўдзельнікаў: што распавядаюць нам гэтыя гісторыі пра Машу і Халіда?
   - Апісанне жыцця дзяўчынкі з Беларусі і хлопчыка з Афганістана — гэта вынік нашых уяўленняў? Адказы запісваюцца на дошцы ў выглядзе ключавых словаў.
   - Адкуль бяруцца нашы ўяўленні? Як яны складаюцца? З нашага ўласнага вопыту ці аднекуль яшчэ? Як шмат удзельнікаў сустракалі ў сваім жыцці людзей з Афганістана?

### Возьмем пад ўвагу:

Калі мы сустракаем незнаёмых нам людзей, мы адначасова «даём» ім характарыстыкі. У нас таксама могуць быць ужо некаторыя ўяўленні адносна іх і чаканні, як негатыўныя, так і пазітыўныя. Стэрэатыпы і прадузятасці заснаваны на тым, што мы думаем пра іншых людзей, а не на тым, што мы пра іх ведаем. Важна памятаць пра гэта, прывучаючы сябе тым самым фарміраваць меркаванне пра чалавека як пра асобу, а не толькі як прыналежнага да якой-небудзь пэўнай групы. Усе людзі розныя!

70. Цытата з Ліндэстад і Ф'ельстад. Прэса і чужыя/ Lindstad og Fjeldstad: Pressen og de fremmede, Kristiansand, I-J Forlag, 1999 г.



## «МЫ» І «ЯНЫ»

### Тэма:

Прыналежнасць да групы і дзяленне на «мы» і «яны».

### Мэта:

Навучэнцы павінны пераканацца ў тым, што ва ўсіх нас ёсць тэндэнцыя дзяліць людзей на «мы» і «яны»; навучыцца ўспрымаць чалавека як асобу, а не як прадстаўніка нейкай адной групы.

Мы дзелім людзей на групы, такім чынам спрашчаючы для сябе ўладкаванне навакольнага свету. Аднак часта бывае так, што больш пазітыўныя характарыстыкі мы даем той групе, да якой належым самі. У выніку ўтвараецца тыповае дзяленне на «мы» і «яны», дзе іншыя людзі становяцца «іншымі/чужымі», з іншымі каштоўнасцямі і меркаваннямі. У многіх грамадствах гэта ярчэй за ўсё заўважна ў размяжоўванні паміж «намі, што жывуць у краіне ўжо даўно», і «тымі, хто сюды перасяліўся».

### Практычная рэалізацыя:

Дадзенае практыкаванне — развагі, якія будуюцца на меркаваннях удзельнікаў пра «нас» і пра «іх». Ва ўдзельнікаў павінны быць даверлівыя і паважлівыя адносіны адзін з адным для выканання такога практыкавання. Чым даўжэй яны ведаюць адзін аднаго, тым больш адкрытай атрымаецца праца і тым большаму яны самі навучацца. У прыкладзе мы ўзялі ў функцыі «мы» — беларусаў і ў функцыі «яны» — прыезджых. Любыя іншыя групы людзей могуць таксама быць выкарыстаны ў якасці прыкладаў.

**Час:** 45 хвілін.
**Што неабходна?** Папера і ручкі.

### Парадак выканання:

1. Вядучы дзеліць удзельнікаў на невялікія групы, якім неабходна адказаць на наступныя пытанні: (15 хвілін)
   - Прывядзіце прыклады дзялення на «мы» і «яны» ў беларускім грамадстве; у раёне, дзе вы жывяце; у школе. Як і чаму ўтварылася падобнае дзяленне?
   - Часам сцвярджаецца, што культура прыезджых можа негатыўным чынам уплываць на беларускую культуру. Якое ваша меркаванне?
   - Ці можа беларуская культура ўспрымацца негатыўным чынам з боку прыезджых? Паспрабуйце знайсці таму прыклады.

3. Групы прадстаўляюць вынікі сваёй працы аўдыторыі. (10 хвілін)
4. Абмеркаванне: (20 хвілін)
   - Ці думалі вы самі калі-небудзь па тыпу: «мы» і «яны»? Распавядзіце.
   - Што маецца на ўвазе пад словамі «большасць» і «меншасць» у грамадстве?
   - Прывядзіце прыклады таго, як «большасць» дае азначэнні прадстаўнікам меншасцяў у грамадстве. Якім чынам могуць быць, напрыклад, ахарактарызаваныя хлопчык ці дзяўчынка — прадстаўнікі меншасці?
   - Прывядзіце прыклады таго, як «меншасць» дае азначэнні прадстаўнікам большасці ў грамадстве. Як гэта ўплывае на большасць?
   - Што правільна: складаць свае адносіны да людзей, зыходзячы з той групы, да якой яны належаць, ці зыходзячы з асобы кожнага?
   - Ці вучыць нас чаму-небудзь назіранне за намі самімі і ўлічванне погляду з боку? Якія высновы можна зрабіць з усяго гэтага?

Удзельніцы конкурсу прыгажосці «Міс Інтэркантыненталь» у нацыянальных касцюмах падчас наведвання музея беларускай архітэктуры і побыту «Дудуткі». Верасень 2009 г.





### Возьмем пад ўвагу:

Ва ўсіх людзей ёсць тэндэнцыя вызначаць некаторыя групы людзей у грамадстве як «іншыя». Дзяліць людзей на групы — нармальная з’ява. Аднак прыпісванне людзям, якія адносяцца да той ці іншай групы, характарыстыкі гэтай групы, можа мець наступствы. Некаторыя людзі, бачачы, што іх дзяляць на катэгорыі і групы, могуць перажываць пачуццё страты свайго ўласнага «я», непрызнання сваіх ведаў, вопыту, каштоўнасцяў і ўспрымання апошніх як не вартых цікавасці. Да таго часу, пакуль «іншасць» не выказваецца за кошт другіх людзей, да яе неабходна ставіцца цярпіма і з разуменнем. Паколькі тое, што адбываецца, — гэта ўзаемадзеянне асобна ўзятых людзей, а не культур.

У гісторыі чалавецтва ёсць шмат прыкладаў таго, як «іншасць» выкарыстоўвалася ў палітыцы і станавілася прычынай дыскрымінацыі, ганенняў і забойстваў. Гітлер, Сталін, Мао Цзэдун, Пол Пот — дыктатары, на сумленні якіх мільёны забітых людзей. «Іншыя» былі вызначаны як людзі «другога гатунку» ці наогул «недачалавекі»: хворыя, ненармальныя, дурныя, брудныя, з дрэннымі генамі і г.д. Ім не было месца ў тых дыктатарскіх грамадствах: ні ў этычнай, ні культурнай сферах.

Магчыма, можна перамагчы прадузятае стаўленне і навешванне ярлыкоў, звяртаючы больш увагі на падабенствы паміж людзьмі, чым на адрозненні паміж імі? Верагодна, гэта будзе спрыяць прыкладанню мастоў, незалежна ад культур, нацыянальнасці і рэлігіі.

# РОЗНЫЯ ПРАВІЛЫ ГУЛЬНІ

### Тэма:

Большасць і меншасць.

### Мэта:

Навучэнцы павінны на сваім вопыце адчуць, што няроўнасць і дыскрымінацыя — несправядлівыя, і ўбачыць, што там, дзе адны маюць уладу, другія перажываюць бяссілле.

У кожнай групы ёсць свае ўласныя «правілы гульні». Ці заўсёды яны справядлівыя для прадстаўнікоў меншасцяў і для тых, хто «іншыя»? Меншасці ў тым ці іншым грамадстве — гэта тыя людзі, якія адрозніваюцца ад большасці: гэта нацыянальныя меншасці, рэлігійныя, сэксуальныя, палітычныя ці якія-небудзь іншыя.

### Практычная рэалізацыя:

Гэтае практыкаванне выконваецца паралельна з іншымі ў адзін і той жа адрэзак часу (некалькі гадзін або цэлы дзень). Практыкаванне заключаецца ў тым, што ўдзельнікі, вымушаныя прытрымлівацца розных «правілаў гульні», атрымліваюць доступ да розных выгодаў і падвяргаюцца дыскрымінацыі. Практыкаванне можа падацца цяжкім, несправядлівым, прынесці расчараванне. Таму праводзіць яго варта ў групах са «сталымі» падлеткамі, у бесканфліктным асяроддзі.

**Час:** 2—3 гадзіны або цэлы навучальны дзень.
**Што неабходна?** Прасторнае памяшканне, падрыхтаванае для працы ў групах, лісточкі-налепкі трох розных колераў, скотч, вялікія адрыўныя лісты паперы і маркеры, папера і ручкі для назіральнікаў.
**Падрыхтоўка:** Вядучаму трэба загадзя напісаць правілы для кожнай з груп.

### Парадак выканання:

1. Вядучы абвяшчае, што неабходна будзе падзяліцца на тры групы: чырвоную, зялёную і жоўтую. Членам груп раздаюцца налепкі адпаведных колераў, якія яны могуць насіць на грудзях. Вядучы тлумачыць правілы (гл. ніжэй). Важна, каб правілаў не было занадта шмат і каб яны не былі занадта аб'ёмнымі і цяжкімі для запамінання. Правілы можна таксама запісаць на дошцы.
   Прыклады правілаў:

   *Група зялёных (прывілеяваныя)*
   Могуць рабіць усё, што ім захочацца (адпаведна, раячыся з вядучым).
   Маюць магчымасць выкарыстоўваць усе сродкі ў гульні: інфармацыю, Інтэрнэт.
   Могуць есці і піць.

   *Група чырвоных (непрывілеяваныя)*
   Нельга сядзець на крэслах.
   Дазволена размаўляць толькі па-англійску.
   Павінны казаць «дзякуй» кожны раз, калі ім даюць слова.
   Не дазволена размаўляць з «зялёнымі», калі толькі «зялёныя» не звяртаюцца да іх першымі.
   Павінны заўсёды пытацца дазволу ў «зялёных», калі хочуць паслухаць музыку, пагуляць у камп'ютарныя гульні, выкарыстаць Інтэрнэт ці пагуляць у настольны тэніс і г.д.
   Не дазволена выкарыстанне мабільных тэлефонаў.
   Не дазволена есці ці піць.

   *Група жоўтых (2 – 4 чалавека, якія з'яўляюцца назіральнікамі)*
   Павінны клапаціцца пра тое, каб усе ўдзельнікі паважалі правілы.
   Павінны назіраць за тым, што адбываецца.
   Павінны запісваць важныя сказаныя і зробленыя рэчы.
   Павінны скласці сваё ўласнае меркаванне пра ўбачанае і пачутае.

   Вядучаму неабходна імправізаваць з колькасцю членаў у кожнай групе ў залежнасці ад таго, якую частку рэальнага жыцця неабходна асвятліць. Так, калі задача — паказаць сітуацыю ў беларускім грамадстве, група «зялёных», г. зн. прывілеяваных, можа быць нашмат меншай, чым група «чырвоных». Калі задача — перадаць сітуацыю на міжнародным узроўні, група «зялёных» можа быць самай вялікай.

2. Вядучы працягвае далей практыкаванне.
3. Пасля таго, як час скончыўся, усе збіраюцца для агульнай дыскусіі. Важна, каб удзельнікі «выйшлі з ролі» да пачатку агульнага абмеркавання. Спачатку вядучы просіць назіральнікаў падзяліцца сваімі назіраннямі пра тое, як жа выконваліся правілы ўдзельнікамі. Якая была ва ўдзельнікаў рэакцыя на правілы? Як паводзілі сябе «зялёныя»? Ці былі выпадкі зларадаснасці? Як паводзілі сябе «чырвоныя»? Ці былі выпадкі адчаю ці злосці?

### Абмеркаванне:

- Ці лёгка было выконваць правілы?
- Як адчувалі сябе ўдзельнікі? Ці навучыліся яны чаму-небудзь?

- Ці адчуваў хто-небудзь сябе ўшчэмленым у правах?
- Ці спрабаваў хто-небудзь абмяняць ці выкінуць сваю этыкетку — прыналежнасць да групы?
- Якія ўшчамленні ў правах можна назіраць у звычайным жыцці?
- Ці можаце вы прывесці прыклады, калі большасць вырашае за меншасць у грамадстве?
- У каго ёсць улада вызначаць, якімі будуць правілы?
- Ці дэмакратычная ваша школа/арганізацыя?
- Якім чынам мы можам дапамагчы меншасці задаволіць іх правы і патрэбы?

### Возьмем пад ўвагу:

Не ўсе ў грамадстве маюць доступ да адных і тых жа выгодаў. Некаторыя падвяргаюцца сістэматычнай дыскрымінацыі, паколькі магчымасці вырашаць і вызначаць правілы належаць іншым. Адсутнасць роўных магчымасцяў выклікае пачуццё несправядлівасці і прыводзіць да адчаю і расчаравання.

### Ідэя для далейшай працы:

Прааналізуйце правілы, якімі павінны былі карыстацца групы. Ці справядлівыя яны? Ці ўсе могуць стаць членамі пэўнай групы? У каго ёсць права і магчымасць вызначаць правілы? Якім чынам можна ўстанавіць правілы, справядлівыя для ўсіх? Як выглядае ідэальнае (г. зн. справядлівае) грамадства?



## ГАЛАВАЛОМКА ПРА РЭЧАІСНАСЦЬ

### Тэма:

Дыскрымінацыя, сегрэгацыя і выключэнне.

### Мэта:

Удзельнікі павінны звярнуць увагу на ўласныя рэакцыі на несправядлівасць і зразумець, што салідарнасць людзей дапамагае ў змаганні з несправядлівасцю і дыскрымінацыяй.

Ці прыходзілася вам калі-небудзь рабіць нешта цяжкае і нуднае, у той час як камусьці іншаму гэта рабіць было неабавязкова? Вы адчувалі пры гэтым несправядлівасць, ці не так?

### Практычная рэалізацыя:

Практыкаванне пачынаецца з працы ў групах і завяршаецца агульным абмеркаваннем.

**Час:** 1,5 гадзіны.
**Што неабходна?** Прасторнае памяшканне, вялікія адрыўныя лісты паперы і маркеры, дошка, папера і ручкі, копіі фотаздымкаў і канверты.
**Падрыхтоўка:** Падрыхтаваць плакаты-фотаздымкі ці ілюстрацыі (фармат А-3), якія адлюстроўваюць няроўнае стаўленне. Кожны з фотаздымкаў-ілюстрацый разразаецца на кавалачкі (каля 20) і становіцца галаваломкай.

### Парадак выканання:

1. Кіраўнік дзеліць удзельнікаў на невялікія групы. Кожная група атрымлівае па канверце з галаваломкай. Першай групе выдаецца канверт з галаваломкай поўнага фотаздымка ці ілюстрацыі. Другой і трэцяй у канвертах выдаюцца галаваломкі — кавалачкі двух фотаздымкаў ці ілюстрацый. Астатнія групы атрымліваюць «зборныя» галаваломкі — кавалачкі розных фотаздымкаў ці ілюстрацый.
2. Заданне: скласці фотаздымак/ілюстрацыю. Перш чым групы пачнуць выконваць заданне, вядучы тлумачыць правілы: першая група пачынае на адну хвіліну раней, чым усе астатнія. Другой групе дазваляецца выкарыстоўваць толькі левую руку пры складанні ілюстрацыі. Астатнія групы могуць рабіць як хочуць. Заданне: як мага хутчэй скласці ілюстрацыю.

3. Усе групы, акрамя першай, хутка зразумеюць, што ім не хапае кавалачкаў для таго, каб скласці поўны фотаздымак/ілюстрацыю. Магчыма, некаторыя зразумеюць, што можна абмяняцца кавалачкамі з іншымі групамі для таго, каб атрымалася поўная ілюстрацыя. Прапановы адносна супрацоўніцтва і ўзаемаабмену дазволены. Вядучы абвяшчае пра завяршэнне гульні, калі ўсе ілюстрацыі складзеныя ці калі ўдзельнікам надакучыць несправядлівасць сітуацыі.

### Абмеркаванне:

- Што вы думаеце пра практыкаванне? Як вы думаеце, навошта мы гулялі ў дадзеную гульню?
- Як гэта, калі ў розных груп розныя (няроўныя) магчымасці?
- Ці можна зрабіць якія-небудзь высновы адносна рэальнага жыцця, зыходзячы з дадзенай гульні?
- Ці перажывалі вы самі або вашы знаёмыя несправядлівасць сітуацыі і няроўнасць магчымасцяў, напрыклад, адносна грошай, адзення, магчымасцяў атрымання адукацыі, на рынку працы, жылля і інш.? Якая сітуацыя з сацыяльна неабароненымі групамі ў грамадстве: з людзьмі з абмежаванымі магчымасцямі і прадстаўнікамі меншасцяў?
- Ці ляжыць віна за дыскрымінацыю людзей на грамадстве?
- Якім чынам грамадства і дзяржаўныя ўлады могуць абараніць ад дыскрымінацыі?
- Як успрымаюць, на ваш погляд, людзі тое грамадства, дзе дыскрымінацыя і ўшчамленне ў правах — нармальная з’ява?
- Да якіх наступстваў для грамадства і для саміх людзей прыводзіць дыскрымінацыя?
- Ці ўшчамляў калі-небудзь я правы іншых людзей?

### Возьмем пад ўвагу:

Не заўсёды і не паўсюль у людзей ёсць роўныя магчымасці. Гэта датычыць і Нарвегіі, і любой іншай краіны. У адных людзей у грамадстве заўсёды ёсць больш доступу да выгодаў і рэсурсаў, чым у іншых. Няроўнае стаўленне да людзей называецца дыскрымінацыяй. Дыскрымінацыя — гэта парушэнне правоў чалавека і непавага яго/яе годнасці. На дзяржаве ляжыць абавязак прадухіляць дыскрымінацыю ў грамадстве і гарантаваць усім грамадзянам роўныя магчымасці. Важна і нам усім памятаць пра тое, што мы можам дыскрымінаваць іншых людзей у паўсядзённым жыцці. Адказнасць за стварэнне справядлівага грамадства ляжыць на ўсіх нас.



## ЗДАГАДАЙЦЕСЯ, ХТО ПРЫЙДЗЕ НА ВЯЧЭРУ

### Тэма:

Дыскрымінацыя і распаўсюд прадузятасцяў.

### Мэта:

Удзельнікі павінны зразумець, што сям’я і кола зносінаў часта аказваюць уплыў на наша ўспрыманне іншых людзей.

Усведамляем мы тое ці не, у нас звычайна ёсць загадзя сфарміраваныя меркаванні і стаўленне да іншых людзей. У кагосьці яны больш умацаваныя, у кагосьці — менш. Прадузятасці мы часта атрымліваем ад нашай сям’і, школы, сяброў і грамадства ў цэлым.

Аб’екты загадзя складзеных і сфарміраваных меркаванняў у грамадстве змяняюцца час ад часу. Так, некалькі дзесяцігоддзяў таму жыхары Осла мелі даволі шмат прадузятасцяў адносна жыхароў паўночнай часткі Нарвегіі. Калі паўночнікі, напрыклад, спрабавалі зняць кватэру ў сталіцы, ім часта прыходзілася хаваць свой паўночны дыялект і месца нараджэння.

### Практычная рэалізацыя:

Дадзенае практыкаванне — ролевая гульня з далейшым агульным абмеркаваннем. Вядучы можа змяняць ролі ўдзельнікаў у залежнасці ад групы і кантэксту.

**Час:** 1 гадзіна.
**Што неабходна?** Прасторнае памяшканне, папера і ручкі для назіральнікаў.
**Падрыхтоўка:** Ролевыя карты.

### Парадак выканання:

1. Кіраўнік тлумачыць, што практыкаванне пачынаецца з ролевай гульні. Яе мэта: прааналізаваць ролю сям’і ў працэсе перадачы каштоўнасцяў і меркаванняў адносна людзей з іншых сацыяльных і культурных груп.
2. Кіраўнік выбірае чатырох удзельнікаў для гульні. Другія чацвёра будуць назіральнікамі. Ім неабходна запісваць аргументы, якія выкарыстоўваюцца ўдзельнікамі. Астатнія — гледачы.
3. Кіраўнік раздае ролі (ролевыя карты) удзельнікам і дае 5 хвілін, каб увайсці ў ролю.
4. Вучні разыгрываюць сцэнкі. (5—15 хвілін)

## Абмеркаванне:

- Пытанне ўдзельнікам: як вам было іграць дадзеную ролю?
- Пытанне назіральнікам: якія аргументы былі выкарыстаны рознымі героямі?
- Пытанне ўсім:
    - Ці прыходзілася вам раней чуць падобныя аргументы ў вашай сям'і ці ў іншых якіх-небудзь месцах?
    - Ці было б усё па-іншаму, калі б малады чалавек належаў да той жа рэлігіі, што і дзяўчына?
    - Ці было б усё па-іншаму, калі б гэта быў малады чалавек, а не дзяўчына, які вырашыў пераехаць да сваёй нявесты?
    - Што б магло адбыцца, калі б дзяўчына распавяла пра сваю сувязь з іншай дзяўчынай?
    - Што б магло адбыцца, калі б малады чалавек распавёў пра сваю сувязь з іншым маладым чалавекам?
    - Ці рэагавалі б члены сям'і, на ваш погляд, такім жа чынам, калі б падобная сітуацыя здарылася ў мусульманскай сям'і?
    - Ці адбываюцца падобныя канфлікты ў сённяшняй Беларусі, як вы думаеце?
    - Ці здаралася вам быць сведкамі падобных канфліктаў?

## Возьмем пад ўвагу:

Стэрэатыпы і прадузятасці распаўсюджваюцца праз працэс сацыялізацыі, навучанне і наша паўсядзённае жыццё. Неабходна крытычна падыходзіць да дадзеных праблем і да таго, што мы «чуем» пра тых ці іншых людзей, прадстаўнікоў іншых сацыяльных або этнічных груп. Стэрэатыпы пра «іншых» — няўстойлівыя, яны змяняюцца з часам.



## Ролевыя карты

**Дачка**
Вы вырашылі распавесці сям'і, што сустракаецеся з маладым чалавекам-мусульманінам і збіраецеся пераехаць да яго ў кватэру.

**Сітуацыя:** вы пачынаеце гульню з таго, што распавядаеце, што вы сустракаецеся з маладым мусульманінам і хацелі б жыць разам з ім. Паспрабуйце падрабязней распавесці пра сваё рашэнне, выкарыстоўваючы як мага больш аргументаў.

**Маці**
Ваша дачка сустракаецца з маладым мусульманінам.

**Сітуацыя:** вы любіце вашу дачку, але ўсё ж не можаце ніяк зразумець, як яна магла закахацца ў хлопца-мусульманіна. Вы скептычна ставіцеся да іслама, лічачы дадзеную рэлігію варожа настроенай у адносінах да жанчын, і асацыюеце мусульман з тэрарыстамі. Вы асцерагаецеся, што хлопец-мусульманін будзе абмяжоўваць жыццё вашай дачкі, зробіць з яе «хатнюю прыслужніцу». Звычайна вы падтрымліваеце вашага мужа на сямейных нарадах. Вы паказваеце вашай дачцэ, як шмат болі і пакутаў прыносіць вам яе рашэнне.

**Старэйшы брат**
Ваша сястра сустракаецца з маладым мусульманінам.

**Сітуацыя:** вы не маеце нічога супраць таго, каб ваша сястра сустракалася з маладым мусульманінам. Вы лічыце, што ўсе людзі свабодныя ў сваім выбары і рашэннях. Аднак, калі вы чуеце, што кажа ваша мама, вы пачынаеце сумнявацца і думаць, што, можа быць, усё ж у гэтага маладога чалавека не самыя добрыя намеры. Вы выказваеце вашу заклапочанасць гэтым і разам з тым спрабуеце абараніць вашу сястру.

**Бацька**
Ваша дачка сустракаецца з маладым мусульманінам.

**Сітуацыя:** вы катэгарычна не прымаеце выбару і рашэння вашай дачкі сустракацца з маладым мусульманінам. Вы клапоціцеся пра рэпутацыю вашай сям'і і пра тое, што будзе пра вас казаць акружэнне. Вы не лічыце сябе расістам, аднак, калі справа датыць сувязі вашай дачкі з мусульманінам і магчымасці іх шлюбу, вы гатовы зрабіць усё, каб гэтага не адбылося. Вы строгі бацька, і аргументы вашы, адпаведна, строгія таксама.

# ВОПЫТ ДЫСКРЫМІНАЦЫІ

**Тэма:**

Дыскрымінацыя.

**Мэта:**

Удзельнікі павінны навучыцца бачыць выпадкі дыскрымінацыі ў паўсядзённым жыцці і спачуваць людзям, якія падвергліся дыскрымінацыі.

У 2000 годзе бару ў Осла на вуліцы Торгата быў выпісаны штраф у 30 тысяч нарвежскіх крон за расізм. Гэта першы падобнага кшталту штраф у Нарвегіі. У рашэнні суда было запісана, што ў суда склалася ўражанне, што дадзены бар на працягу доўгага часу адмаўляў у наведванні людзям па прыкметах іх колеру скуры або этнічнай прыналежнасці. Людзей, «падобных» на замежнікаў, прасілі паказаць пасведчанне асобы пры ўваходзе ў бар, у той час як іншых людзей прадставіць пасведчанне не прасілі.

**Азначэнні:**

Дыскрымінацыя: ад лацінскага discriminare — адрозніваць. Дыскрымінаваць кагосьці — значыць ставіцца па-іншаму; звычайна — як да ніжэйшых людзей. Слова выкарыстоўваецца звычайна для апісання неапраўданага, няроўнага стаўлення да асобных людзей і груп людзей (этнічных, рэлігійных)[71].

**Практычная рэалізацыя:**

Дадзенае практыкаванне — на роздум і агульнае абмеркаванне. Практыкаванне можна пачаць з паказу фільма, выразкі з газеты ці дэманстрацыі выпадку дыскрымінацыі ў рэальным жыцці. Удзельнікам пажадана абапірацца ў меркаваннях і выказваннях на свой уласны жыццёвы вопыт. Аднак настойваць і прымушаць іх распавядаць штосьці не трэба.

**Час:** 2 гадзіны.

**Што неабходна?** Прасторнае памяшканне, дошка або вялікія адрыўныя лісты паперы, папера і ручкі.

**Парадак выканання:**

1. Кіраўнік просіць удзельнікаў падумаць, ці адчувалі яны калі-небудзь дыскрымінацыю на сабе, ці былі сведкамі, ці чулі аб выпадках дыскрымінацыі. (3—5 хвілін) Вядучы запісвае адказы ў выглядзе ключавых слоў на дошцы. Пасля таго, як усе ўдзельнікі прывялі прыклады, вядучы просіць іх выбраць адну сітуацыю, з якой яны хацелі б працаваць больш падрабязна далей. Удзельнік — «аўтар» выбранай сітуацыі можа распавесці пра яе больш падрабязна. Групе належыць абмеркаваць і адказаць на наступныя пытанні:
   - Як узнікла гэтая сітуацыя?
   - Ці было гэта сапраўды дыскрымінацыяй?
   - Якой была рэакцыя чалавека, які падвергся дыскрымінацыі? Якія маглі быць, на ваш погляд, у яго пачуцці?
   - Як адчуваў сябе, на ваш погляд, чалавек, які падверг дыскрымінацыі іншага чалавека?
   - Калі б вы аказаліся ў падобнай сітуацыі ў якасці пацярпелага, маглі б вы зрабіць што-небудзь, каб неяк змяніць сітуацыю?
   - Калі б вы аказаліся сведкам падобнай сітуацыі, што б вы маглі зрабіць, каб прадухіліць дыскрымінацыю? Лёгка было б гэта зрабіць? Ці цяжка? Ці важна і неабходна было б гэта зрабіць?

**Абмеркаванне:**

- Ці ёсць розніца паміж дыскрымінацыяй і непавагай годнасці чалавека?
- Якія прычыны таго, што людзі падвяргаюцца дыскрымінацыі або непавазе іх годнасці?
- Чаму часцей за ўсё падвяргаюцца дыскрымінацыі «іншыя» людзі, якія адрозніваюцца ад большасці?
- Ёсць меркаванне, што людзі дыскрымінуюць іншых людзей, дбаючы пра свае інтарэсы. Ці так гэта? Ці можаце вы прывесці прыклады?
- Дзе людзі «навучыліся» дыскрымінаваць іншых людзей? Як і чаму?
- У краінах Заходняй Еўропы можна часта чуць, што прыезджыя (мігранты і ўцекачы) падвяргаюцца дыскрымінацыі часцей за ўсё. У той жа самы час вельмі любяць у грамадстве такія рэчы, прывезеныя з іншых краін, як індыйская, пакістанская, турэцкая, кітайская, в'етнамская кухня; джаз, поп, соул, хіп-хоп, рэгі; упрыгожанні і элементы адзення. Таксама папулярна наведваць іншыя краіны ў якасці турыстаў. Ці няма тут супярэчнасці? Калі ёсць, то як яе можна растлумачыць?
- Як правіла, мы гаворым пра «негатыўную» дыскрымінацыю або «дрэннае» стаўленне да іншых людзей. А як ідуць справы з пазітыўнай дыскрымінацыяй: патрэбна яна ці не? Напрыклад, такая, як увядзенне квот для жанчын ці прадстаўнікоў меншасцяў на рынку працы, пры прыёме на працу?
- Чаму важна змагацца з дыскрымінацыяй і непавагай чалавечай годнасці?

### Возьмем пад ўвагу:

**Дыскрымінацыя** — гэта несправядлівае, няроўнае стаўленне і ўспрыманне людзей з-за іх прыналежнасці да пэўнай групы (на падставе якой-небудзь прыкметы, указанай у міжнародных дакументах па правах чалавека). Гэта парушэнне правоў чалавека і крыніца канфліктаў у грамадстве.

**Пазітыўная дыскрымінацыя** — дзеянні (сістэма мер), накіраваныя на спецыяльную падтрымку груп, якія знаходзяцца ў неспрыяльным становішчы, а таксама на абарону грамадсказначных інтарэсаў дадзеных груп. Так, напрыклад, у ЗША апошнія чвэрць стагоддзя праводзіцца паслядоўная палітыка пазітыўнай дыскрымінацыі афраамерыканцаў. Можна параўнаць гэта з квотамі, якія існавалі ў СССР у 60—80-х гадах на паступленне ў маскоўскія педагагічныя ВНУ абітурыентаў з сярэднеазіяцкіх рэспублік і з сельскай мясцовасці.

### Варыяцыя:

Папрасіце некаторых удзельнікаў прыдумаць ролевую гульню па пройдзенай сітуацыі. Астатнія ўдзельнікі могуць выступаць у якасці назіральнікаў. Пасля таго, як гульня паказана адзін раз, можна паразважаць аб тым, ці можна было зрабіць штосьці па-іншаму, каб пазбегнуць або прадухіліць дыскрымінацыю? Пасля развагаў і дыскусій сітуацыю можна прайграць яшчэ раз, магчыма, ужо з іншым вынікам.

**Да 2000 года ў штаце Алабама (ЗША) былі забаронены шлюбы паміж людзьмі цёмнага і светлага колеру скуры. 41 % насельніцтва прагаласаваў за адмену дадзенай забароны.**

71. www.caplex.no, запыт слова «дыскрымінаваць».



## САЦЫЯЛЬНЫ СТАТУС

### Тэма:

Сацыяльны статус.

### Мэта:

Удзельнікі павінны зразумець, што сацыяльны статус — гэта феномен, які ўплывае на нашы меркаванні і дзеянні.

Амбасадар Паўднёвай Афрыкі ў Мазамбіку Тандзі Ранко распавядала пра сітуацыю, якая здарылася з ёй пятнаццаць гадоў таму, калі яна працавала памочнікам у офісе нарвежскай гуманітарнай арганізацыі НОРАД у Батсване. У той час яна знаходзілася ў вымушанай ссылцы ў Мазамбіку па прычыне яе палітычнай дзейнасці ў апартэіднай Паўднёвай Афрыцы. Аднойчы ў офіс, дзе яна працавала, зайшоў адзін нарвежац і задаў дзіўнае пытанне: «Нікога хіба тут няма?» Рамко вельмі добра запомніла тую сітуацыю і той дзень, паколькі ніколі не была настроена быць «нікім»[72]. Фанабэрыстасць іншага чалавека, пераж ытую ў свой час цяперашнім амбасадарам Паўднёвай Афрыкі, кожны з нас мае шанец зведаць. Ці не адчувалі і мы сябе хоць раз у жыцці незаўважанымі?

### Практычная рэалізацыя:

Практыкаванне пачынаецца з невялікай гульні — абмену ідэямі — і заканчваецца агульным абмеркаваннем.

**Час:** 45 хвілін.
**Што неабходна?** Прасторнае памяшканне, ручкі і лісточкі-налепкі.

### Парадак выканання:

1. Удзельнікі размяшчаюцца колам, спінамі, звернутымі ўнутр кола. Вочы заплюшчаныя. Кіраўнік наклейвае на лоб кожнага жоўты лісточак-налепку. На лісточку любая лічба ад аднаго да пяці. Удзельнікі не павінны ведаць, якая лічба ў іх на лбе. Калі лічбы раздадзены ўсім (удзельнікі ўсё яшчэ з заплюшчанымі вачыма), вядучы тлумачыць, што лічба кожнага абазначае статус у грамадстве і што статус вызначаны лічбамі ад аднаго да пяці. Чым вышэй лічба, тым вышэй статус у грамадстве. Заданне ўдзельнікам — высветліць, які ў іх статус, назіраючы, якім чынам да іх ставяцца іншыя ўдзельнікі. Размаўляць не дазваляецца. Удзельнікі расплюшчваюць вочы і спрабуюць сігналамі і жэстамі «растлумачыць» іншым удзельнікам, які статус тыя маюць у грамадстве. (каля 2—5 хвілін) Гульня завершана, калі больш-менш

відаць, што ўдзельнікі прыкладна здагадваюцца пра свой статус. Вядучы просіць усіх, хто думае, што яны належаць да групы 1 па статусе, утварыць групу. Такім жа чынам фарміруюцца і іншыя групы, адпаведна па лічбах. Калі групы склаліся, удзельнікі могуць «зняць» свае статусы-лічбы з ілба і высветліць, памыліліся яны ці не.

- Ці цяжка было высветліць і зразумець, да якога статусу вы належыце?
- Якія сігналы, жэсты, знакі атрымалі тыя, у каго быў самы высокі статус?
- Якія сігналы, жэсты, знакі атрымалі тыя, у каго быў самы нізкі статус?
- Ці так і ў рэальным жыцці: мы атрымліваем сігналы, знакі ў адпаведнасці з тым статусам, які мы маем у грамадстве? Ці можаце вы прывесці прыклады?
- У якіх сітуацыях мы пасылаем сігналы пра высокі статус? Калі вы рабілі гэта ў апошні раз?
- У якіх сітуацыях мы пасылаем сігналы пра нізкі статус? Калі вы рабілі гэта ў апошні раз?

2. Вядучы просіць удзельнікаў разбіцца па парах, якім неабходна абмеркаваць: што вызначае ў грамадстве прыналежнасць людзей да таго ці іншага статусу? Патрэбны прыклады як высокага, так і нізкага статусу (якасці чалавека, матэрыяльны дастатак, прыкметы, прыналежнасці, асаблівасці асобы, прафесія і інш.). (10—15 хвілін)
3. Адказы, ідэі і прапановы ўдзельнікаў запісваюцца вядучым на дошцы або штатыве з адрыўнымі лістамі паперы.

### Абмеркаванне:

- Якім чынам я стаўлюся да людзей, у якіх высокі статус у грамадстве? Чаму гэта так?
- Ці звяртаю я менш увагі ў грамадстве на тых людзей, у якіх нізкі статус? Калі так, то чаму?
- У каго ў грамадстве высокі статут? А ў каго нізкі? Чаму гэта так? (Высокі ці нізкі статус у нашым грамадстве ў інвалідаў, гомасэксуалістаў, прадстаўнікоў рэлігійных меншасцяў?)
- Ці заўсёды высокі статус таго ці іншага чалавека заслужаны ім?
- Ці заўсёды нізкі статус таго ці іншага чалавека заслужаны ім?
- Ці павінны мы замест таго, каб меркаваць пра чалавека па яго статусе, меркаваць пра яго па ягоных справах?
- Ці павінны мы ставіцца з павагай да ўсіх людзей, незалежна ад іх статусу?
- Што мы вынеслі для сябе з дадзенага практыкавання?



У розных культурах статус вызначаюць розныя рэчы. Так, розны статус можа быць у жанчын, дзяцей і пажылых у розных грамадствах. Людзі, у якіх ёсць даволі высокі статус у адной краіне, неабавязкова будуць мець яго ў іншай. Як, напрыклад, з'яўляючыся апазіцыйным палітыкам ва ўласнай краіне, стаць уцекачом у іншай?

### Возьмем пад ўвагу:

Важна заўсёды спрабаваць убачыць людзей за «фасадам». Высокі ці нізкі статус не гаворыць нічога пра чалавека: добры ён ці дрэнны. Менавіта таму ставіцца да ўсіх людзей неабходна з павагай.

### Ідэя для далейшай працы:

Удзельнікі могуць займацца пошукам артыкулаў, кніг, вершаў і фільмаў, якія ілюструюць той факт, што неабавязковай з'яўляецца наяўнасць узаемасувязі паміж статусам чалавека і яго дрэннымі ці добрымі ўчынкамі.

---

72. Элізабэт Айдэ і Ане Хэге Сімпсан «Убачыць свет з іншага боку»/ Elisabeth Eide og Anne Hege Simonsen: Å se verden fra et annet sted, Oslo, Cappelens, 2004 г.

# ТАЛЕРАНТНАСЦЬ

**Тэма:**

Талерантнасць і неталерантнасць.

**Мэта:**

Удзельнікі павінны засвоіць сэнс паняцця «талерантнасць» і абмеркаваць межы талерантнасці.

Вытрымка з Дэкларацыі прынцыпаў талерантнасці ААН:
«Талерантнасць — гэта актыўнае стаўленне, якое фарміруецца на аснове прызнання ўніверсальных правоў і асноўных свабод чалавека, і абавязак спрыяць сцвярджэнню правоў чалавека, плюралізму (у тым ліку культурнага плюралізму), дэмакратыі і правапарадку(...) Краіны-ўдзельніцы абавязуюцца выхоўваць грамадзян, адкрытых да ўспрымання іншых культур, здольных цаніць свабоду, паважаць чалавечую годнасць і індывідуальнасць, папярэджваць канфлікты ці вырашаць іх негвалтоўнымі сродкамі».

**Азначэнне:** слова «талерантнасць» паходзіць ад лацінскага слова *tolerare*, што азначае трываць, прымаць, праяўляць разуменне ці паблажлівасць.

Талерантнасць — гэта гатоўнасць лаяльна ставіцца да «чужога», адрознага ад вашага складу думак, веравызнання, паводзінаў; гэта значыць прызнанне за іншымі людзьмі права на ўласны светапогляд. Патрабаванне талерантнасці падспудна ўтрымліваецца ў «залатым правіле» маральнасці, якое гаворыць: «Чаго ў іншым не любіш, таго сам не рабі». Талерантнасць адрозніваецца імкненнем зразумець пабуджальныя матывы паводзінаў іншых людзей, у тым ліку і тых, што здзяйсняюць маральныя правіны і злачынствы. Аднак гэтая якасць не з’яўляецца тоеснай абыякавасці да зла і злачынстваў, а, наадварот, выяўляе гатоўнасць да дзейснай дапамогі людзям.

Неталерантны чалавек — чалавек несвабодны і да таго ж недасведчаны.

**Практычная рэалізацыя:**

Практыкаванне пачынаецца з дыялогу ў парах, затым падводзяцца вынікі ў групах і праводзіцца агульнае абмеркаванне.

**Час:** 2 гадзіны.
**Што неабходна?** Прасторнае памяшканне, вялікія лісты і маркеры.

**Парадак правядзення:**

1. Удзельнікі дзяляцца на пары і абмяркоўваюць, што азначае для іх слова «талерантнасць». Ім таксама можна прапанаваць абмеркаваць выказванні іншых людзей аб талерантнасці. (5—10 хвілін) Кіраўнік падводзіць вынікі на агульным сходзе і запісвае ключавыя словы на дошцы або планшэце.
2. Кіраўнік вывешвае ліст з двума калонкамі, якія маюць загалоўкі «Талерантнасць» і «Неталерантнасць», і прапануе ўдзельнікам прывесці прыклады як талерантных, так і неталерантных паводзінаў.

**Абмеркаванне:**

- У адносінах да каго і да чаго мы талерантныя?
- Што мы адчуваем, калі праяўляем талерантнасць да чагосьці ці кагосьці?
- Што мы адчуваем, калі да нас саміх праяўляюць талерантнасць?
- У чым розніца паміж талерантнасцю і прыняццем?
- У адносінах да каго і чаго мы можам быць неталерантныя? Чаму мы праяўляем неталерантнасць? Прыклады?
- Што мы адчуваем, калі мы неталерантныя да чагосці ці кагосці?
- Ці былі вы самі ў сітуацыі, калі да вас праяўляюць талерантнасць?
- Калі трэба быць талерантным?
- Ці можна праяўляць неталерантнасць?
- Ці можна навучыцца большай талерантнасці?

**Возьмем пад ўвагу:**

Неталерантнасць можа ўзнікнуць з-за недахопу ведаў пра іншых людзей, культуры і лады жыцця. Неталерантнасць непажаданая, бо стварае адлегласць паміж групамі і можа пасеяць варожасць паміж імі. Каб жыць у міры, неабходна выхоўваць талерантнасць паміж людзьмі і народамі, нягледзячы на адрозненні паміж імі. Аднак не варта талерантна ставіцца да ўсяго. Неталерантнасць можа быць і станоўчай, калі будзе ўсталёўваць межы дзеянняў, якія, напрыклад, парушаюць правы чалавека.

**Варыяцыя:**

1. Вядучы дзеліць усіх удзельнікаў на невялікія групы, якім даецца заданне прадставіць рэлігійныя ці іншыя сацыяльныя меншасці, якія могуць стаць аб’ектамі неталерантнасці. Паспрабуйце знайсці як мага больш матэрыялу пра групы і іх паводзіны. (Прыкладамі груп могуць быць журналісты, бамжы, хрысціянскія фундаменталісты, мусульмане, сатаністы, футбольныя фанаты, рокеры, «готы».) Вы можаце праілюстраваць свае довады малюнкамі, пантамімай, ролевымі гульнямі ці песнямі, прыкладамі традыцый або звычаяў асобных груп. (45 хвілін)

2. Групы прадстаўляюць вынікі сваёй працы на агульным сходзе.

**Абмеркаванне:**

- Што вам спадабалася ў розных меншасцях? Што не спадабалася?
- Ці прасцей праяўляць талерантнасць да меншасцяў, калі даведаешся пра іх больш? Чаму? Чаму не?
- Ці можна часам праяўляць неталерантнасць? Чаму?
- Ці было калі-небудзь так, што я належаў да групы, да якой людзі праяўлялі неталерантнасць? Чаму яны праяўлялі неталерантнасць? Ці было гэта правільна/справядліва?





## ДЭБАТЫ:
## КОЛЬКІ «ІНШАСЦІ» І НЕПАДОБНАСЦІ МЫ МОЖАМ ТРЫВАЦЬ?

**Тэма:**

«Іншыя» і талерантнасць.

**Мэта:**

Удзельнікі павінны навучыцца бачыць межы талерантнасці. Удзельнікі асвойваюць форму вядзення дыскусіі.

Урокі гісторыі паказалі нам, што «іншасць» і непадобнасць нярэдка з'яўляюцца прычынай парушэнняў правоў чалавека. Каб захаваць мір і спакой у грамадстве, неабходна вучыцца талерантна ставіцца да «іншасці» і непадобнасці. Французскі драматург Франсуа Вальтэр сказаў: «Я не згодзен з вашым меркаваннем, але гатовы жыццё аддаць за тое, каб вы змаглі яго выказаць». Можна працягнуць гэтую думку: «Я не разумею тваю непадобнасць, але гатовы жыццё аддаць за тваё права быць такім». Павінны мы заставацца талерантнымі абсалютна да ўсяго ці ёсць нейкія межы? Ці ператворыцца талерантнасць у рэлятывізм? І дзе праходзяць межы?

Толькі тады, калі нам становіцца «балюча», наша талерантнасць сапраўды падвяргаецца выпрабаванню!

**Практычная рэалізацыя:**

Практыкаванне разлічана на арганізацыю і правядзенне дэбатаў. Акрамя непасрэдна дэбатаў, удзельнікам неабходна папрацаваць над тэмамі «Правы чалавека» і «Міжкультурнае ўзаемаразуменне», каб у іх быў адпраўны пункт для выбару тэмы, крыніц інфармацыі, падрыхтоўкі пытанняў і правядзення, у рэшце рэшт, дэбатаў. Кіраўнік таксама павінен быць падрыхтаваны для вядзення дэбатаў. На дэбаты могуць быць запрошаны гледачы (бацькі і інш.).

| | |
|---|---|
| **Час:** | 1,5 гадзіны + 1,5 гадзіны. |
| **Што неабходна?** | Прасторнае памяшканне. |
| **Падрыхтоўка:** | Планаванне і падрыхтоўка — паўтары гадзіны; правядзенне — паўтары гадзіны. |

**Парадак выканання, частка 1:**

1. Падрыхтоўка. (паўтары гадзіны)
   А) Выбар тэмы: вядучы абвяшчае, што групе неабходна папрацаваць над падрыхтоўкай да дэбатаў па тэме «Іншыя». Удзельнікам прыйдзецца самім вызначыць тэму і праблему для абмеркавання. Можна таксама

ўзяць некалькі тэм. (Прыклады тэм: ці павінны гомасэксуальныя пары мець права ўсынаўляць дзяцей? Ці павінны ў мусульманскіх вучняў быць малельныя пакоі ў школе? Ці павінна быць забаронена ў нарвежскай школе малітва перад ежай? Прыклады іншых тэм даступныя ў практыкаванні «Практыкаванне-дыялог».)

Б) Практычнае заданне: неабходна выбраць чатырох удзельнікаў і вядучага дэбатаў. Удзельнікі дэбатаў павінны будуць высветліць, на якіх аспектах яны спыняцца, і падзяліць заданні паміж сабой. Вядучаму трэба падрыхтавацца кіраваць дэбатамі, накіроўваць і рэгуляваць абмеркаванне. Панэлістам неабходна даць дастаткова часу на падрыхтоўку.

В) Запрашэнне: бацькоў і іншых гасцей неабходна запрасіць загадзя. Можна таксама падрыхтаваць афіцыйны ліст-запрашэнне. Магчыма, можна запрасіць таксама вучняў і з іншых класаў?

2. Дэбаты. (паўтары гадзіны)
Вядучы дэбатаў (ці хто-небудзь з удзельнікаў) вітае ўсіх і распавядае пра праграму дэбатаў. Нехта з панэлістаў прадстаўляе тэму і пазначае дылемы, звязаныя з тэмай. (5—10 хвілін) Вядучы абвяшчае пра магчымасць задаваць пытанні з залы. Важна, каб ва ўсіх была магчымасць выказацца. Калі не паступае больш «новых» каментароў ці пытанняў, слова перадаецца наступнаму ўдзельніку ў панэлі. Панэліст выступае тады каля 5 хвілін. Пасля выступу вядучы зноў абвяшчае пра магчымасць задаваць пытанні і рабіць каментары.
Наступныя абагульненыя моманты, датычныя пытанняў талерантнасці да непадобнасці і межаў талерантнасці, павінны быць у тым ці іншым выглядзе асветлены падчас дэбатаў:
   - Гісторыя паказвае, што людзі, якія не мелі тых жа правоў, што былі ў іншых, у выніку дамагаліся раўнапраўя і прызнання з дапамогай ведаў і палітычнай барацьбы (жанчыны, малыя народы, людзі з цёмным колерам скуры, гомасэксуалісты і інш.).
   - Як бы мы адчувалі сябе, калі б мы самі або члены нашых сем’яў былі «іншымі»?
   - Добрым «памочнікам» тут могуць быць правы чалавека: неабходна быць талерантным да «іншасці» і непадобнасці, якія не супярэчаць правам чалавека і не парушаюць іх.

### Возьмем пад ўвагу:

Межы талерантнасці не дадзены нам раз і назаўжды. Яны павінны разглядацца ў час дыскусіі і адкрыта абмяркоўвацца ў грамадстве зноў і зноў. Нам неабходна быць талерантнымі да ўсяго «іншага» і непадобнага, што не супярэчыць і не парушае правоў чалавека.



## МЫ СКЛАДАЕМ УЛАСНУЮ ДЭКЛАРАЦЫЮ АБ МІЖКУЛЬТУРНЫМ УЗАЕМАРАЗУМЕННІ

### Тэма:

Міжкультурнае ўзаемаразуменне.

### Мэта:

Навучэнцы павінны падагульніць свае веды па тэме «Міжкультурнае ўзаемаразуменне».

Шматкультурнасць сучаснага грамадства адлюстроўваецца і ў беларускім грамадстве. Наша паўсядзённасць таксама шматкультурная і будзе працягваць быць такой яшчэ многія гады. У 1948 годзе краіны — удзельніцы ААН выпрацавалі і прынялі Усеагульную дэкларацыю правоў чалавека, якая дае нам, звычайным грамадзянам, правы ў адносінах з дзяржавай, у якой мы жывем. Аднак як мы, людзі, павінны ставіцца адзін да аднаго? Як нам ставіцца да таго, што адрозніваецца ад звычайнага, ад «іншых»? Можа быць, варта стварыць дэкларацыю міжкультурнага ўзаемаразумення?

*Звярніце ўвагу, з чаго складаецца дэкларацыя? Што такое прэамбула? Што такое артыкул? Як выглядае звычайна дэкларацыя?*



Помнік Леніну на фоне каталіцкага і праваслаўнага храмаў. Ашмяны, май 2007 г.

**Практычная рэалізацыя:**

Практыкаванне рэкамендуецца для груп, якія ўжо шмат працавалі па тэме «Правы чалавека» і набылі даволі шмат ведаў у гэтай галіне.

**Час:** 3 гадзіны або 45 хвілін + урачыстае прыняцце дэкларацыі на пазакласным мерапрыемстве.

**Што неабходна?** Прасторнае памяшканне, папера і ручкі.

**Парадак выканання:**

1. Кіраўнік распавядае, з чаго складаецца звычайна дэкларацыя (яе мэта, склад артыкулаў, якія адпавядаюць мэце дэкларацыі). Ён таксама тлумачыць, што задача ўдзельнікаў — скласці сваю ўласную дэкларацыю аб міжкультурным узаемаразуменні, і запрашае затым да абмену ідэямі па дадзенай тэме. Якой будзе мэта такой дэкларацыі? Якімі будуць сродкі яе ўздзеяння? Усе ідэі і прапановы ад удзельнікаў запісваюцца на дошку ці вялікія лісты паперы. Ні адна ідэя не павінна быць праігнаравана. (5—15 хвілін)
2. Вядучы дзеліць удзельнікаў на дзве групы, кожная з якіх атрымлівае заданне. Заданне для першай групы: напісаць уступны тэкст (мэта і задачы дэкларацыі). Заданне для другой групы: сістэматызаваць усе агучаныя прапановы і сфармуляваць артыкулы дэкларацыі. (20 хвілін і больш)
3. Кіраўнік павінен паклапаціцца пра тое, каб першапачатковы пісьмовы варыянт дэкларацыі быў зроблены. Варыянт гэты ў далейшым будзе абмяркоўвацца, выпраўляцца, перш чым ён будзе зацверджаны на пленуме ў той жа дзень.
4. У канцы ўдзельнікі, пажадана ва ўрачыстай атмасферы, у прысутнасці запрошаных і гледачоў, абвяшчаюць, што дэкларацыя распаўсюджвае сваё дзеянне на іх групу/клас ці школу.

**Возьмем пад ўвагу:**

Група можа ганарыцца сваёй працяглай грунтоўнай працай, якая ўвянчалася прыняццем дэкларацыі аб міжкультурным узаемаразуменні. Таксама ім неабходна памятаць, што адных словаў недастаткова, калі яны застаюцца на паперы і не пераходзяць у дзеянні! Поспехаў!





# РАЗДЗЕЛ 6

## Мірнае вырашэнне канфліктаў

*Магчыма, можна жыць у бяспецы і без канфліктаў, але гэта будзе «беднае» жыццё, без нюансаў і глыбіні, і, хутчэй за ўсё, мы памром расчараванымі*[73].

Там, дзе ёсць людзі, заўсёды ёсць канфлікт. Канфлікт — натуральная частка жыцця і мае месца ва ўсіх культурах. Канфлікты ўзнікаюць паміж сваякамі, дзецьмі і бацькамі, суседзямі; у школе і на працоўным месцы. Мы ўсе хоць адзін раз у жыцці былі ўцягнутыя ў канфлікт. Канфлікт можа «сапсаваць» жыццё, становячыся прычынай праблем і цяжкасцяў. Аднак сучасным людзям прыходзіцца спраўляцца не толькі з канфліктамі міжасабовага характару. У той ці іншай ступені ім прыходзіцца «спраўляцца» і з геапалітычнымі, міжнароднымі канфліктамі. Штодня са сродкаў масавай інфармацыі мы чуем і бачым гвалт і забойствы, войны і агрэсію, чалавечае гора і адчай. Важна падумаць над тым, які ўплыў аказвае ўсё гэта на нас. Калі аднойчы на адным з нашых семінараў мы абмяркоўвалі, як мы можам справіцца з цяжкасцямі сучаснага свету, адна дзяўчынка-падлетак сказала: «Што б мы ні рабілі, нічога не дапаможа. Свет усё роўна па дарозе ў пекла!»

Рэпліка дзяўчынкі пра безнадзейнасць свету хутчэй азначае тое, што ў нашым глабальным і тэхнічна развітым свеце не атрымаецца пазбегнуць плыні інфармацыі аб несправядлівасці і галечы на планеце. Многія лічаць, у сваю чаргу, што «клапаціцца» пра праблемы сённяшняга свету і рабіць акцэнт на пакутах людзей — наш абавязак, нават калі гэтыя падзеі адбываюцца далёка ад месца, у якім мы жывем. Бо толькі тады, калі мы будзем звяртаць увагу на праблемы, мы будзем спрабаваць знайсці ім рашэнні. Мы хацелі б падкрэсліць, наколькі важна, распавядаючы пра цяжкасці і праблемы, даваць адначасова надзею і разуменне таго, што ўсё ж магчыма працаваць над дасягненнем пазітыўных зменаў. Інге Айдсвог сказаў аднойчы: «Мы думаем, што самае небяспечнае — гэта апісваць жахі сённяшняга свету без таго, каб адначасова даваць надзею на тое, што нешта ўсё ж можна зрабіць з імі. На «небе» дзяцей таксама часам павінны быць аблокі, але «аблокі магчымасцяў»[74].

Навучаць маладых людзей спосабам вырашэння канфліктаў — значыць даваць ім інструмент для стварэння сваёй уласнай рэчаіснасці. Вышэйзгаданая рэпліка дзяўчынкі — сведчанне таго, што часам мы адчуваем сябе зусім бездапаможнымі, і таго, што ўсё ж пакуты людзей не пакідаюць нас абыякавымі. Навучыцца спраўляцца з канфліктамі — значыць таксама і набыць веру ў сябе, ва ўласныя сілы.

Галоўны пасыл навучання вырашэнню канфліктаў у тым, што канфліктам заўсёды можна «кіраваць», уплываць на зыход канфлікту. Завершыцца ён паспяхова ці не, залежыць ад таго, якім спосабам мы спраўляемся з канфліктам. Калі мы навучымся яго вырашаць канструктыўна, хутчэй за ўсё адчуем, што гэта забірае мноства сіл, але і дае шмат сэнсу ўзамен.



Канфлікты даюць нам магчымасць убачыць і пазнаёміцца з тымі бакамі сваёй асобы, аб існаванні якіх мы раней не ведалі. Канфлікты — адзін з відаў жыццёвых цяжкасцяў, які спрыяе разам з тым уласнаму развіццю і росту. Канфлікты ствараюць трэнне. А трэнне стварае цеплыню. Цеплыня стварае энергію для руху. А любое развіццё патрабуе руху. Таму пазбягаць канфліктаў — значыць пазбягаць самога жыцця[75].

У дадзеным раздзеле спачатку мы разгледзім, што такое канфлікт і многія яго станоўчыя характарыстыкі. Затым мы паразважаем пра элементы канфлікту, яго развіццё. Асабліва падрабязна мы спынімся на двух элементах канфлікту: «кепскай» камунікацыі і моцных пачуццях/эмоцыях. Калі мы навучымся лепш кіраваць сваімі пачуццямі, у нас з'явіцца больш шанцаў паспяхова спраўляцца з канфліктамі. У канцы раздзела мы звернемся да механізмаў вырашэння канфліктаў, паколькі вядома, што канфліктамі можна «кіраваць».

## Што такое канфлікт?

Слова «канфлікт» паходзіць ад лацінскага conflictus, што азначае «сутыкненне». Такому сутыкненню заўсёды папярэднічае тая ці іншая форма ўзаемадзеяння: добраахвотная ці недобраахвотная, запланаваная ці спантаная. З гэтага вынікае, што сувязь і кантакт паміж людзьмі з'яўляюцца неабходнымі ўмовамі для ўзнікнення канфлікту. Можна сказаць, што ў любым узаемадзеянні патэнцыйна закладзена магчымасць канфлікту. Толькі той, хто пазбягае стасункаў з іншымі, можа пазбегнуць канфліктаў, але гэта вельмі высокі кошт. Адна жанчына сфармулявала гэта так: «Жыццё без канфліктаў — гэта жыццё без адносінаў».

У спецыяльнай літаратуры няма адзінага азначэння канфлікту, адносна якога існуе згода. Наступныя азначэнні падкрэсліваюць розныя аспекты гэтага феномена:

*«Канфлікт — гэта сутыкненне інтарэсаў, ацэнак, дзеянняў ці ўстановак». (de Bono, 1986 г.)*

*«У канфлікце заўсёды ёсць дзве мэты. Адна перашкаджае другой, і стаўленне да той мэты, якая перашкаджае, уплывае на чалавека, які мае гэту мэту». (Johan Galtung, 2003 г.)*

*«Канфлікт — гэта моцныя супярэчнасці і нязгоды паміж людзьмі, у якіх задзейнічаны моцныя пачуцці». (Hotvedt, 1997 г.)*

*«Можна казаць пра канфлікт, калі адрозненні паміж людзьмі, якія залежаць адзін ад аднаго, успрымаюцца як несумяшчальныя і пагрозлівыя ў адносінах*

*да ўласных запатрабаванняў і інтарэсаў і калі ўзнікае напружанне і моцныя эмоцыі, таму што адзін з бакоў адчувае, што другі выкарыстоўвае сілу, каб паўплываць на сітуацыю». (Ekeland, 2004 г.)*

*«У агульных рысах канфлікты можна апісаць як працэс, у якім павага да чалавечай годнасці паступова змяншаецца і які прыводзіць да таго, што людзі, якія ўдзельнічаюць у ім, звяртаюцца адзін з адным усё больш як з прадметамі, чым як з людзьмі. Чым сур'ёзней канфлікт, тым больш людзі дазваляюць сабе абыходзіцца адзін з адным як з прадметамі». (Hans Brodal/Leif Nilsson, 1999 г.)*

Гэтыя азначэнні маюць шмат агульных рыс. Па-першае, у кожным з іх гаворыцца аб тым, што ў канфлікце ўдзельнічаюць некалькі бакоў з супрацьлеглымі інтарэсамі або мэтамі[76]. Часта існуюць адносіны залежнасці паміж бакамі і ўзнікаюць моцныя пачуцці і напружанасць. Адно з азначэнняў падкрэслівае, што ёсць адчуванне таго, што выкарыстоўваецца сіла, а апошняе — што канфлікты дынамічныя і знаходзяцца ў развіцці: чым сур'ёзней становіцца канфлікт, тым больш бакі хочуць успрымаць адзін аднаго як прадметы, а не як людзей. Паняцце канфлікту — разнастайнае і ўбірае ў сябе шмат. З разуменнем розных аспектаў нашы ўласныя думкі становяцца глыбей, і мы здольныя зразумець больш.

Канфлікты адбываюцца паміж індывідамі, групамі і дзяржавамі. Яны могуць быць бачнымі — гэта значыць, што ўдзельнікі канфлікту разумеюць, што канфлікты ёсць, і яны ўсплываюць на паверхню. Іншыя канфлікты могуць быць латэнтнымі: гэта значыць, што маюцца перадумовы канфлікту, але бакі адмаўляюцца прызнаваць, што ёсць канфлікт. Некаторыя канфлікты ўзнікаюць хутка і вырашаюцца хутка, у той час як другія развіваюцца з цягам часу і становяцца працяглымі. Для ўзнікнення канфліктаў ёсць шмат прычын. Некаторыя звязаны з тым, што людзі/групы людзей маюць розныя адносіны ці каштоўнасці або рознае разуменне рэчаіснасці, у той час як іншыя звязваюць іх з нязгодамі адносна рэсурсаў і матэрыяльных адносін і з тым, што людзі не могуць задаволіць свае асноўныя патрэбы. Канфлікты могуць быць гвалтоўнымі і негвалтоўнымі.

Адрозніваюць паўсядзённыя канфлікты, якія перажываем мы ўсе, і буйныя міжнародныя канфлікты. У гэтым раздзеле мы сканцэнтруемся найперш на міжасабовых канфліктах. Але паколькі паўсядзённыя канфлікты маюць шмат агульнага з тым, што адбываецца ў свеце, мы адначасова даведаемся шмат і пра гэта. Некаторыя лічаць, што немагчыма вырашыць буйныя міжнародныя праблемы, калі мы спачатку не навучымся вырашаць нашы прыватныя, паўсядзённыя канфлікты.



## Канфлікты — гэта толькі негатыў?

Калі спытаць людзей, што яны звязваюць са словам «канфлікт», большасць адкажа, што ў іх узнікаюць негатыўныя асацыяцыі, такія як сваркі, недружалюбнасць, турбота, трывога, страх і гэтак далей. Гэта натуральна, таму што мы ведаем з вопыту, што канфлікты выклікаюць адмоўныя пачуцці. Калі мы ўцягнуты ў канфлікт, мы знаходзімся ў дрэнным настроі, становімся неспакойнымі і, магчыма, страчваем сон. Многія звязваюць канфлікты таксама з узброенымі сіламі, войнамі, гвалтам, забойствамі, бясчынствам і эксплуатацыяй. Калі сур'ёзныя канфлікты нацыянальнага і міжнароднага ўзроўняў не вырашаюцца мірна, а заканчваюцца масавым гвалтам, гэта адразу ж прыцягвае ўвагу ўсіх сродкаў масавай інфармацыі і ўплывае на нас.

Нягледзячы на тое, што паняцце «канфлікт» выклікае адназначна адмоўныя пачуцці, калі добра падумаць, можна выявіць, што ў канфліктаў ёсць і станоўчыя бакі. Наогул, паўсядзённыя канфлікты проста неабходныя для нашага развіцця як людзей. Калі мы можам іх канструктыўна вырашаць, яны здольны прывесці да станоўчага развіцця індывіда і грамадства. Далей мы разгледзім станоўчыя бакі канфліктаў.

## Станоўчыя бакі канфліктаў

Паколькі мы жывем у сацыяльнай супольнасці, іншыя людзі рэагуюць на тое, якія мы і як мы сябе паводзім. Часам канфлікты могуць узнікаць таму, што дзеянні і меркаванні выклікаюць адмоўныя рэакцыі. Аднак не варта ўстрымлівацца ад выказвання свайго меркавання толькі для таго, каб пазбегнуць канфлікту. Наадварот, важна, каб людзі заяўлялі аб сваіх меркаваннях, каб быць паўнавартаснымі людзьмі.

Калі дзеці растуць, іх ідэнтычнасць фарміруецца праз нязгоду з бацькамі, іншымі дзецьмі ў сям'і і іншымі людзьмі, напрыклад: «Я не хачу ўсё гэта есці» і «Я не хачу гуляць у лялькі — хачу гуляць у футбол!» Так дзеці і падлеткі пазначаюць сваё стаўленне да выклікаў штодзённасці. Праз вербальныя і невербальныя знакі мы выказваем нашы жаданні, меркаванні і патрабаванні, якія могуць прывесці да рознагалоссяў і канфліктаў. Хаця гэта выказванне меркаванняў можа быць непрыемным для кагосьці, важна і нармальна выказваць тое, што вы думаеце. Так мы паказваем іншым, хто мы, атрымліваем зваротнае пацверджанне і выпраўляемся. Такім чынам мы фарміруем сваю ідэнтычнасць.

«…Бо мір — гэта не самае лепшае, але толькі тое, чаго мы хочам»[77].

Лідэры і іншыя значныя дзеячы — гэта людзі, якія вельмі дакладна гавораць, чаго яны хочуць. Людзі, якія рэдка ці ніколі не заяўляюць пра сябе і дазваляюць іншым вырашаць за сябе, рызыкуюць стаць

няўпэўненымі, бясформеннымі, страціць індывідуальнасць. Усім нам знёмы вобраз ціхай, паслухмянай дзяўчынкі, якую «не відаць-не чуваць» так, што яна амаль «зліваецца са сцяной».

Канфлікты «дапамагаюць» сфарміраваць асобу чалавека.

Калі ў людзей ёсць розныя ўяўленні пра адно і тое ж, гэта можа прывесці да канфлікту. Хаця дыскусіі могуць быць вельмі гарачымі, яны ўсё ж могуць прынесці і шмат карысці. Таму што менавіта тады, калі людзі думаюць па-рознаму і маюць розныя пункты гледжання, яны маюць добрую магчымасць атрымаць новыя веды і ўбачыць новыя перспектывы. Немагчыма развівацца без нязгоды і дыскусій. Супярэчнасці — натуральныя, неабходныя, эфектыўныя, нармальныя і канструктыўныя. Крыху знізіўшы нашу залішнюю ўпэўненасць і стаўшы больш утаймаванымі пры сустрэчы з іншымі, мы атрымліваем большыя магчымасці ўзбагаціць сябе і развіцца.

Мы далікатна песцім нашы міфы, і таму наш рост як людзей перажывае застой.

Занадта рэдка мы думаем пра ролю ведаў і асэнсавання для здабывання шчасця і развіцця. Калі індывід прайшоў працэс значнага асобаснага сталення, кажуць, што ён «вырас як чалавек». Гэты выраз азначае, што чалавек атрымаў новыя і важныя веды, якія дазваляць яму больш цаніць жыццё.

> *...Самае галоўнае ў жыцці(...) – гэта (...) здольнасць радавацца простым рэчам. Такім, як дзеці, прырода, дыскусіі з іншымі людзьмі, якія ўзбагачаюць чалавека.*
> *Райульф Стэен*[78].

Змяненне свайго меркавання і адносін да чаго-небудзь можа быць знакам росту і сталення. Калі вы ў апошні раз змянялі сваё меркаванне?

Канфлікты могуць прынесці з сабой новыя веды і стаць крыніцай уласнага росту.

Часта лягчэй за ўсё ўступіць у канфлікт з тымі, хто вам больш за ўсё падабаецца. Такім чынам, канфлікты можна інтэрпрэтаваць як станоўчае выражэнне блізкіх адносін, эмацыйнай прыхільнасці і залежнасці. Менавіта таму, што мы турбуемся пра іншых людзей, мы і хвалюемся, калі яны не падзяляюць наша меркаванне. Зыходзячы з гэтага, зразумела, чаму самыя моцныя канфлікты часта адбываюцца паміж сябрамі, закаханымі, бацькамі і дзецьмі.



Канфлікты могуць дэманстраваць глыбокія адносіны паміж людзьмі.

Яшчэ адзін станоўчы бок канфліктаў заключаецца ў тым, што яны праясняюць уяўленні людзей і груп. Людзі, якія раней не ведалі адзін аднаго, дзякуючы канфлікту могуць устанавіць адносіны адзін з адным на аснове агульных мэтаў і інтарэсаў. Канфлікты, такім чынам, могуць выявіць адрозненні і ўзмацніць ідэнтычнасць груп і людзей. Гэта можа быць станоўчым, але можа мець і адмоўныя наступствы[79].

Канфлікты могуць паслужыць пачаткам новых адносін і новага сяброўства.

Апошні і вельмі важны бок канфліктаў, які мы хацелі б тут прадставіць, у тым, што яны могуць стаць асновай для станоўчага развіцця і прагрэсу як у міжасабовых адносінах, так і на ўзроўні краіны і міжнароднай супольнасці. Канфлікты могуць узнікаць у выніку рэальных цяжкасцяў і складанасцяў і з'яўляцца бачным выражэннем сітуацый, якія неабходна выправіць: трэба разумець характар складанасцяў, перш чым спрабаваць іх пераадольваць. Бо толькі калі малодшы сын ці дачка заявіць пра тое, што з ім/ёй абыходзяцца несправядліва, даючы менш грошай на кішэнныя выдаткі, чым іншым дзецям у сям'і, бацькі могуць нешта змяніць. Канфлікты часта патрэбныя для таго, каб даць новы штуршок развіццю і зменам. Многія дасягненні нацыянальных і міжнародных супольнасцяў з'яўляюцца вынікам канфлікту. Прафсаюзы, якія змагаюцца за больш спрыяльныя ўмовы працы, таксама з'яўляюцца вынікам канфлікту;  вынікам канфлікту з'яўляецца і раўнапраўе жанчын, змаганне за якое ішло ў 70-я гады. Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека (1948 г.) таксама з'яўляецца вынікам самага маштабнага канфлікту ў гісторыі чалавецтва — Другой сусветнай вайны. Зыходзячы з гэтага, канфлікты прама ці ўскосна служаць каталізатарамі пошуку новых рашэнняў і сродкаў.

Канфлікты могуць прывесці да прагрэсу і станоўчых змен у грамадстве.

Вы калі-небудзь задумваліся пра тое, што дэмакратыя — гэта, па сутнасці, адзіны буйны механізм вырашэння канфліктаў? Гэта сістэма вырашэння нязгоды і канфліктаў у грамадстве мірным спосабам. Усе члены грамадства маюць магчымасць сказаць, што яны думаюць, і адстойваць свае інтарэсы.

Як мы паказалі, у канфліктаў ёсць шмат станоўчых бакоў. Яны дапамагаюць людзям сфарміраваць сваю ідэнтычнасць, вядуць да асобаснага росту і развіцця, ствараюць новыя сяброўскія адносіны і сувязі і прыводзяць да станоўчых змен у грамадстве. Таму нам не варта

баяцца канфліктаў. Наадварот, мы маем патрэбу ў іх. Калі мы навучымся вырашаць іх больш эфектыўна, мы зможам атрымаць значна большую карысць з іх станоўчых бакоў і знізіць уздзеянне адмоўных.

Канфлікт заўсёды навучыць чаму-небудзь уцягнутыя ў яго бакі [80].

## У нас ёсць выбар

«У мяне не было выбару. Мне прыйшлося ўдарыць!»

(падлетак 17 гадоў)

Нярэдка ў сувязі з цяжкімі канфліктамі прыходзіцца чуць, што «адно чаплялася за другое, і раптам працэс ужо немагчыма было спыніць». Можа быць складана вырашаць канфлікты, калі яны ўжо пачаліся, — здаецца, што яны сталі жыць сваім уласным жыццём. Хаця зрабіць гэта складана, але ўсё ж магчыма. Самае важнае ў вырашэнні канфліктаў — гэта ўсведамляць, што ў нас наогул заўсёды ёсць выбар. Дзецям, а таксама многім падлеткам і дарослым неўласціва думаць, што ў большасці сітуацый у нас ёсць магчымасць выбару паміж рознымі спосабамі дзеяння і рэагавання. Той факт, што мы ўвесь час робім выбар паміж рознымі спосабамі дзеяння, што ў нас ёсць магчымасць выбраць іншыя альтэрнатывы, — з'яўляецца вельмі важным для нашага развіцця як людзей, гатовых да адказнасці. Замест таго, каб дазволіць канфліктам кіраваць намі, мы можам паспрабаваць кіраваць імі.

Гэтыя альтэрнатывы, як правіла, прысутнічаюць падчас канфлікту:
- паспрабаваць пазбегнуць таго, каб стаць часткай канфлікту;
- паспрабаваць забыць тое, што адбылося;
- дазволіць канфлікту ісці сваім ходам;
- рэагаваць з адмоўнымі эмоцыямі і выкарыстаннем псіхічнага прымусу або фізічнай сілы;
- рэагаваць з выкарыстаннем сілы;
- паспрабаваць вырашыць канфлікт.

Як правіла, толькі апошняя альтэрнатыва прыводзіць да станоўчага развіцця.

У нас ёсць выбар. І мы самі выбіраем, як успрымаць той ці іншы канфлікт.

## Спіраль канфлікту

Часам канфлікты бывае цяжка вырашыць. Гэта выклікана тым, што спрэчныя праблемы маюць для нас неверагодную значнасць, і тым, што ў нас абудзіліся моцныя эмоцыі. Калі мы не можам вырашыць канфлікт на ранняй стадыі, ён будзе развівацца ў негатыўным ключы, утвараючы спіраль канфлікту.

Ведаючы, што канфлікты перажываюць развіццё і маюць розныя стадыі, нам будзе лягчэй зразумець, што мы можам умяшацца, узяць на сябе адказнасць і вырашыць канфлікт. Мы можам папрактыкавацца ў азначэнні дэструктыўных элементаў канфлікту, каб навучыцца бачыць набліжэнне канфлікту. Тады вы яшчэ можаце ўмяшацца і такім чынам кантраляваць канфлікт, а не наадварот. Ніжэй мы прадставім тыповую спіраль канфлікту, якая ўзмацняецца з кожным вітком.

**Нязгода**
У пачатку канфлікту двое ці болей людзей выказваюць нязгоду з нагоды рэсурсаў, каштоўнасцяў або розных меркаванняў і адносін бакоў.

**Аднабаковыя зносіны і палярызацыя**
У другой фазе канфлікту бакі абмяркоўваюць і аргументуюць свае пазіцыі. Кожны бок лічыць, што ён правы, і імкнецца да таго, каб заявіць свае довады. Паколькі бакі не слухаюць адзін аднаго, дыялог не з'яўляецца рэальным, і бакі не чуюць адзін аднаго. Абодва бакі ўспрымаюць сітуацыю як тупіковую, што прыводзіць іх у стан роспачы.

**Моцныя пачуцці нарастаюць**
У сітуацыі, калі іншы бок не слухае і рэальнага дыялогу няма, бакі будуць паўтараць свае аргументы з яшчэ мацнейшымі пачуццямі. На гэтай стадыі бакі могуць раззлавацца адзін на аднаго. Кожны з бакоў можа лічыць, што яго інтарэсы не паважаюць і што да яго ставяцца несправядліва.

**Прыўносяцца элементы, якія не датычаць справы**
На гэтай стадыі больш раннія рознагалоссі і спрэчкі могуць быць узняты зноў, хаця яны ўвогуле ніяк не звязаны з цяперашнім канфліктам. Бакі могуць таксама пачаць абмяркоўваць асобы адзін аднаго замест абмеркавання спрэчнага пытання. Тут з'яўляюцца тыповыя адмоўныя асабістыя характарыстыкі і абагульненні, напрыклад: «Ты зусім безнадзейны», «Ты заўсёды рэагуеш так ірацыянальна», «Проста як тыповы мужчына». Такія элементы, якія не маюць дачынення да справы, могуць толькі пашырыць праблемнае поле канфлікту, узмацніць яго і зрабіць больш цяжкім для вырашэня.

**Дыялог спыняецца**
Канфлікт можа завяршыцца разрывам кантактаў паміж бакамі. Людзі могуць павярнуцца спінай адзін да аднаго і больш не размаўляць. Калі

бакі не маюць стасункаў, сітуацыя застаецца нявырашанай, а таксама знікае аснова для пошуку рашэння. NB: важна разумець, што ў асобных выпадках можа быць правільным рашэнне выйсці з напружанай і вострай канфліктнай сітуацыі, каб не даць ёй перайсці ў фізічную канфрантацыю. Тады можна будзе аднавіць дыялог пазней, калі эмоцыі ўлягуцца.

Спыненне дыялогу — самая вялікая небяспека на шляху вырашэння канфлікту.

**Фізічная канфрантацыя**
Канфлікт таксама можа выліцца ў фізічнае сутыкненне, калі бакі пачынаюць біцца або прымяняць іншыя формы гвалту. Фізічная канфрантацыя — гэта падзея, якая вельмі траўмуе, «замыкае» канфлікт у сабе і робіць яго складаным для вырашэння.

СПІРАЛЬ КАНФЛІКТУ:

- *Нязгода.*
- *Аднабаковая камунікацыя і палярызацыя.*
- *Нарастаюць моцныя пачуцці.*
- *Прыўносяцца элементы, якія не датычаць справы.*
- *Дыялог спыняецца, магчыма фізічная канфрантацыя.*

Апісанне стадый спіралі канфлікту і значэння эмоцый паказвае, што чым даўжэй мы дазваляем канфлікту працягвацца, тым складаней становіцца яго вырашаць. Чым раней мы ўмешваемся для таго, каб вырашыць канфлікт, тым лепш. Часта існуюць два элементы, якія могуць паскорыць і ўзмацніць канфлікт: па-першае, мы не заўсёды можам добра ўсталёўваць зносіны, а па-другое, мы дазваляем эмоцыям лёгка захапіць нас. Такім чынам, для вырашэння канфліктаў трэба навучыцца ўсталёўваць зносіны і кіраваць сваімі эмоцыямі. Акрамя таго, неабходна мець павагу, волю і творчасць.

## Камунікацыя

Самае складанае, але таксама і самае важнае падчас вырашэння канфліктаў — гэта зносіны. Практыкуючыся ў зносінах, мы можам навучыцца лепш вырашаць канфлікты.

У раздзеле, прысвечаным педагагічным аспектам, мы распавядалі пра важныя адрозненні паміж дыскусіяй і дыялогам. У дыскусіях нас хвалюе пытанне пераканання іншага боку.

> *«Большасць людзей уступае ў дыскусію, зыходзячы з перакананні ва ўласнай праваце! Зразумела, так яно і ёсць! Гэта само сабой зразумела! Упэўненасць у праваце і жаданне паўплываць на іншых трывала ўкаранёныя ў нас. Калі іншыя людзі не падзяляюць нашых меркаванняў, мы схільныя рабіць выснову, што яны проста не разумеюць. І мы паўтараем тое ж самае яшчэ раз…»*[81]

Часта дыскусіі могуць прывесці да канфліктаў. Мы лічым, што мы самі правы і што іншыя павінны думаць гэтак жа, як мы. Калі іншы бок такі ж упарты, гэта можа прывесці да канфрантацыі. У адрозненне ад дыскусіі, дыялог адкрывае рэальны абмен меркаваннямі, у якім можна мець зносіны, слухаць і вучыцца адзін у аднаго. Каб лепш вырашаць канфлікты, трэба трэніравацца ў авалоданні мастацтвам весці дыялог.

Умовай добрага дыялогу з'яўляецца разуменне таго, што каштоўнасці і ўспрыманне свету, натуральныя для нас, неабавязкова натуральныя для іншых. Усе людзі розныя. У іх рознае паходжанне і ўзрост, яны выраслі ў розных умовах, маюць розныя каштоўнасці і ўстаноўкі. Калі вы ўсвядомлена ставіцеся да чалавечай разнастайнасці, вам лягчэй будзе спрабаваць зразумець пункт гледжання і каштоўнасці іншага чалавека. Таму ў добрым дыялогу бакі аднолькава занепакоены праявай павагі і волі да разумення адзін аднаго і выказваннем свайго меркавання. Калі мы праяўляем павагу да чалавечай годнасці і патрэбаў іншых, то, верагодна, да вас таксама будуць ставіцца з павагай.

Часам бывае цяжка разумець іншых, таму што яны рэагуюць не так, як мы прызвычаіліся. У такіх сітуацыях нам не варта маралізаваць над пачуццямі іншых людзей: «Ну нельга ж так хвалявацца!», «Не трэба гэтага адчуваць!» Мы, магчыма, не жадаем нічога дрэннага, але на справе недаацэньваем тое, што адчувае іншы чалавек. Важнай умовай для вырашэння канфліктаў з'яўляецца наяўнасць кантакту са сваімі ўласнымі эмоцыямі і прызнанне таго, што эмоцыі і рэакцыі іншых часцей за ўсё не супадаюць з нашымі.

Разуменне і цярпімасць да іншых і іх меркаванняў прадугледжвае, што вы самі як чалавек адчуваеце ўпэўненасць у сабе і разумееце, кім вы з'яўляецеся. Няўпэўненыя людзі не могуць справіцца з адрозненнямі. Наадварот, няўпэўненасць можа стаць фактарам, здольным ператварыць адрозненні ў канфлікт.

> *Дзеці і падлеткі, якія маюць здаровае ўяўленне пра сябе і ўсведамляюць сваё ўспрыманне і ўстаноўкі, не стануць успрымаць адрозныя меркаванні як пагрозлівыя. Яны ўпэўнены ў сабе, у навакольным свеце, і ім цікавыя іншыя людзі, іх ідэі і меркаванні. Мы можам спакойна слухаць довады і сцверджанні іншых, не адчуваючы, што нашым уласным меркаванням або нашай чалавечай годнасці пагражаюць*[82].

Паспрабаваць зразумець іншага чалавека — вельмі важна для прадуктыўнага дыялогу і вырашэння канфлікту.

У канфліктнай сітуацыі важна актыўна слухаць суразмоўцу. Гэта прадугледжвае, што вы не толькі слухаеце словы і прапановы, але і ўлоўліваеце сігналы, якія вам перадае іншы чалавек: мову цела, міміку твару. Часта фізічныя праявы могуць сказаць больш, чым тысяча слоў (моршчанне лба, ноткі ў голасе, блукаючы погляд, поза). Быць актыўным слухачом — значыць аддаваць усю сваю ўвагу цалкам і поўнасцю іншаму чалавеку. Добры слухач глядзіць у вочы суразмоўцу, а цела таксама гаворыць пра ягоную актыўную пазіцыю. Ён таксама задае пытанні, калі не разумее чагосьці.

Не прыкідвайцеся, што ўсё разумееце, калі на самой справе не разумееце. Задавайце пытанні!

Наадварот, дрэнны слухач павернуты целам у накірунку ад суразмоўцы, ён глядзіць кудысьці ўбок, што, верагодна, прыводзіць да таго, што мы хочам хутчэй і карацей выказацца. Мы можам патрэніравацца ў тым, каб стаць добрымі слухачамі. Калі вы пачняце глядзець у вочы лектару або выкладчыку і паказваць, што ўважліва слухаеце, то хутка выявіце, што ён накіруе сваю ўвагу на вас.

У працэсе вырашэння канфлікту вельмі важна выслухаць адзін аднаго.

У сапраўдным дыялогу размаўляць і даносіць сваё меркаванне, каб іншы чалавек зразумеў яго, гэтак жа важна, як і ўмець слухаць. Самае важнае — гэта не тое, што вы кажаце, а тое, што зразумеў ваш суразмоўца. Уся міжасабовая камунікацыя адбываецца на ўмовах слухача. Таму важна казаць ясна і выразна і, як ужо падкрэслівалася, выкарыстоўваць мову цела, якое кажа тое ж, што і вашы словы. Калі вы як слухач адчуваеце, што рухі цела чалавека кажуць не тое, што яго словы, вы не ўспрымеце яго довады.

У канфліктных сітуацыях асабліва важна слухаць іншага чалавека, але якраз тады гэта вельмі складана зрабіць. Нам можа быць цяжка пераадолець уласнае жаданне аргументаваць і гучна заяўляць пра перавагу сваіх ідэй. Калі мы адчуваем, што нас абвінавачваюць, лёгка раззлавацца і дазволіць сваім пачуццям узяць верх. Аднак менавіта на гэтым этапе развіцця канфлікту мы можам выйграць больш за ўсё ад кантролю над сабой. Калі мы зможам перамагчы свае ўласныя патрэбы ў лёгкіх рашэннях, паспрабаваць пазбегнуць адмоўных рыс дыскусій і стварыць умовы для дыялогу, мы можам выйграць вельмі шмат.



Гвалт — гэта часта дыялог, які ніколі не пачынаўся або скончыўся раней, чым трэба.

Калі адзін з бакоў праяўляе стрыманасць і паказвае волю да таго, каб выслухаць іншага, гэта можа паўплываць на іншы бок, і ён пачынае рэагаваць гэтак жа. Калі вы самі атрымалі задавальненне ад магчымасці выказацца, і пры гэтым вас не перабівалі, вам становіцца лягчэй слухаць іншых людзей.

Калі бакі канфлікту праяўляюць павагу і волю да разумення і вядзення рэальнага дыялогу, у іх ёсць самыя важныя ўмовы для вырашэння канфлікту. Падчас стрыманай гутаркі можна ацаніць аргументы ў параўнанні і паспрабаваць знайсці рашэнне, прымальнае для абодвух бакоў.

КАБ МЕЦЬ ЛЕПШЫЯ СТАСУНКІ З ІНШЫМІ,
ТРЭБА ТРЭНІРАВАЦЦА Ў НАСТУПНЫМ:

*Прызнаваць, што не ўсе такія, як вы.*
*Прыслухоўвацца да сваіх пачуццяў і спрабаваць зразумець пачуцці іншых.*
*Слухаць, каб зразумець, што кажуць іншыя.*
*Казаць, каб іншыя зразумелі, чаго вы хочаце.*
*Разумець значэнне мовы цела.*

## Значэнне эмоцый і пачуццяў

Калі мы не можам развіць канструктыўны дыялог у канфліктнай сітуацыі, эмоцыі могуць узмацніцца, а канфлікт — паглыбіцца.

Натуральнай рэакцыяй для людзей з'яўляецца гнеў. Часам мы чуем, што чалавек «так раззлаваўся, што не разумеў, што робіць». Канфлікты прыводзяць да росту ўнутранай напружанасці і фізіялагічных рэакцый цела. Калі мы злуемся, цела актывізуецца ў гатоўнасці да дзеянняў. Мышцы напружваюцца і рыхтуюцца да хуткага руху, сэрца б'ецца мацней, а лёгкія дыхаюць часцей. З-за гэтай фізічнай гатоўнасці да дзеяння можна зрабіць нешта неабдуманае — закрычаць, даць аплявуху, ударыць або ўжыць больш грубую форму гвалту.

Чым больш непрыемным здаецца канфлікт, тым вышэй унутранае напружанне. Умераны ўзровень напружання нават карысны, таму што ён завастрае ўвагу. Высокі ўзровень напружання, наадварот, часта немэтазгодны ў канфлікце, таму што можна лёгка страціць кантроль. Некантралюемы гнеў ніколі не прыводзіць ні да чаго добрага ні для самога чалавека, ні для яго акружэння. Кожны дзень мы чытаем у газетах і бачым па тэлевізары наступствы некантралюемых пачуццяў.

Улічваючы гэта, важна прадумаць, што трэба рабіць, калі ў канфліктных сітуацыях нараджаюцца моцныя пачуцці. Важна

кантраляваць сябе і сваю агрэсію, каб не даць гневу ўзяць верх. Хаця бывае цяжка падрыхтавацца да ўспрымання моцных эмоцый, заўсёды ндрэнна падумаць, што трэба рабіць, калі такія сітуацыі ўзнікнуць. Калі мы лічым, што канфлікты лепш за ўсё вырашаць без дапамогі гвалту, трэба прадумаць альтэрнатыўныя стратэгіі.

## Вырашэнне і ўладжванне канфлікту

Людзі развіваюць сваю асобу ў кантакце і ва ўзаемадзеянні з іншымі людзьмі. Канфлікты з'яўляюцца натуральнай часткай гэтага працэсу. Пытанне ў тым, як людзі вучацца іх вырашаць і ці можна ўспрымаць іх як станоўчыя магчымасці.

Большасць людзей маюць вялікі вопыт вырашэння канфліктаў. Наогул, мы вырашаем канфлікты кожны дзень. Праз перамовы і кампрамісы, даючы і атрымліваючы ў адносінах з навакольнымі людзьмі, мы вырашаем большасць і нашых паўсядзённых праблем. Паколькі мы, як правіла, вырашаем іх на ранняй стадыі, мы пазбягаем самых горшых наступстваў і нават не думаем, што перажываем канфлікт. Цікава ўзгадаць, калі ў нас апошні раз быў канфлікт і як мы яго вырашылі. Што мы зрабілі, каб вырашыць яго? Дапамаглі яго вырашыць нашы паводзіны ці паводзіны іншага чалавека?

Мы ўладжваем канфлікты кожны дзень.

Ніжэй мы разгледзім розныя этапы тыповага працэсу вырашэння канфліктаў. Хаця ўсе канфлікты розныя, многія з іх праходзяць праз гэтыя этапы, перш чым рашэнне будзе знойдзена. Гэта адносіцца ў роўнай ступені да міжнародных канфліктаў і міжасабовых канфліктаў.

**Прызнаць наяўнасць канфлікту**
Добрым пачаткам для вырашэння канфліктаў з'яўляецца прызнанне таго, што канфлікт паміж намі наогул існуе. Адкрыта сказаўшы пра праблему і прызнаўшы яе, мы адначасова паведамляем, што ў нас ёсць воля і жаданне вырашыць яе. Напружанасць можна такім чынам некалькі змякчыць. Прыняцце на сябе ініцыятывы паказвае волю і энергію і з'яўляецца прыкметай сілы, а не слабасці.

**Вызначэнне праблемы**
Важна высветліць і вызначыць, з-за чаго ўзнік канфлікт. Часта гэта праходзіць лёгка, але часам гэта бывае цяжка. Бакі могуць мець нейкія вялікія праблемы, якія адымаюць іх сілы і, магчыма, зніжаюць іх матывацыю для пошуку рашэння. Апісваючы канфлікты, можна звярнуцца да добра вядомага вобраза айсберга. Толькі малая яго частка бачная над вадой, а амаль уся велічэзная груда схавана і служыць толькі пагаршэнню канфлікту. Каб справіцца з канфліктам, важна, каб бакі забылі пра непатрэбныя гісторыі, плёткі і домыслы і сфакусаваліся ўласна на праблеме. Добрае правіла тут — рабіць адрозненне паміж чалавекам і праблемай. Крытыкуйце праблему, а не чалавека.

**Дыялог: праява павагі і разумення становішча іншага чалавека**
Калі бакі прызналі, што знаходзяцца ў канфлікце, наступны крок для іх — гэта пачаць дыялог. Тады неабходна надаваць вялікую ўвагу элементам дыялогу — праяўляць павагу і волю да разумення іншага праз актыўную ўвагу. Уваходзячы ў разуменне канфлікту вачыма іншага, бакі могуць лягчэй прыняць патрэбы і меркаванні іншага. Каштоўнасці і паняцці, якія з'яўляюцца зразумелымі для нас, неабавязкова з'яўляюцца такімі для іншага чалавека.

Весці добры дыялог у працэсе вырашэння канфліктаў патрабуе ад людзей мужнасці. Хаця гэта і складана зрабіць, вельмі важна адсунуць свой гонар убок, магчыма, узяць свае словы назад і папрасіць прабачэння.

**На чым пагадзіліся?**
Як правіла, мы згодны са значна большым колам рэчаў, чым тое, адносна чаго вядзем спрэчку. Гэтыя агульныя каштоўнасці могуць стаць дыяментамі працэсу вырашэння канфліктаў. Такім чынам, можна параіць паспрабаваць ідэнтыфікаваць адносіны, звязаныя з канфліктам, якія бакі падзяляюць. Напрыклад, тое, што абодва бакі маюць блізкія і добрыя адносіны адзін з адным і што праблема, якая абмяркоўваецца, не павінна прыцягваць шмат адмоўнай энергіі, засланяючы сабой самае важнае. Калі мы шчырыя і адважваемся казаць такія рэчы, што многія, на жаль, лічаць цяжкім, то мы вызначым канфлікту адпаведнае месца ў жыцці і створым спрыяльнае асяроддзе для далейшага дыялогу.

**Рашэнні, з якімі я магу пагадзіцца**
Для таго, каб шукаць добрыя рашэнні канфліктаў, абодва бакі павінны прызнаць і прыняць патрэбы адзін аднаго. Бакі далей павінны прызнаць, што не ўсе іх жаданні могуць быць задаволены, але што яны абдумалі, што для іх важней за ўсё і што менш важна. Важна паважаць права іншага чалавека на законныя патрэбы. Часам бывае разумна пайсці насустрач іншаму чалавеку і задаволіць асобныя патрабаванні. Абодва бакі павінны распавесці адзін аднаму пра свае патрэбы і жаданні, даваць і атрымліваць, слухаць і праяўляць разуменне і павагу адзін да аднаго.

Падчас вырашэння канфлікту важна дакладна перадаваць свае думкі і ўважліва слухаць. Можа быць, на самой справе мы згодны адзін з адным?

Калі вы выказваеце свае думкі невыразна, іншы чалавек проста можа вас няправільна зразумець. У выніку можна пагадзіцца «на паверхні», на самой справе не пагаджаючыся адзін з адным.

Лепшыя і самыя даўгавечныя рашэнні — гэта тыя, што паважаюць інтарэсы абодвух бакоў. Часта для пошуку добрых рашэнняў патрабуюцца творчыя здольнасці. Калі вы праявіце творчы падыход, то выйграюць абодва бакі замест таго, каб адзін выйграў, а другі прайграў.

Важна падкрэсліць, што мірнае рашэнне — не заўсёды самае лепшае. Калі кагосьці прымушаюць падпарадкавацца, то гэта, верагодна, дрэннае выйсце. Тады ў аднаго боку больш улады ў сітуацыі, і ён ёю злоўжывае. Калі людзей прымушаюць, прычыны канфлікту застануцца нявырашанымі і могуць справакаваць новыя канфлікты ў будучыні. Таму пажадана знайсці рашэнні, якія ўспрымаюцца як справядлівыя і вытрымаюць і заўтрашні дзень.

СТАДЫІ ВЫРАШЭННЯ КАНФЛІКТУ:

*Прызнаць, што вы знаходзіцеся ў канфлікце.*
*Вызначыць праблему.*
*Уступіць у дыялог і праяўляць павагу да сітуацыі іншага чалавека.*
*Знайсці моманты, па якіх вы згодныя.*
*Знайсці рашэнні, якія задавальняюць інтарэсы абодвух бакоў.*

## Канфлікты і абраза, ужыванне сілы

У працы з дзецьмі і падлеткамі мэтазгодна абмеркаваць суадносіны паміж канфліктам і абразай/ужываннем сілы. Ужыванне сілы можна вызначыць як недапушчальнае дзеянне, якое парушае правы іншага, або ўшчамленне правоў іншага. Злоўжыванне ўладай — гэта яшчэ адно шырока вядомае паняцце. У сітуацыях умяшальніцтва існуюць, як правіла, няроўныя адносіны паміж бакамі, гэта значыць адзін бок мае больш улады, чым другі. Сілавыя дзеянні могуць і не папярэднічаць канфліктам, у той жа час канфлікты неабавязкова могуць прыводзіць да сілавых дзеянняў.

Паколькі важнымі элементамі канфліктаў з'яўляюцца нязгода і моцныя пачуцці, то яны часта могуць заканчвацца абразай/ужываннем сілы. Калі канфлікт прыводзіць да сілавых мер, бакі пераходзяць ад нязгоды па нейкім пытанні да адносін крыўдзіцеля і ахвяры. Адна справа — быць у стане канфлікту, калі абодва бакі адказваюць за працяг стасункаў і спрабуюць знайсці агульнае рашэнне. Зусім іншая справа — абраза/ужыванне сілы. Калі ўжыванне сілы становіцца наступствам канфлікту, то яго будзе цяжэй вырашыць. Прычына канфлікту не здымаецца, і ўжыванне сілы толькі падлівае алей у агонь.

Узаемасувязь паміж канфліктам і абразай/ужываннем сілы важна разумець, каб ведаць, што апошняе ні ў якім разе нельга трываць. Той, у каго ў канкрэтнай сітуацыі больш улады, не павінен злоўжываць ёй, каб фізічна або псіхічна пакрыўдзіць іншага чалавека.

Дзецям і падлеткам трэба распавесці, што калі яны стануць сведкамі ўжывання сілы і самім ім цяжка будзе ўмяшацца, то яны павінны як мага хутчэй паведаміць пра гэта дарослым. Калі дарослыя бачаць сілавое ўздзеянне, то яны абавязкова павінны ўмяшацца і паспрабаваць спыніць гвалт. У сітуацыі сілавога ўздзеяння важна разумець, што адказнасць трэба ўскладаць толькі на крыўдзіцеля. Для ахвяры важна пачуць, што яна не вінаватая.

Прыклад са школы:
Настаўніца, якая дзяжурыла на перапынку ў школе, заўважыла, што адзін вучань ляжыць на зямлі, а на ім сядзіць другі вучань. Навокал стаяла шмат іншых вучняў і глядзела. Калі яна спытала, што адбываецца, абодва адказалі, што яны проста гуляюць. Хаця абодва казалі, што ўсё адбываецца па добрай волі, гэта ўсё ж сітуацыя гвалту, таму што адзін бок відавочна выкарыстоўвае сілу супраць іншага. Зразумела, што той, хто ляжыць на зямлі, адчувае прыкрасць, бездапаможнасць і вымушаны казаць, што ён проста ўдзельнічае ў гульні.
Калі настаўніца ўспрыме сітуацыю як канфлікт, то звернецца да абодвух вучняў і загадае ім спыніцца. Так яна ўскладзе адказнасць на абодвух вучняў, і той, хто ляжыць унізе і на самой справе з'яўляецца нявіннай ахвярай, можа адчуць збянтэжанасць — ён можа падумаць, што часткова вінаваты ў тым, што адбываецца.
Калі настаўніца ўспрыме сітуацыю як напад, то яна ўскладзе адказнасць на таго, хто напаў і сядзіць зверху: «Я не хачу бачыць таго, што ты робіш!» Такім чынам яна дасць выразны сігнал таму, хто напаў, што яго паводзіны непрымальныя, у той жа час ахвяра атрымае сігнал, што ў гэтай сітуацыі яго віны няма.

## Не ўхіляйцеся ад адказнасці!

Калі вырашаць канфлікты канструктыўна, што значыць пераводзіць іх у накірунак дыялогу і растлумачэння праблемы, то яны не толькі будуць зняты, але і створаць новыя ці палепшаць старыя адносіны паміж людзьмі, адкрыюць новыя веды і разуменне. Нам неабавязкова станавіцца сябрамі з усімі людзьмі, але мы можам навучыцца жыць, вучыцца і працаваць разам з людзьмі, у якіх ёсць каштоўнасці і разуменне, адрозныя ад нашых. Калі мы хочам гэтага, то можам навучыцца бачыць цудоўнае ў адрозненнях і станоўчае ва ўзаемадапаўненні людзей на працы, у школе і дома.

Калі мы зразумеем, як шмат мы можам выйграць, не ўхіляючыся ад канфліктаў, а вырашаючы іх з ўсёй адказнасцю і ўмешваючыся ў іх ход на ранняй стадыі, вырашаючы іх канструктыўна, — мы можам атрымаць вельмі шмат асабістых пераваг. Важна бачыць у канфліктах натуральную частку жыцця і разумець, што наша чалавечая годнасць не знаходзіцца ў іх пад пагрозай. Не бойцеся канфліктаў, выкарыстоўвайце іх, нават канфлікты, якія ўзнікаюць у сітуацыі навучання. Вучыцеся бачыць у іх магчымасці!

Шлях да разумення сябе доўгі. Хутчэй за ўсё, яму няма канца.

### Пункты для даклада аб вырашэнні канфліктаў

- Канфлікты — гэта натуральная частка жыцця.
- Канфлікт — гэта складанае паняцце, якое мае шмат азначэнняў. Часта канфлікт — гэта рознагалоссі і супярэчнасць інтарэсаў некалькіх бакоў. Паміж бакамі могуць быць элементы залежнасці, і звычайна ў канфліктах узнікаюць моцныя пачуцці.
- Канфлікты часта асацыююцца з адмоўнымі элементамі і цяжкімі пачуццямі.
- Канфлікты могуць мець шмат станоўчых бакоў:
  - яны дапамагаюць сфарміраваць асобу чалавека;
  - яны вядуць да асобаснага росту і развіцця;
  - яны ствараюць новае сяброўства і сувязі;
  - яны вядуць да прагрэсу і станоўчых змен у міжасабовых адносінах, у нацыянальнай і міжнароднай супольнасці.
- У нас заўсёды ёсць выбар: мы самі можам выбіраць, як будзем паводзіць сябе ў канфліктных сітуацыях.
- Мы вырашаем канфлікты кожны дзень, але не часта задумваемся пра гэта.
- Канфлікт часта нясе ў сабе зародкі негатыўнага развіцця. Пазнаёміўшыся са стадыямі спіралі канфліктаў, мы лягчэй зможам распазнаваць іх адрозненні і спрабаваць кіраваць канфліктам.
- Часта спіраль канфлікту развіваецца адмоўна з-за дрэнных стасункаў і таму, што мы не можам кіраваць сваімі пачуццямі.

СПІРАЛЬ КАНФЛІКТУ МОЖА МЕЦЬ НАСТУПНЫЯ СТАДЫІ:
- рознагалоссе;
- аднабаковая камунікацыя і палярызацыя;
- нарастаюць моцныя пачуцці;
- прыўносяцца моманты, якія не датычаць справы;
- дыялог спыняецца, магчыма фізічная канфрантацыя.

- Для таго, каб лепш вырашаць канфлікты, нам трэба трэніравацца ў зносінах і кіраванні нашымі пачуццямі. Добры дыялог прадугледжвае павагу, спробу паставіць сябе ў сітуацыю іншага чалавека і ўменне слухаць.
- Хаця канфлікты адрозніваюцца адзін ад аднаго, часта яны праходзяць праз наступныя стадыі, перш чым знаходзяць сваё вырашэнне:

СТАДЫІ ВЫРАШЭННЯ КАНФЛІКТУ:
- прызнаць, што вы знаходзіцеся ў канфлікце;
- вызначыць праблему;
- уступіць у дыялог і праяўляць павагу да сітуацыі іншага чалавека;
- знайсці моманты, па якіх вы згодныя;
- знайсці прымальныя рашэнні, якія задавальняюць абодва бакі.

- Канфлікт можа прывесці да сілавога ўмяшальніцтва. Сілавое ўмяшальніцтва — гэта недапушчальная пагарда або ўшчамленне правоў іншага чалавека (злоўжыванне ўладай). Калі вы становіцеся сведкай сілавога ўмяшальніцтва, паспрабуйце спыніць яго самі ці паведаміце пра гэта дарослым.
- Калі вы зразумееце, што знаходзіцеся ў канфлікце, вам неабходна прыняць адказнасць за гэта і паспрабаваць справіцца з гэтым канфліктам. Толькі так вы зможаце знізіць патэнцыйныя негатыўныя магчымасці канфлікту і ўмацаваць станоўчыя. ПРЫМАЙЦЕ НА СЯБЕ АДКАЗНАСЦЬ!

---

73. Валстром, Гуніла «Як вырашаць канфлікты»/ Wahlström, Gunilla O: Konflikthåndtering. Metodebok for pedagoger, ad Notam Gyldendal Oslo 1996 г.
74. Прадмова ў працоўным дапаможніку «Будуйце масты, не сцены» (Нарвежскі Хельсінкскі Камітэт, 1999 г.).
75. Нордхэле, Грэтэ «Разуменне і вырашэнне канфліктаў»/ Nordhelle, Grethe: Mekling. Konfliktforståelse og konflikthåndtering, 2006 г.
76. Можна таксама быць у канфлікце з самім сабой. Аднак гэта тое, што часам называецца дылемай, і гэта не тэма для дадзенага аналізу.
77. З верша Б'ёрнстэрне Б'ёрнсана «Jeg velger meg april!».
78. З інтэрв'ю Райульф Стэена/ Reiulf Steen, A-magasinet 1, 05.01.2007 г.
79. Напрыклад, калі моцнае адчуванне групы, гэта садзейнічае аддаленню ад іншых груп і развіццю адмоўнай дыхатаміі «мы-яны».
80. Ганс Бродал, Ляйф Нільсан «Чаму нас вучаць канфлікты»/ Hans Brodal, Leif Nilsson: Konflikter — hva vil de lære oss? Oslo, Antroposof forlag 1999 г.
81. Валстром, Гуніла «Як вырашаць канфлікты»/ Wahlström, Gunilla: Konflikthåndtering. Metodebok for pedagoger, ad Notam Gyldendal Oslo 1996 г.
82. Там жа, старонка 19.



# Практыкаванні па тэме «Вырашэнне канфліктаў»

# КАНФЛІКТЫ — ЧАСТКА НАШАЙ РЭЧАІСНАСЦІ

**Тэма:**

Паняцце канфлікту.

**Мэта:**

Удзельнікі павінны зразумець, што такое канфлікт.

Канфлікты — гэта частка нашага паўсядзённага жыцця. Некаторыя з іх нязначныя і хутка праходзяць. Мы злуемся, калі нам падаюць на вячэру не тое, што нам падабаецца, ці калі бацькі не даюць нам грошай. У іншых выпадках канфлікты могуць мець настолькі вялікія і сур'ёзныя наступствы, што людзі спыняюць усялякі кантакт адзін з адным. Яны таксама могуць прывесці і да больш трагічных наступстваў: большасць цяжкіх злачынстваў здзяйсняецца людзьмі, якія мелі блізкія адносіны з ахвярамі. Існуюць і міжнародныя канфлікты. Яны прыводзяць да з'яўлення тысяч уцекачоў і вымушаных перасяленцаў, уплываюць на людзей, якія не задзейнічаны непасрэдна ў канфлікты, праз матэрыялы СМІ пра гвалт, тэрор, войны і забойствы. Калі мы знаходзімся ў канфлікце з кім-небудзь, гэта часта закранае ўсе нашы пачуцці і думкі. Канфлікты не абавязкова трэба прадухіляць, таму што мы можам навучыцца ў іх вельмі многаму. Аднак неабходна навучыцца імі кіраваць. Канфлікты могуць адабраць усе нашы сілы. Часам мы губляем кантроль і звяртаемся да вербальнай агрэсіі, фізічнага гвалту ці да таго і другога. Але для таго, каб навучыцца кіраваць канфліктамі, мы павінны даведацца пра іх болей. Мы пачнем з абмеркавання пытання: «Што такое канфлікт?»

**Практычная рэалізацыя:**

Практыкаванне пачынаецца з самастойнай працы-разважання, затым — агульнае абмеркаванне.

**Час:** 30—45 хвілін.
**Што неабходна?** Вялікія лісты і фламастэры.

**Парадак выканання:**

1. Кіраўнік загадзя рыхтуе два вялікія лісты. Загаловак першага — «Што такое канфлікт?», другога — «Уласныя прыклады». Вядучы просіць удзельнікаў падумаць над тым, што такое канфлікт, і даць прыклад канфлікту. (1—3 хвіліны) Кіраўнік пытаецца ва ўсіх удзельнікаў па чарзе, яны распавядаюць пра канфлікт, а ён запісвае ключавыя словы на лісце.
2. Кіраўнік распавядае пра розныя азначэнні канфлікту. Можна даць наступнае азначэнне канфлікту: «Канфлікт — гэта сітуацыя, у якой ёсць нязгода паміж некалькімі адносна роўнымі бакамі, у якой замешаны моцныя пачуцці і ёсць пэўная залежнасць бакоў адзін ад аднаго.» На падставе гэтага азначэння вядучы просіць удзельнікаў абдумаць выбраны імі прыклад і паглядзець, у якой ступені ён адпавядае гэтаму азначэнню. (3 хвіліны)

**Абмеркаванне:**

- Ці было цяжка знайсці прыклад канфлікту, у якім вы самі ўдзельнічалі? Чаму?
- Ці падыходзіў «ваш» канфлікт пад дадзенае азначэнне канфлікту? Чаму?
- Вы згодны з прыведзеным азначэннем канфлікту?
- Ці з'яўляюцца некаторыя канфлікты неабходнымі? Чаму?
- Ці з'яўляюцца некаторыя канфлікты залішнімі? Чаму?
- Вы можаце знайсці прыклады рознагалоссяў, якія не з'яўляюцца канфліктамі? Чаму такое рознагалоссе нельга назваць канфліктам?
- Ці праўда, што мы вырашаем канфлікты кожны дзень?
- Чаму можа быць важна нагадваць нам пра тое, што мы можам вырашаць канфлікты?

**Возьмем пад ўвагу:**

Канфлікты — гэта частка нашага жыцця. Мы ўсе жывем з малымі ці вялікімі канфліктамі. Часам канфлікты настолькі маленькія, што мы нават не лічым іх канфліктамі, таму што мы добра з імі спраўляемся. Мы даем і бяром, вырашаем праблемы, тлумачым, што адбываецца. Толькі тады, калі ў нас не атрымліваецца вырашыць канфлікты, мы разумеем, што гэта канфлікты. Мы маем тады непрыемныя адчуванні, і гэта негатыўна адбіваецца на нашым жыцці. Трэба навучыцца вырашаць іх такім чынам, каб зняць непрыемныя адчуванні. Можа быць, тады мы таксама вырасцем як асобы?

Канфлікт — гэта сутыкненне інтарэсаў, меркаванняў, дзеянняў ці жаданняў.

(Дэ Бано, 1986 г.)

Канфлікт — гэта моцныя супярэчнасці і нязгоды паміж людзьмі, куды ўцягнутыя таксама і моцныя пачуцці.

(Хотведт, 1997 г.)

# КАНФЛІКТЫ — ГЭТА ТОЛЬКІ НЕГАТЫЎ?

**Тэма:**

Канфлікты.

**Мэта:**

Удзельнікі павінны зразумець, што канфлікты могуць мець станоўчыя бакі і несці ў сабе магчымасці для развіцця асобы і грамадства.

Што мы звязваем са словам «канфлікт»? У пераважнай большасці з нас гэтае паняцце выклікае негатыўныя асацыяцыі. Мы звязваем канфлікт з вайной, цяжкасцямі і адсутнасцю згоды — рэчамі, якіх мы больш за ўсё хацелі б пазбегнуць. Калі мы крыху падумаем, то магчыма высветлім, што ў канфліктаў ёсць і станоўчыя бакі. Канфлікты — натуральная частка жыцця. Яны ўзнікаюць, таму што ўсе мы розныя і маем розныя ўяўленні пра рэчы. Так, канфлікты могуць быць выражэннем таго, што мы можам дапаўняць адзін аднаго ў школе, у працоўным і паўсядзённым жыцці. Калі мы зразумеем, што можам выйграць вельмі шмат, спрабуючы вырашаць канфлікты замест таго, каб пазбягаць іх, то мы можам атрымаць шмат асабістых пераваг.

**Практычная рэалізацыя:**

Практыкаванне пачынаецца з індывідуальных пытанняў, за якімі ідзе праца ў парах і тройках і падвядзенне вынікаў на агульным абмеркаванні.

**Час:** 45—60 хвілін.
**Што неабходна?** Дошка або вялікія лісты і фламастэры.

**Парадак выканання:**

1. Вядучы просіць удзельнікаў падумаць, якія эмоцыі ў іх узнікаюць пры слове «канфлікт». Пасля разважання на працягу адной хвіліны ўдзельнікі падводзяць вынікі на агульным абмеркаванні. Дазвольце кожнаму выказацца. Адказы, відавочна, пакажуць, што паняцце «канфлікт» выклікае ў большасці негатыўныя асацыяцыі.
2. Затым вядучы просіць удзельнікаў падумаць, ці ёсць у канфліктаў станоўчыя бакі. Ці ёсць аспекты, якія развіваюць? Ці могуць канфлікты прывесці да чаго-небудзь добрага? Удзельнікі працуюць у групах па двое ці трое і запісваюць пяць станоўчых бакоў канфліктаў. (5 хвілін)
3. Падчас выступаў груп на агульным абмеркаванні вядучы запісвае станоўчыя аспекты на дошцы. Калі не былі названы ўказаныя ніжэй станоўчыя бакі, вядучы называе іх сам. КАНФЛІКТЫ МОГУЦЬ:

- Фарміраваць асобу.
  Канфлікты дапамагаюць сфарміраваць асобу чалавека. Калі дзеці сталеюць, яны развіваюцца праз рознагалоссі і канфлікты з бацькамі, братамі, сёстрамі і іншымі людзьмі: «Я хачу гуляць на вуліцы! Я не хачу да бабулі! Я хачу апрануць жоўтую сукенку, а не зялёную! Не хачу больш гуляць у лялькі! Хачу гуляць у футбол!» Падчас канфлікту мы пазначаем нашы пункты гледжання. Пазначаць сваю ідэнтычнасць нармальна. Так мы хочам паказаць, якімі хочам быць!
- Быць крыніцай асабаснага росту.
  Канфлікты ўзнікаюць, таму што іншыя людзі лічаць не так, як вы. Магчыма, іх меркаванне больш правільнае, чым ваша, таму што ў іх ёсць іншыя веды і вопыт. Калі мы адкрытыя, спакойныя і ўмеем слухаць іншых, мы можам даведацца шмат новых рэчаў і развівацца як індывіды.
- Дэманстраваць моцныя адносіны паміж людзьмі.
  Часта мы злуемся мацней за ўсё на тых, каго больш за ўсіх любім. Калі мы шчырыя  і заяўляем пра сваю нязгоду, мы дэманструем важныя і моцныя адносіны паміж людзьмі.
- Фарміраваць новыя адносіны і сяброўства.
  Індывіды і групы, незнаёмыя адзін з адным, могуць сфарміраваць падчас канфлікту агульныя інтарэсы і сяброўства на доўгі час, якія больш значныя, чым канфлікт. Канфлікты могуць, такім чынам, быць месцам сустрэч і стварэння новых адносін.
- Весці да пазітыўных змен і прагрэсу ў грамадстве.
  Толькі пры перажыванні канфліктаў і праблем могуць узнікнуць новыя рашэнні і спосабы іх вырашаць. Уся наша дэмакратычная прававая дзяржава, па сутнасці, з'яўляецца адзіным буйным механізмам вырашэння канфліктаў. Парламент, урад, суды, незалежная прэса і СМІ, па сутнасці, з'яўляюцца каштоўнасна-нейтральнымі інстытутамі, якія даюць магчымасць людзям і арганізацыям, якія маюць розныя разуменні, выказваць сваё меркаванне. Такім чынам, канфлікт ці рознагалоссе вырашаецца мірным шляхам, знаходзяцца кампрамісы і рашэнні. Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека таксама з'яўляецца вынікам канфлікту, у прыватнасці Другой сусветнай вайны, найбуйнейшага канфлікту мінулага стагоддзя.

**Абмеркаванне:**

- Вы самі калі-небудзь адчувалі, што канфлікты прыносяць нешта станоўчае? Распавядзіце!
- Вы калі-небудзь вучыліся чаму-небудзь у канфлікце? Атрымлівалі новыя веды і вопыт?



**Возьмем пад ўвагу:**

Канфлікты могуць прынесці шмат болю і праблем. Але яны таксама могуць мець і станоўчыя бакі, весці да асобаснага росту, спрыяць новаму сяброўству і адносінам. На ўзроўні грамадства канфлікты прыводзяць да таго, што прымаюцца новыя законы і пастановы, а людзі знаходзяць больш мірныя шляхі суіснавання. Толькі калі праблемы выходзяць на паверхню і выяўляюцца рознагалоссі, людзі пачынаюць шукаць рашэнні. Калі вы, наадварот, будзеце рабіць выгляд, што канфлікты не існуюць, то яны, відавочна, будуць працягваць з'яўляцца рэгулярна. Рэдка яны знікаюць самі па сабе. Важна мець усвядомленае стаўленне да канфліктаў, каб працаваць з імі канструктыўна.

«Ёсць людзі, свабодныя ад супярэчнасцяў. Кітайцы гавораць, што іх называюць трупамі. Жыццё, мэта і супярэчнасць — гэта часткі цэлага».

**«Прадухіленне канфліктаў, недапушчэнне канфліктаў — бессэнсоўна. Прадухіленне гвалту, недапушчэнне гвалту ў вышэйшай ступені мае сэнс».**

**(Ёган Гальтунг, 2003 г.)**



## ДРЭВА КАНФЛІКТУ

**Тэма:**

Прэзентацыя паняцця «канфлікт».

**Мэта:**

Удзельнікі павінны разабрацца, што такое канфлікт і ў чым розніца паміж падставамі для канфлікту і спосабамі выражэння канфлікту.

Слова «канфлікт» паходзіць ад лацінскага conflictus, што азначае «сутыкненне». У штодзённай мове мы звязваем канфлікт з нязгодай, несупадзеннем, супярэчнасцю. Аднак ці задумваемся мы калі-небудзь пра існаванне розніцы паміж прычынамі канфліктаў і спосабамі іх выражэння? Крык і лаянка ў адрас іншага чалавека з'яўляецца не падставай для канфлікту, а яго вынікам. Такія негатыўныя наступствы могуць спрыяць паглыбленню канфлікту. Калі мы навучымся лепш разбірацца ў прычынах, з-за якіх канфлікты ўзнікаюць, і ў спосабах іх выражэння, нам будзе лягчэй уладжваць канфлікты.

**Практычная рэалізацыя:**

Гэта практыкаванне, пры выкананні якога ўсе ўдзельнікі ўключаны ў агульную дыскусію. Вынікам дадзенага практыкавання з'яўляецца стварэнне «Дрэва канфлікту».

**Час:** 30 хвілін.

**Што неабходна?** Вялікія адрыўныя лісты паперы, маркеры.

**Падрыхтоўка:** Кіраўніку трэба загадзя намаляваць контуры дрэва (са ствалом і галінамі, але без лісця) на вялікім лісце паперы. На ствале можна напісаць «канфлікт». Неабходна таксама пакінуць месца для «каранёў дрэва».

**Практычная рэалізацыя:**

1. Вядучы тлумачыць, што на плакаце намалявана «Дрэва канфлікту» і задае наступныя пытанні ўдзельнікам: «Што такое канфлікт? Як праяўляецца канфлікт?» Важна задаць пытанні такім чынам, каб удзельнікі здагадаліся, што вядучы пытаецца пра спосабы выражэння канфліктаў, а не прычыны ці падставы, якія прыводзяць да канфліктаў. Ідэі і адказы ўдзельнікаў неабходна адлюстраваць як лісце на галінах дрэва канфлікту. Прыклады адказаў: бойка, павышэнне голасу, плач, рухі цела/жэсты і інш. (NB: калі хто-небудзь з удзельнікаў назаве насмешкі/высмейванне ў якасці спосабу выражэння канфлікту, важна растлумачыць розніцу паміж канфліктам і абразай.)

2. Вядучы задае пытанне: «Адкуль атрымлівае пажыўныя рэчывы лісце дрэва?» ці што-небудзь падобнае і малюе карані дрэва. Удзельнікі павінны зараз прапанаваць ідэі тых выпадкаў, якія вядуць да канфліктаў. Ідэі ўдзельнікаў запісваюцца «на каранях» дрэва канфлікту. Прыклады адказаў: улада, зайздрасць, рэўнасць, прадузятасці, ранімасць, гонар і інш.
3. Вядучы задае пытанне: «Якая роля восеньскага лісця?» (Яны сілкуюць зямлю; тое, што ўмацоўвае/сілкуе прычыны лісця-канфліктаў.) Калі працягваць дадзеную вось «прычына-вынік», можна прыйсці да наступных высноў: крыўда можа прывесці да павышэння голасу (ліст дрэва), які можа, у сваю чаргу, прывесці да прадузятасцяў (корань дрэва), які, у сваю чаргу, можа прывесці да бойкі (ліст дрэва). Вядучы можа таксама адлюстраваць на дошцы схематычна гэту ўзаемасувязь. Калі дадзеная ўзаемасувязь прадстаўлена ўдзельнікам і больш-менш ім зразумелая, вядучы можа зрабіць заключную выснову, што спосабам вырашэння канфлікту з'яўляецца разрыў дадзенага кола/дадзенай узаемасувязі.

### Возьмем пад ўвагу:

Існуе розніца паміж прычынамі канфліктаў і спосабамі іх выражэня. Часта можна бачыць, што абодва гэтыя элементы — і прычыны, і спосабы выражэння — падмацоўваюць адзін аднаго: канфлікт усё больш і больш паглыбляецца і пачынае жыць «уласным» жыццём. Паспяховае вырашэнне канфлікту заключаецца, такім чынам, ва ўсведамленні ўзаемасувязі, якая ўтварае кола і ўмацоўвае канфлікт, і ва ўменні разарваць гэтае кола.

### «Дрэва кпінаў» і «Дрэва канфлікту»

Можна таксама намаляваць «Дрэва кпінаў» па ўзору «Дрэва канфлікту». Аднак неабходна памятаць пра адну важную рэч: у той час як канфлікт можа быць неабходным, паколькі можа прывесці да станоўчых змен і развіцця, кпіны з'яўляюцца па сваёй сутнасці абразай, г. зн. заўсёды негатыўнай з'явай, з якой неабходна змагацца. Калі «Дрэва кпінаў» створана, можна спытаць ва ўдзельнікаў: ці хочуць яны яго знішчыць?



## КАНФЛІКТ І ЎЖЫВАННЕ СІЛЫ

### Тэма:

Канфлікт і абраза.

### Мэта:

Удзельнікі павінны зразумець розніцу паміж канфліктам і абразай і навучыцца выбіраць правільную тактыку ў абодвух выпадках.

Часам канфліктныя сітуацыі могуць выйсці з-пад нашага кантролю. У такіх сітуацыях мы можам рабіць рэчы, пра якія ў далейшым можам шкадаваць. Мы можам, напрыклад, павышаць голас і нават крычаць на іншых людзей, хаця шчыра і не хочам таго; мы можам нават пачаць ужываць фізічную сілу ў адносінах да іншага чалавека і людзей. У некаторых сітуацыях можна назіраць, што той, хто мацней, злоўжывае сваёй сілай над слабейшым чалавекам. Калі канфлікт пераходзіць у выкарыстанне сілы, можна казаць пра абразу. Але не любая абраза — вынік канфлікту! Часта настаўнікі кажуць пра дзіцячыя канфлікты і на гэтай падставе не ўмешваюцца ў сітуацыю, калі на самой справе гаворка ідзе пра цкаванне, дыскрымінацыю і інш. Вельмі важна ўсведамляць і разумець розніцу паміж канфліктам і абразай. Канфлікт неабавязкова прыводзіць да абраз, але можа падвесці да парушэння, калі канфліктная сітуацыя выйдзе з-пад кантролю ўцягнутых у яе людзей/бакоў. Канфлікт, у адрозненне ад сітуацыі з абразай, неабавязкова спыняць, а лепей уладжваць, аналізаваць і рабіць з яго высновы. Менавіта таму канфлікт можа весці да высвятлення незразумеласцяў, нязгод і, у выніку, да пазітыўнага развіцця.

### Практычная рэалізацыя:

Практыкаванне пачынаецца з таго, што вядучы тлумачыць розніцу паміж абразай і канфліктам. Удзельнікам патрэбна будзе пасля гэтага падрыхтаваць маленькія сцэнкі, якія засноўваюцца на азначэнні дадзеных паняццяў. Сцэнкі неабходна таксама ў далейшым абмеркаваць і дапрацаваць.

**Час:** 35 хвілін (частка1) і 35 хвілін (частка 2).
**Што неабходна?** Вялікія адрыўныя лісты паперы і маркеры; актавая ці спартыўная зала.

### Парадак выканання:

1. Кіраўнік тлумачыць спачатку розніцу паміж канфліктам і абразай. У сітуацыі канфлікту ёсць звычайна два бакі, якія не згодны паміж сабой ці маюць розныя інтарэсы. Таксама паміж бакамі могуць быць

адносіны залежнасці і вельмі часта — моцныя эмоцыі. Абраза — гэта непрыстойныя паводзіны і парушэнне правоў іншага чалавека. У падобных сітуацыях прысутнічае звычайна непрапарцыйнае/няроўнае выкарыстанне сілы ўцягнутых бакоў.

2. Кіраўнік дзеліць удзельнікаў на групы па 5 чалавек у кожнай. Заданне групам — знайсці і апісаць дзве сітуацыі: адну, якая ўказвае і нагадвае канфлікт; другую — сітуацыю, што апісвае абразу (напрыклад, насміханне). Групы таксама могуць выбраць сітуацыі, удзельнікамі ці сведкамі якіх яны былі самі. Удзельнікі павінны паказаць свае сітуацыі ў выглядзе нямой сцэнкі або замалёўкі. (15—20 хвілін)
3. Групы збіраюцца ў зале і паказваюць свае сцэнкі. Астатнія аналізуюць і спрабуюць здагадацца: ідзе размова пра канфлікт ці пра сітуацыю з абразай.
4. Вядучы пытаецца ў груп пра спосабы вырашэння сітуацыі канфлікту і абразы. Удзельнікі могуць абмеркаваць спачатку варыянты адказаў у парах. (2-3 хвіліны) Галоўнае тут тое, што пры спробах вырашэння канфлікту ўцягнутыя бакі павінны размаўляць адзін з адным і спрабаваць знайсці выйсце са становішча; а сітуацыі з абразай павінны перарывацца прыцягненнем да адказнасці таго боку, які злоўжываў сваёй уладай ці сілай.
5. Калі ёсць жаданне прасачыць эфект успрымання канфліктнай сітуацыі як сітуацыі з абразай і наадварот, можна зрабіць наступнае:
   а) група выбірае канфліктную сітуацыю і сітуацыю з абразай;
   б) удзельнікі-«добраахвотнікі» выклікаюцца выпрабаваць розныя спосабы справіцца з дадзенымі сітуацыямі;
   в) удзельнікі сыходзяць на «рэпетыцыю» спосабаў вырашэння сітуацый. «Акцёры» могуць зрабіць тое ж самае;
   г) «акцёры» паказваюць сцэнку з канфліктнай сітуацыяй. «Добраахвотнікі» ўваходзяць у залу і спрабуюць вырашыць сцэну, калі б гэта была сітуацыя з абразай. Пасля гэтага «акцёры» паказваюць сцэнку з абразай, пасля чаго «добраахвотнікі» ўваходзяць у залу і спрабуюць вырашыць сцэну, калі б гэта была канфліктная сітуацыя;
   д) вядучы распытвае «акцёраў», удзельнікаў-добраахвотнікаў і астатніх у групе пра іх адчуванні падчас сцэнак. Добра пры гэтым не спяшацца і выдаткаваць дастаткова часу на дыскусіі і абмен адчуваннямі/меркаваннямі;
   е) удзельнікі-добраахвотнікі (калі ёсць жаданне) могуць падзяліцца сваімі думкамі, як бы яны вырашылі канфлікт і сітуацыю з абразай, не блытаючы дадзеныя паняцці.

### Абмеркаванне:

- Ці былі падобныя рысы ў розных канфліктных сітуацыях?
- Ці былі падобныя рысы ў сітуацыях з абразай?
- Ці былі сцэны, адносна якіх цяжка было вырашыць: канфлікт гэта ці сітуацыя з абразай? Якія прычыны такой складанасці, на ваш погляд?



Бойка школьнікаў у двары школы. Салігорск, люты 2009 г.

### Возьмем пад ўвагу:

Канфлікт і абраза — не адно і тое ж. Абраза з’яўляецца парушэннем правоў чалавека, і яе неабходна спыніць чым раней, тым лепш; у той жа самы час канфлікт не абавязкова спыняць, яго неабходна вырашаць, іншымі словамі — накіроўваць у рэчышча дыялогу, дыскусіі і спробы знаходжання рашэнняў, выхадаў з сітуацыі. Зыходзячы з таго, што ўсе ўцягнутыя ў канфлікт бакі больш ці менш адказныя за сітуацыю, на іх ляжыць адказнасць знайсці шляхі вырашэння канфлікту. У сітуацыі з парушэннем правоў чалавека толькі адзін бок — той, што злоўжывае ўладай ці сілай — павінен панесці пакаранне. У такой сітуацыі важна падкрэсліць для пацярпелага боку, што на ім не ляжыць віна за тое, што здарылася. Канфлікты — натуральная частка нашага жыцця. І калі яны вырашаюцца паспяхова, яны могуць прывесці да пазітыўных змен.

# УМЕЦЬ СЛУХАЦЬ

**Тэма:**

Зносіны.

**Мэта:**

Удзельнікі павінны навучыцца актыўна слухаць акружэнне.

Якія рэакцыі ўзнікаюць у вас адразу пасля таго, як вы распавялі іншаму чалавеку пра свае пачуцці, а ён зусім не разумее тое, што вы кажаце, таму што больш заняты чытаннем SMS-паведамлення, якое толькі што атрымаў? Верагодна, вы будзеце расчараваныя і адчуеце сябе малазначным у вачах свайго сябра. Магчыма, вы яшчэ і раззлуяцеся? Нікому не падабаецца, калі яго ігнаруюць. Але як вы самі ставіцеся да іншых і да іх патрэбы быць пачутым? Магчыма, вы таксама не заўсёды бываеце адкрытым і ўважлівым? Тое, як мы слухаем, паказвае, наколькі мы паважаем адзін аднаго.

## Практычная рэалізацыя:

У гэтым практыкаванні ўдзельнікі працуюць у парах, затым абмяркоўваюць усё разам. Паколькі гэтае практыкаванне нацэлена на выпрацоўку вопыту, падчас яго ўдзельнікі набываюць упэўненасць у зносінах, і таму яно добра падыходзіць у якасці ўводзін да вербальных практыкаванняў.

**Час:** 30 хвілін.
**Што неабходна?** Прасторнае памяшканне.

## Парадак выканання:

1. Удзельнікі дзяляцца на пары (А і В). Кіраўнік дае ім паэтапныя заданні: этап 1, затым этап 2, этап 3 і нарэшце этап 4. Вядучы толькі дае інструкцыі, як рабіць практыкаванне, але нічога не каментуе, пакуль не пройдзены ўсе этапы.
**ЭТАП 1:** А і В размаўляюць на зададзеную тэму (напрыклад, што яны рабілі на мінулым тыдні). А і В гавораць, перабіваючы адзін аднаго, і не думаюць пра тое, што кажа іншы. Адзіная мэта — сказаць чалавеку тое, што вы хочаце. (3 хвіліны)
**ЭТАП 2**: На гэты раз удзельнікі таксама размаўляюць наперабой, але ў той жа час спрабуюць улавіць, што кажа іншы чалавек. Гэтым разам ім даюць іншую тэму (напрыклад, распавесці пра нешта цікавае, што з вамі здарылася). (3 хвіліны)
**ЭТАП 3:** Зараз А і В слухаюць адзін аднаго. А вядзе гаворку на зададзеную тэму (напрыклад, што яго цікавіць). В слухае, ніяк не рэагуючы вербальна і мінімальна рэагуючы невербальна. Праз 2 хвіліны яны мяняюцца. Вядучы просіць А і В пераказаць тое, што распавёў іншы. (2 хвіліны А, 2 хвіліны В. Усяго 6 хвілін)
**ЭТАП 4:** А і В просяць выбраць бок «за» або «супраць». Ім даецца тэма, якую яны абмяркоўваюць наступным чынам: А прапаноўвае меркаванне ці аргумент; спачатку В павінен падсумаваць сказанае, а потым выказаць сваё меркаванне ці аргумент. Затым чарга А, і ён падсумоўвае сказанае В, перш чым даць свой аргумент. Удзельнікам даецца тэма (лепш за ўсё нешта вельмі актуальнае на дадзены момант або для гэтай групы). (4—5 хвілін)

## Абмеркаванне:

- Што вы думаеце пра практыкаванне?
- Ці пазналі вы сябе на этапе 1 або 2?
- Што адбудзецца з намі, калі нас не будуць слухаць?
- Ці падабаецца вам, калі вас слухаюць, не перабіваючы?
- Ці вам спадабалася абмяркоўваць (як на этапе 4)?
- Як вам спадабалася слухаць, калі ваша меркаванне абагульняюць?
- Што мы можам зрабіць, каб навучыцца лепш слухаць?

## Возьмем пад ўвагу:

Цяжка, калі вас не слухаюць, а ў вас ёсць шмат што сказаць. Мы павінны памятаць пра гэта, калі размаўляем з іншымі. Каб навучыцца лепш выбудоўваць стасункі, мы павінны трэніравацца ў размове так, каб іншыя разумелі, што мы гаворым; мы таксама абавязкова павінны навучыцца ўважліва і актыўна слухаць тое, што кажуць іншыя. Калі мы не слухаем, то прапускаем важную інфармацыю, што можа прывесці да канфлікту. Ёсць шмат прыёмаў, якія можна выкарыстоўваць для таго, каб стаць уважлівым слухачом. Можна глядзець на іншага чалавека, ківаць галавой, пераказваць тое, што ён сказаў. Слухаючы актыўна, мы праяўляем павагу, ствараем спрыяльную і дружалюбную атмасферу.

Умець слухаць іншага чалавека — першая прыкмета павагі да яго.

## Як стаць добрым слухачом?

Мы слухаем не толькі пры дапамозе працы нашага мозгу, але і целам (гэтыя парады адносяцца толькі да стасункаў з суразмоўцамі-еўрапейцамі, у іншых культурах выкарыстоўваюцца іншыя знакі):
- Глядзіце ў вочы свайму суразмоўцу.
- Трымайцеся вольна і расслаблена (не складайце рукі на грудзях, не адварочвайцеся).
- Нахіліцеся крыху наперад да таго, хто гаворыць.

Слухайце, пра што распавядаюць:
- Будзьце ўважлівы да тэмы, не толькі да фактаў.
- Будзьце адкрытымі для ўспрымання таго, пра што распавядаецца.
- Аналізуйце і ўзважвайце.

Слухайце, якім чынам вам распавядаюць:
- Невербальныя сігналы (напрыклад: выраз твару, становішча цела).
- Вышыня голасу.

Не рабіце выгляд, што вы разумееце, пра што гаворыцца, калі на самой справе вы не разумееце. Добрым спосабам удакладніць або перапытаць суразмоўцу з'яўляецца пытанне: «Ці правільна я зразумеў, што вы сказалі?..»



# УЗАЕМНЫЯ СТАСУНКІ

**Тэма:**
Дыялог.

**Мэта:**
Удзельнікі павінны разабрацца, якім чынам з'яўляюцца непаразуменні і наколькі важная дакладнасць у выкарыстанні слоў.

Размаўляць адзін з адным — мастацтва. Канфлікт можа ўзнікнуць з-за таго, што хтосьці няправільна зразумеў іншага. Вельмі часта падобных канфліктаў можна было б пазбегнуць. Таму нам неабходна трэніравацца гаварыць выразна і даступна — так, каб іншыя людзі адразу нас разумелі.

**Практычная рэалізацыя:**
Практыкаванне пачынаецца з працы ў парах і заканчваецца агульным абмеркаваннем. Практыкаванне добра падыходзіць для наладжвання даверлівых адносін паміж удзельнікамі.

**Час:** 30 хвілін.
**Што неабходна?** Папера і алоўкі.

**Парадак выканання:**
1. Вядучы дзеліць удзельнікаў на пары, якія садзяцца спіной адзін да аднаго. Адзін удзельнік у пары (А) павінен, атрымаўшы інструкцыю ад другога ўдзельніка ў пары (Б), намаляваць фігуру, што размешчана перад удзельнікам Б. Размаўляць адзін з адным дазваляецца, але не дазваляецца тлумачыць, што азначае тая ці іншая фігура. Той, хто малюе, можа пытацца пра што заўгодна. (5—10 хвілін) Не дазваляецца глядзець на фігуру, пакуль тая не гатова.

**Абмеркаванне:**
- Навошта, па вашым меркаванні, мы рабілі гэтае практыкаванне?
- Якім чынам можна дадзенае практыкаванне «перанесці» на прыклады з рэальнага жыцця?
- Ці траплялі вы калі-небудзь у сітуацыі, калі іншыя не разумелі, пра што вы кажаце? У чым была прычына таго, як вам здаецца?
- Чаму часам бывае цяжка сказаць пра некаторыя рэчы проста і адкрыта?


Чуць адзін аднаго трэба вучыцца.

### Возьмем пад ўвагу:

Часам бывае цяжка быць зразумелым іншымі людзьмі. Асабліва гэта можа быць цяжка, калі суразмоўцы — прадстаўнікі розных культур і незнаёмыя адзін з адным. Магчыма, нам варта было б быць больш уважлівымі ў нашых стасунках з іншымі людзьмі і не пакідаць, такім чынам, месца для разнастайных непаразуменняў? Замест таго, каб раздражняцца, што іншыя цябе не разумеюць, трэба падумаць: ці дастаткова выразна і ясна я выказаўся?



## СТВАРАЕМ РАЗАМ

### Тэма:

Стасункі ў групах.

### Мэта:

Удзельнікі павінны прааналізаваць унутрыгрупавыя стасункі і стасункі паміж групамі пры выкананні таго ці іншага задання.

Працаваць можна па-рознаму сумесна ў групе над выкананнем якога-небудзь задання ці дасягненнем якой-небудзь мэты. Нехта, напэўна, возьме на сябе лідэрства, і калі ў астатніх акажацца дастаткова даверу да «лідэра», мэта, хутчэй за ўсё, будзе дасягнута. Можа стацца і так, што ніхто ў групе не захоча ўзяць на сябе ролю лідэра. І праца тады можа быць больш цяжкай і хаатычнай. Калі стасункі ў групе гарманічныя і члены групы лёгка разумеюць адзін аднаго, то заданне выканаць ім будзе лягчэй і без відавочнага лідэра ў групе. Дынаміка працы ў групе складаецца па-рознаму, паколькі людзі розныя, і групы, такім чынам, утвараюцца розныя. А як працуе ваша група?

### Практычная рэалізацыя:

Для выканання дадзенага практыкавання ўдзельнікі размяшчаюцца па перыметры класа. Вядучы можа знаходзіцца ў цэнтры і назіраць за тым, што адбываецца. Важна, каб удзельнікі адчувалі сябе камфортна: не натыкаліся на сталы і крэслы. Практыкаванне добра падыходзіць для наладжвання даверлівых адносін паміж удзельнікамі.

**Час:** 15 хвілін.
**Што неабходна?** Прасторнае памяшканне, падрыхтаванае для актыўнага перамяшчэння вучняў.

### Парадак выканання:

1. Кіраўнік просіць удзельнікаў стаць у кола, узяцца за рукі і заплюшчыць вочы. Расплюшчваць вочы нельга да таго часу, пакуль вядучы не дазволіць. Размаўляць дазваляецца.
2. Кіраўнік просіць удзельнікаў пабудаваць квадрат і назірае, якім чынам удзельнікі стасуюцца адзін з адным; магчыма, нехта з іх расплюшчыць вочы. Калі ўдзельнікі задаволеныя і думаюць, што яны пабудавалі квадрат, яны могуць расплюшчыць вочы. Далей удзельнікі самі могуць коратка абмеркаваць сваю працу над пабудовай квадрата. Кіраўнік на гэтым этапе пакуль нічога асаблівага не кажа.

3. Кіраўнік просіць удзельнікаў зноў заплюшчыць вочы і пабудаваць трохкутнікі ці нейкую іншую геаметрычную фігуру. Калі ўдзельнікі задаволены працай і думаюць, што яны пабудавалі фігуру, тады яны могуць раплюшчыць вочы.

### Абмеркаванне:

- Як адбываліся стасункі ўнутры групы?
- Што было прычынай таго, што ў групы нешта не атрымалася?
- Ці быў хто-небудзь у групе, хто ўзяў на сябе ролю лідэра? Як да гэтага паставілася група?
- Ці быў нехта, хто застаўся пасіўным да працы групы? У чым прычына гэтага?
- Як было выконваць заданне з заплюшчанымі вачыма? Ці было непрыемна або ненадзейна?
- Якія пачуцці былі ў вас, калі вам прыйшлося выступаць як асобна ўзятаму члену групы? Ці было дастаткова ўпэўненасці ў сабе?

### Возьмем пад ўвагу:

Мы паспрабавалі зрабіць практыкаванне з вамі, дзе кожны ўдзельнік адыграў сваю ролю для дасягнення выніку. Падобная праца можа нагадваць сітуацыю канфлікту, паколькі ў яе ўцягнуты шмат бакоў. Мы навучыліся зараз таму, што патрэбны добрыя стасункі паміж удзельнікамі, калі мэта ва ўсіх — дамагчыся дадзенага выніку, г. зн. выканання задання. У некаторых выпадках становіцца неабходнай наяўнасць «лідэра», які сачыў бы за тым, каб ва ўсіх у групе была магчымасць выказацца. Бо чым больш агучаных ідэй, тым большая верагоднасць выбару лепшага рашэння. Калі камунікацыя аказваецца не самай лепшай пры выкананні падобнага задання, верагоднасць прыйсці не да самага лепшага рашэння становіцца даволі вялікай. Таму важна ўцягванне ў працу як мага большай колькасці ўдзельнікаў і абмеркаванне як мага большай колькасці ідэй — шляхоў выхаду або варыянтаў выканання задання.



## КРЭСЛЫ

### Тэма:

Супрацоўніцтва.

### Мэта:

Удзельнікі павінны навучыцца супрацоўнічаць з мэтай уладжвання канфліктаў і пераканацца ў тым, што фантазія і творчасць адыгрываюць вялікую ролю ва ўладжванні канфліктаў.

Канфлікт узнікае часта з-за рознай манеры людзей рабіць штосьці, з-за розных запатрабаванняў і інтарэсаў і з-за недастаткова добрай камунікацыі. Як нам вырашыць тую ці іншую праблему без таго, каб не павышаць голас і не крычаць адзін на аднаго ці, больш за тое, звяртацца да ўжывання фізічнай сілы? Цікава назіраць, як у таго ці іншага чалавека атрымліваецца ўзаемадзейнічаць з іншымі людзьмі. Ці робіць пры гэтым які-небудзь уплыў паходжанне чалавека і яго прыналежнасць да той ці іншай культуры? Дазваляе чалавек кіраваць сабой ці аддае перавагу таму, каб кіраваць самому? Ці правакуе яго тое, што іншыя не прыслухоўваюцца да яго меркавання? Якая рэакцыя ў чалавека на тое, што іншыя хочуць зрабіць нешта па-іншаму? Незалежна ад таго, якім чынам мы ўсе паводзім сябе, мы, хутчэй за ўсё, выявім, што камунікацыя паміж людзьмі — залог знаходжання аптымальных рашэнняў і выхадаў з цяжкіх сітуацый.

### Практычная рэалізацыя:

Гэта практыкаванне прысвечана працэсу камунікацыі і аспектам мірнага вырашэння канфліктаў. Практыкаванне добра падыходзіць для ўсталявання даверлівых адносін паміж удзельнікамі.

**Час:** 35 хвілін.
**Што неабходна?** Памяшканне без сталоў, але з крэсламі для ўсіх удзельнікаў.
**Падрыхтоўка:** Копіі трох розных інструкцый (гл. ніжэй). Кожны від інструкцый раздаецца кожнай трэцяй частцы ўдзельнікаў.

### Парадак выканання:

1. Кожны ўдзельнік атрымлівае ад кіраўніка запіску, якую ён не павінен паказваць іншым удзельнікам, і інструкцыю (А, Б ці В). Відаў раздадзеных інструкцый павінна быць роўная колькасць. Кіраўніку таксама неабходна растлумачыць мэту гульні, перш чым крэслы пачнуць расстаўляцца ў памяшканні.

Інструкцыя А: пастаўце ўсе крэслы колам. У вас ёсць на гэта 10 хвілін.
Інструкцыя Б: пастаўце ўсе крэслы бліжэй да дзвярэй. У вас ёсць на гэта 10 хвілін.
Інструкцыя В: пастаўце ўсе крэслы бліжэй да акна. У вас ёсць на гэта 10 хвілін.

2. Кіраўнік просіць удзельнікаў прытрымлівацца атрыманых інструкцый. Інструкцыі не могуць быць выкананы без таго, каб ўдзельнікі, якія атрымалі аднолькавыя інструкцыі, не супрацоўнічалі. Магчымы наступныя варыянты супрацоўніцтва:
   - Крэслы могуць быць пастаўлены колам такім чынам, што яны «закранаюць» і дзверы, і акно.
   - Крэслы могуць быць пастаўлены па чарзе: спачатку — колам, затым — бліжэй да дзвярэй і нарэшце — бліжэй да акна.
   - Не зусім абавязкова прытрымлівацца інструкцыі і можна паставіць 1/3 крэслаў колам, 1/3 крэслаў каля дзвярэй і 1/3 каля акна.
   - Змяніць сітуацыю, паклаўшы два лісты паперы ў цэнтры пакоя з надпісамі: «дзверы» і «акно».
   - Наогул не прытрымлівацца інструкцыі.

   Дадзенае практыкаванне дае вялікія магчымасці для творчасці. Звычайна групы пачынаюць выкананне інструкцый актыўна, дзесьці з ужываннем сілы: пераносяць крэслы, на якіх іншыя адчайна спрабуюць уседзець. У той час, як адны ўдзельнікі пачынаюць спрабаваць супрацоўнічаць, іншыя — усё яшчэ спрабуюць сабраць і ўтрымаць сабраныя крэслы. Звычайна гэта расчароўвае тых, хто ўжо «саспеў» да супрацоўніцтва. Хтосьці з іх можа махнуць на ўсё рукой. Можа быць і так, што ўдзельнікі не размаўляюць адзін з адным, паколькі могуць думаць, што гэта не дазволена. Хаця вядучы нічога аб гэтым не казаў.
3. Кіраўнік абвяшчае пра заканчэнне практыкавання, калі адчувае, што праца больш-менш завершана.

### Абмеркаванне:

- Якія ў вас адчуванні ад дадзенага практыкавання?
- Ці адчувалі вы, што крэсла, на якім вы сядзелі, было ваша, і вы маглі рабіць з ім што хацелі?
- Як вы ўспрынялі тое, што іншыя ўдзельнікі хацелі іншага — не таго, чаго хацелі вы? Ці настроены вы былі на супрацоўніцтва ў такіх выпадках, ці спрабавалі пераканаць іншага ўдзельніка, аргументаваць словамі або, можа быць, «кулакамі», ці, можа быць, зусім здаліся?
- У выпадку, калі ўдзельнікі не перагаворваліся адзін з адным: чаму вы не размаўлялі адзін з адным?
- Калі вам прыйшлося папракаць ці пераконваць іншых удзельнікаў, як вы гэта рабілі?
- Ці прытрымліваліся вы інструкцый? Як вы думаеце, чаму вы вытлумачылі інструкцыю так і не іначай? Ці разглядалі вы інструкцыю як абавязковую да выканання, нягледзячы на тое, колькі высілкаў на гэта спатрэбілася? Што спрыяла такому разуменню, на ваш погляд?
- Якую ролю ў разуменні і следаванні інструкцыі адыграла ваша прыналежнасць да той ці іншай культуры, калі наогул адыграла?
- Што б вы зрабілі па-іншаму, калі б прыйшлося гуляць яшчэ раз?
- Ці можаце спраецыраваць тое, што здарылася пры выкананні дадзенага практыкавання, на сітуацыю з рэальнага жыцця?
- Якія адносіны гэта практыкаванне мае да мірнага вырашэння канфліктаў, на ваш погляд?

### Возьмем пад ўвагу:

Часам пры спробах вырашэння канфліктаў важна выкарыстоўваць сваю фантазію і думаць нетрадыцыйна. Працэс вырашэння канфліктаў становіцца тады цікавай і творчай працай. Мы пераканаліся ў тым, што неабходна супрацоўніцтва і стасункі для выканання таго ці іншага задання, для дасягнення агульнай мэты; і што важнай з'яўляецца пры гэтым камунікацыя ў вытрыманых танах. У вялікіх групах таксама можа быць неабходнай прысутнасць «лідэра», роля якога — забяспечыць кожнаму члену групы магчымасць выказаць сваё меркаванне. Бо чым больш будзе ідэй і меркаванняў, тым большая верагоднасць знаходжання кампрамісу і аптымальнага рашэння. Калі выкананне задання відавочна вядзе да негатыўных наступстваў для групы, разумна, магчыма, такое выкананне прыпыніць? Ці вырашыць не прытрымлівацца слепа атрыманых інструкцый? Можа, трэба пры гэтым спытаць сябе: навошта я раблю гэта і чаму менавіта такім спосабам? Часта мы выкарыстоўваем даволі традыцыйныя метады вырашэння той ці іншай праблемы. А што калі падумаць нетрадыцыйна?

## Не заўсёды трэба слепа прытрымлівацца інструкцый.

## Інструкцыя А

| | |
|---|---|
| Пастаўце ўсе крэслы колам.<br>У вас ёсць на гэта 10 хвілін. | Пастаўце ўсе крэслы колам.<br>У вас ёсць на гэта 10 хвілін. |
| Пастаўце ўсе крэслы колам.<br>У вас ёсць на гэта 10 хвілін. | Пастаўце ўсе крэслы колам.<br>У вас ёсць на гэта 10 хвілін. |
| Пастаўце ўсе крэслы колам.<br>У вас ёсць на гэта 10 хвілін. | Пастаўце ўсе крэслы колам.<br>У вас ёсць на гэта 10 хвілін. |
| Пастаўце ўсе крэслы колам.<br>У вас ёсць на гэта 10 хвілін. | Пастаўце ўсе крэслы колам.<br>У вас ёсць на гэта 10 хвілін. |
| Пастаўце ўсе крэслы колам.<br>У вас ёсць на гэта 10 хвілін. | Пастаўце ўсе крэслы колам.<br>вас ёсць на гэта 10 хвілін. |
| Пастаўце ўсе крэслы колам.<br>У вас ёсць на гэта 10 хвілін. | Пастаўце ўсе крэслы колам.<br>У вас ёсць на гэта 10 хвілін. |

## Інструкцыя Б

| | |
|---|---|
| Пастаўце ўсе крэслы бліжэй да дзвярэй.<br>У вас ёсць на гэта 10 хвілін. | Пастаўце ўсе крэслы бліжэй да дзвярэй.<br>У вас ёсць на гэта 10 хвілін. |
| Пастаўце ўсе крэслы бліжэй да дзвярэй.<br>У вас ёсць на гэта 10 хвілін. | Пастаўце ўсе крэслы бліжэй да дзвярэй.<br>У вас ёсць на гэта 10 хвілін. |
| Пастаўце ўсе крэслы бліжэй да дзвярэй.<br>У вас ёсць на гэта 10 хвілін. | Пастаўце ўсе крэслы бліжэй да дзвярэй.<br>У вас ёсць на гэта 10 хвілін. |
| Пастаўце ўсе крэслы бліжэй да дзвярэй.<br>У вас ёсць на гэта 10 хвілін. | Пастаўце ўсе крэслы бліжэй да дзвярэй.<br>У вас ёсць на гэта 10 хвілін. |
| Пастаўце ўсе крэслы бліжэй да дзвярэй.<br>У вас ёсць на гэта 10 хвілін. | Пастаўце ўсе крэслы бліжэй да дзвярэй.<br>У вас ёсць на гэта 10 хвілін. |
| Пастаўце ўсе крэслы бліжэй да дзвярэй.<br>У вас ёсць на гэта 10 хвілін. | Пастаўце ўсе крэслы бліжэй да дзвярэй.<br>У вас ёсць на гэта 10 хвілін. |



## Інструкцыя В

| | |
|---|---|
| Пастаўце ўсе крэслы бліжэй да акна.<br>У вас ёсць на гэта 10 хвілін. | Пастаўце ўсе крэслы бліжэй да акна.<br>У вас ёсць на гэта 10 хвілін. |
| Пастаўце ўсе крэслы бліжэй да акна.<br>У вас ёсць на гэта 10 хвілін. | Пастаўце ўсе крэслы бліжэй да акна.<br>У вас ёсць на гэта 10 хвілін. |
| Пастаўце ўсе крэслы бліжэй да акна.<br>У вас ёсць на гэта 10 хвілін. | Пастаўце ўсе крэслы бліжэй да акна.<br>У вас ёсць на гэта 10 хвілін. |
| Пастаўце ўсе крэслы бліжэй да акна.<br>У вас ёсць на гэта 10 хвілін. | Пастаўце ўсе крэслы бліжэй да акна.<br>У вас ёсць на гэта 10 хвілін. |
| Пастаўце ўсе крэслы бліжэй да акна.<br>У вас ёсць на гэта 10 хвілін. | Пастаўце ўсе крэслы бліжэй да акна.<br>У вас ёсць на гэта 10 хвілін. |
| Пастаўце ўсе крэслы бліжэй да акна.<br>У вас ёсць на гэта 10 хвілін. | Пастаўце ўсе крэслы бліжэй да акна.<br>У вас ёсць на гэта 10 хвілін. |

## ЧЫРВОНЫ СЦЯЖОК

### Тэма:

Усведамленне сваіх уласных рэакцый.

### Мэта:

Удзельнікі павінны навучыцца кантраляваць свае пачуцці.

Наша рэакцыя на тую ці іншую сітуацыю звязана з асаблівасцямі нашай асобы і з тым, як, па нашым меркаванні, нас успрымаюць навакольныя людзі. У сітуацыях, падобных адна на адну, мы і паводзім сябе аднолькава. Аднак можа быць вельмі карысна абдумваць і аналізаваць кожную асобную сітуацыю. Бываюць і такія сітуацыі, якія выклікаюць у нас абуранасць і злосць. У нас, напрыклад, можа выклікаць абуранасць сітуацыя, у якой мы бачым відавочную несправядлівасць у адносінах да таго ці іншага чалавека. Бываюць сітуацыі нязначныя і малаважныя, але якія выклікаюць буру эмоцый з нашага боку. У любым выпадку адказнасць за нашы рэакцыі ляжыць заўсёды на нас: ці гэта рэакцыя, заснаваная на нашых перакананнях, ці спантанная, на падставе таго, што ў нас дрэнны настрой.

### Практычная рэалізацыя:

У дадзеным практыкаванні ўдзельнікі думаюць і разважаюць спачатку самі, каб потым сустрэцца на гутарцы адзін з адным у пары ці ў невялікіх групах. Калі няма магчымасці выдаткаваць шмат часу на выкананне практыкавання, можна апусціць ролевую гульню (пункты 2 і 3) і перайсці адразу да абмеркавання.

**Час:** 35 хвілін.
**Што неабходна?** Ручкі.
**Падрыхтоўка:** Удзельнікам раздаюцца лісты паперы з надпісам «Чырвоны сцяжок» і ручкі.

### Парадак выканання:

1. Вядучы раздае кожнаму ўдзельніку копіі ліста паперы «Чырвоны сцяжок» і просіць адказаць на яго пытанні. (5—10 хвілін)
2. Пасля таго, як удзельнікі адказалі на пытанні, яны сустракаюцца ў парах і распавядаюць адзін аднаму пра свае адказы. Кожны ўдзельнік вырашае сам, колькі ён хоча распавесці суразмоўцу. Вядучы просіць затым удзельнікаў выбраць адно пачуццё з адказаў, пра якое яны хацелі б зрабіць ролевую гульню. Калі нехта з удзельнікаў кажа «здаюся» ці «надакучыла», паколькі іншы выкарыстоўвае доўгія і незразумелыя словы, то той, іншы можа іграць ролю, заснаваную на манеры размаўляць доўгімі і незразумелымі словамі. Суразмоўца іграе ролю — рэакцыю «здаюся».
3. Пары іграюць свае ролевыя гульні ў невялікіх групах і просяць астатніх здагадацца, пра які «чырвоны сцяжок» ідзе размова ў дадзенай сцэны. (10 хвілін)

### Абмеркаванне:

- Што новага вы даведаліся пра самога сябе пры выкананні дадзенага практыкавання?
- Якім чынам нам можа дапамагчы тое, што мы будзем загадзя гатовы да нашай рэакцыі на тую ці іншую сітуацыю?
- У чым перавага бачыць, на што рэагуюць іншыя ўдзельнікі?

### Возьмем пад ўвагу:

Можа быць вельмі карысным загадзя падумаць пра ўласныя рэакцыі на тую ці іншую сітуацыю. Гэта можа таксама падштурхнуць нас да «новых» думак пра нас саміх і неабходнасць змяніць тыя ці іншыя рысы ўласнага характару. У любым выпадку, падобнае асэнсаванне і аналіз уласных рэакцый могуць адыграць станоўчую ролю, калі мы сутыкнемся з падобнай сітуацыяй у наступны раз.

### Чырвоны сцяжок

| | |
|---|---|
| Якія людзі ці сітуацыі выклікаюць у ва мне злосць і абуранасць? | Якія людзі ці сітуацыі выклікаюць ва мне страх і боязь? |
| Якія паводзіны, падзеі, словы прымушаюць мяне здацца і стаць пасіўным? | Якія сітуацыі, людзі, рэчы выклікаюць у ва мне раздражненне? |
| Што робіць мяне неспакойным? | Якія сітуацыі, людзі, рэчы выклікаюць у ва мне адчай і расчараванне? |

# ЧАТЫРЫ ПРЫСТУПКІ РАЗ'ЮШАНАСЦІ

### Тэма:

Усведамленне ўласных рэакцый і пачуццяў.

### Мэта:

Удзельнікі павінны прааналізаваць, што ляжыць у аснове пачуцця страху і раз'юшанасці.

Пачуцці раз'юшанасці і страху з'яўляюцца вельмі часта двума бакамі аднаго медаля. І цікава, і неабходна разабрацца, што ж ляжыць у аснове раз'юшанасці і злосці. Магчыма, мы даведаемся штосьці новае пра нас саміх пры гэтым? Дадзенае практыкаванне — магчымасць выявіць некаторыя абражаныя пачуцці, патрэбы і страхі, якія ляжаць у аснове злосці і раз'юшанасці, якія мы зведваем. Калі мы разбяромся ў прычынах і вытоках гэтых пачуццяў, мы можам паспрабаваць справіцца з імі, калі паўстане такая неабходнасць, а не ісці ў іх на павадку.

### Практычная рэалізацыя:

У дадзеным практыкаванні кожнаму ўдзельніку трэба будзе запісаць некалькі сказаў, якія паслужаць затым асновай для агульнай дыскусіі.

**Час:** 30 хвілін.
**Што неабходна?** Папера і ручкі.
**Падрыхтоўка:** Чысты ліст паперы — кожнаму ўдзельніку.

### Парадак выканання:

1. *Першы этап:*
   Вядучы просіць удзельнікаў запісаць па аднаму сказу, які апісваў бы сітуацыю, у якой яны былі па-сапраўднаму злыя і сярдзітыя. Прыклад: «Я раззлаваўся, калі маю ідэю адносна працы ў групах праігнаравалі». (3 хвіліны)
2. *Другі этап:*
   Вядучы тлумачыць, што пачуццё пакрыўджасці вельмі часта ляжаць у аснове раз'юшанасці, і просіць удзельнікаў напісаць па сказу — прыкладу сітуацый, якія могуць выклікаць прыступы раз'юшанасці. Прыклад: «Я пакрыўдзіўся, паколькі ў мяне стварылася ўражанне, што ніхто не ўспрыняў маю ідэю сур'ёзна». (3 хвіліны)
3. *Трэці этап:*
   Прычынай нашых крыўд з'яўляецца часта незадаволенасць нашых жаданняў і чаканняў. Вядучы просіць удзельнікаў напісаць па сказу, які апісвае тыя ці іншыя жаданні і чаканні ў тых ці іншых сітуацыях. Прыклад: «У мяне была патрэба прызнання і таго, каб мяне заўважылі іншыя». (3 хвіліны)
4. *Чацвёрты этап:*
   Вядучы тлумачыць, што ў дадатак да жаданняў і патрэбаў сваю ролю адыгрывае яшчэ і страх, і просіць удзельнікаў падумаць, якія страхі і боязі могуць паслужыць прычынамі раз'юшанасці і злосці, і запісаць па аднаму сказу пра гэта. Прыклад: «Я баюся, што не даб'юся павагі да сабе ад сваіх аднакласнікаў». (3 хвіліны)
5. Калі ўдзельнікі групы добра ведаюць адзін аднаго і давяраюць адзін аднаму, можна зрабіць наступнае: удзельнікі разбіваюцца па парах і «давяраюць» адзін аднаму свае напісаныя сказы. Калі хтосьці з удзельнікаў лічыць, што практыкаванне было складаным для выканання, партнёр у пары можа ў такім разе дапамагчы іншаму ўдзельніку выказаць свае пачуцці. (10 хвілін)

### Абмеркаванне:

- Чаму неабходна аналізаваць прычыны і пачуцці, якія вядуць да прыступаў раз'юшанасці і злосці?
- Якім чынам такі аналіз можа дапамагчы людзям (напрыклад, у канфліктных сітуацыях)?

### Возьмем пад ўвагу:

Аналізуючы і задумваючыся пра тое, якія пачуцці ляжаць у аснове нашых прыступаў раз'юшанасці, злосці або раздражнення, можна адкрыць для сябе «новыя», нечаканыя бакі ўласнага характару. Калі мы ведаем, што прыступы агрэсіі маюць сувязь з пачуццём уласнай непаўнавартаснасці і няўпэўненасці ў сабе, з-за якіх хутчэй за ўсё мы і зведваем пачуццё страху і крыўды, можна зразумець, што раз'юшанасць і злосць — далёка не выхад са становішча. Тым больш што і з іншымі людзьмі сітуацыя прыкладна такая ж. Магчыма, іншыя людзі, так як і мы самі, жадаюць прызнання? Можа, спрабаваць захоўваць спакой, выслухаць іншых, паказаць павагу — лепшая рэакцыя?

## ПРАЯВЫ ГНЕВУ

**Тэма:**

Усведамленне ўласных рэакцый і пачуццяў.

**Мэта:**

Удзельнікі павінны навучыцца аналізаваць і кантраляваць свой гнеў.

Гнеў — гэта натуральная чалавечая рэакцыя. Аднак важна валодаць сабой, каб гнеў не пачаў кіраваць вамі. Часам мы чуем, што нехта «так раззлаваўся, што не разумеў, што робіць». Некантралюемы гнеў ніколі не прыводзіць ні да чаго добрага ні для вас, ні для вашага асяроддзя. Таму важна ўмець кантраляваць сваю агрэсію. Але што ж на самой справе адбываецца з нашым целам, калі мы злуемся?

**Практычная рэалізацыя:**

Практыкаванне пачынаецца з ролевай гульні і працягваецца працай з пытаннямі для абдумвання і агульным абмеркаваннем.

**Час:** 45—60 хвілін.

**Што неабходна?** Прасторны пакой, дзе можна свабодна рухацца.

**Парадак выканання:**

1. Падзяліцеся на невялікія групы. Групам даецца заданне прайграць сітуацыю, у якой адзін ці некалькі ўдзельнікаў пачынаюць злавацца ці даюць выхад гневу. Сэнс у тым, каб раз’юшанасць ці адмоўныя пачуцці вышлі вонкі і сталі бачнымі. (10—15 хвілін)
2. Пасля таго, як групы выступілі са сцэнкамі на агульным сходзе, усе разам абагульняюць і абмяркоўваюць наступныя пытанні:
   - Як вам гулялася?
   - Што адчуваў той, хто праяўляў гнеў? Што адчувалі астатнія?
   - Што прыводзіць вас у раз’юшанасць больш за ўсё?
3. Вядучы задае пытанне: «Што адбываецца з намі, калі мы злуемся?» Папрасіце ўдзельнікаў узгадаць свой уласны вопыт і ўражанні і дайце ім слова. Потым вядучы коратка распавядае пра тое, што адбываецца: цела рыхтуецца да фізічнага напружання, мышцы напружваюцца і рыхтуюцца да хуткай рэакцыі. Сэрца б’ецца мацней і мацней, дыханне пачашчаецца. З-за гэтай фізічнай падрыхтоўкі да дзеяння можна зрабіць нешта занадта неабдуманае: закрычаць, не кантралюючы сябе, ударыць, даць аплявуху, ужыць больш жорсткую форму гвалту.
   Па прычыне фізічнай рэакцыі, якую актывізуе гнеў, можа быць важным даць выхад напружанню цела такім чынам, каб гэта не адбілася на здароўі. Аднак важна даць выхад напружанню ў тым накірунку, у якім мы самі гэтага хочам. Калі мы хочам вырашаць канфлікты без ужывання гвалту, нам варта загадзя прадумаць, у які бок мы накіруем рэакцыю цела.
4. Падзяліце ўдзельнікаў на тыя ж групы, што і раней. Яны працуюць з той жа сітуацыяй, што і ў пункце 1, але зараз спрабуюць знайсці спосаб адрэагаваць на яе, прычым такі, які не звязаны з кантраляваным выйсцем эмоцый ці гвалтам. Якія маюцца альтэрнатывы? (10—15 хвілін)
   Калі ў вас застаўся час і ўдзельнікі хочуць гэтага, можна прайграць сітуацыі яшчэ раз, але зараз ужо так, каб сітуацыя вырашалася канструктыўна і гнеў быў уціхамірaны. (10—20 хвілін)
5. Групы прадстаўляюць вынікі на агульным абмеркаванні.

**Возьмем пад ўвагу:**

Праявы гневу выклікаюць фізічныя рэакцыі ў целе, таму людзі будуць рэагаваць і дзейнічаць хутчэй, чым «трэба». Часта кажуць: «Спачатку зрабіў, а потым падумаў», калі чалавек зробіць нешта неабдумана, і звычайна гэта цягне за сабой негатыўныя наступствы. Важна ўсведамляць гэтыя механізмы, каб мы маглі працаваць над валоданнем сабой і кантролем над эмоцыямі. Магчыма, мы здольны знайсці нейкія альтэрнатыўныя стратэгіі? Ці можна знайсці канструктыўныя рашэнні? Часта дапамагае, калі мы пагаворым адзін з адным спакойна і перавядзем канфлікт у кантраляванае рэчышча перш, чым ён пачне развівацца. Можа быць, палічыць да дзесяці? Ці проста сысці і вярнуцца, калі ўсё крыху супакоіцца?

## «НАПАД» І «АДСТУПЛЕННЕ»

**Тэма:**

«Знаёмства» з уласнымі пачуццямі і рэакцыямі.

**Мэта:**

Удзельнікі павінны навучыцца аналізаваць і кантраляваць свае рэакцыі і пачуцці.

Часта тое, што мы кажам, падмацавана рухамі нашага цела і жэстамі. Калі мы, напрыклад, трымаемся ўпэўнена, тады тое, пра што мы кажам, успрымаецца больш сур'ёзна. Калі ж, наадварот, нашы рухі цела і жэсты ў абарончай пазіцыі, хутчэй за ўсё, мы не будзем успрымацца іншымі людзьмі як упэўненыя ў тым, пра што гаворым. Упэўненыя ў сабе паводзіны паказваюць, што мы знаходзімся «ў балансе» з самім сабой і не нахіляемся целам наперад, нібыта «атакуючы», або назад, нібыта «абараняючыся». Нягледзячы на тое, што многія нашы спрэчкі застаюцца ў славеснай форме і не пераходзяць ва ўжыванне фізічнай сілы, тыя ці іншыя жэсты і рухі цела могуць паказваць, «абараняецца» чалавек ці «нападае». Дадзенае практыкаванне можа дапамагчы распазнаваць сігналы цела пры спрэчках і рэагаваць, як вынік, не аўтаматычна, а больш-менш абдумана.

Ніхто не можа ясна думаць са сціснутымі кулакамі.

**Практычная рэалізацыя:**

Практыкаванне пачынаецца з запаўнення ўдзельнікамі схемы і працягваецца абменам ідэямі і меркаваннямі, абмеркаваннямі ў групах, ролевай гульнёй і агульным абмеркаваннем.

**Час:** 1,5 гадзіны.
**Што неабходна?** Ручкі, вялікія адрыўныя лісты паперы, маркеры.
**Падрыхтоўка:** Удзельнікам раздаюцца копіі схемы «Як часта я паступаю...» і ручка.
Ёсць дзве схемы на выбар; другая больш падыходзіць для ўдзельнікаў малодшага ўзросту.

**Парадак выканання:**

1. Вядучы просіць удзельнікаў запоўніць схему «Як часта я паступаю...» (5 хвілін)
2. Вядучы тлумачыць розніцу паміж паводзінамі, якія нагадваюць «напад», і паводзінамі, што нагадваюць «адступленне» (паміж пагрозай помсты і «здаюся»), і просіць удзельнікаў адзначыць для сябе, які тып паводзін яны выбіраюць часцей. Іншымі словамі, больш ва ўдзельнікаў крыжыкаў у верхняй частцы схемы (паводзіны атакі) ці ў ніжняй (абарончыя)?
3. Вядучы прапануе ўдзельнікам даць свае асацыяцыі і тлумачэнні словам «атака» і «адступленне». (1 хвіліна) Адказы і прапановы трэба запісаць на двух вялікіх лістах паперы (але выкарыстоўваючы толькі верхнюю палову ліста): адзін ліст — «Напад», другі — «Адступленне». Прыклады ідэй, якія могуць прапанаваць удзельнікі: «напад» — наступальна, агрэсіўна, ясна і дакладна; «адступленне» — асцярожна, абачліва і інш.
4. Зараз больш-менш зразумела, якія дзеянні і рэакцыі адносяцца да якога паняцця. Вядучы просіць удзельнікаў назваць адну прычыну: як бы яны паявілі сабе: «нападаючы» ці «ўхіляючыся», і запісвае іх адказы на вялікім лісце паперы пад загалоўкам «Чаму?»
5. Кіраўнік просіць некалькіх удзельнікаў падумаць, якім чынам такія рэакцыі могуць праяўляцца. Што ўдзельнікі казалі б і як і якім чынам выяўлялі б гэта сваім целам? Вядучы запісвае адказы ўдзельнікаў на вялікім лісце паперы пад загалоўкам «Як?».
6. Вядучы просіць удзельнікаў падумаць пра адно слова ці сказ, якія яны выкарыстоўваюць, калі «нападаюць» або «адступаюць», у залежнасці ад таго, што ім часцей прыходзіцца рабіць. Прыкладам паводзін ухілення можа быць фраза: «Нічога страшнага», пры якой чалавек яшчэ рухае плячом і адварочваецца.
7. Вядучы просіць удзельнікаў паказаць свае прыклады (па жаданні). Неабходна яшчэ раз падкрэсліць, што вынікам слоў становяцца звычайна і рухі цела чалавека. Так, можна прапанаваць удзельнікам вымавіць фразу «Нічога страшнага», пры гэтым плячом не ведучы і трымаючы погляд на суразмоўцы. Магчыма, удзельнік выявіць для сябе пачуццё, што пры такой паставе хочацца якраз сказаць не «нічога страшнага», а штосьці-небудзь супрацьлеглае.
8. Удзельнікі разбіваюцца на групы па тры чалавекі ў кожнай. Цяпер усе члены групы могуць «прадэманстраваць» свае прыклады астатнім у групе. Удзельнікі могуць каментаваць і прапаноўваць варыянты змены пазіцый цела і жэстаў для таго, каб манера гаварыць была больш упэўненай, больш з нападзеннем, чым уступкай. (10 хвілін)

**Абмеркаванне:**

- Што дапамагае нам распазнаць і, можа быць, нават прадбачыць паводзіны і рэакцыі іншых?
- Што звычайна ўказвае на тое, што мы паводзім сябе няўпэўнена?
- Ці могуць быць разумнымі паводзіны — «напад» і чаму?
- Ці могуць быць разумнымі паводзіны — «адступленне» і чаму?




- Якім чынам мы можам змяніць тыя ці іншыя нашы рэакцыі і навучыць сябе «новым» рэакцыям?
- Што адчуваецца, калі мы змяняем манеру трымаць сябе і жэсты?

### Возьмем пад ўвагу:

Манера трымаць сябе і жэсты важныя для таго, што мы хочам сказаць. Калі мы не ўпэўнены ў сабе і паказваем гэта нашай манерай трымаць сябе, гэта паўплывае і на тое, як будзе ўспрынята інфармацыя, што зыходзіць ад нас. Такім чынам, распазнаванне манеры гаварыць і трымаць сябе зіншымі людзьмі, плюс славесныя і фізічныя «знакі» дапамогуць нам убачыць і правільна зразумець, што маецца на ўвазе і што адбываецца. Калі такія ж «знакі» мы навучымся адрозніваць і ў саміх сабе, мы зможам больш дакладна прадбачыць уласную рэакцыю ў той ці іншай сітуацыі. Такім чынам, у нас будзе магчымасць зразумець, адпаведная гэта рэакцыя ці не. Мы можам таксама працаваць над развіццём у сабе больш упэўненай манеры трымацца і размаўляць, якая стане альтэрнатывай няўпэўненым і агрэсіўным дзеянням.



### Як часта я пастулаю падобным чынам, аказваючыся ў сітуацыі канфлікту?

| Паводзіны/ рэакцыя | Рэдка | Часам | Часта |
|---|---|---|---|
| Пачынаю надакучаць «крыўдзіцелю» | | | |
| Крычу | | | |
| Перабіваю | | | |
| Выбухаю | | | |
| Папярэджваю («Калі ты гэта не зробіш....!») | | | |
| Выпраўляю («Паглядзі на факты!») | | | |
| Настойваю на сваім («Я маю рацыю!») | | | |
| Крыўджу іншага («Ты — смешны!») | | | |
| Станаўлюся саркастычным | | | |
| Пагражаю помстай («Я табе яшчэ задам!») | | | |
| Замыкаюся ў сабе | | | |
| Змаўкаю | | | |
| Адыгрываюся на іншым чалавеку | | | |
| Заяўляю, што гэта несправядліва ў адносінах да мяне | | | |
| Зласлоўлю за спіной чалавека | | | |
| Спрабую забыць пра праблему | | | |
| Адчуваю сябе кепска | | | |
| Баюся пакрыўдзіць іншых | | | |
| Упадаю ў дэпрэсію | | | |
| Застаюся ветлівым, але ўнутры мяне ўсё кіпіць | | | |

**Як часта я паступаю падобным чынам, аказваючыся ў сітуацыі канфлікту?**
(добра падыходзіць для ўдзельнікаў малодшага ўзросту)

| Паводзіны/ рэакцыя | Рэдка | Часам | Часта |
|---|---|---|---|
| Пачынаю надакучаць «крыўдзіцелю» | | | |
| Пачынаю біцца | | | |
| Перабіваю | | | |
| Выбухаю | | | |
| Пагражаю | | | |
| Кажу: «Я усё роўна маю рацыю!» | | | |
| Крыўджу іншага | | | |
| Адпускаю злосныя жарты | | | |
| Пагражаю помстай | | | |
| Змаўкаю | | | |
| Адыгрываюся на іншым чалавеку | | | |
| Сыходжу | | | |
| Кажу, што са мной паступаюць несправядліва | | | |
| Кажу за спіной чалавека | | | |
| Спрабую забыць пра праблему | | | |
| Адчуваю сябе кепска | | | |
| Мне становіцца крыўдна | | | |
| Застаюся ветлівым, але ўнутры мяне ўсё кіпіць | | | |



# ПЕРАГАВОРШЧЫК

**Тэма:**
Задавальненне сваіх патрэб і жаданняў канструктыўным спосабам.

**Мэта:**
Удзельнікі павінны навучыцца задавальняць свае патрэбы і жаданні, захоўваючы адначасова добрыя адносіны з іншымі.

Часам мы аказваемся ў канфліктных сітуацыях нават з тымі людзьмі, якія нам вельмі блізкія і з якімі ў нас звычайна добрыя адносіны. У такіх сітуацыях мы аказваемся перад дылемай: адмовіцца нам ад сваіх інтарэсаў і жаданняў на карысць захавання добрых адносін ці настойваць на сваім, але з рызыкай сапсаваць адносіны? Падобную дылему вырашыць звычайна нялёгка. Але ці настолькі яна складаная, як здаецца?

**Практычная рэалізацыя:**
У дадзеным практыкаванні выкарыстоўваюцца элементы тэатра, якія могуць выклікаць смех і стварыць добрую атмасферу. Аднак гэта залежыць ад таго, наколькі група творчая. Вядучаму неабходна падкрэсліць, што героі А і Б хацелі б захаваць добрыя адносіны і пасля выканання практыкавання.

**Час:** 45 хвілін.
**Што неабходна?** Прасторнае памяшканне і дастаткова крэслаў для ўдзельнікаў.

**Парадак выканання:**

1. Кіраўнік дзеліць удзельнікаў на групы максімум па шэсць чалавек у кожнай і тлумачыць, што адзін член групы (А) будзе сядзець на крэсле. Другі член (Б) павінен паспрабаваць завалодаць крэслам А шляхам перамоў. Ва ўдзельніка А няма асаблівага жадання аддаваць сваё крэсла, але і адносіны з Б ён сапсаваць не хоча. Гульня можа працякаць як заўгодна, на выбар удзельнікаў. Адзіная ўмова — у А і Б павінны быць добрыя адносіны паміж сабой, якія яны хацелі б захаваць і ў далейшым. Вырашаць адносна тактыкі дзеянняў можа ўдзельнік Б. Пасля таго, як у Б атрымаецца завалодаць крэслам ў выніку перамоў з удзельнікам А, у перагаворнай дзейнасці можа паспрабаваць сябе іншы член групы. Удзельніку Б дазволена атрымліваць дапамогу ў выглядзе парадаў і ідэй ад «назіральнікаў» — астатніх членаў групы. Гульня працягваецца да таго часу, пакуль усе шэсць членаў груп не пабывалі ў ролі Б.

### Абмеркаванне:

- Якія сітуацыі былі прыдуманымі?
- Што атрымалася? Што не атрымалася?
- Пасля таго, як у Б атрымалася завалодаць крэслам, ці засталіся адносіны паміж А і Б такімі ж добрымі, як і ў пачатку?
- Сімвалам чаго можа выступаць у дадзенай гульні крэсла? Адказы ў груп, хутчэй за ўсё, будуць рознымі. У малодшай групе яны могуць, напрыклад, быць такімі: «Крэсла — сімвал таго, што дзеці хочуць атрымаць ад бацькоў (напрыклад, паездка на канікулах ці рэч у падарунак), але што нялёгка ад іх атрымаць».

### Возьмем пад ўвагу:

Часам у нас узнікаюць жаданні або патрэбы, якіх складана дасягнуць, паколькі мы адчуваем, што іншыя людзі нібыта «стаяць на шляху». У некаторых выпадках гэтыя людзі могуць быць нам вельмі блізкімі, якіх мы любім і паважаем або з якімі мы хацелі б завязаць ці падтрымліваць добрыя адносіны. Для таго, каб пазбегнуць канфліктаў ці няёмкіх сітуацый у такіх выпадках, няблага патраціць дастаткова шмат часу і сіл на гутаркі і аргументацыю той ці іншай справы. Магчыма, можна знайсці такое рашэнне, якое задаволіла б усе бакі? Ёсць такі выраз, як сустрэцца на паўдарозе, які мае на ўвазе, што калі мы саступім крыху ў сваіх жаданнях/ перакананнях, другі бок, хутчэй за ўсё, зробіць тое ж самае.

### Варыяцыя:

**ПЕРАГАВОРШЧЫК II**

Перагаворшчык II — больш складаны варыянт дадзенага практыкавання і таму лепш падыходзіць для ўдзельнікаў больш старэйшага ўзросту.

*Парадак выканання:*

1. Вядучы тлумачыць удзельнікам, што выкананне дадзенага практыкавання будуецца на гульні двух герояў. Удзельнік А просіць удзельніка Б пажыць у яго дома некалькі дзён. Абодва ўдзельнікі знаходзяцца ў блізкіх (роднасных ці сяброўскіх) адносінах. Удзельнік Б загадзя ведае, што А застанецца хутчэй за ўсё ў яго даўжэй, чым той кажа, і што А чакае гасціннасці ад Б. Удзельнік А не спяшаецца пры гэтым раскашэльвацца, а просіць Б павесці яго туды і сюды, узяць з сабой туды і сюды. Удзельніку Б не вельмі хочацца «звязвацца» з А, ды і часу асабліва няма. Аднак, магчыма, ёсць нешта такое ў А, што Б вельмі паважае? Як А, так і Б вельмі моцна хацелі б захаваць добрыя ўзаемаадносіны, паколькі, калі адносіны іх сапсуюцца, гэта будзе мець наступствы не толькі для іх дваіх, але і для іншых людзей.



2. Вядучы дзеліць удзельнікаў на групы, па 3—4 чалавекі ў кожнай. Кожнаму ўдзельніку ў групах неабходна пабываць або ў ролі А, або — Б. Калі ёсць час, можна паспрабаваць адыграць абедзве ролі. Тыя, хто не гуляе, могуць назіраць, якім чынам будзе знойдзены выхад з сітуацыі і ці ёсць пры гэтым якія-небудзь негатыўныя моманты.

*Абмеркаванне:*

- Што атрымалася добра ў гульні?
- Што атрымалася не вельмі добра?
- Пасля таго, як А і Б прыйшлі да рашэння, сапсаваліся паміж імі адносіны ці засталіся такімі ж добрымі, як і раней?
- Ці можаце вы прывесці прыклады іншых сітуацый, падобных да гэтай?

## ЧАРГА

**Тэма:**

Развіццё канфліктнай сітуацыі.

**Мэта:**

Удзельнікі павінны разгледзець канфлікт у стадыі кульмінацыі і магчымасць прадухілення татальнага ўзмацнення канфлікту.

Часам бывае цяжка казаць пра пачуцці, якія мы зведваем. Таксама гэта можа быць цяжка зрабіць для нас, калі мы перажываем той ці іншы канфлікт. Аднак калі не паспрабаваць выказаць тое, што цяжка, можна толькі пагоршыць праблему, ды і пачуццяў не стане ад гэтага менш. У выніку з нашымі пачуццямі можа адбыцца «выбух», і мы больш не будзем у сілах іх кантраляваць. Пачуцці тады возьмуць верх над намі, і наступіць кульмінацыя канфліктнай сітуацыі, якую мы і «перадаем» іншым. Другі раз іншыя людзі могуць таксама «выбухнуць», і тады ўжо наша чарга «здзіўляцца», бо мы мы не падазравалі пра праблему. Чым раней у нас атрымаецца разабрацца з негатыўнымі пачуццямі, тым больш застаецца шанцаў, што канфлікт не разрасцецца ў нешта большае. Таму ў сітуацыі развіцця канфлікту ў нас ёсць некалькі магчымасцяў выбару. Калі зробім правільны выбар, пазбегнем самых негатыўных наступстваў.

Як я магу ведаць, як табе, калі ты не распавядаеш мне пра гэта?

**Практычная рэалізацыя:**

Гэта цікавае і забаўнае практыкаванне, выконваючы якое ўдзельнікі могуць сядзець на падлозе.

**Час:** 45 хвілін.
**Што неабходна?** Прасторнае памяшканне.

**Парадак выканання:**

1. Вядучы запрашае двух добраахвотнікаў з удзельнікаў (А і Б).
2. Усе разам пагаджаюцца адносна якога-небудзь канфлікту, у які ўцягнуты два чалавекі, і абмяркоўваюць магчымае развіццё (кульмінацыю) дадзенага канфлікту. Прыкладам кульмінацыі можа быць, напрыклад, ужыванне сілы (удары, збіццё). Група таксама дае іншыя, «новыя» імёны ўдзельнікам А і Б. Кіраўніку неабходна прасачыць, каб імёны не былі імёнамі рэальных людзей і не асацыяваліся з чалавекам, знаёмым групе. Вядучы просіць затым удзельніка А паказаць кульмінацыю канфлікту (напрыклад ударыць), а ўдзельніка Б — адказаць на гэта. Астатнія ўдзельнікі могуць падаваць ідэі рэакцыі ў адказ.
3. Кіраўнік просіць удзельнікаў падумаць пра тое, што ўдзельнік А думаў да прымянення фізічнай сілы. Думкі могуць быць адлюстраваны наступным чынам:




Думкі неабходна сфармуляваць у сказ. Група можа дапамагаць. Першым агучвае свой сказ удзельнік А. Другі ўдзельнік, які агучвае той ці іншы сказ, становіцца «ў чаргу» за ўдзельнікам А. Усяго 4 думкі — 4 сказы (як на ілюстрацыі). Можна і больш, калі ў групы ёсць больш ідэй. Кіраўніку прыходзіцца прасіць часам удзельніка А і наступных удзельнікаў паўтарыць свае думкі.
*(Добра, калі з самага пачатку вядучы дакранецца да пляча таго ці іншага ўдзельніка, каб «пазначыць», каму даецца слова. Навучэнцы ў чарзе за ўдзельнікам А могуць або стаяць, або сядзець у залежнасці ад таго, спакойная група ці не вельмі. Калі не вельмі, лепш ім сядзець.)*

4. Калі чарга дойдзе да апошняй думкі, вядучы просіць апошняга ў чарзе ўдзельніка сказаць свой сказ. Затым усе, хто апынуўся ў чарзе за А, кажуць па чарзе свае сказы. Удзельнік А пасля гэтага завяршае «дзеянне» дэманстрацыяй кульмінацыі канфлікту. Такім чынам будзе бачная і ланцуговая рэакцыя. Пажадана рабіць усё гэта ў даволі хуткім тэмпе, каб максімальна наблізіць гульню да рэчаіснасці.
5. Кіраўнік просіць удзельніка А выйсці з чаргі. Першая названая думка ў ланцужку стала, такім чынам, тая, якую пачуў удзельнік Б. Кіраўнік просіць удзельніка Б адказаць на гэту думку. Іншыя ўдзельнікі могуць яму дапамагаць. І так далей па названым ланцужку, пакуль не будзе дадзены «адказ» на кожную думку. (Сэнс тут у тым, каб паказаць, што рэакцыя Б усё мякчэйшая і мякчэйшая, калі думкі аддаляюцца ад кульмінацыі канфлікту.)

**Абмеркаванне:**

- Што адбываецца ў канфліктнай сітуацыі, калі чалавек выказвае свае думкі і пачуцці?
- Калі моцна змянілася рэакцыя ўдзельніка Б? Чаму, як вы думаеце?
- Магло б гэта здарыцца раней, на больш раннім этапе? Чаму?

**Возьмем пад ўвагу:**

Чым выразней і дакладней мы здолеем выказаць свае думкі і пачуцці на ранняй стадыі развіцця канфлікту, тым лепш, бо ў такім разе ў іншага боку з'яўляецца таксама магчымасць для рэакцыі на больш ранняй стадыі. І ў выніку будзе лягчэй знайсці выхад з канфліктнай сітуацыі. Чым больш канфлікт «запускаецца», тым большая верагоднасць таго, што рэакцыя (калі яна здарыцца) будзе моцнай. Паспрабуйце выказваць свае пачуцці чым раней, тым лепш!

**Канфлікт лягчэй уладзіць, калі як мага раней спахопяцца ўцягнутыя ў яго бакі.**



## СПІРАЛЬ КАНФЛІКТУ

**Тэма:**

Развіццё канфліктнай сітуацыі.

**Мэта:**

Удзельнікі павінны зразумець, якія механізмы ўдзельнічаюць у развіцці канфлікту, і падрыхтавацца да аптымальнага вырашэння канфлікту.

Большасць людзей уступаюць ў дыскусіі, з'яўляючыся перакананымі ў тым, што яны правы. Гэта ж так відавочна: «Мы правы, таму што ў нас ёсць больш ведаў ці вопыту, якія падмацоўваюць тое, што мы думаем». Калі іншыя людзі не падзяляюць нашых поглядаў, мы схільны рабіць выснову, што яны проста нічога не ведаюць і не разумеюць. І паўтараем тое ж самае яшчэ раз… Самае цікавае, што апанент думае дакладна гэтак жа. Вось тут і пачынае закручвацца спіраль канфлікту!

**Практычная рэалізацыя:**

Практыкаванне пачынаецца з выступу кіраўніка, затым ідзе групавая праца і выступы на агульным сходзе.

**Час:** 45 – 60 хвілін.
**Што неабходна?** Вялікія лісты і фламастэры, ручкі і папера.

**Парадак выканання:**

1. Кіраўнік кажа, што ў гэтым практыкаванні група разгледзіць, якія сілы спрыяюць развіццю канфлікту ў негатыўным ключы. Няважна, маем мы справу з міжасабовым ці знешнепалітычным канфліктам паміж дзяржавамі, нярэдка можна бачыць, што мы трапляем у замкнёнае кола, дзе негатыўныя элементы ўзмацняюць адзін аднаго. Спіраль канфлікту можа развівацца па-рознаму, але часта яна ўтрымлівае ў сабе наступныя стадыі (кіраўнік запісвае этапы на вялікім лісце па ходу свайго выступу):

   **Рознагалоссе**
   У пачатку заўсёды існуе праблема, адносна якой два ці болей бакоў маюць рознагалоссі.

   **Дыскусія**
   Бакі пачынаюць абмяркоўваць праблему, вылучаць аргументы. Абодва бакі лічаць, што правы, і ніхто з іх асабліва не хоча слухаць адзін аднаго. Замест таго, каб паспрабаваць зразумець і паглядзець на сітуацыю з пункту гледжання іншага, яны заняты перакананнем іншага ў тым, што яны правы.

**Моцныя эмоцыі**
Паколькі сітуацыя ўспрымаецца як тупіковая, бакі ўсё мацней уцягваюцца ў яе эмацыйна. Яны размаўляюць гучней і жэстыкулююць актыўней, каб пераканаць іншага. Яны таксама могуць злавацца і паводзіць сябе агрэсіўна.

**Прыўносяцца новыя элементы — канфлікт узмацняецца**
Часта бакі прыцягваюць тыя элементы, якія ніяк не звязаны з самой праблемай, але якія толькі ўзмацняюць канфлікт. Гэта могуць быць, напрыклад, адмоўныя асобасныя характарыстыкі і абагульненні: «Ты заўсёды такі строгі!», «З табой бессэнсоўна размаўляць!», «Я чуў, што ты заўсёды такі…» і г.д. Іншыя людзі таксама могуць уцягвацца ў канфлікт: «Ён думае гэтак жа, як я!», «Іншыя казалі, што з табой заўсёды так складана!» Пагрозы таксама могуць адыграць сваю ролю ў гэты момант: «Калі ты не зробіш, як я кажу, то я…» Гэтыя элементы, першапачаткова ніяк не звязаныя з праблемай, узмацняюць канфлікт і робяць яго больш цяжкім для вырашэння.

**Палярызацыя і аддаленне бакоў адзін ад аднаго**
Адлегласць паміж бакамі павялічваецца. Дыялог знікае, гутарка спыняецца, і людзі «паварочваюцца спінай адзін да аднаго».

**Канфлікт не вырашаецца: кантакт перарываецца або бакі пераходзяць да фізічнага гвалту**
Зараз канфлікт дасягнуў свайго апагея. Бакі перастаюць размаўляць адзін з адным, і кантакт спыняецца. Калі адзін ці абодва бакі адчуваюць, што сітуацыю нельга больш выносіць і трымаць адлегласць таксама бессэнсоўна, канфлікт можа прывесці да фізічнага гвалту (бойка ці вайна).

2. Удзельнікі дзяцца на невялікія групы, выбіраюць для аналізу канфліктную сітуацыю і развіваюць яе па ўсіх этапах спіралі канфлікту. Яны могуць разыграць сцэнку ці запісаць этапы канфлікту і важныя моманты на вялікім лісце. Будзе цікавей, калі групы стануць працаваць з рознымі тыпамі канфліктаў. Адны групы могуць узяць канфлікт у сям'і ці ў школе, другія — рэгіянальныя, нацыянальныя ці міжнародныя канфлікты. (30 хвілін)

3. Групы выступаюць на агульным абмеркаванні.

## Абмеркаванне:

- Вы думалі раней пра тое, якія сілы дзейнічаюць па меры развіцця канфлікту?
- Вы самі адчувалі дзеянне гэтых сіл у сваім жыцці? Як гэта было?
- Якія самыя важныя агульныя рысы розных спіраляў канфліктаў прадстаўлены?
- Што вас здзівіла больш за ўсё?
- На якой стадыі канфлікт вырашыць лягчэй за ўсё? Чаму?
- Як мы можам лепш за ўсё вырашаць канфлікты?

## Возьмем пад ўвагу:

Хаця канфлікты развіваюцца рознымі спосабамі, у іх ёсць агульныя рысы. Спачатку, як правіла, бывае дыскусія і аргументацыя па сутнасці праблемы. Аднак часта бывае, што бакі не хочуць слухаць і разумець пункт гледжання і аргументацыю іншага боку і замест гэтага марнуюць свае сілы на тое, каб узмацніць свой пункт гледжання. Гэта аддаляе бакі адзін ад аднаго, і тады стасункі могуць характарызавацца эмацыйнымі выбухамі, агрэсіяй і нападкамі не па сутнасці пытання. Часта ў спрэчку ўцягваюцца элементы, не звязаныя з праблемай. У канчатковым выніку людзі становяцца ворагамі ці спыняюць кантакт. На нацыянальным і міжнародным узроўнях гэта можа пацягнуць за сабой вайну або ўзброены канфлікт. Ведаючы пра розныя стадыі развіцця канфлікту, мы зможам навучыцца лёгка распазнаваць іх і вырашаць, як нам лепш з імі працаваць.

Спыненне дыялогу — самы вялікі вораг вырашэння канфлікту!

Ведаючы пра спіраль канфлікту, нам будзе лягчэй спраўляцца з ім.

## У НАС ЁСЦЬ ВЫБАР

### Тэма:

Вырашэнне канфліктаў.

### Мэта:

Удзельнікі павінны зразумець, што мы самі выбіраем, як будзем ставіцца да канфлікту.

Часта мы акцэнтуем увагу на прычынах канфлікту, а не на тым, як яго вырашыць. Калі канфлікт уплывае на нас і грамадства адмоўна, нам лепш прыкласці высілкі на пошук рашэнняў, а не на ўзгадванне мінулага. Нам самім выбіраць, як ставіцца да канфліктаў. Калі мы ўзгадаем пра гэты станоўчы момант, гэта дасць нам новыя магчымасці. Зараз ужо не канфлікты будуць кіраваць намі, а мы — канфліктамі!

Канфлікты — гэта не заўсёды праблемы, але і магчымасці.

### Практычная рэалізацыя:

Гэта практыкаванне ў форме дыялогу, якое добра падыходзіць у самым пачатку вывучэння тэмы «Вырашэнне канфліктаў».

**Час:** 25 хвілін.
**Што неабходна?** Папера і ручкі, вялікія лісты і фламастэры.

### Парадак выканання:

1. Вядучы задае пытанні: «Як трэба ставіцца да канфліктаў, якія ўзніклі? Якія альтэрнатывы існуюць? Калі вы становіцеся сведкай канфлікту ці самі знаходзіцеся ў канфліктнай сітуацыі, як вы павінны да гэтага ставіцца? Які ў вас ёсць выбар?» Удзельнікі абмяркоўваюць гэта са сваім суседам некалькі хвілін. (5 хвілін)
2. Вядучы падводзіць вынікі разам з групай і запісвае адказы. Калі ўказаныя ніжэй пункты не ўвайшлі ў спіс, вядучы называе іх сам. (10 хвілін)
   *У адносінах да канфлікту ў вас ёсць некалькі магчымасцяў. Вы можаце:*
   1) *выцесніць тое, што адбываецца, са свядомасці;*
   2) *паспрабаваць пазбегнуць таго, каб стаць часткай канфлікту;*
   3) *дазволіць канфлікту паўплываць на вас адмоўна, раздражняць вас усё больш і больш, дазволіць агульнаму напружанню нарастаць;*
   4) *адрэагаваць з выкарыстаннем сілы;*
   5) *паспрабаваць вырашыць канфлікт.*

### Абмеркаванне:

- Якія дзеянні адмоўна ўплываюць на канфліктную сітуацыю? Чаму?
- Якія дзеянні станоўча ўплываюць на канфліктную сітуацыю? Чаму?




### Возьмем пад ўвагу:

Для многіх з'яўляецца нязвыклай думка пра тое, што ў большасці сітуацый ёсць выбар з мноства магчымых спосабаў дзеяння і рэагавання. Для нашага развіцця як адказнага чалавека важна разумець, што мы ўвесь час выбіраем розныя спосабы дзеяння і што заўсёды можна выбраць альтэрнатыву. Пасіўныя адносіны могуць здавацца самай простай рэакцыяй у многіх сітуацыях, але і яны — вынік выбару. Мы можам рабіць выгляд, што канфлікту няма і трымацца ўбаку, або мы можам дазволіць сабе быць уцягнутымі ў яго і спрыяць эскалацыі канфлікту. Спроба справіцца з канфліктам — гэта, як правіла, адзіная альтэрнатыва, якая прыводзіць да станоўчага развіцця. Звычайна чым раней мы ўмешваемся ў канфлікт, тым лепш. Вырашаць канфлікты складаней, калі мы не б'ем трывогу і дазваляем ім развіцца.

# АДНА СІТУАЦЫЯ — ТРЫ ВЫХАДЫ

**Тэма:**

Вырашэнне канфліктаў.

**Мэта:**

Удзельнікі павінны вучыцца знаходзіць спосабы вырашэння канфліктаў.

Хто з нас не думаў хоць бы раз: «Чаму я не сказаў гэта па-іншаму? Чаму не зрабіў па-іншаму?» Даволі балюча ўсведамляць, што ты выбраў у выніку не самы лепшы спосаб рэагавання на тую ці іншую праблему. Магчыма, можна загадзя «падрыхтавацца» да падобных сітуацый у будучыні?

**Практычная рэалізацыя:**

Практыкаванне пачынаецца з самастойнай працы, працягваецца працай у групах і ролевай гульнёй і заканчваецца агульным абмеркаваннем.

**Час:** 45 хвілін.
**Што неабходна?** Прасторнае памяшканне.

**Парадак выканання:**

1. Кіраўнік просіць удзельнікаў падумаць або запісаць на паперы сітуацыю, якую яны нядаўна перажылі, і з якой справіліся не так, як ім хацелася б. Гэта можа быць сітуацыя з жыцця школы, працы, сям'і і інш. (5 хвілін)
2. Удзельнікі дзяляцца на невялікія групы. Кожная група пагаджаецца «працаваць» над той ці іншай сітуацыяй. Праца ў групах працякае з арыентацыяй на наступныя тры альтэрнатывы:
   - Якая самая верагодная рэакцыя ў дадзенай сітуацыі?
   - Якая самая правакацыйная, рэакцыя, якая паглыбляе канфлікт у дадзенай сітуацыі?
   - Якая самая аптымальная рэакцыя ў дадзенай сітуацыі?

   Самай аптымальнай павінна быць рэакцыя, рэлевантная для гэтых канкрэтных удзельнікаў у дадзенай канкрэтнай сітуацыі. Гэта значыць, што такая рэакцыя не абавязкова будзе аптымальнай па азначэнні. Групы прайграюць апісаныя вышэй альтэрнатывы ў ролевай гульні. Калі самая верагодная рэакцыя супадае з самай правакацыйнай, дастаткова прайграць дзве альтэрнатывы. (20 хвілін)
3. Удзельнікі збіраюцца разам у зале, і кіраўнік выбірае некаторыя альтэрнатывы для дэманстрацыі. Можна таксама аб'яднаць групы па дзве, каб яны прайгралі адна для адной. (10 хвілін)



**Абмеркаванне:**

- У чым розніца розных альтэрнатыў-рэакцый на канфлікт?
- Што атрымалася і чаму?
- Знаёмыя былі вам рэакцыі ці не?
- Як часта можна назіраць самую верагодную, самую правакацыйную і самую аптымальную рэакцыі? Самая верагодная будзе, хутчэй за ўсё, рэакцыяй, якая «не працуе», паколькі нічога «не вырашае». Калі група палічыць, што самая верагодная рэакцыя — самы лепшы выбар у сітуацыі, вядучы можа дадаткова спытаць меркаванні ўдзельнікаў пра фактары, якія робяць яе лепшай.
- Якія свае навыкі, стратэгіі мы выкарыстоўваем для таго, каб пазбегнуць самай правакацыйнай рэакцыі ў той ці іншай сітуацыі?

**Возьмем пад ўвагу:**

Нашы рэакцыі на той ці іншы канфлікт — далёка не заўсёды аптымальныя. Аднак, задумваючыся і аналізуючы ўласныя рэакцыі і паводзіны ў сітуацыях, якія важныя для нас, мы можам у далейшым пазбегнуць многіх цяжкасцяў і быць больш гатовымі да будучых канфліктаў. Мы таксама можам навучыцца ў іншых людзей некаторым рэакцыям, тактыкам і стратэгіям.

# ЭТАПЫ ВЫРАШЭННЯ КАНФЛІКТУ

**Тэма:**

Вырашэнне канфліктаў.

**Мэта:**

Удзельнікі павінны навучыцца канструктыўнаму вырашэнню канфліктаў.

Мы ведаем, што існуе незлічонае мноства канфліктаў, ад маленькіх паўсядзённых, з сябрамі і сям'ёй, да буйных міжнародных канфліктаў, глабальных войн і тэрарыстычных пагроз. Розныя канфлікты трэба вырашаць па-рознаму. Таму вырашэнне канфліктаў і з'яўляецца даследчай і творчай працай. Але хаця ўсе канфлікты розныя, ёсць усё ж шэраг агульных момантаў пры іх вырашэнні. Як на самой справе выглядае працэс вырашэння канфлікту?

**Практычная рэалізацыя:**

Практыкаванне пачынаецца з таго, што ўдзельнікі рыхтуюць ролевую гульню, якую яны паказваюць на агульным сходзе. Потым вядучы робіць кароткі даклад, і групы працягваюць стварэнне сваіх сцэнак. Напрыканцы праходзіць агульнае абмеркаванне найбольш важных пытанняў.

**Час:** 1,5 гадзіны ці падвойны ўрок (90 хвілін).
**Што неабходна?** Вялікія лісты і фламастэры, магчыма — дошка і крэйда.
**Падрыхтоўка:** Кароткі даклад пра этапы вырашэння канфліктаў і сітуацыі, якія ляжаць у аснове ролевых гульняў.

**Парадак правядзення:**

1. Вядучы дзеліць удзельнікаў на групы і дае заданне падрыхтаваць сцэнку на аснове выдадзенага ім прыкладу канфліктнай сітуацыі (гл. прыклады ніжэй). Самае важнае — каб канфлікт быў паказаны выразна і яго бакі былі дакладна вызначаны. Групы паказваюць, як канфлікт развіваецца ў адмоўным накірунку: адбываецца яго эскалацыя, ён становіцца больш інтэнсіўным і ўсё далей заходзіць у тупік. Магчыма, ён выльецца ў нястрыманыя выказванні, гвалт (не перастарайцеся!) або бакі проста разыдуцца? (15 хвілін) Групы паказваюць сцэнкі на агульным сходзе.
2. Вядучы можа падвесці вынікі: сцэнкі скончацца так, як канфлікты звычайна заканчваюцца ў рэчаіснасці, калі не дзейнічаць канструктыўна. Вядучы распавядае пра розныя стадыі працэсу вырашэння канфлікту. (10—20 хвілін) Ён тлумачыць, што гэта ўсяго толькі спрошчаная мадэль, і што вырашэнне канфліктаў у рэальным жыцці можа выглядаць інакш. Аднак паспяховы працэс, як правіла, канструктыўны на ўсіх стадыях. Іншымі словамі, тут прыводзяцца добрыя парады па вырашэнні канфліктаў.

**Прызнаць наяўнасць праблемы/ канфлікту**
Калі бакі прызнаюць, што знаходзяцца ў канфлікце, яны таксама даюць сігнал аб тым, што хочуць вырашыць яго.

**Вызначыць праблему/ канфлікт**
Часам адмоўныя моманты, якія не датычаць уласна праблемы, могуць пагоршыць канфлікт. Таму паспрабуйце вызначыць праблему і ўстрымайцеся ад непатрэбных абмеркаванняў за спіной, чутак, не акцэнтуйцеся на дробязях. Часам бывае важна аддзяліць чалавека ад праблемы і паспрабаваць прыцішыць моцныя пачуцці.

**Паспрабаваць паставіць сябе на месца іншага чалавека**
Ва ўсіх нас — розны вопыт, і гэтым можна растлумачыць, чаму мы часта па-рознаму ўспрымаем сітуацыі і праблемы. Важна паспрабаваць зразумець, чаму іншыя думаюць менавіта так, а не інакш.

**Быць адкрытым для стасункаў з іншым бокам: выразна казаць і ўважліва слухаць**
Для таго, каб стварыць добрую атмасферу, важна праяўляць павагу да іншых. Гэта можна зрабіць, актыўна слухаючы тое, пра што гаворыць іншы чалавек. Найбольш верагодна, што гэта будзе ўспрынята як жаданне вырашэння канфлікту, што можа спрыяць узаемнаму актыўнаму слуханню.

**На чым мы пагадзіліся?**
У канфлікце звычайна ёсць шмат момантаў, па якіх людзі згодны адзін з адным. Напрыклад, бакі згодны, што канфлікт трэба вырашыць, што яны любяць адзін аднаго і таму не хочуць, каб канфлікт сапсаваў іх адносіны, што іншыя не павінны пакутаваць і гэтак далей. Канцэнтруючыся на гэтым агульным разуменні, мы можам стварыць станоўчую аснову, якая дасць нам больш спрыяльныя ўмовы для вырашэння праблемы. На гэтай стадыі мы можам папрасіць прабачэння, калі мы зрабілі нешта, пра што шкадуем.

**Вызначыць патрэбы**
Бакам варта распавесці адзін аднаму пра свае самыя важныя патрэбы ў канфлікце і тыя рашэнні, якія былі б для іх прымальнымі. Гэта прадугледжвае, што яны разумеюць, што, магчыма, не ўсе іх жаданні будуць задаволены, але што гэта будзе працэс, у якім мы будзем вымушаны «даваць і атрымліваць».

**Паспрабаваць знайсці прымальныя рашэнні**
Пры ацэнцы рашэнняў важна працягваць захоўваць стасункі. Трэба ўдзяляць увагу станоўчым момантам, якія дадуць розныя рашэнні. Важна разумець, што хаця і не ўсе патрэбы кожнага ўдзельніка будуць задаволены, усё ж можна знайсці рашэнне.

3. Пасля гэтага ўдзельнікі вяртаюцца ў свае групы і працягваюць працаваць над ролевымі гульнямі. Зараз ход гульні змяняецца, і ўдзельнікі праходзяць праз розныя этапы працэсу вырашэння канфлікту, у выніку ў іх атрымліваецца вырашыць канфлікт. (15 хвілін)
4. Групы прадстаўляюць ролевыя гульні на агульным сходзе.

## Возьмем пад ўвагу:

Можна і трэба вырашаць канфлікты канструктыўна. Часта, калі мы праходзім праз такія працэсы (хаця гэта і цяжка), то адчуваем, што становімся больш дасведчанымі людзьмі. Сувязі паміж людзьмі ўмацоўваюцца, таму што мы такім чынам даведваемся адзін пра аднаго больш. Вырашаць канфлікты — гэта не нейкае звышскладанае ўменне, яно ўтрымлівае ў сабе элементы, якія былі нам вядомы і раней і якімі мы валодаем у нашым паўсядзённым жыцці. Часта шмат што можа вырашыць ужо само прызнанне таго, што канфлікт існуе, і факт устанаўлення кантакту з іншым бокам. Памятайце, што вы самі можаце выбраць, як вы будзеце ставіцца да канфлікту. Прыняцце адказнасці — гэта мужны ўчынак! Падумайце пра гэта, калі вы ў наступны раз акажацеся ў канфліктнай сітуацыі і вам трэба будзе дзейнічаць.

## Прыклады канфліктаў, якія можна выкарыстоўваць для працы ў групах:

1. Выпускніца паліцэйскага каледжа паступае на працу ў паліцэйскі ўчастак у Осла. Ва ўчастку працуе яшчэ адна жанчына і 11 мужчын. Аднойчы яна прыходзіць на працу і бачыць, што на сцяне ў агульным пакоі, дзе ўсе звычайна абедаюць, вісяць два плакаты з аголенымі жанчынамі. Плакаты здаюцца ёй абразлівымі, і яна лічыць, што ім не месца ў паліцэйскім участку. За абедам яна гаворыць усім пра гэта і просіць тых, хто павесіў плакаты, зняць іх. Мужчыны толькі смяюцца і кажуць, што яна крыўдлівая. Пасля працы яны разам са сваёй калегай здымаюць плакаты. На наступны дзень, прыйшоўшы на працу, яны бачаць, што плакаты зноў вісяць на сцяне.

2. Дзве пакаёўкі-мусульманкі, якія працуюць у вялікім гатэлі ў горадзе, карыстаюцца на працы галаўным уборам. Аднойчы дырэктар гатэля сказаў ім, што гэтую практыку трэба спыніць, таму што галаўны ўбор не спалучаецца з гатэльнай формай. Калі яны не адмовяцца ад галаўных убораў, то страцяць працу. Пакаёўкам цяжка хадзіць без галаўнога ўбору, таму што ён з'яўляецца важнай часткай іх этнічнай і рэлігійнай ідэнтычнасці.

3. Вас запрасілі на дзень паўналецця да стрыечнай сястры, якую вы вельмі любіце. Вашы мама і тата таксама вельмі хочуць прыйсці на гэтую цырымонію, але настойваюць на тым, каб вы прыгожа апрануліся, чаго вам зусім не хочацца. Акрамя таго, яны кажуць, што вам трэба дастаць кольцы з носу і пірсінг з языка, а калі вы не зробіце гэтага, то застанецеся дома. Для вас вельмі важна патрапіць на свята. Калі вы не прыйдзеце, стрыечная сястра вельмі засмуціцца.

4. Сям'я эмігрантаў пераехала жыць у нарвежскую вёску і адчыніла рэстаранчык хуткага харчавання. Дзеці — хлопчыкі-двайняты 15 гадоў — пайшлі ў мясцовую школу. Праз тры месяцы бацька прыходзіць на працу і бачыць, што акно пабіта, а на сцяне напісана фарбай: «Эмігранты, з'язджайце дадому!» У той жа дзень двайняты даведваюцца ў школе пра чуткі, што гэта зрабілі два іх аднакласнікі. На наступны дзень адбываецца тое ж самае.

5. Вы толькі што пайшлі ў новую школу і хутка знайшлі новых сяброў. У папярэдняй школе вы былі адзінокія, і вас часта дражнілі, таму вы вельмі рады, што нарэшце знайшлі прыяцеляў. Аднойчы пасля школы вы з двума сябрамі пайшлі ў музычную краму. У краме вашы сябры ўзялі кожны па два кампакт-дыскі з паліцы і паклалі ў кішэні. Вы лічыце, што красці нельга, і ад хвалявання ў вас забалеў жывот. Вы кажаце таварышам па-добраму, што дыскі трэба паставіць назад на паліцу, перш чым іх зловяць. Яны толькі смяюцца з вас і пытаюцца, ці ўжо спалохаліся вы ўжо?

## Вырашэнне канфліктаў:

1. Прызнаць наяўнасць праблемы або канфлікту.
2. Вызначыць праблему.
3. Паспрабаваць паставіць сябе на месца іншага чалавека.
4. На чым мы пагадзіліся?
5. Добрыя зносіны: слухаць актыўна, казаць выразна.
6. Вызначыць самыя важныя патрэбы.
7. Знайсці прымальныя рашэнні, «даваць і браць».

**Важныя ключавыя словы для вырашэння канфліктаў:**

КАНТАКТ – ДЫЯЛОГ – ПАВАГА – РАЗУМЕННЕ ПУНКТУ ГЛЕДЖАННЯ ІНШАГА – ДАВАЦЬ І ПРЫМАЦЬ – ЗНАХОДЗІЦЬ РАШЭННІ.

**Варыяцыя:** ПРАБАЧЦЕ

Для таго, каб умець спраўляцца з канфліктамі, неабходна разумець значэнне слова «прабачце». Чаму мы гаворым часам «прабачце»? Ці толькі таму, што хочам быць ветлівымі? Або пасылаем тым самым нейкі сігнал?

Падумайце крыху над сітуацыямі, у якіх звычайна гавораць «прабачце/выбачайце»:

- У якіх сітуацыях мы гаворым звычайна «прабачце/выбачайце»?
- Чаго мы хочам дамагчыся, кажучы «прабачце/выбачайце»?
- Што мы адчуваем, калі гаворым «прабачце/выбачайце»?
- Што мы адчуваем пасля?
- Што мы адчуваем, калі іншыя гавораць нам «прабачце/выбачайце»?

Слова «прабачце» стварае магчымасці для ўзнаўлення і рэабілітацыі кантактаў паміж людзьмі, неабходных для вырашэння таго ці іншага канфлікту. Гэта годнае і патрэбнае слова, якое павінна выкарыстоўвацца як мага часцей!

Unnskyld
I'm sorry
Exuse moi
Извините
Выбачайце





# РАЗДЗЕЛ 7

## Тэатр у навучанні

**Драматызацыя** з'яўляецца добрым дадатковым метадам працы па навучанні правам чалавека, міжкультурнаму ўзаемаразуменню і вырашэнню канфліктаў.

Мы рэгулярна выкарыстоўваем гэты метад у нашых школах па правах чалавека, калі тэатральны педагог або выкладчык (калі ён мае адпаведныя веды і вопыт) працуюць з вучнямі пасля звычайных урокаў. Тэмамі ў такіх выпадках становяцца тыя, якія абмяркоўваліся на працягу дня.

Навучальны тэатр — гэта выдатны спосаб фарміравання асобасных установак. Сродкі тэатра дазваляюць удзельнікам развіваць такія якасці, як здольнасць атаясамлення з іншымі, эмпатыя і ўпэўненасць у сабе. Выкарыстоўваючы ролевыя гульні, імправізацыі і пантаміму, яны могуць пабываць «у скуры» іншага чалавека. Навучальны тэатр, акрамя таго, з'яўляецца цудоўным інструментам сацыялізацыі і выдатна падыходзіць для груп, дзе ўдзельнікі не ведаюць адзін аднаго. Ён можа ўяўляць новую арэну для самавыяўлення ўдзельнікаў, якія вельмі добра праяўляюць сябе ў рамках традыцыйнага навучання. Калі камусьці не падабаецца выступаць перад іншымі, не варта на іх ціснуць. Можна вырашыць гэту дылему, даўшы ім іншыя заданні, напрыклад фатаграфаванне, стварэнне сцэнічнай прасторы ці напісанне сцэнарыя.

Падчас курсу група працуе над пастаноўкай, якая, магчыма, складаецца з некалькіх сцэнак і якую можна пры жаданні паказаць іншым. Аднак мы хацелі б падкрэсліць, што значэнне мае не канчатковы вынік — «паказ», а працэс працы над пастаноўкай.

Ніжэй прыведзены артыкул тэатральнага педагога Крысцін Ёргенсэн, узяты з часопіса Нарвежскага Хельсінкскага камітэта за 2002 год. Крысцін Ёргенсэн выкладала драму падчас «школы» па правах чалавека ў Несна ў 2002 годзе.



## «Выдатна было быць нейтральным. Выдатна было прачнуцца і не распавесці больш ніводнай гісторыі»

У сітуацыі, калі даволі шмат тэм павінны былі змясціцца ў некалькі працоўных гадзін (сацыялізацыя, тэматычная праца і паказ), я выявіла, што валодаю тым, што вучні палічылі цікавым і карысным для самаразвіцця. Унікальнасць драмы і тэатра ў тым, што яны «сацыялізуюць» праз супрацоўніцтва, сумесную працу і пашырэнне ўласных межаў.

З дапамогай драмы і тэатра я магу «завесці» дзяцей далёка ад навакольнай рэчаіснасці і стварыць неіснуючы свет, у якім адбываюцца зусім іншыя падзеі, і людзі — *іншыя*. Часам бывае і так, што ставіцца да рэчаіснасці неабходна так, нібы яна рэальна існуе, але і гэта не страшна. Мы — «у гульні», і ніхто не памірае, хоць і памірае на сцэне. На сцэне мы можам забыць пра сваё паходжанне або запазычыць якое-небудзь іншае. Мы можам марыць і «аказацца» цалкам іншым чалавекам, у іншай рэальнасці.

У працы на працягу дня былі падняты праблемы і тэмы па правах чалавека, адносна якіх удзельнікі хочаш не хочаш павінны былі мець свае меркаванні. Вельмі часта абмяркоўвалася несправядлівасць сучаснага свету. Выкладчыкі з Нарвежскага Хельсінкскага камітэта ўвесь час працавалі над панятцямі нормаў і правіл. «І што на самой справе гэта такое — правы чалавека?» — пыталіся хлопчык з мусульманскай Самалі і дзяўчынка, якая вырасла з нарвежскай дзяржаўнай царквой, малады чалавек з перакананнямі камуніста і дзяўчына, што «ўцякла» ад камуністычнай рэчаіснасці.

Слова «Замры!» стала нашым нязменным жартам падчас «школы». Простае слова, якое, як усе зразумелі з часам, выкрыквалася ўсім, хто быў у руху. А з ім «з'яўляўся» і смех. Што можа быць больш смешнага, чым крыкнуць «Замры!» Ібрагіму, калі той спрабаваў данесці цэлым бутэрброд, пакладзены на шклянку з малаком і яшчэ спрабуючы адначасова перасунуць крэсла!

«Абарона» ролі стала для мяне ў працы з моладдзю важнай, як ніколі, справай. Мець магчымасць падзяліцца ведамі ці гісторыяй і не быць «самой сабой» стала важным складнікам «школы». І гэтаму было некалькі прычын. Я спрабавала паказаць, што на тую ці іншую справу, тую ці іншую рэч заўсёды можна паглядзець з некалькіх бакоў, даючы ўдзельнікам «іншыя», нязвыклыя для іх ролі.

Я спрабавала таксама «сысці» ад рэчаіснасці з дапамогай роляў і фігур, якія жылі ў кантэкстах, далёкіх ад штодзённасці. Быць іншым, забыць сябе крыху і зрабіць тое, чаго, напэўна, не зрабіў бы ў рэальным жыцці — гэта дае неверагодную свабоду чалавеку.

## Аўгусту Баал і «тэатр прыгнечаных»

У якасці гледачоў мы прызвычаіліся сядзець у цёмнай зале і сачыць за тым, што адбываецца на сцэне, не маючы магчымасці ўмешвацца ў дзеянні і канфлікты, якія развіваюцца. У тэатры Аўгусту Баала, наадварот, для пасіўных гледачоў няма месца. Тут цалкам знята адрозненне паміж дзеючымі акцёрамі і гледачамі!
Аўгусту Баал — бразільскі тэатральны педагог, які заснаваў уласную тэатральную школу — «тэатр прыгнечаных». Створаныя ім тэатральныя формы паўсталі з яго ўспрымання палітычнай сітуацыі ў Бразіліі, дзе грамадзяне адчувалі сур'ёзны палітычны ціск. У 1960-х гадах Баал працаваў над стварэннем тэатральнай формы, дзе гледачы могуць непасрэдна ўдзельнічаць у пастаноўцы і ўплываць на яе змест. Пасля таго, як Баал у 1971 г. выдаў кнігу «*Тэатр прыгнечаных*», ён быў арыштаваны і перанёс катаванні. Бразільскі ваенны рэжым таго часу бачыў у Баале сур'ёзную пагрозу.
Працуючы з «тэатрам прыгнечаных», Баал выявіў важную становўчую ролю тэатра ў жыцці людзей і тое, як моцна ён уплывае на іх. Менавіта таму ён з часам распрацаваў шэраг практыкаванняў (кніга «Вясёлка жадання»), разлічаных на людзей, якія хочуць развівацца пры дапамозе тэатра.

Вось некалькі парадоксаў Баала:
*Усе могуць іграць у тэатры, у тым ліку і акцёры!*
*У тэатр можна іграць паўсюль, нават у тэатры!*

Адной з тэатральных форм, якая найбольш часта выкарыстоўваецца Баалам, з'яўляецца тэатр-форум. Форум перакладаецца з лацінскай мовы як «плошча». У сучаснай мове гэта слова выкарыстоўваецца, калі кажуць пра месца, дзе можна вынесці тую ці іншую праблему на агульнае абмеркаванне і аналіз. Баал выкарыстаў ідэю вынясення праблем «на плошчу». Пастаноўка ў тэатры-форуме не плануецца загадзя, а ствараецца на сцэне, і стварае яе сама публіка. Іншымі словамі, тэатр-форум — гэта нясконачны тэатр, тэатр, які ўвесь час у руху. Пастаноўка ў тэатры-форуме — гэта працэс, элементамі якога становяцца аналіз праблемы, эксперымент, спробы і памылкі.

Іграецца сцэна, якая закранае правы чалавека, міжкультурны кантакт або канфлікт. Спачатку п'еса паказваецца публіцы з «дрэнным фіналам», калі сітуацыя застаецца без змен альбо пагаршаецца. Потым п'еса іграецца яшчэ раз, але на гэты раз ужо хто заўгодна з гледачоў можа выгукнуць «Стоп!» і ўвайсці ў адну з роляў. Глядач тады спрабуе змяніць няўдалы ход п'есы, іграючы сваю ролю па-іншаму. Акцёры ўвесь час спрабуюць прыстасавацца да новых сітуацый і перашкаджаць зменам, бо пошук рашэння не павінен быць такой ужо лёгкай справай! Будзе знойдзена рашэнне ці не — не так важна. Самае важнае тое, каб





былі выпрабаваныя розныя спосабы рашэння праблемы. Такім чынам удзельнікі даведваюцца, якія магчымасці адкрывае кожная прапанова і якія рашэнні можна выбраць. Удзельнікі таксама разумеюць, што яны самі павінны праяўляць актыўнасць, каб спрыяць зменам. Калі ніхто не ўмяшаецца, то «джокер», кіраўнік пастаноўкі, павінен сказаць, што калі ніхто нічога не зробіць, п'еса скончыцца зноў гэтак жа, як і ў першы раз. Тады кожны пачынае разумець сваю асабістую адказнасць за тое, што адбываецца: калі я не змяню свет, усё застанецца, як і раней!

Правілы тэатра-форума:
1. *Змена галоўнага героя:* на першай стадыі тэатра-форума можна змяняць толькі галоўнага героя.
2. *Неабходнасць строга прытрымлівацца зададзеных умоў:* джокер павінен сачыць за тым, каб гледачы, якія іграюць ролю галоўнага героя, не змянялі асноўныя (знешнія і ўнутраныя) першапачатковa зададзеныя ўмовы сітуацыі (напрыклад, узрост, прафесію, сямейнае і фінансавае становішча героя).

3. *Роля джокера:* джокер — гэта вядучы пастаноўкі (ім можа быць настаўнік або падрыхтаваны старшакласнік), які праводзіць практыкаванні, гульні і тлумачыць «гледачам» правілы гульні. Джокер натхняе гледачоў, падштурхоўвае іх да ўдзелу ў пастаноўцы.
4. *Магічнае:* гледачы вырашаюць, з'яўляецца развязка кепска прадуманай або «магічнай». («Магічная» развязка — гэта, напрыклад, калі герой выйграе ў латарэю шмат грошай і становіцца багатым).
5. *Трэба прыйсці да рашэння:* гледачы могуць пераламіць складаную сітуацыю і прыйсці да развязкі, якую нельга вызначыць як магічную. Аднак такая развязка часта можа быць звязанай з асаблівым момантам часу, асаблівай сітуацыяй і асаблівым чалавекам. Гэта развязка можа падыходзіць у дадзеным выпадку для дадзеных удзельнікаў, але не абавязкова будзе дзейснай і ў будучыні або ў іншым месцы.

NB! Неабходна растлумачыць удзельнікам правілы тэатра-форума да пачатку пастаноўкі, і джокер павінен нагадаць удзельнікам правілы, перш чым спектакль іграецца ў другі раз.





# РАЗДЗЕЛ 8

## Актывісцкая дзейнасць

Ніхто не можа зрабіць усяго для ўсіх, але ўсе могуць зрабіць што-небудзь для аднаго.

Штодня мы становімся сведкамі таго, як парушаюцца правы чалавека, калі да іншых ставяцца без усялякай павагі і цярпімасці. У гэтым сэнсе веды становяцца вельмі важнымі. Аднак веды не зменяць свет, калі мы адначасова не будзем прымяняць тое, чаму навучыліся. Ніжэй мы пакажам, як дзеці, падлеткі і мы самі можам спрыяць росту павагі да правоў чалавека. Пераўтвараючы словы ў дзеянні, мы атрымліваем станоўчыя пачуцці, якія дапамагаюць сфарміравацца нашай асобе/ідэнтычнасці. Хаця тое, што робяць асобныя людзі, не заўсёды здаецца значным у маштабе велізарнага свету, іх унёсак неацэнны. Любая змена пачынаецца з таго, што чалавек нешта робіць.

Можна параіць пачынаць з малога, атрымаць адпаведны вопыт і ўжо потым паступова прыступаць да буйных і больш складаных задач і праектаў.

## Інфармацыя пра праблему

Калі мы хочам працаваць над павышэннем павагі да правоў чалавека, то першым крокам да гэтага павінен стаць збор інфармацыі. Збірайце інфармацыю пра падзеі, якія адбываюцца там, дзе вы жывяце, у вашай краіне або ў свеце ў цэлым.

НА МЯСЦОВЫМ УЗРОЎНІ:
- Якая сітуацыя адносна правоў чалавека склалася ў вашай школе ці ў вашым класе?
- Якія праблемы з'яўляюцца самымі надзённымі на мясцовым узроўні, пра што пішуць мясцовыя газеты і іншыя сродкі масавай інфармацыі?
- Пагаварыце з людзьмі, якія занепакоены пэўнымі праблемамі ці якія ўжо далучаны да нейкай працы.
- Звяжыцеся з мясцовымі арганізацыямі па месцы жыхарства.

НА НАЦЫЯНАЛЬНЫМ УЗРОЎНІ:
- Якія дакументы па правах чалавека ратыфікавала Беларусь і што ў іх гаворыцца?
- Якія праблемы ў сферы правоў чалавека нацыянальныя праваабарончыя арганізацыі прызнаюць самымі важнымі?
- Што прымаюць улады для таго, каб вырашыць праблему?
- Якія дзеянні ў гэтым накірунку прымаюць праваабарончыя арганізацыі?
- Ці ёсць моладзевыя праваабарончыя арганізацыі на нацыянальным узроўні?

У СВЕЦЕ:
- Якія парушэнні правоў чалавека цікавяць вас больш за ўсё?
- У якіх краінах гэтыя парушэнні найбольш ярка выяўлены?
- Вазьміце карту свету і адзначце краіны, дзе гэтыя правы чалавека парушаюцца.
- Звяжыцеся з праваабарончай арганізацыяй ці навуковай установай і высветліце ў іх прычыны парушэнняў правоў чалавека ў краінах, з якімі вы хацелі б «працаваць».

## Апытанне

Апытанне можа быць добрым спосабам сабраць інфармацыю і наладзіць сувязі з людзьмі з вашай мэтавай аўдыторыі. Гэта можна зрабіць як у вуснай, так і ў пісьмовай форме, папрасіўшы запоўніць анкеты. Вынікі апытання могуць выкарыстоўвацца для таго, каб задакументаваць сітуацыю, якая склалася па асобных праблемах, звязаных з правамі чалавека, або стаць асновай для плана дзеянняў ці больш доўгатэрміновай працы.

КАГО МОЖНА АПЫТАЦЬ?
- Людзей, якіх вы ўжо даўно ведаеце, — бацькоў, членаў сям'і і сяброў.
- Аднакласнікаў, аднакурснікаў, сваіх школьных настаўнікаў, універсітэцкіх выкладчыкаў.
- Выпадковых прахожых на вуліцы.
- Асобныя нацыянальныя меншасці або людзей, якія, магчыма, з'яўляюцца ахвярамі дыскрымінацыі.
- Палітыкаў.
- Актывістаў-праваабаронцаў.
- Журналістаў.
- Іншых людзей.

ПРА ШТО МОЖНА АПЫТАЦЬ ГЭТЫХ ЛЮДЗЕЙ?
- Што яны ведаюць пра правы чалавека?
- Ці ведаюць яны пра свае правы?
- Ці ведаюць яны, як ідуць справы з правамі чалавека ў іх грамадстве?
- У чым заключаюцца самыя важныя грамадскія праблемы, звязаныя з правамі чалавека?
- Ці ведаюць яны, што яны могуць зрабіць, калі правы чалавека будуць парушаны?
- Куды яны могуць звярнуцца па дапамогу?
- Ці былі яны калі-небудзь абураны парушэннем правоў чалавека (уласных ці іншых людзей)?
- Што яны ведаюць пра Еўрапейскі суд па правах чалавека ў Страсбургу?

### Лісты

Просты спосаб дасягнуць станоўчых змен — гэта напісаць лісты мясцовым органам улады, палітычным партыям, дэпутатам парламента, міністрам і інш. У лісце вы можаце выказаць сваё бачанне праблем, якія вас турбуюць. Вы таксама можаце адправіць копію ліста ў газеты ці іншыя СМІ або размножыць і кінуць копіі ліста ў паштовыя скрыні ў раёне.

### Артыкулы і нататкі ў газету

Добрым спосабам прыцягнуць увагу да праблемы з'яўляецца напісанне артыкулаў або чытацкіх лістоў у газеты ці часопісы. Важна коратка і зразумела выказаць сутнасць пытання і вашы асноўныя аргументы. Часта бывае важна пачаць з рэальных гісторый, якія вы самі ці нехта іншы перажыў. Таксама будзе разумна прапанаваць палітыкам і ўпаўнаважаным службовым асобам прыняць канкрэтныя меры, здольныя, па вашым меркаванні, змяніць сітуацыю.

### Грамадскія дэбаты

Яшчэ адзін цікавы спосаб паўплываць на грамадства заключаецца ў правядзенні грамадскіх дэбатаў. Для таго, каб зрабіць гэта, спачатку неабходна выбраць цікавую тэму для дыскусіі, запрасіць людзей, якія маюць адносіны да дадзенай праблемы і могуць добра асвятліць яе, а таксама тых, хто адказвае за сітуацыю з дадзенай праблемай. Вы можаце запрасіць палітыкаў, прадстаўнікоў паліцыі, працаўнікоў муніцыпалітэта, настаўнікаў ці іншых асоб. NB: не забудзьцеся запрасіць журналістаў!

### Дэманстрацыі

Лакальная акцыя ці дэманстрацыя — добры спосаб прыцягнуць увагу мясцовай грамадскасці да праблемы. Старанна прадумайце, што вы хочаце сказаць тым, хто з'яўляецца вашай мэтавай аўдыторыяй, дзе і як вы будзеце праводзіць дэманстрацыю. Часам трэба атрымаць дазвол у паліцыі на правядзенне дэманстрацыі. Для таго, каб дэманстрацыя прыцягнула ўвагу, важна, каб у ёй удзельнічала як мага больш людзей і каб яны ішлі з вялікімі і яркімі плакатамі і транспарантамі.

### Дапамога неабароненым слаям грамадства

У грамадстве заўсёды ёсць неабароненыя слаі насельніцтва, якім патрэбна падтрымка: пажылыя людзі, людзі з абмежаванымі магчымасцямі, бедныя, уцекачы, а таксама асуджаныя, пацыенты псіхіятрычных бальніц, якія знаходзяцца на прымусовым лячэнні і іншыя. Вы можаце зрабіць шмат для таго, каб дапамагчы гэтым людзям. Вы можаце накіраваць лісты СМІ і ўладам, у якіх распавядзеце пра праблемы гэтых



Акцыя супраць крымінальнай адказнасці за дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі. «Дзяды Марозы» выходзяць з будынку Генеральнай пракуратуры. Мінск, 14 кастрычніка 2009 г.

груп. Вы можаце наведаць іх, каб высветліць іх канкрэтныя праблемы. Можа быць, вам спатрэбіцца стварыць асобны праект з мэтай збору рэчаў, неабходных гэтым людзям? Вы таксама можаце дапамагчы людзям выйсці ў грамадства, сабраць сродкі і г.д.

### Падтрымка арганізацый

Многія арганізацыі ўжо праводзяць мерапрыемствы для падлеткаў і моладзі, якія хочуць працаваць валанцёрамі. Нарвежскі Чырвоны Крыж арганізуе дапамогу ў выкананні школьных хатніх заданняў і праводзіць мерапрыемствы ў дапамогу ўцекачам, для чаго ім часта патрабуюцца добраахвотныя памочнікі. Арганізацыя «Выратуйце дзяцей!» (Redd Barna) мае моладзевае падраздзяленне «Прэс» (Press), членамі якога могуць стаць маладыя людзі. Многія арганізацыі з радасцю прымуць грошы на ажыццяўленне сваёй дзейнасці ў Нарвегіі і за мяжой. Перш чым вы пачняце праводзіць акцыю па збору сродкаў, было б нядрэнна звязацца з арганізацыямі, для якіх вы хочаце сабраць грошы, і высветліць, ці патрэбна ім такая падтрымка. Акрамя таго, яны, безумоўна, могуць даць вам каштоўныя парады і падказаць, як дзейнічаць. Толькі фантазія можа

абмежаваць вас у выбары спосабаў збору сродкаў: вы можаце вырабляць тавары для продажу на вуліцы ці іншым спосабам, арганізоўваць конкурсы з аплатай за ўдзел, правесці вечар танца або іншае культурнае мерапрыемства, арганізаваць продаж старых рэчаў, правесці латарэю і г.д.

### Уласны праект ці арганізацыя

Можна таксама распрацаваць і зрабіць свой уласны праект або арганізацыю, нацэленую на доўгатэрміновую працу. Самае першае, што неабходна пры гэтым зрабіць, — гэта вызначыць сферу дзейнасці і канкрэтныя праблемы, над рашэннем якіх вы хочаце працаваць. Імі могуць быць, напрыклад:

- Негатыўнае або варожае стаўленне да прадстаўнікоў меншасцяў у грамадстве.
- Расізм, дыскрымінацыя і ўшчамленне ў правах.
- Высмейванне.
- Сітуацыя ў месцах пазбаўлення волі, псіхіятрычных клініках, дамах для састарэлых і інш.
- Правы жанчын і дзяцей.
- Свабода слова.
- Права на прыняцце рашэнняў і ўдзел у палітычным жыцці грамадства.
- Беднота.
- Дзіцячая праца.
- Прастытуцыя.
- Наркатычная залежнасць.
- Гандаль людзьмі.
- Экалогія.

Для стварэння арганізацыі ці працы над праектам варта таксама правесці аналіз уласных ведаў і навыкаў. Неабходна падумаць над наступнымі момантамі:

- Колькі чалавек усяго ў ініцыятыўнай групе?
- Ці ўсе матываваныя і ці будзе ў іх час займацца працай?
- Ці ёсць у кагосьці бацькі ці іншыя члены сям'і, веды якіх магчыма выкарыстаць (палітыкі, журналісты, праваабаронцы і г.д.)?
- Ці ёсць у наяўнасці памяшканне? Ці бясплатнае яно?
- Якімі ведамі/навыкамі валодае кожны член групы асобна?
- Ці ёсць у наяўнасці камп'ютар і іншая электронная тэхніка?
- Ці ёсць у нас вопыт падобнай працы?
- Ці зладжаны мы як група? Ці цяжка нам звычайна пагадзіцца і прыйсці да агульнага меркавання?






Акцыя ў 10-ю гадавіну знікнення палітыка Юрыя Захаранкі з патрабаваннем высветліць ягоны лёс. 7 мая, Мінск.

- Ці ёсць у нас добрыя кантакты з тымі, для каго мы будзем «працаваць»?
- Ці ёсць у нас кантакты з арганізацыямі, якія працуюць над тымі ж тэмамі/праблемамі?
- Ці ведаем што-небудзь пра патэнцыйных спонсараў?
- Ці лёгка прыцягнуць увагу СМІ да выбраных тэм/праблем?
- Якая мэта праекта/арганізацыі?
- Якіх канкрэтна зменаў мы хочам?
- Ці можам мы знайсці «пацверджанне» нашых ідэй у міжнародных дакументах па правах чалавека?
- Якія метады працы будуць асноўнымі для нас (навучанне, правядзенне курсаў, артыкулы і нататкі ў СМІ, масавыя акцыі і дэманстрацыі, рассылка лістоў мясцовым і дзяржаўным уладам, правядзенне сустрэч і круглых сталоў і г.д.)?
- Іншыя моманты і пытанні, над якімі трэба было б падумаць.

Пасля таго, як група грунтоўна падумала і абмеркавала вышэйпералічаныя моманты, ад слоў можна пераходзіць да справы: складаць план працы, вызначаць чарговасць выканання задач і персанальную адказнасць за іх выкананне. У канцы вам застанецца толькі адно — дзейнічаць!

**Прыклад: План працы, прымеркаваны да дэманстрацыі ў абарону правоў дзяцей-уцекачоў, 12 мая.**

| Задача | Хто адказвае? | Калі? |
|---|---|---|
| Высветліць, у чым заключаюцца найбольш вострыя праблемы дзяцей, якія пражываюць у прытулках для ўцекачоў | Гюн і Ахмед | 2—5 мая |
| Высветліць, якія правы маюць дзеці ў прытулках для ўцекачоў згодна з Канвенцыяй аб правах дзіцяці | Пэр і Тове | 2—5 мая |
| Сфармуляваць патрабаванні | Гюн, Ахмед, Пэр і Тове | 2—5 мая |
| Напісаць улёткі, якія будуць раздавацца | Інгер Йоханэ і Йоакім | 10 мая |
| Вырабіць транспаранты | Оскар і Сіл'я | 9 мая |
| Запрасіць і праінфармаваць іншыя групы, членаў сем'яў і сяброў, прапанаваць ім паўдзельнічаць | Уле Бені і Гюнар | 2—10 мая |
| Звязацца з мясцовымі ўладамі | Фернанда і Бэрыт | 5 мая |
| Праінфармаваць паліцыю | Ане Марыт і Огэ | 2 мая |
| Прапанаваць мясцовым палітыкам падтрымаць акцыю | Б'ёрн і Огэ | 2 мая |
| Звязацца з асобнымі групамі нацыянальных меншасцяў, прытулкамі для ўцекачоў і арганізацыямі, якія працуюць з дадзенай праблематыкай | Огэ і Ане Марыт | 2 мая |
| Падрыхтаваць праграму і тэксты выступаў | Йоакім і Ясміна | 5 мая |
| Прыгатаваць каву і вафлі | Б'ёрн і Гюнар | 12 мая |
| Прыборка пасля завяршэння акцыі | Усе разам | 12 мая |






# РАЗДЗЕЛ 9

## Ацэнка працы

**Не заўсёды лёгка ацаніць,** наколькі паспяхова праходзіць навучанне. Асабліва гэта цяжка зрабіць, калі галоўнай мэтай навучання з'яўляецца садзейнічанне станоўчай змене грамадскага меркавання, як у нашым выпадку. Вымераць ступень засваення новых ведаў увогуле не так ужо і цяжка — трэба толькі задаць удзельнікам шэраг кантрольных пытанняў, якія адразу пакажуць, засвоілі яны той ці іншы матэрыял ці не. Складаней высветліць, ці пераўтварыліся веды ў разуменне і ці змаглі яны змяніць перакананні чалавека. І ці магчыма вымераць змену перакананняў?

Наш вопыт паказвае, што выкладчык, гэтак жа як і самі вучні, можа рабіць высновы пра тое, ці было навучанне карысным і ці дасягнула яно сваіх мэтаў. Трэба вельмі ўважліва паставіцца і да тых пачуццяў, якія адчувае выкладчык па завяршэнні працы з групай. Калі ў выкладчыка ёсць устойлівае адчуванне, што яго высілкі былі паспяховымі, зваротная рэакцыя — адназначнай, а энергетыка — высокай, то відавочна, што ў яго атрымалася дасягнуць мэты. Калі ў выкладчыка не вельмі добрыя адчуванні, то, верагодна, можна нешта палепшыць. З часам выкладчык набудзе вопыт і зразумее, што трэба для таго, каб навучанне было больш дзейсным.

У дадатак да сур'ёзнага стаўлення да ўласных адчуванняў важна рэгулярна праводзіць пісьмовую і вусную ацэнку эфектыўнасці навучання, мэтай якой з'яўляецца выяўленне фактараў поспеху або няўдачы, якія дазволяць правесці працу лепш у наступны раз. Чым больш змястоўным было навучанне, тым важней праводзіць такога кшталту ацэнку. Калі на арганізацыю працэсу навучання вылучаліся сродкі і яго працяг залежыць ад знешняга фінансавання, то можа быць вельмі карысна, а часта і неабходна спасылацца на падобныя ацэнкі эфектыўнасці навучання. Ацэньваць навучанне можна па-рознаму, і ніжэй мы распавядзем пра некаторыя спосабы ацэнкі.

### Бягучая ацэнка

Калі вы праводзіце навучанне на працягу некалькіх дзён, можа быць карысным праводзіць бягучую ацэнку, магчыма, праз адзін-два дні пасля яго пачатку. Сэнс бягучай ацэнкі ў тым, каб сабраць меркаванні і рэакцыі ўдзельнікаў: даведацца, што, па іх меркаванні, атрымліваецца добра, што — не, каб адкарэктаваць і падправіць выкладанне ў наступныя дні. Пытанні можна задаваць вусна і прапанаваць удзельнікам выказаць свае меркаванні і абмеркаваць іх разам, альбо кіраўнік можа папрасіць вучняў даць адказы пісьмова.

Прыкладныя пытанні:

- Што вам больш за ўсё спадабалася сёння?
- Што з таго, што вы даведаліся, для вас важней за ўсё?
- Што можна было зрабіць лепш?
- Што прайшло дрэнна?



### Вусная ацэнка на выніковым занятку

Просты і зручны спосаб правесці вусную ацэнку — арганізаваць агульную дыскусію з вучнямі пасля завяршэння навучання. Можна пасадзіць слухачоў паўколам і прыступіць да абмеркавання. Такая ацэнка дасць кіраўніку навучання магчымасць атрымаць каштоўную інфармацыю ад удзельнікаў. Можна задаць наступныя пытанні:

- Ці адпавядае навучанне вашым чаканням? Чаму? Або чаму не?
- Што вы думаеце пра выкладанне?
- Што вы думаеце пра практыкаванні?
- Што вы думаеце пра даклады?
- Што вы думаеце пра праведзеныя групавыя заняткі?
- Што вы думаеце пра праведзеныя дыскусіі?
- Што вам спадабалася больш за ўсё?
- Што вам спадабалася менш за ўсё?
- Што самае важнае з таго, пра што вы даведаліся?
- Вы даведаліся пра што-небудзь, што збіраецеся выкарыстоўваць у сваім паўсядзённым жыцці?

- Як, па вашым меркаванні, працавала група?
- Як, па вашым меркаванні, працавалі вы самі?
- Што новага вы даведаліся пра саміх сябе?
- Што вы можаце параіць выкладчыку, каб у наступны раз навучанне прайшло інакш/лепш?

### Індывідуальная пісьмовая ацэнка

Таксама можна праводзіць індывідуальную пісьмовую ацэнку. Гэта варта рабіць, калі навучанне працягвалася некалькі дзён. Індывідуальная пісьмовая ацэнка звычайна ўспрымаецца ўдзельнікамі сур’ёзна, і кіраўнік, верагодна, атрымае больш шчырыя адказы як у добрым, так і ў дрэнным сэнсе. Калі кіраўнік падкрэсліць, што ў справаздачы з ацэнкай эфектыўнасці курсаў індывідуальныя адказы будуць прадстаўлены з захаваннем ананімнасці, то гэта таксама можа зрабіць адказы больш шчырымі.

Ацэначную анкету можна скласці па-рознаму, у залежнасці ад таго, што менавіта вы хочаце ацаніць. Мы лічым, што самымі важнымі крытэрыямі паспяховасці выкладання з’яўляецца тое, наколькі атрымалася перадаць веды і разуменне вывучаных тэм, наколькі яно прымусіла ўдзельнікаў думаць, павысіла цікавасць да грамадства і навакольных людзей, спрыяла змене стаўлення, палепшыла ўзаемаразуменне паміж удзельнікамі і, нарэшце, запэўніла іх у сваіх сілах. Пісьмовую ацэнку варта праводзіць пасля завяршэння навучання. Калі ж вы хочаце ацаніць змены адносінаў удзельнікаў з цягам часу, можна правесці больш працяглае даследаванне (напрыклад, на працягу 6 месяцаў, года ці болей).

Тэмы для даследавання могуць быць наступнымі:

1) Працэс, метады і асяроддзе навучання.

2) Веды і разуменне.

3) Змена меркаванняў і адносінаў удзельнікаў.






# Дадаткі

# УСЕАГУЛЬНАЯ ДЭКЛАРАЦЫЯ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА

**Прынята і абвешчана рэзалюцыяй 217 A (III) Генеральнай Асамблеі ад 10 снежня 1948 года.**

ПРЭАМБУЛА

Прымаючы да ўвагі, што прызнанне годнасці, уласцівай усім членам чалавечай сям'і, і роўных і неад'емных правоў іх з'яўляецца асновай свабоды, справядлівасці і ўсеагульнага міру; і

прымаючы да ўвагі, што грэбаванне і пагарда да правоў чалавека прывялі да варварскіх актаў, якія абураюць сумленне чалавецтва, і што стварэнне такога свету, у якім людзі будуць мець свабоду слова і перакананняў і будуць свабодныя ад страху і нястачы, абвешчана як высокае імкненне людзей; і

прымаючы да ўвагі, што неабходна, каб правы чалавека ахоўваліся ўладай закона ў мэтах забеспячэння таго, каб чалавек не быў змушаны звяртацца ў якасці апошняга сродку да паўстання супраць тыраніі і прыгнёту; і

прымаючы да ўвагі, што неабходна садзейнічаць развіццю дружалюбных адносін паміж народамі; і

прымаючы да ўвагі, што народы Аб'яднаных Нацый пацвердзілі ў Статуце сваю веру ў асноўныя правы чалавека, у годнасць і каштоўнасць чалавечай асобы і ў раўнапраўе мужчын і жанчын і вырашылі садзейнічаць сацыяльнаму прагрэсу і паляпшэнню ўмоў жыцця пры большай свабодзе; і

прымаючы да ўвагі, што дзяржавы-ўдзельніцы абавязаліся садзейнічаць у супрацоўніцтве з Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый усеагульнай павазе і захаванню правоў чалавека і асноўных свабод; і

прымаючы да ўвагі, што ўсеагульнае разуменне характару гэтых правоў і свабод мае велізарнае значэнне для поўнага выканання гэтага абавязацельства,

Генеральная Асамблея

абвяшчае дадзеную Усеагульную дэкларацыю правоў чалавека ў якасці задачы, да выканання якой павінны імкнуцца ўсе народы і ўсе дзяржавы з тым, каб кожны чалавек і кожны орган грамадства, нязменна маючы на ўвазе дадзеную Дэкларацыю, імкнуліся шляхам асветы і адукацыі садзейнічаць павазе гэтых правоў і свабод і забеспячэнню шляхам нацыянальных і міжнародных прагрэсіўных мерапрыемстваў усеагульнага і эфектыўнага прызнання і ажыццяўлення іх як сярод народаў дзяржаў — удзельніц Арганізацыі, так і сярод народаў тэрыторый, якія знаходзяцца пад іх юрысдыкцыяй.



Артыкул 1
Усе людзі нараджаюцца свабоднымі і роўнымі ў сваёй годнасці і правах. Яны надзелены розумам і сумленнем і павінны паступаць у адносінах адзін да аднаго ў духу братэрства.

Артыкул 2
Кожны чалавек павінен валодаць усімі правамі і ўсімі свабодамі, абвешчанымі дадзенай Дэкларацыяй, без якога б то ні было адрознення, як то ў адносінах расы, колеру скуры, полу, мовы, рэлігіі, палітычных ці іншых перакананняў, нацыянальнага ці сацыяльнага паходжання, маёмаснага, саслоўнага ці іншага становішча.
Акрамя таго, не павінна праводзіцца ніякага адрознення на падставе палітычнага, прававога ці міжнароднага статусу краіны або тэрыторыі, да якой чалавек належыць, незалежна ад таго, ці з'яўляецца гэта тэрыторыя незалежнай, падапечнай, несамакіраванай ці неяк інакш абмежаванай у сваім суверэнітэце.

Артыкул 3
Кожны чалавек мае права на жыццё, на свабоду і на асабістую недатыкальнасць.

Артыкул 4
Ніхто не павінен утрымлівацца ў рабстве ці ў паднявольным стане; рабства і гандаль рабамі забараняюцца ва ўсіх іх відах.

Артыкул 5
Ніхто не павінен падвяргацца катаванням або жорсткім, бесчалавечным абыходжанню і пакаранню, якія зневажаюць яго годнасць.

Артыкул 6
Кожны чалавек, дзе б ён ні знаходзіўся, мае права на прызнанне яго правасуб'ектнасці.

Артыкул 7
Усе людзі роўныя перад законам і маюць права, без усялякага адрознення, на роўную абарону закона. Усе людзі маюць права на роўную абарону ад якой бы то ні было дыскрымінацыі, якая парушае дадзеную Дэкларацыю, і ад якога б то ні было падбухторвання да такой дыскрымінацыі.

Артыкул 8
Кожны чалавек мае права на эфектыўнае ўзнаўленне ў правах кампетэнтнымі нацыянальнымі судамі ў выпадках парушэння яго асноўных правоў, прадстаўленых яму Канстытуцыяй ці законам.

Артыкул 9
Ніхто не можа быць падвергнуты адвольнаму арышту, затрыманню або выгнанню.

Артыкул 10
Кожны чалавек, для вызначэння яго правоў і абавязкаў і для ўстанаўлення абгрунтаванасці прад'яўленага яму крымінальнага абвінавачвання, мае права, на падставе поўнай роўнасці, на тое, каб яго справа была разгледжана галосна і з выкананнем усіх патрабаванняў справядлівасці незалежным і бесстароннім судом.

Артыкул 11
1. Кожны чалавек, абвінавачаны ў здзяйсненні злачынства, мае права лічыцца невінаватым да таго часу, пакуль яго вінаватасць не будзе ўстаноўлена законным парадкам шляхам галоснага судовага разбіральніцтва, пры якім яму забяспечваюцца ўсе магчымасці для абароны.

2. Ніхто не можа быць асуджаны за злачынства на падставе здзяйснення якога-небудзь дзеяння або за бяздзейнасць, якія падчас іх здзяйснення не складалі злачынствы па нацыянальных законах ці па міжнароднаму праву. Не можа таксама накладацца пакаранне больш цяжкае, чым тое, якое магло быць прыменена ў той час, калі злачынства было здзейснена.

Артыкул 12
Ніхто не можа падвяргацца адвольнаму ўмяшальніцтву ў яго асабістае і сямейнае жыццё, адвольным замахам на недатыкальнасць яго жылля, таямніцу яго карэспандэнцыі ці на яго гонар і рэпутацыю. Кожны чалавек мае права на абарону закона ад такога ўмяшальніцтва ці такіх замахаў.

Артыкул 13
1. Кожны чалавек мае права свабодна перамяшчацца і выбіраць сабе месца жыхарства ў межах кожнай дзяржавы.
2. Кожны чалавек мае права пакідаць любую краіну, уключаючы сваю ўласную, і вяртацца ў сваю краіну.

Артыкул 14
1. Кожны чалавек мае права шукаць схованкі ад пераследу ў іншых краінах і карыстацца гэтым схованкам.
2. Гэта права не можа быць выкарыстана ў выпадку пераследу, які сапраўды заснаваны на здзяйсненні непалітычнага злачынства, або дзеяння, якое супярэчыць мэтам і прынцыпам Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

Артыкул 15
1. Кожны чалавек мае права на грамадзянства.
2. Ніхто не можа быць адвольна пазбаўлены свайго грамадзянства ці права змяніць сваё грамадзянства.

Артыкул 16
1. Мужчыны і жанчыны, якія дасягнулі паўналецця, маюць права без усялякіх абмежаванняў па прыкмеце расы, нацыянальнасці ці рэлігіі ўступаць у шлюб і засноўваць сваю сям'ю. Яны карыстаюцца аднолькавымі правамі адносна ўступлення ў шлюб, падчас знаходжання ў шлюбе і падчас яго скасавання.
2. Шлюб можа быць узяты толькі пры свабоднай і поўнай згодзе абодвух бакоў, якія ўступаюць у шлюб.
3. Сям'я з'яўляецца натуральнай і асноўнай ячэйкай грамадства і мае права на абарону з боку грамадства і дзяржавы.

Артыкул 17
1. Кожны чалавек мае права валодаць маёмасцю як аднаасобна, так і сумесна з іншымі.
2. Ніхто не павінен быць адвольна пазбаўлены сваёй маёмасці.

Артыкул 18
Кожны чалавек мае права на свабоду думкі, сумлення і рэлігіі; гэта права ўключае свабоду змяняць сваю рэлігію ці перакананні і свабоду вызнаваць сваю рэлігію ці перакананні як аднаасобна, так і сумесна з іншымі, публічным ці прыватным парадкам у вучэнні, богаслужэнні і выкананні рэлігійных і рытуальных абрадаў.

Артыкул 19
Кожны чалавек мае права на свабоду перакананняў і на свабоднае выказванне іх; гэта права ўключае свабоду бесперашкодна прытрымлівацца сваіх перакананняў і свабоду шукаць, атрымліваць і распаўсюджваць інфармацыю і ідэі любымі сродкамі і незалежна ад дзяржаўных межаў.

Артыкул 20
1. Кожны чалавек мае права на свабоду мірных сходаў і асацыяцый.
2. Ніхто не можа быць прымушаны ўступаць у якую-небудзь асацыяцыю.

Артыкул 21
1. Кожны чалавек мае права прымаць удзел у кіраванні сваёй краінай непасрэдна або праз свабодна абраных прадстаўнікоў.
2. Кожны чалавек мае права роўнага доступу да дзяржаўнай службы ў сваёй краіне.
3. Воля народа павінна быць асновай улады ўрада; гэта воля павінна знаходзіць сабе выражэнне ў перыядычных і нефальсіфікаваных выбарах, якія павінны праводзіцца пры ўсеагульным і роўным выбарчым праве шляхам таемнага галасавання ці шляхам іншых раўназначных форм, якія забяспечваюць свабоду галасавання.

Артыкул 22
Кожны чалавек, як член грамадства, мае права на сацыяльнае забеспячэнне і на ажыццяўленне неабходных для падтрымання яго годнасці і для свабоднага развіцця яго асобы правоў у эканамічнай, сацыяльнай і культурнай абласцях пры дапамозе нацыянальных высілкаў і міжнароднага супрацоўніцтва і ў адпаведнасці са структурай і рэсурсамі кожнай дзяржавы.

Артыкул 23
1. Кожны чалавек мае права на працу, на свабодны выбар працы, на справядлівыя і спрыяльныя ўмовы працы і на абарону ад беспрацоўя.
2. Кожны чалавек, без якой-небудзь дыскрымінацыі, мае права на роўную аплату за роўную працу.
3. Кожны працаўнік мае права на справядлівую і здавальняючую ўзнагароду, якая забяспечвае годнае чалавека існаванне для яго самога і яго сям'і і дапаўняецца, пры неабходнасці, іншымі сродкамі сацыяльнага забеспячэння.
4. Кожны чалавек мае права ствараць прафесійныя саюзы і ўваходзіць у прафесійныя саюзы для абароны сваіх інтарэсаў.

Артыкул 24
Кожны чалавек мае права на адпачынак і вольны час, уключаючы права на разумнае абмежаванне працоўнага дня і на перыядычны адпачынак, які аплачваецца.

Артыкул 25
1. Кожны чалавек мае права на такі жыццёвы ўзровень, уключаючы ежу, адзенне, жыллё, медыцынскі догляд і неабходнае сацыяльнае абслугоўванне, які неабходны для падтрымання здароўя і дабрабыту яго самога і яго сям'і, і права на забеспячэнне на выпадак беспрацоўя, хваробы, інваліднасці, удаўства, наступлення старасці ці іншага выпадку страты сродкаў да існавання па незалежных ад яго акалічнасцях.
2. Мацярынства і маленства даюць права на асаблівую апеку і дапамогу. Усе дзеці, якія нарадзіліся ў шлюбе або па-за шлюбам, павінны карыстацца аднолькавай сацыяльнай абаронай.

Артыкул 26
1. Кожны чалавек мае права на адукацыю. Адукацыя павінна быць бясплатнай прынамсі ў тым, што датычыць пачатковай і агульнай адукацыі. Пачатковая адукацыя павінна быць абавязковай. Тэхнічная і прафесійная адукацыя павінна быць агульнадаступнай, і вышэйшая адукацыя павінна быць аднолькава даступнай для ўсіх на аснове здольнасцяў кожнага.
2. Адукацыя павінна быць накіравана на поўнае развіццё чалавечай асобы і на павелічэнне павагі да правоў чалавека і асноўных свабод. Адукацыя павінна садзейнічаць узаемаразуменню, цярпімасці і сяброўству паміж усімі народамі, расавымі і рэлігійнымі групамі і павінна садзейнічаць дзейнасці Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па падтрыманні міру.
3. Бацькі маюць права прыярытэту ў выбары віда адукацыі для сваіх малалетніх дзяцей.

Артыкул 27
1. Кожны чалавек мае права свабодна ўдзельнічаць у культурным жыцці грамадства, атрымліваць асалоду ад мастацтва, удзельнічаць у навуковым прагрэсе і карыстацца яго выгодамі.
2. Кожны чалавек мае права на абарону яго маральных і матэрыяльных інтарэсаў, якія з'яўляюцца вынікам навуковых, літаратурных ці мастацкіх прац, аўтарам якіх ён з'яўляецца.

Артыкул 28
Кожны чалавек мае права на сацыяльны і міжнародны парадак, пры якім правы і свабоды, выкладзеныя ў дадзенай Дэкларацыі, могуць быць цалкам выкананы.

Артыкул 29
1. Кожны чалавек мае абавязкі перад грамадствам, у якім толькі і магчыма свабоднае і поўнае развіццё яго асобы.
2. Пры ажыццяўленні сваіх правоў і свабод кожны чалавек павінен падвяргацца толькі такім абмежаванням, якія ўстаноўлены законам выключна з мэтай забеспячэння належнага прызнання і павагі правоў і свабод іншых і задавальнення справядлівых патрабаванняў маралі, грамадскага парадку і агульнага дабрабыту ў дэмакратычным грамадстве.
3. Ажыццяўленне гэтых правоў і свабод ні ў якім разе не павінна супярэчыць мэтам і прынцыпам Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

Артыкул 30
Нішто ў дадзенай Дэкларацыі не можа быць вытлумачана як прадстаўленне якой-небудзь дзяржаве, групе асоб ці пэўным асобам права займацца якой-небудзь дзейнасцю ці здзяйсняць дзеянні, накіраваныя на знішчэнне правоў і свабод, выкладзеных у дадзенай Дэкларацыі.



# ВАЖНЕЙШЫЯ ДАКУМЕНТЫ ПА ПРАВАХ ЧАЛАВЕКА

## Дакументы Арганізацыі Аб'яднаных Нацый

**1948 г.** Канвенцыя аб папярэджанні злачынства генацыду і пакаранні за яго

**1948 г.** Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека

**1951 г.** Канвенцыя аб статусе ўцекачоў, з дадаткамі

**1952 г.** Канвенцыя аб палітычных правах жанчын

**1957 г.** Канвенцыя аб скасаванні прымусовай працы (105 Канвенцыя Міжнароднай арганізацыі працы)

**1965 г.** Міжнародная канвенцыя аб ліквідацыі ўсіх форм расавай дыскрымінацыі

**1966 г.** Міжнародны пакт аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах

**1966 г.** Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах

**1979 г.** Канвенцыя аб ліквідацыі ўсіх форм дыскрымінацыі ў адносінах да жанчын

**1984 г.** Канвенцыя супраць катаванняў і іншых жорсткіх, бесчалавечных відаў абыходжання і пакарання, якія прыніжаюць годнасць

**1989 г.** Канвенцыя аб карэнных народах і народах, якія вядуць племянны лад жыцця ў незалежных краінах (169 Канвенцыя Міжнароднай арганізацыі працы)

**1989 г.** Канвенцыя аб правах дзіцяці

**1999 г.** Канвенцыя аб забароне і неадкладных мерах па выкараненні найгоршых форм дзіцячай працы (182 Канвенцыя Міжнароднай арганізацыі працы)

**2007 г.** Канвенцыя аб правах інвалідаў

## Дакументы Савета Еўропы

**1950 г.** Канвенцыя аб абароне правоў чалавека і асноўных свабод

У далейшым быў прыняты шэраг пратаколаў (дадаткаў да Канвенцыі), якія ўтрымліваюць новыя правы і новыя працэдуры абскарджання дзеянняў, якія парушаюць Канвенцыю.

**1961 г.** Еўрапейская сацыяльная хартыя

**1987 г.** Еўрапейская Канвенцыя па папярэджанні катаванняў і бесчалавечнага абыходжання ці пакарання, якія прыніжаюць годнасць

### Дакумент, прыняты на Нарадзе па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе (НБСЕ)

**1975 г.** Заключны акт Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе (Хельсінкская дэкларацыя)

### Міжнароднае гуманітарнае права

**1907 г.** IV Гаагская канвенцыя аб законах і звычаях сухапутнай вайны

**1949 г.** Жэнеўскія канвенцыі:

1. Аб паляпшэнні становішча параненых і хворых у дзеючых арміях
2. Аб паляпшэнні становішча параненых, хворых і асобаў, якія пацярпелі караблекрушэнне, са складу ўзброеных сіл на моры
3. Аб абыходжанні з ваеннапалоннымі
4. Аб абароне грамадзянскага насельніцтва падчас вайны

**1954 г.** Гаагская канвенцыя аб абароне культурных каштоўнасцяў у выпадку ўзброенага канфлікту

**1977 г.** Дадатковыя пратаколы да Жэнеўскіх канвенцый ад 12 жніўня 1949 года

1. Аб абароне ахвяраў міжнародных узброеных канфліктаў
2. Аб абароне ахвяраў узброеных канфліктаў неміжнароднага характару

**1998 г.** Рымскі статут Міжнароднага крымінальнага суда



# МІЖДЗЯРЖАЎНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ, ЯКІЯ ПРАЦУЮЦЬ У СФЕРЫ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА

ААН мае два сайты: http://www.un.org (асноўны сайт) і сайт Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека: http://www.unhchr.ch

Савет Еўропы: http://www.coe.fr

Еўрапейскі Саюз: http://www.europa.eu.int

Арганізацыя па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе (АБСЕ): http://www.osce.org

Арганізацыя амерыканскіх дзяржаў (ААД): http://www.oas.org

Арганізацыя афрыканскага адзінства (ААА) http://www.oau-oau.org

# НЕЗАЛЕЖНЫЯ ПРАВААБАРОНЧЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ

### Міжнародныя арганізацыі

Amnesty International (AI): amnesty.org — «Міжнародная Амністыя»

Coalition for the International Criminal Court (CICC): iccnow.org — Кааліцыя міжнароднага крымінальнага суда

Human Rights Education Associates (HREA): hrea.org — Асацыяцыя па навучанні правам чалавека

Human Rights Watch: hrw.org — «Хьюман райтс уотч»

International Committee of the Red Cross: icrc.org — Міжнародны камітэт Чырвонага Крыжа

International Commission of Jurists: icj.org — Міжнародная камісія юрыстаў

International Helsinki Federation for Human Rights (IHF): ihf-hr.org — Міжнародная Хельсінкская федэрацыя правоў чалавека

Minority Rights Group International: minorityrights.org — Міжнародная група па правах меншасцяў

### Беларускія арганізацыі

Праваабарончы цэнтр «Вясна»: http://www.spring96.org

Беларускі Хельсінкскі камітэт: http://www.belhelcom.org

Беларуская асацыяцыя журналістаў: http://www.baj.by

Праваабарончы альянс: http://www.belpa.org

Камітэт абароны рэпрэсаваных «Салідарнасць»: http://www.salidarnasc.org

Фонд развіцця прававых тэхналогій: http://www.lawtrend.org

Беларускі Дом правоў чалавека: http://humanrightshouse.org/Network/Belarus/index.html

# СПІС ЛІТАРАТУРЫ


**Андэрсэн, Анэтэ Агард, Турбен Ульрык Нісэн, Марыяне Муніс і Карстэн Шулдборг:** *Як супрацьстаяць гвалту. Каталог ідэй.* Міністэрства адукацыі (Данія), 1995 г.

**Міжнародная Амністыя ў Нарвегіі (рэд. Фолквард):** *Крок за крокам. Матэрыял для навучання правам чалавека. Частка 2: Мадэль навучання для малодшых класаў* (апрацаваная версія кнігі Міжнароднай Амністыі «Крок за крокам», Лондан, 1996 г.), Осла, Міжнародная Амністыя ў Нарвегіі, 2002 г.

**Міжнародная Амністыя:** *СІНІКА. Развіццё культуры правоў чалавека ў Афрыцы. Кіраўніцтва па навучанні правам чалавека* (апрацаваная версія кнігі Міжнароднай Амністыі «Крок за крокам», Лондан, 1996 г.), Лондан, Аддзел па навучанні правам чалавека пры Міжнароднай Амністыі, 1998 г.

**Бенедэк,Вольфган, МінаНіколава (рэд.):** *Разумець правы чалавека. Кіраўніцтва па навучанні правам чалавека,* Граз, Міністэрства замежных спраў Аўстрыі сумесна з Еўрапейскім цэнтрам па навучанні і даследаванням у галіне правоў чалавека і дэмакратыі, 2003 г.

**Бергем Кнут В., Гюнар М. Карлсэн, Беата Слюдал (рэд.):** *Правы чалавека. Уводзіны.* Осла, выдавецтва Humanist, 2004 г.

**Брандэр Пэт, Кармэн Кардэнас, Руі Гомес, Марк Тэйлар, Хуан дэ Вінсентэ Абад:** *Усе розныя – усе раўнапраўныя. Навучальны зборнік,* Страсбург, Еўрапейскі цэнтр моладзі, Савет Еўропы, 1995 г.

**Брандэр Патрыцыя, Элі Кін, Мары-Лаура Леменэр (рэд.):** *КОМПАС. Кіраўніцтва па навучанні моладзі правам чалавека (2-е выданне),* Страсбург, Седэкс, выдавецтва Савета Еўропы, 2003 г.

**Брудал Ханс і Ляйф Нільсан:** *Чаму нас вучаць канфлікты?* Осла, выдавецтва Antroposof, 1999 г.

**Клод Рычард П'ер:** *Навучанне правам чалавека для шырокай аўдыторыі,* Амстэрдам/Кембрыдж: Асацыяцыя па навучанні правам чалавека (HREA), 2000 г.

**Дал Ёйвінд:** *Сустрэча людзей. Міжкультурная камунікацыя,* Осла, выдавецтва Gyldendal Norsk Forlag, 2004 г.

**Каралеўскі дэпартамент аховы здароўя і сацыяльнага забеспячэння:** План дзеянняў, накіраваных на інтэграцыю эмігрантаў і ўключэнне іх у грамадства, кастрычнік 2006 года.

**Донестад Эва і Санер Марыт:** *КрэАктыўныя 40 метадаў. Практыкаванні, накіраваныя на паляпшэнне камунікацыі для розных груп дзяцей і моладзі,* Цэнтр абароны правоў пры арганізацыі «Выратуйце дзяцей», 2001 г.

**Элізабэт Айдэ і Ане Хегэ Сімансэн:** *Убачыць свет з іншага боку,* Осла, выдавецтва Cappelens, 2004 г.

**Айдсвог Інге:** *Перш за ўсё чалавек,* Міністэрства адукацыі, 2004 г.

**Айдсвог Інге:** *Добрыя справы выратуюць свет,* Нарвежскі Чырвоны Крыж, 2005 г.

**Энгелстад Арнэ:** *Тэатр прыгнечаных: калі глядач становіцца ўдзельнікам: метад і практыка Аўгуста Боала,* Осла, выдавецтва Cappelen akademisk forlag, 2001 г.

**Эрыксэн Томас Хюланд (рэд.)** *Міжкультурнае ўзаемаразуменне, выдавецтва* Tano Aschehoug, 1997 г.

**Ерыксэн Томас Хюланд і Торун Арнтсэн Сёрхайм:** *Разуменне культуры на практыцы. Перспектывы на будучыню для шматкультурнай Нарвегіі,* Осла, выдавецтва Ad Notam Gyldendal AS, 1994 г.

**Ф'ельстад Ёйвінд і Мерэтэ Лінстад:** *Прэса і чужыя,* Крысціянсанд, выдавецтва I-J, 1999 г.

**Галтунг Ёхан:** *З абодвух бакоў: уводзіны ў працу з канфліктамі,* Осла, выдавецтва Kagge, 2003 г.

**Гюле Ларс:** *Іслам і сучаснае,* Осла, выдавецтва Abstrakt AS, 2006 г.

**Ліліян Юрт і Вігдзіс Юрт:** *Кніга для жывучых жыццё,* Осла, выдавецтва Cappelen, 2002 г.

**Ішэй Мішэлін Р.:** *Гісторыя правоў чалавека,* выдавецтва University of California Press, Берклі, Лос-Анджэлес, Лондан, 2004 г.

**Каўлі Хокан:** *Справаздача IMDi 2/2006 Барометр інтэграцыі 2005,* Осла, IMDi Міністэрства інтэграцыі, 2006 г.

**Кумар Лоўлін:** *Джулаха! Як разумець рознасць,* Крысціансанд, выдавецтва Høyskoleforlaget, 2001 г., другое выданне, 2002 г.

**Махер Джон і Джудзі Гроўз:** *Прадстаўляючы Хомскага,* выдавецтва Icon Books Ltd., Грэндж роўд, Даксфорд, Кембрыдж CB24QF, 1999 г.

**Марцінэлі Сільвія, Марк Тэйлар:** *T-Kit No. 4 – Міжкультурнае навучанне,* Савет Еўропы, 2004 г.

**Нордхеле Грэтэ: Пасярэдніцтва:** *Разуменне канфлікту і спосабаў яго вырашэння,* Осла, выдавецтва Gyldendal Norsk Forlag, 2006 г.

**Сцегер Манфрэд Б.:** *Вельмі кароткія ўводзіны да тэмы глабалізацыя,* Нью-Ёрк, выдавецтва Oxford University Press Inc., 2003 г.

**Тверэн Мортэн Сміт (рэд.):** *Чалавечая годнасць і аповяды зняволеных,* Рызёр, выдавецтва Aktive Fredsforlag, 2005 г.

**Офіс Вярхоўнага камісара ААН па правах чалавека (OHCHR):** *АБВ: Навучанне правам чалавека, Практычныя заняткі для малодшых і сярэдніх класаў,* ААН Нью-Ёрк і Жэнева, 2004 г.

**Валстром Гуніла О.:** *Як спраўляцца з канфліктамі. Кіраўніцтва для педагогаў,* Осла, выдавецтва ad Notam Gyldendal, 1996 г.